Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання»

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ СЕГМЕНТ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МАНАГРАФІЯ

Магілёў
МДУХ
2015

УДК 94(476)+323.15(476)
ББК 63.3 (4Беи)6
Н 35

Рэкамендавана
Саветам універсітэта ўстановы адукацыі
"Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання"

Рэцэнзенты:
прафесар кафедры паліталогіі і сацыялогіі
УА "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова",
доктар сацыялагічных навук, прафесар *М. Я. Ліхачоў*;
старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі
беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАНБ,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В. Г. Мазец;*
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В. Д. Выбарны*

Аўтары:
І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў, А. У. Бунас, В. В. Юдзін

Манаграфія падрыхтавана ў межах выканання задання "Роля нацыянальных меншасцей у забеспячэнні ўстойлівага паступальнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі Беларусі" Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў "Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі" (ДПНД "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава") у падпраграме "Гісторыя, матэрыяльная і духоўная культура беларускага народа".

**Нацыянальны сегмент грамадзянскай супольнасці Рэспублікі**
Н35 **Беларусь** : манаграфія / І. А. Пушкін [і інш.]. – Магілёў : МДУХ, 2015. – 336 с.
ISBN 978-985-6985-42-6.

У манаграфіі асвятляецца і аналізуецца нацыянальны сегмент грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь: раскрыты нацыянальна-дзяржаўная палітыка, арганізацыя і дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў, этнічная талерантнасць як фактар устойлівага паступальнага развіцця сучаснага беларускага грамадства, сацыяльна-палітычныя пазіцыі веруючых у сучасным грамадстве, роля і значэнне нацыянальнай мовы ў фарміраванні этнічнай ідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам і студэнтам, а таксама ўсім, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй.

**УДК 94(476)+323.15(476)**
**ББК 63.3 (4Беи)6**

**ISBN 978-985-6985-42-6**

© Пушкін І. А., Бубнаў Ю. М.,
Бунас А. У., Юдзін В. В., 2015
© Установа адукацыі
"Магілёўскі дзяржаўны
ўніверсітэт харчавання", 2015

## ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ 5

1 НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ 29

1.1 Асновы, прынцыпы і перыядызацыя нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь *(І.А. Пушкін)* 31

1.2 Заканадаўчае забеспячэнне нацыянальна-дзяржаўных адносін у Рэспубліцы Беларусь *(І.А. Пушкін)* 39

1.3 Стварэнне і дзейнасць дзяржаўных органаў, якія займаліся вырашэннем праблем нацыянальных супольнасцей *(І.А. Пушкін)* 63

1.4 Асноўныя кірункі нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь *(І.А. Пушкін)* 72

1.5 Дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей у Рэспубліцы Беларусь *(І.А. Пушкін)* 87

1.6 Рэгіянальныя асаблівасці ў дзейнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый *(І.А. Пушкін)* 138

1.7 Праблемы ў сферы міжнацыянальных адносін *(І.А. Пушкін)* 154

2 ЭТНІЧНАЯ ТАЛЕРАНТНАСЦЬ ЯК ФАКТАР УСТОЙЛІВАГА ПАСТУПАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА 168

2.1 Сацыяльная актуалізацыя этнічнай талерантнасці як гістарычная тэндэнцыя *(Ю.М. Бубнаў)* 168

2.2 Праявы этнічнай нецярпімасці ў беларускім грамадстве па выніках сацыялагічных апытванняў *(Ю.М. Бубнаў)* 171

2.3 Сацыяльная індыкацыя этнічнага радыкалізму ў сучасным беларускім грамадстве (на прыкладзе Магілёўскай вобласці) *(Ю.М. Бубнаў)* 180

2.4 Шляхі і метады вырашэння праблем этнічнай нецярпімасці ў сучасным грамадстве *(Ю.М. Бубнаў)* 198

3 САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАЗІЦЫІ ВЕРУЮЧЫХ У СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ 212

3.1 Прававыя аспекты канфесійнай палітыкі дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь *(В.В. Юдзін)* 212

3.2 Дынаміка і накіраванасць рэлігійных працэсаў на сучасным этапе беларускай гісторыі *(В.В. Юдзін)* 222

4 РОЛЯ І ЗНАЧЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МОВЫ Ў ФАРМІРАВАННІ ЭТНІЧНАЙ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА 239

4.1 Дзейнасць дзяржаўнай улады па захаванню нацыянальных моў і мовы тытульнай нацыі *(А.У. Бунас, І.А. Пушкін)* 239

4.2 Асаблівасці беларускай самасвядомасці і роля нацыянальнай мовы ў фарміраванні этнічнай самаідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва *(А.У. Бунас)* 260

4.3 Некаторыя рысы да сацыялінгвістычнага партрэта сучаснага беларускага насельніцтва *(А.У. Бунас)* 270

ЗАКЛЮЧЭННЕ 283

БІБЛІЯГРАФІЯ 293

Архіўныя крыніцы 293

Літаратура 293

Summary 334

# УВОДЗІНЫ

Стан і характар функцыянавання грамадзянскай супольнасці, калі не ва ўсім, то шмат у чым, вызначае месца і ролю адпаведнага народа ў агульначалавечай гісторыі. Але гэтак жа дакладна і адваротная выснова: жыццёвы тонус, пасіянарнасць таго ці іншага народа выяўляецца ў сучасных умовах ва ўзроўні развітасці сфарміраванай ім грамадзянскай супольнасці. Гэтая непарыўная ўзаемазалежнасць і дазволіла нам адкрыць дыскусію па праблематыцы, якая ляжыць на стыку дзвюх найбольш актуальных у сучаснай грамадазнаўчай літаратуры тэм: грамадзянская супольнасць і нацыянальныя меншасці.

Важным з’яўляецца вызначэнне ролі грамадзянскай супольнасці і нацыянальнага фактару ў забеспячэнні ўстойлівага паступальнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі Беларусі. Без аналізу палітыка-прававых асноў удзелу нацыянальных супольнасцей у грамадскім і культурным жыцці Беларусі, адносін афіцыйных уладаў да нацыянальных меншасцей, удзелу іх у грамадска-палітычным і культурным жыцці нашай краіны, вызначэння ролі нацыянальных арганізацый у нашым грамадстве немагчыма выпрацаваць глыбока прадуманую, адпаведную інтарэсам краіны, дзяржаўную нацыянальна-канфесійную палітыку. Урэгуляванасць і гарманічнасць адносін дзяржавы з нацыянальнымі супольнасцямі з’яўляецца важнай прыкметай цывілізаванай, прававой краіны.

Савецкая нацыянальная палітыка характарызавалася тым, што, з аднаго боку, яна прызнавала факт існавання нацый і народаў у СССР і ў пэўнай ступені садзейнічала іх развіццю ў межах савецкіх рэспублік, а з другога – і гэта было асноўнай, праграмнай, перспектыўнай задачай – праводзілася палітыка на зліццё нацый і народнасцей, нівеліроўку іх нацыянальных асаблівасцей. Больш за тое, вялікая ўвага надавалася з боку кампартыі і дзяржавы фарміраванню савецкага народа як новай супольнасці людзей, а затым мелася на ўвазе стварэнне адзінага сусветнага грамадства з сацыялістычнай і камуністычнай арыентацыяй [1].

Пасля распаду СССР і ўтварэння Рэспублікі Беларусь палітычныя акты па ўсталяванні суверэнітэту беларускага народа спалучаліся з захадамі па ўзнаўленні этнічных адметнасцей, вяртанні гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці беларусаў, распаўсюджанні іх мовы, звычаяў і традыцый. Дзяржаўная нацыянальная палітыка прадугледжвала падобнае і ў адносінах да іншых нацыянальных супольнасцей.

Унутраны і знешні палітычны курс краіны ў навейшай гісторыі Беларусі арыентаваны на самабытнасць краіны ў гістарычным развіцці, фарміраванне прававога грамадства з сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікай і вызначаўся ўладамі як перыяд “палітыкі згоды”. Увага была

[1] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М.П.Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А.А.Каваленя [і інш.]; Нац.акад.навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск, 2008. С. 543.

акцэнтавана на сувязь з беларусамі замежжа, аб'яднанне беларускага народа ў дзяржаву, якая стала б крыніцай сілы ў свеце, дзе кожная краіна адыгрывае сваю ролю, на стварэнне такой дзяржавы, дзе будуць гарантаваны правы чалавека кожнай нацыянальнасці [2].

Аб'ект нашага даследавання – нацыянальныя меншасці ў Беларусі. Прадмет даследавання – міжэтнічныя стасункі і роля нацыянальных супольнасцей у забеспячэнні ўстойлівага пастпальнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі Беларусі.

Вядомы два разуменні паняцця "нацыянальныя меншасці". Першае шырока сустракаецца ва ўсім свеце. Нацыянальныя меншасці – гэта групы насельніцтва пэўнай нацыянальнасці, якія расселены ў іншанацыянальным асяроддзі па-за межамі ўласных дзяржаўных утварэнняў або не маюць такіх, ствараюць этнакультурную супольнасць, якая пэўным чынам інтэгруецца з тытульнай большасцю. Іншае дадзена ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь". Пад асобамі, якія належаць да нацыянальных меншасцей, разумеюцца тыя, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі, маюць яе грамадзянства і па свайму паходжанню, мове, культуры або традыцыях адрозніваюцца ад асноўнага насельніцтва рэспублікі.

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана паняцце "нацыянальная супольнасць" (артыкулы 14, 15). Безумоўна, пад гэтым паняццем можна разумець усе нацыянальнасці, якія пражываюць на тэрыторыі краіны, у тым ліку і беларусаў.

У манаграфіі, як і ў афіцыйных выданнях, тэрмін "нацыянальныя супольнасці" ужываецца ў абазначэнні нацыянальных меншасцей Беларусі. У Рэспубліцы Беларусь словазлучэнне "нацыянальныя меншасці" выкарыстоўваецца пры падпісанні міжнародных дамоў.

Пад міжнацыянальнымі адносінамі разумеюцца суб'ектыўна перажываемыя адносіны паміж людзьмі розных нацыянальнасцей, этнічнымі супольнасцямі. Яны складваюцца ў палітыцы, эканоміцы, працоўнай дзейнасці, быце, сямейным жыцці, сферах сяброўскай, нефармальнай камунікацыі. Характар адносін (сяброўскі, нейтральны або канфліктны) залежыць ад гістарычнага мінулага, сацыяльна-палітычнай абстаноўкі ў краіне, эканамічных і культурна-бытавых умоў жыцця, ад канкрэтнай сітуацыі ці зацікаўленасці ў сувязях. На ўзроўні асобных людзей ён залежыць ад індывідуальна-псіхалагічных якасцей кожнага чалавека [3].

Трэба мець на ўвазе, што станаўленне нацый і захаванне этнічных асаблівасцей і каштоўнасцей заўсёды з'яўлялася ініцыятывай сярэдніх

---

[2] Бурая Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) // Весці БДПУ. Серыя 2. 2007. № 1. С. 46–47.

[3] Мусіенка С. Этнаканфесіянальнае асяроддзе Рэспублікі Беларусь: стан і тэндэнцыі развіцця // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 9. С. 34.

класаў (пераважна гараджан, інтэлігенцыі, дробнай шляхты, заможнай часткі насельніцтва), а не "простага народу" ў інтарэсах якога разгортваліся ўсе нацыянальныя рухі.

У працы былі выкарыстаны матэрыялы: Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (ДАБр), Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці (ДАМаг), Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг), Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВц), Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці (ДАГр), Літоўскага дзяржаўнага новага архіва (LVNA), Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (ДАРФ), штогадовых справаздач саветаў па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры абласных выканаўчых камітэтах. Выкарыстоўваліся вынікі ўласных сацыялагічных даследаванняў [4]. Пытанні міжнацыянальных адносін, канфесійная сітуацыя, узаемадзеяннне з грамадскімі аб'яднаннямі і партыямі асвятляліся ў спецыяльных выданнях рэгіянальных ідэалагічных устаноў [5].

Пры аналізе палітыка-прававых асноў нацыянальна-дзяржаўных і канфесійных адносін у Рэспубліцы Беларусь, асноўных кірункаў нацыянальна-канфесійнай палітыкі краіны выкарыстоўваліся: заканадаўчая база Рэспублікі Беларусь [6], пастановы Урада [7], указы і прамовы кіраўніка

---

[4] Апытанні рэпрэзентатыўнай выбаркі моладзі праводзіліся групай супрацоўнікаў кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання з 1997 па 2011 год. У агульнай колькасці было апытана больш за 5 тысяч маладых людзей жаночага і мужчынскага полу ва ўзросце да 30 гадоў, якія пражываюць у Магілёўскай вобласці, а таксама ў г. Мінску і г. Гродна.

[5] Напрыклад: Пути повышения эффективности идеологической работы в современных условиях : стиль, формы и методы в 2 ч. / Сборник материалов по итогам семинара идеологических работников области. Могилёв, 2010. Ч. 2. С. 62–65, 59–62, 50–59.

[6] Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г. 3-е изд., стер. Минск, 2008; О национальных меньшинствах в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь 11 ноября 1992 г. № 1926–XII (изменения и дополнения от 5 января 2004 г. № 261–З, от 7 мая 2007 г. № 212–З) ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь "О национальных меньшинствах в Республике Беларусь": Закон Рэспублікі Беларусь от 5 января 2004 г. № 261–З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь (НРПА), 2004. № 4. 2/1010 ; Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях : Закон Рэспублікі Беларусь ад 17.12.1992 г. , № 2054 – XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 2. Арт. 18. ; Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях": Закон Рэсп. Беларусь, 31 кастрычніка 2002г., № 137–З // НРПА. 2002. № 123. 2/886 ; Уголовный кодекс Белорусской ССР. Минск : Беларусь, 1990 ; Уголовный кодекс Республики Беларусь. Минск, 2004 ; Об образовании : Закон Республики Беларусь от 29 октября 1991 г., № 1202–XII // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1991. № 33. Ст. 598 ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь "Об образовании": Закон Рэспублики Беларусь от 4 августа 2004 г. № 311–З // НРПА. 2004. № 123. С. 21–22 ; О языках в Республике Беларусь : Закон Республики Беларусь от 26 января 1990 г. № 3094–XI : в редакции Закона от 13 июля 1998 г. № 187–З // Ведомости Национального собрания Республики Беларусь. 1998. № 28. Ст. 461 ; Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь, 9.01.2006 г., № 98–З // НРПА. 2006. № 9. 2/1195; Об охране историко-культурного наследия: Закон Республики Беларусь, 13 ноября 1992 г., № 1940 – XII // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1992. № 30. Ст. 504; Об общественных объединениях: Закон Респ. Беларусь, 4 окт. 1994 г., № 3254 – XII: по сост. на 23 сентября 2004 г. Минск, 2004 ; Об утверждении Основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь. Закон Республики Беларусь от 14.11.2005 г. № 60–З, 2/1157 // НРПА. 2005. № 188. С. 34–42 ; О противодействии экстремизму : Закон Республики Беларусь от 04.01.2007 г. № 203–З, 2/1300 // НРПА. № 15. С. 23–28 ; О культуре в Республике Беларусь : Закон Республики Беларусь от 4 июня 1991 г. № 832–XII, изменения и дополнения: Закон от 14 мая 2001 г. № 16–З // НРПА. 2001. № 48. 2/759 ; О гражданстве

дзяржавы [8], апублікаваныя зборнікі дакументаў і матэрыялаў навуковых канферэнцый, працы іншых даследчыкаў, публікацыі ў перыядычным друку. Асабліваe месца належыць матэрыялам Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь [9]. У 2004 г. быў выдадзены даведнік, у якім утрымліваліся міжнародныя і нарматыўна-прававыя дакументы Рэспублікі Беларусь аб правах асоб, якія адносяцца да нацыянальных супольнасцей, інфармацыя аб нацыянальных арганізацыях [10]. Прававая база па нацсупольнасцям у Еўропе, свеце і этнакультурная палітыка ў Беларусі ў адпаведнасці з міжнародным кантэкстам прадстаўлена ў выданні

---

Республики Беларусь : Закон Республики Беларусь от 18 октября 1991 г. № 1181 – XII // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1991. № 32. Ст.581 ; О гражданстве Республики Беларусь. Закон Республики Беларусь от 01.08.2002 г. № 136 –З // НРПА. 2002. № 88. 2/885 ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь "О беженцах" от 22 февраля 1995 г. № 3605 – XII: Закон Республики Беларусь от 16.06.1999 г. № 268 –З // НРПА. 1999. № 47. 2/43 ; О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь : Закон Республики Беларусь от 03.06.1993 г. № 2339–XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 21. Ст. 250 ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь "О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь" : Закон Республики Беларусь от 19.07.2005 г. № 41–З, 2/1138 // НРПА. 2005. № 121. С. 8–24.

[7] О вопросах сохранения историко-культурного наследия: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 6 мая 2002 г., № 579 // НРПА. 2002. № 55. 5/10410 ; О системе мер, обеспечивающих проведение реставрационно-восстановительных работ на наиболее важных объектах историко-культурного наследия: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 8 окт. 2002 г., № 1395 // НРПА. 2002. № 115. 1/5676 ; О первоочередных мерах по сохранению и возрождению исторических центров городов Беларуси: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 23 июля 2001 г., № 1085 // НРПА. 2001. № 72. 5/6470 ; О порядке определения нерабочих дней для верующих нехристианских религий в связи с их праздниками: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 22 января 1992 г., № 30 // Собрание Постановлений Правительства Республики Беларусь. 1992. № 2. Ст. 28 ; Справка о межнациональных отношениях и работе с национальными общностями по совершенствованию государственной политики в сфере национальных отношений в 2008 году // Коллегия аппарата Уполномоченного по делам религий и национальностей от 21.01.2009. № 1. Минск, 2009 ; Программа развития конфессиональной сферы, национальных отношений и сотрудничества с соотечественниками за рубежом на 2006–2010 годы. Согласована Советом Министров Республики Беларусь 30.11.2006. Минск, 2006.

[8] Об утверждении Концепции национальной безопасности Республики Беларусь : Указ Президента Республики Беларусь от 17.07.2001 г. № 390 // НРПА. 2001. № 69. 1/2852 ; Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны: Указ Президента Республики Беларусь, 18 окт. 2007 г., № 527 // НРПА. 2007. № 252. 1/9038 ; Лукашенко А.Г. Послание Президента А.Г.Лукашенко участникам I Конгресса деятелей культуры стран СНГ // Рэспубліка. 1996. 31 мая. С. 3 ; Лукашэнка А.Р. Мы ўсе ў адказе за нашу Беларусь. Штогадовае Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь // Звязда. 1997. 12 крас. С. 2–6; Лукашенко А. Г. Послание Президента Национальному собранию. Речь от 7 апреля 1999 г. // Советская Белоруссия. 1999. 8 апр С. 1–3 ; Лукашенко А.Г. Послание Президента Республики Беларусь Национальному Собранию Республики Беларусь // Информационный бюллетень Администрации Президента Республики Беларусь. 2001. № 4. С. 3–29 ; Государство для народа : Доклад Президента Республики Беларусь // Государство для народа: документы и материалы Третьего Всебелорусского собрания, 2–3 марта 2006 года, Минск / редкол.: А.Н.Рубинов и др. Минск: Беларусь, 2006. С. 9–74.

[9] Статистический ежегодник Республики Беларусь, 1999: статистический материал. Минск, 1999 ; Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2003: статистический материал. Минск, 2003 ; Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2007: статистический материал. Минск, 2007 ; Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2008: статистический материал. Минск, 2008 і інш.

[10] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік / Складальнік Н.В.Ходар. Мінск, 2004.

Еўрапейскага цэнтра па пытаннях меншасцей [11]. Адной з крыніц вывучэння нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь выступалі атласы народаў [12].

Нацыянальна-дзяржаўная палітыка ў Савецкай Беларусі, асаблівасці ўзнаўлення этнічных адметнасцей пры ўсталяванні дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і культурнае жыццё нацыянальных супольнасцей асветлены ў калектыўных выданнях навуковых супрацоўнікаў Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАНБ, якія пабачылі свет у апошнія некалькі год [13].

Шляхі нацыянальна-культурнага адраджэння ў 1990–1993 гг. і новая палітыка ў адносінах да беларускай дыяспары і царквы раскрыты ў калектыўнай працы "Нарысы гісторыі Беларусі" [14]. Аўтары робяць выснову, што ў першыя гады існавання Рэспублікі Беларусь дзейнасць па нацыянальна-культурнаму адраджэнню, фарміраванню нацыянальнай свядомасці беларускага народа не прыняла да прыкметных зрухаў. Дзяржава, грамадскія сілы далёка не поўнасцю выкарыстоўвалі спрыяльныя для гэтага магчымасці, якія ўзніклі з выхадам Беларусі на суверэнны шлях развіцця. Адраджэнне нярэдка кампраметавалася адсутнасцю прадуманай, узважанай палітыкі дзяржаўных структур у адносінах да нацыянальнай культуры, а таксама адсутнасцю сур'ёзнай прававой базы, якая б забяспечвала ёй неабходныя ўмовы развіцця [15].

Дэмаграфічныя працэсы, якія адбываліся ў Беларусі, разгледжаны ў артыкуле А. Смалянчука. Ён, аналізуючы нацыянальную структуру насельніцтва Беларусі ў XX ст., зрабіў выснову, што "з пункту гледжання этнанацыянальных працэсаў гісторыя Беларусі XX ст. – гэта гісторыя імкнення народаў краіны да нацыянальнага самавызначэння. На пачатку 90-х гадоў XX ст. працэсы русіфікацыі і саветызацыі ў значнай ступені былі спынены. Распачаўся новы этап нацыянальна-культурнага Адраджэння народаў краіны. Беларусы, палякі, літоўцы, татары, яўрэі, украінцы ды інш. адраджалі свае культурныя традыцыі, стваралі сістэму вывучэння мовы ўласнай нацыянальнасці. Усё гэта спрыяла пашырэнню нацыянальнай самаідэнтыфікацыі сярод народаў Беларусі. Амаль

[11] Вопросы меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире / Европейский центр по вопросам меньшинств; сост., авт. предисл. А.Оипов, А.Василевич. Минск, 2012.

[12] Беларусы: Этнагеаграфія, дэмаграфія, дыяспара, канфесіі. Атлас / Нав.рэд. В.К. Бандарчык. Мінск, 1996 ; Нацыянальны атлас Беларусі. Мінск, 2002. С. 170–184.

[13] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё / В.К. Бандарчык, В.М. Белявіна, Г.І. Каспяровіч і інш. Мінск, 2001 ; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. Мінск, 2006 ; Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. Мінск: Беларус.навука, 2008 ; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т.6. Беларусь у 1946–2009 гг. Мінск, 2011.

[14] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. / А.П. Касцюк , І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. ; Інстытут гісторыі АНБ. Мінск, 1995. С. 466–476, 502–506.

[15] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 476.

упершыню ў XX ст. гэтыя народы адчулі дзяржаўны клопат пра іх нацыянальна-культурнае развіццё”[16].

Стан рэлігіі ў сучасным беларускім грамадстве разгледжаны ў калектыўным даследаванні, прысвечаным гісторыі канфесій на Беларусі з канца XVIII ст. да сучаснасці, пад агульнай рэдакцыяй У. Навіцкага [17]. Аўтары робяць выснову, што ў 1989–1996 гг. абагацілася рэлігійнае жыццё ў Беларусі. Кожнаму грамадзяніну было прадастаўлена права спавядаць любую рэлігію альбо быць атэістам. Вырасла колькасць канфесій, рэлігійных абшчын, якія карысталіся вялікім аўтарытэтам у насельніцтва. Грамадства было зацікаўлена ў дыялогу прадстаўнікоў розных канфесій, зацвярджэнні прынцыпаў талерантнасці і супрацоўніцтва. Паважлівыя ўзаемаадносіны з’яўляліся гарантам сацыяльнага міру і спакою на беларускай зямлі.

Найбольш грунтоўна даследаваннем дзяржаўнай этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і ролі дзяржавы ў развіцці нацыянальных супольнасцей займалася гродзенская даследчыца А. Макрушыч [18]. Яна ў сваіх публікацыях сцвярджала, што розныя фактары прывялі да складання ў грамадстве ўстойлівых традыцый талерантнасці, якія ў незалежнай Беларусі былі падтрыманы адпаведнай палітыкай дзяржаўных органаў. Такая палітыка была накіравана на захаванне ў грамадстве атмасферы міжэтнічнай згоды, фарміраванне грамадзянскай нацыі Беларусі, падтрымку мерапрыемстваў з удзелам прадстаўнікоў розных этнічных груп, што садзейнічала знаёмству насельніцтва з іх культурнымі традыцыямі і недапушчэнню ўзнікнення этнафобскіх настрояў.

---

[16] Смалянчук А. Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі ў XX стагоддзі // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 1. Мінск, 2002. С. 165–166.

[17] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст.) / В.В. Грыгор’ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М.Філатава; Навук. Рэд. У.І.Навіцкі. Мінск, 1998.

[18] Макрушич Е.Н. Государственная поддержка этнокультурного развития национальных меньшинств в г. Гродно (1991–2006 гг.) // Гродна і Гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада) матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гродна, 10–11 крас. 2008 г. Гродна, 2008. С. 368–372 ; Макрушич Е.Н. Информационный аспект этнокультурной политики в отношении национальных общностей в Республике Беларусь (1997–2006) // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. стат. Гродно, 2008. С. 91–94 ; Макрушич Е.Н. Роль государства в сохранении этнокультурной идентичности в условиях глобализации // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно, 2010. С. 132–135 ; Макрушич Е. Н. Факторы сохранения межэтнической толерантности в Республике Беларусь // Этносоциум и межнациональная культура. 2009. № 3 (19). С. 210–217 ; Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. 2008. № 1. С. 49–55; Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в Республике Беларусь в начале XXI века // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. 2009. № 2. С. 20–27 ; Макрушич Е.Н. Традиционная культура белорусов как объект государственной политики в Республике Беларусь в 90-е гг. XX в. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. 2008. № 2. С. 60–66.

Спробы перыядызацыі нацыянальна-канфесійнай палітыкі Рэспублікі Беларусь зроблены сучаснымі беларускімі вучонымі Н. Бурай, Д. Безнюком, Н. Кавалёвай, І. Мартыненка [19].

Аналіз дасягненняў дзяржаўнай палітыкі ў сферы міжнацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой зроблены ў публікацыях кансультанта аддзела нацыянальнасцей і прававой работы апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей М. Рыбакова. Ён робіць выснову, што захаванне стабільных міжэтнічных адносін і развіццё канструктыўнага дыялогу культур у выніку правядзення дэмакратычнай нацыянальнай палітыкі з’яўляецца адным з найважнейшых дасягненняў і галоўных арыенціраў развіцця і ўдасканалення дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь [20].

У кантэксце адпаведнасці міжнародным стандартам разглядалася этнакультурная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь даследчыкам А. Осіпавым [21].

Аналізуючы шляхі дзяржаўнасці Беларусі прафесар А.А. Каваленя падкрэсліў, што “дасягненні Рэспублікі Беларусь абумоўлены, і не ў апошнюю чаргу, навуковымі напрацоўкамі гісторыкаў, якія былі накіраваны на кансалідацыю грамадства, умацаванне міжканфесійнага і міжнацыянальнага ладу”. Даследчык наступным чынам характарызуе нацыянальную палітыку дзяржавы (пачынаючы з 1995 г.): “Найноўшая гісторыя Беларусі пацвердзіла: палітычны курс, абраны ўладай, які накіраваны на стварэнне сацыяльна-арыентаванай рынкавай эканомікі, адпавядае нацыянальным інтарэсам, сутнасці нацыянальнай ідэі, векавым спадзяванням беларусаў, менталітэту народа і прынцыпу гістарычнай пераемнасці” [22].

Сутнасць і кірункі дзяржаўнай палітыкі ў сферы нацыянальна-культурнага і рэлігійнага развіцця былі прадметам аналізу на прадстаўнічых навуковых форумах.

---

[19] Бурая Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) // Весці БДПУ. Серыя 2. 2007. № 1. С. 46–49 ; Безнюк Д.К. Государственно-конфессиональные отношения в Республике Беларусь. Минск, 2006 ; Безнюк Д.К. Этапы формирования национальной политики Республики Беларусь в делах религии // Гуманітарна-эканамічны веснік. 2004. № 3. С. 104–111 ; Ковалёва Н.В. Процесс социокультурного развития национальных меньшинств в Республике Беларусь // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. материалов Междунар. науч. конф. Гродно, 2000. С. 67–69 ; Мартыненка І.Э. Перыядызацыя і перспектывы развіцця ў Рэспубліцы Беларусь заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны (1917–2009 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2010. № 2. С. 28–29.

[20] Рыбаков М.Л. О межнациональных отношениях и государственной политике в Республике Беларусь // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно, 2010. С. 19–22 ; Яго ж. О государственной политике Республики Беларусь в отношениях с соотечественниками за рубежом // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно: ГрГУ, 2010. С. 356–360.

[21] Осипов А. Этнокультурная политика в Беларуси: сопоставление с международным контекстом // Вопросы меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире. Минск, 2012. С. 171–198.

[22] Каваленя А.А. Дзяржаўнасць Беларусі: гісторыя і сучаснасць // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2007. Спецыяльны выпуск. С. 72, 75.

09–10.02.1995 г. у г. Мінску адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя “Грамадзянская і нацыянальная згода – першааснова кансалідацыі беларускага грамадства” [23]. У канферэнцыі прынялі ўдзел вучоныя, парламентарыі (старшыня Вярхоўнага савета М. Грыб), дэпутаты саветаў розных узроўняў, лідары некаторых партый, прадстаўнікі прамысловых прадпрыемстваў, прадпрымальнікі, саветнік Прэзідэнта С. Посахаў і інш. Адна з трох секцый мела назву “Этнакультуралагічныя аспекты кансалідацыі беларускага грамадства”. У рэкамендацыях канферэнцыі адзначалася: “Важнейшай передумовай кансалідацыі беларускага грамадства з’яўляецца фарміраванне цэласнай гістарычнай свядомасці народа, сцвярджэнне нацыянальнай самабытнасці, усведамленне ўласнай гісторыі і дзяржаўнасці; адной з умоў кансалідацыі беларускага грамадства таксама з’яўляецца забеспячэнне свецкага характару беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай культуры”. Удзельнікі канферэнцыі прапанавалі: “арыентаваць грамадства краіны на разуменне беларускай нацыі як сукупнасці ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь незалежна ад іх этнічнага паходжання. У сваіх падыходах да “польскага”, “рускага” ці “літоўскага” пытанняў у цяперашнім і бліжэйшым будучым нацыянальная палітыка ўрада Беларусі павінна зыходзіць з неабходнасці захавання суверэнітэту над тэрыторыямі з насельніцтвам, якое не атаясамлівае сябе з беларусамі, інтэграванне этнічных супольнасцей у грамадскае жыццё беларускай нацыі і дзейнасць беларускай дзяржавы” [24].

21–22.05.1996 г. у Віцебску адбылася Першая Нацыянальная навукова-практычная канферэнцыя “Нацыянальныя меншасці Беларусі: шляхі супрацоўніцтва і згоды”. На ёй была ўхвалена навуковай грамадскасцю “Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі” [25]. Матэрыялы канферэнцыі былі выдадзены ў выглядзе тэматычнага зборніка навуковых прац “Нацыянальныя меншасці Беларусі” ў трох кнігах [26].

У 2006 г. НАНБ правяла Міжнародную навуковую канферэнцыю па навейшай гісторыі “Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность” (29.09.2006 г., Мінск). Пад час яе прагучалі даклады і былі абмеркаваны актуальныя пытанні навейшай гісторыі, дзяржаўнай ідэалогіі, сацыялогіі, прававой, нацыянальнай і рэлігійнай палітыцы,

[23] Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. Материалы междунар. науч. конф. Минск, 9–10 февраля 1995 г. / Серия “Общественно-политические науки”. М., 1995.

[24] Рэкамендацыі канферэнцыі // Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. М., 1995. С. 335–336.

[25] Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі / Навук. рэд. Яцкевіч С.А. Мінск, 1996.

[26] Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб.навук.прац. У 3 кн. / Нав. рэд. С.А. Яцкевіч. Брэст-Мінск-Віцебск, 1996.

развіцця культуры і мастацтва, іншых аспектаў грамадска-палітычнага жыцця [27].

Праблемы сучаснасці, навейшага перыяду гісторыі Беларусі, агульнадзяржаўнага, нацыянальнага маштабу ўзнімаліся на Першым з’ездзе вучоных Рэспублікі Беларусь (г. Мінск, 01–2.11.2007 г.). У выступах М. Мясніковіча, П. Нікіценкі, А. Лукашанца, А. Кавалені адзначаліся задачы і праблемы стабільнага, дынамічнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі Беларусі.[28] У рэзалюцыі з’езда падкрэслена, што для дасягнення высокіх паказчыкаў устойлівага развіцця краіны ў кірунку нацыянальная культуры неабходна навуковае абгрунтаванне шляхоў і механізмаў устойлівага развіцця мовы, літаратуры, гісторыка-культурнай спадчыны і мастацтва ва ўмовах глабалізацыі. [29]

У сваім дакладзе М. Мясніковіч даў адзнаку сучаснасці : “Навуковыя даследаванні, … пераканаўча паказваюць, што вызначаныя ў апошні час у Беларусі сацыяльныя, палітычныя, эканамічныя, сацыякультурныя змены вывелі беларускае грамадства на стадыю ўстойлівага развіцця і набылі незваротны характар” [30]. Ролю гуманітарных навук у фарміраванні беларускай мадэлі развіцця краіны прааналізаваў П. Нікіценка. Падкрэсліў, што асабліва важным для вучоных гуманітарыяў у галіне гісторыі з’яўляецца даследаванне айчыннай гісторыі, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі [31]. Моўныя праблемы жыцця сучаснага беларускага грамадства сталі прадметам аналізу А. Лукашанца. Ён звярнуў увагу на тое, што “Аспект моўнага жыцця нашай краіны, які патрабуе пільнай увагі з боку дзяржавы, – гэта неадпаведнасць заканадаўчага статусу беларускай і рускай моў і іх рэальнага становішча ў грамадстве. Не сакрэт, што сёння мова тытульнай нацыі – беларуская – займае другарадныя пазіцыі ў большасці камунікатыўных сфер. І гэтая праблема таксама набывае ідэалагічнае гучанне. Справа ў тым, што моўнае жыццё – гэта вельмі далікатная сфера чалавечых адносін, таму нацыянальнай большасці звычайна значна цяжэй адстойваць свае абсалютна справядлівыя нацыянальна-моўныя правы ў параўнанні з нацыянальнай меншасцю. Любыя моўныя прэтэнзіі нацыянальнай меншасці, нават празмерныя, на эмацыянальным узроўні ўспрымаюцца як справядлівая барацьба за сваю роўнасць. А патрабаванні

---

[27] Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.-теорет. конф. (Минск, 29 сент. 2006 г.) / Нац. акад. наук Беларуси. Минск, 2006.

[28] Матэрыялы Першага з’езда вучоных Рэспублікі Беларусь // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск.

[29] Рэзалюцыя Першага з’езда вучоных Рэспублікі Беларусь // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск. С. 90.

[30] Мясникович М.В. Наука – прогрессу страны // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск. С. 38.

[31] Никитенко П.Г. Роль гуманитарных наук в формировании белорусской модели социально ориентированного устойчивого инновационного развития страны // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск. С. 48.

нацыянальнай большасці, нават калі яны цалкам апраўданыя, часта ацэньваюцца як нацыяналізм у сваім негатыўным значэнні. Таму і ў гэтай сферы неабходна вялікая тлумачальная работа па фарміраванню культуры моўных паводзін…” [32].

Міжканфесійныя [33] і міжнацыянальныя адносіны, статус і дзейнасць этнічных супольнасцей, у тым ліку і ў навейшай гісторыі Беларусі, разглядаліся на навуковых канферэнцыях як прысвечаных гэтай праблематыцы [34], так і на агульных [35]. На некаторых з іх працавалі асобныя секцыі, якія былі прысвечаны этнакультурнай гісторыі і рэлігіі Беларусі [36]. Шэраг міжнародных навуковых канферэнцый, якія былі прысвечаны

[32] Лукашанец А.А. Моўныя праблемы жыцця сучаснага беларускага грамадства // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск. С. 57.

[33] Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: зб. матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Брэст, 7–8 кастрычніка 2004 г.). Брэст, 2005 ; Религия и общество: актуальные проблемы современного религиоведения : сб. науч. трудов / Под общ. ред. В.В. Старостенко. Могилёв, 2006 ; Религия и общество – 4: сб. науч. трудов / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. Могилёв, 2009; Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20–21 мая 2010 г., Могилев. В 2 ч. Могилев, 2010 ; Религия и общество – 6: актуальные проблемы свободы совести: сб. науч. статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. Могилёв, 2011.

[34] Беларусіка = ALBARUTHENICA. [Кн.] 4: Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі. Мінск, 1995 ; Беларусіка = ALBARUTHENICA. Кн. 3: Нацыянальная і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне. Мінск, 1994 ; Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). Мінск, 2004 ; Грамадзянская супольнасць і праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ў Беларусі. Матэрыялы навукова-практычнага семінара (Мінск, 30–31 мая 1996 года). Брэст, 1996 ; Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). Мінск, 2001 ; Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. Гродно, 2006 ; Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. ст. Гродно, 2010 ; Polsko–Białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe: Materiały XI Międzynarodowej Konferencji Naukowej “Droga ku wzajemności” (Białystok 18–20.VII.2003). Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2004 ; Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Мат. X Міжнар. навук. канф.: Гродна–Мір, 24 кастрычніка 2002 г. Гродна, 2004 ; Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Междунар.науч.конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. Гродно, 2003 ; Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф., Гродно, 7–9 нояб. 2003 г. Барановичи: «Баранов.укруп.тип.», 2004 ; Blisko, a tak daleko Polacy w obwodzie brzeskim na Białorusi. Warszawa, 2004.

[35] Адукацыя і нацыянальна-культурнае адраджэнне: Тэз. навук. дакл. на Міжнар. канф. (25–26 кастр.1994 г., г. Мінск): У 2 ч. Мінск, 1994 ; Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. Материалы междунар. науч. конф. Минск, 9–10 февраля 1995 г. М., 1995 ; Матэрыялы Першага з’езда вучоных Рэспублікі Беларусь // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск ; Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно–гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно–практической конференции, Витебск, 19–20 апреля 2007 г. Витебск, 2007. Ч. I ; Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай навуковой канферэнцыі “Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць” у 2 ч. Магілеў, 2003. Ч. II ; Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навук. артыкулаў. Гродна, 2006 ; Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.-теорет. конф. (Минск, 29 сент. 2006 г.) / Нац. акад. наук Беларуси. Минск, 2006 ; Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27–28 марта 1998 г.). Мінск,1998 ; Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац. Магілёў, 2005.

[36] Напрыклад: Романовские чтения–3 : сб. трудов Международной науч. конференции. Могилёв, 2007 ; Романовские чтения – 5: сб. трудов Международной науч. конференции. Могилёв, 2009.

захаванню этнічнай свядомасці і развіццю польскай супольнасці, праводзіліся грамадскімі аб’яднаннямі “Саюз палякаў на Беларусі” [37] і “Міжнародная Акадэмія па вывучэнню нацыянальных меншасцей”, якая выдавала штоквартальнік “Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей” і тэматычныя зборнікі навуковых прац па нацыянальнай адукацыі [38].

У 2001 і 2003 гадах Інстытутам гісторыі НАНБ былі праведзены навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя пытанням этнічных супольнасцей у Беларусі і беларуска-ўкраінскаму ўзаемадзеянню, матэрыялы якіх унеслі значны ўклад у даследаванне гісторыі і сучаснасці нацыянальных супольнасцей Беларусі [39]. Вылучаецца сваёй змястоўнасцю канферэнцыя “Этнасацыяльныя і канфесійныя працэсы ў сучасным грамадстве”, якая праводзіцца праз год у Гродна і матэрыялы якой друкуюцца асобнымі зборнікамі [40].

Праблемы заканадаўчага забеспячэння правоў нацыянальных супольнасцей і іх рэалізацыі, міжнацыянальных адносін у Беларусі даследавалі Н. Бурая [41], З. Вініцкі [42], Э. Іофе [43], Н. Кавалёва [44], І. Канапацкі [45], Т. Кручкоўскі [46], А. Ліўшыц [47], І. Пушкін [48], А. Рагімаў [49], У. Тугай [50], А. Ціхаміраў [51] і іншыя.

---

[37] Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Междунар.науч.конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. Гродно, 2003 ; Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф., Гродно, 7–9 нояб. 2003 г. Барановичи, 2004.

[38] Нацыянальная адукацыя: тэмат. зб. навук. прац. Кніга IX. Адукацыя дыяспар. Брэст, 1998.

[39] Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар.навук.канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). Мінск, 2004 ; Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). Мінск, 2001 і інш.

[40] Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. Гродно, 2006 ; Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. ст.). Гродно, 2010 і інш.

[41] Бурая Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) // Весці БДПУ. Серыя 2. 2007. № 1. С. 46–49.

[42] Winnicki Z. Status publiczno–prawny polskej mniejszości narodowej w Respublice Białoruś // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф., Гродно, 7–9 нояб. 2003 г. Барановичи, 2004. С. 7–33.

[43] Иоффе Э., Мельцер Б. Джойнт в Беларуси. Минск, 1999 ; Иоффе Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси : Краткий науч.–попул. очерк. Минск, 1996 ; Яго ж. Проблемы реализации прав национальных общностей и законодательство Республики Беларусь // Чалавек. Грамадства. Свет. 2005. № 1. С. 58–62 ; Пытанні ўдасканалення заканадаўства адносна нацыянальных меншасцей у Рэспубліке Беларусь // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн.1. Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. С. 37–39 ; Деятельность Белорусского объединения еврейских организаций и общин по укреплению национального согласия // Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. М., 1995. С. 259–264.

[44] Ковалёва Н.В. Процесс социокультурного развития национальных меньшинств в Республике Беларусь // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. материалов Междунар. науч. конф., Гродно, 9–10 дек. 2000 г. Гродно, 2000. С. 67–69.

[45] Канапацкі І.Б., Смолік А.І. Гісторыя і культура беларускіх татар. Мінск, 2000 ; Канапацкі І. Беларускія татары як складовая частка агульнай супольнасці // Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цівілізацый” (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000г.). Мінск, 2001. С. 203–211 ; Канапацкі, І., Шабановіч, А.–Б. Адраджэнне мусульманскай адукацыі беларускіх татараў // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей. Брэст, 1997.

Пэўны фактычны матэрыял і высновы аб становішчы і дзейнасці нацыянальных супольнасцей у навейшай гісторыі Беларусі ўтрымліваюцца ў публікацыях: М. Касцюка, У. Навіцкага, М. Улейчыка, А. Білык і Ю. Уральскага, У. Рубінчыка, І. Ігнаценкі, У. Курбатава, Г. Калюжнай, Л. Лыча, якія былі змешчаны ў зборніку матэрыялаў навуковай канферэнцыі "Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць" (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) [52], С. Стурэйкі, О. Орды, Н. Бурай, Т. Івановай у матэрыялах канферэнцыі "Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе" (Гродна, 8–9 снежня 2005 г.) [53], У. Розенфельда, І. Папова, М. Гуменюка, Т. Крычынь у матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Шлях да ўзаемнасці = Droga ku

№ 4. С. 6–9 ; Канапацкі І. Татары-мусульмане ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 7. С. 40–46.

[46] Kruczkowski T. Polacy jako mniejszośc narodowa na Białorusi – warunki egzystencji i perspektywy // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф., Гродно, 7–9 нояб. 2003 г. Барановичи, 2004. С. 115–138.

[47] Лившиц А. Развитие белорусского законодательства против антисемитизма, расовой и национальной вражды или дискриминации // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып.1. Мінск, 2002. С. 110–114 ; Яго ж. Статья 16 Конституции Республики Беларусь 1996 года и юридические последствия ее применения в контексте истории // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 2. Мінск, 2003. С. 193–204.

[48] Пушкін І.А. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь ў сферы міжнацыянальных адносін (1991–2010 гг.) // Вестник Могилёвского государственного университета продовольствия. 2011. № 1. С. 99–108 ; Яго ж. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2007 ; Религиозные организации польского населения Восточной Беларуси (беларуско–русское пограничье) // Kultura pogranicza – pogranicze kultur. Siedlce–Pułtusk, 2005. S. 169–172 ; Асноўныя тэндэнцыі ў накірунках дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі (1991–2004 гг.) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. 2006. № 4. С. 15–20 ; Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1991–2005 гадах як фактар фарміравання грамадзянскай супольнасці // Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.–теорет. конф. (Минск, 29 сент. 2006 г.) / Нац. акад. наук Беларуси. Минск: Белорус. наука, 2006. С. 465–471 ; Украінская дыяспара Беларусі ў перыяд Навейшай гісторыі (1919–2009 гг.) // Українознавчий альманах. Випуск 17. Київ, 2014. С. 217–221.

[49] Рагімаў А. Міграцыя народаў Каўказа ў Рэспубліку Беларусь у 1980–1990-я гады // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 11. С. 33–40 ; Яго ж. Конфессионально–демографическая характеристика миграции представителей народов Кавказа в Беларусь в 80–90 гг. ХХ ст. // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: зб. матэрыялаў міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі (Брэст, 7–8 кастрычніка 2004 г.). Брэст, 2005. С. 215–219 ; Миграции и особенности этнокультурной адаптации представителей народов Кавказа в Республике Беларусь (Западный регион) // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навук. артыкулаў. Гродна, 2006. С. 315–320 ; Этнокультурные ориентации и особенности адаптации этнических груп народов Кавказа в Республике Беларусь // Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.-теорет. конф. С. 471–477 ; Социально-демографическая характеристика этнических груп народов Кавказа, проживающих в Республике Беларусь, по материалам переписей населения // Доклады Национальной академии наук Беларуси. 2011. Т. 5. № 4. С. 118–124.

[50] Тугай У.В. Латышы на Беларусі. Мінск, 1999.

[51] Ціхаміраў А. Беларуска–літоўскія ўзаемаадносіны ў 1991–2006 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 7. С. 3–11 ; Яго ж. Беларуска–украінскія адносіны ў 1991–2006 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 2. С. 3–10.

[52] Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. Мінск, 2001.

[53] Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. Гродно, 2006.

wzajemności" (Гродна–Мір, 24 кастрычніка 2002 г.) [54], М. Ткачова, Т. Горбач, І. Багданава ў матэрыялах III Міжнароднага кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый" (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) [55], В. Паўлоўскай, В. Касовіч, Л. Лыча ў зборніку навуковых прац "Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі"[56], польскіх даследчыкаў К. Гжэгжылкі, Б. Стэлінгоўскай, А. Бобрыка, А. Садоўскага, В. Чэлюсцінскага, літоўскага Ю. Шастакоўскага ў зборніку "Blisko, a tak daleko Polacy w obwodzie brzeskim na Białorusi" [57].

Польскія даследчыкі ў выніку аналізу нацыянальнага склада насельніцтва, канфесійнай сітуацыі, заканадаўства Рэспублікі Беларусь (Канстытуцыі, Закона аб нацыянальных меншасцях, Закона аб мовах, Закона аб дзейнасці рэлігійных аб'яднанняў), становішча польскай этнічнай супольнасці ў цэлым пазітыўна ацэньваюць беларускае заканадаўства ў сферы забеспячэння магчымасцей для развіцця нацыянальных супольнасцей (палякаў). У той жа час звяртаюць увагу на некаторыя агаворкі ў законах, накшалт "ці, або, выбар, традыцыйныя" і г.д., якія абмяжоўваюць дзейнасць супольнасцей. Звязваюць патрабаванні ўладаў аб увядзенні беларускай мовы як абавязковай (у касцёлах) з парушэннем правоў чалавека. Некаторыя разглядаюць негатыўна аднолькава як беларусізацыю, так і русіфікацыю. Іншыя, адзначаючы цяжкае становішча ў краіне з беларускай мовай, сцвярджаюць, што гэта прывядзе да русіфікацыі палякаў у Беларусі. Аналізуючы моўную і канфесійную сітуацыю, вынікі рэферэндумаў і праўкі ў існуючыя Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, Законы аб мовах, нацыянальных супольнасцях, якія павялічылі магчымасць абмежаванняў і забарон, робяць выснову аб тым, што беларускае заканадаўства, якое тычыцца нацыянальных супольнасцей, на практыцы ў 1990–1994 гг. было даволі ліберальным, а пазней наступае рэгрэс ("w okresie późniejszym nastąpił regres") [58]. Падобных поглядаў прытрымліваецца гродзенскі даследчык Т. Кручкоўскі. Ён сцвярджае, што палітыка беларускіх улад, якая адпавядала ў 1990-я гг. еўрапейскім стандартам, пасля 1999 г. стала вяртацца да савецкай практыкі [59]. Увядзенне беларускай мовы, як

---

[54] Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Мат. X Міжнар. навук. канф.: Гродна-Мір, 24 кастрычніка 2002 г. Гродна, 2004.

[55] Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цівілізацый" (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.). Мінск, 2001.

[56] Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі. Зб. нав. арт. Мінск, 1997.

[57] Blisko, a tak daleko Polacy w obwodzie brzeskim na Białorusi / Redakcja naukowa Adam Bobryk. Warszawa, 2004.

беларускай самасвядомасці і роля нацыянальнай мовы ў фарміраванні этнічнай самаідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва // Гуманитарный альманах: сборник статей. Могилёв, 2013. С. 88–100 ; Асаблівасці самаідэнтыфікацыі беларускага грамадства // История, философия, политика, право: Научные труды преподавателей гуманитарных дисциплин. Вып. 3. Могилев, 2013. С. 22–26 ; Беларуская мова ў жыцці сучаснага беларуса // Социальное знание и белорусское общество: материалы международной научно-практической конференции, г. Минск, 3–4 декабря 2009 г. Минск, 2009. С. 258–260 ; Пушкін І.А. Дзейнасць інстытутаў дзяржаўнай улады па рэгуляванні міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2013. № 9. С. 32–39 ; Яго ж. Дзяржаўныя органы па рэгуляванню міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова.Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2013. № 2. С. 32–37 ; Заканадаўчыя асновы міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. 2012. № 1. С. 70–79 ; Парламенцкая дзейнасць у Рэспуліцы Беларусь па рэгуляванні міжнацыянальных адносін // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. 2013. № 1. С. 62–69 ; Стварэнне і дзейнасць дзяржаўных органаў па рэгуляванні міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь // Гісторыка–археалагічны зборнік. Мінск, 2013. Выпуск 28. С. 112–115 ; Государственно-правовое регулирование межнациональных отношений в Республике Беларусь // Українознавчий альманах. Випуск 16. Київ, Мелітополь, 2014. С. 291–298 ; Этнокультурное разнообразие Беларуси как объект политики // Беспамятных Н., Василевич А., Осипов А., Прина Ф., Пушкин И. Политика управления этнокультурным разнообразием в Беларуси, Молдове и Украине: между советским наследием и европейскими стандартами. Вильнюс, 2014. С. 74–125 ; Украінская дыяспара Беларусі ў перыяд Навейшай гісторыі (1919–2009 гг.) // Українознавчий альманах. Випуск 17. Київ, 2014. С. 217–221 ; Юдзін В.В. Дзяржаўна-канфесійныя адносіны на беларусі: праблемы і перспектывы // История философия, политика, право: Научные труды преподавателей гуманитарных дисциплин. Вып. 2. Могилев, 2012. С. 161–165 ; Яго ж. Издержки на пути к гражданскому обществу (по результатам опросов молодежи) // Становление гражданского общества: проблемы и перспективы: сборник выступлений. Могилев, 2011. С. 24–28 ; Религиозность населения Могилевской области // Социология религии в обществе Позднего Модерна: материалы Третьей Международной научной конференции. НИУ «БелГУ», 13 сентября 2013 г. Белгород, 2013. С. 343–347.

[105] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі. С. 161.

найважнейшых. У навуковых і грамадска-палітычных колах актыўна абмяркоўваліся стан і шляхі ўдасканалення міжнацыянальных адносін у нашым грамадстве. Аналізаваліся дасягненні і адыходы, прычыны дэфармацый у гэтай сферы грамадскага жыцця і шляхі пераадолення набытых нявырашаных праблем і цяжкасцей, новыя канцэптуальныя ідэі і канкрэтныя меры, якія былі накіраваны на далейшае развіццё і ўмацаванне адзінай шматнацыянальнай дзяржавы” [106].

Падзеі 1990-х гг. пераканаўча засведчылі ў палітычным, эканамічным, ідэйным распадзе СССР доказы няўдачы не толькі яе эканомікі, палітыкі, ідэалогіі, але і доказы паражэння яго нацыянальнай палітыкі. З атрыманнем незалежнасці ў дзяржаўнай палітыцы, у грамадскай, індывідуальнай, а таксама навуковай свядомасці пастсавецкіх супольнасцей пераважыў новы падыход да разумення задач нацыянальнага развіцця. Была ўсвядомлена і сфармулявана іншая мэта: не згуба нацыянальных уласцівасцей у “савецкім народзе”, а іх здабыццё – адраджэнне, сцвярджэнне, развіццё. Суверэнітэт стаў не толькі формай адасаблення нацыянальных эканомік і палітык, але і ўмовай правядзення ўласнай нацыянальнай стратэгіі, якая накіравана на адраджэнне нацыі і нацыянальнай самасвядомасці [107].

У Рэспубліцы Беларусь рабіліся спробы (ідэалагічныя і навуковыя) распрацаваць адзіную стратэгію нацыянальнага развіцця і напоўніць канкрэтным зместам паняцце “нацыянальная ідэя”, якое з’яўляецца неабходным элементам калектыўнай культурнай традыцыі. Гэтае паняцце ў навейшай гісторыі Беларусі было напоўнена і рэлігійным зместам. Галоўнае ў ёй – стабільнасць усяго беларускага грамадства, бо менавіта яна і з’яўляецца залогам паспяховых сацыякультурных трансфармацый.

Суверэнная дзяржава з’яўляецца гарантам існавання культурна-нацыянальнай шматвобразнасці. Працэсы фарміравання нацыі ў гэтым выпадку маюць усе шанцы на завершанасць, а канчатковым вынікам стане фарміраванне палітычнай нацыі, поліэтнічнай, поліканфесіянальнай, аб’яднанай агульнымі каштоўнасцямі палітычнага і прававога парадку.

Ахова і папулярызацыя традыцый усіх нацыянальных супольнасцей і рэлігійных груп, якія пражываюць у краіне, ажыццяўляецца дзяржавай праз рэалізацыю нацыянальна-канфесійнай палітыкі. Яна з’яўляецца сістэмай мер, якія прадпрымаюцца дзяржаўнымі органамі і накіраваны на стварэнне ўмоў для захавання культурнай і рэлігійнай самабытнасці ўсіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у краіне. З іншага боку, такая мэта дасягаецца праз аказанне дзяржавай featurerознабаковай дапамогі ў

[106] Игнатенко И.М. Национальный вопрос и современность // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф. Мінск, 2001. С. 31–32.
[107] Этнонациональное и религиозное самоопределение белорусов / И.Л. Коган, С.В. Моложанова, В.И. Русецкая и др.; Науч. ред. Е.М. Бабосов. Минск, 2002. С. 27–28.

развіцці культуры ўсіх нацыянальных супольнасцей і захаванні рэлігійных традыцый.

Нацыянальна-канфесійная палітыка дзяржавы грунтуецца на наступных кампанентах: 1) нацыянальнае самакіраванне ва ўсіх сферах жыцця нацыі і народнасці: дзяржаўнае ўладкаванне, палітыка-прававыя, сацыяльна-эканамічныя адносіны, духоўнае жыццё і г.д.; 2) раўнапраўе і роўнасць усіх канфесій, нацый і народнасцей, абарона інтарэсаў нацыянальных супольнасцей; 3) фактары і ўмовы для ўсебаковага свабоднага развіцця нацыянальных моў, культуры, традыцый і г.д., якія існуюць (альбо адсутнічаюць) у тых ці іншых рэгіёнах, дзе кампактна пражываюць прадстаўнікі той ці іншай нацыянальнасці; 4) уважлівыя адносіны да гістарычных, культурных, рэлігійных каштоўнасцей і традыцый, вытокаў нацыянальнай самасвядомасці; 5) эканамічны фактар. Без гэтага немагчыма гарманізіраваць міжнацыянальныя адносіны.

Асноўная мэта нацыянальна-канфесійнай палітыкі – забеспячэнне ў грамадстве стабільных і бесканфліктных адносін паміж прадстаўнікамі рознай этнічнай прыналежнасці і рэлігійных канфесій, а таксама канструктыўнага ўзаемадзеяння паміж дзяржаўнымі структурамі і нацыянальнымі супольнасцямі.

## 1.1 Асновы, прынцыпы і перыядызацыя нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь

У пачатку 1990-х гг. у грамадстве ішоў інтэнсіўны працэс змены шкалы каштоўнасцей. На карце Еўропы з’явілася незалежная Рэспубліка Беларусь, перад якой паўсталі праблемы фарміравання грамадзянскіх пачуццяў прыналежнасці да Рэспублікі Беларусь – краіны са шматвякавой гістарычнай і культурнай спадчынай, у станаўленні якой адметны ўклад унеслі ўсе народы Беларусі. Іншаэтнічныя групы складалі значную частку насельніцтва рэспублікі. Пры гэтым назіралася павялічэнне іх долі ў этнічнай структуры. Ва ўмовах актывізацыі грамадскага жыцця назіраўся, асабліва ў першай палове 1990-х гг., рост запатрабаванняў да развіцця культуры прадстаўнікамі нацыянальных супольнасцей, якія пражывалі ў рэспубліцы.

Фарміраванне дзяржаўнай нацыянальна-канфесійнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь пачалося з моманту атрымання краінай суверэнітэту. Яе асноўнай мэтай было стварэнне ўмоў для культурнага развіцця грамадзян любой этнічнай і канфесійнай прыналежнасці. Нацыянальная палітыка была накіравана на захаванне традыцыйнай культуры беларусаў і развіццё культур нацыянальных супольнасцей, якія пражывалі ў краіне. Такое размежаванне было абумоўлена тым, што для беларусаў як тытульнага этнасу рэспублікі было важным зберажэнне іх этнічнай мастацкай культуры, паколькі функцыянаванне беларускай мовы, развіццё

прафесійнай мастацкай культуры з’яўляюцца прэрагатывамі моўнай і культурнай палітыкі дзяржавы.

З 1991 г. захаваннем традыцыйнай культуры беларусаў пераважна займаліся ўстановы, падпарадкаваныя Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь. Асноўнымі кірункамі іх дзейнасці ў гэтай вобласці былі: збор і захоўванне аўтэнтычнага фальклору, вырабаў народных рамёстваў; падтрымка праяў традыцыйнай культуры ў індывідуальнай і калектыўнай творчасці людзей; стымуляванне і заахвочванне ўдзельнікаў культурнага працэсу; папулярызацыя традыцыйнай культуры праз культурна-масавыя мерапрыемствы і сродкі масавай інфармацыі [108]. Рэалізацыя дадзеных кірункаў ажыццяўлялася як на ўзроўні Міністэрства праз арганізацыю акцый рэспубліканскага маштабу, так і ва ўстановах культуры ў рэгіёнах.

Пытаннямі захавання адукацыі на беларускай мове і пашырэння яе ўжытку займаліся пераважна структуры Міністэрства адукацыі і шэраг грамадскіх аб’яднанняў (ГА “Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны”, “Таварыства беларускай школы” і інш.).

Нацыянальную палітыку ў навейшай гісторыі Беларусі можна падзяліць на тры блокі: 1) беларускае нацыянальнае адраджэнне, 2) пастаянная ўвага да праблем усіх нацыянальных супольнасцей, 3) перавод у ранг дзяржаўнай палітыкі адносіны да беларускай дыяспары.

Рэспубліка Беларусь з’яўляецца ўнітарнай дзяржавай, у якой пражываюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. У Канстытуцыі замацаваны тэрмін “нацыянальныя супольнасці”. Безумоўна, пад гэтым паняццем можна разумець усе нацыянальнасці, якія пражываюць на тэрыторыі краіны, у тым ліку і беларусаў. У Рэспубліцы Беларусь словазлучэнне “нацыянальныя меншасці” выкарыстоўваецца пры падпісанні міжнародных дамоў. У адпаведнасці з артыкулам 17 Канстытуцыі “дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца беларуская і руская мовы” [109].

Усяго ў Рэспубліцы Беларусь пражываюць каля 9,5 млн чалавек. Згодна перапісу насельніцтва 2009 г. 83,7 % жыхароў краіны – беларусы, 8,3 % – рускія, 3,1 % – палякі, 1,7 % – украінцы, 0,1 % – яўрэі, 3,1 % – іншыя (з іх 2,4 % не ўказалі нацыянальнасць).

---

[108] Макрушич Е.Н. Роль государства в сохранении этнокультурной идентичности в условиях глобализации // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе . Гродно, 2010. С. 132–135.

[109] Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г. Минск, 2008.

Табліца 1 – Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі (па матэрыялах перапісаў)[110]

| Нацыянальнасці | Колькасць асоб дадзенай нацыянальнасці тыс. чал. / год | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1926* | 1939* | 1959 | 1970 | 1979 | 1989 | 1999 | 2009 |
| Усё насельніцтва | 4983 | 5571,2 | 8055,7 | 9002,3 | 9532,5 | 10151,8 | 10045,2 | 9503,8 |
| Беларусы | 4017 | 4615,5 | 6532,0 | 7289,6 | 7568,0 | 7904,6 | 8159,1 | 7957,3 |
| Рускія | 384 | 366,9 | 660,1 | 938,2 | 1134,1 | 1342,1 | 1141,7 | 785,1 |
| Палякі | 98 | 58,4 | 538,9 | 382,6 | 403,2 | 417,7 | 395,7 | 295,5 |
| Украінцы | 35 | 104,2 | 133,1 | 190,8 | 231,0 | 291,0 | 237,0 | 158,7 |
| Яўрэі | 407 | 375,1 | 150,1 | 148,0 | 135,5 | 112,0 | 28,0 | 12,9 |
| Іншыя нацыянальнасці | 42 | 51,1 | 41,5 | 53,1 | 60,7 | 84,4 | 80,0 | 295,2 |
| У працэнтах | | | | | | | | |
| Усё насельніцтва | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |
| Беларусы | 80,6 | 82,9 | 81,1 | 81,0 | 79,4 | 77,9 | 81,2 | 83,7 |
| Рускія | 7,7 | 6,6 | 8,2 | 10,4 | 11,9 | 13,2 | 11,4 | 8,3 |
| Палякі | 2,0 | 1,0 | 6,7 | 4,3 | 4,2 | 4,1 | 3,9 | 3,1 |
| Украінцы | 0,6 | 1,9 | 1,7 | 2,1 | 2,4 | 2,9 | 2,4 | 1,7 |
| Яўрэі | 8,2 | 6,7 | 1,9 | 1,6 | 1,4 | 1,1 | 0,3 | 0,1 |
| Іншыя нацыянальнасці | 0,9 | 0,9 | 0,4 | 0,6 | 0,7 | 0,8 | 0,8 | 3,1** |

Калі параўноўваць колькасць прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей з папярэднімі перапісамі 1989, 1999 гг. (гл. табл. 1), то павялічылася колькасць армян, азербайджанцаў, арабаў, грузін, асецін, таджыкаў, туркмен; паменшылася колькасць амаль усіх іншых нацыянальнасцей (яўрэяў, рускіх, украінцаў, палякаў, татар, літоўцаў, латышоў, эстонцаў і інш.). Значна скарацілася колькасць яўрэяў , што звязана з ад’ездам апошніх за межы Беларусі. Працэнт рускіх стаў адпавядаць 1959 г., калі пашырыўся працэс русіфікацыі, які быў выкліканы пабудовай новай супольнасці людзей – савецкі народ. У 2009 г. амаль у 4 разы павялічылася колькасць тых нацыянальнасцей, якія з’явіліся ў Беларусі ў пасляваенны час і ў перыяд існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь.

У выніку актыўнага міграцыйнага абмену ў пачатку 1990-х гадоў, калі беларусы вярталіся на этнічную радзіму, а асобы іншых нацыянальнасцей актыўна выязджалі ў блізкае і далёкае замежжа, і кансалідацыйных працэсаў, якія адбываліся ў часы ўмацавання

[110] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. Мінск, 2001. С. 291 ; Пералік колькасці згодна перапісаў 1959, 1970, 1979 г. // ДАБр. Фонд 254. Воп. 1. Спр. 7833 ; Численность населения Республики Беларусь: данные переписи 2009 г. // Всебелорусское народное собрание – опыт демократии: материалы по теме единого дня информирования. Могилев, 2010. С. 20–21.

* Без заходніх абласцей.

** Армян – 0,1 % (8512 чал.), татараў – 0,1 % (7316), цыганаў – 0,1 % (7079), азербайджанцаў – 0,1 % (5567), літоўцаў – 0,1 % (5087).

незалежнасці Рэспублікі Беларусь, доля беларусаў (у параўнанні з перапісам 1979, 1989, 1999 гг.) стабільна павялічвалася і ў 2009 г. перавысіла даваенны ўзровень 1939 г. (гл. табл. 1, 2).

Табліца 2 – Этнічная структура насельніцтва Беларусі ў працэнтных суадносінах згодна з пасляваеннымі перапісамі насельніцтва [111].

| Нацыянальнасць | 1959 г. | 1970 г. | 1979 г. | 1989 г. | 1999 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 81,1 | 81,0 | 79,4 | 77,9 | 81,2 | 83,7 |
| Рускія | 8,2 | 10,4 | 11,9 | 13,2 | 11,4 | 8,3 |
| Палякі | 6,7 | 4,3 | 4,2 | 4,1 | 3,9 | 3,1 |
| Украінцы | 1,7 | 2,1 | 2,4 | 2,9 | 2,4 | 1,7 |
| Яўрэі | 1,9 | 1,6 | 1,4 | 1,1 | 0,3 | 0,1 |
| Армяне | – | 0,03 | 0,03 | 0,04 | 0,1 | 0,1 |
| Татары | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 |
| Цыганы | – | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 |
| Літоўцы | – | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 |
| Азербайджанцы | 0,0 | 0,01 | 0,03 | 0,04 | 0,1 | 0,1 |
| Немцы | – | 0,02 | 0,03 | 0,03 | 0,04 | – |
| Малдаване | – | 0,02 | 0,03 | 0,04 | 0,04 | – |
| Грузіны | – | 0,01 | 0,02 | 0,02 | 0,03 | – |
| Чувашы | – | 0,02 | 0,03 | 0,03 | 0,02 | – |
| Латышы | – | 0,03 | 0,03 | 0,02 | 0,02 | – |
| Узбекі | – | 0,02 | 0,03 | 0,03 | 0,01 | – |
| Казахі | – | 0,01 | 0,02 | 0,02 | 0,1 | – |
| Башкіры | – | 0,01 | 0,01 | 0,01 | 0,0 | – |
| Іншыя народы | 0,3 | 0,1 | 0,1 | 0,2 | 0,1 | 0,2 [112] |

Працэсы ўрбанізацыі закранулі ўсе без выключэння нацыянальнасці, якія жылі ў рэспубліцы. Найбольш хутка расла ў гарадах колькасць беларусаў. Паменшылася вага рускіх, украінцаў, яўрэяў. Палякі з чацвёртага месца ў інфаструктуры гарадоў Беларусі перамясціліся на трэццяе (3,1 %) [113].

У разглядаемы перыяд прадстаўнікі большасці нацыянальных супольнасцей пражывалі па ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дысперсна, у асноўным у гарадскіх пасёлках, і займалі даволі высокія статусныя пазіцыі (за выключэннем некаторых, напрыклад, цыгане) у сацыяльнай структуры, эканоміцы, палітыцы і культуры беларускага грамадства. Гэта тлумачыцца тым, што нацыянальныя групы актыўна

[111] Пушкін І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.) : манаграфія. Мінск, 2010. С. 306 ; Гембіцкая М. Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 11. С. 38.
[112] Па перапісу 2009 г. у Беларусі 2,4% грамадзян не ўказалі нацыянальнасць.
[113] Каспяровіч Г.І., Бялкоўская Н.Г. Асноўныя тэндэнцыі і асаблівасці дэмаграфічных працэсаў у гарадах Беларусі // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2000. № 2. С. 77–78.

папаўняліся яшчэ ў перыяд існавання СССР за кошт высокаадукаваных мігрантаў з іншых саюзных рэспублік.

Характарызуючы сітуацыю, звязаную са становішчам нацыянальных супольнасцей у Рэспубліцы Беларусь, неабходна адзначыць яе стабільнасць і ўнікальнасць, што выражалася ў адсутнасці якіх-небудзь сутычак і канфліктаў на этнічнай, расавай, лінгвістычнай і канфесіянальнай аснове. Такое становішча тлумачыцца менталітэтам беларускага народа, гістарычнымі традыцыямі мірнага міжэтнічнага супрацоўніцтва, даўнімі і трывалымі сувязямі між этнічнымі групамі, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі. А таксама ў пэўнай ступені і адносна невялікай колькасцю прадстаўнікоў не славянскага насельніцтва, аўтарытарнай сістэмай кіравання і кантролю.

Шматлікія навуковыя даследаванні, праведзеныя на працягу апошняга дзесяцігоддзя, пастаянны сацыялагічны маніторынг, здзейснены органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь, сведчаць, што пераважная большасць беларускіх грамадзян не ўлічвала ў сваёй паўсядзённай жыццядзейнасці нацыянальныя фактары. Значная іх частка ўвогуле не цікавілася такімі пытаннямі, не надавала ім ніякага значэння. Для большасці беларусаў і прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей нацыянальная прыналежнасць не мела значэння пры выбары сяброў і знаёмых, жонкі ці мужа, на працы і ў іншых выпадках паўсядзённага ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі, звыш 2/3 нашых грамадзян мелі сваякоў іншай нацыянальнасці. Тое ж назіралася пры выяўленні палітычных арыентацый: пераважная частка нашых грамадзян не цікавілася нацыянальнай прыналежнасцю прадстаўнікоў органаў улады, кандыдатаў у дэпутаты, і для іх яна не мела значэння.

Афіцыйны погляд на міжнацыянальныя адносіны ў Беларусі выказаў у 2004 г. тагачасны старшыня Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей С. Буко. На яго думку стабільнасць у міжнацыянальных адносінах, якая праяўлялася ў адсутнасці якіх-небудзь сутыкненняў і канфліктаў на этнічнай і канфесійнай аснове, тлумачылася дэмакратычнай дзяржаўнай нацыянальнай палітыкай, менталітэтам грамадзян нашай краіны, гістарычнымі традыцыямі мірнага суіснавання, трывалымі сувязямі паміж этнічнымі групамі, якія жылі на тэрыторыі Беларусі. С. Буко лічыў, што асноўным фактарам, які папярэджваў негатыўныя працэсы ў нацыянальнай сферы, была нацыянальная палітыка Беларусі, заснаваная на “разуменні беларускай нацыі перад усім як суграмадзянства, а не як этнічнай супольнасці” [114].

У 2005 г. Аналітычным цэнтрам EcooM (г. Мінск) было праведзена сацыялагічнае даследаванне па вывучэнні сучаснага стану этнаканфесіянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь. Пад час яго былі

[114] Беларусь – наш общий дом // Вечерний Могилев. 2004. 22 сент. С. 3.

апытаны 1410 рэспандэнтаў, рэпрэзентатыўнасць склала 97 % [115]. Вынікі даследавання засведчылі, што, нягледзячы на складанасці пераходнага перыяду, адносіны паміж этнасамі не трансфармаваліся ў канфліктныя. У цэлым этнаканфесіянальная сітуацыя ў Беларусі стабільная, аднак пэўныя праблемы ў сферы міжэтнічных адносін існавалі. Маглі справакаваць напружанасць у Беларусі наступныя прычыны (па ўбываючай): 1) праблема трафіка нелегальнай працоўнай сілы і наркотыкаў; 2) крымінальныя тэмы, дзе ўказваецца нацыянальнасць злачынцаў; 3) прадастаўленне вялікіх правоў і магчымасцей асобнай нацыі; 4) тэрытарыяльныя супярэчнасці; 5) этнаканфесіянальныя праблемы; 6) дыскрымінацыя нацыянальных супольнасцей супрацоўнікамі дзяржаўных службаў. Сярод веруючых праваслаўнымі сябе палічылі 79,4 %, каталікамі – 12,6 %, пратэстантамі – 1,9 % рэспандэнтаў. Прасочвалася рэлігійна-нацыянальная ідэнтыфікацыя. Сярод беларусаў і рускіх асноўная маса адносіла сябе да праваслаўных (84,7 % і 85,4 % адпаведна), то сярод палякаў праваслаўнымі лічылі сябе 25 %. У той жа час да каталікоў адносілі сябе 69,4 % палякаў, 9,6 % беларусаў і 6,8 % рускіх [116].

Варта падкрэсліць, што існуюць розныя меркаванні па перыядызацыі нацыянальна-канфесійнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у 1991–2010 гг.

Даследчыца Н. Кавалёва падзяляе нацыянальную палітыку Беларусі на 3 этапы : 1) 1991–1994 гг. – запаўненне новымі ідэямі этнічнага зместу, развіццё цікавасці да палярных культур і рэлігій; 2) 1994–1997 гг. – стварэнне інстытуцыйных магчымасцей нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных супольнасцей; 3) 1997–2000-я гг. – стабілізацыя як нацыянальных супольнасцей, так і міжэтнічных адносін, фарміраванне нацыянальнай ідэі. Паводле гэтай перыядызацыі асноўная прававая нацыянальная база была створана за перыяд 1994–1997 гг. [117] У адрозенні ад яе Д. Блізнюк адзначае, што перыяд 1995–2000 гг. характарызуецца ўдасканаленнем нацыянальна-канфесійнай палітыкі, унясеннем змяненняў у існуючую заканадаўчую базу з мэтай правядзення і ўкаранення ў жыццё захадаў па рэгуляванні міжэтнічных і міжканфесіянальных зносін у сувязі з прыняццем Прэзідэнтам Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь [118]. І. Мартыненка, аналізуючы зананадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, адзначыў, што 2001–2009 гг. – найбольш прадукцыйны перыяд з пункту гледжання прыняцця новых прававых актаў. Даследчыца Н. Бурая лічыць, што выпрацоўка нацыянальнай ідэі

---

[115] Мусіенка С. Этнаканфесіянальнае асяроддзе Рэспублікі Беларусь: стан і тэндэнцыі развіцця // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 9. С. 34.

[116] Мусіенка С. Этнаканфесіянальнае асяроддзе Рэспублікі Беларусь: стан і тэндэнцыі развіцця. С. 34–36.

[117] Ковалёва Н.В. Процесс социокультурного развития национальных меньшинств в Республике Беларусь // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. Гродно, 2000. С. 67–69.

[118] Безнюк Д. К. Этапы формирования национальной политики Республики Беларусь в делах религии // Гуманіт. – эканам. веснік. 2004. № 3. С. 109.

стала адным з прыярытэтаў (пасля эканомікі) дзяржавы ў перыяд 1992–1994 гг. У гэты час галоўнай задачай для дзяржавы было фарміраванне нацыянальнай палітыкі з улікам асаблівасцей краю, гісторыі і кансалідацыйных тэндэнцый беларускага народа, што немагчыма без прававой базы, якая б дазволіла будаваць разгалінаваную сістэму па кіраванні і каардынацыі дзейнасці ўсіх арганізацый нацыянальнага і канфесіянальнага толку. Стваралася заканадаўства па абароне правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей. Закон “Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацый” заклаў падмурак для вырашэння ўсіх канфліктаў і спрэчак. З абраннем першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь наступіў перыяд паглыблення напрамку супрацоўніцтва з рознымі этнасамі і пашырэння легалізацыі розных канфесій. На думку даследчыцы Н. Бурай, пасля 2001 г. “стратэгіі далейшага развіцця (Беларусі) прыярытэтамі служылі: дзяржаўны суверэнітэт разам з забеспячэннем рэальных правоў і свабод грамадзян і прынцыпам верхавенства права. Гэты пастулат рэалізаваўся праз перагляд асноўных заканадаўчых актаў у забеспячэнні правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей. За перыяд 2001–2003 гг. былі перагледжаны асноўныя законы, прыняты іх новыя рэдакцыі ці ратыфікаваны новыя. У пытаннях веравызнання ў Рэспубліцы Беларусь створаны ўмовы для развіцця розных канфесій… дзяржава на самым высокім узроўні клапоціцца аб захаванні канфесіянальнага і міжнацыянальнага міру ў Рэспубліцы Беларусь” [119]. А. Макрушыч вылучае тры перыяды ў правядзенні этнакультурнай палітыкі ў Беларусі: 1) 1991–1994 гг.; 2) 1995–1998 гг., калі “этнакультурная палітыка ў стаўленні да нацыянальных меншасцей” з’яўлялася прыярытэтным кірункам нацыянальнай палітыкі Беларусі [120]; 3) этнакультурная палітыка ў пач. XXI ст. Яна сцвярджае, што пасля 2000 г. пры рэалізацыі нацыянальнай палітыкі пашыралася выкарыстоўванне метаду рэгулявання этнакультурнай сферы, які даказаў сваю эфектыўнасць у апошнія гады XX ст. [121] У сваёй манаграфіі мы сфармулявалі свае асаблівасці перыядызацыі нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

У 1996 г. Прэзідэнт А.Р. Лукашэнка ў сваім пасланні ўдзельнікам кангрэса дзеячоў культуры краін СНД адзначаў, што стварэнне грамадства раўнапраўных і свабодных культур павінна будавацца на ідэі іх глыбіннага ўзаемапранікнення. Ён таксама падкрэсліў, што ўзаемасувязь культур магчыма пры наладжаных добрасуседскіх адносінах з краінамі (у першую

[119] Бурая Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.). С. 47–48.

[120] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. 2008. № 1. С. 54.

[121] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в Республике Беларусь в начале XXI века // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. 2009. № 2. С. 22.

чаргу, з Расіяй, Польшчай, Украінай і краінамі Балтыі). Беларускі народ выступае як кансалідатар культур іншых народаў [122]. У 1997 г. у сваім пасланні Нацыянальнаму сходу, кажучы наконт далейшага развіцця дзяржавы, Прэзідэнт зазначыў, што "абноўленая Кантытуцыя абагульніла лепшы сусветны вопыт канстытуцыйнага будаўніцтва. Яе прававы стрыжань у абароне правоў і свабод асобы, замацаванне гарантый і механізмаў іх рэалізацыі. Праз прызму заканадаўства на бліжэйшы час вызначаны кірунак на прыняцце законаў, якія павінны не толькі рэгуляваць эканамічныя адносіны, але і забеспячэнне ўмовы для рэалізацыі на практыцы правоў і свабод чалавека, кожнага грамадзяніна"[123].

У 1999 г. у пасланні Нацыянальнаму сходу Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што "развіццё краіны павінна быць 1) сацыяльна арыентаваным, накіраваным на аздараўленне нацыі, фарміраванне ўсебакова развітога і сацыяльна актыўнага члена новага грамадства; 2) навукаёмкім; 3) рэсурсазберагальным; 4) эколагаабарончым. <...> Дзяржаўнае рэгуляванне выступае як фактар функцыянальнага палітычнага кіравання, гаранта свабод асобы; прыярытэт дзяржаўнай ідэалогіі, якая павінна выканаць аб'яднальную функцыю не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і ў СНД і іншых краінах. У межах унутранага нацыянальна-культурнага развіцця меншасцей неабходна пераадоленне настрояў некаторых грамадзян, накіраваных супраць некарэнных жыхароў краіны і бачанне беларускім народам свайго нацыянальнага развіцця ў цесным супрацоўніцтве з рускім і ўкраінскім народамі, у цесным супрацоўніцтве з іншымі народамі" [124]. У 2001 г., падводзячы некаторыя вынікі дзяржаўнай палітыкі за пяць гадоў, у сваім пасланні Нацыянальнаму сходу А.Р. Лукашэнка адзначыў, што "захаваны і атрымліваюць далейшае развіццё лепшыя традыцыі беларускага народа пры глыбокім разуменні і павагі да інтарэсаў іншых народаў, імкненні жыць у міры і згодзе з людзьмі ўсёй планеты, ва ўмовах ідэалагічнага забеспячэння рашэння задач устойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь" [125]. 17.07.2001 г. была прынята Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь [126]. У ёй прадугледжаны меры па захаванні этнічнай, культурнай і моўнай самабытнасці грамадзян Беларусі ўсіх нацыянальнасцей, забеспячэнні навуковага маніторынгу этнаканфесіянальнай сферы

[122] Лукашенко А.Г. Послание Президента А.Г.Лукашенко участникам I Конгресса деятелей культуры стран СНГ // Рэспубліка. 1996. 31 мая. С. 3.
[123] Лукашэнка А.Р. Мы ўсе ў адказе за нашу Беларусь. Штогадовае Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь // Звязда. 1997. 12 крас. С. 6.
[124] Лукашенко А. Г. Послание Президента Национальному собранию. Речь от 7 апреля 1999 г. // Советская Белоруссия. 1999. 8 апр. С. 3.
[125] Лукашенко А.Г. Послание Президента Республики Беларусь Национальному Собранию Республики Беларусь // Информационный бюллетень Администрации Президента Республики Беларусь. 2001. № 4. С. 4.
[126] Об утверждении Концепции национальной безопасности Республики Беларусь : Указ Президента Республики Беларусь от 17.07.2001 г. № 390 // НРПА. 2001. № 69. 1/2852

Камітэтам нацыянальнай бяспекі і фарміраванні ідэалогіі беларускай дзяржавы.

На пачатку XXI ст. кіраўніцтвам краіны былі вызначаны асноўныя прынцыпы рэалізацыі дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі. У 2006 г. Прэзідэнт А.Р. Лукашэнка, падводзячы вынікі развіцця краіны, падкрэсліў, што ў Беларусі маюцца традыцыі бесканфліктнага існавання прадстаўнікоў розных этнасаў, якія падмацоўваюцца прадуманай дзяржаўнай палітыкай, дзяржаваю створаны спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця духоўных традыцый усіх людзей, што жывуць у Беларусі [127]. Падобныя выказванні неаднаразова гучалі ад кіраўніцтва Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Яно адзначала, што беларускае грамадства захавала інтэрнацыянальны характар, а палітыка беларускай дзяржавы накіравана на ўмацаванне дадзенай сітуацыі як гарантыі сацыяльнай стабільнасці[128].

Можна цалкам пагадзіцца з даследчыцай А. Макрушыч, што пасля 2000 г. пры рэалізацыі нацыянальнай палітыкі пашыралася выкарыстоўванне метаду рэгулявання этнакультурнай сферы [129]. Праграмны метад быў выкарыстаны пры распрацоўцы прыярытэтаў і кірункаў дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі [130].

Па ініцыятыве Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей сумесна з Нацыянальнай камісіяй па справах ЮНЭСКА ў Рэспубліцы Беларусь 21 мая адзначаўся Сусветны дзень культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця, 16 лістапада – Дзень талерантнасці [131].

### 1.2 Заканадаўчае забеспячэнне нацыянальна-дзяржаўных адносін у Рэспубліцы Беларусь

Прававую базу Рэспублікі Беларусь у сферы нацыянальна-дзяржаўных і міжнацыянальных адносін, барацьбы з распальваннем нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай нянавісці, якая ўяўляе з сябе падштурхоўванне да дыскрымінацыі, варожасці і гвалту, – складалі: Канстытуцыя, Законы “Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях”, “Аб нацыянальных меншасцях Рэспублікі Беларусь”, “Аб палітычных партыях”, “Аб грамадскіх аб’яднаннях”, “Аб друку і іншых СМІ”, Крымінальны кодэкс, артыкул кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях і іншыя законы. Заканадаўства

[127] Государство для народа : Доклад Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко // Государство для народа: документы и материалы Третьего Всебелорусского собрания. Минск, 2006. С. 56.

[128] Буко С. Республика Беларусь – страна межнацинального мира и согласия // Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік. С. 3–5.

[129] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в Республике Беларусь в начале XXI века. 2009. № 2. С. 22.

[130] Дзяржаўная праграма “Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.”. Мінск, 2002 ; Галіновая праграма “Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.”. Мінск, 2002 ; Рэспубліканская праграма па захаванню і падтрымцы народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь, зацверджаная нам. старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 28.12.2000 г. № 05/239 // Рэгіянальныя мэтавыя праграмы: некаторыя пытанні тэорыі і практыкі: мат. да творчага семінара. Мінск, 2001. С. 22–53.

[131] Выпіска з пратакола // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 962. Арк. 11–12.

Беларусі грунтуецца на міжнародных нарматыўных актах: "Дэкларацыя правоў асоб, якія належаць да нацыянальных ці этнічных, рэлігійных і моўных меншасцей", ухвалена ААН у 1992 г.; "Канвенцыя ў абарону нацыянальных меншасцей", прынята Саветам Еўропы ў 1995 г.

У справе забеспячэння праў нацыянальных супольнасцей Беларусь заключыла міжнародныя пагадненні з шэрагам краін. Адным з першых было пагадненне з Польшчай 23.06.1992 г.[132] У наступныя гады з Літвой, Украінай, Расіяй і іншымі краінамі.

Першыя падпісаныя Рэспублікай Беларусь у якасці суверэннай дзяржавы міжнародныя акты: Дэкларацыя аб добрасуседстве, узаемаразуменні і супрацоўніцтве з Рэспублікай Польшча і Дэкларацыя аб прынцыпах добрасуседскіх адносін з Літоўскай Рэспублікай – прызнавалі этнічную, культурную і моўную самабытнасць нацыянальных супольнасцей (беларускай у суседніх краінах і польскай, літоўскай у Беларусі), а таксама іх права свабодна выяўляць гэтую самабытнасць без якой-небудзь дыскрымінацыі і ва ўмовах поўнай роўнасці перад законам [133].

Міністэрства замежных спраў, паводле даручэнняў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, у 1993 г. рыхтавала міжурадавае пагадненне паміж Беларуссю і Польшчай аб парытэтным утрыманні маёмасці Беларускага гісторыка-культурнага таварыства ў Польшчы і Саюза палякаў на Беларусі. Пасля перамоў з кіраўніцтвам Беларускіх арганізацый у Польшчы і польскіх арганізацый у Беларусі на разгляд Савета Міністраў быў прадстаўлены сфарміраваны спіс патрэб беларускай нацыянальнай супольнасці ў Польшчы і польскай нацыянальнай супольнасці ў Беларусі. У прыватнасці адзначаліся наступныя патрэбы польскай супольнасці: 1) пераўтварыць Дом культуры ў г.Гродна па вул. Дзяржынскага, 32 у Цэнтр польскай культуры і забяспечыць яго ўтрыманне; 2) увесці штатныя адзінкі: намесніка старшыні СПБ па культуры, 2 бібліятэкараў, бухгалтара, 2 прыбіральшчыц, 3 вартаўнікоў, 1 вадзіцеля аўтобуса, 2 работнікаў аддзела культуры і 2 работнікаў аддзела адукацыі, фінансаваць работу кіраўнікоў ансамблей: "Эхо" г. Гродна, "Звонечкі", "Гродненскі словікі", "Лехіці" (4 стаўкі); 3) у кожным раённым цэнтры (дзе былі філіялы СПБ) мець па аднаму штатнаму работніку, які будзе займацца пытаннямі культуры і адукацыі; 4) фінансаванне выдання газеты "Głos znad Niemna"; 5) пачаць будаўніцтва новага Цэнтра польскай культуры; 6) пачаць будаўніцтва польскай школы; 7) стварыць польскую рэдакцыю на Беларускім радыё і тэлебачанні [134].

---

[132] Winnicki Z. Status publiczno–prawny polskej mniejszości narodowej w Respublice Białoruś // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф. Барановичи, 2004. С. 20 ; Kruczkowski T. Polacy jako mniejszośc narodowa na Białorusi – warunki egzystencji i perspektywy // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. С. 130.

[133] Нарысы гісторыі Беларусі.Ч. 2. С. 505–506.

[134] Прапановы Савету Міністраў // ДАГр. Фонд 1171. Воп. 5. Спр. 2970. Арк.186, 189.

Гэтыя прапановы адразу выклікалі неадназначную, нават можна казаць, негатыўную рэакцыю з боку Гродзенскіх уладаў. Аб гэтым дазваляе казаць ліст-адказ за № 01–9/161 ад 19.05.93 г. Гродзенскага аблвыканкама ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. У ім, у прыватнасці адзначана, што п.1. немагчыма выканаць, т.я. ГДК адзіная дзяржаўная клубная ўстанова ў горадзе, у якой працуюць 12 мастацкіх калектываў, студыі, гісторыка-культурнае аб’яднанне “Паходня”, яўрэйскае культурнае аб’яднанне імя Л.Найдуса і інш. Пакідаючы ў баку пытанні аб фінансаванні штатных адзінак, у адказе ўзгадваецца ансамбль “Лехіці”, якому было прысвоена званне “народны”. Упраўленне культуры адразу прапанавала СПБ (каб увесці 2 штатныя адзінкі) падпарадкаваць ансамбль дзяржаўнай установе культуры. Безумоўна, гэтая прапанова для СПБ была непрымальнай. Пра адкрыццё польскай школы гаварылася, што гэта магчыма (адна з школ будзе вызначана як польская), калі будзе створана дастаткова класаў. Адзначалася, што кіраўніцтва СПБ звярталася да гарвыканкама з просьбай аб выдзяленні двух зямельных участкаў, каб распачаць будаўніцтва дзвюх малакамплектных школ за кошт СПБ. Аблвыканкам паведамляў, што вядзецца пошук месц. Да таго ж 2 участкі былі ўжо выдзелены: на адным быў пабудаваны дом для праўлення СПБ, на другім планавалася ўзвесці цэнтр польскай культуры [135].

Асноўным дакументам, рэгулюючым раўнапраўнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай, у тым ліку і ў сферы культуры, стаў Дагавор паміж БССР і УССР, падпісаны 29.12.1990 г. (уступіў у дзеянне 31.08.1991 г.). На яго аснове 17.12.1992 г. быў падпісаны міжурадавы Дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій, а 10.02.1993 г. – Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры паміж міністэрствамі культуры. Гэтыя нарматыўныя акты вызначалі прававое поле, дэталізавалі формы культурнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, гарантавалі стварэнне найбольш спрыяльных умоў для задавальнення патрэб нацыянальных супольнасцей [136].

17.07.1995 г. Беларусь і Украіна падпісалі Дагавор аб сяброўстве, добрасуседстве і супрацоўніцтве. Ён замяніў папярэдні базісны дагавор ад 1990 г. На наступных этапах узаемаадносін нарматыўна-прававая база культурных, навуковых, адукацыйных сувязей папаўняецца шэрагам пагадненняў, што дэталізавалі, дапаўнялі і ўдасканальвалі існуючыя юрыдычныя нормы. Так, у перыяд з 1995 па 2004 гг. былі падпісаны наступныя міжурадавыя дакументы па вызначанай тэматыцы: Пагадненне аб узаемным прызнанні і эквівалентнасці дакументаў аб адукацыі і вучоных званнях (1998 г); Пагадненне аб забеспячэнні правоў асоб,

[135] Ліст-адказ за № 01–9/161 ад 19.05.93 г. Гродзенскага аблвыканкама ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь // ДАГр. Фонд 1171. Воп. 5. Спр. 2970. Арк. 190–191.

[136] Юрчак Дз.В. Беларуска-украінскае двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1991–2004 гг. // Весці БДПУ. Серыя 2. 2006. № 4. С. 16.

прыналежных да нацыянальных меншасцей (1999 г); Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі (2000 г.). З міжведамасных дакументаў былі распрацаваны: Дагавор аб супрацоўніцтве паміж дзяржаўнымі тэлерадыёкампаніямі (1995 г); Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі паміж міністэрствамі адукацыі (2001 г); Пагадненне аб супрацоўніцтве Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага камітэта Украіны па справах рэлігій (20.08.2001 г.); Пагадненне аб навукова-практычным супрацоўніцтве паміж акадэміямі навук (2002 г). Акрамя таго, дзейнічалі распрацаваныя двухгадовая праграмы і пратаколы супрацоўніцтва міністэрстваў культуры Беларусі і Украіны [137].

У пагадненні 1999 г. указвалася, што прыналежнасць да нацыянальнай супольнасці з’яўлялася пытаннем індывідуальнага выбару асобы, і гарантавалася, што такі выбар не будзе мець адмоўных наступстваў для дадзенай асобы.

Пры вызначэнні грамадзянскіх, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў асоб, якія належылі да нацыянальных супольнасцей, бакі зыходзілі з агульнапрынятых міжнародных стандартаў у сферы правоў чалавека. Кожны з бакоў прызнаваў за асобамі, якія належылі да нацыянальных супольнасцей, права выражаць, захоўваць, развіваць этнічную, культурную і моўную непаўторнасць, не парушаючы пры гэтым правоў і свабод іншых асоб. Акрамя таго, дадзеныя асобы мелі права ствараць грамадскія арганізацыі, нацыянальныя культурныя і адукацыйныя ўстановы для захавання і развіцця этнічнай культурнай і моўнай непаўторнасці. У 2010 г. ва Украіне налічвалася каля 1200 грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей, а наогул больш за 1600 грамадскіх арганізацый імкнуліся прадстаўляць інтарэсы нацыянальных супольнасцей [138].

У адпаведнасці з артыкулам 6 Дамовы бакі прызнавалі права асоб, якія належылі да нацыянальных супольнасцей, устанаўліваць і падтрымліваць кантакты паміж сабой на тэрыторыі краіны пражывання, а таксама з асобамі сваёй нацыянальнасці за мяжой і прымаць удзел у дзейнасці міжнародных неўрадавых арганізацый.

Таксама Дамова прызнавала за асобамі, якія належылі да нацыянальных супольнасцей, права карыстацца роднай мовай у прыватным і грамадскім жыцці, права на нацыянальныя прозвішча, імя, імя па бацьку, права мець доступ да інфармацыі на роднай мове.

---

[137] Юрчак, Дз.В. Беларуска-украінскае двухбаковае супрацоўніцтва ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1991–2004 гг. С. 16.

[138] Лєсєв І. Громадські організації та деякі аспекти державотворення в сучасній Україні: прблеми, прогнози, перспективи // Українознавчий альманах. Випуск 2. Київ, 2010. С. 32.

У адпаведнасці з артыкулам 9 Дамовы бакі прымалі меры для захавання, вывучэння і памнажэння культурнай спадчыны нацыянальных супольнасцей, у тым ліку забяспечвалі захаванне і ахову помнікаў, іх гісторыі і культуры, якія знаходзіліся на тэрыторыі кожнага бока. Згодна з Дамовай заахвочвалася дзейнасць інфармацыйна-культурных цэнтраў другога бока на сваёй тэрыторыі і забяспечвалася садзейнічанне арганізацыі іх працы.

01.03.1999 г. у Мінску было падпісана Пагадненне ад супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам нацыянальнай палітыкі Расійскай Федэрацыі. Прадугледжвалася супрацоўніцтва ў сферы падтрымкі ініцыятыў нацыянальна-культурных аб’яднанняў у розных сферах дзейнасці [139].

28.09.1999 г. было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь і Дэпартаментам нацыянальных меншасцей і эміграцыі пры Урадзе Літоўскай Рэспублікі.

У 1999 г. было падпісана Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Малдова аб супрацоўніцтве па забеспячэнню правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей.

У адпаведнасці з артыкулам першым дадзенага пагаднення, дагаворныя бакі ўлічвалі ў сваёй дзейнасці інтарэсы грамадзян беларускай нацыянальнай супольнасці, якія жылі на тэрыторыі Рэспублікі Малдова і грамадзян малдаўскай нацыянальнасці, якія жылі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і збіраліся садзейнічаць стварэнню спрыяльных умоў для захавання і развіцця іх этнічнай самабытнасці.

У адпаведнасці з артыкуламі пагаднення, бакі дамовіліся аказваць прававую і арганізацыйна-метадычную дапамогу ў арганізацыі нацыянальна-культурных аб’яднанняў і рэлігійных арганізацый; садзейнічаць кантактам паміж прадстаўнікамі нацыянальнасці на тэрыторыі дзяржавы пражывання, а таксама ва ўстанаўленні і развіцці сувязей з суайчыннікамі за мяжой; садзейнічаць захаванню і развіццю культурнай спадчыны, гістарычных і культурных помнікаў, стварэнню неабходных умоў для вывучэння роднай мовы, гісторыі і геаграфіі дзяржаў, да якіх этнічна належаць нацсупольнасці.

Дамовай было ўстаноўлена права нацыянальных супольнасцей карыстацца роднай мовай, нацыянальнымі імёнамі і прозвішчамі, ствараць сродкі масавай інфармацыі.

Згодна з артыкулам 8 пагаднення была створана Беларуска-Малдаўская міжведамасная камісія, якая павінна была: а) збірацца пачаргова ў сталіцах дзяржаў Дагаворных Бакоў у адпаведнасці з раней

[139] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 31.

абумоўленай праграмай; б) распрацоўваць планы сумеснай дзейнасці, а таксама аналізаваць выкананне раней прынятых праграм і прапаноўваюць неабходныя рэкамендацыі; в) выпрацоўваць прымальныя арганізацыйныя механізмы для паспяховага здзяйснення дадзенага Пагаднення; г) абмяркоўваць праблемы фінансавання сумесных праграм мерапрыемстваў.

12.05.1999 г. (Пр. № 1) адбылося першае пасяджэнне (г. Мінск) Беларуска-Малдаўскай міжведамаснай дарадчай камісіі па забеспячэнню правоў асоб, якія належылі да нацыянальных супольнасцей. Быў зацверджаны план работы Беларуска-Малдаўскай міжведамаснай дарадчай камісіі на 1999–2000 гг. Узгадвалася дзейнасць Таварыства “Малдова” ў Рэспубліцы Беларусь. Дэпартамент нацыянальных адносін і функцыянавання моў Рэспублікі Малдова запрасіў фальклёрны калектыў з г. Рэчыцы на свята Славянскага пісьменства і культуры ў Рэспубліку Малдова. Было запланавана правесці святы беларускай культуры ў Рэспубліцы Малдова і малдаўскай культуры ў Беларусі. Прадугледжвалася супрацоўніцтва ВНУ, у сферы адукацыі, СМІ, гарадоў-пабрацімаў, удзел вучоных і спецыялістаў (па накіраванню Дэпартамента) у канферэнцыі па этнаканфесійных праблемах у г. Гродна (лістапад 1999 г.) і на заключных мерапрыемствах III Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур (Гродна, май 2000 г.) [140]. У лютым 2007 г. у Малдове адбылося 6 пасяджэнне Беларуска-Малдаўскай міжведамаснай дарадчай камісіі [141].

14.10.2002 г. было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнай службай па праблемах культаў пры Урадзе Рэспублікі Малдова.

Такім чынам, Беларусь і Літва, Малдова, Расія, Польшча, Украіна выступалі на міжнароднай арэне як раўнапраўныя партнёры і мелі добры патэнцыял для плённага супрацоўніцтва. Дружалюбны і прагматычны характар двухбаковых сувязей, нягледзячы на пэўныя палітычныя разыходжанні, развіваўся ў розных сферах, павышаў значнасць польскага, рускага, украінскага і малдаўскага фактараў у знешняй і ўнутранай палітыцы Беларусі і беларускага фактару ў палітычным і грамадскім жыцці Расіі, Польшчы, Украіны і Малдовы.

Канстытуцыя і заканадаўства Рэспублікі Беларусь прызнаюць нацыянальныя супольнасці як састаўную частку народа Беларусі. У адпаведнасці з артыкулам 14 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржава рэгулюе адносіны паміж нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў. Артыкул

---

[140] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 30.

[141] Кошалеў М., Папоўская Т. Беларуска-малдаўскія ўзаемасувязі: гісторыя і сучаснасць // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 11. С. 51.

15 прадугледжвае, што дзяржава адказна за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у дзяржаве [142].

Артыкул 22 Канстытуцыі указвае, што ўсе роўныя перад законам і маюць правы без усялякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў. Артыкулы 50, 51 сведчаць, што кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, таксама, як ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання нацыянальнай прыналежнасці. Знявага нацыянальнай годнасці караецца згодна з заканадаўствам. Кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе, у адпаведнасці з законам, свабоду выбару мовы выхавання і навучання. Кожны мае права на ўдзел у культурным жыцці. Гарантуецца свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання.

16.12.1991 г. камісіяй па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах Вярхоўнага Савета (ВС) Беларусі быў разгледжаны праект канцэпцыі Закона “Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп у Рэспубліцы Беларусь”.[143] Былі сабраны заўвагі і прапановы іншых камісій Вярхоўнага Савета, выканаўчых органаў улады, нацыянальных грамадскіх арганізацый да прапанаванага праекта Закона. Сам праект быў адобраны і прапанаваны на разгляд 9 сесіі ВС 10.03.92 г. у фармулёўцы “Аб свабодным развіцці нацыянальных груп (меншынстваў) у Рэспубліцы Беларусь”. [144]

Пры падрыхтоўцы праекта члены камісіі выкарыстоўвалі: закон СССР “Аб свабодным нацыянальным развіцці грамадзян СССР, якія пражываюць за межамі сваіх нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў або не маюць іх на тэрыторыі СССР” ад 26.04.1990 г. [145], закон Украіны “Аб нацыянальных меншасцях на Украіне” ад 25.06.1992 г. [146] (праект Закона быў абмеркаваны 16.11.1991 г. у Адэсе на Усеўкраінскім з’ездзе нацыянальных меншасцей), закон аб нацыянальна-асабовай аўтаноміі на Украіне ад 24.01.1918 г., закон Літоўскай рэспублікі “Аб нацыянальных меншасцях” ад 23.11.1989 г. (у рэдакцыі ад 11.03.1991 г.), закон Латвійскай рэспублікі “Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп Латвіі і іх праве на культурную аўтаномію” ад 19.03.1991 г., закон “Аб культурнай аўтаноміі нацыянальных меншасцей Эстоніі” ад 12.02.1925 г., парады АБСЕ, савета Еўропы [147].

---

[142] Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г.

[143] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4090. –Арк. 174–175.

[144] Матэрыялы да пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4091. Арк. 4–6.

[145] Закон СССР «О свободном национальном развитии граждан СССР, проживающих за пределами своих национально-государственных образований или не имеющих их на территории СССР» // ДАРФ. Фонд Р-9654. Воп. 5. Спр. 180. Арк. 49–56.

[146] Історія України: Джерельний літопис. К., 2008. С. 703–706.

[147] Матэрыялы да пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4094. Арк. 33–60.

Гэтая важная дзяржаўная справа (прыняцце Закона), не засталася па-за ўвагаю грамадскай дзейнасці сяброў нацыянальна-культурных таварыстваў. Яны актыўна імкнуліся паўплываць на працэс падрыхтоўкі і прыняцця Закона з улікам іх нацыянальных інтарэсаў, каштоўнасцей і запатрабаванняў. 08.04.1992 г. адбылася сустрэча кіраўнікоў нацыянальных аб'яднанняў з членамі Камісіі ВС. У выніку, на наступны дзень на пасяджэнні Камісіі па пытанню "Аб парадку разгляду праекта Закона "Аб свабодным развіцці нацыянальных груп у Рэспубліцы Беларусь" было вырашана прасіць сесію Вярхоўнага Савета задаволіць просьбу прадстаўнікоў грамадска-культурных аб'яднанняў азербайджанцаў, армян, татар, немцаў, рускіх, яўрэяў, украінцаў – прысутнічаць на пасяджэнні сесіі пры абмеркаванні Закона і даць магчымасць выступіць іх прадстаўніку [148].

Абмеркаванне і прыняцце праекта Закона "Аб свабодным развіцці нацыянальных груп у Рэспубліцы Беларусь" адбылося на сесіі ВС 23.04.1992 г. Ад імя каардынацыйнай рады нацыянальных аб'яднанняў Рэспублікі Беларусь на сесіі выступіў з прамоваю А.–Б.А. Шабановіч. Вярхоўны Савет адобрыў праект Закона ў першым чытанні [149].

Распачаўся працэс дапрацоўкі праекта Закона. У камісію ВС па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах паступіла шэраг новых заўваг, прапаноў ад Камісій Вярхоўнага Савета (некаторыя камісіі наогул выступілі супраць прыняцця такога Закона), асобных дэпутатаў, ад грамадскіх арганізацый. Так, Украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне Брэсцкай вобласці патрабавала, каб у Законе быў прызнаны факт існавання і кампактнага пражывання ў Паўднёвым беларускім Палессі аўтахтоннага ўкраінскага этнічнага насельніцтва [150]. "Саюз палякаў на Беларусі" (СПБ) у праект Закона ў артыкул 6-ы прапаноўваў унесці "права на ўтварэнне ў месцах кампактнага пражывання нацыянальных груп, якія складаюць большасць насельніцтва дадзенай мясцовасці, нацыянальных адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак", "права на вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты па асобных спісах нацыянальных супольнасцей". Падобнае прапаноўвала і аб'яднанне ўкраінцаў "Ватра" [151].

У ліпені 1992 г. праект Закона ўжо рыхтаваўся пад назвай "Аб нацыянальных меншасцях". 3.07.1992 г. Камісія ВС па нацыянальных пытаннях прымае рашэнне ўнесці праект Закона на сесію Вярхоўнага Савета. Прыняты ў другім чытанні праект Закона "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь" разглядаўся на пасяджэннях камісіі 24.08.1992 г. і 19.10.1992 г., быў адобраны і рэкамендаваны сесіі Вярхоўнага Савета [152].

---

[148] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4091. Арк. 53.
[149] Матэрыялы сесіі // Там жа. Спр. 4094. Арк.153–191.
[150] Матэрыялы да пасяджэння камісіі // Там жа. Спр. 4095. Арк. 13–14.
[151] Матэрыялы да пасяджэння камісіі // Там жа. Арк. 12.
[152] Пратакол пасяджэння камісіі // Там жа. Спр. 4091. Арк. 73, 134.

11.11.1992 г. пастановаю Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь быў уведзены ў дзеянне Закон “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” [153]. У снежні 2003 г. у гэты Закон дэпутатамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь унесены змяненні і дапаўненні, якія набылі сілу паводле Закона Рэспублікі Беларусь за № 261–З ад 5.01.2004 г. [154]

У прэамбуле да Закона “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” сказана, што ён заснаваны на Канстытуцыі краіны, прынцыпах міжнароднага права ў вобласці правоў чалавека і нацыянальных супольнасцей і накіраваны на стварэнне ўмоў для свабоднага развіцця нацыянальных супольнасцей, а таксама на абарону іх правоў і законных інтарэсаў [155]. Грамадзяне, якія адносяцца да нацыянальных супольнасцей, валодаюць комплексам спецыфічных правоў. У палажэннях Канстытуцыі і заканадаўства Беларусі дакладна вызначаны механізм іх рэалізацыі і разнастайныя спосабы ўдзелу дадзенай катэгорыі грамадзян у прыняцці рашэнняў, якія закранаюць іх законныя правы і інтарэсы.

У адпаведнасці з артыкулам 2 Закона “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” прыналежнасць грамадзяніна краіны да нацыянальнай супольнасці з’яўляецца справай яго асабістага свабоднага выбару, з-за ажыццяўлення якой не могуць узнікаць ніякія неспрыяльныя вынікі. Артыкул 4 дадзенага Закона не дапускае якое-небудзь прамое або ўскоснае абмежаванне правоў і свабод грамадзян за іх прыналежнасць да нацыянальных супольнасцей, а таксама спробы асіміляцыі супраць іх волі. Згодна з артыкулам 5, ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання сваёй нацыянальнай прыналежнасці, а таксама да доказвання нацыянальнай прыналежнасці або адмовы ад яе.

У той жа час існавала інструкцыя “Аб парадку вызначэння нацыянальнай прыналежнасці грамадзян Рэспублікі Беларусь”, узгодненая з намеснікам міністра ўнутраных спраў, старшынёю Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры СМ РБ, у адпаведнасці з якой у пашпарце грамадзяніна рабілася адзнака аб нацыянальнасці толькі тады, калі грамадзянін гэтага жадаў. Але пасля ўказання нацыянальнай прыналежнасці, яе змяніць магчыма было толькі ў судзе, у той час, як у артыкуле 5 Закона ўказваецца на недапушчальнасць прымусу даказваць сваю нацыянальнасць.

Артыкул 13 вышэй названага Закона прадугледжвае, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці, карыстаюцца абаронай дзяржавы на роўных асновах. За любыя дзеянні,

[153] Пастанова Вярхоўнага Савета // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4095. Арк. 1, 117.

[154] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 65 ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь “О национальных меньшинствах в Республике Беларусь”: Закон Рэспублики Беларусь, 5.01.2004 г., № 261–З // НРПА. 2004. № 2. С. 25.

[155] О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь “О национальных меньшинствах в Республике Беларусь”: Закон Рэспублики Беларусь. С. 25.

накіраваныя на дыскрымінацыю па нацыянальных прыкметах, стварэнне перашкод у рэалізацыі нацыянальнымі супольнасцямі сваіх правоў, распальванне міжнацыянальнай варожасці, заканадаўствам прадугледжвалася адказнасць.

Дзейнасць, накіраваная на распальванне расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасці ці розні, беларускім заканадаўствам вызначана як экстрэмізм (экстрэмісцкая дзейнасць) [156].

Распальванне нацыянальнай нянавісці заўсёды стрымлівалася, як у часы БССР, так і ў Рэспубліцы Беларусь. 2.04.1990 г. быў прыняты закон СССР “Аб узмацненні адказнасці за замах на нацыянальнае раўнапраўе грамадзян і гвалтоўнае парушэнне адзінства тэрыторыі СССР”. Закон абвясціў супрацьзаконнай і падпадаючай пад забарону дзейнасць любых аб’яднанняў грамадзян, у тым ліку палітычных партый, грамадскіх арганізацый (ГА) і масавых рухаў, накіраваную на ўзбуджэнне нацыянальнай або расавай варожасці або пагарджэння ці прымянення гвалту на нацыянальнай, расавай, рэлігійнай аснове.

У Крымінальным кодэксе, які быў прыняты 02.06.1999 г. і ўступіў у дзеянне з 01.01.2001 г., ёсць артыкул 130, які сведчыць, што “наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці, на ўніжэнне нацыянальнай годнасці – наказваецца штрафам, альбо арыштам на тэрмін да 6 мес., альбо абмежаваннем свабоды на тэрмін да 5 год, альбо пазбаўленнем свабоды на той жа тэрмін” [157]. У той жа час у гэтым артыкуле няма ніякай адказнасці за прамое або ўскоснае абмежаванне правоў ці ўсталяванне прамых або ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад адносін да рэлігіі. Такім чынам, службовыя асобы, якія ўшчэмлівалі б правы грамадзян у залежнасці ад расавай, нацыянальнай прыналежнасці або адносін да рэлігіі, практычна не маглі быць прыцягнуты да адказнасці. Адсюль, быў магчымы суб’ектыўны фактар адносін чыноўніка да пэўных нацыянальнасцей, што магло ўплываць на кадравую палітыку ў пэўнай галіне, вобласці, і пры гэтым заканадаўча чыноўніку была забяспечана беспакаранасць.

Афіцыйныя даныя пра выкарыстанне артыкула. 130 КК РБ прадстаўлены ў васямнаццатым і дзевятнаццатым перыядычных дакладах па выкананні палажэнняў Міжнароднай канвенцыі па ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, якія павінны былі быць прадстаўленыя 8 мая 2008 г. у Камітэт па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі ААН. За перыяд з 2003 г. па 2010 г. у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь за здзяйсненне злачынстваў на глебе расавай дыскрымінацыі асуджаны [158]:

---

[156] О противодействии экстремизму : Закон Республики Беларусь от 04.01.2007 г. № 203–3 // НРПА. № 15. 2/1300.

[157] Уголовный кодекс Республики Беларусь. Минск, 2004.

[158] Доклады Беларуси от 18 ноября 2012 г. восемнадцатый и девятнадцатый периодические доклады по выполнению положений Международной конвенции о ликвидации всех форм расовой дискриминации,

2003 год − 4 чал. (частка 3 артыкула 130).

2006 год − 2 чал. (частка 1 артыкула 193).

2007 год − 2 чал . (частка 1 артыкула 193); 2 чал. (пункт 14 часткі 2 артыкула 139); 1 чал. (частка 3 артыкула 147).

2008 год − 1 чал. (частка 2 артыкула 130).

2009 год − 1 чал. (частка 1 артыкула130).

Па частцы 1 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, на зневажэнне нацыянальнага гонару і годнасці) асуджаны 1 чалавек з прызначэннем пакарання ў выглядзе штрафу, па частцы 2 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, на зневажэнне нацыянальнага гонару і годнасці, звязаныя з гвалтам або здзейсненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў) асуджаны 1 чалавек з прызначэннем пакарання ў выглядзе 3 (трох) гадоў пазбаўлення волі, па частцы 3 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (дзеянні, прадугледжаныя часткамі першага ці другога дадзенага артыкула, збылі дзейснены групай асоб або пацягнулі па неасцярожнасці смерць чалавека або іншыя цяжкія наступствы) асуджана 4 чалавекі, з іх двум асобам прызначана пакаранне ў выглядзе 5 (пяці) гадоў пазбаўлення волі, яшчэ двум − пазбаўленне волі на тэрмін 8 (восем) гадоў.

У адпаведнасці з артыкулам 6 Закона "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь" дзяржава гарантуе грамадзянам, якія адносяць сябе да нацыянальных супольнасцей, роўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы і свабоды. Пры гэтым заканадаўствам краіны прадугледжваецца роўнасць асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей, без іх дзялення па прынцыпу даўнасці пражывання. Так, у адпаведнасці з артыкулам 1 Закона, пад асобамі, якія належаць да нацыянальных супольнасцей, разумеюцца асобы, якія заўсёды пражываюць на тэрыторыі Беларусі, маюць яе грамадзянства, і якія па свайму паходжанню, мове, культуры або традыцыях адрозніваюцца ад асноўнага насельніцтва рэспублікі.

Грамадзянства можа набыць, у адпаведнасці з артыкулам 14 Закона "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь" (прыняты 18.10.1991 г.) [159], толькі асоба, якая пражывала на тэрыторыі дзяржавы апошнія сем год. Адсюль, асобы, якія прыехалі ў Беларусь параўнальна нядаўна і не набылі яе грамадзянства, не падпадалі пад дзеянне Закона "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь" і не валодалі тымі правамі, якія

---

подлежавшие представлению 8 мая 2008 года. CERD/C/BLR/18-19. П. 53–54 // http://www2.ohchr.org/english/bodies/cerd/cerds83.htm. – Дата доступа 16 жніўня 2013 г.

[159] О гражданстве Республики Беларусь : Закон Республики Беларусь от 18 октября 1991 г. № 1181 – XII ; О гражданстве Республики Беларусь. Закон Республики Беларусь от 01.08.2002 г. № 136–З.

прадугледжвала заканадаўства. Закон “Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь” быў прыняты ВС Рэспублікі Беларусь 3.06.1993 г.[160], Закон “Аб бежанцах” у 1995 г. [161]

Артыкул 9 Закона “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” дае правы грамадскім аб’яднанням нацыянальных супольнасцей займацца прадпрыймальніцкай дзейнасцю ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

З 01.02.2003 г. уступіў у дзеянне закон “Аб крымінальнай адказнасці за арганізацыю незаконнай міграцыі, а таксама за парушэнні правіл праезду і знаходжання замежных грамадзян у Рэспубліцы Беларусь”, па якому прадугледжана крымінальная адказнасць за арганізацыю незаконнай міграцыі, парушэнне правіл знаходжання або транзітнага праезду замежных грамадзян праз тэрыторыю рэспублікі. Урадам прыняты пастановы, якія рэгламентуюць працоўную і прадпрымальніцкую дзейнасць замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, што часова пражываюць на тэрыторыі рэспублікі, а таксама парадак прыцягнення замежнай рабочай сілы. Паводле ацэнак дзяржаўных органаў і спецыялістаў, у краіне на нелегальным становішчы на 2004 г. знаходзілася ад 150 да 200 тыс. мігрантаў, і найбольшая іх частка ў пагранічных абласцях – Магілёўскай, Гомельскай, Брэсцкай [162].

Сярод правоў, асобна пералічаных артыкулам 6 Закона “Аб нацыянальных меншасцях”, разгледзім некаторыя [163].

Заканадаўства Беларусі, створанае ў апошняе дзесяцігоддзе, гарантавала рэалізацыю права на стварэнне грамадскіх аб’яднанняў і ўваход у дзеючыя грамадскія аб’яднанні як у індывідуальным парадку, так і ў групавой форме.

Стварэнне грамадскіх аб’яднанняў (ГА) нацыянальнага характару рэалізуецца ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленнымі для ўсіх грамадскіх аб’яднанняў у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб’яднаннях” [164]. Якіх-небудзь прынцыповых перашкод для ўдзелу ў дзейнасці нацыянальных культурных аб’яднанняў асоб без грамадзянства, грамадзян іншых дзяржаў на тэрыторыі Беларусі не было.

---

[160] О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь : Закон Республики Беларусь от 03.06.1993 г. № 2339–XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 21. Ст. 250 ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь “О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь” : Закон Республики Беларусь от 19.07.2005 г. № 41–З // НРПА. – 2005. № 121. 2/1138.

[161] О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь “О беженцах” от 22 февраля 1995 г. № 3605 – XII: Закон Республики Беларусь от 16.06.1999 г. № 268 –З // НРПА. 1999. № 47. 2/43.

[162] Рагімаў А. Міграцыя народаў Каўказа ў Рэспубліку Беларусь у 1980–1990-я гады // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 11. С. 40.

[163] О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь “О национальных меньшинствах в Республике Беларусь”: Закон Рэспублики Беларусь. С. 25–26.

[164] Об общественных объединениях: Закон Республики Беларусь, 4 окт. 1994 г., № 3254 – XII: по сост. на 23 сентября 2004 г. Минск, 2004.

У Беларусі дзейнічалі грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцей, якія ажыццяўлялі культурна-асветніцкія, дабрачынныя і адукацыйныя праграмы пры падтрымцы рэспубліканскіх і муніцыпальных улад. Дзейнасць усіх нацыянальных фарміраванняў была звязана перш за ўсё з вывучэннем сваёй роднай мовы, гісторыі, культуры, мастацтва сваіх народаў, правядзеннем сустрэч, семінараў, святаў, фестываляў, выстаў, канферэнцый, наладжваннем творчых сувязей з краінамі паходжання. Ствараліся культурна-асветніцкія цэнтры, калектывы самадзейнай народнай творчасці і г.д.

Права карыстацца роднай мовай, права выбару мовы зносін, а таксама права на свабоду выбару мовы выхавання і навучання. Па даных перапісу насельніцтва 1999 г. назвалі роднай мову сваёй нацыянальнасці 82 % насельніцтва, на мове сваёй нацыянальнасці размаўлялі дома 45 % насельніцтва. У 2009 г. – адпаведна амаль 60 % і 30 % насельніцтва.

Артыкул 5 Закона “Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь” [165] устанаўлівае, што ў месцах кампактнага пражывання грамадзян пэўнай нацыянальнасці па заявах законных прадстаўнікоў дзяцей і па рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў могуць стварацца групы ў дашкольных установах і класы ў агульнаадукацыйных школах, у якіх навучэнне і выхаванне поўнасцю, або часткова здзяйсняюцца на мове нацыянальнай супольнасці або вывучаецца мова нацыянальнай супольнасці.

У адпаведнасці з артыкулам 2 Закона “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” [166] (зацверджаны Указам Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь № 178–З ад 13.07.1998 г.), наша краіна імкнулася праяўляць дзяржаўны клопат аб свабодным развіцці і выкарыстанні ўсіх нацыянальных моў, якімі карысталася насельніцтва рэспублікі. У той жа час заканадаўства Рэспублікі Беларусь не рэгламентуе выкарыстанне моў у неафіцыйных зносінах.

У адпаведнасці з артыкулам 3 вышэй азначанага закона, грамадзянам Беларусі гарантавалася права карыстацца іх нацыянальнай мовай, на адукацыю і развіццё культуры на мовах народаў, прадстаўнікі якіх пражываюць у рэспубліцы, звяртацца ў дзяржаўныя органы, органы мясцовага кіравання і самакіравання, на прадпрыемствы, ва ўстановы, арганізацыі і грамадскія аб’яднанні на беларускай, рускай або іншай дапушчальнай для бакоў мове. Артыкулам 6 дадзенага закона прадугледжана, што ўсялякія прывілеі або абмежаванні недапушчальны, а публічная знявага, ганьба дзяржаўных і іншых нацыянальных моў,

---

[165] Об образовании : Закон Республики Беларусь от 29 октября 1991 г., № 1202–XII ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь “Об образовании”: Закон Рэспублики Беларусь от 4 августа 2004 г. № 311–З // НРПА. 2004. № 123. С. 21–22.

[166] О языках в Республике Беларусь : Закон Республики Беларусь от 26 января 1990 г. № 3094–XI : в редакции Закона от 13 июля 1998 г. № 187–З // Ведомости Национального собрания Республики Беларусь. 1998. № 28. Ст. 461.

стварэнне перашкод і абмежаванняў у карыстанні імі, пропаведзь варожасці на моўнай глебе цягнуць устаноўленую законам адказнасць. У адпаведнасці з артыкулам 7, акты органаў мясцовага кіравання і самакіравання прымаюцца і друкуюцца, пры неабходнасці, на нацыянальнай мове большасці насельніцтва той ці іншай мясцовасці.

Артыкуламі 11,13,14,15,18 прадугледжана, што мовай з'ездаў, канферэнцый і іншых форумаў, сферы абслугоўвання, судаводства, юрыдычнай дапамогі могуць быць, пры неабходнасці, любыя мовы.

У артыкулах 21, 22, 23, 26 Закона гаворыцца пра правы на захаванне і развіццё культуры, выхаванне і атрыманне адукацыі, стварэнне дашкольных і агульнаадукацыйных устаноў адукацыі (ці асобных падраздзяленняў у іх – груп і класаў адпаведна) на роднай мове для грамадзян іншых нацыянальнасцей, якія пражываюць у рэспубліцы "ў адпаведнасці з пажаданнямі грамадзян і па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў" [167]. Словы "ў месцах кампактнага пражывання грамадзян іншых нацыянальнасцей...", якія былі спачатку ў Законе, у 1998 г. з яго прыбралі, паколькі ўжо ў "Канцэпцыі нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі" (1996 г.) гаворыцца пра дысперснасць рассялення і пра адсутнасць (за рэдкім выключэннем) зон кампактнага пражывання нацыянальных супольнасцей у Беларусі [168].

На базе агульнаадукацыйных школ, пазашкольных, клубных, бібліятэчных устаноў сістэм Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры былі створаны школы, класы, факультатывы, гурткі па навучанню на роднай мове, даследаванню гісторыі і культуры нацыянальных супольнасцей. Дзейнічалі школы з польскай і літоўскай мовамі навучання. У 176 агульнаадукацыйных школах быў уведзены этнакультурны кампанент. Былі створаны больш за пяцьдзясят школ выхаднога дня для прадстаўнікоў армянскай, азербайджанскай, грузінскай, грэчаскай, яўрэйскай, літоўскай, малдаўскай, польскай, нямецкай, татарскай і ўкраінскай нацыянальнасцей, у якіх навучалася каля пяці тысяч чалавек.

У Беларусі дзейнічаюць 4 установы агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучанне ажыццяўляецца на мове нацыянальнай супольнасці: 2 школы з польскай мовай навучання (г. Гародня і г. Ваўкавыск) і 2 школы з літоўскай мовай навучання (в. Пеляса і в. Рымдзюны Гродзенскай вобласці). На паказаных мовах нацыянальных супольнасцей у 2008 г. навучалася 717 вучняў (на польскай – 601, літоўскай – 116). У 114 установах агульнай сярэдняй адукацыі родная мова нацыянальных супольнасцей у розных арганізацыйных формах (навучальны прадмет,

[167] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 16–17.
[168] Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі.

факультатыўныя заняткі, гуртковая праца) вывучалі каля 4780 навучэнцаў, у тым ліку польскую мову – 4327, іўрыт – 344, літоўскую – 116. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі адкрыты групы, у якіх вывучалі польскую, літоўскую, украінскую мовы і іўрыт парадку 40 дзяцей, а таксама дзейнічаюць 26 гурткоў, якія наведваюць 93 дзіцяці [169]. Дзейнічае Літоўскі культурна-асветніцкі цэнтр у в. Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці [170].

У 2014 г. функцыянавалі 4 установы адукацыі, у якіх навучанне ажыццяўлялася на мовах нацыянальных супольнасцей: 2 школы з польскай мовай навучання і выхавання (у Гродне і Ваўкавыску) і 2 школы з літоўскай мовай навучання і выхавання (у в. Рымдзюны Астравецкага раёна і в. Пеляса Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці). На мове нацыянальных супольнасцей у 2013/2014 навучальным годзе навучаліся 794 вучні (на польскай – 669, літоўскай – 125 вучняў). Акрамя таго, у 135 установах агульнай сярэдняй адукацыі 4 тыс. 997 вучняў вывучалі мовы нацыянальнай супольнасці на вучэбных занятках, факультатыўных занятках або ў аб’яднаннях па інтарэсах: польскую мову – 4 тыс. 702 вучні, літоўскую мову – 30 вучняў, яўрэйскую мову – 265 вучняў [171].

У 2010–2011 гадах Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь рэалізоўваўся праект ЮНЭСКА “Тэорыя і практыка фарміравання міжкультурнага ўзаемадзеяння ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь: стан, праблемы, перспектывы”[172]. У рамках праекта 04.11.2011 г. была праведзена Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Межкультурное взаимодействие в современной образовательной среде: состояние, проблемы, перспективы», матэрыялы якой былі апублікаваныя[173].

---

[169] Доклады Беларуси от 18 ноября 2012 г. восемнадцатый и девятнадцатый периодические доклады по выполнению положений Международной конвенции о ликвидации всех форм расовой дискриминации, подлежавшие представлению 8 мая 2008 года. CERD/C/BLR/18-19. П. 125–127 // http://www2.ohchr.org/english/bodies/cerd/cerds83.htm. – Дата доступа 16 жніўня 2013г.

[170] Праграма адкрыцця літоўскага культурнага цэнтра ў Рымдзюнах // Lietuvos valstybės naujasis archyvas (Літоўскі дзяржаўны новы архіў, г. Вільнюс). Фонд 78. Воп. 1. Спр. 163. Арк. 17–18.

[171] Абавязковы экзамен па гісторыі Беларусі будуць здаваць з 2015 года выпускнікі 11-х класаў // Навіны Беларусі. БЕЛТА. 24 ліпеня 2014 года. http://blr.belta.by/all_news/society/Abavjazkovy-ekzamen-pa-gstory-Belarus-buduts-zdavats-z-2015-goda-vypusknk-11-x-klasa_i_69683.html. – Дата доступа 24.07.2014 г.

[172] Доклады Беларуси от 18 ноября 2012 г. восемнадцатый и девятнадцатый периодические доклады по выполнению положений Международной конвенции о ликвидации всех форм расовой дискриминации, подлежавшие представлению 8 мая 2008 года. CERD/C/BLR/18-19. П. 130 // http://www2.ohchr.org/english/bodies/cerd/cerds83.htm. – Дата доступа 16 жніўня 2013г.

[173] Материалы международной научно-практической конференции Межкультурное взаимодействие в современной образовательной среде: состояние, проблемы, перспективы. Минск, 2012 ; Лаптенок А.С. Подготовка учащихся к жизни в поликультурном мире // Пособие для педагогов общеобразовательных учреждений, учреждений дополнительного образования детей и молодежи, рекомендованное Ученым советом НМУ “Национальный институт образования” Министерства образования Республики Беларусь. Минск, 2012.

Варта адзначыць, што меліся праблемы, якія ўзнікалі пры рэалізацыі права на крыстанне роднай мовай.

1) Недахоп падручнікаў, вучэбна-метадычных матэрыялаў, кваліфікаваных педагагічных кадраў. Адукацыйныя структуры з этнакультурным кампанентам забяспечваліся падручнікамі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі на мовах нацыянальных супольнасцей часткова Міністэрствам адукацыі Беларусі, а таксама краінамі гістарычнага паходжання (Польшчай, Літвой, Латвіяй, Украінай і інш.). Але праца ў вышэйшых навучальных установах па падрыхтоўцы кадраў для такіх школ вялася вельмі марудна.

2) Наяўнасць у артыкулах законаў некалькіх агаворак "могуць ствараца", "па рашэнню выканаўчых і распарадчых" органаў. Даследчыкі і прадстаўнікі нацыянальных ГА прапаноўвалі ўнесці змены ў Закон "Аб мовах" і ўбраць дадзеныя агаворкі. [174] Тады артыкулы Закона гучалі б адназначна і абавязвалі выканаўчыя і распарадчыя органы ствараць дашкольныя ўстановы і агульнаадукацыйныя школы на мовах нацыянальных супольнасцей.

3) Закон "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" меў яшчэ адну загану. Па дадзеных перапісаў насельніцтва 1999 г. – 81 % , 2009 г. – 83,7 % жыхароў Беларусі вызначылі сябе як беларусы. Але артыкулы Закона (22, 23, 27) разглядалі мовы, якія маглі выкарыстоўвацца ў выхаванні, навучанні, у сродках масавай інфармацыі ў інтэрпрэтацыі "беларуская мова і (або) руская мова". Менавіта гэта "або" ўказвала на пэўныя перавагі для прадстаўнікоў рускай нацыянальнасці, якіх у нас пражывае, па дадзеных таго ж перапісу, усяго 11 %, перад тымі ж беларусамі. Зразумела, што гэта вялікая колькасць насельніцтва (больш за мільён чалавек, у той час, як на астатнія нацыянальнасці, якіх больш за 140, прыпадала каля васьмісот тысяч чалавек), але як жа тады быць з прынцыпам, прадугледжаным артыкулам 22 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, аб роўнасці правоў і законных інтарэсаў.

4) Значная частка нацыянальных супольнасцей Беларусі была акультурана ў беларускую або рускую культуру, лічыла сваёй роднай мовай беларускую або рускую мову, і ў сувязі з гэтым навучанне на мовах нацыянальных супольнасцей сутыкалася з такімі цяжкасцямі, як слабая паспяховасць, недастатковае засваенне ведаў на практычна незнаёмай мове, з-за адсутнасці моўнай практыкі ў паўсядзённым жыцці.

Працэс рэальнага адраджэння моў з'яўляецца працяглым, і з часам указаныя цяжкасці будуць пераадолены.

Права на заснаванне сродкаў масавай інфармацыі, выдавецкую дзейнасць, а таксама на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі на роднай мове рэалізоўвалася ў адпаведнасці з артыкулам 27

[174] Иоффе Э.Г. Проблемы реализации прав национальных общностей и законодательство Республики Беларусь // Чалавек. Грамадства. Свет. 2005. № 1. С. 58–62.

Закона “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” мовай сродкаў масавай інфармацыі магла быць мова любой нацыянальнасці, прадстаўнікі якой пражывалі ў рэспубліцы. У Беларусі выдаваліся газеты і часопісы на польскай, украінскай мовах. Але ў сувязі з тым, што значная частка прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей па розных абставінах не валодалі сваімі нацыянальнымі мовамі і роднай мовай для іх з’яўлялася беларуская або руская, таму нацыянальныя грамадскія аб’яднанні выдавалі СМІ на рускай і беларускай мовах (“Авив”, “Берега” – яўрэйскія, “Байрам”, “Жизнь” – татарскія, “Как дела” – нямецкая). На 01.01.2015 г. у Беларусі нацыянальнымі грамадскімі аб’яднаннямі выдаваліся часопіс “Мишпоха” Саюза беларускіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын і газеты: “Glos znad Niemna” грамадскага аб’яднання “Саюз палякаў на Беларусі”, “Авив” Саюза беларускіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын, “Українець в Беларусі” Беларускага грамадскага аб’яднання украінцаў “Ватра”, “Романо Лав” грамадскага аб’яднання “Беларуская цыганская дыяспара”, “Мусу жодис” Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі “Беларуская абшчына літоўцаў” [175]. З-за адсутнасці сродкаў многія нацыянальныя аб’яднанні не маглі самастойна выдаваць газету ці часопіс. У даследуемы перыяд дзяржава не прадстаўляла магчымасці (паласу, старонку, нумар у месяц і г.д.) нацыянальным аб’яднанням выкарыстоўваць дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі.

Права свабодна выбіраць і быць абраным у дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні. У адпаведнасці з Канстытуцыяй, Выбарчым кодэксам нацыянальная прыналежнасць асобы не магла паўплываць на рэалізацыю дадзенага права, таму што ніхто не мог быць прымушаны да яе вызначэння. Вынікі навуковага матэрыялу этнаканфесійнага становішча ў рэспубліцы сведчылі аб тым, што толькі для чвэрці грамадзян мела значэнне нацыянальная і веравызнаўчая прыналежнасць палітычнага дзеяча, кандыдата ў дэпутаты.

Пад час правядзення першых у Рэспубліцы Беларусь выбараў Прэзідэнта краіны (1994 г.) праводзіўся збор подпісаў аб вылучэнні кандыдатам у Прэзідэнты: Ахрэма Э. – лідара палітычнай партыі “Польскае дэмакратычнае аб’яднанне” (дзейнічала с 1993 г. да 1995 г.); Шэляговіча М. – старшыні грамадска-культурнага аб’яднання “Полісьсе” [176]. Аднак, падзеі паказалі, што арганізацыя, якая прэтэндуе на палітычнае прадстаўніцтва і створаная на нацыянальнай прыкмеце, не мела шанцаў у Беларусі на поспех.

---

[175] Общественные национально-культурные объединения // http://belarus21.by/Articles/nac_cult_ob. – Дата доступа 22.01.2015 г.

[176] Национально–государственные интересы Республики Беларусь. С. 244; Вынікі сбору подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь // ДАМаг. Фонд 7. Воп. 5. Спр. 4248. Арк. 26.

Права роўнага доступу да любых пасад у дзяржаўных органах Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная прыналежнасць грамадзяніна Рэспублікі Беларусь не фіксавалася якім-небудзь чынам ні ў якіх дакументах і ў сувязі з гэтым не магла прымацца на ўвагу пры разглядзе дзелавых якасцей кандыдатаў на пасаду ў органах дзяржаўнай улады і кіравання Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым адсутнічала фіксаванне нацыянальнай прыналежнасці дзяржаўных служачых і абагульняючая статыстыка па дадзенаму пытанню. Хаця пэўныя звесткі па нацыянальнаму складу дэпутатаў Віцебскай, Гродзенскай вобласці дазваляюць казаць аб іх прадстаўніцтве ў органах улады [177].

Так, згодна з данымі аб нацыянальным складзе дэпутатаў Віцебскай вобласці на 29.01.1996 г., у 318 саветах вобласці з 4461 дэпутата прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей складалі 8,1 %. У абласным савеце іх было – 12,8 %, раённых саветах – 9,03 %, гарадскіх – 15,5 %, сельскіх саветах – 6,8 %, пасялковых – 7,9 %, гарадскіх саветах абласнога падпарадкавання – 26,4 %, гарадскіх саветах раённага падпарадкавання – 7,6 % [178]. У органах выканаўчай улады Гродзенскай вобласці больш за 20% складалі палякі. Больш за 30 % іх было сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў. Пад час выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў 24-га склікання, дэпутатамі былі выбраны 687 прадстаўнікоў польскай нацыянальнай супольнасці (21,6 % ад агульнай колькасці дэпутатаў). Па 2 дэпутаты польскай нацыянальнасці меліся ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі [179]. У ходзе выбараў у 2007 г. дэпутатамі мясцовых Саветаў Гродзенскай вобласці 25-га склікання сталі 674 прадстаўнікі польскай нацыянальнай супольнасці (21,9 % ад агульнай колькасці дэпутатаў). А сярод 2704 кіраўнікоў арганізацый вобласці 457 (16,9 %), у тым ліку 49 (22,7 %) сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, таксама з'яўляліся палякамі па нацыянальнасці.

14.06.2003 г. быў прыняты Закон «О государственной службе в Республике Беларусь». Нацыянальны аспект адлюстраваны ў артыкулах 22 і 24. Артыкул 22 адлюстроўваючы абмежаванні, звязаныя з дзяржаўнай службай, гучыць наступным чынам: "1.13. запрещается получать от иностранных государств документы, предоставляющие права на льготы и преимущества в связи с политическими, религиозными взглядами или национальной принадлежностью, а равно пользоваться такими льготами и преимуществами, если иное не вытекает из международных договоров Республики Беларусь". Артыкул 24 фіксуе пры паступленні на дзяржаўную службу права: "2. При поступлении на государственную службу, а также при ее прохождении не допускаются какие-либо ограничения и (или)

---

[177] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 20.

[178] Справаздача // ДАВц. Фонд 1966. Воп. 29. Спр. 22. Арк. 24–38.

[179] Тусевич Е. Живём без оглядки на национальность. С. 6–7.

преимущества в зависимости от пола, расы, национальности, социального происхождения, имущественного положения, отношения к религии, убеждений, а также принадлежности к политическим партиям и иным общественным объединениям, за исключением случаев, предусмотренных Конституцией Республики Беларусь” [180].

Права на атрыманне дапамогі з боку дзяржавы ў справе развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі і права на захаванне сваёй гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культуры, у тым ліку прафесійнага і самадзейнага мастацтва. На міжнародным узроўні неабходнасць захавання традыцыйнай культуры розных этнасаў была ўсвядомлена ў канцы ХХ пачатку ХХІ стст., калі Генеральнай Асамблеяй ЮНЭСКА былі прыняты Рэкамендацыі па захаванні фальклору (1989 г.), Усеагульная канвенцыя пра культурную разнастайнасць (2001 г.), Міжнародная канвенцыя пра ахову header нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2004 г.), Канвенцыя пра заахвочванне форм і спосабаў культурнага самавыяўлення (2005 г.) [181]. У іх падкрэслівалася неабходнасць удзелу дзяржаў у захаванні культурнай разнастайнасці, у тым ліку культурнай спадчыны ўсіх этнічных супольнасцей, якія пражываюць у іх.

Неабходнасць захавання этнічнай культуры абумоўлена яе значэннем у жыцці грамадства. Этнакультура выконвае ролю інтэгратара індывідаў у адзіны этнас, з’яўляецца адным з важных шляхоў разумення цэласнасці свету, зыходным базісам любой нацыянальнай культуры. Важнасць удзелу менавіта дзяржаўных органаў у захаванні этнічных культур абумоўлена тым фактам, што дадзеная сфера не з’яўляецца высокапрыбытковай і таму роля прыватных інвестыцый у падтрымцы этнакультуры неістотная.

Дзяржаўныя структуры Беларусі імкнуліся да забеспячэння неабходных умоў для захавання і развіцця культур усіх нацыянальнасцей. Пры гэтым улічваліся аб’ектыўныя асаблівасці фарміравання канкрэтных нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі дзяржавы, ступені захавання іх прадстаўнікамі нацыянальнай культуры і мовы, запытаў і рэальных патрабаванняў прадстаўнікоў нацыянальнай групы. У нашай краіне мелася “Праграма мер па рэгуляванню этнаканфесійнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь”.

У абласцях і раённых цэнтрах Беларусі былі створаны і працавалі камісіі садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацый пры выканкамах. Меліся планы працы, праводзіліся пасяджэнні, фіксаваліся пратаколы, у якіх разглядаліся пытанні “этнаканфесійнай сітуацыі”. На жаль, займаліся камісіі амаль

---

[180] Закон Республики Беларусь от 14 июня 2003 г. №204-З «О государственной службе в Республике Беларусь» // НРПА, 2004 г., № 120, 2/1053 (с изменениями и дополнениями).

[181] Макрушич Е.Н. Роль государства в сохранении этнокультурной идентичности в условиях глобализации // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 132–135.

толькі рэлігійнай дзейнасцю. Міжнацыянальныя адносіны, спрыянне нацыянальнаму адраджэнню і г.д. да 2004 г. уключна не былі прадметам разгляду ніводнага разу.

Сутнасць праграм раскрывае змест ліста Камітэта за № 03–04/328 ад 6.03.2002 г. у Бабруйскі гарвыканкам наконт удасканалення сістэмы працы па рэгуляванню этнаканфесійнай сітуацыі: "…п.2…звярнуць увагу на падтрымку, перад усім, сумесных мерапрыемстваў нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў, якія садзейнічаюць прапагандзе ідэй інтэрнацыяналізму, дружбы народаў і талерантнасці…" [182].

У рэгіёнах ствараліся Каардынацыйныя Рады грамадскіх і нацыянальных аб'яднанняў, палітычных партый і прафсаюзных арганізацый горада. У сакавіку 2005 г. падобная рада ўзнікла ў Магілёве. Мэтай яе стварэння была каардынацыя дзеянняў грамадскіх аб'яднанняў, выпрацоўка прапаноў для органаў дзяржаўнай улады, мясцовага самакіравання, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый наконт развіцця сацыяльнай і грамадскай актыўнасці грамадзян. У склад бюро Рады ўвайшлі прадстаўнікі 7 грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый. Старшынёй Рады стаў старшыня грамадскага аб'яднання "Магілёўская яўрэйская абшчына" [183].

У адпаведнасці з Законам "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" (18.05.2004 г. была прынята новая рэдакцыя Закона) [184] мэтай дзяржавы абвяшчалася адраджэнне і развіццё беларускай нацыянальнай культуры і культур нацыянальных супольнасцей Беларусі, як часткі агульнасусветнай культуры. Артыкулам 3 Закона абвяшчалася права на бесперашкодную культуратворчую дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. У адпаведнасці з артыкулам 10 асобам любой нацыянальнасці і этнічнай групы, якія пражывалі на тэрыторыі краіны, гарантавалася права на развіццё сваёй культуры і мовы, на стварэнне нацыянальных школ, прадпрыемстваў, устаноў культуры (тэатраў, музеяў, выдавецтваў і г.д.), аб'яднанняў, асацыяцый, культурна-асветніцкіх таварыстваў, культурных цэнтраў.

У адпаведнасці з артыкулам 8 Закона "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь" дзяржава садзейнічала стварэнню ўмоў для развіцця адукацыі і культур нацыянальных супольнасцей шляхам выдзялення з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў неабходных для гэтага грашовых сродкаў. На правядзенне культурных мерапрыемстваў нацыянальным культурным аб'яднанням фінансавыя сродкі выдаткоўваліся мэтавым парадкам на конкурснай аснове. Неабходныя для развіцця адукацыі нацыянальных супольнасцей сродкі выдаткоўваліся з дзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў без выдзялення іх з агульных расходаў

---

[182] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 44.

[183] Бубнаў Ю.М., Пушкін І.А. Паліталогія: Курс лекцый. Магілёў, 2006. С. 88.

[184] О культуре в Республике Беларусь : Закон Республики Беларусь от 4 июня 1991 г. № 832–XII, изменения и дополнения: Закон от 14 мая 2001 г. № 16–3.

на адукацыю ў Рэспубліцы Беларусь. З мясцовых бюджэтаў фінансавалася развіццё прафесійнага і самадзейнага мастацтва, даціравалася дзейнасць установ культуры, створаных нацыянальнымі культурнымі аб'яднаннямі. Трэба адзначыць, што ў пэўны час з-за наяўнасці адмоўных з'яў у эканамічным жыцці, сродкі з дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў на культурную дзейнасць нацыянальных культурных аб'яднанняў былі недастатковыя для задавальнення ўсіх іх патрэб.

Напрацаваны за апошнія гады вопыт па дзяржаўнай падтрымцы нацыянальна-культурных фарміраванняў акумуляваўся ў фестывалях нацыянальных культур [185]. У нашай дзяржаве былі створаны мінімальна неабходныя ўмовы для захавання і развіцця культуры нацыянальных супольнасцей, дзейнасці іх арганізацый, установ культуры і адукацыі. Артыкул 10 прадугледжваў падрыхтоўку спецыялістаў для забеспячэння інтарэсаў нацыянальных супольнасцей у галіне адукацыі і культуры ўстановамі адукацыі Рэспублікі Беларусь. У тым ліку на аснове дамоў, якія былі заключаны з грамадскімі аб'яднаннямі нацыянальных супольнасцей.

У адпаведнасці з артыкулам 11 Закона "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь" помнікі гісторыі і культуры нацыянальных супольнасцей, якія знаходзіліся на тэрыторыі краіны, з'яўляліся часткай культуры Рэспублікі Беларусь і ахоўваліся дзяржавай у адпаведнасці з заканадаўствам.

Захаванню гісторыка-культурнай спадчыны нацыянальных супольнасцей садзейнічалі шэраг заканадаўчых актаў і пастаноў Урада. Найбольш важныя нарматыўна-прававыя акты: пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1085 ад 23.07.2001 г. "Аб першачарговых мерах па захаванні і адраджэнні гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі" [186], пастанова Урада Рэспублікі Беларусь № 579 ад 6.05.2002 г. "Аб пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны" [187], пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1395 ад 8.10.2002 г. "Аб сістэме мер, якія забяспечваюць правядзенне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на найбольш важных аб'ектах гісторыка культурнай спадчыны" [188], Указ Прэзыдэнта № 527 ад 18.10.2007 г. "Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны" [189] і інш.

[185] Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т.6. С. 665.

[186] О первоочередных мерах по сохранению и возрождению исторических центров городов Беларуси: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 23 июля 2001 г., № 1085 // НРПА. 2001. № 72. 5/6470.

[187] О вопросах сохранения историко-культурного наследия: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 6 мая 2002 г., № 579 // НРПА. 2002. № 55. 5/10410.

[188] О системе мер, обеспечивающих проведение реставрационно-восстановительных работ на наиболее важных объектах историко-культурного наследия: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 8 окт. 2002 г., № 1395 // НРПА. 2002. № 115. 1/5676.

[189] Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны: Указ Президента Республики Беларусь, 18 окт. 2007 г., № 527 // НРПА. 2007. № 252. 1/9038.

9.01.2006 г. з’явілася новая рэдакцыя Закона “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” [190]. Паводле Артыкула 4 грамадскія аб’яднанні маглі аказваць дзяржаўным органам садзейнічанне ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, папулярызаваць гісторыка-культурныя каштоўнасці, ажыццяўляць грамадскі кантроль за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, уносіць у дзяржаўныя органы прапановы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, садзейнічаць фарміраванню ў грамадзян патрыятызму і адказнасці за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.

Права на ўстанаўленне культурных сувязей з суайчыннікамі за межамі Рэспублікі Беларусь. Гэта права ў практычнай дзейнасці нацыянальных культурных аб’яднанняў і дзяржаўных органаў Беларусі з-за адсутнасці спецыяльнай рэгламентацыі разглядалася даволі шырока. Сувязі з суайчыннікамі за мяжой здзяйсняліся нацыянальнымі культурнымі аб’яднаннямі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з артыкулам 30 Закона “Аб грамадскіх аб’яднаннях” [191], дзе зацверджана, што грамадскія аб’яднанні ў адпаведнасці з іх статутамі маглі ўступаць у міжнародныя грамадскія аб’яднанні, удзельнічаць у стварэнні міжнародных саюзаў грамадскіх аб’яднанняў, падтрымліваць прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя дамовы і пагадненні, прадпрымаць іншыя захады, якія не супярэчылі заканадаўству Рэспублікі Беларусь і яе міжнародным абавязкам.

Права вызнаваць любую рэлігію ці не вызнаваць ніякай, удзельнічаць у выкананні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў на роднай мове. Асновы былі закладзены ў Законе “Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях”, які быў прыняты ў снежні 1992 г.[192]

У рыма-каталіцкіх касцёлах Беларусі вяліся набажэнствы на польскай і беларускай мовах. Кіраўніцтвам Віцебскай вобласці ў 2010 г. была распрацавана праграма “500”. Згодна з ёй на тэрыторыі былога ваеннага гарадка ў Глыбоцкім раёне планавалася стварыць аздараўленча-турыстычны комплекс “Пліса”. У ім прадугледжана стварэнне беларускай і літоўскай вёсак, яўрэйскага мястэчка, татарскай слабады, польскай сядзібы. У кожным паселішчы будзе свая культавая пабудова – царква, касцёл, мячэць, сінагога[193].

Артыкул 12 Закона “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” забараняе стварэнне і дзейнасць ГА нацыянальных супольнасцей, калі гэта супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь аб

---

[190] Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь, 9.01.2006 г., № 98–З // НРПА. 2006. № 9. 2/1195.

[191] Об общественных объединениях: Закон Республики Беларусь, 4 окт. 1994 г., № 3254 – XII: по сост. на 23 сентября 2004 г.

[192] Барыс С. Адраджэнне рэлігійнага жыцця ў Беларусі ў 1988–2003 гг. С. 17.

[193] Региональная программа “500”. С. 10.

грамадскіх аб'яднаннях, альбо калі грамадскія аб'яднанні супольнасцей арганізацыйна злучаны ці з'яўляюцца часткай палітычнай арганізацыі замежнай дзяржавы. Артыкул 3 Закона прадугледжвае, што грамадзяне, якія адносяць сябе да нацыянальных супольнасцей, павінны выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і іншыя заканадаўчыя акты рэспублікі, садзейнічаць захаванню суверэнітэта і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, паважаць традыцыі грамадзян усіх нацыянальнасцей, якія пражываюць на яе тэрыторыі, іх мову і культуру. У 1993 г. прадстаўнікі грамадскіх арганізацый этнічных супольнасцей Беларусі прынялі супольную заяву аб сумеснай дзейнасці на стварэнне такой дзяржавы, дзе будуць гарантаваны правы чалавека кожнай нацыянальнасці. Супольную заяву падпісалі прадстаўнікі ўкраінскай, яўрэйскай, татарскай, польскай, нямецкай і літоўскай нацыянальнасцей і згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" [194].

Аналіз тагачаснага заканадаўства дазваляе казаць аб яго пэўнай недапрацаванасці. Адным з галоўных недахопаў з'яўлялася недакладнасць тэрміналогіі. Так, артыкулам 14 Канстытуцыі замацаваны тэрмін "нацыянальныя супольнасці". Але ў нарматыўных актах, якія з'явіліся пазней, выкарыстоўваўся тэрмін "нацыянальныя меншасці" – Закон "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь" 2003 г., Закон "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" 1998 г. [195] Неабходна вызначыцца на адным тэрміне і выкарыстоўваць яго ва ўсёй заканадаўчай базе краіны. На міжнародным узроўні быў замацаваны тэрмін нацыянальныя меншасці. Напрыклад, Рамачная канвенцыя Савета Еўропы аб ахове нацыянальных меншасцей, Маскоўская канвенцыя Аб забеспячэнні праў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей і інш. Недахопам беларускіх законаў з'яўлялася наяўнасць у артыкулах слоў "або", агаворак "могуць стварацца, па рашэнню выканаўчых і распарадчых органаў". Яны парушалі прынцып артыкула 22 Канстытуцыі аб роўнасці правоў і законных інтарэсаў.

У 2003 г. пад эгідай ГА "Цэнтр па правах чалавека" ў Мінску праходзіла Міжнародная канферэнцыя на тэму "Міжнародна-прававая абарона нацыянальных меншасцей". Удзельнічалі прадстаўнікі органаў судовай і выканаўчай улады Беларусі, вучоныя, юрысты, прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей, эксперты з Вялікабрытаніі, Польшчы, Расіі, ЗША. Быў прыняты выніковы дакумент. У ім, у прыватнасці, адзначалася "…у цэлым становучая сітуацыя з забеспячэннем праў нацменшасцей на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь; стваральная праца дзяржаўных органаў і,

---

[194] Бурая Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.). С. 47.

[195] О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь "О национальных меньшинствах в Республике Беларусь": Закон Рэспублики Беларусь. С. 25–26 ; Иоффе Э.Г. Проблемы реализации прав национальных общностей и законодательство Республики Беларусь. С. 58–62.

перад усім, Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, якія аказваюць дапамогу ў забеспячэнні канстытуцыйных праў нацменшасцей у Беларусі”.

У дакуменце гаварылася, што “ўлічваючы станоўчы вопыт і праблемы суседніх дзяржаў і далёкага замежжа, заклікаем працягваць канструктыўнае супрацоўніцтва органаў улады і кіравання, усіх зацікаўленных НГА і прадстаўнікоў нацменшасцей у справе забеспячэння стабільнасці і падтрымання міру ў Рэспубліцы Беларусь.”

У гэтых мэтах было прапанавана “ўдасканальваць нацыянальнае заканадаўства, з улікам прапаноў удзельнікаў канферэнцыі, для станаўлення грамадзянскай супольнасці і дэмакратызацыі Беларусі.” У шэрагу іншых таксама прагучалі прапановы: “унясенне ў айчыннае заканадаўства паняцця “нацыянальныя меншасці”; увядзенне закона аб рэстытуцыі; унясенне змен у выбарчае заканадаўства для забеспячэння адпаведнага прадстаўніцтва нацыянальных меншасцей у органах улады.”

Адначасова ўдзельнікі зафіксавалі, “што сітуацыя з забеспячэннем канстытуцыйных праў нацменшасцей у Беларусі адзначаецца стабільнасцю і мае тэндэнцыі станоўчага развіцця. Значная заслуга ў гэтым прадстаўнічай улады на месцах і Камітэта…, прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый, грамадзянскага супольніцтва ў цэлым” [196].

Напрыканцы варта адзначыць, што заканадаўства Рэспублікі Беларусь давала магчымасць грамадзянам, якія адносілі сябе да нацыянальных супольнасцей, удзельнічаць у працэсе прыняцця рашэнняў па праблемах, якія закраналі іх правы і інтарэсы, наступнымі шляхамі:

1) Удзел у палітычным працэсе. У адпаведнасці з артыкулам 37 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь грамадзяне мелі права ўдзельнічаць у рашэнні дзяржаўных спраў непасрэдна, так і праз свабодна абраных прадстаўнікоў. Непасрэдны ўдзел грамадзян у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы забяспечваўся правядзеннем рэферэндумаў, абмеркаваннем праектаў законаў і пытанняў рэспубліканскага і мясцовага значэння, іншымі, прадугледжанымі законам спосабамі. У парадку, прадугледжаным заканадаўствам, грамадзяне Рэспублікі Беларусь мелі магчымасць прымаць удзел у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця на рэспубліканскіх і мясцовых зборах. Артыкулам 38 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь было прадугледжана права выбіраць і быць абранымі ў дзяржаўныя органы на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні. Такім чынам, удзел грамадзян, якія належылі да нацыянальных супольнасцей, у палітычным працэсе быў магчымы пасіўным і актыўным удзелам у выбарах, рэферэндумах і г.д. Варыянтам з’яўлялася стварэнне і дзейнасць палітычных партый. У адпаведнасці з артыкулам 5 Канстытуцыі

---

[196] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 52.

палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб’яднанні садзейнічалі выяўленню і вырашэнню палітычнай волі грамадзян, удзельнічалі ў выбарах. У той жа час трэба адзначыць, што ў рэспубліцы з 1999 года не было зарэгістравана ніводнай палітычнай партыі, якая стваралася па этнічнаму прынцыпу або мела выключна этнічныя мэты і задачы.

2) Стварэнне і дзейнасць грамадскіх аб’яднанняў нацыянальна-культурнай накіраванасці. У адпаведнасці з артыкулам 36 Канстытуцыі кожны меў права на свабоду аб’яднанняў. Грамадскія аб’яднанні садзейнічалі выяўленню і выражэнню палітычнай волі грамадзян (артыкул 5 Канстытуцыі). Грамадскія аб’яднанні ствараліся грамадзянамі для рэалізацыі сваіх правоў. Грамадскія аб’яднанні нацыянальна-культурнай накіраванасці ўзаемадзейнічалі з дзяржаўнымі органамі па ўсяму спектру пытанняў, што закраналі правы і інтарэсы грамадзян, якія належылі да нацыянальных супольнасцей.

3) Шляхам падачы зваротаў. У адпаведнасці з артыкулам 40 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожны меў правы накіроўваць асабістыя або калектыўныя звароты ў дзяржаўныя органы. Дзяржаўныя органы, а таксама службовыя асобы былі абавязаны разгледзець зварот і даць адказ у вызначаны законам тэрмін асобам, якія накіравалі зварот. Прадугледжана асабовая адказнасць чыноўнікаў за ігнараванне зваротаў грамадзян.

Такім чынам, пасля атрымання незалежнасці перад дзяржаўнымі структурамі Рэспублікі Беларусь паўстала праблема фарміравання новай нацыянальнай палітыкі ў стаўленні да нацыянальных супольнасцей. На працягу 1990–2000-х гг. была створана нарматыўна-прававая база, якая забяспечыла спрыяльныя ўмовы для развіцця культур нацыянальных супольнасцей Беларусі. Заканадаўчымі актамі Беларусі гарантаваліся шэраг правоў грамадзянам, якія належылі да любой этнічнай групы.

Рэспубліка Беларусь далучылася да асноўных міжнародных канвенцый, пактаў, пратаколаў, якія звязаны з правамі чалавека і чалавечым вымярэннем. Развівала супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі у сферы забеспячэння правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей, перад усім з краінамі – членамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, краінамі – суседзямі Беларусі.

Заканадаўства Беларусі ў сферы гарантый правоў асоб, якія належылі да нацыянальных супольнасцей адпавядала міжнародным стандартам.

### 1.3 Стварэнне і дзейнасць дзяржаўных органаў, якія займаліся вырашэннем праблем нацыянальных супольнасцей

Дзяржаўная ўлада Рэспублікі Беларусь удзяляла асаблівую ўвагу нацыянальнаму пытанню. Гэта можна прасачыць па законатворчай дзейнасці і па стварэнню органаў, якія займаліся вырашэннем праблем нацыянальных супольнасцей.

Пасля атрымання незалежнасці ў Беларусі ўзнікла неабходнасць у рэарганізацыі існуючых і стварэнні новых структур органаў дзяржаўнай улады, у тым ліку ў сферы міжнацыянальных адносін. Рэгуляваннем міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь займаліся прадстаўнічыя і выканаўчыя органы ўлады. Вопыт вырашэння міжнацыянальных праблем у судовым парадку ў краіне адсутнічае. У беларускай навуцы гэта пытанне маладаследавана.

Міжнацыянальныя адносіны ў Беларусі сталі прадметам увагі прадстаўнічых органаў улады толькі з пачатку 1990-х гг. З 1972 да 21.09.1990 г. пытанні міжнацыянальных адносін не знаходзілі адлюстравання ў працы якога–небудзь органа Вярхоўнага Савета (ВС) БССР. Іх разглядам павінен быў займацца аддзел па пытаннях сацыяльнага і культурнага развіцця, потым камісія па народнай асвеце і культуры. Не разглядаліся нацыянальныя праблемы і на сесіях ВС БССР да 2.02.1988 г. [197]. Толькі напрыканцы 1980-х гг., пасля падзей ва Узбекістане, Нагорным Карабахе, Абхазіі і іншых месцах на міжнацыянальныя адносіны звярнулі ўвагу і ў Беларусі.

Пасля правядзення ў 1990 г. выбараў у мясцовыя і Вярхоўны (ВС) саветы сталі адбывацца змены ў падыходах да вырашэння праблем міжнацыянальных адносін і задавальнення інтарэсаў нацыянальных супольнасцей Беларусі ў грамадска-палітычным і культурна-асветным жыцці. Пастановаю Прэзідыума ВС БССР ад 21.09.1990 г. у Сакратарыяце Вярхоўнага Савета ўнутры некаторых аддзелаў былі ўтвораны сектары. У складзе аддзела па пытаннях сацыяльнага і культурнага развіцця з’явіўся сектар па пытаннях адукацыі, культуры і міжнацыянальных адносін. Пастановаю ВС БССР XII склікання ад 1.06.1990 г. былі ўтвораны пастаянныя камісіі, сярод якіх – камісія па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах (Камісія). На гэта паўплывала і тое, што ў той час у вышэйшым органе ўлады краіны – Вярхоўным Савеце СССР – дзейнічала камісія Савета нацыянальнасцей ВС СССР па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах [198].

Пасля вырашэння арганізацыйных пытанняў, на сваім чацвёртым пасяджэнні 24.09.1990 г. члены Камісіі – дэпутаты Вярхоўнага Савета – абмеркавалі зварот агульнага сходу аддзялення польскага культурна-асветнага таварыства імя А. Міцкевіча (Гродна), які адбыўся 14.08.1990 г. Члены таварыства звярталіся да ўладаў з патрабаваннямі “спыніць антыпольскую кампанію ў газетах”, атрымаць магчымасць сустрэчы з кіраўніцтвам Гродзенскай вобласці, прасілі выдзеліць памяшканне для таварыства, дапамагчы ў выданні газеты і стварэнні школ на польскай мове, даць дазвол на змяненне нацыянальнасці з беларускай на польскую і

[197] Сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Стэнаграфічныя справаздачы. Мінск, 1972–1989.
[198] Информация о встрече с представителями комиссий по вопросам национальных отношений // ДАРФ. Фонд Р-9654. Воп. 10. Спр. 109. Арк. 168.

інш. Частка палякаў вобласці патрабавала “забараніць гвалтоўнае набажэнства ў касцёлах на беларускай мове”, што, на нашу думку, ніяк не адпавядала добрым узаемаадносінам беларусаў і палякаў каталіцкага веравызнання і супярэчыла курсу Каталіцкай царквы на ўжыванне падчас набажэнстваў нацыянальных моў краін знаходжання касцёла [199].

04.12.1990 г. Камісія прыняла рашэнне па пытанню “Аб стане адраджэння нацыянальнай культуры і роднай мовы сярод грамадзян польскай нацыянальнасці ў Гродзенскай вобласці і іншых раёнах Беларусі”: рэкамендаваць СМ БССР разгледзець пытанне аб рэгістрацыі Саюза палякаў на Беларусі; вырашыць пытанне аб частковым фінансаванні газеты – органа СПБ; даручыць Гродзенскаму аблвыканкаму і гарвыканкаму разгледзець пытанні аб выдзяленні памяшканняў для СПБ, рэдакцыі газеты, частковым фінансаванні культурна-асветных аддзелаў таварыства; спрыяць хутчэйшаму развіццю польскай мовы; забяспечыць бібліятэкі літаратурай на польскай мове; выдзеліць памяшканні для гуртковай і іншай культурна-масавай дзейнасці; прыняць меры па аднаўленню помнікаў, якія ўшаноўваюць вядомых дзеячаў сумеснай гісторыі і культуры Беларусі і Польшчы. Аб задавальненні грамадска-палітычных і культурных патрэб асоб польскай нацыянальнасці размова таксама вялася на пасяджэннях Камісіі 22.05.1991 г., на якім было разгледжана пытанне “Аб ходзе выканання рашэння Камісіі па адраджэнню польскай культуры і мовы, узнятым Польскім культурна-асветным таварыствам імя А. Міцкевіча” і 09.04.1992 г. калі была заслухана інфармацыя “Аб прапановах СПБ па пытаннях адраджэння польскай мовы і культуры” [200].

Вясною 1991 г. члены Камісіі звярнулі ўвагу на сферу міжнацыянальных адносін. 20.03.1991 г. была заслухана “Інфармацыя вучоных Інстытута сацыялогіі АН БССР аб стане міжнацыянальных адносін у БССР”, а 22.05.1991 г. разглядалася пытанне “Аб падрыхтоўцы праекта Закона “Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп у БССР” [201].

Напрыканцы 1980-х гадоў у Беларусі паўстала праблема нацыянальнага вывучэння Палескага рэгіёна. З’явіўся рух за прызнанне існавання заходне-палескай этнічнай групы (Етвязі). На пасяджэнні Камісіі 20.05.1991 г. абмяркоўвалася пытанне “Аб статуце і праграме грамадска-культурнага аб’яднання “Полісье”. Статут быў прыняты на сходзе 14.04.1990 г. У ім дэкларавалася, што асноўная мэта аб’яднання – садзейнічанне этнакультурнаму адраджэнню Заходняга Палесся (Етвязі). Гэта частка Беларусі разглядалася як асобны край. У Статуце прасочваліся

---

[199] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 62.

[200] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4090. Арк. 125–127; Пратакол пасяджэння камісіі // Там жа. Спр. 4091. Арк. 53.

[201] Пратакол пасяджэння камісіі // Там жа. Спр. 4090. Арк. 310–312,125–127

сепаратысцкія настроі. На пасяджэнні Камісіі частка дэпутатаў выказала заклапочанасць тым, што дзейнасць таварыства ініцыіравалася зверху, з боку выканаўчай улады, і гэта стварае нацыянальную напружанасць у рэспубліцы, вядзе да дэстабілізацыі міжнацыянальных адносін. 12.06.1991 г. Камісіяй разглядаўся "Зварот А.Трушко (А. Наварыча) з прапановаю больш актыўна садзейнічаць развіццю культуры Палескага рэгіёна Беларусі". Выступіў М. Шэляговіч і расказаў аб працы грамадска-культурнага таварыства "Полісьсе". Ён прапанаваў: а) прыняць Закон аб заходне-палескай этнічнай групе народа, б) прыняць пастанову аб фінансаванні работы ГКТ "Палісьсе", в) стварыць заходне-палескі культурна-асветны цэнтр. Дэпутаты прынялі рашэнне: "1) падтрымаць і адобрыць імкненне членаў ГКТ "Палісьсе" да вывучэння народнай культуры, фальклору, дыялекту Палескага рэгіёна... 3) лічыць немэтазгодным прыняцце заканадаўчых актаў па стварэнню якіх-небудзь аўтаномій, навуковых цэнтраў. Жыхары беларускага Палесся з'яўляюцца самабытнай часткай беларускага народа" [202].

02.10.1991 г. прадметам увагі Камісіі стала пытанне "Аб дзейнасці нацыянальных грамадска-культурных аб'яднанняў горада Мінска". На падставе таго, што ў маі 1991 г. пры Мінскім гарадскім аддзяленні Савецкага фонду міра былі зарэгістраваны і дзейнічалі 6 нацыянальных грамадска-культурных аб'яднанняў (татарскае, яўрэйскае, украінскае, рускае, армянскае, азербайджанскае) з агульнай колькасцю сяброў больш за 6000 чалавек, а таксама рашэння 5-й нечарговай сесіі Мінскага гарадскога савета за № 165 ад 05.09.91 г. аб размяшчэнні ў будынку дома палітычнай асветы Мінскага абкама КПБ–КПСС Цэнтра нацыянальных культур, Камісія прыняла рашэнне: 1) прапанаваць Савету Міністраў разгледзець рашэнне Мінскага гарсавета аб утварэнні ў доме палітасветы Цэнтра нацыянальных культур; 2) прапанаваць Дзяржкамдруку і Міністэрству культуры забяспечыць бібліятэкі літаратурай на мовах нацсупольнасцей; 3) прапанаваць Вярхоўнаму Савету каапатаваць у склад Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах ВС РБ з правам дарадчага голаса прадстаўнікоў нацыянальных грамадска-культурных аб'яднанняў рэспублікі [203].

16.12.1991 г. Камісіяй разглядаўся праект канцэпцыі Закона "Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп у Рэспубліцы Беларусь". Напрыканцы 1991 г. збіраліся заўвагі і прапановы камісій Вярхоўнага Савета, выканаўчых органаў улады, нацыянальных грамадскіх арганізацый да прапанаванага праекта Закона. Сам праект быў адобраны і прапанаваны 10.03.92 г. на разгляд 9 сесіі ВС РБ [204].

---

[202] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4090. Арк. 107–136.
[203] Пратакол пасяджэння камісіі // Там жа. Арк. 139–147.
[204] Пратакол пасяджэння камісіі // Там жа. Арк. 174–175.

Абмеркаванне і прыняцце праекта Закона “Аб свабодным развіцці нацыянальных груп у Рэспубліцы Беларусь” адбылося на сесіі ВС 23.04.1992 г. Вярхоўны Савет адобрыў праект Закона ў першым чытанні. Распачаўся працэс дапрацоўкі праекта Закона. Паступіла шэраг заўваг і прапаноў ад Камісій ВС (некаторыя камісіі наогул выступілі супраць прыняцця такога Закона), асобных дэпутатаў, ад грамадскіх арганізацый [205]. З ліпеня 1992 г. праект Закона ўжо рыхтаваўся пад назвай “Аб нацыянальных меншасцях”. У другім чытанні праект Закона “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” разглядаўся на Камісіі 24.08.92 г. і 19.10.92 г., быў адобраны і рэкамендаваны сесіі ВС.

11.11.1992 г. пастановаю Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь уведзены ў дзеянне Закон “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” [206]. У яго змест уносіліся змяненні і дапаўненні ў 2004, 2007 гг. [207]

24.08.1992 г. былі прыняты асноўныя напрамкі канцэпцыі работы Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах. У прыватнасці ў іх былі зафіксаваны: станаўленне беларускай дзяржавы, беларускае нацыянальнае адраджэнне, адраджэнне нацыянальнай свядомасці нацыянальных супольнасцей і г.д. 7.12.1992 г. на пасяджэнні Камісіі аналізавалася работа мясцовых саветаў народных дэпутатаў Гомельскай вобласці па ўдасканаленню міжнацыянальных адносін. Сярод іншага было зафіксавана існаванне насцярожаных адносін часткі рускага насельніцтва да палітыкі беларускага адраджэння [208].

Дэпутаты – члены Камісіі 20.01.1993 г. – пазнаёміліся з інфармацыяй Э.К. Дарашэвіча аб выніках сацыялагічнага даследавання міжнацыянальных адносін беларускага памежжа на матэрыялах Заходняга Палесся (Маларыцкі, Іванаўскі, Кобрынскі, Пінскі раёны). Адзначалася, што 81,8 % ад агульнай колькасці апытаных не выступалі за якую-небудзь аўтаномію і лічылі сябе беларусамі. 61,7% лічылі немэтазгодным вылучэнне Заходняга Палесся ў самастойны культурна-моўны рэгіён у Рэспубліцы Беларусь, 7,3 % падтрымалі ідэю аўтаноміі. Аўтары аналітычнай запіскі зрабілі выснову, што ў Беларусі “праблем асобнага палескага этнасу няма ў народнай этнічнай свядомасці”. Было адзначана, што ў Заходнім Палессі насельніцтва гаворыць на рускай мове – 53,6 %, беларускай – 12,6 %, украінскай – 3,6 %, польскай – 0,6 %, на мясцовай мове (гаворцы) – 49,72 %. На пытанне “Ці магчымы ў рэгіёне міжнацыянальныя канфлікты” рэспандэнты адказалі: немагчымы – 45,8 %, могуць быць нязначныя канфлікты – 33,2 %, маецца глеба для сур’ёзных канфліктаў – 8,4 %, не далі адказу – 12,6 %. Апытванне засведчыла, што ў Кобрынскім раёне

[205] Матэрыялы да пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4095. Арк. 12–14.
[206] Пастанова Вярхоўнага Савета // Там жа. Арк. 1, 117.
[207] О национальных меньшинствах в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь 11 ноября 1992 г. № 1926–XII, изменения и дополнения: Закон от 5 января 2004 г.
[208] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4091. Арк. 92–94, 160–165.

адзначаецца супрацьстаянне праўкраінскіх палешукоў і тых, хто (аб'яднанне "Полісьсе") за самастойнасць Заходняга Палесся як адміністратыўна-моўнай і гаспадарча-эканамічнай адзінкі [209].

Апошняе пасяджэнне Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах адбылося 26.01.1993 г. У першай палове лютага 1993 г. адбылося яе перайменаванне. У сувязі з гэтым ужо Камісія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай палітыцы і пытаннях Садружнасці Незалежных Дзяржаў сабралася 24.02.1993 г., каб удакладніць асноўныя кірункі (Канцэпцыю) работы [210].

8.12.1993 г. на пасяджэнні Камісіі разглядалася пытанне "Аб выкананні Закона Рэспублікі Беларусь "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь". На абмеркаванні вынікаў дзеяння Закона прысутнічалі прадстаўнікі органаў выканаўчай улады і прадстаўнікі нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў: рускай культуры "Русь", "Малдова", армян "Айястан", немцаў Беларусі "Адраджэнне", татар-мусульман "Аль-Кітаб", СПБ; асацыяцый: карэйцаў, яўрэйскіх арганізацый Беларусі, украінцаў "Ватра". Неабходнасць гэтай сустрэчы была выклікана тым, што мінуў год, як быў прыняты Закон, і таму было варта абмеркаваць, як працуе Закон на месцах, падзяліцца вопытам, вызначыць праблемы, складанасці. Ад дэпутатаў, членаў камісіі, прадстаўнікоў нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў прагучала шэраг заўваг і прапаноў: а) адсутнічала фінансавая падтрымка нацыянальных таварыстваў з боку дзяржавы; б) мясцовыя ўлады не дазвалялі нацыянальным грамадскім аб'яднанням займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю; в) артыкул 5 Закона меў дэкларатыўны характар; г) у м. Свір Мядзельскага раёна мясцовыя ўлады не далі дазвол на правядзенне сходу СПБ, перашкаджалі адкрыццю польскамоўных класаў у г. Ліда; д) камісія ВС па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны займалася толькі адраджэннем беларускай мовы і культуры і не дапамагала іншым нацыянальным супольнасцям; е) былі патрэбны падатковыя ільготы; ж) пры Савеце Міністраў патрэбна стварыць фонд дапамогі нацыянальным супольнасцям; з) стварыць у цэнтры г. Мінска цэнтр нацыянальных культур; і) у раёнах было складана атрымаць памяшканне для дзейнасці аб'яднанняў.

Члены Камісіі адзначылі, што некаторыя грамадскія аб'яднанні сталі займацца палітычнай дзейнасцю, у прыватнасці, па ініцыятыве СПБ у Гродна адбыўся з'езд ветэранаў Арміі Краёвай, чыя дзейнасць у беларускай гісторыі ацэньваецца неадназначна. У адказ з боку прадстаўнікоў украінскага і татарскага аб'яднанняў прагучала: "калі мы падпісваем нешта са згоды ўладаў – гэта добра, а калі падпісваем нешта

[209] Аналітычная запіска аб выніках сацыялагічнага даследавання // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4092. Арк. 10–12.
[210] Пратакол пасяджэння камісіі // Там жа. Арк. 23.

іншае – гэта палітыка і парушэнне статута". У выніку было адзначана, што адбылося плённае абмеркаванне праблем нацыянальных супольнасцей. Ніякіх канкрэтных рашэнняў Камісіяй не было прынята і толькі запланавалі правядзенне ў канцы снежня пасяджэння Камісіі з удзелам прадстаўнікоў выканаўчай улады (Савета Міністраў, міністэрстваў адукацыі, культуры, інфармацыі, савета па справах рэлігіі), на якім збіраліся абмеркаваць практычныя пытанні рэалізацыі Закона "Аб нацыянальных меншасцях" [211].

15.03.1994 г. у Рэспубліцы Беларусь была прынята Канстытуцыя. Дэпутаты парламенцкіх камісій, якія адказвалі за сферу міжнацыянальных адносін, спрычыніліся да яе распрацоўкі і ўнясенні змен. У Канстытуцыі тэрмін "нацыянальныя меншасці" адсутнічае [212].

17.03.1994 г. на пасяджэнні Камісіі было заслухана пытанне "Аб будаўніцтве Літоўскага культурна-асветніцкага цэнтра ў в. Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці". Будаўніцтва цэнтра было задумана яшчэ ў 1990 г. З 18.09.1990 г. распачалося будаўніцтва. Да пачатку 1994 г. узнік канфлікт паміж мясцовымі ўладамі і Літоўскай Рэспублікай наконт завяршэння будаўніцтва (крыніц фінансавання) і таго, хто будзе гаспадаром цэнтра. Гродзенскі аблвыканкам нават прыняў рашэнне аб спыненні будаўнічых прац. Камісія, заслухаўшы экспертаў і абмеркаваўшы дакументы, вырашыла, што неабходна правесці перамовы з літоўскім бокам, завяршыць будаўніцтва і пасля гэтага вызначыць уладальнікаў цэнтра. Яго ўрачыстае адкрыццё адбылося 18.03.2001 г.[213].

Пасля правядзення ў Рэспубліцы Беларусь выбараў Прэзідэнта сталі адбывацца змены ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Закранулі яны і дзейнасць вышэйшага заканадаўчага органа ўлады.

Пастановаю ВС Рэспублікі Беларусь (XIII склікання) ад 16.01.1996 г. была ўтворана камісія па правах чалавека, нацыянальных пытаннях, СМІ, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі. За увесь час свайго існавання і дзейнасці (23.01.1996 г.–12.10.1996 г.) яна толькі аднойчы 30.05.1996 г. звярнула сваю ўвагу на нацыянальнае пытанне ў Беларусі. Дэпутатаў пазнаёмілі з прапановамі інстытута "Белінфарпрагноз" правесці для ВС сацыялагічныя даследаванні на тэму "Заканадаўчыя асновы рэгулявання міжнацыянальных і рэлігійных адносін у Рэспубліцы Беларусь". Было вырашана правесці гэтыя даследаванні [214].

Пасля правядзення ў 1996 г. рэферэндуму адбыліся змяненні назвы, паўнамоцтваў і структуры вышэйшага заканадаўчага органа краіны. У Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь была

[211] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4092. Арк. 106–111.
[212] Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г.
[213] Праграма адкрыцця літоўскага культурнага цэнтра ў Рымдзюнах // LVNA. Фонд 78. Воп. 1. Спр. 163. Арк. 17–18.
[214] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4669. Арк. 49.

створана Пастаянная камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. У Савеце Рэспублікі міжнацыянальныя адносіны ўваходзяць у круг пытанняў Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю.

Парламенцкія камісіі Рэспублікі Беларусь, якія адказвалі за нацыянальнае пытанне, у розны час сваёй дзейнасці прымалі ўдзел у падрыхтоўцы і распрацоўцы праектаў законаў: "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь" (прыняты ў 1991 г.), "Аб мовах" (1990 г., змяненні і дапаўненні 1998 г.), "Аб культуры" (1991 г., 2001 г.), "Аб адукацыі" (1991 г.), "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (1992 г., 2006 г.), "Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь" (1993 г., 2005 г.), "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (1994 г., 2004 г.), "Аб бежанцах" (1995 г., 1999 г.), "Аб дзяржаўнай службе" (2003 г.), "Аб супрацьдзеянні экстрэмізму" (2007 г.), у якіх адлюстраваны пэўныя аспекты рэгулявання міжнацыянальных адносін [215].

Спецыяльных дзяржаўных органаў у сістэме вышэйшай выканаўчай улады, якія займаліся праблемамі нацыянальных супольнасцей, у рэспубліцы да сярэдзіны 1990-х гг. не існавала, не было і механізмаў супрацоўніцтва ўладных структур і аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей. Развіццём адукацыі на роднай мове нацыянальных супольнасцей займалася Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Падтрымку і фінансаванне культурных ініцыятыў нацыянальных супольнасцей ажыццяўляла Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Яно арганізацыйна і фінансава падтрымала арганізацыю фестываляў польскай песні, вылучала сродкі на правядзенне конкурсаў, выстаў, утрыманне мастацкіх калектываў аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей, мэтанакіравана займалася забеспячэннем спрыяльных умоў для развіцця мастацкай творчасці нацыянальных супольнасцей [216].

У мэтах эфектыўнага супрацоўніцтва дзяржаўных органаў кіравання Рэспублікі Беларусь і нацыянальных грамадскіх арганізацый у студзені 1995 г. была створана Кардынацыйная рада па справах нацыянальных супольнасцей пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. У яе склад увайшлі прадстаўнікі міністэрстваў і іншых органаў цэнтральнага кіравання, кіраўнікі нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў. Старшынёй рады з'яўляўся намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Рада павінна была садзейнічаць захаванню і развіццю культур

[215] Осипов А. Этнокультурная политика в Беларуси: сопоставление с международным контекстом // Вопросы меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире. С. 189–190; Пушкін І.А. Заканадаўчыя асновы міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1. 2012. № 1. С. 71–76; Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 10–21.

[216] Дакументы аб праекце міжурадавага пагаднення Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча аб нацыянальных меншасцях, супрацоўніцтве Міністэрства з нацыянальнымі культурнымі аб'яднаннямі нацыянальных меншасцей і іншым пытанням (18.05.–15.12.1993 г.) // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 33. Арк. 11, 22.

нацыянальных супольнасцей, але яе рашэнні насілі рэкамендацыйны характар.

У студзені 1997 г. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў падпісаны ўказ “Аб сістэме рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных ураду Рэспублікі Беларусь”, паводле якога Рада па справах рэлігій пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь ператваралася ў Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

17.04.1997 г. была прынята пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 362 “Пытанні Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь”, якое зацвердзіла “Палажэнне аб Дзяржаўным камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь”, а пастановай Савета Міністраў № 164 ад 06.07.2004 г. было зацверджана Палажэнне “Аб камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей”. У адпаведнасці з артыкулам першым Палажэння Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь з’яўляўся рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і падпарадкоўваўся Ураду Рэспублікі Беларусь. Яго асноўныя задачы, абавязкі, правы і паўнамоцтвы раскрыты ў манаграфіі “Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.)” [217].

У лістападзе 2001 г. Дзяржкамітэт быў пераутвораны ў Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры СМ РБ, які з’яўляўся рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і падпарадкоўваўся Ураду.

15.07.2006 г. пастановай № 891 Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей быў рэарганізаваны, і ў структуры Ураду Беларусі з’явіўся апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей [218]. Упаўнаважаны прызначаецца на пасаду Прэзідэнтам па прапанове Савета Міністраў і падпарадкоўваецца Ураду. Пры Упаўнаважаным дзейнічаюць кансультатыўныя Міжэтнічая рада і Экспертная рада.

На рэгіянальным і мясцовым узроўні ва ўсіх абласных выканаўчых камітэтах, а таксама ў Мінскім гарвыканкаме былі створаны саветы (аддзелы) па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Іх задачы галоўным чынам аналагічныя кругу задач, якія вырашаюцца Упаўнаважаным, за выключэннем удзелу ў распрацоўцы заканадаўства і міжнароднага супрацоўніцтва. У абласцях і гарадах стваралісця Каардынацыйныя рады грамадскіх і нацыянальных аб’яднанняў, палітычных партый і прафсаюзных арганізацый. Правядзеннем культурных мерапрыемстаў для нацыянальных супольнасцей, камплектаваннем бібліятэчных фондаў на

[217] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 41–44.

[218] Палажэнне аб апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей // http://www.pravoby.info/documenta/part0/akta0943.htm

мовах супольнасцей у ліку іншага займаліся аддзелы культуры адпаведных выканкамаў.

Аналіз дзейнасці дзяржаўных органаў па рэгуляванню міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь дазваляе вылучыць некалькі этапаў: 1) першая палова 1990-х гг. – гэта перыяд, калі дзяржава прытрымлівалася ліберальнай мадэлі нацыянальна-канфесійных адносін. Праводзілася палітыка неўмяшальніцтва ў дзейнасць грамадскіх нацыянальна-культурных аб’яднанняў; 2) з 1996 г. – этап характарызуецца паступовым адыходам ад ліберальнай да мадэлі супрацоўніцтва (кааперацыйнай мадэлі) дзяржаўна-нацыянальных адносін; 3) з пачатку 2000-х гг. у нацыянальнай палітыцы заўважаецца імкненне да кантролю, унармавання і рэгулявання грамадскай дзейнасці, пераважае падтрымка інтэрнацыянальнага і выкарыстоўванне праграмных метадаў працы.

### 1.4 Асноўныя кірункі нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь

Акрамя забеспячэння рэалізацыі правоў нацыянальных супольнасцей, якія прадугледжаны згодна з заканадаўствам краіны (гл. раздзел “Заканадаўчае забеспячэнне нацыянальна-дзяржаўных адносін у Рэспубліцы Беларусь”), прадстаўнічыя і выканаўчыя органы засяроджвалі сваю дзейнасць найперш у культурна-асветніцкім накірунку.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за № 1587 ад 02.12.1997 г. “Аб каардынацыйным Савеце па справах нацыянальных супольнасцей Беларусі” было вырашана стварыць напачатку 1998 г. пры Дзяржаўным камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей – Каардынацыйную Раду па справах нацыянальных супольнасцей для садзейнічання рэалізацыі правоў грамадзян розных нацыянальнасцей, каардынацыі дзейнасці рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання па стварэнню ўмоў і аказанню дапамогі ў асветніцкай дзейнасці аб’яднанням нацыянальных супольнасцей Беларусі, выпрацоўкі рэкамендацый па практычнаму ўвасабленню дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі. Рада таксама павінна была разглядаць пытанні ўзаемадзеяння з беларускім замежжам. Рада стваралася як грамадскае фарміраванне. У яе склад увайшлі прадстаўнікі міністэрстваў, органаў кіравання, нацыянальна-культурных аб’яднанняў Беларусі [219].

У чэрвені 2001 г. адбылося абнаўленне складу Каардынацыйнай Рады. На яе пасяджэннях абмяркоўваліся найбольш актуальныя пытанні міжнацыянальных адносін і статутнай дзейнасці аб’яднанняў. Форма такога самакіравання ў асяроддзі этнакультурных супольнасцей сведчыла

[219] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 46 ; Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. 2008. № 1. С. 50–51.

пра адсутнасць канфрантацыі паміж нацыянальнасцямі, якія пражывалі ў рэспубліцы, і давала ім магчымасць самім фарміраваць грамадскую дзейнасць і атрымліваць падтрымку з боку дзяржавы на рэалізацыю арганізаваных імі праектаў і мерапрыемстваў адкрыта і празрыста, на роўных правах і ўмовах. У той жа час праз Раду дзяржава кантралявала і накіроўвала дзейнасць нацыянальных аб’яднанняў.

23.03.2004 г.у Камітэце па справах рэлігіі і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Беларусі адбылася сустрэча з кіраўнікамі грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей. У прынятай рэзалюцыі адзначалася: “…п.2. Прызнаць мэтазгодным стварэнне Кансультатыўнай рады грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей пры Камітэце, якая будзе спрыяць пашырэнню магчымасцей грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей у іх статутнай дзейнасці і дапамогі ад зацікаўленых” [220].

Дадзеная Кансультатыўная міжэтнічная рада пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей (далей – Рада) была створана ў 2004 г. і перазацверджана ў адпаведнасці з Палажэннем аб Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей і яго апараце, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15.07.2006 г. за № 891. Апошняе Палажэнне зацверджана загадам № 7 Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей 23.01.2010 г.

Рада ў рамках сваёй кампетэнцыі супрацоўнічала з Упаўнаважаным, рыхтавала прапановы па ўдасканаленню ўзаемадзеяння грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей, каардынавала дзейнасць грамадскіх аб’яднанняў, прадстаўнікі якіх уваходзілі ў склад Рады.

Асноўнымі задачамі Рады было: а) садзейнічанне захаванню і ўмацаванню міжнацыянальнай згоды ў Рэспубліцы Беларусь; б) садзейнічанне інтэграванню грамадзян розных нацыянальнасцей у беларускае грамадства; фарміраванню ў грамадстве ўсведамлення і прызнання таго, што ўсе нацыянальныя супольнасці з’яўляюцца неад’емнай часткай народа Рэспублікі Беларусь; папулярызацыя каштоўнасці этнакультурнай разнастайнасці беларускага грамадства і шматвяковай традыцыі мірнага сумеснага пражывання ў краіне розных нацыянальных супольнасцей; в) садзейнічанне стварэнню адпаведных умоў для рэалізацыі праў грамадзян розных нацыянальнасцей на адраджэнне сваіх нацыянальных каштоўнасцей, адукацыйна-асветніцкай, культурна-творчай, інфармацыйнай і іншай дзейнасці ў адпаведнасці са статутамі грамадскіх аб’яднанняў; г) дапамога абмену ў сферы культуры паміж грамадзянамі розных нацыянальнасцей і іх грамадскімі аб’яднаннямі, развіццю сувязей з краінамі паходжання гэтых грамадзян; садзейнічанне ўсталяванню высокай культуры міжнацыянальных адносін;

[220] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 52.

д) садзейнічанне фарміраванню ў грамадстве негатыўнага стаўлення да праяў нецярпімасці, знявагі і дыскрымінацыі па нацыянальных прыкметах.

У 2010 г. у склад Рады ўваходзілі 25 членаў – прадстаўнікоў нацыянальна-культурных грамадскіх аб’яднанняў і іх саюзаў, зарэгістраваных у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Сярод іншага, па прапанове Упаўнаважанага, Рада размяркоўвала дзяржаўныя фінансавыя сродкі, накіраваныя на падтрымку праектаў з удзелам нацыянальных супольнасцей. Кожны з прэтэндэнтаў на атрыманне фінансавай падтрымкі абгрунтоўваў перад сваімі калегамі неабходнасць яе атрымання, прычым суаднесіў яе з запатрабаваннямі іншых нацыянальных супольнасцей. Аналіз вылучэння фінансавай падтрымкі ў такім фармаце паказаў, што з моманту яе ўводзін (з 2007 г.), сумы, размеркаваныя паміж супольнасцямі, апынуліся прыкладна аднолькавымі, у адрозненне ад папярэдніх гадоў працы Рады (створана ў 2004 г.). Прычым некаторыя нацыянальныя супольнасці, якія мелі лепшае фінансавае становішча, у большасці выпадкаў здымалі свае заяўкі з удзелу ў размеркаванні сродкаў на карысць іншых нацыянальна-культурных аб’яднанняў.

Па звароту Рады ў 2008 г. апаратам Упаўнаважанага сумесна з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам на разгляд Рэспубліканскай камісіі па парадкаванню выкарыстання адміністрацыйных будынкаў, збудаванняў, вытворчых плошчаў і іншых аб’ектаў дзяржаўнай уласнасці было вынесена пытанне пра ўсталяванне паніжальнага каэфіцыента, які ўжываўся пры вызначэнні памераў арэнднай платы шэрагу грамадскіх этнакультурных аб’яднанняў. У 2010 г. па хадайніцтве Упаўнаважанага ў дачыненні 40 рэспубліканскіх і рэгіянальных грамадскіх нацыянальна-культурных аб’яднанняў дадзенае пытанне было вырашаны станоўча. Аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам прымалі рашэнні пра ільготнае падаткаабкладанне нацыянальных аб’яднанняў у гарадах і раёнах, на тэрыторыі якіх яны дзейнічалі. Прымаліся рашэнні пра поўнае вызваленне ад падаткаў на зямлю і нерухомасць ці зніжэнні іх на 50 працэнтаў [221].

Вялікі аб’ём працы па каардынацыі дзейнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый ускладаўся на Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, у кампетэнцыю якога ўваходзіла арганізацыйна-метадычная дапамога і матэрыяльная падтрымка нацыянальных супольнасцей у справе адраджэння і далейшага развіцця нацыянальных культур. Тут была складзена картатэка нацыянальных самадзейных мастацкіх калектываў, народных майстроў з мэтай далучэння іх да сваёй дзейнасці, аказання ім матэрыяльнай і іншай неабходнай дапамогі [222].

На базе Цэнтра ў 1995–1996 гг. дзейнічалі шэраг самадзейных

---

[221] Рыбаков М.Л. О межнациональных отношениях и государственной политике в Республике Беларусь // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 19–22.

[222] Паўлоўская В.П. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна–асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў ХХ стагоддзі. С. 158.

мастацкіх калектываў нацыянальных супольнасцей: хор “Руская песня”, хоры ўкраінскай і польскай песні, дзіцячыя ансамблі ўкраінскага танца і польскай песні, вакальны ансамбль “Шматгалоссе”. Пры садзейнічанні Цэнтра нацыянальна-культурныя аб’яднанні праводзілі свае святы: татарскі “Курбан-Байрам”, яўрэйскія “Пурым”, “Ханука”, малдаўскае свята вясны “Мертышор” і іншыя [223]. У 1995 г. Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур арганізаваў археалагічную экспедыцыю па месцах кампактнага пражывання татар у Беларусі. Адной з задач экспедыцыі было звярнуць увагу органаў мясцовых уладаў на праблему развіцця татарскай культуры, захавання татарскіх могілак-мізараў. Паралельна праходзіў пошук старапісаных кніг-кітабаў [224].

Для дзеячаў культуры ў 1997–1998 гг. былі прыняты палажэнні аб прысуджэнні прэміі “За духоўнае адраджэнне”, палажэнне аб ганаровай грамаце Міністэрства культуры, аб ганаровай грамаце Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Імі ўзнагароджваліся асобы за стварэнне твораў, якія садзейнічалі сцвярджэнню духоўных каштоўнасцей і ідэй сяброўства і братэрства паміж людзьмі розных нацыянальнасцей і веравызнанняў. Указам А.Лукашэнка ад 15.04.1998 г. быў створаны Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Мэтай стварэння гэтага фонду было фінансаванне праграм развіцця культуры і мастацтва: выплата грантаў, арганізацыя фестываляў, выстаў, і г.д. [225]

Механізм супрацоўніцтва ўладных структур і аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей на рэгіянальным узроўні ажыццяўлялі саветы па справах рэлігій і нацыянальнасцей, якія дзейнічалі пры абласных выканаўчых камітэтах. Задачы саветаў – абарона праў нацыянальных супольнасцей, забеспячэнне ім роўных з беларусамі праў ва ўсіх сферах жыцця, стварэнне спрыяльных умоў для захавання іх этнічных своеасаблівасцей.

У абласцях і раённых цэнтрах Беларусі былі створаны і працавалі камісіі садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацый пры выканкамах. Меліся планы працы, праводзіліся пасяджэнні, фіксаваліся пратаколы, у якіх разглядаліся пытанні “этнаканфесійнай сітуацыі”. На жаль, займаліся камісіі амаль толькі рэлігійнай дзейнасцю.

У Беларусі існавала “Праграма мер па рэгуляванню этнаканфесійнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь”. 30.11.2006 г. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь была ўзгоднена чарговая “Праграма развіцця

---

[223] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 53.

[224] Паўлоўская В.П. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна–асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе. С. 158.

[225] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 50.

канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2006–2010 гг.”, якая была распрацавана апаратам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей [226].

Адпаведна аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам распрацоўваліся і дзейнічалі рэгіянальныя праграмы. Яны, як правіла, былі разлічаны на два гады. У 2003 г. былі прыняты рэгіянальнымі ўладамі праграмы па працы з нацыянальнымі супольнасцямі на 2004–2005 гг., у 2005 г. на 2006–2007 гг. і г.д.

Планы мерапрыемстваў па выкананню абласных і рэспубліканскай праграм развіцця дадзеных сфер непасрэдна на месцах рэалізоўвалі гар- і райвыканкамы. Напрыклад, Іеўскі РВК паведамляў: “ у выкананне праграмы: 3.06.2000 г. танцавальны калектыў “Студзенька” Юрацішкаўскага ДК прыняў удзел у абласным свяце нацыянальных культур у Гродна; 10.06.2000 г. раён быў прадстаўлены ў культуралагічным праекце “Траецкі кірмаш”; у жнівені 2000 г. у Польшчы ў міжнародным фестывалі фальклору ўдзельнічаў хор польскай песні “Івянка” [227].

У Беларусі фарміравалася такая мадэль дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных супольнасцей, пры якой вядучая роля адводзілася дзейнасці грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей пры матэрыяльнай і арганізацыйнай падтрымцы дзяржаўных структур. Гэта, з аднаго боку, дазваляла прадстаўнікам нацыянальных супольнасцей адносна самастойна вырашаць пытанне пра неабходнасць захавання сваёй этнічнай самабытнасці і вызначаць прыярытэты дзейнасці ў гэтым кірунку. З другога боку, у Беларусі была магчыма дзейнасць грамадскіх арганізацый, у тым ліку нацыянальных, толькі з моманту іх афіцыйнай рэгістрацыі органамі выканаўчай улады, якія і фарміравалі ў краіне нацыянальную палітыку. Праваздольнасць і дзеяздольнасць ГА ўзнікала толькі з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі незалежна ад віду і тычылася як канстытуцыйна-прававых адносін, так і іншых праваадносін [228]. Гэта дазваляла дзяржаве кантраляваць працэсы нацыянальнага развіцця і стрымлівала грамадскія ініцыятывы, асабліва тыя, што не адпавядалі асноўным кірункам дзейнасці афіцыйных улад. Прычым існавалі патрабаванні з боку дзяржавы, каб нацыянальныя ГА выступалі толькі ад імя сваіх членаў, а не ад імя ўсёй супольнасці.

Афіцыйныя ўлады ў першую чаргу патрымлівалі тыя мерапрыемствы нацыянальна-культурных грамадскіх аб’яднанняў, якія

---

[226] Рыбаков М.Л. О межнациональных отношениях и государственной политике в Республике Беларусь // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном. С. 19–22 ; Программа развития конфессиональной сферы, национальных отношений и сотрудничества с соотечественниками за рубежом на 2006–2010 годы. Согласована Советом Министров Республики Беларусь 30.11.2006. Минск, 2006.

[227] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 44.

[228] Дашкевіч А.Л. Грамадскія аб’яднанні як суб’екты канстытуцыйна-прававых адносін у Рэспубліцы Беларусь // Право и демократия: сб. науч. тр. Вып. 21). Минск, 2010. С. 40.

праводзіліся сумесна і садзейнічалі прапагандзе ідэй інтэрнацыяналізму, сяброўства народаў і талерантнасці.

Дзяржкамітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей актыўна дапамагаў нацыянальна-культурным аб’яднанням у фінансаванні выдання кніг і перыёдыкі, правядзенні культурных мерапрыемстваў: выстаў, свят. Грамадскімі аб’яднаннямі нацыянальных супольнасцей сумесна з дзяржаўнымі структурамі былі арганізаваны і праведзены розныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, якія можна класіфікаваць наступным чынам: 1) арганізацыя этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі; 2) вывучэнне гісторыі і культуры сваёй этнічнай групы (правядзенне навуковых канферэнцый, выпуск іх матэрыялаў); 3) правядзенне вечароў, выстаў, канцэртаў і фестывалей [229].

Так у 1997 г. адзначалася 600-годдзе пасялення татараў на беларускіх землях. Дзяржкамітэт аказаў фінансавую дапамогу ГА “Аль-Кітаб” у правядзенні ўрачыстага сходу, выставы па гісторыі і культуры татараў Беларусі, свята “Курбан-Байрам” у Навагрудку, Іўе, Смілавічах, стварэнні відэастужкі пра жыццё татараў у Беларусі, удзеле дэлегацыі аб’яднання “Аль-Кітаб” у Другім сусветным кангрэсе татараў.

За кошт Камітэта ў 1997 г. была выдадзена кніга “Яўрэі: па старонках гісторыі” (складальнік С. Асіноўскі), у 1998 г. – С. Тэна “Карэйцы ў Беларусі”. Нямецкім цэнтрам “Адраджэнне” быў заснаваны свой літаратурны альманах “Як справы?”, першы выпуск якога надрукаваны ў 1998 г. за кошт сродкаў Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь. За кошт дзяржаўных сродкаў у 1997–1998 гг. выйшлі ў свет на рускай мове (пераклад з яўрэйскага) кніга вершаў і паэм класіка яўрэйскай літаратуры Ізі Харыка “Адсюль крычу ў будучыя гады..,”, на некалькіх мовах часопіс “Байрам” і г.д.[230] У 1998 г. былі надрукаваны “Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай С.Х. Александровічу”, у 1999 г. па заказе Дзяржкамітэта ў БДУК распрацоўваўся вучэбны дапаможнік “Татаразнаўства”.

Пры падтрымцы дзяржавы ў Беларусі былі выдадзены кнігі пра карэйцаў, чувашаў, татараў, азербайджанцаў, палякаў, латышоў, яўрэяў у Беларусі. 2.02.2004 г. у Мінскім Палацы культуры ветэранаў адбылося ўрачыстае пасяджэнне, якое было прысвечана 10-годдзю стварэння Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Рэспубліцы Беларусь. На пасяджэнні прысутнічалі прадстаўнікі ўрада, пасольстваў мусульманскіх краін, гарвыканкама, рэлігійных аб’яднанняў мусульман, многіх грамадскіх аб’яднанняў, журналісты [231].

[229] Макрушич Е.Н. Роль государства в сохранении этнокультурной идентичности в условиях глобализации // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 132–135.
[230] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 51.
[231] Канапацкі І. Татары-мусульмане ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 7. С. 40.

Дзяржкамітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей аказваў дапамогу і ў іншых сферах. Так, напрыклад, хадайнічаў перад БДУ аб залічэнні юрыста грамадскага нацыянальнага аб'яднання азербайджанцаў Беларусі "Габустан" Ф.С. Тагіева саіскальнікам па тэме "Грамадзянства Беларусі і Азербайджана". Ён праводзіў навуковае даследванне на тэму "Азербайджанцы ў Беларусі" (з 1917 года), якая на погляд Камітэта мела перспектыву і практычную каштоўнасць. Паводле звароту аб'яднання цыган Камітэт 21.06.2004 г. накіраваў ліст-хадайніцтва на імя Міністра аховы здароўя аб залічэнні цыганскай дзяўчыны ў медыцынскі ўніверсітэт на стаматалагічны факультэт "у мэтах паляпшэння сацыяльнага статуса асоб цыганскай нацыянальнасці" [232].

З мэтай правядзення эфектыўнай нацыянальнай палітыкі неабходна было вызначыць становішча спраў, якое склалася ў сферы забеспячэння правоў нацыянальных супольнасцей, іх надзённыя праблемы і ўлічыць традыцыі, што склаліся гістарычна. Таму 21–22.05.1996 г. у г. Віцебску была праведзена першая нацыянальная навукова-практычная канферэнцыя "Нацыянальныя меншасці Беларусі: шляхі супрацоўніцтва і згоды". У яе правядзенні прынялі ўдзел навукоўцы з усіх абласцей Беларусі і Мінска, з Расіі, Прыбалтыкі, Польшчы.

На канферэнцыі абмяркоўваліся палажэнні дзяржаўнай канцэпцыі нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Вялася размова пра гістарычныя, філасофскія, культурныя, прававыя асновы праблем нацыянальна-культурнага развіцця, пра стварэнне дзейных механізмаў увасаблення канцэпцыі ў жыццё. Выказваўся погляд аб неабходнасці стварэння адпаведнага Міністэрства. Была зроблена навуковая спроба вызначыць паказчыкі становішча нацыянальных супольнасцей. На навуковых секцыях былі выказаны розныя меркаванні па пытаннях удасканалення забеспячэння праў нацыянальных супольнасцей Беларусі. Менавіта там шэраг навукоўцаў падтрымалі ранейшыя выказванні, што лепшым тэрмінам будзе "нацыянальныя супольнасці", а не "нацыянальныя меншасці". У далейшым рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання сталі ўжываць тэрмін "нацыянальныя супольнасці".

Над праектам "Канцэпцыі нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі" працавала група навукоўцаў і спецыялістаў пад эгідай Каардынацыйнага Савета па справах нацыянальных супольнасцей пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусі, Рэспубліканскага Цэнтра нацыянальных культур. Выпрацаваная канцэпцыя вызначыла асноўныя напрамкі стварэння і дзейнасці праграмы, тэарэтычнага забеспячэння і практычнай рэалізацыі нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных супольнасцей.

---

[232] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С.107, 114.

Канцэпцыя павінна была садзейнічаць рэалізацыі галоўнай мэты міжнацыянальнай палітыкі – пабудове дэмакратычнага прававога грамадства, у якім задавальняюцца нацыянальна-культурныя запатрабаванні ўсіх без выключэння народаў краіны пры ўмовах забеспячэння агульнанацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь. Вызначальнай ідэяй Канцэпцыі з'явілася разуменне нацыянальна-культурнага будаўніцтва як асновы і сродку адраджэння нацыянальнага жыцця супольнасцей ва ўсіх яе праявах, у сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай, духоўнай сферах. У Канцэпцыі падкрэслівалася, што адсутнасць належнай увагі з боку дзяржавы да запытаў нацыянальных супольнасцей у сферы культуры, адукацыі, рэлігіі, ігнараванне іх моўных запатрабаванняў можа выклікаць абвастрэнне вызначаных нацыянальных пачуццяў і прывесці да міжэтнічных канфліктаў. У той жа час узровень нацыянальна-культурных запытаў нацыянальных супольнасцей павінен зыходзіць з рэальных фінансава-эканамічных магчымасцей краіны пражывання, не павінен закранаць стратэгічных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, накіраваных на захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці краіны[233].

У падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі, а таксама распрацоўцы канцэпцыі актыўны ўдзел прымала грамадскае аб'яднанне "Міжнародная акадэмія вывучэння нацыянальных меншасцяў" (ГА МАНМ). Акадэмія сумесна з шэрагам вышэйшых навучальных установ Беларусі і замежжа рэгулярна праводзіла ў 1990–2000-х гг. Міжнародныя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя нацыянальным супольнасцям. Матэрыялы пра іх змяшчаліся на старонках штоквартальнага інфармацыйна-навуковага часопіса "Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей". ГА МАНМ выдала тэматычныя зборнікі: "Адукацыя. Гісторыя. Мова" (1992 г.), "Асвета. Гісторыя. Мова" (1992 г.), "Нацыянальная адукацыя: пытанні беларускамоўнага выкладання" (1993 г.), "Нацыянальная адукацыя: гісторыя, сучаснасць, перспектывы" ў трох кнігах (усе 1995г.), "Нацыянальная адукацыя і полікультурная парадыгма" (1996 г.), "Нацыянальная адукацыя беларуска-польска-літоўскага сумежжа" (1997 г.), "Адукацыя дыяспар" (1998г.).

У чэрвені 1996 г. была праведзена Рэспубліканская нарада з кіраўнікамі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў на тэму "Праблемы сацыяльна-культурнай сферы на сучасным этапе" [234]. У дакладзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнка было падкрэслена, што "пры ўсебаковай падтрымцы беларускай культуры, адраджэнні маральных каштоўнасцей, ідэалаў і традыцый беларусаў, не павінны ўшчамляцца інтарэсы іншых нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі. Дзейнасць шматлікіх культурна-

[233] Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі.
[234] Паўлоўская В.П. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна–асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе. С. 155–159.

асветніцкіх нацыянальных арганізацый і цэнтраў павінна садзейнічаць узаемаабагачэнню культур, умацаванню дружбы і супрацоўніцтва людзей розных нацыянальнасцей, пераадоленню нацыянальнага эгаізму” [235].

Праблемы развіцця і ўдасканальвання работы сярод нацыянальных супольнасцей у Беларусі ўвесь час знаходзіліся ў цэнтры ўвагі дзяржаўных, грамадскіх і навуковых колаў рэспублікі.

Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей сумесна з Гродзенскім аблвыканкамам на базе УА “ГрДУ імя Я.Купалы” рэгулярна праводзіў Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі пад агульнай назвай “Этнасацыяльныя і канфесійныя працэсы ў сучасным грамадстве” (дзявятая адбылася ў 2011 г.).

Пры ўдзеле дзяржаўных структур былі праведзены сумесна з ГА татар “Аль-Кітаб” і мусульманскім рэлігійным аб’яднаннем у Рэспубліцы Беларусь Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі: першая – “Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы” (сакавік 1993 г.), другая – “Ісламская культура татараў Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай ды іншымі культурамі” (май 1995 г.), трэцяя – “Праблемы вывучэння і захавання культурнай спадчыны татарскага народа ў Беларусі” (сакавік 1997 г.), чацвёртая – “Іслам у Рэспубліцы Беларусь. Мінулае і сучаснасць” (9–10.08.98 г., Мінск); пятая – “Іслам і актуальныя праблемы сучаснасці” (жнівень 1999 г., Мінск); восьмая – “Мячэці і мізары татар Беларусі, Літвы і Польшчы: да 100-годдзя другой Мінскай мячэці” (2003 г., Навагрудак). На канфэрэнцыі “Цюркскія народы ў гісторыі Беларусі” (верасень 2003 г.), акрамя вучоных прысутнічалі прадстаўнікі дыпламатычных службаў 10 краін [236].

Цэнтрам этнаканфесійных і сацыякультурных даследаванняў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, які быў створаны ў 1998 г., сумесна з аблвыканкамам ажыццяўляліся навуковыя даследаванні па гістарычнай, культурнай і лінгвістычнай праблематыцы народаў польска-літоўска-беларускага памежжа. Вынікам з’явілася правядзенне Міжнародных навуковых канферэнцый “Шлях да ўзаемнасці”, у якіх прымалі ўдзел вучоныя з Беларусі і Польшчы, прадстаўнікі Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы і грамадскага аб’яднання “Саюз палякаў на Беларусі”. Канферэнцыі праводзіліся з 1993 г. папераменна: адзін год – у Беластоку, другі – у Гродна. Удзельнікі канферэнцый мелі магчымасць пачуць шмат цікавых паведамленняў па гісторыі, культуры, этнаграфіі, мовазнаўстве двух нашых народаў. 13–14.11.2008 г. у г. Гродна адбылася XV канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел

[235] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 50.

[236] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). Мінск, 2007. С. 50 ; Канапацкі І. Татары-мусульмане ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 7. С. 46 ; Пушкін, І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 102.

больш за 100 прадстаўнікоў навукі, дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый, у тым ліку 28 вучоных з Рэспублікі Польшча і прадстаўнікоў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы.

Вывучэнню беларускай гісторыі палякаў, яўрэяў, літоўцаў, рускіх, украінцаў, татараў, цыган, грэкаў і іншых прысвячаліся і іншыя навукова-практычныя канферэнцыі з наступным выданнем іх матэрыялаў (“Беларуска-ўкраінскія ўзаемаадносіны ад старажытнасці да сучаснасці” і іншыя).

Дзяржаўныя структуры і нацыянальныя аб’яднанні праводзілі працу па распаўсюджванні ў грамадстве інфармацыі пра гісторыю і культуру нацыянальных супольнасцей Беларусі. На тэлеканале “Беларускае тэлебачанне” раз у тыдзень выходзіла перадача “Шматгалоссе. Народы Беларусі: гісторыя, культура, побыт”, на першым канале беларускага радыё перадачы “Супольнасць”, “Нацыянальная палітра”, “Братэрства”, у якіх распавядалася пра традыцыі, звычаі, гісторыю рассялення нацыянальных супольнасцей Беларусі. На працягу 1994–1996 гг. у Рэспубліцы Беларусь выдаваўся часопіс “Форум”. На яго старонках знаходзілі адлюстраванне пытанні развіцця нацыянальных супольнасцей, друкавалася інфармацыя пра нацыянальна-культурныя аб’яднанні. Асобныя артыкулы па дадзенай праблематыцы публікаваліся ў дзяржаўных газетах “Рэспубліка”, “Культура”, “Беларуская Ніва”, часопісе “Кантакты і дыялогі”.

Упаўнаважаным сумесна з Міністэрствам інфармацыі арганізоўваліся конкурсы сярод журналістаў і аўтараў на лепшую публікацыю, перадачу ў СМІ пра духоўнасць, міжнацыянальную згоду, міжкультурны дыялог і сяброўства народаў.

У мэтах азнаямлення грамадскасці з нацыянальна-культурнымі аб’яднаннямі нацыянальных супольнасцей, іх дзейнасцю ў 1996 г. быў выдадзены даведнік “Нацыянальныя культурна-асветныя аб’яднанні Рэспублікі Беларусь” [237]. У 1998 г. Дзяржкамітэтам быў падрыхтаваны “Зборнік міжнародных і рэспубліканскіх дакументаў аб нацыянальна-культурным развіцці нацыянальных супольнасцей Беларусі” з мэтай шырэйшага інфарміравання грамадскасці пра нацыянальную палітыку Рэспублікі Беларусь [238].

У рамках праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі пры фінансавай падтрымцы Офіса АБСЕ ў Мінску апаратам Упаўнаважанага быў падрыхтаваны буклет – даведнік “Беларусь шматнацыянальная” пра гісторыю народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у Беларусі. Буклет быў выдадзены на беларускай, рускай і англійскай мовах, добра ілюстраваны і карыстаецца вялікай папулярнасцю.

---

[237] Нацыянальныя культурна-асветныя аб’яднанні Рэспублікі Беларусь. Мінск, 1996.

[238] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 52–53.

З пачатку 2008 г. запушчана абноўленая версія інфармацыйнага праекта “Вітае Беларусь” – інтэрнэт-сайт Belarus21.by. На сайце змешчана агульная інфармацыя пра нацыянальнасці і канфесіі ў Беларусі, структуры суайчыннікаў у замежжы, органы па справах рэлігій і нацыянальнасцей, пра вопыт працы, заканадаўства, а таксама навіны, якія тычацца дадзеных сфер [239].

У пэўнай ступені дзяржава дапамагала выданню СМІ на нацыянальных мовах. На працягу 1991–1994 гг. нацыянальна-культурнымі аб’яднаннямі былі створаны ўласныя органы друку. Татарскім аб’яднаннем выдаваўся квартальнік “Байрам. Татары на зямлі Беларусі”, яўрэйскім – газета “Авіў”, польскім – газета “Głos znad Niemna (Голас над Нёманам)” і “Magazin Polski (Часопіс польскі)” [240]. Тэматыка матэрыялаў дадзеных выданняў тычылася галоўным чынам гісторыі нацыянальных супольнасцей Беларусі і сучаснага жыцця нацыянальных абшчын. Міністэрства культуры і друку рэспублікі Беларусь часткова фінансавала выданне некаторых друкаваных органаў аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей. У 1994 г. гэтай структурай было выдзелена 66 200 000 беларускіх рублёў на падтрымку газет і часопісаў, якія выпускаліся нацыянальнымі грамадскімі арганізацыямі [241].

У 1995–1998 гг. пачалі выходзіць тры новыя газеты: “Украінец у Беларусі” Беларускай асацыяцыі ўкраінцаў “Ватра”, “Берасцейскі край” грамадскага аб’яднання “Асвета Брэстчыны”, татарская газета “Жыццё” – штомесячнае выданне Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Рэспубліцы Беларусь і аб’яднання “Аль-Кітаб”.

На роднай мове выдавалі свае друкарскія органы польскія і ўкраінскія аб’яднанні, астатнія карысталіся беларускай ці рускай мовамі. Моўную сітуацыю дакладна ахарактарызаваў муфтый І. Александровіч у сваім інтэрв’ю газеце “Звязда”: “Беларусь мы лічым сваёй другой радзімай, сваю мову мы згубілі і раней размаўлялі толькі на беларускай, зараз размаўляем на рускай і польскай” [242].

У Гродзенскай вобласці (2008 г.) выдаваліся 5 часопісаў і газет на польскай мове. Выходзілі газеты “Słowo Zycia” (тыраж 5939 экз.), “Głos znad Niemna” (2260 экз.), часопісы “Słowo ojczyste” (600 экз.), “Ziemia Lidzka” (2 тыс. экз.), “Magazyn Polski” (2 тыс. экз.).

Па ініцыятыве Упаўнаважанага ў 2008 г. выданні нацыянальных грамадскіх арганізацый упершыню прынялі ўдзел у рэспубліканскай

---

[239] Рыбаков М.Л. О межнациональных отношениях и государственной политике в Республике Беларусь // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 19–22.

[240] Kabzińska I. Odradzanie sią grupy polskej inteligencij w Respublice Białoruś // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. С. 34–35.

[241] Сводныя справаздачы Міністэрства аб працы ўстаноў культуры і народнай творчасці, сводныя статыстычныя справаздачы Міністэрства і справаздачы падведамасных устаноў аб працы паркаў культуры і адпачынку за 1994/1995 гг. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 20–21.

[242] Мядзведзева В. “Нельга дапусціць процістаяння рэлігій” // Звязда. 2001. 12 кастр. С. 2.

выставе “СМІ ў Беларусі” і ІІІ Беларускім інфармацыйным форуме “СМІ ў эпоху глабалізацыі: актуальныя аспекты” сумесна са СМІ грамадскіх аб’яднанняў беларусаў Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Украіны, Малдовы, ЗША [243].

На 01.01.2015 г. у Беларусі нацыянальнымі грамадскімі аб’яднаннямі выдаваліся часопіс “Мишпоха” Саюза беларускіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын і газеты: “Glos znad Niemna” грамадскага аб’яднання “Саюз палякаў на Беларусі”, “Авив” Саюза беларускіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын, “Українець в Беларусі” Беларускага грамадскага аб’яднання ўкраінцаў “Ватра”, “Романо Лав” грамадскага аб’яднання “Беларуская цыганская дыяспара”, “Мусу жодис” Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі “Беларуская абшчына літоўцаў” [244].

У рэалізацыі нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь улічваліся і адукацыйныя запатрабаванні нацыянальных супольнасцей (гл. раздзел “Дзейнасць дзяржаўнай улады па захаванню нацыянальных моў і мовы тытульнай нацыі”).

Найбольшую грамадскую значнасць нацыянальных супольнасцей у жыцці Беларусі падкрэслівалі выставы, фестывалі нацыянальных культур, якія арганізоўваліся і праводзіліся органамі дзяржаўнага кіравання сумесна з грамадскімі аб’яднаннямі нацыянальных супольнасцей Беларусі.

Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь на базе Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры 26–28.04.2001 г. быў праведзены рэспубліканскі семінар кіраўнікоў нацыянальна-культурных аб’яднанняў, органаў культуры гарадоў і раёнаў кампактнага пражывання нацыянальных супольнасцей па праблемах развіцця нацыянальных культур і ўзаемадзеяння з нацыянальнымі культурна-асветніцкімі аб’яднаннямі. Як вынік, напрыклад, установа культуры “Біблятэка № 2 г. Гродна” сумесна з татарскай грамадой у чытальнай зале стварылі татарскі літаратурна-інфармацыйны куток, дзе сабралі розныя выданні па гісторыі татар на рускай і татарскай мовах, праводзілі розныя вечарыны і мерапрыемст-вы [245]; у 2001 г. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАНБ прайшла выстава рукапісных кніг беларуска-літоўскіх татараў XVII–XX стст. [246] і інш.

Міністэрства і ўпраўленні культуры спрычыніліся да арганізацыі і правядзення раённых і гарадскіх рэгіянальных свят нацыянальных культур у абласцях Беларусі; адкрытага дзіцячага фестывалю нацыянальных культур “Сонечны птах”, які традыцыйна праходзіў у Мінскім Палацы

---

[243] Справка о межнациональных отношениях и работе с национальными общностями по совершенствованию государственной политики в сфере национальных отношений в 2008 году // Коллегия аппарата Уполномоченного по делам религий и национальностей от 21.01.2009. № 1. Минск, 2009.

[244] Общественные национально-культурные объединения // http://belarus21.by/Articles/nac_cult_ob. – Дата доступа 22.01.2015 г.

[245] Жыццё татарскае. 2003. № 8. жнівень.

[246] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 56.

дзяцей і моладзі; фестывалю “Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў” (беларусаў, палякаў і літоўцаў).

21.05–10.07.2004 г. у філіяле Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі – музеі беларускага народнага мастацтва была арганізавана і працавала выстава “Суквецце нацыянальных культур”. Яе наведала 2770 чалавек, 97 экскурсійных груп. У падрыхтоўцы і правядзенні выставы прынялі ўдзел: літоўскія, рускія, яўрэйскія, казахскія, азербайджанскія, татарскія, малдаўскія, нямецкія грамадскія аб’яднанні.

Найболей маштабнымі мерапрыемствамі ў справе адраджэння і развіцця культур нацыянальных супольнасцей Беларусі сталі фестывалі нацыянальных культур, якія праводзіліся ў Гродна. Сваё прывітанне ўдзельнікам I Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур (1996 г.) даслаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка. У ім, у прыватнасці, адзначалася, што “Беларусь арганічна сфарміравалася на паліэтнічнай аснове і мае шматвяковую мудрую традыцыю павагі да духоўных каштоўнасцей усіх нацыянальных супольнасцей. Захаванне і працяг гэтых традыцый з’яўляецца важным як для грамадства, так і для далейшага развіцця культур, якія робяць наша жыццё шматкаляровым і паўнагучным” [247].

Арганізоўвалі і праводзілі ўсебеларускі фестываль у 4 туры (рэгіянальныя, абласныя, рэспубліканскі, заключны): Міністэрства культуры, Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Гродзенскі аблвыканкам, Гродзенскі гарвыканкам (рэгіянальныя і абласныя туры – адпаведныя аблвыканкамы і ўпраўленні культуры). Мэты фестывалю: гарманізацыя міжнацыянальных адносін і развіццё шматвяковых традыцый дабратворнага ўзаемадзеяння культур нацыянальных супольнасцей Беларусі; папулярызацыя лепшых узораў паэтычнага, музычнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва нацыянальных супольнасцей Беларусі; развіццё сеткі самадзейных мастацкіх нацыянальных калектываў у культурна-асветных, навучальных установах, грамадскіх аб’яднаннях нацыянальных супольнасцей; даследаванне, аднаўленне і пераемнасць мастацкіх традыцый нацыянальных супольнасцей; падтрымка творча адораных прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей; умацаванне творчых і дзелавых адносін паміж установамі культуры і грамадскімі арганізацыямі нацыянальных супольнасцей; азнаямленне шырокіх колаў грамадскасці з самабытнай культурай народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у Беларусі [248].

Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур праводзіўся раз у два гады. X фестываль адбыўся ў 2014 г. (I – 1996 г., II – 1998 г., III –

---

[247] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 53–54.

[248] Дакументы аб падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 471. Арк. 4–15; Спр. 804. Арк. 1–169; Спр. 960. Арк. 1–222; Спр. 962. Арк. 11–12.

2000 г., IV – 2002 г., V – 2004 г., VI – 2006 г., VII – 2008 г., VIII – 2010 г., IX – 2012 г.). Больш за 600 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў 11 нацыянальных супольнасцей Беларусі прынялі ўдзел у I фестывалі нацыянальных супольнасцей. Сярод іх беларускае таварыства немцаў "Адраджэнне", беларускае згуртаванне татараў–мусульман "Аль–Кітаб", армянскае культурна-асветніцкае таварыства "Аястан", СПБ, рэспубліканскае таварыства рускай культуры, беларуская асацыяцыя ўкраінцаў "Ватра" і інш. Правядзенне III Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур у чэрвені 2000 г. стала важнай падзеяй культурнага жыцця нашай краіны на мяжы тысячагоддзяў. У ім прыняло ўдзел больш за тысячу ўдзельнікаў, якія прадстаўлялі мастацтва 16 нацыянальных супольнасцей. У чэрвені 2002 г. у Гродна адбыліся заключныя мерапрыемствы IV Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур, у якіх прынялі ўдзел прадстаўнікі 21 нацыянальнай супольнасці. V Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, заключныя мерапрыемствы якога прайшлі 4–6.06.2004 г. у Гродна, сабраў каля 1500 чалавек з 60 населеных пунктаў, якія прадстаўлялі 25 нацыянальнасцей. У яскравай мастацкай форме была здзейснена галоўная ідэя фестываляў – паказ самабытнасці народаў, якія пражывалі ў Беларусі, іх культурных каштоўнасцей, дасягненняў у адраджэнні і развіцці мастацка-гістарычнай спадчыны продкаў. У 2008 г. сваю культуру дэманстравалі прадстаўнікі 30 нацыянальнасцей. З кожным годам павялічвалася колькасць прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей на фестывалях нацыянальных культур, што сведчыць пра захаванне этнічнай і нацыянальнай самабытнасці насельніцтва Беларусі. У IX фестывалі прынялі ўдзел каля 2,5 тыс чалавек 33 нацыянальнасцей.

На падрыхтоўку і правядзенне I Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур было выдаткавана 740 млн руб., на II фестываль – 2 млрд 760 млн руб., на V фестываль – 179,8 млн руб., у тым ліку з рэспубліканскага бюджэту 14,1 млн руб., абласных – 55,5, гарадскіх – 43,5 млн руб. [249]

**Высновы.** У навейшай гісторыі Рэспублікі Беларусь менавіта вышэйшы заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь забяспечыў падтрымку ініцыятыў і працэсу супрацоўніцтва з нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі. Гэта рабілася для захавання ў беларускім грамадстве стабільнасці і дыялогу паміж прадстаўнікамі розных нацыянальных супольнасцей і ўладамі. Да моманту стварэння ў сярэдзіне 1990-х гг. органаў выканаўчай улады, адказных за правядзенне нацыянальна-канфесійнай палітыкі, парламенцкія структуры выконвалі асноўную ролю па рэгуляванні міжнацыянальных адносін. У выніку іх дзейнасці ў

[249] К вопросу о белорусско-польских отношениях. Минск, 2005. С. 7.

Рэспубліцы Беларусь створана неабходная заканадаўчая база для развіцця нацыянальных супольнасцей і забеспячэння іх належнага статусу.

Дзяржаўная падтрымка культурнай дзейнасці нацыянальных супольнасцей і кантроль за іх грамадскімі арганізацыямі актывізаваліся з другой паловы 1990-х гг. пасля стварэння органа выканаўчай улады, адказнага за правядзенне нацыянальна-канфесійнай палітыкі. Ён імкнуўся забяспечыць умовы для захавання самабытнасці і выканання заканадаўства ў сферы рэалізацыі праў нацыянальных супольнасцей.

Згодна з заканадаўствам, нацыянальная палітыка органаў дзяржаўнага кіравання падзялялася на: аказанне матэрыяльнай і арганізацыю метадычнай дапамог, правядзенне выстаў, фестываляў нацыянальных культур і мастацтваў, адзначэнне галоўных дат у гісторыі той ці іншай нацыянальнай супольнасці, дапамога ў фінансаванні мастацкіх калектываў, каардынацыю дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў і ораганаў улады. У Рэспубліцы Беларусь праз дзейнасць СМІ вялася прапаганда нацыянальнай адметнасці і культурнай шматвобразнасці. Прыкладаліся намаганні для захавання нацыянальных моў і адукацыі на родных мовах. У структурах Міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі працавалі спецыялісты, якім было даручана аказваць дапамогу грамадскім нацыянальна-культурным аб’яднанням.

Аналіз крыніц дазваляе сцвярджаць, што структуры прадстаўнічай і выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь прымалі рашэнні ўзважана, з улікам дзяржаўных інтарэсаў, а таксама грамадска-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы.

Нацыянальная палітыка дзяржаўнай улады да грамадскага развіцця нацыянальных супольнасцей насіла характар пратэкцыянізму і здзяйснялася ў цэлым выверанымі, прадуманымі крокамі, пры наяўнасці пэўных недахопаў і непаразуменняў у сферы нацыянальна-дзяржаўных адносін, якія можна выправіць. Яна была абумоўлена шэрагам унутрыпалітычных і знешнепалітычных фактараў. На яе правядзенне аказвалі ўплыў як дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей, так і стан грамадства ў Беларусі (гл. раздзел “Праявы этнічнай нецярпімасці ў беларускім грамадстве па выніках сацыялагічных апытванняў”). У дзеяннях уладаў прасочвалася схіленне да комплекснага вырашэння існуючых праблем нацыянальных супольнасцей. У выніку правядзення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі, якая забяспечвала задавальненне культурна-асветных і грамадскіх запатрабаванняў нацыянальных супольнасцей з улікам агульнанацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, у грамадстве скláліся стабільныя міжнацыянальныя адносіны.

Дзяржаўныя структуры Беларусі імкнуліся задаволіць запатрабаванні нацыянальных супольнасцей у грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай сферах. Прыкладалі намаганні да забеспячэння аптымальных

умоў для захавання і развіцця культур, моў усіх нацыянальнасцей, прадстаўнікі якіх пражывалі ў краіне. Пры гэтым улічвалі аб'ектыўныя асаблівасці фарміравання канкрэтных нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, запытаў і рэальных патрабаванняў прадстаўнікоў нацыянальнай групы. У дзеяннях дзяржаўнай улады было бачна схіленне да інтэрнацыянальных кірункаў дзейнасці і комплекснага вырашэння існуючых праблем нацыянальных супольнасцей .

Для вырашэння праблем нацыянальных супольнасцей прадугледжвалася: стварэнне пэўнага органа дзяржаўнай улады, які б забяспечваў умовы для захавання самабытнасці і выкананне заканадаўства ў сферы рэалізацыі праў нацыянальных супольнасцей; падтрымка ініцыятыў і супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі нацыянальных супольнасцей; падтрымка стабільнасці, дыялогу і супрацоўніцтва ў сферы міжнацыянальных адносін; прапаганда нацыянальнай адметнасці і культурнай шматвобразнасці праз дзейнасць СМІ; захаванне моў і адукацыі на родных мовах нацыянальных супольнасцей.

Па кірунках дзейнасці, згодна з заканадаўствам, нацыянальная палітыка падзялялася на: аказанне матэрыяльнай дапамогі, арганізацыю метадычнай дапамогі, правядзенне выстаў, фестываляў нацыянальных культур і мастацтваў, адзначэнне галоўных дат у гісторыі той ці іншай нацыянальнай супольнасці, фінансаванне (дапамога мастацкім калектывам), каардынацыю Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры, супрацоўніцтва з Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і мясцовымі ораганамі ўлады.

Рэспубліканскія і мясцовыя органы ўлады Рэспублікі Беларусь імкнуліся да захавання міжнацыянальнага даверу, міжкультурнага дыялогу ва ўмовах існуючых супярэчнасцей, у тым ліку і міжнацыянальных, у беларускім грамадстве спрыялі дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў. Прадастаўляліся шырокія магчымасці нацыянальным супольнасцям у культурна-асветніцкай дзейнасці.

### 1.5 Дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей у Рэспубліцы Беларусь

Грамадска-палітычныя і культурныя працэсы, якія адбываліся ў Беларусі напрыканцы XX у пачатку XXI стст. далі адчувальны штуршок развіццю беларускай нацыянальнай культуры і культуры нацыянальных супольнасцей, гэта садзейнічала росту іх палітычнай і нацыянальнай свядомасці. У гэтых умовах грамадскага развіцця паступова фарміраваліся элементы палітычнай культуры, арыентаванай на рынак і канкурэнтную барацьбу, што прадугледжвала садзейнічанне фарміраванню грамадзянскай супольнасці і актывісцкага (грамадзянскага) тыпу палітычнай культуры ў насельніцтва Беларусі.

У гэтай справе важнае значэнне мае працэс стварэння і дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь нацыянальных грамадскіх арганізацый (НГА), якія згуртавалі людзей, аб’яднаных агульнымі інтарэсамі. Добраахвотныя аб’яднанні прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей ствараліся для сумеснай рэалізацыі праграмы альбо для дасягнення пэўнай мэты, дзейнічалі на падставе пэўных правілаў і працэдур, развівалі актыўнасць і самадзейнасць асоб, задавальнялі іх запатрабаванні і інтарэсы. Іх работа мела непасрэдны ўплыў на грамадскае і культурнае жыццё рэспублікі.

У Рэспубліцы Беларусь сфарміравалася такая мадэль дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных супольнасцей, пры якой вядучая роля адводзілася дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей пры фінансавай, прававой, арганізацыйнай падтрымцы і кантролі з боку дзяржаўных структур.

Першыя грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцей узніклі ў канцы 1980-х гг. У 1988 г. у г. Гродна пры абласным аб’яднанні савецкага фонду культуры было створана Гродзенскае абласное польскае культурна-асветнае таварыства з секцыяй у г. Ліда. Мэтай таварыства з’яўлялася прапаганда польскай мовы і культуры, наладжванне і падтрымка сувязей з грамадскімі аб’яднаннямі ў ПНР. У студзені 1989 г. створана таварыства польскай культуры ў г. Ваўкавыску, аддзяленні таварыства савецка-польскага сяброўства ў Бераставіцкім і Воранаўскім раёнах. У той жа час стала прыкметнай актыўнасць татарскай абшчыны ў г.п. Іўе, якая арганізацыйна далучылася да “Саюза літоўскіх татар”, які дзейнічаў пры Літоўскім фондзе культуры. Афіцыйна “Саюз літоўскіх татар” ставіў задачу вывучэння гісторыі і культуры татар, якія жылі на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Польшчы.

У лютым 1990 г. стварылася таварыства “Палонія”, якое было зарэгістравана аддзелам культуры Мінгарвыканкама. У чэрвені 1990 г. на з’ездзе была ўтворана рэспубліканская арганізацыя – Саюз палякаў Беларусі (СПБ). У пачатку 1989 г. было створана Мінскае таварыства яўрэйскай культуры. Восенню 1989 г. узніклі першыя татарскія культурна-асветныя таварыствы ў Мінску і Гродна. На сярэдзіну 1990 г. дзейнічалі 11 нацыянальных культурна-асветных таварыстваў і аб’яднанняў [250].

У 1993 г. прадстаўнікі грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей Беларусі прынялі заяву аб сумеснай дзейнасці на стварэнне такой дзяржавы, дзе будуць гарантаваны правы чалавека кожнай нацыянальнасці. Супольную заяву падпісалі прадстаўнікі ўкраінскай, яўрэйскай, татарскай, польскай, нямецкай, літоўскай нацыянальнасцей і згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына” [251].

---

[250] Запіска ЦК КПБ // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 156. Спр. 775. Арк. 14.

[251] Бурая Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) // Весці БДПУ. Серыя 2. 2007. № 1. С. 47.

Грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцей дзейнічалі не толькі ў сталіцы Беларусі – Мінску, але і ў рэгіёнах (гл. табл. 3).

Табліца 3 – Рэгіянальныя нацыянальныя грамадскія арганізацыі Беларусі на 2001 год [252].

| Вобласць | Колькасць зарэгістраваных НГА | Супольнасці |
| --- | --- | --- |
| Брэсцкая | 10 | палякі, украінцы, яўрэі |
| Віцебская | 14 | англічане, латышы, немцы, палякі, рускія, яўрэі |
| Гомельская | 7 | казакі (рускія), немцы, палякі, яўрэі |
| Гродзенская | 18 | літоўцы, немцы, палякі, рускія, татары, украінцы, яўрэі |
| Магілёўская | 10 | азербайджанцы, армяне, беларусы, грузіны, немцы, палякі, рускія, украінцы, яўрэі |

У 2005 г. у Беларусі дзейнічалі 123 грамадскія арганізацыі і іх саюзы, якія прадстаўлялі 24 нацыянальныя супольнасці (дарэчы ў нашай дзяржаве стала жылі 107,8 тыс. грамадзян іншых краін). Сярод арганізацый – 47 яўрэйскіх, 12 польскіх, 9 нямецкіх, па 8 рускіх і літоўскіх, па 5 азербайджанскіх, украінскіх і татарскіх, 3 армянскія, 4 цыганскія, па 2 грэчаскія і грузінскія. У Рэспубліцы Беларусь таксама былі нацыянальныя арганізацыі арабаў, афганцаў, башкіраў, грузін, дагестанцаў, казахаў, карэйцаў, латышоў, малдаван, сірыйцаў, турак, чувашоў, эстонцаў [253]. 38 арганізацый мелі статус міжнародных і рэспубліканскіх. На 01.01.2015 г. дзейнічалі 212 аб'яднанняў 26 нацыянальнасцей [254].

Для дасягнення статутных мэт грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцей дзейнічалі самастойна, абапіраючыся на ўласны інтэлектуальны і матэрыяльны патэнцыял, або выкарыстоўвалі дапамогу

[252] Ліст Упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Брэсцкай вобласці". 31.01.2001 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 74–75; Ліст Віцебскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці ад 26.01.2001 г. "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у вобласці" // Там жа. Арк. 61–64 ; Ліст Упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Гомельскай вобласці" // Там жа. Арк. 89–90 ; Ліст Упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Гродзенскай вобласці". 31.01.2001 г. // Там жа. Арк. 76–77 ; Ліст Упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Магілёўскай вобласці". 1.02.2001 г. // Там жа. Арк. 87–88.

[253] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік ; Пушкін І.А. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1991–2005 гадах як фактар фарміравання грамадзянскай супольнасці // Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность. С. 466.

[254] Общественные национально-культурные объединения // http://belarus21.by/Articles/nac_cult_ob. – Дата доступа 22.01.2015 г.

уладаў Рэспублікі Беларусь ці краіны паходжання супольнасці. Каб найлепей вырашаць пэўныя задачы часам аб’ядноўваліся разам.

Так, напрыклад, 30 студзеня 1996 г. Брэсцкае яўрэйскае культурна-асветніцкае таварыства “Тарбут”, абласны аддзел саюза палякаў, аддзел рускага таварыства і ўкраінскае грамадска-культурнае таварыства Брэсцкай вобласці падпісалі сумесную заяву арганізацый нацыянальных абшчын вобласці. У ёй гаварылася, што таварыствы будуць развіваць і ўмацоўваць супрацоўніцтва паміж грамадскімі арганізацыямі нацыянальных абшчын на аснове павагі і ўзаемнага даверу; будуць адстойваць правы чалавека і інтарэсы нацыянальных супольнасцей на аснове безумоўнага выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і адпаведных міжнародных пагадненняў. Заяўлялася аб развіцці канструктыўнага, раўнапраўнага супрацоўніцтва з органамі ўлады усіх узроўняў, з мэтай забеспячэння нацсупольнасцям Брэстчыны магчымасцей для захавання і развіцця іх мовы, культуры, традыцый і абрадаў. Таварыствы выказвалі імкненне да стварэння ў г. Брэсце, пры актыўным удзеле органаў мясцовай улады, абласнога цэнтра нацыянальных культур, што дазволіла б палепшыць узаемаразуменне і хутчэйшае вырашэнне ўзніклых праблем.

Нацыянальныя грамадскія аб’яднанні Беларусі ўтварылі Саюз некамерцыйных арганізацый “Беларускі кангрэс нацыянальных аб’яднанняў” (Мінск), у які ўвайшлі: культурна-асветніцкае грамадскае аб’яднанне “Габустан”, Мінскае гарадское культурна-асветнае таварыства “Айастан”, Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне грэкаў “Пелапаннес”, Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Асацыяцыя беларускіх карэйцаў”, Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Беларуская абшчына літоўцаў”, грамадскае аб’яднанне “Цэнтр нямецкай культуры “Відэргебурт” (“Адраджэнне”), Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Рускае таварыства”, Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны “Чышма”, Беларускае грамадскае аб’яднанне татар “Зікр уль Кітаб” (“Памяць і кніга”), грамадскае аб’яднанне “Абшчына беларускіх чувашаў “Атал” (“Волга”), Саюз беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын.

Аналіз статутаў і дзейнасці міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных аб’яднанняў наступных супольнасцей: рускіх, татар, палякаў, украінцаў, літоўцаў, цыган, азербайджанцаў, грузін, афганцаў, яўрэяў, немцаў, карэйцаў, грэкаў, казакаў дазваляе пракаментаваць статуты і вызначыць у асноўным агульныя тэндэнцыі ў кірунках дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў у Беларусі.

89,2 % ад агульнай колькасці прааналізаваных ГА, займаліся захаваннем нацыянальных традыцый і прапагандай сваёй культуры шляхам стварэння калектываў мастацкай самадзейнасці, правядзення канцэртаў, конкурсаў, фестываляў, выстаў і г.д. 78,4 % – прадстаўлялі

розныя інтарэсы сваіх сяброў (членаў) у дзяржаўных і іншых установах. 54,1 % займаліся (ці планавалі займацца) захаваннем і прапагандай помнікаў гісторыі і культуры свайго народа. 45,9 % – ставілі перад сабою мэту нацыянальнага адраджэння і культуры, каб захаваць самаатаясамленне і пазбегнуць асіміляцыі. 40,5 % – збіраліся адстойваць сацыяльныя і эканамічныя правы, абараняць і дапамагаць суайчыннікам. 37,8 % – садзейнічалі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. 32,4 % абаранялі нацыянальныя і грамадзянскія правы, годнасць. 29,7 % займаліся праблемай адраджэння і развіцця роднай мовы, 21,6 % – дабрачыннай дапамогай і ўшанаваннем памяці славутых асоб сваёй нацыянальнасці, ахвяр Халакосту і г.д. 18,9 % – спрыялі грамадскай актыўнасці асобам сваёй нацыянальнасці, давалі ім магчымасць для самарэалізацыі, раскрыцця свайго творчага патэнцыялу. Такі ж працэнт грамадскіх аб’яднанняў займаўся асветніцкай дзейнасцю (стварэннем нацыянальных школ, класаў па вывучэнню роднай мовы і г.д.). 16,2 % імкнуліся да стварэння сваіх нацыянальных цэнтраў, каардынацыі намаганняў у справе захавання нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. 16,2 % спрыялі вывучэнню ўласнай гісторыі, займаліся навуковай і даследчыцкай дзейнасцю, 13,5 % – выдавецкай дзейнасцю (газеты “Истоки”, “Głos znad Niemna”, часопіс “Мишпоха” і інш.). 5,4 % садзейнічалі грамадзянскай самасвядомасці. 5,4 % выступалі за інтэграцыю з іншымі краінамі, 5,4 % выхоўвалі пачуццё сваёй уласнай нацыянальнай выключнасці. 2,7 % імкнуліся змагацца з шавінізмам і нацыяналізмам і столькі ж планавалі для выканання статутных мэт і задач выкарыстоўваць актыўныя метады грамадскіх дзеянняў: мітынгі, маніфестацыі, масавыя акцыі і г.д. [255]

У сваёй дзейнасці НГА шчыльна супрацоўнічалі з установамі культуры. У 1992–1993 гг. дзяржаўныя бібліятэкі сумесна з нацыянальнымі культурна-асветнымі аб’яднаннямі Беларусі правялі розныя мерапрыемствы, сустрэчы з цікавымі людзьмі, круглыя сталы: бібліятэка № 1 г. Мінска з армянскім таварыствам, бібліятэка № 10 з таварыствам “Палонія”, бібліятэка № 20 з украінскім таварыствам “Заповіт”, цэнтральная бібліятэка імя Я.Купалы з яўрэйскім таварыствам, абласная бібліятэка імя А.Пушкіна з аб’яднаннем “Русь” [256]. Упачатку XXI ст. біблятэка № 2 г. Гродна сумесна з татарскай грамадой у чытальнай зале стварылі татарскі літаратурна-інфармацыйны куток, дзе сабралі розныя творы і выданні па гісторыі татар на рускай і татарскай мовах, праводзілі

[255] Пушкін І.А. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1991–2005 гадах як фактар фарміравання грамадзянскай супольнасці // Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность. С. 466; Яго ж. Асноўныя тэндэнцыі ў накірунках дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі (1991–2004 гг.) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. 2006. № 4. С. 16–17; Бубнаў Ю.М., Пушкін І.А. Паліталогія. С. 81–89.

[256] Ліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь намесніку старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь “Аб арганізацыі культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных таварыстваў на базе бібліятэк”. 30.09.1993 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 26. Арк. 22–23.

розныя вечарыны і мерапрыемствы [257]. У 2001 г. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАНБ прайшла выстава рукапісных кніг беларуска-літоўскіх татараў XVII–XX стст. [258] і інш. 21.05–10.07.2004 г. у філіяле Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі – музеі беларускага народнага мастацтва – была арганізавана і працавала выстава "Суквецце нацыянальных культур". Яе наведала 2770 чалавек, 97 экскурсійных груп. У падрыхтоўцы і правядзенні выставы прынялі ўдзел: літоўскія, рускія, яўрэйскія, казахскія, азербайджанскія, татарскія, малдаўскія, нямецкія грамадскія аб'яднанні.

Аднак пры ўсёй значнасці мерапрыемстваў, якія праводзіліся большасцю нацыянальных грамадскіх арганізацый, яны былі даволі аднастайнымі і прысвечанымі, у асноўным, народным і нацыянальным святам. Напрыклад, ГА Мінскае гарадское культурна-асветніцкае таварыства "Айастан" у 2003 г. планавала: 6.01 – канцэрт на Ражство; Новы год, 28.05 – дзень ухвалення дзяржавы Арменія, 21.09 – канцэрт і святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя дню Незалежнасці Рэспублікі Арменія. Крыху больш аб'ёмныя па колькасці мерапрыемстваў былі планы Беларускага ГА ўкраінцаў "Ватра", грамадскага аб'яднання нямецкай культуры "Масты", але таксама ў асноўным культурна-асветніцкага кірунку.

Трэба адзначыць, што шэраг НГА праводзілі працу толькі пры наяўнасці фінансавання з боку фондаў альбо краін, адкуль паходзіць дадзеная супольнасць. Пры адсутнасці знешняга фінансавання згортвалі працу і выкананне праграм. Акрамя недахопу фінансавых сродкаў, адной з асноўных праблем нацыянальных аб'яднанняў было атрыманне памяшканняў на ільготных умовах і функцыяніраванне школ выхаднога дня. У 1998–1999 гг., у сувязі з рэгістрацыяй і перарэгістрацыяй, былі вялікія праблемы з памяшканнямі ў грамадскіх аб'яднанняў "Малдова", немцаў "Адраджэнне" і інш.

У той жа час, неабходна ведаць, што грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцей Беларусі былі не толькі спажыўцамі з "кішэні" падаткаплацельшчыкаў альбо краін сваёй этнічнай радзімы. Яўрэйскія, польскія, нямецкія і іншыя аб'яднанні аказвалі неаднаразова гуманітарную дапамогу дзяржаўным установам, інтэрнатам Беларусі. Напрыклад, пасля правядзення фестывалю "Усходні слодач" ("Восточные сладости") значныя сродкі былі пералічаны інтэрнатам Мінска, на пабудову Нацыянальнай бібліятэкі; грамадскае аб'яднанне немцаў з Бабруйска падаравала аргтэхніку савету па справах рэлігій і нацыянальнасцей Магілёўскага аблвыканкама і інш.[259]

---

[257] Жыццё татарскае. 2003. № 8. жнівень.
[258] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 56.
[259] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 122.

Грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцей Беларусі для захавання нацыянальных традыцый і прапаганды сваёй культуры стварылі вялікую колькасць самадзейных калектываў (гл. табл. 4). У структурах Міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі працавалі спецыялісты, якім было даручана аказваць дапамогу ў гэтай справе грамадскім нацыянальна-культурным аб'яднанням.

Табліца 4 – Творчая дзейнасць нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь, 2004 г.[260]

| **Нацыянальнасць** | **Колькасць творчых калектываў** | **Колькасць мерапрыемстваў у год** | **Колькасць мерапрыемстваў на адзін калектыў** |
|---|---|---|---|
| Азербайджанцы | 8 | 23 | 2,88 |
| Армяне | 16 | 25 | 1,56 |
| Грэкі | 4 | 16 | 4,0 |
| Дагестанцы | 1 | 6 | 6,0 |
| Карэйцы | 1 | 7 | 7,0 |
| Літоўцы | 8 | 16 | 2,0 |
| Малдаване | 8 | 36 | 4,5 |
| Немцы | 8 | 34 | 4,25 |
| Палякі | 85 | 246 | 2,89 |
| Рускія | 11 | 190 | 17,27 |
| Татары | 36 | 192 | 5,33 |
| Украінцы | 96 | 160 | 1,67 |
| Цыгане | 5 | 8 | 1,6 |
| Чувашы | 9 | 12 | 1,33 |
| Яўрэі | 54 | 200 | 3,7 |
| Усяго | 350 | 1171 | 3,34 |

Органы дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь не толькі спрыялі, але дапамагалі і каардыянавалі культурную дзейнасць нацыянальных супольнасцей. Так, Міністэрствам культуры на базе Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры ў 2001 г. быў праведзены рэспубліканскі семінар кіраўнікоў нацыянальна-культурных аб'яднанняў, органаў культуры гарадоў і раёнаў кампактнага пражывання нацыянальных супольнасцей па праблемах развіцця нацыянальных культур і ўзаемадзеяння з нацыянальнымі культурна-асветніцкімі аб'яднаннямі [261].

Вялікі аб'ём працы па каардынацыі дзейнасці нацыянальных

[260] Звесткі аб творчай дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 474. Арк. 30.
[261] План рэспубліканскага семінара // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 126–127.

грамадскіх арганізацый ускладаўся на Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур (утвораны ў 1994 г.), у кампетэнцыю якога ўваходзіла арганізацыйна-метадычная дапамога і матэрыяльная падтрымка нацыянальных супольнасцей у справе адраджэння і далейшага развіцця нацыянальных культур. Тут была складзена картатэка нацыянальных самадзейных мастацкіх калектываў, народных майстроў з мэтай далучэння іх да сваёй дзейнасці, аказання ім матэрыяльнай і іншай неабходнай дапамогі. На базе Цэнтра ў 1995–1996 гг. дзейнічалі шэраг самадзейных мастацкіх калектываў нацыянальных супольнасцей: хор "Руская песня", хоры ўкраінскай і польскай песні, дзіцячыя ансамблі ўкраінскага танца і польскай песні, вакальны ансамбль "Шматгалоссе". Пры садзейнічанні Цэнтра нацыянальна-культурныя аб'яднанні праводзілі свае святы: татарскі "Курбан-Байрам", яўрэйскія "Пурым", "Ханука", малдаўскае свята вясны "Мертышор" і іншыя. У 1995 г. Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур арганізаваў археалагічную экспедыцыю па месцах кампактнага пражывання татар у Беларусі. Адной з задач экспедыцыі было звярнуць увагу органаў мясцовых уладаў на праблему развіцця татарскай культуры, захавання татарскіх могілак-мізараў. Паралельна праходзіў пошук старапісаных кніг-кітабаў [262]. З 1998 г. у Полацку працаваў Цэнтр нацыянальных культур і рамёстваў [263].

Сумесна з нацыянальнымі грамадскімі арганізацыямі праводзіліся раённыя і гарадскія рэгіянальныя святы нацыянальных культур у абласцях Беларусі, дзіцячы фестываль нацыянальных культур "Сонечны птах", які традыцыйна праходзіў у Мінскім Палацы дзяцей і моладзі, фестываль "Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў" (беларусаў, палякаў і літоўцаў).

Па ініцыятыве Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей сумесна з Нацыянальнай камісіяй па справах ЮНЭСКА 23.03.2004 г. адбылася сустрэча з кіраўнікамі грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей, на якой было вырашана падтрымаць прапанову аб правядзенні Дзён культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця ў Рэспубліцы Беларусь. Ад таго часу ў Рэспубліцы Беларусь 21 мая адзначаўся Сусветны дзень культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця, 16 лістапада – Дзень талерантнасці [264].

Аналіз канкрэтнай ролі НГА ў грамадзянскай супольнасці і ўдзелу нацыянальных супольнасцей Беларусі ў грамадскім і культурным жыцці

---

[262] Справаздача Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур 2000 г. // Там жа. Спр. 407. Арк. 128–138 ; Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 53; Паўлоўская В.П. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна–асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе. С. 158.

[263] Ліст Віцебскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці ад 26.01.2001 г. "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у вобласці" // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 61–64.

[264] Выпіска з пратакола // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 962. Арк. 11–12.

дзяржавы разгледзім па дзейнасці грамадскіх арганізацый асобных супольнасцей.

***Рускія*** з'яўляюцца самай вялікай нацыянадьнай супольнасцю Беларусі. Іх колькасць у навейшай гісторыі Беларусі стабільна скарачалася: амаль 13 % ад насельніцтва краіны ў 1989 г., 11,4 % у 1999 г. і 8,3 % – 2009 г. Але іх роля ў сацыяльным і грамадскім жыцці была вышэй за іх колькасны склад, т.я. большасць з іх працавала ў сферы кіравання, навукі, культуры. Пераважная большасць рускіх у значнай ступені захоўвала сваю нацыянальную самасвядомасць, мову, а вернікі – рэлігію.

Сучаснае рускае насельніцтва на Беларусі прадстаўлялі тры асноўныя групы: стараверы і іх нашчадкі, карэннае рускае несельніцтва, продкі якіх жылі тут на працягу некалькіх пакаленняў і рускія мігранты, якія перасяліліся ў рэспубліку не так даўно і мелі шчыльныя сваяцкія і сяброўскія сувязі з насельніцтвам Расіі. Акрамя гэтых груп можна адзначыць нашчадкаў ад міжнацыянальных шлюбаў рускіх з беларусамі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Да рускага насельніцтва адносіць сябе і даволі прадстаўнічая частка ўкраінцаў, татар, яўрэяў, беларусаў і асоб іншых нацыянальнасцей, якія былі выхаваны на рускай культуры і пераняялі некаторыя рысы рускага насельніцтва. Далучэнню беларусаў да культуры рускіх садзейнічала гістарычная памяць аб мінулым, агульнасць лёсу, роднасць культур, моў, а таксама ўзровень сацыяльна-прафесійнай і культурнай падрыхтаванасці.

У разглядаемы перыяд у Беларусі дзейнічалі наступныя грамадскя арганізацыі, якія гуртавалі асоб рускай нацыянальнасці: Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Рускае таварыства" (Мінск), якое мела свае абласныя аддзяленні ў Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродна, Магілёве, Мінску; Віцебская гарадская грамадская арганізацыя "Рускі культурны цэнтр "Русь" (Віцебск); Віцебскае грамадскае аб'яднанне "Руская абшчына" (Віцебск); Беларускае грамадскае аб'яднанне "Русь" (Мінск); Мінскае таварыства рускай культуры "Русь" (Мінск); грамадскае аб'яднанне "Бабруйскае таварыства рускай культуры "Русь" (Бабруйск); культурна-асветніцкае грамадскае аб'яднанне "Наш дом "Адзінства" (Мінск), Магілёўскае абласное грамадскае аб'яднанне "Рускі Дом" [265].

Асноўнай мэтай арганізацый з'яўлялася прапаганда рускай культуры, культурна-асветніцкая дзейнасць па захаванню традыцый і культуры рускага народа. Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Рускае таварыства" праводзіла вечарыны рускай паэзіі, раманса, эстраднай песні. Урачыста праходзілі ў Магілёве Сіманаўскія чытанні. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці рускіх грамадскіх арганізацый з'яўляліся шматразовымі дыпламантамі і лаурэатамі гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў і фестываляў. Акрамя культурна-

[265] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік.

асветніцкай дзейнасці, арганізацыі, якія аб'ядноўвалі рускае насельніцтва, актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі (канферэнцыі, сімпозіумы, абмен дэлегацыямі, кантакты з амбасадай і інш). У Беларусі распаўсюджвалася расійская прэса, выходзілі мясцовыя рускамоўныя выданні, існавалі тэатры, на рускай мове вяліся праграмы радыё і тэлебачання, ажыццяўлялася навучанне ў школах і ВНУ.

Шырока прапагандавалася сумесная дэейнасць Беларускага экзархату рускай праваслаўнай царквы і Маскоўскай патрыярхіі, якія выступалі за кансалідацыю расійскіх і беларускіх адзінаверцаў.

За інтэграцыю з іншымі дзяржавамі і выхаванне ўласнай нацыянальнай выключнасці выступалі праславянскія і, часткова, рускія яб'яднанні як афіцыйна зарэгістраваныя, так і без рэгістрацыі. Так, у статуце ГА "Паслы славянства" былі зафіксаваны наступныя задачы: інтэграцыя з Расіяй, распаўсюджванне праўдзівай інфармацыі аб славянскай культуры, падтрымка дзеячаў культуры, якія падвергліся нападу за абарону нацыянальнай (рускай) культуры і г.д. Мэты і задачы Віцебскага ГА "Руская абшчына" добра бачны з праграмных артыкулаў, якія былі надрукаваны ў газеце "Истоки". Апошняя выдавалася аб'яднаннем раз у квартал накладам 3000 асобнікаў. Газета была зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасв. № 2092 ад 19.06.2003 г.).

Лідар ВГА "Руская абшчына" А.У. Краўцоў на старонках газеты ў артыкуле "Мы ставим цель" размясціў праграмныя мэты рускіх абшчын: "...воспитание у русских, белорусов и украинцев чувства принадлежности к единому и неделимому русскому народу; воспитание русского патриотизма – каждый русский человек должен помнить, что его поле Куликово – та русская земля, на которой он живёт…пропаганда достижений нашей общерусской культуры; осознание подлинного величия русского народа как последнего оплота добра и справедливости, противостоящего мировому злу; ... воспитание чувства ответственности у русских людей за всю Русскую землю и за каждого русского человека; … осознание происходящего геноцида людей русской национальности" [266].

У 1990-я гг. у Беларусі дзейнічалі мясцовыя філіялы расійскіх нацыянальных партый і рухаў (ЛДПР, "Славянскі сабор", культурна-асветніцкае таварыства "Русь" і г.д.).

У выніку можна сцвярджаць, што ў сацыяльна-палітычных і нацыянальных аспектах рускаму насельніцтву Рэспублікі Беларусь былі адкрыты шырокія магчымасці і перспектывы для рэалізацыі нацыянальных і моўна-культурных патрэб. З 1995 г. руская мова з'яўлялася другой дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь, а да таго мовай міжнацыянальных зносін.

---

[266] Кравцов А. Мы ставим цель // Истоки. 2004. февраль. С. 8.

***Палякі*** ў асноўнай сваёй частцы жывуць у Воранаўскім, Шчучынскім, Лідскім, Гродзенскім, Ваўкавыскім раёнах Гродзенскай вобласці. Шмат іх у Гродна і Лідзе [267]. Трэба ўлічваць, што на нацыянальнае і культурнае адраджэнне польскай супольнасці ў Беларусі ўплывалі некалькі фактараў – рэлігійны, адраджэнне самасвядомасці, унутраная палітыка дзяржавы і міждзяржаўны.

Сацыялагічныя апытванні польскага насельніцтва ў Беларусі (выбарка па ўсіх рэгіёнах рэспублікі, праводзіліся польскімі даследчыкамі ў 43 каталіцкіх парафіях, 859 рэспандэнтаў) дазваляюць вызначыць, што значыць быць сапраўдным палякам. Найбольшая колькасць рэспандэнтаў адказала: веданне польскай мовы – 34 % (можна было выбіраць некалькі адказаў, таму агульная лічба больш за 100 %), далей: католік – 30 %, бацькі палякі – 18 %, ведае (захоўвае) традыцыі – 14 %, самавызначэнне – 12 %, жыве ў Польшчы – 11 %, асаблівасці характару – 7 %, нарадзіўся ў Польшчы – 6 %, патрыятызм – 5,5 %, моліцца па-польску – 5 %, шляхціц – 5 %, ведае польскую гісторыю – 3,5 %, іншае – каля 3 %, запіс у дакуменце – каля 3,5 %, родзічы ў Польшчы – 2,5 %, хрышчоны ў каталіцкай веры каля 1 % [268].

Невыпадкова шматлікія польскія грамадскія дзеячы і каля 60 % насельніцтва Беларусі прытрымліваліся думкі, што ўсе католікі – палякі. Гэта было выклікана тым, што праблема польскай этнічнай індэнтыфікацыі шчыльна злучана з каталіцкай рэлігіяй. Каталіцкі клір на Беларусі, у большасці ў 1990-я гг. і часткова сёння, мае яскрава бачную прапольскую арыентацыю.

У другой палове 1990-х гадоў каталіцкія абшчыны Беларусі абслугоўвалі 185 ксяндзоў. З іх 134 былі з замежжа (мясцовых каля 50). Прычым з ліку апошніх, 100 – гэта грамадзяне Польшчы. Дзеянні некаторых ксяндзоў, у прыватнасці “па вяртанню беларускім католікам польскай нацыянальнай свядомасці”, выходзілі за межы рэлігійнай дзейнасці. У касцёлах з’яўлялася дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Польшчы. Былі выпадкі адкрытага закліку да веруючых мяняць грамадзянства з беларускага на польскае.

Тэндэнцыя да паланізацыі касцёла адбывалася адначасова з нараджэннем і развіццём свецкага польскага руху.

Большасць польскіх таварыстваў Рэспублікі Беларусь на пачатку 1990-х гадоў аб’ядналіся ў ГА “Саюз палякаў Беларусі” (СПБ). Устаноўчы з’езд аб’яднання адбыўся 16.06.1990 г. у Гродна. Кіраўніком камісіі па падрыхтоўцы з’езда быў Т. Гавін – старшыня праўлення Гродзенскага абласнога польскага культурна-асетніцкага таварыства імя А. Міцкевіча [269].

---

[267] Gawin T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. Historia działaności. S. 11–36.
[268] Gorbaniuk J., Gorbaniuk O. Co znaczy być Polakiem dla katolików na Białorusi? C. 50.
[269] Інфармацыя аб СПБ // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 41. Арк. 65.

Т. Гавін дае перыядызацыю польскага руху ў Беларусі: 1) пачаткі польскага адраджэння ў гады "перабудовы" (1988–1991 гг.), 2) польскае адраджэнне ў Беларусі 1991–1994 гг., 3) дзейнасць СПБ ва ўмовах аўтарытарнага грамадства 1994–2004 гг. [270]

СПБ ухваліў сваёй галоўнай задачай адраджэнне культурных традыцый, адукацыі і нацыянальнай самасвядомасці палякаў. З самага пачатку члены саюза паводзілі сябе вельмі актыўна. Яны пісалі петыцыі, выстаўлялі пікеты каля абласных і раённых выканкамаў, настойвалі на сваіх патрабаваннях, шчыльна супрацоўнічаючы з каталіцкай царквою. У прыватнасці, яны настойвалі на прызнанні таго, што ўсе касцёлы на тэрыторыі Гродзеншчыны – памятнікі польскай культуры. У Лідзе быў пастаўлены помнік А. Міцкевічу, у Вілейцы – памятнік легіянерам Ю. Пілсудскага. Прыкладаліся намаганні аб'яднаць дэпутатаў-палякаў у Вярхоўным Савеце XII склікання (іх было каля 30), але з гэтага нічога не атрымалася. Яны былі камуністамі, і польскія праблемы іх мала цікавілі [271].

24.04.1993 г. у Гродна адбыўся II з'езд палякаў Беларусі. На ім быў прыняты зварот да ўладаў Рэспублікі Беларусь (Вярхоўнага Савета і Урада), у якім патрабавалася, "каб ужо ў 1993 годзе было зроблена наступнае: 1) пабудова першых у Беларусі польскіх школ у Гродна, Лідзе і Ваўкавыску; 2) утварэнне рэспубліканскага "Цэнтра польскай культуры" часова ў новаўтвораным будынку СПБ у Гродна; 3) пачаць будаўніцтва ў Гродна рэспубліканскага Цэнтра польскай культуры; 4) фінансаванне дзяржаваю польскай газеты "Głos znad Niemna", часопіса "Magazyn Polski"; 5) у мясцовасцях дзе створаны аддзелы СПБ і польскія ансамблі выдзеліць ім памяшканні і сродкі на падтрымку іх культурна-асветніцкай дзейнасці; 6) надаць салдатам АК статус ветэранаў II Сусветнай вайны; 7) згодна з гістарычнай праўдай увесці змены ў падручнікі гісторыі аб адносінах паміж польскімі і беларускімі народамі [272].

У 1992–1993 гг. ішлі працы па пабудове ў Гродна "Цэнтра польскай культуры". СПБ 22 студзеня 1993 г. звярнуўся ў Савет Міністраў, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з просьбай аб выдаткаванні бюджэтных сродкаў на яго пабудову [273]. 4 сакавіка 1993 года Міністэрства Культуры Рэспублікі Беларусь у сваім адказе Савету Міністраў "Аб уключэнні будынка Цэнтра польскай культуры ў г. Гродна ў пералік аб'ектаў культуры, будаўніцтва якіх фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту" адзначыла, што міністэрства не мае магчымасці фінісаваць будаўніцтвыа гэтага Цэнтра. Але падтрымлівае

[270] Gawin T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. S. 87, 141, 243.
[271] Национально–государственные интересы Республики Беларусь. С. 241–242.
[272] Зварот з'езду // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 9. Арк. 106–107.
[273] Ліст СПБ у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.01.1993 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 7. Арк. 204–205.

просьбу СПБ і лічыць патрэбным адшукаць для гэтага дадатковыя сродкі [274].

Вялікая актыўнасць СПБ у некаторых кірунках выклікала незадавальненне, напачатку з боку беларускай нацыянальна-арыентаванай інтэлігенцыі, а пазней з боку ўрада Беларусі, які заявіў, што "ніякай антыбеларускай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь беларускі ўрад не дапусціць" [275].

Аб тым, наколькі сур'ёзны былі асцярогі правячай эліты Беларусі пагрозы польскай экспансіі, сведчыць выступленне старшыні КДБ на закрытым пасяджэнні Вярхоўнага Савета ў 1992 г. Ён паведамляў: "О попытках искусственного ополячивания белорусского населения, особенно в западных районах Беларуси… Польская сторона проводит целенаправленную массированную обработку населения… в духе католицизма, полонизации, пытается переориентировать его гражданское самосознание. При этом преследуется конкретная цель – создание хорошо организованной, идейно сплочённой польской диаспоры в Беларуси, способной стать проводником политики РП и при необходимости – средством давления в межгосударственных отношениях. Такая политика Польши в перспективе может реально угрожать суверенитету и территориальной целостности Республики Беларусь" [276].

У польскім руху адбывалася пэўная эвалюцыя. Адна яго частка пайшла па шляху палітызацыі. Напрыканцы 1993 г. была створана і зарэгістравана новая палітычная партыя – Польскае дэмакратычнае аб'яднанне (ПДА). У яе дакументах былі вызначаны наступныя задачы партыі: дэмакратызацыя, рэфарміраванне грамадства, умацаванне незалежнасці Беларусі, стварэнне спрыяльных умоў жыцця насельніцтву, асабліва нацыянальным супольнасцям, у тым ліку і палякам. "Мы не польская общественная организация, мы одна из политических партий Беларуси", – было заяўлена з трыбуны ўстаноўчага з'езду ПДА.

У сярэдзіне 1990-х гг. адбылося збліжэнне СПБ і БНФ. Палякі пагадзіліся, з агаворкамі, з лініяй БНФ: спачатку беларускае адраджэнне, затым – усе астатнія, і толькі поспех беларускага адраджэння дасць гэтым астатнім шанс і гарантыі. Падзеі пераканалі СПБ, што пакуль Беларуссю кіруюць "інтэрнацыяналісты", польская культура і школа будуць мець толькі фармальную падтрымку. Саюз палякаў адназначна выказаўся за дзяржаўнасць беларускай мовы.

Ідэйная блізкасць беларускага і польскага адраджэння праявілася ў ходзе прэзідэнцкіх выбараў 1994 г. Лідар БНФ З.С. Пазняк у цэлым па краіне атрымаў 12,8 % галасоў і заняў трэцяе месца. У Гродзенскай

---

[274] Ліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4.03.1993 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 7. Арк. 201.

[275] Национально–государственные интересы Республики Беларусь. С. 243.

[276] Там жа. С. 224–225.

вобласці за яго прагаласавалі 20,6 % і ён заняў другое месца. Прычым найбольшую колькасць галасоў ён атрымаў у рэгіёнах з высокім працэнтам польскага насельніцтва, а ў чатырох раёнах аказаўся пераможцам. На парламенцкіх выбарах 1995 г. СПБ і БНФ сталі фактычнымі саюзнікамі. Некаторыя члены Саюза палякаў балатаваліся ад Народнага Фронта.

У барацьбу за пост прэзідэнта ўключыўся і старшыня ПДА Э.Ахрэм. Склад членаў яго ініцыятыўнай групы налічваў усяго 337 чалавек. Колькасць сабраных імі подпісаў аказалася вельмі далёка ад неабходнай для рэгістрацыі (100 тыс.), што ўсе іх нават не здавалі ў выбарчую камісію. У ходзе перарэгістрацыі партый і грамадскіх аб'яднанняў у 1995 г. ПДА не стала перарэгістроўвацца і знікла з палітычнай арэны. Падзеі паказалі, што арганізацыя, якая прэтэндуе на палітычнае прадстаўніцтва і створана на нацыянальнай прыкмеце, не мела шанцаў у Беларусі на поспех, т.я. палякі, як і ўвесь народ, мелі розныя палітычныя арыентацыі.

З моманту абрання прэзідэнтам А. Лукашэнкі барацьба супраць польскага ўплыву стала важным кірункам дзяржаўнай палітыкі. Яе тэарэтычную аснову сфармуляваў М. Сяргееў, лідар Славянскага сабора "Белая Русь". На яго думку беларускае грамадства складалася з "русі" і "ляхаў". Апошнія з'яўляліся носьбітамі "тлятворнага ўплыву Захада" і неслі пагрозу здаровай славянскай цывілізацыі. Быў ухвалены курс на "славянска-праваслаўнае адзінства". Пачаўся працэс ціску на каталіцкіх святароў з замежжа. У чэрвені 1996 г. у Лідзе была ліквідавана мемарыяльная дошка, прысвечаная Л. Нарбуту, герою паўстання 1863 г. Зняцце ўказам Прэзідэнта з паста старшыні Гродзенскага гарвыканкама, паляка па нацыянальнасці, Г. Крупенка дало падставу для распаўсюджвання чутак, што ўсіх палякаў пазбавяць кіруючых пасад і г.д. [277]

Пасля лістапада 1996 г. супрацьдзеянне ўладаў польскаму адраджэнню стала больш актыўным. Вядома, што старшыня СПБ Т. Гавін крытычна выказваўся аб рэферэндуме. У выступу па беларускаму тэлебачанню 26.03.1997 г. А. Лукашэнка абвінаваціў беларускіх палякаў не толькі ў "спровацированных извне" антыўрадавых выступах, але і ў "чёрной неблагодарности", якой яны адказалі яму на тое, што беларускі ўрад быццам бы адкрыў у Гродна польскую школу [278].

29.06.1997 г. Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь перарэгістравала "Саюз Палякаў на Беларусі". У студзені 1998 г. на тэрыторыі Беларусі меліся: Дамы Паляка (у якасці матэрыяльнай базы СПБ) у Гродна, Лідзе, Магілёве, Баранавічах, Браславе, Шчучыне, Ашмянах, в. Кемелішкі Астравецкага раёна, г.п. Поразава, в. Вішнява Валожынскага раёна; польскія бібліятэкі ў Гродна, Лідзе, Ваўкавыску,

[277] Национально–государственные интересы Республики Беларусь. С. 244–245.
[278] Там жа. С. 246.

Навагрудку, Ашмянах, в. Кемелішкі, Мінску, Магілёве, Віцебску, Браславе, Шчучыне, Баранавічах, Поразаве, в. Вішнева [279].

У 1998 г. СПБ меў структуры ў 6 абласцях, 51 раёне, 150 вясковых мясцовасцях, налічваў каля 30 тыс. членаў. Дзейнічалі яго аддзелы ў Гродзенскай вобласці: Гродзенскі гарадскі і раённы, Ліда, Ваўкавыск, Шчучын, Ашмяны, Астравец, Іўе, Воранава, Слонім, Навагрудак, Карэлічы, Свіслач, Бераставіцы, Масты; у Мінскай вобласці: Мінск, Нясвіж, Вілейка, Маладзечна, Валожын, Клецк, Івянец; у Брэсцкай вобласці: Брэст, Пінск, Баранавічы, Ляховічы, Кобрын, Пружаны; у Віцебскай вобласці: Віцебск, Браслаў, Паставы, Міёры, Полацк, Глыбокае; у Магілёўскай вобласці: Магілёў, Бабруйск; у Гомельскай вобласці: Гомель, Мазыр, Светлагорск.

Пры СПБ дзейнічалі 65 польскіх самадзейных калектываў (з іх 40 у Гродзенскай вобласці): хары, вакальныя групы, ансамблі спеваў і танцаў, танцавальныя калектывы, вакальна-інструментальныя ансамблі, фальклорныя групы. У 1997 г. быў заснаваны ў Гродна польскі тэатр (кіраўнік В.Сілкін).

Вопратку для калектываў стваралі за ўласны кошт, толькі ансамблю спеваў і танцу “Ютшенка” г. Ваўкавыска пашыў фінансаваў Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур.

Можна адзначыць вялікія намаганні і значныя дасягненні польскіх актывістаў у сферы адраджэння польскамоўнай адукацыі ў нашай краіне.

Першыя спробы стварэння польскай адукацыі ў Беларусі пачаліся ў сакавіку 1988 г., калі былі накіраваны лісты да ўладаў Гродзеншчыны [280]. Настойлівыя патрабаванні да ўладаў далі плённы вынік. У верасні 1996 года ў Гродна пры ўдзеле прем’ер-міністраў Беларусі і Польшчы была ўрачыста адкрыта першая польская школа. 1,5 млн. долараў на яе будаўніцтва выдаткаваў польскі бок. Праз СПБ школу фінансавала “Польская садружнасць” – грамадская арганізацыя дапамогі палякам за мяжой. 62 тыс. долараў выдаткаваў беларускі ўрад. Далейшае ўтрыманне школы ўзяў на сябе Гродзенскі гарвыканкам. Яна разлічана на 660 месц, з інтэрнатам, басейнам, стадыёнам.

У 1997–1998 гг. вывучэнне польскай мовы ў розных формах ахоплівала 19353 вучняў у 325 пунктах навучання (гл. табл. 5, 6) [281].

---

[279] Інфармацыйныя лісты // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 79–85.

[280] Gawin T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. S. 120–128.

[281] Gawin, T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. S. 285.

Табліца 5 – Вывучэнне польскай мовы ў Рэспубліцы Беларусь, 1997–1998 гг.

| **Рэгіён** | **Колькасць школ** | **Колькасць вучняў** | **Колькасць настаўнікаў** |
|---|---|---|---|
| Гродзенскі | 221 | 12835 | 304 |
| Брэсцкі | 37 | 2583 | 48 |
| Магілёўскі | 5 | 152 | 3 |
| Віцебскі | 21 | 1058 | 15 |
| Мінскі | 39 | 2707 | 50 |
| Гомельскі | 1 | 16 | 1 |
| Усяго | 325 | 19353 | 421 |

18.02.1998 г. СПБ накіраваў ліст у Навагрудскі райвыканкам, у якім са свайго боку прапаноўваў дапамогу ўладам у справе фінансавання будаўніцтва польскай школы ў Навагрудку. У той жа дзень СПБ звярнуўся ў Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей з прапановай аб будаўніцтве ў г. Гродна яшчэ адной сярэдняй школы з польскай мовай навучання за кошт бюджэту, а ў Навагрудку за кошт “Вспульноты Польскай”. Навагрудскі гарвыканкам пряняў рашэнне аб адмове ў будаўніцтве сярэдняй школы з польскай мовай навучання. Асноўнай прычынай адмовы была наступная: “наяўнасць вучняў у школах з польскай мовай навучання не дазволіць сфарміраваць класы-камплекты з патрэбнымі нарматывамі напаўняльнасці, што ў сваю чаргу павялічыць кошт навучання аднаго дзіцяці ў гэтых класах у параўнанні з классамі з сярэдняй напаўняльнасцю ў іншых агульнаадукацыйных школах горада” [282].

Табліца 6 – Колькасць класаў у 1997–1998 гг. з польскай мовай навучання ў Беларусі.

| **Месца знаходжання** | **Класы** | **Колькасць вучняў** | **Колькасць настаўнікаў** |
|---|---|---|---|
| Гродна – польская школа | 1–7 | 486 | 65 |
| Сапоцкін | 4,5,6 | 25 | 4 |
| Ваўкавыск | 1–6 | 95 | 6 |
| Навагрудак | 2,3,4,6 | 39 | 6 |
| Ліда | 4 | 13 | 1 |
| Мінск | 1–4 | 51 | 4 |
| Брэст | 1–6 | 83 | 6 |
| Усяго | 31 | 789 | 92 |

[282] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 79.

Закончылася правалам і спроба пабудаваць польскую школу ў Ваўкавыску. СПБ знайшоў сродкі, падпісаў неабходныя дакументы, вызначыўся з падрадчыкам для будаўніцтва, але мясцовыя ўлады забаранілі таму, што "кацельная", каля якой меркавалі пабудаваць школу, патрабуе рэканструкцыі.

29.03.1999 г. галоўнае праўленне ГА "СПБ" выступіла з заявай. У ёй гаварылася: "У знак пратэсту супраць нявырашанасці ўзнятых намі пытанняў Саюз палякаў на Беларусі быў вымушаны прыняць рашэнне аб няўдзеле ў III Фестывалі Нацыянальных Культур, нягледзячы на тое, што ў свой час быў ініцыятарам гэтага Фестывалю". У Заяве нават дэклараваўся магчымы выхад ГА "СПБ" з Каардынацыйнага Савета [283].

Старшыня СПБ Т. Гавін тлумачыў дзеянні ўладаў наступным чынам: "Як толькі беларус, паляк, рускі стане адчуваць сябе беларусам, палякам, рускім, у іх знікне "савецкасць", і кіраваць ім будзе значна складаней" [284].

ГА "СПБ" і далей працягвала актыўна займацца пытаннямі будаўніцтва польскіх школ у Беларусі. Так у 2001 г. у польскай школе ў Баранавічах у 1–11 класах вучылася 610 вучняў, існавала група дарослых па вывучэнню польскай мовы, дзве настаўніцы выязжалі для правядзення заняткаў па польскай мове ў навакольныя школы вёсак Ішкалдзь і Паланечкі [285]. У маі 2012 г. шэраг актывістаў арганізацыі пратэставалі супраць адкрыцця рускамоўных класаў у польскай школе.

СПБ на працягу шмат год прыкладала вялікія намаганні, каб зрушыць з месца вырашэнне справы па ўраўнаванню праў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і былых членаў узброеных фарміраванняў Арміі Краёвай (улады тлумачылі, што перашкод не будзе, калі дадзеныя асобы не здзейснялі злачынстваў у перыяд іх удзелу ў АК на тэрыторыі Беларусі); імкнулася ўсталяваць памятную дошку ў Брэсцкай крэпасці ў гонар яе абаронцаў у верасні 1939 г.; займалася ўшанаваннем месц пахаванняў загінуўшых удзельнікаў фарміраванняў АК у Лідзе і Гродна.

Па гэтых пытаннях у ГА "СПБ", з-за ідэалагічных разыходжанняў, узнікалі канфлікты з органамі дзяржаўнай улады. СПБ у яго патрабаваннях падтрымлівалі польская амбасада, Беларускі Хельсінскі камітэт і інш. 29–30.05.1999 г. у Гродна адбылося пасяджэнне галоўнага савета "СПБ" з удзелам актыву, на якім былі абмеркаваны актуальныя пытанні дзейнасці арганізацыі. Не знайшоўшы паразумення з Дзяржкамітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей, 04.06.1999 г. ГА "СПБ" (старшыня Т. Гавін)

[283] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 80.
[284] Белорусская деловая газета. 1997. 8 дек. С. 4.
[285] Kabzińska I. Odradzanie sią grupy polskej inteligencij w Respublice Białoruś // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф. С. 35.

звярнулася ва Урад Рэспублікі Беларусь з пратэстам на дзейнасць Дзяржкамітэту ў адносінах да СПБ [286].

Органы дзяржаўнай улады Гродзеншчыны ў супрацьвагу ГА "СПБ" у 1999 г. аказалі падтрымку дзейнасці "Polska Macierz Szkolna" ("Польская матерь школьная"), якая пачала дзейнасць у Беларусі з 1995 г. [287], і кангрэса палякаў. Шэраг польскіх калектываў сталі фінансавацца дзяржавай. Было вырашана, каб зменшыць матэрыяльную базу ГА "СПБ", распачаць кампанію па пераводу "Дамоў палякаў" на баланс аддзелаў культуры (як бы ўзяць клопат аб іх фінансавым утрыманні). Але не ўсе палякі былі згодныя на гэта. Яны адчулі ў гэтым будучую форму ўціску ўладаў на дзейнасць аб'яднанняў (у прыватнасці ў Поразава, Лідзе). 13.10.2005 г. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прапанавала абласным выканаўчым камітэтам разгледзець пытанне аб уключэнні культурна-асветных установ СПБ у сетку дзяржаўных установ культуры [288].

У пачатку 2000-х гг. ГА "СПБ" абвінавачвалі ў антыдзяржаўнай дзейнасці, у выкарыстоўванні фінансавых сродкаў аб'яднання на падрыў існуючай улады. Сталі адбывацца праверкі структур СПБ з боку падатковых органаў і абслугоўваючага банка. Аб'яднанне абвяргала любыя абвінавачванні ў свой бок: "…атрыманыя грашовыя сродкі выкарыстоўваюцца дакладна па мэтаваму прызначэнню, не накіраваны і не могуць быць выкарыстаны для дзейнасці, накіраванай на змяненне канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, у палітычных мэтах, распальвання сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці" [289].

У 1990-я гг. у Беларусі дзейнічалі харцарскія і маладзёжныя арганізацыі: таварыства польскай моладзі ў Беларусі, таварыства польскай моладзі ў Гродна, клуб польскіх студэнтаў у Мінску, клуб польскай моладзі ў Браславе і інш. [290] "Саюз польскага харцарства на Беларусі" ставіў сваёй асноўнай задачай – выхаванне грамадзянскай пазіцыі ў маладога пакалення, пачуцця клопату і адказнасці за лёс сваёй дзяржавы – Беларусі.

Выдавалася ў Беларусі польскамоўная прэса. Самым вядомым выданнем з'яўляўся орган СПБ "Głos znad Niemna". Газета пачала друкавацца з 1989 г. На пачатку набор рабіўся ў Беластоку, а друк у Гродна. Выходзіла нерэгулярна. Затым увесь працэс яе стварэння быў перанесены ў Гродна, газета стала штотыднёвікам, наклад дасягнуў 10 тыс.

---

[286] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 81.

[287] Kabzińska I. Odradzanie sią grupy polskej inteligencij w Respublice Białoruś / I.Kabzińska // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. С. 34.

[288] Ліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 474. Арк. 266.

[289] Kruczkowski T. Polacy jako mniejszośc narodowa na Białorusi – warunki egzystencji i perspektywy // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф. С. 132.

[290] Kabzińska I. Odradzanie sią grupy polskej inteligencij w Respublice Białoruś // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. С. 38.

асобнікаў. За 1992–1994 гг. у Гродна выйшла пяць нумароў часопіса “Magazyn Polski”. У 1993–1994 гг. выходзіла газета “Cudowna Podros”, разлічаная на дзяцей і моладзь. Былі мясцовыя выданні. У Лідзе на працягу 1994–1998 гг. выпускалася гісторыка-краязнаўчая газета “Ziemia Lidzka”. Выдаваліся польскамоўныя бюлетэнні ў Баранавічах і Нясвіжы. Для вырашэння праблем навукова-педагагічнага характару пры вывучэнні польскай мовы, на тэрыторыі Беларусі з 1997 г. Таварыства “Polska Macierz Szkolna” (“Польская матерь школьная”) выдавала асветніцкі і грамадска-культурны часопіс “Słowo Ojczyste” (Роднае слова). У ім прадугледжваліся два дадаткі. Першы – “Мы і школа” – як метадычны дапаможнік для настаўнікаў і выкладчыкаў польскай мовы. Другі – літаратурна-гістарычны, у ім прапагандавалася творчасць беларускіх і польскіх пісьменнікаў і паэтаў. Галоўнымі праблемамі польскай прэсы былі: матэрыяльна-фінансавыя цяжкасці, адсутнасць дастатковай колькасці журналісцкіх кадраў, слабае валоданне польскай мовай палякамі Беларусі [291].

Можна прывесці прыклады супрацоўніцтва грамадскіх арганізацый польскага насельніцтва з органамі мясцовай улады. У 1999 г. у Шчучыне Гродзенскай вобласці, з санкцыі уладаў, нацыянальна-культурныя калектывы (польскі хор, 2 фальклорныя калектывы) прынялі ўдзел у агітацыйнай кампаніі па выбарах дэпутатаў мясцовых саветаў у вясковай мясцовасці.

У 2003 г. на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь было 14 польскіх нацыянальных аб’яднанняў, з іх 4 рэспубліканскія, 17 Дамоў палякаў, у 120 населенных пунктах 140 аддзяленняў СПБ, 132 польскія самадзейныя творчыя калектывы, тэатр маладога акцёра ў вёсцы Рубяжэвічы Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. 2 польскія школы (Гродна, Ваўкавыск) [292].

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на пачатак 2005 г. органамі юстыцыі былі зарэгістраваны 8 грамадскіх аб’яднанняў, створаных польскай грамадскасцю Беларусі. У рэспубліцы на польскай мове выдаваліся 4 газеты і 2 часопісы [293]. Самым шматлікім і разгалінаваным па сваёй структуры польскім грамадскім аб’яднаннем напачатку XXI стагоддзя, як і раней, з’яўляўся Саюз палякаў Беларусі

Пад эгідай ГА ”СПБ” дзейнічалі больш за дзесяць структур, у тым ліку: маладзёжныя, студэнцкія, польскае навуковае таварыства, таварыства польскіх гісторыкаў, таварыства медыцынскіх сясцер і акушэраў, таварыства народных майстроў, таварыства польскіх мастакоў, польскае таварыства ўрачоў на Гродзеншчыне, таварыства жаўнераў Арміі Краевай,

[291] Kabzińska I. Odradzanie sią grupy polskej inteligencij w Respublice Białoruś. С. 34–35.
[292] Інфармацыя аб аказанні дапамогі нацыянальна-культурным аб’яднанням беларусаў у Польшчы і польскім нацыянальна-культурным аб’яднанням у Беларусі за 1995–2002 гг. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 474. Арк. 22–24.
[293] К вопросу о белорусско–польских отношениях. С. 7.

таварыства польскіх ветэранаў, таварыства палякаў – ахвяр палітычных рэпрэсій, спартыўны клуб ”Баторы”, гандлёва-прамысловая палата, камітэты памяці А.Міцкевіча і Э.Ажэшка і інш. ГА “СПБ” аб’ядноўвала звыш за 22 тыс. чалавек. Пры СПБ таксама дзейнічалі рэспубліканскія грамадскія аб’яднанні “Харцарства” (польскі варыянт скауцкага руху) і “Мацер школьная” (спецыялізавалася на адукацыйных праграмах) [294].

Пачатак XXI ст. адзначыўся канфрантацыяй з уладамі і ўнутраным расколам у СПБ. Значную ролю тут зноў адыграў знешнепалітычны фактар.

Першыя вострыя канфлікты ўнутры СПБ пачынаюцца з 2003 г., калі ўлады спрабуюць узяць пад кантроль кіруючыя органы грамадскай арганізацыі, прывесці да кіраўніцтва лаяльных асоб для таго, каб праз СПБ прарваць палітычную ізаляцыю Беларусі [295] і паўплываць на палітыку афіцыйных уладаў Польшчы, якія неаднаразова крытыкавалі ўнутраную палітыку Рэспублікі Беларусь. Так, у красавіку 2002 г. ад міністра замежных спраў Польшчы У. Цімашэвіча прагучала: “У Беларусі па-ранейшаму парушаюцца правы чалавека, актывісты апазіцыі знікаюць без вестак пры таямнічых абставінах, а выказванне сваіх поглядаў караецца. Калі не будзе перамен – не зменяцца і нашы адносіны да лідараў Беларусі”. Не менш красамоўнае выказванне былога прэм’ер-міністра Польшчы Т. Мазавецкага: “Я глыбока ўсхваляваны ганеннямі на беларускую газету “Пагоня”. Судзіць журналістаў за крытычны тэкст аб прэзідэнце – гэта, зразумела, яўны прыклад парушэння свабоды слова. Я цалкам салідарны з абвінавачваемымі. Неабходна прысутнасць назіральнікаў з-за мяжы на іх працэсе” [296]. 02.08.2005 г. дзяржавы – члены Еўрасаюза апублікавалі сумесную заяву (падпісалі 34 дзяржавы – краіны ЕС, кандыдаты і партнёры): “Еўрасаюз асуджае апошнія крокі беларускіх уладаў супраць СПБ і ўмяшальніцтва ўрада ў дзейнасць незалежнай арганізацыі” [297]. Трэба мець на ўвазе і тое, што ў 2005 г. у Польшчы працягвалі навучанне нелегальнага ў Беларусі гуманітарнага ліцэя, напрыканцы кастрычніка 2005 г. у Беларусі з’явіўся першы нумар штоквартальнага часопіса “Польскі часопіс у эміграцыі”. Рэдакціравалі яго журналісты, якія падтрымлівалі А. Борыс. Першы нумар быў надрукаваны ў Польшчы пры падтрымцы створанага па ініцыятыве “Права і справядлівасці” Камітэта салідарнасці з Беларуссю. Часопіс павінен скласці канкурэнцыю прапрэзідэнцкаму “Магазыну польскаму”. З 22.02.2006 г. з тэрыторыі Польшчы на Беларусь пачалося апазіцыйнае афіцыйным уладам Беларусі радыёвяшчанне па-беларуску радыё “Рацыя” [298].

[294] Звесткі аб дзейнасці СПБ // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 474. Арк. 31.
[295] Gawin T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. S. 331–332.
[296] Хроника текущих событий // Новая Польша. 2002. № 5. С. 8.
[297] Там жа. 2005. № 9. С. 17.
[298] Там жа. С. 17; Там жа. 2005. № 12. С. 11; Там жа. 2006. № 4. С. 13.

Беларускія ўлады рэагавалі адпаведным чынам. У ліпені 2005 г. адбыліся некалькі высылак дыпламатаў Беларусі з Польшчы і наадварот, міліцыя і супрацоўнікі КДБ Беларусі затрымалі трох актывістаў СПБ, уварваліся ў памяшканне СПБ у Гродна, былі затрыманы паўтара дзясятка актывістаў СПБ і некалькі журналістаў. У пачатку жніўня 2005 г. у Гродна быў арыштаваны галоўны рэдактар газеты “Głos znad Niemna”, прэс-сакратар СПБ А. Пісальнікаў, менавіта ў той дзень, калі Гродна наведваў віцэ-маршалак Польскага сейма, лідар “Грамадзянскай платформы” Д. Туск. У тым жа месяцы беларускія памежнікі анулявалі дазвол на ўезд у краіну 4 дэпутатам еўрапарламенту ад “Грамадзянскай платформы” (Польшча) і мэру Беластока Р. Туру [299]. Польшчу вельмі моцна ўсхвалявала тое, што Беларусь у 2007 г. аб’явіла аб устаноўцы пад Брэстам і Гродна сучасных супрацьпаветраных ракет С-300 (дасягаюць прасторы да Варшавы, траціны тэрыторыі Польшчы) [300].

У той жа час ёсць і адваротныя прыклады. Па шляху супрацоўніцтва пайшлі намаганні абедзвюх краін па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны. Згодна з пагадненнем паміж Урадамі Рэспублікі Польшча і Рэспублікі Беларусь ад 25.03.1995 г. была створана адмысловая камісія. Так, 13–15.04.2005 г. у Пінску адбылося 15 пасяджэнне Беларуска-польскай кансультацыйнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны [301].

13.03.2005 г. галоўны савет СПБ, выбраны VI з’ездам ГА “СПБ”, за подпісам старшыні ГА “СПБ” А. Борыс накіраваў зварот да Прэзідэнта А. Лукашэнка. Пасля канстатуючай часткі аб становішчы палякаў у Беларусі і дзейнасці СПБ, у ім утрымліваецца зварот па дапамогу ў вырашэнні наступных пытанняў: 1) Зацвердзіць механізм падаткаабкладання Цэнтраў польскай культуры, Дамоў польскіх ідэнтычныя прымяняемым у адносінах да дзяржаўных устаноў культуры; 2) Перагледзець расцэнкі па аплаце камунальных паслуг у Дамах польскіх і прывесці іх у адпаведнасць з расцэнкамі для дзяржаўных устаноў культуры; 3) Выдзеліць фінісаванне на бягучы рамонт Дамоў польскіх; 4) Вырашыць пытанне аплаты працы кіраўнікоў польскіх самадзейных калектываў; 5) Заключыць дамовы паміж Міністэрствамі адукацыі, культуры Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча аб супрацоўніцтве ў вобласці адукацыі, навукі і культуры (згодна з інфармацыяй Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь быў заключаны 9.12.2004 г.); 6) Выдаць падручнікі і метадычныя дапаможнікі для школ з польскай мовай навучання; 7) Дазволіць будаўніцтва школ з польскай мовай ў Воранава і другой у г. Гродна за кошт СПБ; 8) Пачаць фінансаванне выдання польскамоўнай газеты “Głos znad Niemna”, а

---

[299] Хроника текущих событий // Новая Польша. 2005. № 9. С. 16.
[300] Там жа. 2007. № 1. С. 14.
[301] Ліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 2.03.2005 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 474. Арк. 206.

таксама часопіса “Magazyn Polski”, як гэта робіцца для беларусаў у Польшчы; 9) Прыняць дэлегацыю СПБ для абмеркавання ўзнятых намі пытанняў [302].

Дзеянні новага кіраўніцтва СПБ выклікалі негатыўную рэакцыю з боку выканаўчых органаў улады Беларусі. Зыходзячы з таго, што згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь уся дзейнасць арганізацыі (ГА”СПБ”) павінна была рэалізоўвацца ў культурна-асветніцкім кірунку і з улікам шматлікіх парушэнняў пры правядзенні чарговага з’езда ГА “СПБ” (2005 г.), а таксама ў сувязі з палітызаванасцю дзейнасці СПБ, Міністэрства юстыцыі Беларусі занялося вывучэннем дакументаў з’езда і дало ім прававую адзнаку. У сакавіку 2005 г. Міністэрства юстыцыі Беларусі не прызнала законнымі вынікі з’езда СПБ. 11.05.2005 г. VI з’езд ГА “СПБ” быў прызнаны нелігітымным, а прынятыя на ім рашэнні – неправамоцнымі [303]. Было прапанавана вярнуць на пасаду старшыні лаяльнага да ўладаў Т. Кручкоўскага. Але таго ўжо выключылі са складу СПБ наогул. У адказ – неаднаразовыя арышты абранай на з’ездзе старшыні А. Борыс. У той час прагучалі словы тагачаснага дэпутата Палаты прадстаўнікоў В. Фралова: “Саюз палякаў праяўляе больш адвагі ў барацьбе за свае правы, чым уся наша апазіцыя ў апошнія гады” [304]. У снежні 2006 г. старшыня не прызнанага ўладамі Беларусі СПБ А. Борыс была пазбаўлена замежнага пашпарта [305].

27.08.2005 г. у Ваўкавыску быў арганізаваны новы з’езд СПБ і праведзены чарговыя выбары. Дэлегаты выбралі новага старшыню – І. Лучніка. Улады Рэспублікі Беларусь вынікі работы з’езда прызналі. У 2009 г. І. Лучніка на пасадзе старшыні СПБ змяніў С. Сямашка. 14.01.2012 г. СПБ узначаліў М. Лысы. У сваю чаргу ўлады Польскай рэспублікі – прэзідэнт і ўрад – выказаліся, што будуць падтрымліваць толькі арганізацыю А. Борыс. У чэрвені 2010 г. Борыс заявіла аб адстаўцы і на яе месца была выбрана А. Арэхва, якую 18.11.2012 г. змяніў М. Яцкевіч. Ад гэтага часу беларускія палякі належаць да двух арганізацый СПБ.

Асобы польскай нацыянальнасці ў Беларусі займалі даволі высокі сацыяльны статус, аб гэтым сведчаць наступныя факты. У органах выканаўчай улады Гродзенскай вобласці больш за 20 % складалі палякі. Больш за 30 % іх было сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў. Падчас выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў 24-га склікання дэпутатамі былі выбраны 687 прадстаўнікоў польскай нацыянальнай супольнасці (21,6 % ад агульнай колькасці дэпутатаў). Па 2 дэпутаты польскай нацыянальнасці меліся ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі [306]. Згодна з данымі аб нацыянальным складзе дэпутатаў Віцебскай вобласці на 29.01.1996 г., у

[302] Зварот галоўнага савета ГА СПБ // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 474. Арк. 229–229 адв.
[303] К вопросу о белорусско–польских отношениях. С. 9.
[304] Хроника текущих событий // Новая Польша. 2005. № 9. С. 16.
[305] Там жа. 2007. № 1. С. 14
[306] К вопросу о белорусско–польских отношениях. С. 7.

318 саветах вобласці з 4461 дэпутата прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей складалі 8,1 %. У абласным савеце іх было – 12,8 %, раённых саветах – 9,03 %, гарадскіх – 15,5 %, сельскіх саветах – 6,8 %, пасялковых – 7,9 %, гарадскіх саветах абласнога падпарадкавання – 26,4 %, гарадскіх саветах раённага падпарадкавання – 7,6 % [307]. Наогул сябры СПБ актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх выбарчых кампаніях Беларусі на працягу 1994–2004 гг. Набіралі ў асобных акругах і ўчастках пераважна ад 8 да 14 % галасоў выбаршчыкаў. У мясцінах з вялікай колькасцю польскага насельніцтва некаторыя члены СПБ станавіліся дэпутатамі мясцовых саветаў [308].

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што даволі значная частка польскага насельніцтва Беларусі праз дзейнасць у нацыянальных грамадскіх аб'яднаннях дасягалі мэтаў нацыянальнага адраджэння, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, пашырэння грамадскай актыўнасці палякаў Беларусі, абароны сваіх нацыянальных і грамадзянскіх правоў. Сярод іншых вырашалі задачы выяўлення патрэб і праблем палякаў Беларусі, абуджэння грамадзянскай самасвядомасці польскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь, супрацьдзеяння шавінізму і нацыяналізму, развіцця патрыятызму і інш.

Змены ў грамадстве, што адбыліся на працягу апошняга дзесяцігоддзя XX – пачатку XXI стст., спрыялі нацыянальнаму і культурнаму адраджэнню польскай супольнасці на Беларусі. На практыцы гэта ўвасобілася ва ўдасканаленні арганізацыйных форм дзейнасці, аднаўленні некаторых відаў народнай творчасці і адраджэння польскай нацыянальнай адукацыі.

***Украінцы*** ў даследуемы перыяд складалі чацвёртую па колькасці этнічную групу ў Беларусі (1999 г. – 2,4 %, 2009 г. – 1,7 % або 158723 чал.). Яны пражываюць, з большага, у Мінску, буйных гарадах усходняй часткі краіны і ў Брэсцкай вобласці, дзе ў перыяд дэмакратызацыі грамадскага жыцця і сталі ўзнікаць грамадскія арганізацыі ўкраінцаў.

Першым было створана ў студзені 1991 г. рэспубліканскае Беларускае грамадскае аб'яднанне ўкраінцаў "Ватра". З 1995 г. бярэ пачатак дзейнасць ГА "Цэнтр украінскай культуры "Січ" у г. Мінску [309]. Аб'яднанне было ўтворана з мэтай – садзейнічаць захаванню і развіццю ўкраінскай культуры, самаідэнтыфікацыі ўкраінскага этнаса ў Рэспубліцы Беларусь, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, гістарычнай памяці, стварэння ўмоў для нацыянальна-культурнага развіцця. Цэнтр

---

[307] Справаздача // ДАВц. Фонд 1966. Воп. 29. Спр. 22. Арк. 24–38.

[308] Gawin T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. S. 256–264.

[309] Пушкін І.А. Асноўныя тэндэнцыі ў накірунках дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі (1991–2004 гг.) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. 2006. № 4. С. 15–20 ; Яго ж. Грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцей Беларусі і фарміраванне грамадзянскай супольнасці (1991–2005 гг.) // ИППОКРЕНА. 2006. № 4. С. 16–23.

аб’ядноўваў каля 50–70 актывістаў, у мерапрыемствах грамадскага аб’днання ўдзельнічала да 900 чалавек. Сацыяльны склад не даследаваўся.

З 1997 г. пры ГА ЦУК “СІЧ” працавала нядзельная ўкраінская школа, якая ўвесь час мела цяжкасці ў дзейнасці з-за праблем з памяшканнем для правядзення заняткаў. Дзейнічаў хор украінскай песні “Крыніца” (з 1998 г. меў званне народнага), існаваў дзіцячы танцавальны ансамбль і “Клуб сяброў Украіны”.

Цэнтр “Січ” супрацоўнічаў з Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур, Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей, іншымі нацыянальна-культурнымі аб’яднаннямі.

У якасці прыкладу дзейнасці Цэнтра ўкраінскай культуры “Січ” варта прывесці прарobленую арганізацыйную працу і падрыхтаваную творчую праграму VI рэспубліканскага фестывалю мастацтваў украінцаў Беларусі, які праводзіўся 27.04.2002 г. у Мінску ў памяшканні Беларускай дзяржаўнай акадэміі фізічнай культуры (БДАФК). Дадзенае мерапрыемства праводзілася цэнтрам “Січ” у межах IV Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур і святкавання году Т.Р. Шаўчэнкі ў Беларусі пры спрыянні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, амбасады Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, адміністрацыі БДАФК.

Да пачатку фестывалю была выдадзена прыгожая праграмка на ўкраінскай мове з запрашэннем наведаць выставу твораў жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама канцэрт, у якім бралі ўдзел лепшыя выканаўцы абласных аглядаў. На выставе былі прадстаўлены жывапіс, вышыўка, кераміка майстроў з Мінска, Віцебска, Радашкавічаў.

У 1996 годзе быў утвораны ў г. Брэсце Украінскі навукова-педагагічны саюз Беларусі “Берагіня” [310]. Мэта – яднанне педагагічных, навуковых і культурных дзеячаў Беларусі ў справе развіцця сістэмы ўкраінскай адукацыі, вывучэння ўкраінскай мовы, культуры, народнай творчасці і нацыянальных традыцый украінцаў.

Украінская мова вывучалася ў двух сярэдніх школах горада Брэста, а таксама факультатыўна і ў гуртках у Кобрыне, Драгічынскім раёне. Гэта дало падставу рэктарату Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта звярнуцца з просьбай да Міністэрства адукацыі і навукі, каб тое дазволіла весці падрыхтоўку спецыялістаў з кваліфікацыяй філолаг, выкладчык рускай і ўкраінскай мовы і літаратуры [311].

У склад саюзу “Берагіня” ўваходзілі болей за 50 чалавек. Пры аб’яднанні дзейнічалі: украінскі студэнцкі эксперыментальны тэатр “Арт-Майдан” (15 чал.), турыстычны клуб “Энергія” (15 чал.).

[310] Пушкін І.А. Асноўныя тэндэнцыі ў накірунках дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі (1991–2004 гг.). С. 15–20 ; Яго ж. Грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцей Беларусі і фарміраванне грамадзянскай супольнасці (1991–2005 гг.). С. 16–23.

[311] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь. С. 166.

Да найбольш значных мерапрыемстваў “Берагіні” варта аднесці: штогадовыя Шаўчэнкаўскія чытанні; арганізацыя і правядзенне штогадовых турыстычных вандровак (Карпаты, Крым); штогадовыя тэатральныя вечары; падрыхтоўка і выданне вучэбных дапаможнікаў – Дорошко Л.С. Початковий курс української мови. Фонетика. – Брест, 2000; Дорошко Л.С. Практичний курс української мови (Лексика). – Брест, 2004.

У выкананне статутных мэтаў і задач ГА УНПСБ “Берагіня” супрацоўнічала з СШ № 14, 29 г. Брэста, гімназіяй № 6 г. Брэста, БрДУ імя А.Пушкіна, Інстытутам літаратуры імя Т.Шаўчэнкі НАН Украіны, Кіеўскім нацыянальным педагагічным універсітэтам імя М. Драгаманава, Валынскім дзяржаўным універсітэтам, таварыствам “Україна – Світ” і інш.

На тэрыторыі Брэсцкай вобласці дзейнічалі грамадскае аб’яднанне “Прасвіта Берасцейшчыны” імя Т. Шаўчэнкі і Украінскае грамадска-культурнае аб’яднанне Брэсцкай вобласці, выдаваліся газеты “Берасцейскі край” і “Голас Берасцейшчыны”.

Аналіз вытрымак з газет, зроблены спецыялістамі Камітэта ў даведцы “Аб тэматыцы і змесце газеты “Берасцейскі край”, аб некаторых аспектах дзейнасці аб’яднання “Прасвіта Берасцейшчыны” [312], дазволіў ім адзначыць, што з боку гэтых украінскіх аб’яднанняў гучалі зняважлівыя выказванні наконт тытульнага этнасу – беларусаў, іх мовы, заклікі да перагляду дзяржаўных межаў.

26.08.1999 г. у Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей у чарговы раз за фінансавай дапамогай на выданне звярнуўся галоўны рэдактар газеты “Берасцейскі край”. На звароце маецца надпіс-паведамленне: “На пасяджэнні Рэспуб. камісіі па перарэгістрацыі паліт. партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў 17.09.1999 г. ГА “ПБ” імя Шаўчэнкі адмоўлена ў перарэгістрацыі. І адпаведна падрыхтаваны ліст у Дзяржкамітэт РБ па друку”. З гэтага паведамлення бачны далейшы лёс грамадскага аб’яднання і газеты. Яны прыпынілі сваё існаванне.

Гэта адбылося таму, што дзейнасць “Прасвіты” набыла палітычны, прычым даволі радыкальны, неканструктыўны характар. Яна не садзейнічала аўтарытэту беларускай дзяржавы, перашкаджала беларуска-ўкраінскаму міждзяржаўнаму супрацоўніцтву.

З 2001 г. пачала выдавацца газета на ўкраінскай мове “Украінец у Беларусі” пад эгідаю ГА “Ватра” і Камітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцей.

У Беларусі дзейнічалі: рэспубліканскае Беларускае грамадскае аб’яднанне ўкраінцаў “Ватра”, якое каардынавала работу грамадскай арганізацыі ўкраінцаў “Радзіслаў” (г. Віцебск), культурна-асветніцкіх таварystваў “Верхавіна” (г. Гомель), “Краяны” (г. Маладзечна), “Обрій”

[312] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 169–172.

(г.п. Калодзішчы, Мінскі р-н), “Заповіт” (г. Мінск), “Славуціч” (г. Бабруйск,), грамадскага аб’яднання ўкраінцаў “Дняпро” (г. Магілёў). У Брэсце дзейнічаў навукова-педагагічны саюз “Берагіня”, грамадскае аб’яднанне Культурна-асветнае адзінства ўкраінцаў “Палессе”, у Гродна – аб’яднанне ўкраінцаў “Барвінак”, у Мінску – грамадскае аб’яднанне “Цэнтр украінскай культуры “Січ”.

Як адзначае даследчык А. Ціхаміраў, істотнай перашкодай у дзейнасці любых дыяспар з’яўлялася іх раз’яднанасць, адсутнасць агульнай стратэгіі ў частцы выкарыстання патэнцыялу існуючых арганізацый. У сувязі з гэтым з канца 1990-х гг. сталі праводзіцца мерапрыемствы па аб’яднанню суайчыннікаў. Вялася падрыхтоўчая работа па скліканню ўстаноўчай канферэнцыі і з’езда ўкраінцаў Беларусі [313].

Як вынік плённай працы ўкраінскай супольнасці ў Беларусі варта адзначыць наступнае. 23.01.2001 г. ГА ўкраінцаў “Ватра” правяло літаратурную вечарыну, якая была прысвечана украінскай паэтэсе Л. Украінке і 100-годдзю яе наведвання Беларусі. Фінансавыя сродкі на яе правядзенне выдаткавала Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [314]. Пры падтрымцы амбасады Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, членаў украінскіх грамадскіх арганізацый у 2002 г. у Мінску і Брэсце, у 2005 г. у Магілёве, былі адкрыты помнікі ўкраінскаму кабзару Тарасу Шаўчэнку. У 2007 г. амбасада Украіны і грамадская камісія па ўшанаванню памяці Піліпа Орліка, ураджэнца в. Касута (цяпер Вілейскі раён Мінскай вобласці) і аўтара першай Канстытуцыі Украіны, наладзілі святкаванне 335-годдзя з дня яго нараджэння [315].

Такім чынам, украінскія грамадскія аб’яднанні Беларусі праводзілі значную культурна-асветніцкую работу, пастаянна ўдзельнічалі ва Усебеларускіх фестывалях нацыянальных культур, захоўваючы нацыянальныя традыцыі і культуру ў асяродку сваёй нацыянальнай супольнасці і прапагандуючы яе сярод насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

***Яўрэі*** жывуць на тэрыторыі сённяшняй Беларусі ўжо восем стагоддзяў. Напрыканцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў адзначалася рэзкае павелічэнне эміграцыі, што прывяло да значнага памяншэння іх колькасці. Тым не менш яўрэйскія абшчыны па-ранейшаму застаюцца прыкметнай з’яваю ў любым горадзе.

Пачаткам адраджэння дзейнасці грамадскіх арганізацый яўрэяў можна лічыць працу групы міласэрнасці ў Доме інвалідаў у Дражні ў 1989 г., якая аказвала дапамогу адзінокім яўрэям і ляжачым інвалідам усіх нацыянальнасцей. У пачатку 1989 г. было створана Мінскае таварыства яўрэйскай культуры, у красавіку 1991 г. – Беларускае аб’яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын (БАЯАіА). Сярод яўрэйскіх грамадскіх арганізацый

---

[313] Ціхаміраў А. Беларуска-украінскія адносіны ў 1991–2006 гг. С. 9–10.
[314] Матэрыялы аб правядзенні вечарыны // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 58–60.
[315] Ціхаміраў А. Беларуска-украінскія адносіны ў 1991–2006 гг. С. 9.

апошняе было найбольш вядомым і пазней злучыла 135 арганізацый і суполак з 18 гарадоў Беларусі: Беларускае грамадскае аб’яднанне “Асацыяцыя яўрэяў – былых вязняў гета і нацысцкіх канцлагераў” (Мінск); грамадскае аб’яднанне “Рэспубліканскі фонд “Халакост” (Мінск); грамадскае аб’яднанне “Яўрэйскі дабрачынны фонд “Хэсэд-Рахамім” (Мінск); грамадскае аб’яднанне “Беларускі саюз яўрэяў інвалідаў і ветэранаў вайны, партызан і падпольшчыкаў” (Мінск); Рэспубліканскае яўрэйскае спартыўнае таварыства “Маккабі” (Мінск); грамадскае аб’яднанне “Клуб яўрэйскай культуры “Шалом” (Баранавічы); яўрэйскае культурна-асветнае таварыства імя Хайма Вейцмана (Пінск); Брэсцкі яўрэйскі дабрачынны цэнтр “Хэсэд-Давід” (Брэст); Брэсцкі абласны навукова-асветны цэнтр “Халакост” (Брэст); Пінскі яўрэйскі абшчынны дабрачынны фонд “Хэсэд Арон” (Пінск); Брэсцкае гарадское яўрэйскае грамадскае аб’яднанне “Брыс” (Брэст); яўрэйскае культурна-асветнае грамадскае аб’яднанне “Мост” (Столін); Віцебскае гарадское дабрачыннае грамадскае аб’яднанне “Хасдэй Давід” (Віцебск); Віцебскае грамадскае аб’яднанне “Яўрэйская абшчына “Аціква” (Віцебск); грамадскае аб’яднанне “Полацкі яўрэйскі культурны цэнтр” (Полацк); грамадскае аб’яднанне “Яўрэйскі культурны цэнтр “Мішпоха” (Сям’я) (Віцебск); грамадскае аб’яднанне “Полацкі яўрэйскі дабрачынны цэнтр “Хэсэд Эфраім” (Полацк); грамадскае аб’яднанне “Таварыства міласэрнасці “Шалом” (Орша); грамадскае аб’яднанне “Таварыства папячэння яўрэйскіх могілак Віцебскай вобласці “Беталом” (“Дом вечнасці”) (Віцебск); грамадскае аб’яднанне “Аршанская яўрэйская абшчына” (Орша); Гомельскае абласное яўрэйскае аб’яднанне “Ахдут” (Гомель); Рэчыцкае гарадское грамадскае аб’яднанне “Клуб яўрэйскай культуры “АМИ” (Рэчыца); Гомельскі гарадскі яўрэйскі дабрачынны цэнтр “Хэсэд Бацья” (Гомель); Светлагорскае гарадское яўрэйскае грамадскае аб’яднанне “Дабрачыннае таварыства “Рахамім” (Светлагорск); Мазырскае яўрэйскае дабрачыннае ГА “Хэсэд Эммануіл”; Гродзенскае грамадскае аб’яднанне яўрэйскай культуры імя Л.Найдуса (Гродна); грамадскае аб’яднанне “Гродзенскі яўрэйскі дом “Менора” (Гродна); Гродзенскі яўрэйскі дабрачынны фонд “Нахум” (Гродна); Гродзенскае яўрэйскае мемарыяльнае грамадскае аб’яднанне “Еруша” (Гродна); Рэгіянальнае мемарыяльна-культурнае грамадскае аб’яднанне г. Ліда; грамадскае аб’яднанне “Бабруйскае гарадское яўрэйскае дабрачыннае аб'яднанне “Рахамім” (Бабруйск); грамадскае аб’яднанне “Бабруйская гарадская яўрэйская абшчына” (Бабруйск); Горацкае яўрэйскае культурна-асветнае таварыства ім. Б.Іоффе (Горкі Магілёўскай вобл.); Магілёўская гарадская яўрэйская нядзельная школа (Магілёў); Магілёўская яўрэйская абшчына (Магілёў); грамадскае аб’яднанне “Магілёўскі гарадскі яўрэйскі дабрачынны цэнтр “Хэсэд Барух” (Магілёў); грамадскае аб’яднанне яўрэйскай культуры “Тхія” (Бабруйск); Мінскае грамадскае аб’яднанне яўрэйскай культуры імя Ізі

Харыка (Мінск); грамадскае аб’яднанне “Яўрэйскае культурнае таварыства “Эмуна” (Мінск); грамадскае аб’яднанне “Яўрэйская адукацыйная праграма” (Мінск); Мінскае дабрачыннае грамадскае аб’яднанне “Гілф” (Мінск); гарадское грамадскае аб’яднанне “Слуцкая яўрэйская абшчына “Памятай!” (Слуцк); грамадскае аб’яднанне “Маладзечанскае яўрэйскае таварыства” (Маладзечна); Барысаўскае яўрэйскае грамадскае аб’яднанне “Святло Міноры” (Барысаў). Пазней БАЯАіА атрымала назву – Саюз беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і абшчын (прэзідэнт – Леанід Левін. З 1992 г. працавала Яўрэйская асацыяцыя вучоных, інжынераў і прадпрымальнікаў Беларусі.

Беларускае аб’яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын было створана з мэтай адраджэння яўрэяў Рэспублікі Беларусь як нацыянальнай, так і культурнай супольнасці, іх кансалідацыі. За час свайго існавання аб’яднаннем адкрыты 14 нядзельных школ па вывучэнню мовы і культуры яўрэйскага народа, дзве агульнаадукацыйныя школы (у Мінску і Магілёве). Намаганнямі БАЯАіА выдаваліся 4 яўрэйскія газеты і спецыяльная газета для моладзі. Быў адкрыты яўрэйскі народны ўніверсітэт для людзей як старэйшага, так і малодшага ўзростаў.

У Беларусі ў сярэдзіне 1990-х гг. дзейнічалі 16 нядзельных школ, у якіх атрымлівалі нефармальную нацыянальную адукацыю 1500 дзяцей. У Мінску на базе школы № 132 працавала школа для яўрэйскай моладзі, у якой вучылася 255 дзяцей. Акрамя іўрыту, пад кіраўніцтвам настаўнікаў з Ізраіля вывучалі прадметы: традыцыі ізраільскага народа, гісторыю і геаграфію Ізраіля. У Гомелі з 1994/1995 навучальнага года працавала пачатковая школа-дзіцячы садок “Аціква”, дзе ў дзіцячым садзе выхоўваліся 40 дзяцей, а ў першым класе навучалася 46 дзяцей. У дзіцячым садку № 50 г. Віцебска была адкрыта група для яўрэйскіх дзяцей з вывучэннем іўрыта. Адначасова ішло азнаямленне дзяцей з беларускай і рускай культурай [316]. Працавалі дзіцячыя садкі таксама ў Мінску і Магілёве

27–28.06.1993 г. у Мінску адбылося пасяджэнне каардынацыйнага савета Беларускіх яўрэйскіх арганізацый і абшчын, дзе быў прыняты важны дакумент “Праблемы яўрэйскага руху ў Беларусі і шляхі іх рашэння”. У ім былі сфармуляваны мэты яўрэйскага руху: адраджэнне яўрэйства Беларусі як нацыянальнай, рэлігійнай і культурнай супольнасці, абарона гонару і нацыянальнай годнасці яўрэйскага народа, яго законных правоў і інтарэсаў у органах дзяржаўнай улады, а таксама адносіны да палітычных партый і органаў улады. Было падкрэслена: “Яўрэям уласная партыя не патрэбна. Але будучы грамадзянамі гэтай краіны, будучы выбаршчыкамі, мэтазгодна аказваць падтрымку тым рухам, якія ў сваіх праграмах і ў практычнай дзейнасці дастаткова лаяльна адносяцца да

[316] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь. С. 167.

нацыянальных пытанняў… Як бы там ні было, мы павінны ўмець працаваць з той уладаю, якая ёсць, ідучы з ёй на кантакты, кампрамісы, не даходзячы да канфрантацыі. Але там, дзе ўлады паводзяць сябе абуральна ў адносінах да яўрэйскіх праблем, патрэбна быць дастаткова цвёрдымі і ісці законным парламенцкім шляхам да канца”. На пасяджэнні прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці былі вызначаны: дабрачынная, асветніцкая і культурная [317].

З дапамогай Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, пры непасрэдным удзеле ўсіх арганіэацый, БАЯАіА праводзіліся агляды самадзейнасці, дзіцячыя фестывалі на лепшую песню, малюнак, алімпіяды школьнікаў на лепшае веданне мовы і гісторыі. У 1995 г. адбыўся фестываль кантарскай песні, былі арганізаваныя летнія лагеры ў Радашковічах і Ракаве. Разам са Скарынаўскім цэнтрам была праведзена вясной 1995 г. канферэнцыя “Уклад яўрэяў у беларускую культуру”.

Аб плённасці і выніковасці вялікай працы Беларуснага аб’яднання яўрэйскіх арганізацый і абшчын сведчыць той факт, што ў снежні 1996 г. у Мінску пачаў сваю работу адзіны ў СНД каледж яўрэйскай адукацыі.

Аб’яднанне БАЯАіА супрацоўнічала з нацыянальнымі арганізацыямі былога СССР, з амерыканскай дабрачыннай арганізацыяй “Джойнт”, з Сусветным яўрэйскім кангрэсам і Еўрапейскім аб’яднаннем яўрэйскіх абшчын. Усё гэта дало добры плён у развіцці яўрэйскага народа [318].

Джойнт з’яўляўся фундатарам Беларускага аб’яднання яўрэйскіх арганізацый і абшчын. Джойнт фінансаваў правядзенне з’ездаў розных яўрэйскіх арганізацый, дзейнасць яўрэйскага ўніверсітэта ў г. Мінску і Яўрэйскага ўніверсітэта культуры ў Віцебску, аказваў дапамогу яўрэйскім дзіцячым садкам, займаўся падрыхтоўкай выхавацеляў, фінансаваў рэгулярныя семінары для выкладчыкаў нядзельных школ, выданне часопісаў і кніг і г.д.

З 1994 г. (з дапамогаю Джойнта) выдаваўся штогоднік “Мішпоха” (яўрэйскае краязнаўства, праграма “Карані”), з 1995 г. – яўрэйскія календары “Сінагогі Беларусі”, выйшлі два зборнікі матэрыялаў і дакументаў “Трагедыя яўрэяў Беларусі ў гады нямецкай акупацыі (1941 – 1944)”, першы падручнік “Старонкі гісторыі яўрэяў Беларусі”, зборнік аповесцей і апавяданняў А. Капілава “Замкавая, 2/7”, чацвёрты том “Беларусікі” з матэрыяламі міжнароднай навуковай канферэнцыі “Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі” і інш. [319]

---

[317] Иоффе Э. Деятельность Белорусского объединения еврейских организаций и общин по укреплению национального согласия // Технология политики. С. 260 ; Бурая Н.В. Напрамкі дзейнасці яўрэйскіх арганізацый на Беларусі на сучасным этапе развіцця // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 192.

[318] Паўлоўская В.П. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна–асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе 7. С. 158.

[319] Иоффе Э. Джойнт в Беларуси. С. 66, 68.

Для прыкладу варта прывесці яшчэ некалькі фактаў. У 1992 г. у Віцебску была заснавана прэмія імя М.Шагала, з 1994 г. там жа праходзілі пленэры, з 1996 г. праводзіліся фестывалі яўрэйскага мастацтва. 23.02. 1995 г. пачаў працу яўрэйскі ўніверсітэт у Мінску (рэктар – кандыдат філасофскіх навук Зелік Пінхасік), які быў адкрыты па ініцыятыве навуковай камісіі Беларускага аб’яднання яўрэйскіх арганізацый і абшчын. Вельмі значная работа праводзілася яўрэйскімі арганізацыямі па ўшанаванню памяці аб загінуўшых яўрэях (ахвярах Халакосту). Пад час святкавання 50-годдзя Мінскага гета была арганізавана выстава мастакоў на яўрэйскую тэму, рыхтаваўся помнік загінуўшым у Мінскім гета. У сакавіку 1998 г. Беларускае аб’яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын наладзіла святкаванне 100-годдзя яўрэйскага паэта Беларусі Ізі Харыка [320].

У Брэсце добра працавала яўрэйская культурна-асветніцкая арганізацыя “Тарбут”. Дзякуючы яе намаганням у горадзе быў узведзены помнік ахвярам Брэсцкага гета. У абласным цэнтры існавала яўрэйская нядзельная школа, якую наведвалі дзеці ад 5 да 14 год. У 2008 г. пры Магілёўскай яўрэйскай абшчыне працавала “Школа грамадскіх экскурсаводаў”, дзе слухачы знаёміліся з гарадскімі мясцінамі, якія мелі адносіны да гісторыі і культуры яўрэйскага народа. У Беларусі рэалізоўваўся двухгадовы праект “Яўрэйская адукацыя ў малых абшчынах Беларусі”. У межах яго выканання толькі ў 2010 г. было праведзена каля 100 штотыднёвых заняткаў у яўрэйскіх абшчынах Брэста, Бабруйска, Гродна, Магілёва, Оршы, Барысава, Мазыра і Ліды. 11.11.2010 г. у Магілёве яўрэйскай абшчынай пры падтрымцы “Джойнта” была праведзена першая Хеўрута (дзень яўрэйскіх ведаў). 28.12.2010 г. на базе Мінскага яўрэйскага абшчыннага дома было праведзена мерапрыемства “Выхаванне на аснове здравага сэнсу”, якая была скіравана на дапамогу бацькам, якія выхоўваюць адказных і самастойных дзяцей. Напрыканцы 2010 г., падчас зімовых вакацый, яўрэйскай абшчынай Гродна быў арганізаваны лагер адпачынку для яўрэйскіх дзяцей.

У Беларусі актыўна працавалі дабрачынныя цэнтры “Хэсэд-Рахамім” (Мінск), “Хэсэд-Раха” (Віцебск), “Хэсэд-Бація” (Гомель), “Хэсэд-Барух” (Магілёў), а таксама асобныя группы міласэрнасці (Барысаў, Ліда, Мазыр, Орша, Рэчыца, Брэст і інш.).

Вялікае значэнне для захавання і развіцця культуры яўрэйскага насельніцтва мела рэлігія. Улады Беларусі ставіліся з разуменнем да патрэб веруючых іудзеяў і, па магчымасці, вярталі іх рэлігійныя каштоўнасці. Так, былі вернуты сінагогі ў Гродна і Слоніме, дзве сінагогі працавалі ў Пінску.

Варта адзначыць фактары, якія перашкаджалі дзейнасці яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і негатыўна ўплывалі на працэс фарміравання

---

[320] Матэрыялы святкавання // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 264. Арк. 10–12.

грамадзянскай і нацыянальнай згоды: не ва ўсіх гарадах Беларусі яўрэям вярнулі рэлігійныя будынкі, не было ніводнай яўрэйскай агульнаадукацыйнай школы, не знайшлі асоб, якія апаганьвалі яўрэйскія пахаванні на могілках [321].

Такім чынам, у пачатку XXI ст. у Рэспубліцы Беларусь дзейнічала 54 яўрэйскія творчыя калектывы, якія праводзілі каля 200 мерапрыемстваў у год. Выдаваліся часопісы і газеты: “Авіў”, “Мішпоха”, “Адраджэнне” (Віцебск), “Адзінства” (Гомель), “Алія”, “Яўрэйскія навіны”. Былі створаны і дзейнічалі маладзёжныя арганізацыі: Саюз Яўрэйскай моладзі і студэнтаў, “Эль А.Тора”, “Бейт Гілель”, спартыўнае аб’яднанне “Маккабі” і іншыя [322].

Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці грамадскіх яб’яднанняў яўрэйскай супольнасці былі дабрачынная, асветніцкая і культурная. Характэрным для любога яўрэйскага культурна-асветніцкага аб’яднання Беларусі было арганізоўваць працу сярод сваіх суайчыннікаў па інтарэсах і ўзроставых (палавых) прыкметах.

Асобныя лідары і актывісты яўрэйскага руху, шляхам стварэння вялікай колькасці рознага роду аб’яднанняў і клубаў, імкнуліся забяспечыць яўрэйскую прысутнасць у рэгіёнах і краіне.

***Літоўцаў і латышоў*** у Беларусі аб’ядноўвалі: грамадская арганізацыя “Саюз латышоў Віцебскай вобласці “Даўгава” (Віцебск), Міжнародная грамадская арганізацыя Клуб “Гервячай” (Гродзенская вобл., Астравецкі раён, пас. Гервяты), Рэспубліканская грамадская арганізацыя “Беларуская абшчына літоўцаў” (Мінск), Гродзенскае грамадскае аб’яднанне літоўцаў “Тэвінэ” (“Радзіма”) (Гродна), Лідскае грамадскае аб’яднанне літоўцаў “Рута” (Гродзенская вобл, г. Ліда), грамадскае аб’яднанне “Гервяцкая суполка літоўцаў” (Гродзенская вобл., Астравецкі р-н, п. Гервяты), Радуньскае грамадскае аб’яднанне літоўцаў “Гінтарас” (Воранаўскі р-н, г.п. Радунь), Пеляскае грамадскае аб’яднанне літоўцаў “Гімціне” (д. Пеляса Воранаўскага р-на), Браслаўскае раённае грамадскае аб’яднанне “Рытас” (Браслаўскі р-н, г.п. Відзы) [323].

Значная колькасць літоўцаў пражывае на беларуска-літоўскім памежжы, найбольш кампактна – у Астравецкім і Воранаўскім раёнах Гродзенскай вобласці, крыху менш – у Пастаўскім і Браслаўскім раёнах Віцебскай вобласці. У гэтых раёнах сканцэнтравана амаль што трэцяя частка ўсіх літоўцаў Беларусі. Астатнія гэта літоўцы-мігранты і іх нашчадкі. Яны дысперсна пражывалі ў розных месцах Беларусі і складалі пераважную большасць сярод беларускіх літоўцаў. Даследчык Ю. Унуковіч адзначае, што практычна да сярэдзіны XX ст. літоўцы Беларусі

[321] Иоффе Э. Деятельность Белорусского объединения еврейских организаций и общин по укреплению национального согласия // Технология политики. С. 263–264.
[322] Бурая Н.В. Напрамкі дзейнасці яўрэйскіх арганізацый на Беларусі на сучасным этапе развіцця // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 192–193.
[323] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік.

захоўвалі свае асноўныя этнакультурныя асаблівасці, у першую чаргу рэлігійную і моўную адметнасці. У другой палове XX ст. назіралася агульнае скарачэнне колькасці літоўцаў і паслабленне іх этнічнай устойлівасці, што прывяло да іх частковай асіміляцыі. Тым не менш літоўскую мову сёння можна пачуць нават на Усходзе Беларусі ў вёсцы Малькаўка Магілёўскай вобласці, дзе з 1929 г. да 1939 г. існаваў літоўскі нацыянальны сельскі савет [324].

З мая 1994 г. у Рэспубліцы Беларусь дзейнічала аб'яднанне беларускіх літоўцаў. Асноўнымі мэтамі таварыства з'яўляліся супрацоўніцтва і шанаванне ўзаемаразумення паміж народамі Беларусі і Літвы, захаванне гістарычнай памяці, культуры, нацыянальнай самасвядомасці, мовы і звычаяў сярод літоўскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Аб'яднанне актыўна займалася адкрыццём нядзельных школ, стварэннем інфармацыйнага цэнтра, пабудовай школы і культурнага цэнтра літоўцаў, выездам літоўскіх дзетак у Літоўскую рэспубліку на экскурсіі, правядзеннем семінараў па адукацыйных праблемах, стварэннем гурткоў мастацкай самадзейнасці, якія ўдзельнічалі ў Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур [325].

Рэспубліканская абшчына беларускіх літоўцаў актыўна супрацоўнічала з арганізацыяй "Санрыша", якая аб'ядноўвала ўсіх літоўцаў былога СССР, а таксама з Дэпартаментам нацыянальных супольнасцей і літоўцаў замежжа ўрада Літвы [326].

29.11.1999 г. у Беларусі было зарэгістравана Радунскае грамадскае аб'яднанне літоўцаў "Гінтарас" (Гродзенская вобл., Воранаўскі раён, г.п. Радунь). Яно было створана дзеля аб'яднання намаганняў сваіх сяброў па стварэнню ўмоў для нацыянальнага самавыражэння, задавальнення памкненняў да пазнання і захавання літоўскай гісторыі, мовы, звычаяў і традыцый для грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія мелі літоўскае нацыянальнае паходжанне. Пры ГА "Гінтарас" дзейнічала Літоўскае аб'яднанне Пеляска–Радуньская капэла.

Намаганнямі членаў і сяброў аб'яднання праводзіліся святы літоўскай культуры, Каляды, адзначаліся пачатак і заканчэнне навучальнага года ў літоўскай нядзельнай школе. Штогод яны традыцыйна бралі ўдзел у правядзенні дзяржаўных і рэлігійных святаў у месцах пражывання літоўцаў, праводзілі экскурсіі па Літве і гістарычных мясцінах Беларусі.

---

[324] Унуковіч Ю. Літоўцы ва Усходняй Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. С. 37–43.

[325] Інфармацыйны ліст РГА "Беларуская абшчына літоўцаў" аб праробленай працы за 1994 – 2000 гг. // LVNA. Фонд 78. Воп. 1. Спр. 163. Арк.13–14.

[326] Дэпартамент нацыянальных меншасцей і літоўцаў замежжа пры Урадзе Літоўскай Рэспублікі 1989–2009 гг. "Інфармацыя аб дзейнасці літоўцаў і іх грамадскіх арганізацый у Беларусі, Украіне, Расіі, дакументы, справаздачы" // Там жа. Арк.1–186 ; Паўлоўская В.П. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна–асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе. С. 158.

У сваёй дзейнасці аб’яднанне супрацоўнічала з органамі мясцовай улады (пасялковым саветам, райвыканкамам) і Пеляскім культурна-асветніцкім літоўскім цэнтрам.

У 1990-х гг. у пяці школах Гродзенскай вобласці (адна сярэдняя, тры базавыя і адна пачатковая) вывучалася літоўская мова і літаратура.

У Беларусі дзейнічалі: дзяржаўная школа з літоўскай мовай навучання ў Рымдзюнах Астравецкага раёна і недзяржаўная ў Пелясах Воранаўскага раёна. Апошняя была адкрыта пры фінансавай падтрымцы Літоўскага культурнага цэнтра як базавая школа з выкладаннем усіх прадметаў на літоўскай мове. Заняткі праводзілі, у асноўным, прысланыя з Вільні настаўнікі, якіх падабраў Фонд культуры Літоўскай Рэспублікі. Фонд, разам з дабрачыннымі арганізацыямі Літвы, паклапаціўся і аб аплаце працы выкладчыкаў [327]. Пелясаўская школа з 1999/2000 н.г. набыла статус дзяржаўнай. Школы супрацоўнічалі з Вільнюскім педагагічным універсітэтам і Каўнаскім унівесітэтам імя Вітаўта [328]. Школа ў вёсцы Рымдзюны напрыканцы 2011 г. адзначыла сваё пятнаццаціґоддзе. На ўрачыстасцях прысутнічалі: амбасадар Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі, кіраўнікі мясцовых улад, старшыня Міжнароднага клуба “Гервячай”, кіраўнік грамадскай арганізацыі “Гервяцкая абшчына літоўцаў”, выступал мясцовы фальклёрны ансамбль “Жыльвіціс” [329].

У 1999/2000 нав. годзе існавала 7 нядзельных школ: Гродна (з 1994 г.), Ліда (з 1999 г.), вёскі Пелеса (з 1999 г.), Радунь (з 1998 г.), Усоні (з 1999 г.), Вайнунь (з 1999 г.), Летуві. У іх вывучалася літоўская мова, гісторыя, геаграфія, этналогія і літоўскія народныя традыцыі. Для вучняў літоўскіх школ арганізоўваліся паездкі ў Літву на адпачынак, экскурсіі. Літоўская рэспубліка забяспечвала падручнікамі і метадычнымі дапаможнікамі школы, павышэнння кваліфікацыі настаўнікаў [330].

У вёсцы Рымдзюны існавалі літоўскія яслі [331] і вялося будаўніцтва Літоўскага нацыянальнага культурнага цэнтра на сродкі Літвы. Заказчыкам будаўніцтва выступала Рэспубліканскае ГА “Беларуская абшчына літоўцаў”.

Будаўніцтва цэнтра было задумана яшчэ ў 1990 г., калі існаваў СССР. З 18.09.1990 г. распачалося будаўніцтва. Да пачатка 1994 г. узнік канфлікт паміж мясцовымі ўладамі і Літоўскай рэспублікай наконт завяршэння будаўніцтва (крыніц фінансавання) і таго, хто будзе гаспадаром цэнтра. Гродзенскі аблвыканкам нават прыняў рашэнне аб спыненні будаўнічых прац. Пытанне “Аб будаўніцтве Літоўскага культурна-асветніцкага цэнтра ў в. Рымдзюны Астравецкага раёна

[327] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь. С. 166–167.
[328] Літоўскія адукацыйныя ўстановы Беларусі // LVNA. Фонд 78. Воп. 1. Спр. 163. Арк.6–7, 22.
[329] Новицкая Л. Школа с литовским акцентом // Рэспубліка. 2011. 14 снежня. С. 23.
[330] Літоўскія нядзельныя школы Беларусі ў 1999 г. // LVNA. Фонд 78. Воп. 1. Спр. 163. Арк. 6–12.
[331] Літоўскія адукацыйныя ўстановы Беларусі // Там жа. Арк. 6–7, 22.

Гродзенскай вобласці” 17.03.1994 года было заслухана на пасяджэнні Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах. Камісія, заслухаўшы экспертаў і абмеркаваўшы дакументы, вырашыла: неабходна правесці перамовы з літоўскім бокам, завяршыць будаўніцтва і пасля гэтага вызначыць уладальнікаў цэнтра [332]. У 1996 годзе пабудавана школа (адкрыццё адбылося 10 кастрычніка), 7 дамоў для настаўнікаў; у 1997 г. – быў пабудаваны інтэрнат на 70 месц, сталовая, дзіцячы сад; у 1998 г. – кацельная, зроблена ацяпленне. У 2000 годзе было завершана будаўніцтва дома культуры. 18.03.2001 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё літоўскага культурнага цэнтра ў Рымдзюнах. На ім прысутнічалі адказныя дзяржаўныя асобы з Беларусі і Літвы [333].

Прадстаўнікі літоўскай абшчыны Беларусі ўдзельнічалі ў спартыўных гульнях літоўцаў свету, дзе занялі трэцяе месца ў камандным першанстве, выйгралі прыз лепшага гульца ў шахматы сярод іншаземцаў. Таварыства ўдзельнічала ў Днях памяці загінуўшых у вайне, святкаваннях гадавіны Грунвальдскай бітвы, якія праходзілі ў Гродне і Мінску.

Нягледзячы на тое, што колькасць латышоў у Беларусі была невялікая (на 2009 г. – 1549 чал.), яны пакінулі пасля сябе глыбокі след працавітасцю, кемлівасцю, згуртаванасцю. Што датычыцца этнічных традыцый, то можна адзначыць, што захаваліся рысы, якія характэрны толькі для латышоў. Даследчык У.Тугай адзначае: “На Беларусі засталося няшмат дзяцей і ўнукаў латышскіх перасяленцаў. Аднак з поўнай упэўненасцю можна казаць, што яны ў цэлым захавалі нацыянальныя рысы, уласцівыя латышскай нацыі. Сёння трэба зрабіць усё, каб замацаваць у кожнага тутэйшага латыша ўсведамленне мінулага, гістарычную памяць, сувязь з папярэднімі пакаленнямі, трывалую сувязь з зямлёй, на якой яны выраслі, з пакаленнямі, што жылі да іх і рупіліся пра дабрабыт радзімы. Вырашэнне гэтай праблемы – састаўная частка агульнага працэсу дэмакратызацыі нашага грамадства, і яно заклікана да канца вылечыць старыя раны і не даць нацыянальным супольнасцям страціць іх каштоўнасці. Сярод складаных праблем, якія закранаюць свядомасць і пачуцці мільёнаў жыхароў Беларусі, на першы план выступаюць пытанні дзяржаўнага суверэнітэту, захавання і развіцця нацыянальнай культуры, роднай мовы, культуры і мовы іншых нацыянальных згуртаванняў, якія жывуць у рэспубліцы, адраджэння гістарычнай і культурнай спадчыны” [334].

Захаваннем традыцый латышскага насельніцтва Віцебшчыны займаўся “Саюз латышоў Віцебскай вобласці “Даугава”. Пры яго

---

[332] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4093. Арк. 34–38.

[333] Праграма адкрыцця літоўскага культурнага цэнтра ў Рымдзюнах // LVNA. Фонд 78. Воп. 1. Спр. 163. Арк.17–18.

[334] Тугай У.В. Латышы на Беларусі. Мінск, 1999. С. 133.

актыўным удзеле праводзіліся традыцыйныя Дні Латвіі ў Віцебску. Пры консульстве Латвіі ў Віцебску працавала нядзельная школа, дзе дзеці вывучалі латышскую мову, традыцыі і культуру; была арганізавана выстава маладых латышскіх мастакоў. А ў г. Рыга выстаўляліся работы М. Шагала з фондаў Віцебскага музея. Прадстаўнікі ГА "Саюз латышоў Віцебскай вобласці "Даўгава", калектывы мастацкай самадзейнасці, майстры народнай творчасці з Даугаўпілса і Рэзекне прымалі актыўны ўдзел у рэгіянальных святах "Браслаўскія бліскавіцы" і "Дзвіна-Двина-Даугава". "Браслаўскія бліскавіцы" праводзіліся з мэтай адраджэння спеўных, танцавальных, абрадавых, гульнявых традыцый і развіцця рамёстваў народаў-суседзяў: беларусаў, латышоў і літоўцаў. Свята дзіцячай творчасці "Дзвіна-Двина-Даугава" уключала ў сябе тэатралізаванае шэсце, свята плытагонства, вадзяную феерыю, выставы і канцэрты самадзейных калектываў з Беларусі, Расіі і Латвіі [335].

У выніку неабходна асабліва адзначыць пазіцыі Літвы і Латвіі ў справе падтрымкі сваіх дыяспар. Гэтыя дзяржавы мэтанакіравана спрыялі школьнай адукацыі на роднай мове, накіроўвалі выкладчыкаў з Латвіі і Літвы, падтрымлівалі любую сферу культуры, дзе пераважала балтамоўнае насельніцтва.

За час існавання літоўскіх і латышскіх таварыстваў былі адкрыты нядзельныя школы, праводзілася культурна-асветніцкая праца. У сваёй дзейнасці аб'яднанні супрацоўнічалі з органамі мясцовай улады.

***Татары і башкіры.*** Восенню 1989 г. узніклі першыя татарскія культурна-асветніцкія таварыствы ў Мінску і Гродна. Згодна з пэўнай інфармацыяй грамадскае аб'яднанне татар г. Гродна дзейнічала пад рознымі назвамі яшчэ з 1988 г. (тады – пры гарадскім фондзе культуры). Сябры (члены) аб'яднання ўваходзілі ў склад Беларускага грамадскага аб'яднання татар "Зікр-Уль-Кітаб". Асноўны накірунак дзейнасці – культурна-асветніцкі. Удзельнічалі ў фестывалях нацыянальных культур, стварылі ансамбль, функцыяніравала школа выхаднога дня . У пачатку 2002 г. у ім налічвалася каля 50 чалавек. На думку спецыялістаў аддзела нацыянальнасцей Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей : "асаблівай актыўнасці аб'яднанне не праяўляла, т.я. члены ў асноўным сталага ўзросту. У цэлым аб'яднанне дзейнічала як зямляцкае" [336] (клуб па інтарэсах).

Вядомы даследчык гісторыі І. Канапацкі наступным чынам апісваў пачатак стварэння грамадскіх арганізацый татарскага народа ў Беларусі: "Рэвалюцыйныя хвалі, змрочныя, цяжкія гады сталінскіх рэпрэсій парушылі паступовы ход развіцця татарскай культуры. Многія

---

[335] Ліст Віцебскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці ад 26.01.2001 г. "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у вобласці" // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 61–64.

[336] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 140.

прадстаўнікі нацыі, баючыся, што іх можа напаткаць лёс крымскіх татар, з'ехалі ў Польшчу, ЗША, Аўстралію, Турцыю, краіны Заходняй Еўропы. Сярод іх было шмат інтэлігенцыі, духоўных асоб. Адвечныя традыцыі літоўскіх татар сталі забывацца, што яшчэ больш узмацніла заняпад нацыянальнай культуры, садзейнічала раз'яднанню народа. Неабходна было захаваць спадчыну літоўскіх татар для нашчадкаў. Аб гэтым вялася гаворка на сходах прадстаўнікоў беларускіх татар у Мінску і Гродна восенню 1989 года. Тады ж узніклі татарскія абласныя грамадска-культурныя аб'яднанні. 23 чэрвеня 1991 года на свяце Курбан-Байрам у Іуі, дзе прысутнічалі шматлікія пасланцы з усіх раёнаў і абласцей Беларусі, было вырашана стварыць рэспубліканскае згуртаванне татар-мусульман на Беларусі "Аль-Кітаб". Аднадушна абралі кіраўніцтва: прэзідэнтам стаў Абу-Бякір Шабановіч, дырэктар Мінскай гімназіі" [337].

У 1993 г. татарскія таварыствы былі рэарганізаваны ў Беларускае аб'яднанне татар-мусульман "Аль-Кітаб". У студзені 2001 г. яно было рэарганізавана ў Беларускае грамадскае аб'яднанне татараў "Зікр уль-Кітаб". Яно мела статус рэспубліканскай арганізацыі і вызначыла сваёй галоўнай мэтай садзейнічанне адраджэнню нацыянальных культурных каштоўнасцей і традыцый татараў Беларусі [338].

Татарскія аб'яднанні, як і іншыя, сутыкаліся з наступнымі праблемамі ў сваёй дзейнасці: недастатковае фінансаванне, унутраныя расколы, непаслядоўная палітыка дзяржавы, зніжэнне этнічнай самасвядомасці татар у гады савецкай улады, рост працэсаў іх асіміляцыі і г.д. На думку саміх татар – галоўным сродкам іх самазахавання з'яўлялася рэлігія – іслам.

Татарская культурна-асветніцкая суполка "Аль–Кітаб" звярталася да дзяржаўных устаноў з шэрагам цікавых прапаноў. У тым ліку і аб адкрыцці аддзялення татаразнаўства пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, каб весці падрыхтоўку спецыялістаў.

Пытанне падрыхтоўкі кадраў паступова вырашалася шляхам мэтавага накіравання моладзі татарскага паходжання ў ВНУ як Беларусі, так і Татарстана. "Аль-Кітаб" праводзіла сур'ёзную работу па арганізацыі вывучэння крымска-татарскай і арабскай моў [339].

З мэтай больш дасканалага вывучэння стану культуры татар-мусульман у 1995 г. Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур арганізаваў археалагічную экспедыцыю па месцах кампактнага пражывання татар у Беларусі.

Адна з задач экспедыцыі – звярнуць увагу органаў мясцовых уладаў на праблему развіцця татарскай культуры, захавання татарскіх могілак-

[337] Думін С.У., Канапацкі І.Б. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. С. 201.
[338] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 42.
[339] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь. С. 166.

мізараў. Паралельна праходзіў пошук старапісаных кніг – кітабаў [340].

Пры падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцей грамадскае аб’яднанне татар “Аль-Кітаб” і мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне ў Рэспубліцы Беларусь правялі шэраг сумесных мерапрыемстваў. У 1998 г.: IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Іслам у Рэспубліцы Беларусь. Мінулае і сучаснасць” (г. Мінск, 09–10.08.98 г.); былі надрукаваны “Матэрыялы навукова–практычнай канферэнцыі, прысвечанай С.Х. Александровічу”; пабачыў свет IV выпуск квартальніка беларускага згуртавання татараў-мусульман “Аль-Кітаб” – “Байрам”. У 1999 г.: V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Іслам і актуальныя праблемы сучаснасці” (г. Мінск, жнівень); па заказе Дзяржкамітэта ў БДУК распрацоўваўся вучэбны дапаможнік “Татаразнаўства” [341].

Акрамя ўзгаданых, Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі праводзіліся: першая – “Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы” (сакавік 1993 г.), другая – “Ісламская культура татараў Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай ды іншымі культурамі” (май 1995 г.), трэцяя – “Праблемы вывучэння і захавання культурнай спадчыны татарскага народа ў Беларусі” (сакавік 19997 г.), восьмая – “Мячэці і мізары татар Беларусі, Літвы і Польшчы: Да 100-годдзя другой Мінскай мячэці” (2003 г., Наваградак). На канфэрэнцыі “Цюркскія народы ў гісторыі Беларусі” (верасень 2003 г.), акрамя вучоных, прысутнічалі прадстаўнікі дыпламатычных службаў 10 краін [342].

У Беларусі наладжана пэўная культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх татар. Татарскай грамадой г. Гродна у чытальнай зале бібліятэкі № 2 быў створаны і дзейнічаў татарскі літаратурна-інфармацыйны куток, дзе сабраны розныя творы і выданні па гісторыі татар на рускай і татарскай мовах, праводзіліся розныя вечарыны і мерапрыемствы [343]. У 2001 г. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАНБ прайшла выстава рукапісных кніг беларуска-літоўскіх татар XVII–XX стст. На IV Усебеларускім фестывалі нацыянальных культур (2002 г.) выступалі танцавальны гурт “Турначык” (“Жураўлік”) Беларускай дзяржаўнай палітэхнічнай акадэміі (кір. А. Капяровіч), харэграфічнае трыо з Узды “Крылцы” (кір. Г. Дубар), народныя майстры па вырабах з дрэва і скуры Г. і В. Александровічы. Гурт і майстры атрымалі дыпломы, а трыо стала лаўрэатам фестывалю [344].

---

[340] Паўлоўская В.П. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна–асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе. С. 158.

[341] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 104.

[342] Канапацкі І. Татары-мусульмане ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. С. 46; Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 50.

[343] Жыццё татарскае. 2003. № 8. жнівень.

[344] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 56.

Ад першых дзён татарскага адраджэння яго дамінантай стаў рэлігійны фактар. У 1990 г. была адноўлена мусульманская абшчына г. Мінска, а ў 1994 г. створана Мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне ў Рэспубліцы Беларусь [345]. За 10 гадоў пры самым актыўным удзеле аб’яднання былі створаны 13 новых мусульманскіх суполак, пабудавана 7 мячэцяў, праведзена 9 дзіцячых ісламскіх лагераў, 9 ісламскіх канферэнцый, штогод працуе каля 10 нядзельных школ у абшчынах [346]. Да лістапада 2005 г. абавязкі муфція выконваў І. Александровіч. 02.02.2004 г. у Мінскім Палацы культуры ветэранаў адбылося ўрачыстае пасяджэнне, якое было прысвечана 10-годдзю стварэння Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Рэспубліцы Беларусь. На пасяджэнні прысутнічалі прадстаўнікі ўрада, пасольстваў мусульманскіх краін, гарвыканкама, рэлігійных аб’яднанняў мусульман, многіх грамадскіх аб’яднанняў, журналісты [347].

З сярэдзіны 1990-х гг.назіраўся даволі шырокі размах будавання мусульманскіх храмаў. На той час, калі распачалося татарскае адражэнне ў Беларусі з 19-ці даваенных мячэцяў заставалася толькі адна – у Іўі (у 2002 г. яна адзначыла сваё 120-годдзе). У 1994 г. адноўлена мячэць у Слоніме, у 1996 г. з’явілася мячэць у Смілавічах (Чэрвеньскі раён), у 1997 г. – у Навагрудку, у 1999 г. – у Відзах (Браслаўскі раён), у 2000 г. – у Клецку, у 2002 г. – у Маладзечна і Лоўчыцкая мячэць (вёска Католышы Навагрудскага раёна), у 2003 г. прыступілі да ўзвядзення мячэці па вул. Грыбаедава ў Мінску [348].

На канферэнцыі “Іслам і глабальныя праблемы сучаснасці” (1999 г.), сярод іншага, узнімалася пытанне аб выдаткаванні памяшкання для выканання рэлігійных патрэб і вяртанні канфіскаваных у 1949 г. культавых прадметаў мусульманскай абшчыне г. Мінска [349].

Гэта было выклікана тым, што пасля шматлікіх зваротаў татар-мусульман, у 1993 г. Мінскія гарадскія ўлады для аднаўлення мячэці выдаткавалі участак зямлі на скрыжаванні вуліц Грыбаедава і Тарханава. У яго ўвайшла і тэрыторыя разбуранага ў савецкі час мізара. У 1995 г. быў адобраны рабочы праект будаўніцтва нулявога цыклу мячэці і план рэканструкцыі тэрыторыі мускльманскіх могілак (мізара). 22.12.1998 г. быў атрыманы дазвол Мінскага гарвыканкама на пачатак будаўніцтва мячэці. Але не хапала сродкаў і будаўніцтва не пачалася. Неабходна было недзе праводзіць набажэнствы. Удзельнікі канферэнцыі палічылі справядлівым, што калі ў мінулым улады зачынілі мячэць і канфіскавалі

[345] Канапацкий И. Печальный юбилей. К 100-летию второй Минской мачети. С. 6.
[346] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (ХХ – пачатак ХХІ ст.). С. 44.
[347] Канапацкі І. Татары-мусульмане ў Беларусі. С. 40.
[348] Там жа. С. 46 ; Гембіцкая М. Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі. С. 39.
[349] Канапацкий И. Печальный юбилей. С. 5.

будынак і рэчы, дык цяпер павінны або вярнуць або прадаставіць іншае памяшканне.

У адказ атрымалася наступнае. 07.07.2002 г. споўнілася 100 год ад часу ўрачыстага адкрыцця другой Мінскай мячэці (закрыта ўладамі і канфіскавана ў 1949 г.). Да юбілею мусульманская абшчына г. Мінска атрымала ад гарадскіх уладаў "спецыяльны падарунак". З студзеня 2002 г. рашэннем фінансавых органаў г. Мінска мусульманская абшчына павінна плаціць падатак у памеры больш за 1,5 млн беларускіх рублёў штомесяц за кавалак разбуранага татарскага мізара, які быў выдзелены ўладамі пад рэканструкцыю гістарычнай мячэці. У ліпені за спазненне на адзін дзень з аплатай падатку (не паспелі сабраць грошы ў абшчыне) ім налічылі штраф у памеры 260 тыс. руб.[350]

У сучасным грамадстве да ісламу праяўляецца павышаная цікаўнасць і падазронасць. Гэта выклікана жахлівымі праявамі ў свеце экстрэмізму з боку асобных прадстаўнікоў "мусульман". Пазіцыю Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь выказаў муфцій І. Александровіч: "Мы лічым, што сапраўдныя мусульмане не могуць забіваць людзей, красці, рабаваць, браць чужую маёмасць у іншых людзей… Падрывы дамоў, гібель нявінных людзей – гэта ўчынкі несапраўдных мусульман. Гэта дзейнічаюць ворагі Ісламу пад шыльдай мусульман. Забойства, тэрарызм, шалёны экстрэмізм не маюць нічога агульнага з Ісламам…" [351].

У сакавіку 2001 г. у Мінску мусульмане адсвяткавалі першае мусульманскае, чыста беларускае вяселле. Жаніха звалі Саід (Сяргей), а нявесту – Марына. На старонках газеты паведамлялася: "Гэтая падзея лічыцца вельмі важным для ісламскага закліку ў Беларусі… таму што нараджэнне першай мусульманскай сям'і сярод славянскага насельніцтва з'яўляецца важным крокам для ўмацавання і абгрунтавання Ісламу ў Беларусі" [352]. Папаўненне мусульман Беларусі за кошт славян не адзінкавае. У краіне з 1000 гадовай традыцыяй хрысціянства гэта можа прывесці да міжканфесійных канфліктаў.

Вясной 2004 г. пачаў сваю дзейнасць у Мінску вячэрні ісламскі ўніверсітэт [353].

Мусульмане Беларусі прымалі нязменны ўдзел у з'ездах Сусветнага кангрэса татараў (першы праходзіў у 1992 г., другі – ў 1997 г., трэці – ў 2002 г. і г.д.) і пасяджэннях яго выканкама. Наладжаны шчыльныя сувязі беларускіх татараў з Турцыяй. 01.07.2004 г. вярхоўныя муфціі Расіі і Беларусі Р.Гайнутдзін і І. Александровіч падпісалі сумеснае пагадненне аб супрацоўніцтве, якое прадугледжвае абмен рэлігійнай літаратурай,

[350] Канапацкий И. Печальный юбилей. С. 5–6.
[351] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 46.
[352] Жизнь. 2001. июнь.
[353] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.) С. 52.

тэкстамі пропаведзяў, вучэбнымі дапаможнікамі для духоўных навучальных устаноў, арганізацыю і правядзенне сумесных навукова-багаслоўскіх форумаў і г.д. [354]

Асаблівую ролю ў грамадскім жыцці адыгрываюць СМІ. У 1991 г. актывісты "Аль-Кітаб" (І. Александровіч, Я. Гучок, І. Канапацкі, Т. Якубоўскі, Д. Чамбаевіч і інш.) на чале з Т. Якубоўскім упершыню ў гісторыі татар Беларусі пачалі выдаваць на беларускай мове часопіс – штоквартальнік "Байрам. Татары на зямлі Беларусі". За час існавання часопіса было выдадзена на беларускай мове 43 нумары, аб'ём кожнага – 100–120 старонак. Мэты часопіса – абуджэнне самасвядомасці татарскага народа, асвятленне культурнай і гістарычнай спадчыны, абмен поглядамі, думкамі, прапановамі наконт шляхоў адраджэння татарскага этнасу і ісламa ў наш час. Па выніках Рэспубліканскага творчага конкурсу, які быў прысвечаны нацыянальнай палітыцы і арганізаваны Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігіі і нацыянальнасцей, а таксама Дзяржаўным камітэтам па друку ў 1999 г., штоквартальнік " Байрам " атрымаў другую прэмію. Тым не менш у 2002 г. было прыпынена выданне часопіса [355].

З 1994 г. па 1997 г. выдаваўся рускамоўны часопіс "Аль-Джыхад" (Барацьба), які з другога нумара стаў называцца "Аль-Іслам", а з трынаццатага "Жыццё" (выйшла 24 нумары) [356].

Ад пачатку 1997 г. у Беларусі выдавалася газета "Жыццё" – штомесячнае выданне Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь і аб'яднання "Аль-Кітаб". Газета мела дадатак – бюлетэнь "Жыццё татарскае" і дзіцячую старонку. Наклад газеты – 300 асобнікаў.

У 2001 г. выйшаў першы нумар альманаха "Millet" – друкаванага органа Федэрацыі татарскіх саюзаў Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны (Польшча). У 2002 г. газету "Жыццё" выдавала Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь, а Беларускае грамадскае аб'яднанне татар "Зікр уль-Кітаб" бюлетэнь "Жыццё татарскае" (да красавіка 2005 г.). У маі 2003 г. выйшлі сотыя нумары газет "Жыццё" і "Татарскае жыццё". Змест артыкулаў першай насіў больш рэлігійны характар, друкавалася шмат матэрыялаў, якія датычыліся мусульманскай праблематыцы свету. У другой перавага аддавалася асвятленню пытанняў з мясцовага жыцця татар.

11–13.10.2002 г. у Смілавіцкай мячэці адбыўся з'езд заснавальнікаў Дабрачыннай рэлігійнай місіі "Мусульманская мараль", якая была зарэгістравана 25.07.2002 г. Мэта створанай арганізацыі: тлумачэнне

[354] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 62.

[355] Орда О.А. Роль СМИ в возрождении культуры татар Беларуси // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 424–425.

[356] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 43.

ісламу, дапамога бедным, маламаёмасным і пенсіянерам, дабрачынныя справы [357].

Місіяй "Мусульманская мараль" быў распрацаваны першы ісламскі сайт – islam.by, які з'явіўся ў беларускім інтэрнеце ў 2003 г. [358]

У навейшай гісторыі Беларусі шмат прыкладаў, якія сведчаць аб умацаванні ўзаемасупрацоўніцтва беларускага і татарскага этнасаў, у прыватнасці ў галіне нацыянальна-культурнага адраджэння. Беларускія вучоныя прымалі актыўны ўдзел у канферэнцыях, якія праводзіліся па ініцыятыве татарскіх аб'яднанняў, выступалі з публікацыямі на старонках татарскага друку, шмат чаго зрабіў калектыў ЦНБ НАНБ, дзе знаходзіцца ўнікальны каталог "Рукапісы беларускіх татараў канца XVII – пачатку XX стст.", прымаюць удзел у стварэнні энцыклапедычнага даведніка "Татары Беларусі, Літвы і Польшчы". Татарская супольнасць вядзе працу па перакладу Карану на беларускую мову, дазвол на друк гэтай кнігі па-беларуску даў муфціят еўрапейскай часткі Расіі і Сібіры. У 2003 г. старшыня Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання І. Александровіч падараваў ЦНБ НАНБ чатырохтомны тэфсір (каментар да Карану) на арабскай і рускай мовах [359].

На жаль, як і іншыя нацыянальныя супольнасці Беларусі, татарскія аб'яднанні праводзяць свае мерапрыемствы на рускай мове. Муфцій І. Александровіч так ахарактарызаваў сучасную моўную сітуацыю сярод татараў у сваім інтэрв'ю газеце "Звязда": "Беларусь мы лічым сваёй другой радзімай, сваю мову мы згубілі і раней размаўлялі толькі на беларускай, зараз размаўляем на рускай і польскай… За ўсю гісторыю татар на гэтай зямлі не было ніводнага канфлікту паміж мусульманамі і карэнным насельніцтвам. І зараз няма ніякага працістаяння… Сёння ў нас вялізнае поле дзейнасці – асветніцтва. Пасля атэістычнага перыяду людзі забыліся на духоўнасць… Спадзяёмся, што нашчадкі беларускіх татар прыйдуць у іслам" [360].

У Беларусі дзейнічалі грамадскія арганізацыі: Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны "Чышма" ( "Крыніца", г. Мінск), Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Татара-башкірскі культурны цэнтр "Хэтэр" ("Памяць"), Беларускае рэгіянальнае аб'яднанне татарскай моладзі (Мінск), Беларускае грамадскае аб'яднанне татар "Зікр уль Кітаб" ("Памяць і кніга", г. Мінск), грамадскае аб'яднанне татар (Гродна) [361].

---

[357] Съезд в Смиловичах // Жизнь. 2002. нояб. С. 2–3.

[358] Орда О.А. Роль СМИ в возрождении культуры татар Беларуси // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 426.

[359] Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 58–59.

[360] Мядзведзева В. "Нельга дапусціць процістаяння рэлігій" // Звязда. 2001. 12 кастр. С. 2.

[361] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік ; Гембіцкая М. Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі. С. 39.

ГА “Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны “Чышма” была створана ў 1998 г. Аб’ядноўвае татар і башкір. З 2004 г. дзейнічае культурны цэнтр “Чышма”, пры ім працуе нацыянальны вакальна-харэаграфічны ансамбль “Чышма”, музычная студыя – клас гітары, баяна, духавых народных інструментаў (курай). Адкрыты курсы татарскай мовы. Фарміруецца нацыянальная бібліятэка [362].

У выніку варта адзначыць, што пры рэспубліканскім згуртаванні татар-мусульман на Беларусі “Аль-Кітаб” працавалі камісіі па гісторыі, культуры, рабоце сярод моладзі, пытаннях рэлігіі, міласэрнасці, па ўмацаванню сувязей з татарамі, што жылі ў іншых мясцінах, у тым ліку і за мяжой. Вялося даследаванне мінулага, запісваліся паданні, казкі, іншы фальклорны матэрыял, рабіліся апісанні звычаяў, якія захоўваліся ў штодзённым жыцці і ў рэлігійных абрадах; праводзіўся збор экспанатаў для будучага музея і выстаў. Упершыню ў гісторыі татар Беларусі яны пачалі выдаваць на беларускай мове свой часопіс, які прысвечаны мінуламу і сучаснасці татарскай нацыянальнай супольнасці.

***Цыганы (рома)*** з’яўляюцца самай шматколькаснай нацыянальнай супольнасцю ў Еўропе [363]. Згодна перапісу 2009 г. іх у Беларусі 7079 чал. Цыганскія арганізацыі Беларусі называюць іншую лічбу – каля 58 тысяч.

Асноўная маса цыган прыйшла на беларускія землі з тэрыторыі Нямеччыны і Польшчы, а ў канцы XVI – пачатку XVII стст. – з Вугоршчыны (Венгрыя). Лад жыцця цыган на працягу стагоддзяў практычна не змяняўся. З канца мая яны вандравалі, а ўзімку прасіліся на пастой у вёскі. Значная частка сучаснага цыганскага насельніцтва Беларусі – нашчадкі паваенных перасяленцаў з іншых рэгіёнаў СССР (галоўным чынам з Малдавіі). Канец качавога жыцця цыган у СССР наступіў у 1956 г. у сувязі са з’яўленнем Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР “Пра далучэнне да працы цыган, якія займаюцца бадзяжніцтвам”. Цыган, што парушылі ўказ чакаў пяцігадовы тэрмін турэмнага зняволення. У наш час месцамі кампактнага пражывання беларускіх цыган з’яўляюцца Мінск, Гродна, Гомель, Віцебск, Магілёў, Брэст, Бабруйск, Заслаўль, Ашмяны, а таксама іншыя гарады і мястэчкі. Рэлігійная самасвядомасць цыган у параўнанні з этнічным аслаблена. Як правіла, цыганы прымалі рэлігію той мясцовасці, у якой пражывалі. Абсалютная большасць беларускіх цыган вызнаюць праваслаўе, частка – каталіцтва. Прычым і ў наш час рэлігійны культ адыгрывае вялікую ролю ў жыцці беларускіх цыган [364].

Беларускія цыганы ўваходзяць у склад супольнасці, якую акрэсліваюць як беларуска-літоўскую этналінгвістычную групу цыган

[362] Інфармацыя аб ГА “Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны “Чышма” // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 962. Арк. 26

[363] Фрэйзэр А. Цыганы. Мінск, 2003.

[364] Болотова Ю.Г. Субкультура белорусских цыган. С. 324–329.

Еўропы. На тэрыторыі Беларусі цыганская супольнасць, у сваю чаргу, падзяляецца на некалькі меншых груп. Першую складаюць "беларуска рома", якія з'яўляюцца нашчадкамі выхадцаў з беларуска-літоўскага і венгерска-польскага арэалаў. Так называлі сябе толькі тыя цыганы, якія жылі ў Мінску і Мінскай вобласці. Да другой групы адносяцца беларуска-літоўскія цыганы польскага паходжання – "рома бежанцы", якія жылі па ўсёй заходняй і цэнтральнай частках рэспублікі. Трэцяя група – "ліпенцы" (ад змененага слова лепельцы). Яны жылі на паўночным захадзе Беларусі. На тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай абласцей жылі цыганы змешанага беларуска-рускага паходжання ("сякі", "вэшытка", "габалі" і інш.). На поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі цыганы называлі сябе "гомельцы", "палесякі", "сінякі". На Палессі жылі "пінчукі". У цэнтральнай, паўднёва-ўсходняй і паўднёвай частках Беларусі жылі групамі і асобнымі сем'ямі цыганы – "бернікі". Гэта нашчадкі былых членаў табараў, што качавалі па памежжы Беларусі, Бранскай вобласці і Украіны. На тэрыторыі Віцебскай вобласці пасля Другой сусветнай вайны ў вёсках пасялілася група цыганоў з Літвы. У Брэсцкай і Гродзенскай абласцях жылі польскія цыганы "фэлдытка". У цэнтральнай і паўднёвай частках Беларусі жылі невялікія групы цыганоў змешанага беларуска-ўкраінскага паходжання – "муканы" [365]. За апошнія дваццаць год значная частка цыган пераехала жыць у буйныя гарады, у горад Мінск.

Замкнутасць цыганскай культуры, выяўленае імкненне да самазахавання, свядомае абмежаванне доступу звонку, кланавасць, дуалізм маральнасці, аўтаномія асобы не раз выклікалі неразуменне ва ўлады і мясцовага насельніцтва. Да цяперашняга часу цыганы ганарацца тым, што не асіміляваліся ў іншаэтнічным асяроддзі, захавалі сваё асаблівае аблічча, самасвядомасць, менталітэт і традыцыі. За гады качавога жыцця беларускія цыганы выпрацавалі свой маральны кодэкс, якога прытрымліваюцца дагэтуль. Захоўваюцца сямейныя традыцыі. На сучасным этапе яны трохі змяніліся, але іх аснова засталася ранейшай. Да цяперашняга часу дзейнічаюць цыганскія суды. Павага да старэйшых – аснова маральнай культуры беларускіх цыган.

У разглядаемы перыяд становішча цыганоў у Беларусі было не лепш, чым у іншых краінах былога сацыялістычнага лагеру, напрыклад, Чэхіі. Беспрацоўе сярод цыганоў складала каля 98 %. У Рэспубліцы Беларусь амаль нічога не рабілася дзеля таго, каб знізіць узровень беспрацоўя ў асяродку цыганоў. Сярод іх вельмі нізкі ўзровень адукацыі. Прыкладна 85 % цыганоў не мелі няпоўнай сярэдняй адукацыі. Яны

[365] Калінін В. Цыганы на Беларусі // З гісторыяй на "ВЫ". Мінск, 1994. С. 330–349 ; Дучыц Л. З гісторыі цыганоў Беларусі . С. 48–49 ; Жук О.Э. Социальная организация цыган Беларуси. –С. 78–81 ; Бартош О.Э. Проблемы этничной идентификации цыган Беларуси. С. 152–154 ; Болотова Ю.Г. Субкультура белорусских цыган. С. 324–329 ; Піскун Л., Піскун Я. Да пытання аб культуры і адукацыі цыганоў Беларусі. С. 16–20.

сутыкаюцца з праблемамі нават падчас атрымання пачатковай адукацыі. Гэта не толькі пралікі дзяржаўнай палітыкі, а і спецыфіка нацыянальнай самасвядомасці цыганскага насельніцтва. Яно, у сваёй большасці, і не імкнецца да таго, каб іх дзеці атрымоўвалі поўнавартасную адукацыю. У той жа час Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Л. Гуляка на анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА 02.12.2009 г. адзначыў, што пытанні працаўладкавання цыган і навучання іх дзяцей у школах сталі больш кіруемымі дзякуючы супрацоўніцтву з дзяржаўнымі органамі ўлады пяці цыганскіх грамадскіх нацыянальна-культурных аб’яднанняў.

У Беларусі не інавала цыганскай школы. Стварэнне цыганскай школы дазволіла б значна знізіць узровень неадукаванасці сярод цыганоў. У якасці прыкладу можна прывесці нашага бліжэйшага суседа – Расію, у якой у даследуемы перыяд было некалькі цыганскіх школ. У Літве, дзе цыганская школа працавала не адзін год, кіраўніцтвам школы было прынята рашэнне аб будаўніцтве дадатковага корпуса з той прычыны, што колькасць цыганскіх дзяцей, якія жадалі навучацца, перавышала магчымасці самой школы. У Рэспубліцы Беларусь не было ніводнага цыганскага культурнага цэнтра. Для прыкладу, цыганскі культурны цэнтр надзвычай актыўна працаваў у Расіі. Ён кожны год ладзіў у Маскве вялікі фестываль цыганскага мастацтва, які фінансаваўся з бюджэту Маскоўскай мэрыі. Фестываль меў статус міжнароднага і збіраў вялікую колькасць людзей з былога Савецкага Саюза [366].

У адносінах да цыганоў у Беларусі існаваў даволі вялікі ўзровень дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце. Паміж цыганамі і беларусамі ў цэлым вельмі добрыя адносіны. Але пэўныя дзяржаўныя СМІ і органы правааховы пры затрыманні злачынцаў, калі сярод іх былі цыганы абавязкова гэта падкрэслівалі. Тым самым ствараўся стэрэатып – “Хто гандлюе наркотыкамі? Адказ адзін – цыганы!” У той жа час, згодна з нашым заканадаўствам нельга падкрэсліваць нацыянальнасць чалавека, які парушыў закон.

Каб нейкім чынам пераадолець негатыўнае стаўленне да цыган, 27.09.2004 г. ГА “Беларуская секцыя міжнароднага аб’яднання праў чалавека” прапанавала Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь адкрыць пастаянную выставу цыганскай культуры пры Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту [367].

У Мінску былі зарэгістраваны і дзейнічалі 1 міжнароднае і 2 рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднанняў цыган. Праводзілі працу сярод ромскага насельніцтва: раённае грамадскае аб’яднанне “Беларуская цыганская дыяспара” (Мінскі раён, пас. Бараўляны), Беларуская асацыяцыя цыган “Рома” (Мінскі раён, пас. Калодзішчы), Міжнародная грамадская

---

[366] Калінін М. Цыганам у Беларусі кепска. С. 7.

[367] Ліст ГА “Беларуская секцыя міжнароднага аб’яднання праў чалавека” // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 962. Арк. 38–39

арганізацыя цыган “Адраджэнне” (Мінская вобл., г.п. Калодзішчы), грамадскае аб’яднанне “Ашмянская цыганская абшчына” (г. Ашмяны Гродзенскай вобл.) [368]. Большасць з іх, у асноўным займалася размеркаваннем сярод цыган выплат і кампенсацый, атрыманых ад Германіі за палітыку генацыду ў адносінах да цыган у гады Другой сусветнай вайны.

Найбольш актыўнае і вядомае аб’яднанне цыган у Беларусі – ГА “Беларуская цыганская дыяспара”, якое ставіла перад сабою мэты, акрамя агульназначных, – дамагацца кампенсацыі ахвярам Халакоста, забяспячэнне сацыяльнага статуса і працаўладкавання ромскага насельніцтва, юрыдычнай абароны цыган і вырашэння праблем крымінагеннай сітуацыі ў цыганскім асяродку [369].

Аб’яднанне імкнулася супрацоўнічаць з органамі ўлады, рознымі грамадскімі ўстановамі. Так, у другой палове 1990-х гг. у Магілёве цыганскае насельніцтва арганізоўвала свой нацыянальны падворак пад час святкавання Дня горада.

ГА “Беларуская цыганская дыяспара” прапанавала правесці ў Мінску 10–14.10.2002 г. ІІ Міжнародны Ромскі дзіцячы фестываль мастацтваў “Залатая падкова”. У ім планавалі браць удзел прадстаўнікі цыганскіх дыяспар Балгарыі, Расіі, Польшчы, Венгрыі, Украіны, Прыбалтыкі, Малдовы, Беларусі, Чэхіі. Збіраліся арганізаваць і правесці канцэрт, навукова-практычную канферэнцыю, мастацкую выставу “Свет вачыма дзяцей”, начное шоу “Шацёр”. Але не заўжды намаганні цыганскіх аб’яднанняў здзяйсняюцца. З-за фінансавых цяжкасцей фестываль не адбыўся. Не знайшла гэтая ініцыятыва падтрымкі і з боку беларускіх улад.

9.01.2003 г. у Мінскі гарвыканкам паступіў ліст ад ГА “Беларуская цыганская дыяспара” з просьбай выдзеліць месца пад міні-рынак для цыган, які будзе пабудаваны за кошт дыяспары. Гэта рабілася з мэтай вырашэння эканамічных пытанняў і працаўладкавання цыганскага насельніцтва горада. Аб’яднанне атрымала адмову і яму было прапанавана ўдзельнічаць у конкурсе праектаў на агульных умовах.

Згодна інфармацыі ГА “Беларуская цыганская дыяспара” тры прадстаўнікі цыганскай нацыянальнасці вылучаліся ў Палату прадстаўнікоў і мясцовыя саветы. У снежні 2004 г. выйшаў першы нумар інфармацыйнага бюлетэня ГА “Беларуская цыганская дыяспара” пад назвай “Рамана Лаў” (“Цыганскае слова”). Гэта першае ў гісторыі цыган Беларусі друкаванае выданне. Існаваў рэстаран цыганскай кухні “Дрома-ромэн” (“Шляхі цыган”). У нашай дзяржаве былі добра вядомы ансамблі цыган (2004 г.): “Джана Рома” з Ашмян, “Тэрнэ Бэрша” з Магілёва, “Гіля

---

[368] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік.

[369] Пушкін І.А. Асноўныя тэндэнцыі ў накірунках дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі (1991–2004 гг.) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова. 2006. № 4. С. 19.

Ромэн” з Лельчыц і іншыя. Культуру цыган, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі неабходна разглядаць як субкультуру [370].

Абагульняючы звесткі пра цыган, варта адзначыць два моманты. Па-першае, недастатковая ўвага органаў дзяржаўнай улады да патрэб і запатрабаванняў цыганскай нацыянальнай супольнасці і забеспячэння належнага статуса грамадзянам ромскай нацыянальнасці. Па-другое, нежаданне саміх цыган прыкладаць шмат намаганняў для змянення свайго статуса, атрымання належнай адукацыі, актыўнага ўдзелу у грамадскім і культурным жыцці дзяржавы.

***Нямецкая*** супольнасць Беларусі стварыла сваё першае таварыства ў Мінску ў 1990 г., калі было зарэгістравана Мінскае гарадское грамадскае аб’яднанне “Цэнтр нямецкай культуры “Відэргебурт” (Адраджэнне), якое планавала рэалізаваць маштабныя праекты.

У Беларусі з 1995 г. вялася распрацоўка бізнес-праекта пад назвай “Жыллёвы пасёлак з вытворчай зонай “Цэнтр нямецкай культуры”. У 2000 г. гэты праект спрабавала рэалізаваць Беларускае таварыства немцаў “Нямецкі дом”. Архітэктурны праект “Пасёлак этнічных немцаў на 500 жыхароў у Мінскім раёне” быў распрацаваны і паспяхова абаронены, як дыпломная праца выпускнікамі Беларускай дзяржаўнай палітэхнічнай акадэміі (кіраўнік – доктар архітэктуры, прафесар В. Аладаў). Урад Германіі падтрымліваў выкананне падобных праектаў.

Неабходна адзначыць, што да 2000 г. у Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, з 5 дзеючых грамадскіх нямецкіх арганізацый, толькі Беларускае таварыства немцаў “Нямецкі дом” ніводнага разу не звярталася і таму кантакты з ім былі выпадковыя і мінімальныя.

Кіраўнікі іншых нацыянальна-культурных аб’яднанняў немцаў з Віцебска, Бабруйска дэлегіравалі сваё прадстаўніцтва ў вырашэнні агульных праектаў старшыні ЦНК “Відэргебурт”, які ўваходзіў у склад Каардынацыйнай рады па справах нацыянальнасцей пры Камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

Усе гэтыя аб’яднанні праводзілі работу сярод сваіх сяброў па вывучэнню нямецкай мовы, гісторыі, культуры, арганізацыі святаў і г.д. Пры ГА працавалі хор і ансамбль нямецкай песні, бібліятэка нямецкай культуры ў Мінску, танцавальны ансамбль, студэнцкі тэатр і дзіцячы садок у Віцебску. За выключэннем таварыства “Нямецкі дом”, усе астатнія прымалі ўдзел у фестывалях нацыянальных культур. ЦНК “Відэргебурт” быў заснаваны свой літаратурны альманах “Як жывеш?”. Яго першы выпуск у 1998 г. быў выдадзены за кошт сродкаў Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей. У 1999 г. адбылася навукова-мастацкая сустрэча “Беларуска-нямецкія культурныя ўзаемасувязі”, якая была

[370] Пушкін І.А. Грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцей Беларусі і фарміраванне грамадзянскай супольнасці (1991–2005 гг.) // ИППОКРЕНА. С. 19; Болотова Ю.Г. Субкультура белорусских цыган. С. 324–329.

прысвечана 600-годдзю І. Гутэнберга і 250-годдзю І. Гётэ. Матэрыялы сустрэчы былі надрукаваны ў чарговым выпуску альманаха за бюджэтныя сродкі.

У сярэдзіне 1990-х гг. у дзіцячым садку № 90 г. Віцебска працавалі дзве групы для дзяцей этнічных немцаў, дзе вывучалася нямецкая мова і пачыналася знаёмства з традыцыямі і культурай нямецкага народа. Адначасова ішло азнаямленне дзяцей з беларускай і рускай культурай [371].

З верасня 1992 г. у Бабруйску дзейнічала грамадскае аб’яднанне “Бабруйская нямецкая абшчына “Цэнтр нямецкай культуры”. Аб’яднанне ставіла перад сабою мэту: адраджэнне, захаванне і развіццё культурных традыцый немцаў, які жылі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь; вывучэнне нямецкай мовы і развіццё сяброўства паміж народамі. У склад аб’яднання ўваходзіла каля 60 сямей, па сацыяльнаму складу – інтэлігенцыя (служачыя) і рабочыя, якія мелі розную адукацыю. Так як сяброўства было пабудавана па сямейнаму тыпу, у яго склад уваходзілі асобы розных узростаў.

Пры “Цэнтры нямецкай культуры” (ЦНК) працавалі наступныя культурна-асветныя гурткі: вакальная група “Лерхэн” (“Жаўрукі”), група сацыяльнай дапамогі, курсы вывучэння нямецкай мовы. Грамадскае аб’яднанне ўвесь час з’яўлялася ўдзельнікам фестываляў культуры нацыянальных супольнасцей.

Для рэалізацыі сваіх статутных мэтаў ГА “Бабруйская нямецкая абшчына “ЦНК” супрацоўнічала з падобнымі цэнтрамі ў Беларусі і краінах СНД, з Міжнародным саюзам нямецкай культуры (Масква), з Федэральным саюзам Еўрапейскіх нацыянальных супольнасцей (г. Фленсбург, Германія).

Кажучы пра нямецкую супольнасць У. Мейерсон сцвярджаў, што нямецкі рух афіцыйна сфарміраваўся ў Беларусі ў 1992 г., калі было створана таварыства “Відэргебурт” (старшыня А. Майснер) [372]. Першымі ў арганізацыю ўвайшлі прадстаўнікі дыяспары з Мінску, Гродна, Бабруйска, крыху пазней Гомеля і Віцебска. Затым таварыства распалася на некалькі самастойных арганізацый па віне кіраўніцтва.

У 2000 г. у Беларусі былі зарэгістраваны Віцебскі саюз немцаў, цэнтры нямецкай культуры ў Гомелі і Бабруйску, таварыства “Відэргебурт” у Мінску. Частка знаходзілася ў стадыі перарэгістрацыі. Са слоў У. Мейерсона ў СМІ прагучала наступнае: “У чэрвені [2000 г.] мы прыйшлі да канчатковага пераканання: трэба ствараць Асацыяцыю грамадскіх аб’яднанняў нямецкай нацыянальнай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Асацыяльна-каардынуючы цэнтр, каб праца арганізацый насіла не стыхійны, а прадуманы і арганізаваны характар”. Далей паведамлялася,

[371] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь. С. 167.
[372] Доверие можно заслужить только работой // Московская немецкая газета. 2000. верасень. С. 11.

што ў чэрвені 2000 г. дадзеная асацыяцыя была ўтворана, старшынёю быў абраны У. Мейерсон. 22.05.2001 г., на падставе гэтай газетнай публікацыі, Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей накіраваў ліст у пракуратуру, т.я. у рэспубліцы быў створаны і дзейнічаў незарэгістраваны ва ўстаноўленным парадку саюз грамадскіх аб'яднанняў [373].

На пачатку XXI ст. у Беларусі праводзілі працу наступныя зарэгістраваныя нямецкія аб'яднанні: Беларускае таварыства немцаў "Нямецкі дом", ГА "Цэнтр нямецкай культуры "Відэргебурт" ("Адраджэнне"), грамадскае аб'яднанне нямецкай культуры "Масты" (Мінск), ГА "Культурна-асветны цэнтр немцаў "Фройндэскрайс" ("Кола сяброў") (Брэсцкі раён, в. Чарнаўчыцы), гарадское грамадскае беларуска-нямецкае аб'яднанне "Вількоммен – Калі ласка", гарадское грамадскае аб'яднанне "Віцебскі саюз немцаў" (Віцебск), Гомельскае гарадское грамадскае аб'яднанне "Цэнтр нямецкай культуры" (Гомель), грамадскае аб'яднанне нямецкай культуры "Айнтрахт" (Ліда), ГА "Бабруйская нямецкая абшчына "Цэнтр нямецкай культуры" (Бабруйск) [374]. Апошняя ў 2007 г. самаліквідавалаася [375].

Такім чынам, нямецкія грамадскія аб'яднанні імкнуліся праводзіць працу па адраджэнню, захаванню і развіццю культурных традыцый немцаў, якія жылі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама садзейнічалі вывучэнню нямецкай мовы і развіццю сяброўства паміж беларускім і нямецкім народамі.

***Народы з Каўказскага рэгіёна*** ў Беларусі – гэта вынік узрастання міграцыйных працэсаў апошніх дзесяцігоддзяў, што стала неад'емнай прыкметай сучасных міжнародных і міждзяржаўных адносін. Міграцыйныя працэсы ўносілі пэўную спецыфіку ў развіццё міжнацыянальных і канфесійных адносін у Рэспубліцы Беларусь, уплывалі на сацыяльна-дэмаграфічную характарыстыку грамадства, вызначалі шматвобразнасць форм узаемадзеяння розных культур, народаў, моў.

Актыўныя знешнія міграцыі апошніх часоў у Беларусь пэўным чынам змянілі этна-канфесійную культуру грамадства, дапоўнілі яе шэрагам гістарычна новых для дзяржавы, адносна нешматлікіх іншаэтнічных груп. З'явіліся розныя па колькасці і характару рассялення этнічныя групы народаў Каўказа, агульная дэмаграфічная маса якіх значна ўзрасла [376].

---

[373] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 110.

[374] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік.

[375] Гадавая справаздача "Аб працы ў сферы міжнацыянальных адносін і каардынацыі супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой" // Бягучы архіў аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцей Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.

[376] Рагимов А.Н. Конфессионально–демографическая характеристика миграции представителей народов Кавказа в Беларусь в 80–90 гг. XX ст. С. 215 ; Яго ж. Міграцыя народаў Каўказа ў Рэспубліку Беларусь у 1980 – 1990-я гады. С. 33–40.

У 2004–2014 гг. у Беларусі пражывалі прадстаўнікі каля 45 народаў Каўказскага рэгіёна. Як адзначае даследчык А.Рагімаў, яны не мелі асабліва значнай ролі ў сферы міжнацыянальных і міжканфесійных адносін у Рэспубліцы Беларусь, але на яе характар уплывалі. Найбольш шматлікія этнічныя групы народаў Каўказа, якія жылі ў Беларусі, згодна з перапісамі насельніцтва прадстаўлены: армянамі, азербайджанцамі, грузінамі. Назіраўся пастаянны рост колькасці прадстаўнікоў і іншых народаў Каўказа: абхазаў, даргінцаў, інгушаў, кабардзінцаў, кумыкаў, лезгінаў, асецінцаў, чачэнцаў і інш.[377]

Прадстаўнікі народаў Паўночнага Каўказа і Закаўказзя пражывалі на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Найвялікшая этнічная група каўказцаў Беларусі – армяне. Большая колькасць з іх пражывала ў Мінскай, Гомельскай, Віцебскай абласцях, меншая – у Гродзенскай і Брэсцкай. Як этнаканфесійная група армяне прадстаўлялі адзін з найбольш ранніх кірункаў хрысціянства – манафізіцкую канфесію. У 2004 г. у Беларусі была зарэгістравана першая канфесійная абшчына армян “Армянская Апостальская царква” [378]. Грузіны пераважна жылі ў Мінскай, Віцебскай і Гомельскай абласцях. Большасць веруючых грузін – праваслаўныя. Азербайджанцы найбольш былі прадстаўлены ў Мінскай, Магілёўскай, Гомельскай і Віцебскай абласцях. Падрабязна дзейнасць азербайджанскай дыяспары даследаваў Б. Ганбараў [379]. Значная частка з іх вызнавала іслам шыіцкага толку. Прадстаўнікі іншых народаў Каўказа малаколькасныя і жылі галоўным чынам дысперсна, найперш за ўсё, у буйных гарадах. На думку А. Рагімава, у Беларусі “тэмы міжэтнічных супярэчнасцей, алармісцкіх настрояў наконт іншаэтнічных міграцый, чачэнскай і вахабісцкай пагрозы не дадуць палітычных дывідэнтаў у нашай краіне. Бо прадстаўнікі каўказскай дыяспары, якія пераехалі ў Беларусь, больш занятыя праблемамі адаптацыі [пакуль што – І.П.] да новых рэаліяў, чым утварэннем “ісламскага парадку” [380].

У Беларусі дзейнічалі аб’яднанні: Гродзенскае грамадскае аб’яднанне грузін (Гродна), Магілёўскае гарадское грамадскае аб’яднанне “Грузінская абшчына Іберыя” (Магілёў), Міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Кангрэс азербайджанскіх абшчын” (Мінск), Культурна-асветніцкае грамадскае аб’яднанне “Габустан” (Мінск), Гродзенскае гарадское нацыянальна-культурнае грамадскае аб’яднанне азербайджанцаў “Достлуг” (Гродна), Магілёўскае грамадскае аб’яднанне азербайджанцаў

[377] Рагимов А.Н. Конфессионально–демографическая характеристика миграции представителей народов Кавказа в Беларусь в 80–90 гг. ХХ ст. С. 215

[378] Там жа. С. 216.

[379] Ганбаров Б. А. Азербайджанская диаспора в Республике Беларусь: организационная структура, социально-экономическое положение и основные направления деятельности (1989–2013 г.). Минск, 2014.

[380] Рагимов А.Н. Конфессионально–демографическая характеристика миграции представителей народов Кавказа в Беларусь в 80–90 гг. ХХ ст. С. 216–217.

“Хазар” (Магілёў, ліквідавана ў 2005 г. – на сёняшні дзень у абласным цэнтры зарэгістравана новая грамадская арганізацыя азербайджанцаў “Азеры”), Бабруйская грамадская арганізацыя “Азербайджанскае таварыства гісторыі і культуры” (Бабруйск), Міжнародная грамадская арганізацыя армян “Урарту” (Бабруйск), Магілёўскае абласное дабрачыннае армянскае грамадскае аб’яднанне “Масіс” (Магілёў), Мінскае гарадское культурна-асветнае таварыства “Айастан” (Мінск), Міжнароднае грамадскае аб’яднанне дагестанцаў “Ачаг” (Мінск) [381].

Асноўнымі мэтамі арганізацыі і дзейнасці сваіх таварystваў прадстаўнікі каўказскіх народаў бачылі захаванне сваіх нацыянальных культур, моў, папулярызацыю гісторыі і этнічных звычаяў, літаратуры, аказанне дапамогі суайчыннікам – інвалідам і ветэранам, а таксама ўздзеянне на землякоў, якія нелегальна прыбываючы ў Беларусь, уступаюць у канфлікты з законамі рэспублікі. Як слушна адзначае А. Рагімаў, віноўнага вельмі часта шукаюць па этнічных прыкметах, і віна асобных неправамерна перакладаецца на ўсю дзейнасць дадзенай дыяспары [382].

Пры некаторых грамадскіх аб’яднаннях былі адкрыты і дзейнічалі нядзельныя школы па вывучэнню нацыянальнай мовы (напрыклад, у Магілёве азербайджанская нядзельная школа для дзяцей існуе больш за 10 год), гісторыі і традыцый, праводзіліся нацыянальныя святы, фестывалі і канцэрты. У пачатку 2000-х гг. у Мінску была адкрыта школа-клас спецыяльна для грузінскіх дзяцей – бежанцаў з Абхазіі, які наведвалі вучні не толькі з грузінскіх, але і змешаных беларуска-грузінскіх сямей. Падобны клас быў адкрыты і ў СШ № 9 г. Гродна.

Актывісты этнакультурных аб’яднанняў у пераважнай большасці належылі да гуманітарнай, радзей – тэхнічнай інтэлігенцыі. Згодна з А. Рагімавым, ёсць падставы меркаваць, што рэальныя лідары, якія маюць сур’ёзны рэсурс уладнага ўздзеяння на сваіх суайчыннікаў, прадстаўлены ў сферы эканомікі, магчыма, крымінальнай [383].

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь пражывалі прадстаўнікі каля 45 народаў Каўказскага рэгіёна, якія не мелі асабліва значнай ролі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, але пэўным чынам на яго ўплывалі. Адчувалася некаторае негатыўнае ўспрыняцце іх з боку славянскай часткі насельніцтва Беларусі.

Грамадскія аб’яднанні каўказскіх народаў у Беларусі займаліся праблемамі адаптацыі і аказання дапамогі суайчыннікам, захаваннем сваіх нацыянальных культур, моў, папулярызацыяй нацыянальнай гісторыі і літаратуры.

---

[381] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік.
[382] Рагімаў А. Міграцыя народаў Каўказа ў Рэспубліку Беларусь у 1980 – 1990-я гады. С. 39.
[383] Рагимов А.Н. Конфессионально–демографическая характеристика миграции представителей народов Кавказа в Беларусь в 80–90 гг. XX ст. С. 218.

***Іншыя нацыянальнасці.*** За апошнія пятнаццаць год у Беларусь прыбыла даволі шмат мігрантаў з краін Балтыі, Расіі, рэспублік Сярэдняй Азіі, Казахстана, Закаўказзя, Малдовы, іншых краін. Большасць з прыбыўшых у Беларусь – асобы, якія выехалі з БССР у розныя гады або прадстаўнікі нацыянальнасцей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі [384].

Але ў выніку розных прычын у Беларусі з’явіліся прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей, якія ніколі раней стала не жылі на тэрыторыі нашай краіны. Так, напрыклад, згодна з дадзенымі Дэпартамента па грамадзянству і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь, на 01.03.2005 г. афіцыйна атрымалі статус бежанцаў 325 афганцаў (з улікам непаўналетніх дзяцей – 544 асобы). У той жа час, як адзначаў кіраўнік адной з афганскіх абшчын С. Рахмад, у 2005 г. на тэрыторыі Беларусі стала жылі больш за 1000 афганцаў [385].

У першую чаргу, з мэтай абароны сваіх грамадзянскіх правоў, сацыяльнай і культурнай адаптацыі ў нашай краіне, былі ўтвораны: грамадскае аб’яднанне “Міжнародны дабрачынны фонд дапамогі афганскім бежанцам”, Міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Арабскі інфармацыйны цэнтр”, грамадскае аб’яднанне “Сірыйская абшчына” (усе Мінск). З адзначанымі мэтамі, а таксама для захавання мовы і нацыянальнай культуры былі ўтвораны: грамадскае аб’яднанне “Абшчына беларускіх эстонцаў”, турэцкае грамадскае аб’яднанне “Дружба-Достлук”, грамадскае аб’яднанне – абшчына “Малдова”, грамадскае аб’яднанне “Абшчына беларускіх чувашаў “Атал” (“Волга”) (Мінск), казахскае Міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Елімай” (Айчына), Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Асацыяцыя беларускіх карэйцаў” (усе Мінск), Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне грэкаў “Пелапаннес” (Маладзечна), грамадскае аб’яднанне Грэчаскае нацыянальна-культурнае таварыства “Алкестыда” (Мінск), грамадскае аб’яднанне “Англійскі культурны цэнтр” (Віцебск) [386].

Грамадскае аб’яднанне “Абшчына беларускіх чувашаў “Атал” (Волга) было створана ў 1999 г. Сябры арганізацыі займаліся вывучэннем і прапагандай чувашскай мовы, гісторыі, звычаяў і традыцый чувашскага народа. У 2001 г. таварыства “Атал” выдала кнігу “Воіны-чувашы ў баях за вызваленне Беларусі”[387].

Пад уплывам актывізацыі нацыянальнага жыцця Беларусі ў 1997 г. з’явілася ініцыятыўная група па стварэнні таварыства грэкаў у Беларусі “Алкестыда”. Спачатку было зарэгістраванае як гарадская арганізацыя, затым перарэгістраванае як рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне

---

[384] Шахотько Л.П. Население Республики Беларусь в конце XX века. Минск, 1996. С. 127.

[385] Стурейко С.А. Афганские беженцы в Республике Беларусь. Проблемы социальнокультурной интеграции. С. 147–148.

[386] Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік.

[387] Інфармацыя аб ГА “Абшчына беларускіх чувашаў “Атал”. 2004 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 1124. Арк. 35

“Грэчаскае нацыянальна-культурнае таварыства “Алкестыда”. Асноўныя мэты дзейнасці: садзейнічанне развіццю культур грэчаскага і беларускага народаў і актывізацыя работы па ўзаемаабагачэнні гэтых культур, вывучэнне і прапаганда грэчаскай культуры, наладжванне і развіццё культурных, навуковых сувязей паміж Рэспублікай Беларусь і Грэчаскай Рэспублікай. Асноўныя задачы таварыства: адраджэнне беларускай і грэчаскай культур, народнай творчасці, рамёстваў, фальклору, прапаганда народных традыцый і звычаяў беларускага народа. Галоўны кірунак працы таварыства “Алкестыда” – культурна-асветніцкая работа. У 1997 г. быў створаны ансамбль грэчаскага танца і дзіцячы хор грэчаскай песні. З 1998 г. яны ўдзельнічаюць у Рэспубліканскіх фестывалях нацыянальных культур. 26.10.2000 г. прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларуска-грэчаскія ўзаемасувязі: ад старажытнасці да сучаснасці” [388]. Замінае дзейнасці некампактнасць пражывання грэкаў у Беларусі.

### 1.6 Рэгіянальныя асаблівасці ў дзейнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый

Для прадстаўнікоў большасці нацыянальных супольнасцей характэрна дысперснае пражыванне па ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, галоўным чынам у гарадской мясцовасці (гл. табл. 7). Найбольшы працэнт нацыянальных супольнасцей у Гродзенскай вобласці (33,3 %) і г. Мінску (20,7 %). Палякі складаюць 21,5 % насельніцтва Гродзенскай вобласці, у тым ліку большасць насельніцтва ў Воранаўскім раёне (24,6 тыс. з 30,5 тыс., ці 80,7 %). Польская супольнасць складае ад чвэрці да паловы насельніцтва ў Ваўкавыскім, Гродзенскім, Іўеўскім, Зэльвенскім, Лідскім, Шчучынскім раёнах Гродзенскай вобласці, а таксама ў Браслаўскім раёне Віцебскай вобласці [389]. Варта адзначыць кампактнае пражыванне літоўцаў у в. Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці, рускіх (старабрадцы) у Віцебскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях, кампактнае (сумеснае, абшчыннае) пражыванне цыганоў у абласных і раённых цэнтрах.

Нацыянальныя грамадскія арганізацыі і рухі праводзілі значную працу па захаванню сваёй нацыянальнай культуры, яе далейшага ўсебаковага развіцця, аб чым ішла гаворка ў папярэднім раздзеле. Аднак варта прыпыніцца і на працы ў абласных рэгіёнах, дзе дзейнасць гэтых арганізацый вызначалася вялікай штодзённай работай па захаванню сваёй нацыянальнай спадчыны. Аналіз колькаснага складу НГА, дынамікі іх развіцця і кірункаў дзейнасці дазваляе вылучыць рэгіянальныя асаблівасці.

---

[388] Грэкі ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 1. С. 48–52.

[389] Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Том III. Минск, 2011. С. 106–131.

Табліца 7 – Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі па абласцях ў працэнтах, 2009 г. [390]

| | Беларусь | Брэсцкая | Віцебская | Гомельская | Гродзенская | Мінск | Мінская | Магілёўская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |
| Беларусы | 83,7 | 88,0 | 85,1 | 88,2 | 66,7 | 79,3 | 88,5 | 88,7 |
| Армяне | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 |
| Азербайджанцы | 0,1 | 0,04 | 0,1 | 0,05 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 |
| Грузіны | 0,03 | 0,01 | 0,02 | 0,02 | 0,02 | 0,04 | 0,02 | 0,03 |
| Латышы | 0,02 | 0,01 | 0,04 | 0,01 | 0,02 | 0,02 | 0,01 | 0,01 |
| Літоўцы | 0,1 | 0,03 | 0,1 | 0,02 | 0,2 | 0,1 | 0,03 | 0,02 |
| Палякі | 3,1 | 1,3 | 0,9 | 0,1 | 21,5 | 0,7 | 1,3 | 0,2 |
| Рускія | 8,3 | 6,4 | 10,2 | 7,7 | 8,2 | 10,0 | 7,1 | 7,8 |
| Татары | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,2 | 0,1 | 0,1 | 0,05 |
| Украінцы | 1,7 | 2,9 | 1,2 | 2,1 | 1,4 | 1,5 | 1,2 | 1,2 |
| Цыгане | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,2 | 0,03 | 0,03 | 0,1 | 0,1 |
| Яўрэі | 0,1 | 0,04 | 0,2 | 0,2 | 0,1 | 0,3 | 0,05 | 0,1 |
| Іншыя | 2,55[391] | 0,07 | 1,84 | 1,2 | 1,43 | 7,71 | 1,3 | 1,59 |

Асобнае месца ў Рэспубліцы Беларусь займае ***горад Мінск***. Сталічны статус і вялікая канцэнтрацыя насельніцтва абумовілі наяўнасць вялікай колькасці разнастайных нацыянальных грамадскіх арганізацый. У горадзе Мінску праводзіліся як агульнанацыянальныя, так і рэгіянальныя мерапрыемствы грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі.

У якасці прыклада прывядзем найбольш значныя ў перыяд другой паловы 1990-х – пачатку 2000-х гг.

17.03.1996 года ў Мінску адбыўся першы Усебеларускі фестываль яўрэйскай культуры. 29.05.1999 г. Цэнтр украінскай песні “Січ” правёў V рэспубліканскі фестываль мастацтваў украінцаў Беларусі ў Мінску ў канцэртным зале Белдзяржфілармоніі. 20.06.1999 г. адбыўся V з’езд Усебеларускага аб’яднання яўрэйскіх арганізацый і абшчын (VI з’езд прайшоў 19.06.2001 г.). 29.01.2000 г. адбылася канферэнцыя Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі “Нямецкі дом” (г. Мінск). 22–24.02.2000 г. абшчына беларускіх эстонцаў арганізавала і правяла ў Мінску “Свята Нацыянальнай Эстонскай культуры ў Рэспубліцы Беларусь”. 05–12.11.

[390] Перапись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Том III. С. 8–24.

[391] Трэба ўлічваць, што 2,4 % не указалі сваю нацыянальнасць.

2000 г. у Мінску намаганнямі Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын быў праведзены абшчынны фестываль яўрэйскай кнігі пад назвай "Шэсць вякоў прысутнасці на зямлі Беларускай".

Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны "Чышма" 25–28.04.2001 г. у г. Мінску правёў свята паэзіі, якое было прысвечана 125-годдзю з дня нараджэння народнага татарскага паэта Г.Тукая. З 21.03.2001 г. у Мінску па ініцыятыве і намаганнямі Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў "Пелапанэс" праводзіўся тыдзень культуры Грэцыі, які быў прысвечаны 180-годдзю вызвалення Грэцыі ад асманскага іга. Саюз БЯГАіА 21–23.10.2001 г. правёў Дні памяці, прысвечаныя 60-годдзю пачатка халакосту ў Беларусі. 11–18.11.2001 г. у Мінске Саюз разам з ГА "Яўрэйскае культурнае таварыства "Эмуна" правялі V абшчынны фестываль яўрэйскай кнігі. 27.04.2002 г. у г. Мінске адбыўся VI Рэспубліканскі фестываль мастацтваў украінцаў Беларусі. 24.04.2002 г. у Мінску быў адкрыты Яўрэйскі абшчынны дом. 15.04.2003 г. яўрэйская абшчына г. Мінска адзначыла дзесяцігоддзе пачатку працы першых і на той час адзіных дзяржаўных яўрэйскіх класаў імя Хаіма Бяліка ў СШ № 132. 07.03.2003 г. у Мінску ГА "Беларуская абшчына літоўцаў" здзейсніла адкрыццё "Літоўскай чытальні" на базе бібліятэкі № 20. З 13.08.2004 г. па 15.09.2004 г. у Мінску ў Дзяржаўным літаратурным музеі Я. Купалы працавала выстава "Пайшло слова Тарасова горда, непакорна…", якая была прысвечана 190-годдзю з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі і прымеркавана да Дня Незалежнасці Украіны (24 жніўня). У адкрыцці выставы (13 жніўня) браў удзел фальклёрны ансамбль беларускага грамадскага аб'яднання ўкаінцаў "Ватра" [392].

Пералік падзей можна бясконца працягваць, бо правядзенне значных мерапрыемстваў у сталіцы абумоўлена шэрагам аб'ектыўных фактараў: зручнасць, прэстыжнасць, наяўнасць буйных СМІ і г.д.

Асобна належыць адзначыць актыўную дзейнасць "Яўрэйскага дабрачыннага фонда "Хэсэд–Рахамім". У прыватнасці, ён аказваў падтрымку каля 7000 жыхароў г. Мінска. У сваёй дзейнасці фонд кіраваўся 20 праграмамі: сацыяльны дагляд на даму, дастаўка штодзённых гарачых абедаў на дом; замена бялізны; штодзённыя гарачыя абеды маламаёмасным; прадстаўленне медыцынскага абсталявання і лекаў хворым і г.д. Да таго ж "Хэсэд–Рахамім" аказаў дапамогу: гарадской Асацыяцыі бацькоў дзяцей-інвалідаў, Фонду дапамогі "26 красавіка", арганізацыі інвалідаў Чарнобыля, гарадскому таварыству інвалідаў, Савету жанчын, шматдзетным бацькам, інвалідам вайны Партызанскага раёну г. Мінска і інш.

На тэрыторыі ***Брэсцкай вобласці*** праводзілі працу грамадскія аб'яднанні прадстаўнікоў шэрагу нацыянальных супольнасцей Беларусі. Іх

[392] Наша слова. 2004. 18 жніўня. С. 4.

дзейнасць добра аналізаваць па раёнах, у якіх яны кампактна пражывалі. У першай палове 1990-х вылучалася дзейнасць шэрагу грамадскіх арганізацый украінскай супольнасці, якія ставілі пытанне аб пражыванні на Палессі вялікай колькасці украінцаў.

На пачатак 2001 г. у Брэсцкай вобласці існавалі 10 нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў: яўрэяў – 6 (Брэст, Пінск, Столін), СПБ, украінцаў – 3 [393]. Праз некалькі год у абласным цэнтры дзейнічалі наступныя грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцей: Брэсцкае абласное аддзяленне рэспубліканскага ГА "Рускае таварыства", Брэсцкае абласное аддзяленне рэспубліканскага ГА "СПБ", гарадскі аддзел ГА "СПБ", украінскі навукова-педагагічны саюз "Берагіня", Брэсцкі яўрэйскі дабрачынны цэнтр "Хэсэд-Давід", гарадское яўрэйскае ГА "Брыск", гарадскі аддзел "Полесье", польскае ГА "Мацер школьная". У г. Баранавічы былі зарэгістраваныя і дзейнічалі: гарадская арганізацыя ГА "Клуб яўрэйскай культуры "Шалом" і Баранавіцкі горрайаддзел ГА "СПБ". Згодна з інфармацыяй Пінскага гарадскога выканаўчага камітэта, у горадзе праводзілі актыўную працу грамадскія аб'яднанні: палякаў, яўрэяў, украінцаў.

Яўрэйскія ГА забяспечвалі дагляд за хворымі, дапамагалі прадуктамі састарэлым і нястачным, арганізавалі клубную дзейнасць, працу мінідзённага стацыянара. Супольна адзначалі яўрэйскія святы. Штомесячна праводзіліся пасяджэнні клубаў: ветэранаў, аматараў песні і танцаў, жаночага, сямейнага і інш. Аддзяленні ГА "СПБ", сярод іншых мерапрыемстваў па захаванні і вывучэнні польскай мовы і культуры, праводзілі семінары, канферэнцыі. Так, была праведзена Міжнародная навуковая канферэнцыя "Унёсак палякаў у еўрапейскую культуру". Іх намаганнямі быў надрукаваны насценны каляндар на 2005 год, пабачыў свет музычны дыск спеваў на польскай мове ў выкананні вучняў школ г. Брэста, адбыліся выставы польскіх мастакоў і інш.

У мэтах захавання мовы, культурных традыцый, асобнымі нацыянальнымі супольнасцямі ў ***Віцебскай вобласці*** на пачатак 2000-х гг. існавалі 14 зарэгістраваных нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў: 1 латышскае, 2 нямецкіх, СПБ і яго рэгіянальныя аддзяленні, 1 рускае, 8 яўрэйскіх (Віцебск, Полацк, Орша), 1 англійскае. Найбольш актыўныя былі СПБ і яўрэйскія аб'яднанні [394]. На тэрыторыі Віцебскай вобласці з 1998 г. плённа працаваў цэнтр нацыянальных культур і рамёстваў у Полацку. У 2003 г. быў абагульнены вопыт работы гэтага цэнтра.

На 01.01.2005 г. у Віцебскай вобласці былі наступныя грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцей: Віцебскае аддзяленне

---

[393] Ліст Упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Брэсцкай вобласці". 31.01.2001 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 74–75.

[394] Ліст Віцебскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці ад 26.01.2001 г. "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у вобласці" // Там жа. Арк. 61–64.

Рэспубліканскага ГА “Рускае таварыства”, Віцебская гарадская арганізацыя “Рускі культурны цэнтр “Русь”, ГА “Руская абшчына” (Віцебск), Віцебская гарадская арганізацыя ўкраінцаў “Беларускага ГА “Ватра”, ГА Саюза латышоў Віцебскай вобласці “Даўгава” (Віцебск), Браслаўскае раённае аб’яднанне “Рытас” (г.п. Відзы, в. Вайнюнцы), Грамадскае беларуска-нямецкае аб’яднанне “Вількоммен – Калі ласка” (Віцебск), ГА “Віцебскі саюз немцаў”, Віцебскі абласны савет “СПБ”, Браслаўскае раённае аб’яднанне ГА “СПБ”, Карасінскі аддзел “Мацер школьная” (в. Карасіно), Глыбокскае раённае аддзяленне ГА “СПБ”, Докшыцкае аддзяленне ГА “СПБ”, Міёрскае аддзяленне ГА “СПБ”, Пастаўскае аддзяленне ГА “СПБ”, Камайскі аддзел ГА “СПБ”, Віцебскае дабрачыннае аб’днанне “Хасдэй Давід”, ГА “Полацкі яўрэйскі культурны цэнтр”, ГА “Яўрэйскі культурны цэнтр “Мішпоха” (Віцебск), ГА “Полацкі яўрэйскі дабрачынны цэнтр “Хэсэд Эфраім”, ГА “Таварыства міласэрнасці “Шалом” (Орша), ГА “Аршанская яўрэйская абшчына”, ГА “Таварыства апекі яўрэйскіх могілак Віцебскай вобласці “Беталом” (Дом вечнасці), Віцебскае ГА “Яўрэйская абшчына “Аціква”.

У 2010 г. у Віцебскай вобласці дзейнічала 16 нацыянальна-культурных аб’яднанняў і 6 структур раённага значэння, якія стаялі на ўліку ў мясцовых органах улады. Аб’яднанні прадстаўлялі 7 нацыянальнасцей і дзейнічалі ў гарадах: Віцебск, Полацк, Орша, а таксама ў Міёрскім, Глубоцкім, Докшыцкім і Пастаўскім раёнах. Сярод іх: 3 – рускіх, 1 – украінскае, 1 – латышскае, 1 – літоўскае, 2 – нямецкіх, 6 – польскіх, 8 – яўрэйскіх. Найбольш актыўна вялі працу аб’яднанні ўкраінцаў, яўрэяў і палякаў.

Кіраўніцтвам Віцебскай вобласці ў 2010 г. была распрацавана праграма “500”. Згодна з ёй на тэрыторыі былога ваеннага гарадка ў Глыбоцкім раёне планавалася стварыць аздараўленча-турыстычны комплекс “Пліса”. У ім прадугледжана стварэнне беларускай і літоўскай вёсак, яўрэйскага мястэчка, татарскай слабады, польскай сядзібы. У кожным паселішчы будзе свая культавая пабудова – царква, касцёл, мячэць, сінагога [395].

Найбольш актыўнымі на тэрыторыі вобласці былі Віцебская гарадская грамадская арганізацыя “Рускі культурны цэнтр “Русь” і ГА “Рускае таварыства”. Дзейнасць гэтых установ была накіравана на ўмацаванне сувязей з славянскімі нацыянальна-культурнымі аб’яднаннямі Расіі, Украіны, Беларусі, былой Югаславіі. Акрамя культурна-асветніцкай дзейнасці, яны актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі (канферэнцыі, сімпозіумы, абмен дэлегацыямі, кантакты з амбасадай і інш). Паспяхова працаваў вучэбна-кансультатыўны пункт

[395] Региональная программа “500”. С. 10.

“Школа Расіі”, вучні старшых класаў прымалі ўдзел у гуманітарных алімпіядах у Маскве.

Віцебская грамадская арганізацыя ўкраінцаў “Радзіслаў” займалася распаўсюджваннем ведаў па гісторыі і культуры Украіны і ўкраінцаў, папулярызацыяй у сваім этнічным асяродку ўкраінскай мовы. Яе сябры прымалі актыўны ўдзел у арганізацыі Дзён славянскага пісьментства.

Усе польскія арганізацыі вобласці былі аб’яднаны пад эгідаю ГА “СПБ”. У Віцебску працаваў “Дом польскі”. Асноўная мэта іх дзейнасці – адраджэнне польскай мовы і культуры ў асяродку палякаў вобласці, а таксама, згодна з сцвярджэннямі спецыялістаў абласнога савета па справах рэлігіі і нацыянальнасцей: “падтрымка працэсу пашырэння сферы ўжытку беларускай мовы”. Калектывы мастацкай самадзейнасці польскіх нацыянальных аб’яднанняў часта выступалі з канцэртамі ў Польшчы (г. Зялёная Гура і інш.), а спартсмены ўдзельнічалі ў паланійскіх гульнях у г. Сопат.

Палякі Глыбоцкага раёна каталіцкага веравызнання, актыўна ўдзельнічалі ў хоры пры касцёле Св. Троіцы (г. Глыбокае), прымалі ўдзел у фестывалі польскай песні. Вывучэнне польскай мовы адбывалася на базе цэнтра пазашкольнай працы і ў школе мастацтваў. Удзельнікі вакальнай групы “Глубочанка” прынялі актыўны ўдзел у фестывалі польскай песні ў Міёрах, сталі лаурэатамі свята “Квітней, Глыбоччына” [396].

Нягледзячы на нешматлікасць, грамадскія аб’яднанні яўрэяў праяўлялі вялікую актыўнасць. Віцебскае дабрачыннае аб’яднанне “Хасдэй Давід” аказвала неабходную дапамогу састарэлым. З гэтымі мэтамі была створана і працавала патранажная служба, арганізаваны цэнтр пракату медыцынскага абсталявання, бясплатнае харчаванне. Клопатам цэнтра было ахоплена больш за 2 тысячы чалавек. Пры аб’яднанні працавала студыя “Натхненне”, яўрэйскі нацыянальны вакальна-харэаграфічны ансамбль “Віцебскія дзяўчаты”, якому ў 2001 г. было прысвоена званне народнага. ГА “Яўрэйскі культурны цэнтр “Мішпоха” выдаваў свой часопіс і газету. Па ініцыятыве аб’яднання “Лухот” працаваў Віцебскі яўрэйскі грамадскі ўніверсітэт гісторыі і культуры. Аб’яднаннем “Таварыства апекі яўрэйскіх могілак Беталам” былі выдадзены бібліяграфічны даведнік аб Халакосце і кніга-шляхавод па Стара-Успенскіх могілках. Яўрэйскімі нацыянальна-культурнымі аб’яднаннямі ладзіліся тэматычныя вечарыны з нагоды рэлігійных святаў і значных падзей з гісторыі яўрэйскага народа, Міжнародны фестываль маладзёжных яўрэйскіх тэатраў краін СНД і Балтыі “Пурымшыль” [397].

Пры Полацкім яўрэйскім культурным цэнтры: працавалі клубы яўрэйскай сям’і “Мішпоха”, ветэранаў Вялікай Айчынай вайны і жаночы, гурток “Яўрэйская песня”, маладзёжны клуб “Аціква”, літаратурная

[396] Степаненко Н. Нас объединила земля Беларуси // Віцьбічы. 2002. 27 чэрв. С. 4.
[397] Там жа. С. 4.

гасцёўня, музычны салон, вялося вывучэнне гісторыі Полацкай яўрэйскай абшчыны. Штогод праводзіўся абшчынны фестываль яўрэйскай кнігі. Існавалі наладжаныя сувязі з Полацкім зямляцтвам у Ізраіле. Актыўна дзейнічаў ГА "Полацкі яўрэйскі дабрачынны цэнтр "Хэсэд-Эфраім". У ім на ўліку значыліся пенсіянеры, інваліды з дзяцінства I і II груп, усяго каля 500 чалавек. Аб'яднанне курыравала праграмы "Харчаванне", "Патранаж", "Аптэка" і іншыя. Для тых, хто страціў зрок, а раней шмат чыталі, здзяйснялася праграма "Кніга, якая гаворыць" – вялікі набор літаратурных твораў на аўдыёкасетах.

Пры Браслаўскім раённым ГА літоўцаў "Рытас" працавалі 3 нядзельныя школы, арганізоўваліся і праводзіліся культурна-масавыя мерапрыемствы: "Ужгавелес" (Масленіца), Дзень маці, святы птушак, навагоднія ранішнікі і інш. Для вучняў нядзельных школ былі арганізаваны экскурсіі ў Літву.

Традыцыйныя Дні Латвіі ў Віцебску адбываліся пры актыўным удзеле "Саюза латышоў Віцебскай вобласці "Даугава". Пры консульстве працавала нядзельная школа, дзе дзеці вывучалі латышскую мову, традыцыі і культуру.

Шчыльныя сувязі з партнёрамі ў Германіі падтрымлівалі нацыянальныя аб'яднанні немцаў – "Вількоммэн – Калі ласка" і Віцебскі саюз немцаў". Рэгулярна арганізоўваліся вандроўкі студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў гарады Вецлар і Локун, праводзіліся цыклы лекцый "Марк Шагал і Віцебск" у гарадах Германіі, была падрыхтавана да выдання кніга вершаў Д. Сімановіча на нямецкай мове, у Полацкім Сафійскім саборы адбыўся канцэрт арганай музыкі ў выкананні І. Айхорна і інш.

Значнай падзеяй у дзейнасці ГА "Англійскі культурны цэнтр" стала адкрыццё першай у Беларусі бібліятэкі замежнай літаратуры. Цэнтр з'яўляўся членам Сусветнай асацыяцыі жанчын, падтрымліваў сувязі з фондам Сабрэ [398].

Прадстаўнікі ГА "Саюз латышоў Віцебскай вобласці "Даўгава", калектывы мастацкай самадзейнасці, майстры народнай творчасці з Даўгаўпілса і Рэзекне (Латвія) прымалі актыўны ўдзел у рэгіянальных святах "Браслаўскія бліскавіцы" і "Дзвіна-Двина-Даугава". Больш за 40 год на мяжы трох дзяржаў – Латвіі, Беларусі і Расіі на кургане сяброўства ў Верхнядзвінскім раёне адбываліся штогадовыя сустрэчы ветэранаў вайны 1941–1945 гг. і жыхароў памежных раёнаў.

На пачатак 2001 г. у ***Гомельскай вобласці*** было зарэгістравана 7 нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў: СПБ – 3, яўрэяў – 2, немцаў – 1, казакоў – 1 [399]. У канцы 2000 г. з'явілася суполка армян.

---

[398] Степаненко Н. Нас объединила земля Беларуси. С. 4.

[399] Ліст Упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Гомельскай вобласці" // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 89–90.

29.05.2003 г. дзейнічалі і знаходзіліся ў працэсе рэгістрацыі 11 нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў і іх структур, якія прадстаўлялі 5 нацыянальных супольнасцей.

У 2006 г. у вобласці дзейнічалі восем самастойных нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў, якія былі зарэгістраваны ўпраўленнем юстыцыі абласнога выканаўчага камітэта. Сярод іх 6 яўрэйскіх, 1 нямецкае і 1 цыганскае: ГА "Гомельская абласная яўрэйская абшчына "Ахдут", Гомельская гарадская грамадская арганізацыя нямецкай культуры, Гомельская міжраённная ромская абшчына, Калінкавіцкая раённая грамадская арганізацыя Гомельскага абласнога аб'яднання "Ахдут", Рэчыцкае нацыянальнае аб'яднанне "Клуб яўрэйскай культуры "АМІ", Мазырская раённая арганізацыя ГА "Гомельская абласная яўрэйская абшчына "Ахдут", Мазырскае яўрэйскае дабрачыннае ГА "Хэсэд–Эммануіл", Светлагорскае дабрачыннае яўрэйскае таварыства "Рахамім". Акрамя таго, у вобласці дзейнічалі чатыры арганізацыйныя структуры рэспубліканскіх нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў: тры аддзяленні ГА "СПБ" – у Гомелі, Мазыры, Лельчыцах і Гомельскае гарадское грамадскае аб'яднанне ўкраінцаў "Верхавіна" Беларускага ГА "Ватра".

На думку савета па справах рэлігій і нацыянальнасцей Гомельскага аблвыканкама: "Найбольш актыўнымі з'яўляліся яўрэйскія і польскія грамадскія фарміраванні. Прычым узровень іх актыўнасці ніжэй, чым у іншых рэгіёнах Беларусі. Фактаў сур'ёзных парушэнняў заканадаўства з боку нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў вобласці не зафіксавана. Не адзначана і далучэнне грамадскіх аб'яднанняў да палітычнай дзейнасці. Адной з асаблівасцей дзейнасці грамадскіх нацыянальна-культурных аб'яднанняў у вобласці з'яўлялася іх праца ў культурна-асветніцкай сферы, дабрачыннай дзейнасці, аказанне сацыяльнай падтрымкі членаў сваёй арганізацыі" [400].

Да пэўных праяў парушэння заканадаўства варта прывесці ў якасці прыкладу наступны факт: у Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці ў 2003 г. праходзілі сходы прадстаўнікоў ГА "СПБ" у памяшканні мясцовага касцёла прасвятога Сэрца Хрыста і Дзевы Марыі з Фацімы.

Рэалізацыя ўласных праграм нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі ў вобласці адбывалася пры некаторай падтрымцы мясцовай улады. Так, усе калектывы мастацкай самадзейнасці функцыянавалі пры дзяржаўных установах культуры.

Сярод нацыянальных аб'яднанняў вобласці найбольш шматлікімі і разгалінаванымі з'яўляліся яўрэйскія. Іх дзейнасць была шчыльна злучана з іудзейскімі рэлігійнымі абшчынамі. Асноўнай была сацыяльная праца і аказанне матэрыяльнай дапамогі. Гэта і дазволіла ахапіць і далучыць да

---

[400] Гадавая справаздача савета // Бягучы архіў савета па справах рэлігій і нацыянальнасцей Гомельскага аблвыканкама; Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 135.

працы вялікую колькасць яўрэйскага насельніцтва вобласці. Выкарыстоўваліся розныя формы і метады вывучэння мовы, культуры, традыцый яўрэйскага народа.

Аддзелы адукацыі і культуры Гомельскага гарвыканкома аказвалі арганізацыйную і фінансавую падтрымку гарадскому аддзелу ГА "СПБ" пры правядзенні ім розных мерапрыемстваў. Дзіцячыя калектывы гарадскога аддзела СПБ рэгулярна прымалі ўдзел у агульнапольскіх фестывалях у Лодзі, Беластоку, Варшаве.

На тэрыторыі Гомельскай вобласці жыло больш за 3300 асоб цыганскай нацыянальнасці. У асноўным у Жыткавіцкім, Петрыкаўскім, Светлагорскім, Жлобінскім, Гомельскім, Рэчыцкім раёнах і горадзе Гомеле.

У снежні 2004 г. адбылася сустрэча Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь з дырэктарам бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ К.Штрохалам. На сустрэчы прысутнічаў дарадчык АБСЕ па пытаннях цыган М.Георге, які заявіў, што ў Беларусі склалася "драматычная сітуацыя з становішчам цыганскага насельніцтва", асабліва ў Гомельскай вобласці.

Абласныя ўлады адразу наладзілі канструктыўны дыялог з актывістамі цыганскага руху, каб вырашыць шэраг надзённых пытанняў, якія закраналі інтарэсы цыган вобласці. У пачатку 2005 г. быў зарэгістраваны статут грамадскага аб'яднання "Гомельская міжраённная ромская абшчына" (цыганы).

Савет па справах рэлігій і нацыянальнасцей аблвыканкома сумесна з Гомельскай міжраённай ромскай абшчынай распрацаваў прыкладны пералік пытанняў для разгляду на пасяджэннях гарадскіх і райвыканкомаў, дзе пражывалі асобы цыганскай нацыянальнасці. 11.10.2006 г. адбылася калегія Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, на якой падсумавалі вынікі вывучэння цыганскага пытання на абшарах Гомельскай вобласці [401].

Нешматлікасць і некампактнасць пражывання нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі Гомельшчыны абумоўлівала нязначны ўплыў на насельніцтва вобласці нацыянальных аб'яднанняў і памяншала верагоднасць узнікнення праблем у нацыянальных адносінах. Дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў у вобласці была сканцэнтравана толькі ў асобных гарадскіх пасяленнях. Яны нешматлікія, за выключэннем яўрэйскіх арганізацый.

На пачатак 2001 г. у ***Гродзенскай вобласці*** існавалі 18 нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў (зарэгістравана – 17) і 8 Дамоў палякаў. Актыўна дзейнічалі палякі, літоўцы, татары ў Іўе. У Гродна было 7

[401] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 137.

нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў: СПБ, рускіх, літоўцаў, татар, яўрэяў, украінцаў, немцаў [402].

Гродзеншчына – рэгіён, які вызначаецца багатай этнакан-фесіянальнай шматвобразнасцю. У міры і згодзе там жылі прадстаўнікі 87 нацыянальнасцей.

На 01.01.2005 г. на тэрыторыі Гродзенскай вобласці працавалі 64 зарэгістраваныя нацыянальныя грамадскія аб'яднанні (з іх 44 у структуры ГА "СПБ"), якія аб'ядноўвалі 17022 члены. Гэта: 44 аддзяленні ГА "СПБ" (14181 член); ГА літоўцаў "Гінтарас" (43), ГА літоўцаў "Гімтэне" (815), ГА літоўцаў "Рута" (100), ГА "Таварыства польскай культуры на Лідчыне" (250), Яўрэйскае рэгіянальнае мемарыяльна-культурнае грамадскае аб'яднанне (200), ГА "Яўрэйскі дабрачынны фонд "Нохум" (20), ГА "Польскі народны ансамбль песні і танца "Лехіці" (35), ГА літоўцаў "Тэвіне" (64), ГА "Рускае таварыства" (65), ГА "Ашмянская цыганская абшчына" (196), абласное аддзяленне Беларускага ГА "Русь" (27), культурна-асветніцкае аб'яднанне ўкраінцаў "Барвінак" (48), ГА яўрэйскай культуры імя Найдуса (50), ГА "Гродзенскі яўрэйскі абшчыны дом "Мінора" (20), грамадскае аб'яднанне татар (76), грамадскае аб'яднанне грузін (10), ГА "Абшчына беларускіх чувашаў" (15), ГА "Гервяцкая абшчына літоўцаў" (387), Міжнародная грамадская арганізацыя клуба "Гервячай" (398), рэгіянальнае грамадскае аб'яднанне армян "Мусалер" (22).

Аб высокім сацыяльным статусе асоб польскай нацыянальнысці на Гродзеншчыне сведчаць наступныя факты. У органах выканаўчай улады вобласці больш за 20 % складалі палякі. Больш за 30 % іх сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў.

Падчас выбараў у мясцовыя саветы дэпутатаў 24-га склікання дэпутатамі былі выбраны 687 прадстаўнікоў польскай нацыянальнай супольнасці (21,6 % ад агульнай колькасці дэпутатаў). У Савеце Рэспублікі (2008 г.) з 8 дэпутатаў, якія былі выбраны ад Гродзенскай вобласці, 2 – польскай нацыянальнасці [403].

На тэрыторыі вобласці функцыянавалі 4 грамадска-культурныя аб'яднанні польскай нацыянальнай супольнасці: ГА "Саюз палякаў на Беларусі" (СПБ), ГА "Польская мацер школьная", Гродзенскае ГА "Польскі народны ансамбль песні і танцаў "Лехіці", ГА "Таварыства польскай культуры на Лідчыне". Асноўнымі мэтамі іх дзейнасці з'яўлялася нацыянальнае адраджэнне, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, адраджэнне і развіццё польскай культуры і прапаганда польскай мовы.

ГА "СПБ" – гэта самае шматлікае нацыянальна-культурнае аб'яднанне ў Гродзенскай вобласці . У 13 з 17 раёнаў і ў г. Гродна былі

---

[402] Ліст Упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Гродзенскай вобласці". 31.01.2001 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 76–77.

[403] Тусевич Е. Живём без оглядки на национальность. С. 6.

створаны раённыя (гарадскія) арганізацыі ГА "СПБ", акрамя таго, зарэгістраваны і пастаўлены на ўлік 25 першасных арганізацый саюза. На тэрыторыі вобласці дзейнічалі 7 Дамоў паляка (у г. Гродна, Лідзе, Навагрудку, Шчучыне, Ваўкавыску, у г.п. Поразава Свіслацкага раёна, в. Камялішкі Астравецкага раёна). У Гродзенскай вобласці актыўна і творча дзейнічалі 39 польскіх калектываў мастацкай самадзейнасці. Шасці з іх было прысвоена званне  народны і ўзорны.

На працягу шмат год у вобласці праводзіліся штогадовыя міжнародныя канферэнцыі "Шлях да ўзаемнасці", фестывалі "Беласток-Гродна", "Гродна-Беласток", адным з арганізатараў якіх, побач з Гродзенскім аблвыканкомам і іншымі дзяржаўнымі ўстановамі, з'яўлялася ГА "СПБ". Прычым неабходна адзначыць, што ініцыятыва правядзення мерапрыемстваў зыходзіла "знізу", а не ад органаў дзяржаўнай улады, якія ўвесь час, з моманту ўзнікнення ініцыятывы, найперш патрабавалі пісьмовыя заявы і тлумачэнні аб яе неабходнасці, а не як зафіксаванае ў заканадаўстве права на нацыянальную самарэалізацыю ва ўсіх сферах жыцця.

У пачатку 2010 г. у вобласці функцыянавалі 20 нацыянальна-культурных аб'яднанняў 8 нацыянальных супольнасцей, сярод якіх 4 польскія аб'яднанні ("Саюз палякаў на Беларусі", "Польска Мацеж Школьна на Беларусі", "Таварыства польскай культуры на Лідчыне", "Польскі народны ансамбль песні і танца "Лехіці"); 6 літоўскіх (Гродзенскае аб'яднанне "Тэвіне", Лідскае "Рута", Радунское "Гінтарас", Пеляскае "Гіміне", "Гервяцкае аб'яднанне літоўцаў", Міжнародны клуб "Гервячай"); 4 яўрэйскія (Гродзенскі дабрачынны фонд "Нахум", Гродзенскае аб'яднанне яўрэйскай культуры ім. Найдуса, Гродзенскае мемарыяльнае аб'яднанне "Еруша", Гродзенскі яўрэйскі супольны дом "Менора"); а таксама Украінскае аб'яднанне "Барвінак", "Рускае таварыства", аб'яднанне татараў горада Гродна, Гродзенскія грамадскія аб'яднанні грузінаў, чувашоў, цыган і армян [404]. Этнанацыянальныя аб'яднанні Гродзеншчыны ажыццяўлялі культурна-асветніцкія праграмы, прымаючы ўдзел у фестывалях, канцэртах, святах, якія праходзілі не толькі ў вобласці ці рэспубліцы, але і за мяжой.

Нацыянальныя аб'яднанні прыкладалі свае намаганні для падтрымання ўмоў нацыянальнага самавыражэння, задавальнення памкненняў да пазнання і захавання сваёй культуры, гісторыі, мовы, звычаяў, традыцый. Мастацкія калектывы нацыянальных аб'яднанняў прымалі ўдзел у культурна-масавых мерапрыемствах, якія арганізоўваліся і дзяржаўнымі структурамі. У адказ бясплатна прадстаўляліся памяшканні ГДК, РДК, клубаў для правядзення мерапрыемстваў нацыянальных ГА, а таксама апаратура, транспарт і г.д.

---

[404] Боярчук Т.Н. Этнонациональная и поликонфессиональная ситуация современной Гродненщины // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. С. 148–152.

На Гродзеншчыне полікультурнасць была ўласціва толькі вялікім населеным пунктам: Гродна Лідзе, дзе дзейнічала адразу некалькі этнакультурных суполак [405]. Актыўнае нацыянальна-культурнае жыццё адзначалася ў Гродна, Лідзе, Ваўкавыску.

Асяродкі польскай культуры меліся амаль ва ўсіх гарадскіх паселішчах Гродзеншчыны. Польскімі этнакультурнымі аб'яднаннямі праводзіліся маштабныя культурныя мерапрыемствы, у якіх прымалі ўдзел не толькі польскія, але беларускія і літоўскія мастацкія калектывы. Асяродкі літоўскай культуры былі створаны ў месцах кампактнага пражывання літоўскай этнічнай групы – вёска Пелясы Воранаўскага і в. Рымдзюны Астравецкага раёна.

Варта адзначыць наступнае. Нават у Заходнім рэгіёне Беларусі, дзе маюцца адміністратыўныя раёны з кампактным пражываннем нацыянальных супольнасцей напрыканцы XX пачатку XXI стст. этнакультурныя асяродкі былі створаны і функцыянавалі ў асноўным у гарадскіх паселішчах.

На пачатак 2001 г. у ***Магілёўскай вобласці*** налічвалася 10 нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў (Магілёў, Бабруйск). У Магілёве пры Цэнтры культуры і вольнага часу ў 1990-я гг. дзейнічала культурна-асветнае аб'яднанне беларусаў (адзінкавы выпадак у абласных справаздачах пра аб'яднанні беларусаў) [406].

У 2005 г. на тэрыторыі вобласці былі зарэгістраваны і працавалі 17 грамадскіх арганізацый, якія былі утвораны прадстаўнікамі 8 нацыянальнасцей: Грамадскае аб'яднанне азербайджанцаў "Хазар" (Магілёў), Магілёўскае абласное грамадскае аб'яднанне "Азербайджанскае таварыства "Азеры" (з 2006 г.), Азербайджанскае таварыства гісторыі і культуры (Бабруйск), Грамадскае аб'яднанне армян "Масіс" (Магілёў), Міжнароднае грамадскае аб'яднанне армян "Урарту" (Бабруйск), ГА "Магілёўская яўрэйская абшчына", Магілёўская гарадская яўрэйская нядзельная школа, Магілёўскі гарадскі дабрачынны цэнтр "Хэсэд Барух", ГА "Бабруйская гарадская яўрэйская абшчына", Гарадское яўрэйскае аб'яднанне "Рахамім" (Бабруйск), ГА яўрэйскай культуры "Тхія" (Бабруйск), Нямецкая абшчына "Цэнтр нямецкай культуры" (Бабруйск), Магілёўскае і Бабруйскае аддзяленні ГА "СПБ", Магілёўскае гарадское аддзяленне РГА "Рускае таварыства" , Бабруйскае аб'яднанне рускай культуры "Русь", Культурна-

---

[405] Макрушыч А.М. Складванне этнакультурных асяродкаў на Гродзеншчыне ў канцы XX – пачатку XXI стст. // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. Гродно, 2012. С. 300.

[406] Ліст Упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама "Аб дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Магілёўскай вобласці". 1.02.2001 г. // НАРБ. Фонд 974. Воп. 4. Спр. 473. Арк. 87–88

асветніцкае ГТ украінцаў “Дніпро” (Магілёў), Магілёўскае гарадское грамадскае аб’яднанне “Грузінская абшчына Іберыя” [407].

На 01.01.2010 г. на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў Магілёве і Бабруйску дзейнічалі 16 грамадскіх аб’яднанняў 7 нацыянальных супольнасцей: 2 азербайджанскія, 2 армянскія, 1 грузінскае, 5 яўрэйскіх, 2 польскія, 2 рускія (ГА “Рускае таварыства”, ГА “Рускі дом”), 2 украінскія (“Дніпро” Магілёў, “Славуціч” Бабруйск) [408]. Падрабязна дзейнасць нацыянальных грамадскіх арганізацый у Магілёўскай вобласці раскрыта ў адпаведным раздзеле манаграфіі “Гражданское общество и государство (очерки теории и практики взаимодействия). Могилев: МГУП, 2014” [409].

Грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей на тэрыторыі ***Мінскай вобласці*** праяўлялася не ва ўсіх раёнах. Так, у Старадарожскім, Любанскім, Маладзечанскім, Мядзельскім, Салігорскім, Крупскім, Лагойскім, Чэрвенскім, Смалевіцкім, Копыльскім, Слуцкім, Уздзенскім, Жодзінскім, Пухавіцкім і г. Заслаўле не дзейнічалі зарэгістраваныя нацыянальна-культурныя аб’яднанні нацыянальных супольнасцей.

Прывядзем прыклады дзейнасці НГА у некаторых раёнах [410]. У г. Барысаве былі зарэгістраваны і дзейнічалі гарадскі аддзел ГА “СПБ” і яўрэйскае ГА “Святло Меноры”. Неабходна адзначыць, што ў іх склад уваходзіла таксама частка жыхароў Барысаўскага раёна.

ГА “Асветніцкае таварыства яўрэйскай гісторыі і культуры “Святло Меноры” аб’ядноўвала каля 940 чалавек. Яго дзейнасцю былі ахоплены Барысаў, Жодзіна, Крупкі, Халапенічы. Іўрыт вывучалі даролслыя ў “ульпане” (гуртке) і дзеці ў нядзельнай школе пры СШ № 18. Пры аб’яднанні: існаваў маладзёжны клуб “Дарога надзеі”, былі арганізаваны 2 групы па вывучэнню англійскай мовы, гурток “Юны праграміст”, дзейнічаў дабрачынны цэнтр “Хэсэд Эмуна” на ўліку ў якім значылася 382 асобы, якія рэгулярна атрымоўвалі харчовую дапамогу. Некалькі дзесяткаў чалавек абслугоўваліся па праграме “дагляд на даму”. Цэнтр арганізаваў і правёў розныя мерапрыемствы.

“Дом польскі” ў Барысаве быў адкрыты 05.10.2002 г. У ім былі размешчаны: бібліятэка польскай літаратуры, класы для вывучэння польскай мовы, памяшканне для правядзення культурных мерапрыемстваў. У СШ № 20 меліся калектыў спеваў і танцаў, тэатральны,

---

[407] Гадавая справаздача савета // Бягучы архіў савета па справах рэлігій і нацыянальнасцей Магілёўскага аблвыканкама ; Пушкін І.А. Гістарычная і культурная спадчына горада Магілёва: Курс лекцый. Магілёў, 2006. С. 140–144.

[408] Межнациональные отношения // Пути повышения эффективности идеологической работы в современных условиях: стиль, формы и методы. Ч. 2. С. 62–63.

[409] Пушкін І.А. Уплыў грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей на станаўленне грамадзянскай супольнасці ў 1990–2012 гг. (на прыкладзе Магілёўскай вобласці) // Гражданское общество и государство (очерки теории и практики взаимодействия). Могилев, 2014. С. 213–231.

[410] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 160–164.

якія ставілі спектаклі (у тым ліку на польскай мове), праводзілі канцэрты, на якіх прадстаўлялася польская культура.

У Бярэзінскім раёне (Калодзішчыцкі вайсковы гарадок) на базе Калодзішчанскай вясковай бібліятэкі № 2 праводзіла працу культурна-грамадская арганізацыя ўкраінак "Обрый" (Гарызонт), у яе склад уваходзілі жанчыны ўкраінскага паходжання. Па інфармацыі райвыканкама, іх дзейнасць займала значнае месца ў грамадскім, духоўным і культурным жыцці раёна.

Значную культурна-асветніцкую працу праводзіў раённы адзел ГА "СПБ" у Валожынскім раёне. Ён меў 5 сваіх аддзяленняў і аб'ядноўваў каля 500 асоб. У 2003 годзе ў г.п. Івянец быў адкрыты "Польскі дом". Найбольш актыўна паводзілі сябе члены Вішнявецкага аддзялення Валожынскага раённага аддзела ГА "СПБ". Была добра вядома у наваколлі і за яе межамі дзіцячая група "Вішнявецкія шпакі". У Сівіцкім аддзяленні існаваў дзіцячы ансамбль "Польскія кветы", у мясцовай школе (кабінеце замежных моў) выпускалася насценная газета "Язык польскі".

Плённа працаваў у Клецкім раёне аддзел ГА "СПБ". Быў арганізаваны і дзейнічаў ансамбль польскіх спеваў і танцаў "Крынічанька" і маладзёжная вакальна-інструментальная група "Надзея".

Значная колькасць грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей была зарэгістравана і дзейнічала ў горадзе Маладзечна: мясцовы аддзел ГА "СПБ", "Маладзечанскае яўрэйскае таварыства", ГА "Рускае таварыства", Беларускае ГА грэкаў "Пелапанэс", украінскае культурна-асветніцкае аб'яднанне "Краяны". Намаганнямі гэтых нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў была праведзена вялікая колькасць культурных мерапрыемстваў, канцэртаў, быў арганізаваны адпачынак і аздараўленне дзяцей у Польшчы, Грэцыі. Добра вядомы сваімі спевамі далёка за межамі раёна ансамбль польскай песні "Ютшанка" (Ранішні світанак), украінскі гурт "Краяны".

Дзякуючы намаганням літоўскай дыяспары ў 2003 г. у Маладзечна быў выдадзены зборнік "Літоўская паэзія", які стаў значнай падзеяй у літоўска-беларускіх культурных дачыненнях [411].

У Нясвіжскім раёне праводзілі працу: раённы аддзел ГА "СПБ" і Сноўскі вясковы аддзел ГА "СПБ". З 1993 г. дзейнічаў дзіцячы ансамбль спеваў і танцаў "Нясвіжанка". У Рубяжэвічах Стаўпцоўскага раёна дзейнічаў польскі "Тэатр польскага акцёра", праводзілася добраўладкаванне ўстановы "Дом польскі". У горадзе Слуцку з 1996 г. дзейнічала нацыянальна-культурнае аб'яднанне "Памятай", якое ставіла перад сабою мэту вывучэння культуры яўрэйскага народа, арганізацыі вольнага часу і дабрачыннай дапамогі яўрэйскаму насельніцтву горада. Аб'яднанне

[411] Ціхаміраў А. Беларуска–літоўскія ўзаемаадносіны ў 1991–2006 гг. С. 10.

ўваходзіла ў склад Беларускага аб'яднання яўрэйскіх арганізацый і абшчын.

Варта прывесці словы з афіцыйнай справаздачы Маладзечанскіх уладаў (2003 г.), якія цалкам адпавядаюць стану грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных супольнасцей у розных рэгіёнах Рэспублікі Беларусь: "...Належыць адзначыць, што паміж грэчаскім, рускім, польскім, украінскім і яўрэйскім нацыянальна-культурнымі аб'яднаннямі існуе шчыльная ўзаемасувязь і іншае супрацоўніцтва, якое ўзбагачае розныя культуры.
Кожнае нацыянальна-культурнае аб'яднанне мае трывалыя сувязі з краінай паходжання… Дзейнасць аб'яднанняў вельмі шматвобразна. Асаблівай адметнасцю іх з'яўляецца шчыльнае гарманічнае яднанне з беларускай нацынальнай культурай" [412].

**Высновы.** Аналіз дзейнасці грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей на рэспубліканскім і рэгіянальным узроўне засведчыў, што ў Рэспубліцы Беларусь дзяржава рэгулявала адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў, інтарэсаў.

Асаблівасцю культурна-асветніцкага і грамадска-палітычнага жыцця нацыянальных супольнасцей было вылучэнне трох этапаў. 1) 1991–1995 гг. час ідэнтыфікацыі і актывізацыя дзейнасці. Праводзілася палітыка неўмяшальніцтва ў дзейнасць грамадскіх нацыянальна-культурных арганізацый. Асноўная ўвага дзяржаўных органаў была накіравана на развіццё адукацыі нацыянальных супольнасцей на іх родных мовах. На піке беларусізацыі значна ўзрасла колькасць школ, дзе вывучалася мова нацыянальных супольнасцей. Пастпова фарміраваліся элементы грамадзянскай супольнасці і актывісцкага тыпу палітычнай культуры насельніцтва, арыентаванай на рынак і канкурэнтную барацьбу. 2) 1996–2000 гг. – заканадаўчае рэгуліраванне і паступовае згортванне ініцыятыў. Нацыянальная палітыка была накіравана на вырашэнне праблем забеспячэння правоў нацыянальных супольнасцей і задавальнення этнакультурных запытаў насельніцтва. З 1999 г. назіралася памяншэнне актыўнасці з боку як асобных прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, так і НГА. 3) з пачатку 2000-х гадоў перыяд рэгламенціраванага кантролю з боку дзяржаўных выканаўчых органаў, дзейнасць толькі ў рэчышчы ўзгодненых і дазволеных мерапрыемстваў. Пераважае падтрымка інтэрнацыянальнага і выкарыстоўванне праграмных метадаў працы. Заўважаецца рэзкае звужэнне функцыянавання беларускай мовы і моў нацыянальных супольнасцей на карысць рускай.

[412] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 162–163.

Грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцей рэалізоўвалі культурна-асветніцкія, інфармацыйныя, дабрачынныя і адукацыйныя праграмы, у тым ліку і пры падтрымцы рэспубліканскіх, абласных, раённых і гарадскіх уладаў. Дзейнасць усіх нацыянальных фарміраванняў была ў асноўным у культурна-асветніцкім кірунку. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць творчых і мастацкіх самадзейных калектываў, якія былі створаны і дзейнічалі пры нацыянальных аб'яднаннях і дзяржаўных установах культуры. Таму такімі масавымі, яскравымі і разнастайнымі былі фестывалі нацыянальных культур. Неабходна адзначыць, што ў пэўных рэгіёнах жаданне паказаць культуру нацыянальных супольнасцей, якія пражывалі на іх тэрыторыі, прыводзіла да таго, што зусім не было бачна беларускай. Сітуацыя стала выпраўляцца ў апошнія два-тры гады.

Некаторае памяншэнне актыўнасці з боку, як асобных прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, так і нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў было выклікана, па-першае, некаторымі абмежаваннямі з боку ўлад у сферы стварэння палітычных партый і грамадскіх арганізацый і іх дзейнасці ў грамадска-палітычным жыцці, а, па-другое, агульным становішчам, калі паменшыліся магчымасці рэальных змен шляхам грамадзянскіх ініцыятыў.

На правядзенне культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў нацыянальных аб'яднанняў мэтавым парадкам на конкурснай аснове выдаткоўваліся сродкі з агульнадзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў. З мясцовых бюджэтаў фінансавалася развіццё самадзейнага мастацтва, даціравалася дзейнасць устаноў культуры, якія былі створаны нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі.

Найбольш актыўнымі з'яўляліся яўрэйскія і польскія грамадскія фарміраванні. Акрамя ўзгаданых, у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях таксама значную актыўнасць праяўлялі ўкраінскія, татарскія і літоўскія. У Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай адзначаецца значная дзейнасць латышскіх, рускіх, украінскіх, армянскіх і азербайджанскіх грамадскіх арганізацый. Узровень актыўнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый на ўсходзе быў ніжэй, чым у іншых рэгіёнах Беларусі.

Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці нацыянальных супольнасцей былі дабрачынная, асветніцкая і культурная. Характэрным для любога яўрэйскага культурна-асветніцкага аб'яднання Беларусі было арганізоўваць працу сярод сваіх суайчыннікаў па інтарэсах і ўзроставых (палавых) адзнаках. Асобныя лідары і актывісты яўрэйскага руху, шляхам стварэння вялікай колькасці рознага роду аб'яднанняў і клубаў, імкнуліся забяспечыць яўрэйскую прысутнасць у рэгіёнах і краіне.

Прадстаўнікі большасці нацыянальных супольнасцей пражывалі па ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у асноўным у буйных гарадах і гарадскіх пасяленнях, займалі высокія статусныя пазіцыі у сацыяльнай

структуры, эканоміцы, палітыцы і культуры беларускага грамадства (за выключэннем некаторых, напрыклад, цыган).

Некампактнасць пражывання нацыянальных супольнасцей ва ўсходняй частцы Беларусі абумоўлівала нязначны ўплыў на насельніцтва гэтага рэгіёна НГА і памяншала верагоднасць узнікнення праблем у нацыянальных адносінах.

Дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў была сканцэнтравана пераважна ў гарадскіх паселішчах. Яны былі нешматлікія па колькасці зарэгістраваных членаў аб’яднання (за выключэннем СПБ і шэрагу яўрэйскіх арганізацый).

Наогул насельніцтва краіны ў пераважнай большасці не было знаёма з дзейнасцю грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі і ўважала за сферу іх інтарэсаў і дзейнасці толькі культурна-асветніцкую працу.

Грамадскія арганізацыі не змаглі цалкам пазбавіцца ад жорсткай апекі з боку дзяржавы. Існуючы фактычны матэрыял, які даступны даследчыку, дазваляе казаць аб тым, што НГА не заўжды мелі магчымасць аказваць дастатковы ўціск на дзяржаўную ўладу для прыняцця рашэнняў па эфектыўнай рэалізацыі сваіх праў. Актыўная грамадская дзейнасць НГА, за выключэннем культурнай сферы, рашуча перарывалася органамі дзяржаўнага кіравання. Механізм пастаяннага ўзаемадзеяння, сацыяльнага партнёрства з імі фактычна не быў створаны. Гэта замінала магчымасцям рэальнага ўдзелу грамадскіх арганізацый у грамадска-палітычным жыцці нашай дзяржавы.

Фактаў сур’ёзных парушэнняў заканадаўства з боку нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў не было зафіксавана. Не адзначалася і актыўная далучанасць грамадскіх аб’яднанняў у палітычную дзейнасць.

Эфектыўная грамадска-палітычная, культурна-асветніцкая дзейнасць і самарэалізацыя нацыянальных супольнасцей, іх высокі сацыяльна-прававы статус у Беларусі забяспечвалі адну з галоўных умоў – заахвочванне рэгіянальных і нацыянальна-культурных аб’яднанняў, падтрымку нацыянальных культур і традыцый, якая неабходна для працякання натуральных працэсаў сацыяльных змен у нашай краіне.

### 1.7 Праблемы ў сферы міжнацыянальных адносін

У навейшай гісторыі Беларусі ўдалося пазбегнуць міжнацыянальных канфліктаў у шмат чым, дзякуючы своеасабліваму менталітэту насельніцтва. Разам з тым, нельга казаць, што ў нацыянальных узаемаадносінах Беларусі не існуе праблем і супярэчнасцей. Сярод іх мы вылучаем праблемы ў сферы супрацоўніцтва ўладных структур і аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей, а таксама ў сферы міжнацыянальных адносін.

У пэўных сітуацыях з боку дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь заўважаліся факты неаднолькавых адносін да некаторых грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей, асабліва калі тыя прымалі рашэнні, якія мелі шырокі грамадскі розгалас (удзел у выбарах, пабудова нацыянальных школ, статус ветэранаў АК і г.д.). Лідары нацыянальных грамадскіх арганізацый адстойвалі сваё права на самастойнае прыняцце рашэнняў. Так, калі на пасяджэнні Камісіі Вярхоўнага Савета па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах пры абмеркаванні пытання аб задавальненні грамадска-палітычных і культурных патрэб нацыянальных супольнасцей было адзначана, што некаторыя грамадскія аб’яднанні сталі займацца палітычнай дзейнасцю, у адказ з боку прадстаўнікоў украінскага і татарскага аб’яднанняў прагучала: “калі мы падпісваем нешта са згоды ўладаў – гэта добра, а калі падпісваем нешта іншае – гэта палітыка і парушэнне статута” [413].

Гэта праявілася і пры фінансаванні выданняў СМІ. З сакавіка 1994 г. па 1999 г. газета палякаў ”Głos znad Niemna” фінансавалася са сродкаў дзяржаўнага бюджэту. У сакавіку 1999 г. прагучала крытыка Дзяржкамітэта ў бок рэдакцыі газеты. Гэта тычылася таго, што друкуюцца матэрыялы ў якіх асвятляецца пэўная дзейнасць старшыні ГА “СПБ” Т. Гавіна. У прыватнасці, яго заклікі да правядзення несанкцыяніраваных пікетаў перад будынкам Гродзенскага аблвыканкама, арганізацыя і правядзенне 20.11.1998 г. саюзам недазволенага пікеціравання будынка Навагрудскага РВК (патрабавалі забеспячыць дзяцей і іх бацькоў правам вучыцца на роднай – польскай мове), удзел кіраўніцтва ГА “СПБ” у палітычных акцыях – мерапрыемствах незарэгістраванага аб’яднання “Хартыя 97”, “кангрэсе дэмакратычных сіл” і г.д. На нашу думку, менавіта з-за непаразумення з уладамі падчас падзеяў 1999 г., у снежні 2000 г. Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па друку паведаміў, што няма магчымасці аднавіць фінансаванне выдання газеты “Głos znad Niemna” і часопіса “Magazyn Polski”.

З-за фінансавых праблем у 2002 г. было прыпынена выданне штоквартальніка “Байрам ”. Хаця па выніках Рэспубліканскага творчага конкурсу (1999 г.), які быў прысвечаны нацыянальнай палітыцы і арганізаваны Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігіі і нацыянальнасцей і Дзяржаўным камітэтам па друку, часопіс атрымаў другую прэмію [414].

У сакавіку 2004 г. у Міністэрстве інфармацыі і Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь не знайшла падтрымку ідэя аб стварэнні на Першым Нацыянальным тэлеканале штотыднёвай аўтарскай праграмы аб дзейнасці нацыянальных супольнасцей Беларусі.

Складанасці ва ўзаемаадносінах польскага насельніцтва з органамі дзяржаўнай улады не абмяжоўваліся толькі праблемамі з выданнем газеты.

---

[413] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Фонд 968. Воп. 1. Спр. 4092. Арк.106–111.

[414] Орда О.А. Роль СМИ в возрождении культуры татар Беларуси. С. 424-425.

Да іх варта аднесці адмову ўладамі СПБ у пабудове ў Воранаўскім раёне школы з польскай мовай навучання за ўласныя сродкі, накладанне ў 2002 г. падатку на гуманітарную дапамогу, якую атрымліваў СПБ на адукацыйныя патрэбы і г.д.[415]

На правядзенне нацыянальна-канфесійнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь пэўны ўплыў аказвалі і знешнепалітычныя фактары. Пасля 1996 г. адбылося пагаршэнне адносінаў на міждзяржаўным узроўні паміж Рэспублікай Польшчай і Рэспублікай Беларусь. На гэта паўплывалі: 1) ідэя стварэння “польского коридора” з Гродна ў Калінінград – выклікала адмоўную рэакцыю ў Польшчы; 2) значная частка палітычнай апазіцыі з Беларусі знайшла прытулак ў Польшчы; 3) дэпартацыя з Беларусі дэлегацыі прафсаюза “Салідарнасць” у маі 1996 г.; 4) заявы дзяржаўнага кіраўніцтва Беларусі аб стварэнні на тэрыторыі Польшчы антыбеларускіх структур; 5) у 1998 г. у вобразе ворага была прадстаўлена Польшча пад час візіту у Беларусь міністра замежных спраў Польшчы Геремека як старшыні місіі АБСЕ, яго візіт суправаджаўся артыкуламі ў дзяржаўных СМІ аб тым, што Польшча на працягу ўсёй гісторыі рабіла для Беларусі толькі адны “пакости” і г.д. [416]

Паўплывала на адносіны ўладаў да польскай супольнасці ў Беларусі і разыходжанне геапалітычных інтарэсаў дзвюх дзяржаў [417]. Ідэалагічнай асновай аб’яднання ўсіх славян беларускія ўлады лічылі праваслаўную рэлігію. Таму беларускіх католікаў і палякаў кіраўніцтва дзяржавы лічыла палітычна нелаяльнымі, носьбітамі асноў заходняй цывілізацыі, якія “чужды” большасці беларускага народа. Сярод часткі насельніцтва існавала ўстойлівае меркаванне аб тым, што ўсе прыхільнікі заходняй, ліберальна-рыначнай мадэлі развіцця, умацавання незалежнасці з’яўляюцца палякамі (С. Шушкевіч, З. Пазьняк, С. Багданкевіч, А. Дабравольскі і інш.). Вялася кампанія супраць дзейнасці ксяндзоў.

Пасля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. беларускія ўлады спрабавалі выкарыстаць СПБ для пераадолення крызіса ў знешнепалітычных стасунках з еўрапейскімі краінамі, што справакавала раскол у самай буйнай арганізацыі польскай супольнасці ў Беларусі [418].

Зноў абвастрыліся непаразуменні паміж часткай польскай супольнасці і беларускімі ўладамі пасля таго, як 07.09.2007 г. парламент Рэспублікі Польшча прыняў закон “Аб карце паляка”, які пачаў дзейнічаць 31.03.2008 г. Карта пацвярджала прыналежнасць этнічных палякаў, якія жывуць у СНД і Прыбалтыцы, да польскага народа і давала ім ільготы ў

---

[415] Kruczkowski T. Polacy jako mniejszośc narodowa na Białorusi – warunki egzystencji I perspektywy / T. Kruczkowski // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. С. 132.
[416] Национально-государственные интересы Республики Беларусь. С. 224–225.
[417] Часноўскі М. Беларуска-польскія адносіны ў 1996–1999 гг. С. 16–21.
[418] Gawin T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. S. 331, 342–410.

афармленні віз пры наведванні Польшчы, гарантавала падтрымку пры вядзенні бізнэсу, працаўладкаванні і паступленні на вучобу ў Польшчы.

Улады Беларусі неаднаразова крытыкавалі практыку распаўсюджвання “карты паляка”, абвінавачваючы Польшчу ў парушэнні міжнароднага права.

23.02.2011 г. Палата прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь пастанавіла звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд, каб вызначыць, ці адпавядае польскі закон “Аб карце паляка” агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права. Старшыня Палаты прадстаўнікоў У. Андрэйчанка, заявіў, што “гэтая праблема (польскі закон “Аб карце паляка”) закранае цэлы шэраг напрамкаў беларуска-польскага ўзаемадзеяння. У закон Рэспублікі Польшчы “Аб карце паляка” былі закладзены палажэнні, якія супярэчаць міжнародным нормам і не адпавядаюць прынцыпам добрасуседства”. Паводле інфармацыі, якая прагучала ў Палаце прадстаўнікоў, карту паляка на пачатак 2011 г. у Беларусі мелі больш за 14,5 тысяч чалавек.

31.03.2011 г. Канстытуцыйны суд Беларусі пачаў высвятляць, ці адпавядае закон Рэспублікі Польшча “Аб карце паляка” міжнароднаму праву. Упершыню ў сваёй дзейнасці Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь выказваў сваю пазыцыю наконт дакумента, прынятага замежнай дзяржавай. 07.04.2011 г. Канстытуцыйны суд Беларусі вырашыў, што польскі закон “Аб карце паляка” не адпавядае міжнароднаму праву [419].

Паводле дзеючых нарматыўных актаў, ці лепей казаць тлумачэнняў закадаўчых актаў, веруючы чалавек, які прысутнічаў на нейкай вечарыне ці мерапрыемстве быў абмежаваны ў сваім натуральным праве памаліцца (звярнуцца з падзякай да Бога) перад спажываннем ежы. Гэта магло быць неадназначна расцэнена. Любая малітва на мерапрыемствах, якія праводзілі нацыянальныя грамадскія аб’яднанні, на думку пэўных чыноўнікаў, не сумяшчальна з іх дзейнасцю, гэта прэрэгатыва рэлігіёзных абшчын. Такім чынам існавала забарона маліцца на мерапрыемствах (цалкам забяспечваліся толькі правы атэістаў). Гэта наглядна ілюструе гісторыя з “аплаткавым спатканнем”, якое было арганізавана ў 2003 г. мясцовым аддзелам ГА “СПБ” в. Забалацце Воранаўскага раёна. Ім было ўказана на недапушчальнасць малітвы на мерапрыемствах аб’яднання, але ж пераважная большасць палякаў Беларусі з’яўлялася каталікамі. Аб парушэннях дзеючага заканадаўства гаворылася і ў лісце Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей 06.03.2002 г. на імя ГА татар “Зікр уль Кітаб”: “У выніку вывучэння друкаванага органа Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Рэспубліцы Беларусь газеты “Жизнь” і некаторых

[419] Решение Конституционного Суда Республики Беларусь «О позиции Конституционного Суда Республики Беларусь по Закону Республики Польша «О Карте поляка» № П-258/2011 от 7 апреля 2011 г. // Конституционный Суд Республики Беларусь [Электронный ресурс] http://www.kc.gov.by/main.aspx?guid=23203. Дата доступа 25.10.2014 г.

іншых дакументаў Камітэтам засведчана прыналежнасць Беларускага грамадскага аб’яднання татар “Зікр іль Кітаб” да рэлігійнай дзейнасці, што супярэчыць заканадаўству” [420]. На падставе матэрыялаў той жа газеты падобны ліст накіраваны на імя дабрачыннага грамадскага аб’яднання “Мараль”.

Замкнутасць цыганскай культуры, выяўленае імкненне да самазахавання, свядомае абмежаванне доступу звонку, кланавасць, дуалізм маральнасці, аўтаномія асобы не раз выклікалі неразуменне ва ўлады і мясцовага насельніцтва.

У адносінах да цыганоў у Беларусі існаваў даволі вялікі ўзровень дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце. Паміж цыганамі і беларусамі ў цэлым вельмі добрыя адносіны. Але пэўныя дзяржаўныя СМІ і органы правааховы пры затрыманні злачынцаў, калі сярод іх былі цыганы абавязкова гэта падкрэслівалі. Тым самым ствараўся стэрэатып – “Хто гандлюе наркотыкамі? Адказ адзін – цыганы!” У той жа час, паводле нашага заканадаўства нельга падкрэсліваць нацыянальнасць парушальніка закона.

Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей у 2001 г. прыняў наступную заяву: “У матэрыялах, якія прадстаўляюцца прэс-службамі дзяржаўных органаў і інтэрв’ю пасадавых асоб, а менавіта Міністэрства ўнутраных спраў, маюць месца выказванні, якія садзейнічаюць фарміраванню негатыўных адносін да грамадзян цыганскай нацыянальнасці і могуць расцэньвацца як прыніжаючыя нацыянальныя пачуцці і годнасць грамадзян (меліся на ўвазе тагачасныя паведамленні МУС, апублікаваныя ў СМІ). Належыць адзначыць, што апублікаванне даных аб нацыянальнасці асоб, якія здзейснілі правапарушэнні, не адпавядаюць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і не садзейнічаюць падтрыманню яе міжнароднага аўтарытэту” [421].

Гэта не адзінкавыя выпадкі. У лютым 2003 г. у Ленінскім РАУС г. Бабруйска праводзіліся мерапрыемствы пастаноўкі на ўлік асоб крымінальнага кірунку, якія патрабавалі прафілактычнага ўдзеяння з боку органаў унутраных спраў. Аднак пры іх правядзенні былі дапушчаны грубыя парушэнні інструкцый, рэгламентуючых дадзеную працу, што прывяло да абгрунтаванага абурэння шэрагу грамадзян – прадстаўнікоў грамадскай асацыяцыі цыган. ГА “Беларуская цыганская дыяспара” звярнулася са скаргамі ва ўсе інстанцыі. Сутнасць мерапрыемстваў звялася да татальных абследаванняў усіх запар дамоў, дзе жылі цыгане. Ва ўпраўленні ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама было праведзена службовае разбіральніцтва. Начальнік УУС І. Сяргей паведаміў, што супрацоўнікі, якія дапусцілі парушэнне інструкцый былі прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

[420] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 48.
[421] Там жа. С. 168–169.

На вучэбна-метадычным зборы начальнікаў органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь 14.10.2003 г. было растлумачана, што нельга вылучаць нацыянальнасць пры агалошванні вынікаў злачыннай дзейнасці асоб. І як вынік, у чэрвені 2004 г. зноў інфармацыя МУС, што 50 % цыган прычасныя да гандлю наркотыкамі. Чарговыя лісты ГА ў Камітэт, а той – у МУС.

Падобнае адзначалася і пазней. Вясной 2005 г. БелаПАН (агенства навін) паведаміла наступнае: "Мужчина цыганской народности пытался откупиться, чтобы избежать уголовной ответственности за незаконный оборот наркотиков. В Могилёве задержали организатора преступной группы – 53-летнего мужчину цыганской народности... При расследовании уголовного дела задержаны лица цыганской народности, изъяты наркотики, документация по их производству и деньги..." [422]. У пачатку 2007 г., суд Ленінскага раёна Магілёва прысудзіў чатырох наркадзяльцоў з Магілёва і Гомеля да працяглых тэрмінаў пазбаўлення волі. Пра гэта паведамілі ў прэс-групе УКДБ Беларусі па Магілёўскай вобласці, падкрэсліўшы, што "как удалось установить в ходе оперативно-следственных мероприятий, все четверо – лица цыганской национальности" [423].

Недастаткова ўвагі звяртала дзяржава на праблемы працаўладкавання цыган і на стварэнне ўмоў для навучання на цыганскай мове. Не знайшла падтрымкі з боку беларускіх улад і ініцыятыва ГА "Беларуская цыганская дыяспара" аб правядзенні ў Мінску 10–14.10.2002 г. II Міжнароднага Ромскага дзіцячага фестывалю мастацтваў "Залатая падкова". 09.01.2003 г. у Мінскі гарвыканкам паступіў ліст ад ГА "Беларуская цыганская дыяспара" з просьбай выдзяліць месца пад міні–рынак для цыган, які будзе пабудаваны за кошт дыяспары. Гэта рабілася з мэтай вырашэння эканамічных пытанняў і працаўладкавання цыганскага насельніцтва горада. Аб'яднанне атрымала адмову і яму было прапанавана ўдзельнічаць у конкурсе праектаў на агульных умовах [424].

"Пытанняў па цыганах", якія трэба выносіць на ўрадавы ўзровень, не існуе, заявіў 2.12.2009 г. падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Л. Гуляка. Па яго словах, пасля правядзення адной з міжнародных канферэнцый па цыганскай тэматыцы прадстаўнікам цыганскай абшчыны было прапанавана сфармуляваць актуальныя пытанні жыцця іх супольнасці для разгляду ва ўрадзе і прыняцця адпаведнай пастановы. Як адзначыў Гуляка, сустрэчы з кіраўніцтвам цыганскіх нацыянальна-культурных аб'яднанняў не дазволілі "выйсці" на такі дакумент. Упаўнаважаны адзначыў, што, па

[422] Наркодилер предложил сотруднику КГБ 50 000 долларов // http://gorad.by/by/page/accident/3068. Дата доступа 28.05.2012 г.; http://news.tut.by/society/291440.html. Дата доступа 28.05.2012 г.
[423] Наркодельцы наказаны // http://www.mycity.by/content/view/124/11/. Дата доступа 28.05.2012 г.
[424] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 107–108.

даных перапісу насельніцтва 1999 г., у Беларусі лічылі сябе цыганамі 9 927 чалавек, прычым больш 8 тыс. (80,7 %) пражывалі ў гарадах і гарадскіх мястэчках, 1,9 тыс. – у сельскай мясцовасці. Цыгане галоўным чынам вызнавалі праваслаўе і каталіцызм, актыўна займаліся захаваннем нацыянальных традыцый, культуры і мовы. Падчас перапісу 1999 г. 77 % цыган сваёй роднай мовай назвалі цыганскую. Статыстыка занятасці цыган насцярожвала. Згодна перапісу 1999 г., толькі 9,4 % ад агульнай колькасці цыган былі заняты афіцыйна. Але ў апошні час гэта тэндэнцыя змянялася да лепшага, як адзначыў Л. Гуляка. Па яго словах, пытанні занятасці цыган і навучання іх дзяцей у школах становяцца “трохі больш кіруемымі” дзякуючы супрацоўніцтву з дзяржавай пяці цыганскіх грамадскіх нацыянальна-культурных аб’яднанняў.

Кажучы пра цыган, варта адзначыць два моманты. Па-першае, недастатковая ўвага органаў дзяржаўнай улады да патрэб і запатрабаванняў цыганскай нацыянальнай супольнасці і забеспячэння належнага статуса грамадзянам ромскай нацыянальнасці. Па-другое, нежаданне саміх цыган прыкладаць шмат намаганняў для змянення свайго статуса, атрымання належнай адукацыі, актыўнага ўдзелу ў грамадскім і культурным жыцці дзяржавы.

Можна адзначыць паасобныя факты непаразуменняў з мясцовымі ўладамі. У в. Пелеса Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці дзейнічала школа, у якой вучыліся на роднай мове дзеці асоб літоўскай нацыянальнасці, якія жылі ў вёсцы і наваколлі. Школа, разам з спартыўнай пляцоўкаю, садам, трыма жылымі дамамі і гаспадарчымі пабудовамі, знаходзілася на зямлі (плошча ўчастка – 2,51 га), якая была выдзелена нацыянальна-культурнаму таварыству літоўцаў Воранаўскага раёна. Таварыства не займалася гаспадарчай дзейнасцю і не мела багата сродкаў, нават на ўплату падатку за зямлю. У 1997 г. Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей звярнуўся з хадайніцтвам у Воранаўскі райвыканкам аб вызваленні нацыянальна-культурнага таварыства літоўцаў Воранаўскага раёна ад уплаты падатку на зямлю, дзе знаходзілася школа і іншыя пабудовы. Воранаўскі райвыканкам на зварот Дзяржкамітэта прыняў рашэнне за № 651 ад 19.12.97 г. – “адмовіць”.

Пэўныя праблемы былі выкліканы і статусам нацыянальных аб’яднанняў у грамадстве Беларусі. На думку М. Несцяровіча “хоць грамадскія арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь пазбавіліся жорсткай апекі дзяржаўных органаў, механізм дакладнага і пастаяннага ўзаемадзеяння, сацыяльнага партнёрства з імі фактычна не быў створаны. Яго адсутнасць і сёння працягвае істотна зніжаць магчымасці рэальнага ўдзелу грамадскіх арганізацый у выпрацоўцы палітыкі краіны, кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі” [425].

---

[425] Несцяровіч М.Б. Узаемаадносіны дзяржаўнай улады і грамадскіх арганізацый у Беларусі (1917–2000 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2005. № 2. С. 58.

У перыяд 1990–2014 гг. у Рэспубліцы Беларусь заўважаліся праявы нацыянальнага экстрэмізму. Гэта дазваляе сцвярджаць аналіз пэўных падзей, а таксама праграмных дакументаў і выказванняў лідараў асобных, афіцыйна зарэгістраваных уладамі Беларусі, нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў.

Так, у 1990 г. у некалькіх раёнах Гродзенскай вобласці, асабліва Воранаўскім і Астравецкім, "праяўляўся прыкметны інтарэс экстрэмісцкі настроеных асоб з Літвы... Там мелі месца спробы распальвання нацыяналістычных настрояў сярод літоўцаў, выклікаць у іх незадавальненне ўмовамі жыцця ў БССР, імкненне далучыцца да Літоўскай ССР" [426]. У тым жа годзе, згодна інфармацыі пракуратуры БССР: "Польскай грамадкасцю, таксама вылучаліся прапановы аб адмове вывучэння беларускай мовы і літаратуры, выказвалася ідэя ўтварэння ў вобласці польскай аўтаноміі... Сярод палякаў, якія жылі ў рэспубліцы, укаранялася думка, што няма Польшчы без Гродна, Львова, Вільнюса" [427].

У другой палове 1990-х гг. у касцёлах Беларусі з'яўлялася дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Польшча. Былі выпадкі адкрытага закліку да веруючых мяняць грамадзянства з беларускага на польскае. Гэтая дзейнасць выклікала незадавальненне напачатку з боку беларускай нацыянальна-арыентаванай інтэлігенцыі, а пазней з боку ўрада Беларусі, які заявіў, што "ніякай антыбеларускай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь беларускі ўрад не дапусціць" [428]. Дзякуючы ўзважанай дзяржаўнай палітыцы і намаганням архібіскупа, кардынала К. Свёнтака ўдалося прыпыніць паланізатарскую дзейнасць касцёла на Беларусі.

З 1995 г. уплыў часткі рускай супольнасці (асабліва былых афіцэраў) ва ўладных структурах істотна ўзрос. З іх боку назіраўся супраціў беларускаму адраджэнню. Менавіта яны сталі актыўнымі генератарамі і праваднікамі перахода да панславізму як дзяржаўнай ідэалогіі. Гэта нават дала падставу пэўным палітыкам казаць аб нацыянальнай дыскрымінацыі беларусаў у Беларусі. Красамоўным з'яўляецца факт, што яшчэ ў другой палове 1990-х гг. грамадзяне Расіі ўзначальвалі МЗС Рэспублікі Беларусь і амбасаду Беларусі ў Расійскай Федэрацыі, былі намеснікамі старшыні КДБ. У Рэспубліцы Беларусь актыўна ствараліся і дзейнічалі мясцовыя філіялы расійскіх нацыянальных партый і рухаў: ЛДПР, "Яблоко", РНЕ, "Отечество", Славянскі сабор "Белая Русь". Некаторы час дзяржаўныя структуры належным чынам не рэагавалі на іх пэўныя экстрэмісцкія дзеянні. У той жа час, у жніўні 1999 г. пры падрыхтоўцы дакументаў да

---

[426] Інфармацыя // НАРБ. Фонд 4 п. Воп. 156. Спр. 612. Арк. 55–56.
[427] Інфармацыя пракуратуры БССР // Там жа. Спр. 775. Арк. 45–46.
[428] Национально-государственные интересы Республики Беларусь. С. 243.

перарэгістрацыі ўзніклі праблемы ў Міністэрстве юстыцыі ў ГА “Рускае таварыства” [429].

Нявырашанымі заставаліся праблемы, узнятыя яўрэйскімі грамадскімі аб’яднаннмі, якія негатыўна ўплывалі на працэс фарміравання грамадзянскай і нацыянальнай згоды: не ва ўсіх гарадах Беларусі яўрэям вярнулі рэлігійныя будынкі, не было ніводнай яўрэйскай агульнаадукацыйнай школы, не знайшлі асоб, якія апаганьвалі яўрэйскія пахаванні на могілках, газеты не апублікавалі прамовы кіраўніцтва рэспублікі падчас жалобы з нагоды 50-годдзя знішчэння Мінскага гета, адхіленне ў 1994 г. Фондам фундаментальных даследванняў Беларусі праекта па даследаванню нацысцкай палітыкі генацыда супраць яўрэйскага насельніцтва Беларусі ў 1941–1944 гг. як не асабліва важнага і актуальнага, падчас урачыстасцей 50-годдзя вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў не ўзгадалі аб удзеле яўрэяў у Вялікай Айчыннай вайне і г.д. [430] Пры гэтым адбываліся антысеміцкія праявы ў Беларусі: апаганьванне будынкаў сінагог, пэўныя выказванні ў СМІ і інш.

З аднаго боку, адпаведныя дзяржаўныя структуры адрэагавалі на падзеі, а з другога боку, ніхто не быў пакараны за гэта. Так у маі 1999 г. Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей звярнуўся з пратэстам у Дзяржкамдрук Беларусі наконт публікацыі ў газеце “Личность” 31.03. 1999 года № 5–6 інтэрв’ю з “кіраўнікам рэгіянальнай арганізацыі партыі РНЕ Г. Самойлавым”. У матэрыяле ўтрымліваліся выказванні, якія абражалі яўрэяў і іўдзеяў [431]. У першым паўгоддзі 2000 г. у продажу з’явілася кніга “Война по законам подлости” (Мінск: Выдавецтва ЗАТ “Православная инициатива”, 1999). Дзяржкамітэт асудзіў факт яе выдання, як не спрыяльны стабільнасці міжнацыянальных і міжканфесійных адносін і традыцый талерантнасці ў рэспубліцы. Справа аб кнізе дайшла да судовага разбіральніцтва. Суд парушэнняў закона па Арт. 71 УК РБ (парушэнне нацыянальнага і расавага раўнапраўя) не знайшоў складу злачынства. Кніга адкрытага антыяўрэйскага зместу па-ранейшаму была ў продажы. А 5 мая 2000 г. на першай паласе газеты “Вечерний Минск”, у выглядзе святочнага віншавання “Солдат победы, братьев и сестёр” з 55 гадавінай Перамогі, была апублікавана рэклама кнігі. Падарунак тым, хто змагаўся з гітлераўскім нацыянал-сацыялізмам, які ў прынцыпе прапагандаваў тыя ж ідэі, што і аўтары кнігі.

Дарэчы, у рэспубліцы неаднаразова адзначаліся факты антысемітызму ў выглядзе надпісаў абразлівага зместу і апаганення месцаў пахавання асоб яўрэйскай, польскай і татарскай нацыянальнасцей. З 21.06.

---

[429] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 72–74.

[430] Иоффе Э. Деятельность Белорусского объединения еврейских организаций и общин по укреплению национального согласия. С. 263–264.

[431] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 167.

па 14.07.2002 г. на могілках “Паўночныя” Мінскага раёна былі перакулены і часткова пашкоджаны 8 яўрэйскіх надмагілляў. На мусульманскіх могілках, размешчаных у Слонімскім раёне Гродзенскай вобласці ў гэты ж перыяд часу былі разламаныя 6 надмагілляў. 02.04.2003 г. быў здзейснены акт вандалізму на месцы пахавання польскіх салдат у г. Ваўкавыску – разбураныя 24 помніка-крыжа, сапсаваныя надпісы. У снежні 2010 г. невядомыя знішчылі ханукальны знак-свяцільню на месцы, дзе планавалася пабудаваць сінагогу. На працягу 1,5 гадоў міліцыя не магла знайсці злачынца. У 2011 г. у Бабруйску невядомыя змалявалі агароджу мясцовай сінагогі антысеміцкімі лозунгамі і разбілі шыбы ў вокнах. У Асіповічах на яўрэйскіх могілках апаганілі некалькі дзясяткаў надмагільных помнікаў. Падобнае адбылося на тэрыторыі Гомельскай вобласці: у Лоеве ў красавіку 2012 г. на гарадскіх яўрэйскіх могілках былі выяўленыя дзве разрытыя магілы, у 2011 г. у Рэчыцы на яўрэйскіх могілках пашкоджаны 14 пахаванняў і помнік ахвярам Халакоста, у 2010 г. у Гомелі на Прудкоўскіх яўрэйскіх могілках пашкодзілі 30 надмагільных помнікаў. 03.06.2012 г. у г. Магілёве невядомыя апаганілі Камень-мемарыял “В память о евреях Могилёва – жертвах нацизма”. Палова помніка была аблітая карычневай фарбай. Праваахоўныя органы Беларусі калі і ўзбуджалі крымінальныя справы, то толькі па факце хуліганства. Нават тады, калі пакідаўся надпіс “Смерть жидам”. Па форме гэта хуліганства, але па сутнасці – акт, які распальвае нацыянальную варожасць.

Праявы экстрэмізму заўважаліся і ў дзейнасці асобных грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі. Так, у сярэдзіне 1990-х гг. кіраўніцтва грамадскага аб’яднання “Прасвіта Берасцейшчыны” імя Т.Шаўчэнкі, Украінскага грамадска-культурнага аб’яднання Брэсцкай вобласці, рэдакцый газет “Берасцейскі край” і “Голас Берасцейшчыны” неаднаразова бяздоказна абвінавачвалі ў надрукаваных матэрыялах Рэспубліку Беларусь у прымусовай асіміляцыі і дыскрымінацыі ўкраінцаў, тым самым ствараючы падставы для ўзнікнення міжнацыянальнай напружанасці.

Аб гэтым сведчаць наступныя факты. Так, у № 6 за 1996 год газеты “Берасцейскі край” сцвярджалася, што ў Беларусі “вядзецца антыўкраінская кампанія”. У № 1 за 1997 год была выказана думка, што “тэрыторыя Брэсцкай вобласці незаконна ўвайшла ў склад БССР”. На старонках газеты адзначалася, што “ў Беларусі пражывае звыш 1 млн. украінцаў”, “Берасцейшчына – этнічна ўкраінская зямля” (№ 30), “Берасцейшчына заселена этнічнымі ўкраінцамі” (№ 33), “паўсюль у сельскай мясцовасці Брэсцкай вобласці людзі размаўляюць на ўкраінскай мове”, “украінцы не могуць без праблемаў чытаць украінскую прэсу, нармальна вучыць дзяцей у ўкраінскіх школах” (№ 34), “практычна з

пасляваеннага часу да сёння ідзе метадычная паступовая работа па асіміляцыі народу ўкраінскай Берасцейшчыны” (№ 36, 13.09.1997 г.).

Некаторыя ініцыятары ўкраінскага руху Брэсцкай вобласці заяўлялі аб пачатку складання “негатыўнага рэестру” тых асоб, якія выказвалі ці выказваюць сваю нязгоду са спробамі ўкраінізацыі Берасцейшчыны. Гэта справа распачалася на старонках, створанага ў 1996 г., “Слоўніка Берасцейшчыны” (аўтар В. Леанюк). У ім Берасцейшчына названа “украінскім краем”, а на 6 старонцы змешчана наступнае: ”мы павінны знайсці і памятаць ненавіснікаў украінства палескага... у такім памеры ведаць, як ведаем нацыянальных герояў, светлых патрыётаў”. Дзіўным, калі не сказаць антыбеларускім, выглядае выступ кіраўніка Маларыцкага філіялу ГА “Прасвіта Берасцейшчыны” В.Харсюка на ІІ Сусветным форуме ўкраінцаў. У сваёй прамове, сярод іншага, ён сцвярджаў: ”Наша беларуская дзяржава стараецца скрыць нацыянальную прыналежнасць палескага народу, варожа ставіцца да тых, хто дамагаецца засвядоміць палешукоў, што яны ёсць украінцы, а не якая-небудзь там невядомая мешаніна, мужыкі і гавораць па-маларыцкі, або па-мясцоваму”. В. Харсюк звярнуўся наконт Берасцейшчыны да ўкраінскага кіраўніцтва, якое знаходзілася на форуме, з запытам – ”чаму яно, маўляў, не ведае дзе праўдзівая ўкраінская мяжа” [432].

Варожа ставілася кіраўніцтва ГА “Прасвіта” і да сваіх, нязгодных у чымсці з імі. Напрыклад, да Беларускай асацыяцыі ўкраінцаў “Ватра”. Цяпер гэтыя грамадска-культурныя аб’яднанні ўкраінцаў Брэсцкай вобласці не маюць афіцыйнай рэгістрацыі і прыпынілі сваю дзейнасць [433].

Не садзейнічала міжнацыянальнаму міру і дыялогу пазіцыя асобных грамадскіх аб’яднанняў рускай супольнасці. Гэта добра заўважана як з выказванняў іх лідараў, так і з праграмных артыкулаў, якія былі надрукаваны ў газеце “Истоки”. Апошняя выдавалася на сродкі Віцебскага грамадскага аб’яднання “Руская абшчына”. Прадстаўнікі і лідар аб’яднання “Руская абшчына” А. Краўцоў цалкам адмаўлялі асобам беларускай нацыянальнасці ў нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, самастойным вызначэнні свайго лёсу, будучыні, адмаўлялі ў праве на ўласныя традыцыі, гісторыю, нацыянальны менталітэт, дзяржаўнасць. Аб падобным выказваліся К. Александраў [434] і У. Уткевіч [435] са старонак газеты “Истоки”.

Вопыт еўрапейскіх краін паказвае, што найбольшыя складанасці ўзнікаюць у выпадку інтэграцыі выхадцаў з краін ісламскага Усходу. Рэспубліка Беларусь з прычыны нязначнай колькасці імігрантаў-

[432] Пушкін І.А. Праявы нацыянальнага экстрэмізму ў дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў на Брэсчыне ў 1990–я гг. // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў. С. 321–323.
[433] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 170–171.
[434] Александров К. Кто прав – Иосиф Сталин или Теодор Герцль // Истоки. 2004. февр. С. 8.
[435] Уткевич В.А. Мы, белорусы – русские люди // Истоки. 2003. окт. С. 3.

мусульман з падобнымі праблемамі не сутыкалася. Аднак ва ўмовах глабалізацыі і нарастаючых іміграцыйных патокаў, адбудзецца павелічэнне колькасці імігрантаў, у тым ліку з краін ісламскага свету. Па выніках перапісу насельніцтва 2009 г. у Рэспубліцы Беларусь пражывала крыху менш за 15 тысяч чалавек, якія прыбылі з ісламскіх краін. І ўсё ж у Беларусі адзначаліся канфліктныя сітуацыі ва ўзаемадзеянні з мясцовым насельніцтвам. Найбольш распаўсюджанай формай падобных канфліктаў з'яўляецца нанясенне абраз з указаннем грэблівага стаўлення да некарэннага паходжання («чурка», «нярускі»), і іншыя падобныя спосабы выказвання непрыязнасці. Як непасрэдная нагода да праявы агрэсіі з боку беларусаў маладыя людзі часта называюць заляцанні да мясцовых дзяўчат. Даволі часта імігранты паказваюць на праявы дыскрымінацыі пры найме жылля. Нярэдка рашэнне гэтага пытання для замежніка ўсходняга паходжання становіцца сапраўднай праблемай, сутнасць якой у тым, што многія адмаўляюцца здаваць у арэнду жылплошчу толькі на падставе «нярускага» паходжання патэнцыйнага кватэраздымшчыка. Для прадстаўнікоў найбольш паслядоўных прыхільнікаў ісламскай рэлігіі вострым пытаннем застаецца выкананне патрабаванняў да прадуктаў харчавання, недахоп мячэцяў і г.д. [436]

Пры станоўчым разуменні агульначалавечых каштоўнасцей у грамадзян Беларусі назіраецца пэўная тэндэнцыя да праяў нацыянальнага экстрэмізму. Пра гэта сведчыць факт, які адбыўся ў самым канцы 2012 г. За некалькі гадзін да Новага года ў мінскім метро адбылася групавая бойка паміж беларусамі і асобамі каўказскай нацыянальнасці. Спрэчка ўзнікла з-за міжнацыянальных стэрэатыпаў. Услед за славеснай сваркай паміж беларусамі і каўказцамі завязалася бойка. Пацярпелі пры гэтым у большай ступені госці сталіцы Беларусі. Варта адзначыць, што міліцыянты УУС па ахове Мінскага метрапалітэна зрэагавалі на здарэнне выключна аператыўна і прафесійна: калі састаў з тымі, што біліся прыбыў на станцыю Купалаўская, яго ўжо сустракалі супрацоўнікі МУС. Усе затрыманыя былі дастаўлены ў міліцыю для разбіральніцтва [437].

Цалкам пагаджаючыся з некаторымі даследчыкамі [438] і дапаўняючы іх можна адзначыць наступныя прычыны магчымых і часткова наяўных праяў нацыянальнага экстрэмізму ў Беларусі ў 1990–2005 гады: а) сістэмныя крызісы, якія ў момант змянялі палітычныя рэжымы; б) асаблівасці ўрбанізацыі, якая прыводзіла да вялікай канцэнтрацыі насельніцтва ў

[436] Алампиев О.А. Восприятие выходцами из исламских стран сложностей интеграции в белорусском обществе // Религия и общество – 7: сб. науч. статей. Могилев, 2012. С. 6–8; Пушки И.А. Проявления национального экстремизма в белорусском обществе в условиях глобализации // Освоение минеральных ресурсов Севера: проблемы и решения. С. 766–770.

[437] Новости // http://news.tut.by/accidents/328650.html. – Дата доступа 22.10.2014 г.

[438] Курбатов В.М. Национальный и религиозный экстремизм: причины и особенности. С.110–112 ; Яго ж. Национальный и религиозный экстремизм: причины и особенности // Белорусская политология. С. 164–166.

гарадах і, прычым, не забяспечыла магчымасцей эканамічнай і культурнай адаптацыі асоб пэўных нацыянальнасцей; в) існаванне аўтарытарных і таталітарных (прыхаваны нацыянальны экстрэмізм да пэўнага часу) палітычных рэжымаў, якія правацыруюць гвалт як форму вырашэння супярэчнасцей; г) незавершанасць працэсаў нацыянальнай і нацыянальна-дзяржаўнай кансалідацыі (этнічны сепаратызм); д) сацыяльна-эканамічнае жыццё, нізкі ўзровень даходаў асобных груп насельніцтва; е) традыцыйна (гістарычна) сфарміраваныя стэрэатыпы ў адносінах да пэўных нацыянальнасцей; ж) нелегальная эканоміка (вытворчасць і збыт наркотыкаў і інш.) і адпаведныя звышпрыбыткі; з) адчуванне небяспекі асіміляцыі як асобных нацыянальных супольнасцей, так і тытульнага этнасу ва ўмовах глабалізацыі (інтэрнацыяналізацыі); і) фактар тэрытарыяльнай канцэнтрацыі нацыянальных супольнасцей і іх сацыяльны статус; к) улічваючы, што нацыяналізм з'яўляецца ідэалогіяй сярэдняга класу, па меры паляпшэння ўмоў жыцця і павелічэння насельніцтва, якое адносіць сябе да сярэдняга класу, пашыраюцца нацыяналістычныя настроі (пакуль што ў Беларусі засяроджаныя на культурна–моўных праблемах); л) барацьба нацыянальных эліт; м) гарантаванне на дзяржаўны ўзроўні ў законах праў і прывілеяў нацыянальных супольнасцей з адначасовым ігнараваннем і не забеспячэннем падобных праў і прывілеяў для тытульнага этнасу; н) месіянства і фанабэрыстасць з боку асобных лідараў нацыянальных супольнасцей (паляк – гэта шляхціц, беларус – мужык; беларусы гэта "ісцінна рускія", месіянская роля для ўсіх славян і г.д.) [439].

**Высновы.** Варта падкрэсліць, што большая частка дасягненняў у нацыянальнай справе ў навейшай гісторыі Беларусі – гэта вынік ініцыятыў і ахвярнай дзейнасці аматараў і актывістаў грамадскіх арганізацый, а не ўладаў. Пік найбольшага нацыянальнага ўздыму нацыянальных супольнасцей Беларусі прыпадае на 1991–1995 гг., затым перыяд зацішша і некаторы спад, які тлумачыцца большым кантролем з боку дзяржаўнай улады за дзейнасцю арганізацый нацыянальных супольнасцей Беларусі. Аб гэтым сведчыць змест заявы намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама: "Перад усім належыць зразумець, што тое, што адбываецца ў Саюзе палякаў – безумоўна, унутраная справа членаў гэтай арганізацыі. Аднак органы ўлады не могуць і не павінны быць пабочнымі назіральнікамі ўзніклага канфлікту, таму што гэта тычыцца жыхароў Гродзеншчыны" [440].

[439] Пушкин И.А. Национальный экстремизм в белорусском обществе – миф или реальность // Современные проблемы гуманитарных и общественных наук. С. 222–229 ; Яго ж. Проявления национального экстремизма в белорусском обществе в условиях глобализации // Освоение минеральных ресурсов Севера. С. 766–770.

[440] Тусевич Е. Живём без оглядки на национальность. С. 6.

На думку доктара гістарычных навук А. Смалянчука: “У 1994–1995 гг. дзяржаўная палітыка зрабіла досыць рэзкі паварот. Працэс беларусізацыі быў гвалтоўна спынены. Узніклі перашкоды ў правядзенні культурна-асветніцкай і грамадскай дзейнасці нацыянальных суполак Беларусі. У масавай свядомасці ізноў пачала пашырацца боязь быць заўважаным у прыналежнасці да той або іншай нацыянальнай супольнасці. Тым не менш цалкам пераламіць тэндэнцыю нацыянальна-культурнага Адраджэння ўлады не здолелі” [441].

У Беларусі не існуе досыць сур’ёзных аб’ектыўных падстаў для міжнацыянальных канфліктаў. У эканоміцы, банкаўскай справе няма нацыянальных кланаў, якія б дыктавалі свае правілы ўсяму грамадству, у рэлігійнай сферы усталявалася пэўная этнаканфесійная згода, дэтэрмінаваная як дзяржавай, так і светапоглядннай культурай грамадзян. У Рэспубліцы Беларусь у наш час назіраецца стабільнасць трансфармацыйных працэсаў у этнаканфесійным асяроддзі. Гэта з’яўляецца несумненным дасягненнем знешняй і ўнутранай дзяржаўнай палітыкі і ідэалагічнай працы. Аднак у беларускім грамадстве існуе “прыхаваная нацыянальная нецярпімасць” да цыган, асоб “каўказскай і азіяцкай” нацыянальнасцей, яўрэў. І ёсць небяспека таго, што пры складанай палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў Беларусі, у агульнай масе насельніцтва з’явіцца значная колькасць актыўных асоб, якія паспрабуюць вырашыць свае праблемы шляхам нацыянальных абвінавачванняў, пошукам ворагаў па нацыянальных прыкметах.

[441] Смалянчук А. Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі ў XX стагоддзі. С. 165–166.

## 2 Этнічная талерантнасць як фактар устойлівага паступальнага развіцця сучаснага беларускага грамадства

Штогод 16 лістапада сусветная грамадскасць адзначае Дзень талерантнасці. Гэты факт сведчыць аб сусветнай значнасці талерантнасці ў сучасным глабалізаваным свеце. Што гэта за з'ява такая, што спадобілася асаблівай ўвагі сусветнай грамадскасці, і наколькі грамадзяне Беларусі талерантныя да прадстаўнікоў іншых народаў? На гэтыя пытанні я і паспрабую адказаць ў прапанаваным чытачу раздзеле.

### 2.1 Сацыяльная актуалізацыя этнічнай талерантнасці як гістарычная тэндэнцыя

Лацінскі корань слова "талерантнасць" (tolerantia) адлюстроўвае сэнс гэтага тэрміна – цярпенне, памяркоўнасць, паблажлівасць да каго-небудзь ці чаго-небудзь [442]. Талерантнасць – гэта прыняцце іншага такім, які ён ёсць, прызнанне, нароўні са сваёй, яго карціны свету, гэта павага да асаблівасцей яго выгляду, складу думкі і стылю жыцця, гэта памяркоўнасць да слабасцей і недахопаў іншага, гэта псіхалагічная сумяшчальнасць, узаемаразуменне, разуменне і прызнанне асаблівасцей нацыянальнай псіхалогіі, гендэрнай, канфесійнай, узроставай, прафесійнай і любой іншай групавой і індывідуальнай спецыфікі, прызнанне правоў іншых быць самім сабой, гэта адсутнасць сілавога навязвання сваёй карціны свету іншым людзям. Талерантнасць не азначае адмовы ад сваёй уласнай карціны свету. Талерантнасць не азначае і адсутнасці барацьбы розных карцін свету. Але барацьба гэтая можа весціся толькі негвалтоўнымі метадамі, а выключна перакананнем і станоўчым прыкладам.

У "Дэкларацыі прынцыпаў талерантнасці" [443], зацверджанай рэзалюцыяй 5.61 на генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА 16 лістапада 1995 г, сцвярджаецца, што «талерантнасць азначае павагу, прыняцце і правільнае разуменне багатай разнастайнасці культур нашага свету, нашых форм самавыяўлення і спосабаў праяў чалавечай індывідуальнасці. Ёй спрыяюць веды, адкрытасць, зносіны і свабода думкі, сумлення і перакананняў. Талерантнасць – гэта гармонія ў разнастайнасці. Гэта не толькі маральны абавязак, але і палітычнае, і прававое запатрабаванне. Талерантнасць – гэта дабрачыннасць, якая робіць магчымым дасягненне міру і спрыяе замене культуры вайны культурай свету".

Рускі аналаг паняцця «талерантнасць» – цярпімасць – наводзіць на думку аб пасіўным цярпенні чужых асаблівасцей. Аднак, як падкрэслівае Дэкларацыя прынцыпаў талерантнасці, "талерантнасць – гэта не уступка, паблажка або патуранне. Талерантнасць – гэта, перш за ўсё, актыўныя адносіны, якія фарміруюцца на аснове прызнання ўніверсальных правоў і

[442] Словарь иностранных слов.М., 1989. С. 510.
[443] http://www.tolerance.ru/declar.html

асноўных свабод чалавека. Ні пры якіх абставінах талерантнасць не можа служыць апраўданнем замахаў на гэтыя асноўныя каштоўнасці, талерантнасць павінны праяўляць асобныя людзі, групы і дзяржавы”. У артыкуле 1.4 Прэамбулы Дэкларацыі падкрэсліваецца, што “праява талерантнасці, якая сугучна павазе правоў чалавека, не азначае цярпімых адносін да сацыяльнай несправядлівасці, адмовы ад сваіх ці ўступкі чужым перакананням. Гэта азначае, што кожны вольны прытрымлівацца сваіх перакананняў і прызнае такое ж права за іншымі. Гэта азначае прызнанне таго, што людзі па сваёй прыродзе адрозніваюцца па знешнім выглядзе, становішчу, гаворцы, паводзінах і каштоўнасцях і валодаюць правам жыць у свеце і захоўваць сваю індывідуальнасць. Гэта таксама азначае, што погляды аднаго чалавека не могуць быць навязаныя іншым”.

Сфера прымянення талерантнасці зусім не абмяжоўваецца асабістымі ўзаемаадносінамі. Палітычную накіраванасць талерантнасці нельга недаацэньваць. “Дэкларацыя прынцыпаў талерантнасці» не пакідае сумненняў на гэты конт, вызначаючы талерантнасць як «абавязак спрыяць сцвярджэнню правоў чалавека, плюралізму (у тым ліку культурнага плюралізму), дэмакратыі і правапарадку. Талерантнасць – гэта паняцце, якое азначае адмову ад дагматызму, ад абсалютызацыі ісціны і сцвярджае нормы, устаноўленыя ў міжнародных прававых актах у галіне правоў чалавека”.

Падобна таму, як для лекара цікавасць выклікае не здароўе, а хвароба, так і ў сацыёлага, які вывучае талерантнасць, увага факусуецца на розных праявах нецярпімасці. Нецярпімасць, адпаведна, уяўляе сабой якасць, супрацьлеглую талерантнасці. На думку Дж. Лока, нецярпімасць з’яўляецца вынікам “разбэшчанай, ганарлівай чалавечай прыроды” [444]. Аднак наўрад ці варта бачыць у шматлікіх праявах этнічнай нецярпімасці выключна псаванне талерантнай чалавечай прыроды. Хутчэй, наадварот, спрадвечная чалавечая натура выразна праглядаецца ў шырока распаўсюджаных актах нецярпімасці да іншаверцаў, іншадумцаў і ўсіх іншых, непадобных знешнім выглядам, паводзінамі або ідэямі, чужынцаў. Справа ў тым, што нецярпімасць выступае першасным, самым прымітыўным фактарам этнічнай ідэнтычнасці. “Свае” ўсведамляюцца такімі спачатку толькі ў проціпастаўленні з “чужымі”. Усведамленне чалавекам сваёй этнічнай ідэнтычнасці шматлікімі навукоўцамі прызнаецца базавым, часцей за ўсё нават рацыянальна не асэнсаваным пачуццём. Найважнейшай умовай станаўлення і ўмацавання этнічнай ідэнтычнасці чалавека з’яўляецца адасабленне сябе і сабе падобных ад усіх астатніх, што не належаць да яго этнічнай групы. Такое адасабленне можа мець розную ступень выяўленасці, аж да крайняй варожасці да чужынцаў. Адносіны недаверу і варожасці да прадстаўнікоў іншых этнічных,

[444] Локк Дж. Сочинения в трех томах: Т. 3. С. 70.

рэлігійных або ідэалагічных груп мае глыбокія гістарычныя карані. Саманазвы многіх старажытных этнасаў перакладаюцца “чалавек”, “людзі”. Само сабой зразумела, што ўсе іншыя, якія не належаць да “людзей”, людзьмі для нашых далёкіх продкаў не з’яўляліся. Таму іх можна было забіваць і нават у выключных выпадках ужываць у ежу, як жывёл. Маральныя нормы практычна ўсіх народаў мелі этнічную (пазней – таксама і сацыяльна-класавую) сферу прымянення, за межамі якой паняцці дабра і зла часта мяняліся месцамі. Так, напрыклад, Стары Запавет забараняе яўрэям даваць грошы на працэнты сваім супляменнікам, аднак не прадугледжвае ніякіх абмежаванняў у адносінах да кліентаў-іншаверцаў. Падобныя нормы існавалі ў Сярэднявеччы і ў многіх краінах Еўропы. Дарэчы сказаць, гэтым, у прыватнасці, можна растлумачыць той факт, што яўрэі спрадвеку пераважалі на сусветным рынку ліхвярскіх паслуг, ганебных або забароненых для мясцовых жыхароў. Этнічнае размежаванне, якое часта даходзіць да прамога генацыду, даводзіцца лічыць адным з важнейшых фактараў чалавечай гісторыі аж да сённяшняга дня.

Сучаснасць дадала новыя сюжэты да шматвяковай гісторыі міжэтнічных адносін. Наш час не без падставы называюць стагоддзем прагрэсу глабалізацыі. І сапраўды, сфарміраваліся, і ўсё больш эфектыўна дзейнічаюць палітычныя, эканамічныя, культурныя, інфармацыйныя і розныя іншыя структуры, установы, арганізацыі і прадпрыемствы, сфера дзейнасці якіх – увесь зямны шар. Працэс глабалізацыі ў той ці іншай меры ўплывае на многія разнастайныя бакі жыцця ўсіх народаў, якія насяляюць Зямлю. Асабліва востра працэс глабалізацыі закранае найбольш ранімыя нацыянальныя пачуцці людзей. Гэта і зразумела, бо глабалізацыя ў многіх адносінах уніфікуе лад жыцця людзей, якія падвергліся яе ўплыву, прымушаючы іх купляць адны і тыя ж тавары, глядзець адны і тыя ж фільмы, слухаць адну і тую ж музыку, гаварыць на адной мове. Пераважная большасць людзей успрымае гэты працэс як даброты, што адкрываюць перад імі новыя, больш шырокія магчымасці забяспечыць сабе і сваім блізкім высокі грамадскі статус і матэрыяльны дабрабыт. Аднак прыкметная частка прадстаўнікоў народаў, уцягнутых у працэс глабалізацыі, праяўляе неспакой з прычыны страты сваёй этнічнай ідэнтычнасці. На гэтай аснове могуць актывізавацца розныя формы этнічнай нецярпімасці, аж да экстрэмісцкіх, гвалтоўных мер уздзеяння на прадстаўнікоў іншых этнасаў, якія, як правіла, складаюць меншасць у дадзенай супольнасці. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што як сярод апалагетаў, так і сярод праціўнікаў глабалізацыі пераважаюць маладыя людзі, сярод якіх нямала і тых, хто апранае свой пратэст супраць страты ўласнай этнічнай ідэнтычнасці ў формы гвалтоўных дзеянняў у адносінах да прадстаўнікоў іншых народаў.

У еўрапейскай філасофскай традыцыі цярпімасць спачатку разглядалася амаль выключна як верацярпімасць, як “цярпімасць у

адносінах да тых, хто ў рэлігійных пытаннях прытрымліваецца іншых поглядаў” [445] (глядзі, напрыклад, “Вопыт верацярпімасці” Дж. Лока або “Трактат аб верацярпімасці” М.-Ф. Вальтэра). Пасродкам верацярпімасці прабівала сабе дарогу свабода сумлення, якая ў тых канкрэтных гістарычных умовах азначала права пратэстантаў на выбар веравызнання. Затым лозунг талерантнасці падхапіла буржуазія, зацікаўленая ў пашырэнні рынкаў атрымання сыравіны і збыту тавараў за кошт асваення чужых нацыянальных тэрыторый. Сучасная глабалізацыя з'яўляецца вынікам эканамічнай экспансіі транснацыянальных карпарацый. Талерантнасць расчышчае ім шлях да раней закрытых нацыянальных рынкаў. Гэта і ёсць палітэканамічная падаплёка ідэалогіі талерантнасці. Аднак нельга не прызнаць і той факт, што толькі талерантнасць дазваляе жыць у свеце людзям, сацыяльным групам і народам, што адрозніваюцца этнічнымі прыкметамі, рэлігійнымі вераваннямі, палітычнымі поглядамі, культурнымі каштоўнасцямі і ладам жыцця. Няўвага да пытанняў талерантнасці можа абярнуцца сітуацыяй «вайны ўсіх супраць усіх», што ставіць крыж на будучыні ўсёй чалавечай цывілізацыі. Таму іншага шляху, акрамя пашырэння зоны ўсебаковай талерантнасці, у сучаснага глабалізаванага грамадства не існуе.

### 2.2 Праявы этнічнай нецярпімасці ў беларускім грамадстве па выніках сацыялагічных апытанняў

Лічыцца, што ў Беларусі жывуць людзі, талерантныя ад нараджэння. Адны ганарацца гэтай нацыянальнай асаблівасцю беларускага народа, іншыя абураюцца і іранізуюць з нагоды пакорлівай памяркоўнасці сваіх землякоў. Аднак самі беларусы, роўна як і іх суседзі, у большасці сваёй згаджаюцца з тым, што яны талерантная нацыя. І сапраўды, у параўнанні з краінамі-суседзямі, асабліва былымі савецкімі рэспублікамі на поўдні, усходзе і поўначы, беларускае грамадства можа служыць станоўчым прыкладам мірнага сумеснага пражывання розных этнасаў і канфесій. Гэтаму спрыяюць аб’ектыўныя і суб’ектыўныя акалічнасці. Важнейшай асновай міжнацыянальнага міру ў нашай краіне з’яўляецца высокая ступень этнічнай аднастайнасці беларускага грамадства. Вельмі блізкія па мове, звычаях, рэлігіі беларусы, рускія, палякі і ўкраінцы ў суме складаюць больш за 95 працэнтаў насельніцтва Беларусі. Шматлікія даследчыкі і палітыкі указваюць на асаблівасці нацыянальнага характару беларусаў як на галоўную прычыну этнічнага спакою ў Беларусі. Мы паспрабуем прааналізаваць суб’ектыўны фактар міжэтнічнай цярпімасці, засноўваючыся на выніках уласных сацыялагічных апытанняў маладых жыхароў Беларусі. Апытанні рэпрэзентатыўнай выбаркі моладзі Магілёўскай вобласці праводзіліся групай супрацоўнікаў кафедры

[445] Локк Дж. Сочинения в трех томах: Т. 3. М., 1988. С. 93.

гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання з 1997 па 2009 год. У агульнай колькасці мы апыталі больш за 5 тысяч маладых людзей жаночага і мужчынскага полу ва ўзросце да 30 гадоў, якія пражываюць у Магілёўскай вобласці, а таксама ў г. Мінску і ў г. Гродна. На некаторых выніках гэтых апытанняў, якія маюць дачыненне да міжэтнічнай нецярпімасці, мы спынімся больш падрабязна.

Прыходзіцца прызнаць, што радыкалізм, у тым ліку і ў сферы міжэтнічных адносін, які даходзіць нярэдка да актаў насілля, з’яўляецца неад’емнай характэрнай рысай значнай часткі насельніцтва Беларусі, асабліва сярод моладзі. У гэтым мы пераканаліся падчас правядзення сацыялагічных апытанняў маладзёжнай кагорты.

Адным з самых папулярных лозунгаў ідэолагаў і практыкаў этнічнай нецярпімасці з’яўляецца тэзіс, паводле якога пераважнае права на пражыванне на вызначанай тэрыторыі раз і назаўжды замацавана за так званай “карэннай” нацыяй. Наўрад ці трэба даказваць, што праслаўутае “натуральнае” права з’яўляецца абуральнай формай дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце і недапушчальна ў сучасным глабалізаваным свеце. Тым не менш, страхі, звязаныя з “распродажам роднай зямлі іншаземцам”, апаноўваюць нямала людзей у самых розных краінах. Наколькі папулярныя ідэі “натуральнага права” сярод маладых грамадзян Беларусі? Гэта можна ўбачыць на дыяграме малюнка 1, на якой паказаны вынікі нашага апытання жыхароў Магілёўшчыны ў 2007 і ў 2009 гг.




**Малюнак 1 – Адносіны жыхароў Магілёўскай вобласці да сцвярджэння: “Беларусь – толькі для беларусаў” (%)**

Як бачна, нямала маладых жыхароў Магілёўшчыны з’яўляюцца прыхільнікамі беларускай рэдакцыі нацыяналістычнага, па сутнасці, лозунга, які стаў у свой час псіхалагічнай асновай нацысцкай ідэалогіі. Сярод прадстаўнікоў беларускай моладзі выявілася 13,5 % прыхільнікаў абмежавання месца пражывання людзей па нацыянальнай прыкмеце. Прадстаўнікі старэйшых пакаленняў амаль у два разы радзей згаджаліся з лозунгам “Беларусь – толькі для беларусаў”. Верагодна, яны лепш за маладых людзей разумеюць усю небяспечнасць практычнай рэалізацыі прынцыпу “натуральнага права” ў палітыцы і ў эканоміцы. Да таго ж для правядзення гэтага прынцыпу ў жыццё патрабуецца выканаць

невырашальную задачу пошуку аб’ектыўных крытэрыяў прыналежнасці індывіда да карэннай нацыі, у дадзеным выпадку, да беларускага этнасу, які, як вядома, з’яўляецца складаным сплавам ураў, славян, балтаў і германцаў. А пры рашэнні гэтай задачы ну ніяк не пазбегнуць працэдуры вымярэння параметраў чэрапа і формы носа ў прадстаўнікоў “карэннай нацыі” і вызначэння на гэтай аснове эталоннага этнічнага тыпу. Наўрад ці варта марнаваць час і друкаванае месца для таго, каб даказваць абсурднасць падобных спроб, ужо, дарэчы, якія мелі месца ў еўрапейскай гісторыі і былі аспрэчаны сур’ёзнымі навукоўцамі. А вось нагадаць аб тым, чым небяспечныя такія доследы, вельмі нават трэба, усім тым, хто паспеў забыцца пра гітлераўскія канцлагеры і шматлікія прыклады этнічнага генацыду. Падзел насельніцтва краіны на “карэнную” нацыю і “прышлых”, на “сваіх” і “чужых” стварае сітуацыю неабгрунтаваных прывілеяў адных і справядлівай незадаволенасці іншых сацыяльных груп, што ніяк не спрыяе сацыяльнай гармоніі. А зрушэнне крытэрыяў вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці ў бок этнічнага паходжання, калі палітычную і эканамічную эліту складаюць толькі прадстаўнікі “карэннай” нацыі, ставіць крыж на прагрэсе краіны. Вядомыя з гісторыі і сучаснасці прыклады прывілеяванага становішча адной нацыі над іншымі толькі пацвярджаюць адзначаную вышэй заканамернасць.

І, тым не менш, як відаць з вынікаў апытання, сярод нашай моладзі знайшлося нямала прыхільнікаў лозунга “Беларусь – толькі для беларусаў”. Да іх варта прыглядзецца больш уважліва, улічваючы сацыяльна-палітычныя рызыкі, якія зыходзяць ад гэтай групы грамадзян. У групе прыхільнікаў “натуральнага права” на месца пражывання дзве трэці складаюць юнакі і толькі адну трэць – дзяўчыны. Даволі цікава полаўзроставае размеркаванне моладзі, якая пагадзілася з лозунгам “Беларусь – толькі для беларусаў”. На малюнку 2 гэта добра відаць.




**Малюнак 2 – Полаўзроставае размеркаванне прыхільнікаў сцвярджэння: “Беларусь – толькі для беларусаў” (%)**

Узровень этнічнай нецярпімасці ў юнакоў з гадамі падае ў два разы (з 23 % сярод 16–19-гадовых да 11 % сярод 25–30-гадовых), а вось у дзяўчын, наадварот, нецярпімасць у два разы ўзрастае (з 7 % сярод тынэйджараў да 13 % у групе 25–30-гадовых). У юнакоў такая дынаміка, верагодна, абумоўлена працэсам прафесійнай сацыялізацыі, падчас якой

яны пазбаўляюцца ад этнанацыянальных стэрэатыпаў. У дзяўчын жа тэндэнцыя ўзмацнення этнічнай нецярпімасці ва ўзроставым дыяпазоне ад 25 да 30 гадоў, магчыма, звязана з негатыўным вопытам зносін з прадстаўнікамі іншых этнасаў у звышкамунікатыўны перадшлюбны перыяд.

Вынікі сацыялагічнага апытання сведчаць аб тым, што лозунг “Беларусь – толькі для беларусаў” хутчэй знаходзіць станоўчы водгук у свядомасці людзей, чый розум не занадта закрануты адукацыяй. Залежнасць нацысцкай арыентацыі беларускай моладзі ад узроўню адукацыі можна візуальна назіраць на мал. 3.

Прыкметна, што вышэйшая адукацыя, у цэлым, павышае імунітэт маладога чалавека да нацысцкай ідэалогіі. Так, сярод уладальнікаў дыпламоў вышэйшых вучэбных устаноў эпігонаў прынцыпу абмежавання людзей па іх нацыянальнасці апынулася ў 3 разы менш, чым сярод навучэнцаў школ (адпаведна, 6 % і 17 %). Аднак залежнасць тут не простая і зусім не лінейная. Як высветлілася падчас аналізу сацыялагічных даных, важна не то, дзе вучыцца рэспандэнт, а то, як ён там вучыцца. Ва ўсякім разе, прыхільнасць маладых людзей да нормаў “натуральнага права” моцна залежыць ад таго, наколькі добрымі вучнямі яны былі ў школе. Так, сярод маладых людзей са сярэднім балам агульнаадукацыйнай школы 4 і вышэй (па пяцібальнай сістэме) папулярнасць лозунгу “Беларусь – толькі для беларусаў” апынулася ў два з паловай разы ніжэй, чым сярод тых, хто вучыўся на “здавальняюча”. Такім чынам, дадзеныя сацыялагічнага даследавання лішні раз даказалі карысць якаснай адукацыі, якая, як высвятлілася, павышае і ўзровень талерантнасці маладых людзей.




**Малюнак 3 – Размеркаванне прыхільнікаў сцвярджэння “Беларусь – толькі для беларусаў”, у залежнасці ад узроўню адукацыі (%)**

Род прафесійных заняткаў таксама даволі прыкметна ўплывае на ўзровень талерантнасці. Самымі талерантнымі апынуліся медыкі, сярод якіх толькі 5 % цалкам пагадзіліся з дэвізам нацыяналістаў, а таксама будучыя гуманітарыі і эканамісты з 15 % і 12 % прыхільнікамі этнічных абмежаванняў на пражыванне, адпаведна. Лідыруюць жа па шкале нацыяналізму будучыя афіцэры і будаўнікі, сярод якіх безумоўна падтрымлівае лозунг “Беларусь – толькі для беларусаў” кожны другі.




**Малюнак 4 – Адносіны жыхароў Магілёўскай вобласці ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў да сцвярджэння: "Некаторыя нацыі ў нас непажаданыя" (%)**

Такім чынам, на паверку апынулася, што, насуперак распаўсюджанаму меркаванню аб прыроднай талерантнасці беларускага народа, 13,5% прадстаўнікоў нашай моладзі заражаны нацысцкай бацылай этнічнай нецярпімасці, фактычна пагадзіўшыся з лозунгам нямецкіх фашыстаў: "Германія – толькі для немцаў", а ў беларускай рэдакцыі "Беларусь – толькі для беларусаў". Такое сцвярджэнне мяркуе, што ёсць нацыі, прадстаўнікі якіх непажаданыя на тэрыторыі Беларусі. Для таго каб паставіць усе кропкі над і, мы папрасілі ўдзельнікаў апытання вызначыцца і на гэты конт. Пазіцыя маладых жыхароў Магілёўшчыны адзначана на дыяграме малюнка 4.

Вынікі апытання перасягнулі ўсе асцярогі. Зараз ужо не 13,5 %, а 38,3 % нашых маладых суайчыннікаў фактычна пагадзіліся з прынцыпам этнічнай сегрэгацыі. Гэта азначае, што частка нашых суайчыннікаў пры ацэньванні людзей зыходзяць не з іх асабістых вартасцей і недахопаў, а з іх нацыянальнай прыналежнасці. Такі падыход з'яўляецца падставай нацысцкай ідэалогіі.

Знаходжанне якіх нацый на тэрыторыі Беларусі лічыцца найбольш непажаданым? Адказаць на такое пытанне мы папрасілі ўдзельнікаў апытання ў адкрытай форме. Рэспандэнты самі ўпісвалі ў свабодным радку тое, што жадалі сказаць па гэтым пытанні, гэта значыць для таго, каб выказаць сваю пазіцыю, яны павінны былі прыкласці нейкія намаганні. Дадзены факт, па нашым меркаванні, толькі надае вагу вынікам апытання. Вынікі адказаў у ранжыраваным парадку размешчаны ў табліцы 8.

На паверку апынулася, што толькі чвэрць (24,6 %) маладых жыхароў Магілёўшчыны паслядоўныя інтэрнацыяналісты. Пакідаюць надзею на адсутнасць бацыл нацызму тыя ўдзельнікі апытання, якія не задумваліся над гэтым пытаннем (16,4 %), а таксама тыя, хто праігнараваў яго (18,6%). Астатнія жа 40 % нашых маладых землякоў канкрэтна указалі, якія нацыі ў нас, па іх меркаванню, непажаданыя.

Табліца 8 – Размеркаванне адказаў моладзі на пытанне: “Знаходжанне якіх нацый на тэрыторыі Беларусі Вы лічыце непажаданым” (%).

| Этнасы і нацыі | Рэспандэнты ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў | Рэспандэнты старэйшыя за 30 гадоў |
|---|---|---|
| чачэнцы | 10,3 | 8,6 |
| цыгане | 9,1 | 6,7 |
| каўказцы | 8,1 | 6,2 |
| азіяты | 4,8 | 5,2 |
| негры | 4,7 | 3,3 |
| грузіны | 4,4 | 2,4 |
| армяне | 3,2 | 2,4 |
| арабы | 3,2 | 1,9 |
| кітайцы | 2,9 | 3,3 |
| мусульмане | 2,5 | 1,4 |
| ізраільцяне | 2,5 | 0,5 |
| азербайджанцы | 2,1 | !,4 |
| узбекі | 1,9 | 1,0 |
| амерыканцы | 1,6 | 0,5 |
| таджыкі | 1,5 | 1,0 |
| усё пажаданыя | 24,6 | 27,6 |
| не задумваліся | 16,4 | 9,0 |
| не адказалі | 18,6 | 35,7 |

Зададзімся пытаннем аб прычынах этнічнай антыпатыі, якая выявілася ў адказах маладых грамадзян Беларусі. Аб прычынах непрымання нашай моладдзю людзей па этнічнай прыкмеце можна даведацца, паглядзеўшы на табліцу 9.

Табліца 9 – Прычыны непрымання моладдзю некаторых нацый (па матэрыялах нашых апытанняў у 1997 і 2007 гг.) (%)

| Прычыны этнічнага непрымання | Доля апытаных | |
|---|---|---|
| | **1997 г.** | **2007 г.** |
| Паводзяць сябе, як гаспадары | 37,2 | 41,9 |
| Зняважліва ставяцца да нашай культуры | 33,8 | 47,8 |
| Ствараюць напружанае становішча | 32,7 | 48,4 |
| Імкнуцца падмануць нас | 27,2 | 29,4 |
| Ганарліва трымаюцца | 20,6 | 17,2 |
| Жывуць лепш за нас | 16,1 | 10,3 |
| Раздражняюць асаблівасці знешняга выгляду | 15,8 | 13,9 |
| Жадаюць скупіць усё каштоўнае | 12,4 | 17,5 |
| Імкнуцца заняволіць нас | 11,4 | 18,0 |
| У іх нізкая культура | 8,0 | 6,6 |
| Іншыя прычыны | 1,3 | 1,5 |
| **Заўвага** – Сума адказаў у слупках перавышае 100 %, так як рэспандэнты маглі абраць некалькі варыянтаў адказу | | |

Сярод матываў этнічнай антыпатыі прадстаўлены і страхі (“імкнуцца падмануць нас”, “жадаюць скупіць усё каштоўнае”, “імкнуцца заняволіць нас”), і зайздрасць (“жывуць лепш за нас”), і комплекс непаўнацэннасці (“паводзяць сябе як гаспадары”, “зняважліва ставяцца да нашай культуры”, “ганарліва трымаюцца”), і ганарыстасць (“у іх нізкая культура”, “раздражняюць асаблівасці знешняга выгляду”). Наўрад ці варта тлумачыць адукаванаму чытачу, што здзяйсняюць злачынствы, падманваюць і хамяць асобныя людзі, а не нацыі. Таму вызначаныя часткай нашых суграмадзян абвінавачванні на адрас цэлых нацый не адпавядаюць нормам этнічнай талерантнасці.

Якія ж меры ўздзеяння на прадстаўнікоў негатыўна ацэненых нацый лічаць прымальнымі нашы далёка не заўсёды талерантныя маладыя суграмадзяне? Аб гэтым наступная табліца 10. У ёй адлюстраваны вынікі апытанняў 1997 і 2009 гг., праведзеных творчым калектывам кафедры гуманітарных дысцыплін МДУХ. У 1997 годзе было апытана 1092 прадстаўнікоў моладзі з Магілёўскай вобласці, Мінска і Гродна. У 2009 годзе мы апыталі 684 дарослых жыхара Магілёўшчыны.

Табліца 10 – Метады ўздзеяння на прадстаўнікоў негатыўна ацэненых нацый, у працэнтах ад апытаных

| **Метады ўздзеяння** | **Згодны цалкам** | | **Часткова згодны** | | **Не згодны** | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **1997 г.** | **2009 г.** | **1997 г.** | **2009 г.** | **1997 г.** | **2009 г.** |
| Трэба забараніць ім займаць важныя пасады | 24,7 | 30,0 | 30,8 | 28,4 | 39,2 | 40,6 |
| Трэба прымусіць прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей засвоіць мову і звычаі карэннай нацыі | 18,6 | 17,0 | 36,2 | 39,3 | 40,1 | 41,5 |
| Трэба забараніць ім купляць нерухомасць і зямлю | 12,6 | 19,2 | 23,4 | 28,4 | 57,6 | 51,5 |
| Неабходна абмежаваць іх па месцах пражывання | 12,5 | 14,5 | 23,0 | 23,0 | 58,0 | 61,1 |
| Трэба забараніць ім браць шлюб з нашай моладдзю | 8,2 | 8,9 | 16,2 | 17,8 | 70,1 | 72,1 |
| Трэба выселіць іх сілай з нашай краіны | 4,6 | 3,5 | 16,8 | 15,5 | 73,4 | 79,7 |
| Неабходна вынішчыць іх фізічна | 4,2 | 1,2 | 5,3 | 5,0 | 85,6 | 92,5 |

Прадстаўленыя даныя дазваляюць вызначыць узровень этнічнай нецярпімасці, а таксама накіраванасць яе змен у свядомасці маладога пакалення Беларусі за апошнія 13 гадоў. На жаль, прыходзіцца канстатаваць калі не ўзмацненне этнічнай нецярпімасці, то, ва ўсялякім разе, адсутнасць тэндэнцыі да яе паніжэння. Да ліку прыхільнікаў статуснага абмежавання (“трэба забараніць ім займаць важныя пасты”) у 2009 г. можна з поўным правам прылічыць больш паловы (58,4 %) юнакоў і дзяўчын Беларусі, прычым амаль трэць прадстаўнікоў беларускай моладзі абсалютна ўпэўненыя ў правільнасці такой забароны. У 1997 годзе такіх заўзятых апалагетаў статусных абмежаванняў было некалькі менш.

Этнічная нецярпімасць сярод маладых жыхароў Беларусі датычыцца і міжэтнічных шлюбаў. За абмежаванні ў гэтай сферы з той або іншай ступенню ўпэўненасці выступае кожны чацвёрты прадстаўнік беларускай моладзі. Вастрыня моўнай насільнай экспансіі “карэннай” нацыі за апошнія 13 гадоў, здаецца, не знізілася. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на радыкальныя нацыяналістычныя настроі, якія выявіліся ў форме патрабавання гвалтоўнага высялення прадстаўнікоў непажаданых нацый, а таксама іх знішчэння. З ідэяй гвалтоўнага высялення цалкам або часткова пагадзіўся кожны пяты грамадзянін, а знішчаць людзей іншай этнічнай прыналежнасці ў той або іншай ступені прапаноўвалі ад 9,5 % маладых удзельнікаў апытання ў 1997 годзе да 6,2 % рэспандэнтаў у 2009 годзе. Мабыць, адзінай лыжкай мёду ў гэтай бочцы дзёгцю будзе высновa аб тым, што ўдзельная вага ваяўнічых нацыстаў сярод нашых суграмадзян за апошнія 13 гадоў некалькі скарацілася. Падставу для такой высновы дае параўнальны аналіз даных апытанняў, праведзеных намі ў 1997, 2007 і 2009 гг. Для забеспячэння належнай супастаўнасці вынікаў мы пералічылі даныя толькі па маладзёжнай групе рэспандэнтаў. З гэтымі вынікамі апытанняў можна пазнаёміцца на малюнку 5.




**Малюнак 5 – Працэнтныя долі маладых (16–30 гадоў) жыхароў Магілёўскай вобласці, у той або іншай меры згодных з меркаваннем, што прадстаўнікоў непажаданых нацый неабходна вынішчыць фізічна**

Добра ўжо тое, што ўдзельная вага этнічных экстрэмістаў сярод нашай моладзі становіцца ўсё менш і менш. Так, у 1997 годзе іх было 4,2 %, а ў 2009 годзе мы зафіксавалі сярод моладзі Магілёўшчыны толькі 1,3 % агрэсіўных нацыстаў, якія лічаць магчымым фізічнае знішчэнне непажаданых чужынцаў. Аднак такія людзі працягваюць заставацца ў маладзёжным асяроддзі тым дэтанатарам, які можа падарваць знешне спакойную міжэтнічную сітуацыю ў Беларусі. У рэшце рэшт, карэлаў у Расіі таксама да пэўнага часу лічылі спакойным і талерантным народам, пакуль у 2006 годзе ў Кандапоге не ўспыхнулі міжэтнічныя беспарадкі.

Як паказалі сацыялагічныя апытанні, у Беларусі таксама ёсць гаручы матэрыял міжэтнічных канфліктаў. Бо знаходзяцца сярод нашых суграмадзян і тыя, хто гатоў асабіста ўдзельнічаць у нацыяналістычных пагромах. Іх удзельную вагу сярод дарослых жыхароў Магілёўшчыны мы пакажам на малюнку 6, абапіраючыся на даныя сацыялагічных апытанняў, праведзеных Магілёўскім інстытутам рэгіянальных сацыяльна-палітычных даследаванняў, пачынаючы з 2002 года.

Мала гэта або шмат – 1 % экстрэмістаў, гатовых асабіста ўдзельнічаць у нацыяналістычных пагромах (даныя апытання 2009 года)? У сітуацыі абвастрэння эканамічнага крызісу, павышэння ўзроўню беспрацоўя, дэфіцыту прадуктаў харчавання або якіх-небудзь іншых правакацыйных фактараў гэты 1 працэнт радыкальна настроеных грамадзян можа дэстабілізаваць значна шырэйшыя пласты насельніцтва, чым гэта ўяўляецца магчымым у спакойныя гады. Таму не варта недаацэньваць праблему латэнтнага этнічнага экстрэмізму.




**Малюнак 6 – Удзельная вага дарослых жыхароў Магілёўскай вобласці, гатовых асабіста ўдзельнічаць у нацыяналістычных пагромах, у працэнтах**

Такім чынам, ці талерантныя маладыя жыхары Беларусі? Несумненна, пераважная большасць нашых суграмадзян, у тым ліку і

сярод маладых людзей, станоўча адносяцца да прадстаўнікоў іншых народаў і этнасаў, выяўляючы цярпімасць да культурнай разнастайнасці, якая прыўносіцца імі ў багатую ўласную культуру Беларусі. Аднак ёсць, і зараз мы ведаем колькі, і тыя, хто з'яўляецца носьбітам і распаўсюджвальнікам віруса нацыянальнай нецярпімасці і этнічнай нянавісці. Веданне аб тым, што такія маральныя і псіхалагічныя ўсталёўкі існуюць у нашым грамадстве, дазволіць усвядоміць наяўнасць і маштаб праблемы этнічнай нецярпімасці ў нашым грамадстве і будзе спрыяць больш эфектыўнаму процідзеянню ідэалогіі нацызму.

Беларусь застаецца адным з нешматлікіх астраўкоў міжэтнічнага спакою ў сучасным бурна зменлівым свеце. Аднак пад роўняддзю бачнага міжнацыянальнага дабрабыту хаваюцца працэсы, ігнараваць якія было бы грубай памылкай. Талерантнасць жыхароў Беларусі дагэтуль часцей за ўсё была абумоўлена іх адноснай ізаляванасцю ад міграцыйных плыняў з Азіі і Афрыкі. Аднак доўга нашай краіне захоўваць монаэтнічную сацыяльную структуру наўрад ці атрымаецца. Вось тады мы і пазнаем сапраўдны кошт знакамітай беларускай талерантнасці.

### 2.3 Сацыяльная індыкацыя этнічнага радыкалізму ў сучасным беларускім грамадстве (на прыкладзе Магілёўскай вобласці)

Этнічны радыкалізм уяўляе сабой крайнюю форму дыскрымінацыі людзей па этнічнай прыкмеце. Апошняя ж характарызуецца псіхалогіяй, ідэалогіяй і палітыкай нацыянальнай перавагі. Этнічная дыскрымінацыя выяўляецца ў рознай ступені нецярпімасці да прадстаўнікоў іншых этнасаў, якая пачынаецца з бытавой ксенафобіі і даходзіць да генацыду. Менавіта гэтую, «генацыдную», форму нецярпімасці звычайна і называюць этнічным радыкалізмам. Аднак складана аддзяліць бытавую ксенафобію ад яе радыкальных формаў. Першая, хутчэй, утрымлівае ў сабе патэнцыю радыкалізму, якая толькі і чакае любой магчымасці для свайго праяўлення. Таму надзвычай небяспечна недаацэньваць любыя, якія нават знешне не ўяўляюцца значнымі, праявы дыскрымінацыі людзей па нацыянальнай і любой іншай прыналежнасці. Нельга забываць, што этнічны радыкалізм па сутнасці сваёй з'яўляецца сінонімам нацызму, усе “прывабнасці” якога ў асобе нямецкага фашызму і японскага мілітарызму чалавецтва яшчэ не забылася з часоў Другой сусветнай вайны. Разгул нацыяналізму ў пачатку XX стагоддзя дорага каштаваў народам свету, у тым ліку і тым, якія далі магчымасць сваім лідэрам ўвесці сябе ў наркатычны чад ідэалогіі этнічнай перавагі. Імкненне прадухіліць рэцыдывы нацызму ў сучасным высокатэхналагічным свеце, у тым ліку і ў ваенным дачыненні, вызначае павышаную цікавасць да этнічнага радыкалізму з боку навукоўцаў, палітыкаў і шырокай грамадскасці. Глабальная значнасць праблематыкі этнічнага радыкалізму падкрэсліваецца тым фактам, што яшчэ ў 1965 годзе Генеральная Асамблея Арганізацыі

Аб’яднаных Нацый прыняла Міжнародную канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, у якой абвяшчаецца прынцыповая роўнасць усіх людзей перад законам, без адрознення па прыкмеце расы, колеру скуры або нацыянальнага паходжання.

Этнічны радыкалізм, у якія б рэспектабельныя адзенні ён ні «апранаўся», непазбежна вядзе да нацыянальнай варожасці, нецярпімасці і гвалту. Таму ў большасці краін, у тым ліку і ў Беларусі[446], прыняты антыэкстрэмісцкія законы, у якіх распальванне міжнацыянальнай варожасці кваліфікуецца як крымінальнае злачынства. І не выпадкова, паколькі любы радыкалізм, і ў асаблівасці этнічны, акрамя таго, што парушае сацыяльны спакой, правакуючы ўзаемную падазронасць і варожасць у шматэтнічным грамадстве, да таго ж яшчэ і падрывае дзяржаўныя асновы, ініцыіруючы бясконцы ланцужок нацыянальнага сепаратызму. Таму актуальнасць праблематыкі радыкалізму немагчыма пераацаніць. У поўнай меры гэта сцвярджэнне датычыцца і спакойнай з выгляду Беларусі, нягледзячы на тое, што ў нашай краіне чужынцам і іншаверцам жывецца параўнальна спакойна.

Разбярэмся дзеля пачатку, якое паняцце змяшчае ў сабе сам тэрмін “этнічны радыкалізм”. Гэты тэрмін для нас гучыць як сінонім “экстрэмізму”. На нашу думку, радыкалізм з’яўляецца практычным выразам ідэалогіі экстрэмізму, апошні ж вызначаецца як ідэалогія і практыка крайніх (радыкальных) сродкаў і метадаў дасягнення мэты. Сэнс выкарыстання паняцця “крайні” ў дадзеным кантэксце азначае прымяненне гвалтоўных метадаў вырашэння праблем, звязаных з той ці іншай формай гвалту ў адносінах да адной асобы або сацыяльнай групы. Веер мэтаў, дасягненне якіх забяспечваецца радыкальнымі сродкамі і метадамі, можа быць самым разнастайным. Тыпалогія радыкалізму *па сферах грамадскай дзейнасці* можа быць прадстаўлена наступным незавершаным пералікам:

– палітычны радыкалізм;
– нацыянальны (этнічны) радыкалізм;
– рэлігійны радыкалізм;
– эканамічны радыкалізм;
– ідэалагічны радыкалізм;
– педагагічны радыкалізм;
– экалагічны радыкалізм;
– лінгвістычны радыкалізм;
– мастацкі радыкалізм і г.д.

*По суб’ектах дзейнасці* радыкалізм падзяляецца на:

– індывідуальны радыкалізм;
– групавы радыкалізм;

---

[446] Закон Республики Беларусь от 04.01.2007 № 203-З «О противодействии экстремизму». Интернет-ресурс http://pravo.levonevsky.org/bazaby11/republic22/text199.htm. Доступ 11.11.2012 г.

– саслоўны радыкалізм;
– класавы радыкалізм;
– дзяржаўны (нацыянальны) радыкалізм;
– інтэрнацыянальны (глабальны) радыкалізм.

У грамадска-палітычнай сферы магчыма падраздзяленне радыкалізму на дзяржаўны і апазіцыйны. Радыкалізм можна тыпалагізаваць і паводле іншых прыкмет. Напрыклад, вылучыць розныя ступені радыкалізацыі дзейнасці адных і тых жа суб’ектаў. Напрыклад, пратэсныя акцыі прынята ранжыраваць ад мазахісцкіх галадовак, маўклівых пікетаў і дэманстрацый да тэрарыстычных актаў. Аднак на гэтым мы прыпыняем гаворку пра тыпалагізацыю радыкалізму, паколькі гэта не з'яўляецца непасрэднай задачай дадзенага тэксту. Растлумачым толькі факт ўключэння нацыянальнага радыкалізму ў абодва прыведзеныя вышэй спісы. Справа ў тым, што тэрмін “нацыянальны” па традыцыі, заведзенай Х. Конам [447], разумеецца ў двух сэнсах: як аб'яднанне людзей на аснове грамадзянскага, палітычнага, дзяржаўнага фактару, і як этнічны кансалідуючы пачатак. Прычым другая трактоўка, у сваю чаргу, раскладаецца на дзве альтэрнатыўныя ацэначныя пазіцыі. Так, напрыклад, для адных нацыяналізм тоесны станоўчаму патрыятызму, а для іншых ўяўляе сабой негатыўную «ідэалогію і палітыку, якая вынікае з ідэй нацыянальнай перавагі і супрацьпастаўлення сваёй нацыі іншым»[448]. Такія вельмі далёкія адна ад адной па сэнсе трактоўкі тэрміна «нацыянальны» даволі часта не распазнаюцца, што прыводзіць да непаразуменняў і пустых спрэчак сярод абывацелей і навукоўцаў. Менавіта па гэтай прычыне мы прапануем выкарыстоўваць паняцце «этнічны радыкалізм», якое пазбаўлена двухсэнсоўнасці і адлюстроўвае не культурны, грамадзянскі ці палітычны, а самы што ні на ёсць адкрыты фізіялагічны кантэкст разгляду дадзенай тэмы.

Этнічны радыкалізм выяўляецца, у першую чаргу, у тым, што носьбіты гэтай ідэалогіі імкнуцца гвалтоўнымі метадамі ўсталяваць нарматыўныя (як на ўзроўні маралі, так і ў прававых формах) эканамічныя, палітычныя, статусныя і іншыя прывілеі для свайго этнасу з адпаведнай дыскрымінацыяй так званых «нетытулаваных» этнасаў. Менавіта гэта і асуджае прынятая ўсімі дзяржавамі, якія ўваходзяць у ААН, Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, уключыўшы ў гэта паняцце «любое адрозненне, выключэнне, абмежаванне або перавагу, заснаваную на прыкметах расы, колеру скуры, радавога,

[447] Кон Х. Идея национализма // Ab Imperio: Теория и история национальностей и национализма в постсоветском пространстве. 2001. № 3. С. 419 ; Кон Г. Национализм: его смысл и история. Дайджест книги.

[448] Например, Современный толковый словарь русского языка под ред. С.А. Кузнецова (СПб.: Норинт, 2001) определяет национализм как «идеологию и политику, исходящую из национального превосходства и противопоставления своей нации другим». Схожие определения дают Большой энциклопедический словарь под ред. А. М. Прохорова (М.: Большая российская энциклопедия, 2004.), Новый словарь русского языка под ред. Т.Ф.Ефремовой (М.: Русский язык, 2000) и др.

нацыянальнага або этнічнага паходжання, якія маюць на мэце або следствам знішчэнне або змяншэнне прызнання, выкарыстання або ажыццяўлення на роўных пачатках правоў чалавека і асноўных свабод у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай або любых іншых галінах грамадскага жыцця»[449]. Улічваючы няпэўнасць крытэрыяў этнічнай ідэнтыфікацыі, у сферы міжнацыянальных адносін пераважаюць не разумныя і навукова абгрунтаваныя довады, а афектыўныя эмоцыі. Менавіта па гэтай прычыне любыя спробы вертыкальна дыферэнцыраваць этнасы ў неабходных для выжывання абласцях жыццядзейнасці непазбежна прыводзяць да радыкалізацыі іх узаемаадносін. Таму радыкалізм аказваецца сталым спадарожнікам этнічнай парадыгмы, у асаблівасці, калі яна пераходзіць з аўдыторый халодных навуковых дыскусій у гарачую зону палітычнай рэалізацыі.

Адной з ключавых праблем даследавання этнічнай тэматыкі выступае пытанне аб індыкатарах, з дапамогай якіх можна зафіксаваць ступень радыкалізацыі міжнацыянальных адносін. Толькі вырашыўшы гэтую праблему, можна пры разглядзе далікатнай этнічнай тэмы мінімізаваць уплыў эмацыйнага фактару на карысць вопытным шляхам правераных рацыянальных заключэнняў аб стане спраў у сацыяльнай сферы.

Індыкатарамі (ад лац. *indicator – паказальнік*) мы будзем называць колькасныя характарыстыкі вывучаемага аб'екта, у дадзеным выпадку, этнічнага радыкалізму, якія паддаюцца эмпірычнай праверцы. Такое азначэнне індыкатара цалкам адпавядае яго трактоўцы, напрыклад, у Вікіпедыі, дзе тэрмін «індыкатар» (у грамадскіх навуках, у прыватнасці, у сацыялогіі) разумеецца як даступная назіранню і вымярэнню характарыстыка вывучаемага аб'екта, якая дазваляе меркаваць пра іншыя яго характарыстыкі, недаступныя для непасрэднага даследавання [450]. Адзначым адразу, што мы будзем лічыць сінонімам зыходнага паняцця таксама тэрмін “паказчык”, значэнне якога вызначаецца як абагульненая характарыстыка якога-небудзь аб'екта або працэсу, звычайна выражаная ў лічбавай форме [451]: калі гавораць пра сацыяльныя індыкатары, то вельмі часта маюць на ўвазе сацыяльную статыстыку. Так, напрыклад, тлумачыцца гэта паняцце Дэвідам і Джуліяй Джэры, а менавіта, як “рэгулярна збіраемая сацыяльная статыстыка, якая адлюстроўвае прыкметы змяненняў у агульным стане грамадства (напрыклад, даныя злачыннасці, аховы здароўя і смяротнасці)” [452]. Сапраўды, часцей за ўсё

[449] Интернет-ресурс: http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/raceconv.shtml. Доступ 07.11.2012 г.

[450]Интернет-ресурс: http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%98%D0%BD%D0%B4%D0%B8%D0%BA%D0%B0%D1%82%D0%BE%D1%80. Доступ 25.11.2012 г.

[451]Интернет-ресурс: http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9F%D0%BE%D0%BA%D0%B0%D0%B7%D0%B0%D1%82%D0%B5%D0%BB%D1%8C. Доступ 25.11.2012 г.

[452] Большой толковый социологический словарь. М., 2001. Том 2. С. 252.

колькасныя параметры сацыяльных працэсаў адлюстроўваюцца менавіта статыстыкай, якая выпрацавала эфектыўную тэхналогію, абсталяваную шматлікім інструментарыем. Таму, вядома ж, варта прызнаць, што індыкатарамі этнічнага радыкалізму могуць служыць, у першую чаргу, статыстычныя даныя, у прыватнасці, статыстыка Міністэрства ўнутраных спраў, якая адлюстроўвае колькасныя і якасныя характарыстыкі злачыннасці на міжэтнічнай глебе. Аднак пры ўсёй важнасці гэтага каналу інфармацыі аб ступені распаўсюджанасці агрэсіўнага нацыяналізму нам даводзіцца прызнаць відавочную непаўнату статыстычных індыкатараў. Па-першае, па той прычыне, што Закон Рэспублікі Беларусь ад 04.01.2007 № 203-З “Аб супрацьдзеянні экстрэмізму” не дазваляе дыферэнцыраваць разнавіднасці радыкалізму, таму міліцэйская статыстыка папросту не фіксуе ксенафобію, уключаючы яе ў агульную статыстыку экстрэмізму. А па-другое, супрацоўнікі МУС далёка не заўсёды могуць распазнаць этнічны экстрэмізм і часта прымаюць яго праявы за звычайную злачыннасць. І, па-трэцяе, статыстыка наогул і міліцэйская статыстыка у прыватнасці адлюстроўвае факты, якія ўжо адбыліся, што не дазваляе палітыкам і сацыяльным інжынерам працаваць на апярэджанне такога сацыяльна небяспечнага злачынства, якім выступае этнічны радыкалізм.

Усіх гэтых недахопаў пазбаўлены індыкатары, пабудаваныя на аснове сацыялагічнага метаду. Сацыялагічныя індыкатары выкарыстоўваюцца, напрыклад, для вымярэння ўзроўню карупцыі, шчасця, дэмакратыі і многіх іншых, вельмі складаных сацыяльных з’яў. Падыдуць яны і для вымярэння патэнцыяльнага радыкалізму ў грамадстве. Да вартасцей сацыялагічных паказчыкаў можна смела аднесці тое, што з іх дапамогай параўнальна лёгка можна вымерыць узровень кожнай разнавіднасці экстрэмізму, прычым у любым соцыуме, пачынаючы з пэўнага працоўнага (навучальнага) калектыву і заканчваючы глабальным маштабам. Сацыялагічныя паказчыкі этнічнага радыкалізму можна канкрэтызаваць таксама па дэмаграфічных і прафесійных групах насельніцтва, што дазваляе правесці фактарны аналіз, даць дзяржаўным органам магчымасць працаваць адрасна, г.зн. з улікам спецыфікі адпаведнай сацыяльнай групы.

Актуалізацыя этнічнай радыкальнасці можа праяўляцца ў рознай форме як па прадмеце дыскрымінацыі, так і па спосабах выражэння ксенафобіі. Палітыкі павінны разбірацца з паводзінавымі рэцыдывамі этнічнага радыкалізму. А вось сацыёлагі часцей за ўсё маюць справу з вербальнай рэалізацыяй радыкалісцкага патэнцыялу грамадства. У гэтым і заключаецца іх перавага перад палітыкамі, якая дазваляе прадказваць (або прагназіраваць) усплёскі радыкалісцкіх праяў, а не сутыкацца з імі знянацку тварам у твар.

Сацыялагічныя індыкатары здольныя выяўляць схаваныя сацыяльныя пласты патэнцыяльнага радыкалізму, у тым ліку і этнічнага. У гэтым,

мабыць, іх галоўная перавага. Ніякімі іншымі спосабамі немагчыма атрымаць адэкватнае апісанне экстрэміцкіх намераў у сацыяльным маштабе. Нават спецыяльныя службы, прафесійна занятыя выяўленнем патэнцыйных экстрэмістаў, працуюць выключна з асобнымі індывідамі і арганізацыямі. У іх, на шчасце, пакуль няма матэрыяльных, тэхнічных і людскіх рэсурсаў для практычнага ажыццяўлення сцэнарыя татальнага кантролю, аналагічнага антыўтопіям Джорджа Оруэла. Здольнасць сацыялагічнага метаду выяўляць патэнцыйна небяспечныя, з пункту гледжання этнічнага радыкалізму, сацыяльныя групы, якія яшчэ не "саспелі" ідэалагічна і арганізацыйна да тэрарыстычных актаў, стварае ўмовы для прэвентыўнай працы з імі не карных, а выхаваўчых дзяржаўных структур.

Варта заўважыць, што вымярэнні, атрыманыя з дапамогай сацыялагічных індыкатараў, ажыццяўляюцца па вядомых тэхналогіях, што робіць іх лёгка ўзнаўляльнымі рознымі даследчымі інстанцыямі. Вымярэнні, праведзеныя ў маніторынгавым рэжыме, дадуць уяўленне аб дынаміцы працэсу радыкалізацыі нацыянальнай свядомасці ў тым ці іншым рэгіёне або ў краіне ў цэлым. Супастаўляльныя па інструментарыі сацыялагічныя замеры ў розных краінах дазволяць атрымаць дакладныя параўнальныя дадзеныя аб ступені распаўсюджвання ў іх этнічнага экстрэмізму. Немалаважна таксама і тое, што сацыялагічныя замеры эмпірычна правяраемыя на ўсіх тэхналагічных этапах, што істотным чынам павышае ўзровень даверу да іх як з боку даследчыкаў, палітыкаў і практычных працаўнікоў, так і з боку шырокай грамадскасці.

Істотна і тое, што менавіта сацыялагічны метад дазваляе вызначыць фактары рознага паходжання, якія правакуюць этнічны радыкалізм. Фактарны аналіз дае магчымасць больш мэтанакіравана і, такім чынам, больш эфектыўна вырашаць тыя праблемы, якія ўзнікаюць у сферы міжэтнічных адносін, у прыватнасці, праблему этнічнага экстрэмізму. Гэта акалічнасць робіць сацыялогію абавязковым і найважнейшым элементам у сацыяльных тэхналогіях гарманізацыі міжэтнічных адносін у сучасным складанаарганізаваным грамадстве. Усе гэтыя перавагі сацыялагічнага метаду мы і паспрабуем, у сілу нашых магчымасцей, рэалізаваць у дадзеным матэрыяле.

У якасці асноўнага інструмента вымярэння этнічнага радыкалізму мы будзем выкарыстоўваць методыку вызначэння "**індэкса спажывецкіх настрояў**" (ІСН). ІСН як метад сацыялагічнага зандзіравання грамадскай думкі быў створаны ў 1946 годзе навукоўцамі ўніверсітэта штата Мічыган (ЗША). У цяперашні час індэкс спажывецкіх настрояў уваходзіць у лік 11 важнейшых макраэканамічных паказчыкаў, на падставе якіх вылічвае свае прагнозы Бюро эканамічнага аналізу, уключанае ў структуру ўрада ЗША. З 1970-х гадоў індэкс спажывецкіх настрояў актыўна выкарыстоўваецца ў эканамічным і палітычным жыцці ЗША і краін Заходняй Еўропы. У ЗША, напрыклад, бягучы паказчык ІСН аб'яўляецца сродкамі масавай

інфармацыі ў першую пятніцу кожнага месяца ў 10 гадзін раніцы, што сведчыць аб вялікай цікавасці да яго з боку не толькі спецыялістаў, але і шырокай грамадскасці.

Індэкс спажывецкіх настрояў вызначаецца па рознасці станоўчых і адмоўных адказаў рэспандэнтаў на дыхатамічныя пытанні сацыялагічнай анкеты. ІСН вылічваецца такім чынам, што пры 100 % станоўчых адказаў на пытанні анкеты ён роўны 200 балам (максімальны ўзровень), калі ўсе рэспандэнты дадуць адмоўныя адказы – 0 балам (мінімальны ўзровень), а пры роўнасці станоўчых і адмоўных адказаў – 100 балам (нейтральны ўзровень ).

Методыка ІСН, апрабаваная для вымярэння спажывецкіх настрояў, выдатна падыдзе і для індыкацыі этнічнага радыкалізму. Мы толькі заменім пытанні-індыкатары, захаваўшы ў большасці выпадкаў дыхатамічную шкалу адказаў, абавязковую ў выпадку прымянення методыкі ІСН. Наша ўдасканаленне методыкі ІСН закране таксама фармат канчатковых вынікаў вымярэння этнічнага радыкалізму. Мы будзем імкнуцца пераходзіць ад балавага фармату атрыманых значэнняў Індэкса да працэнтнага, прыняўшы за 100% максімальна магчымы узровень радыкалізму. Такі фармат дазволіць больш наглядна прадэманстраваць канкрэтны ўзровень этнічнай нецярпімасці, у дачыненні да адзінай шкалы вымярэнняў.

Такім чынам, з метадычнай прэамбулай, відаць, скончана. Прыступім, нарэшце, да сацыялагічнага вымярэння этнічнага радыкалізму па матэрыялах апытанняў дарослых жыхароў Магілёўшчыны.

Мэтазгодна пачаць з азначэння сацыяльнай базы этнічнай нецярпімасці, якая, у сваю чаргу, спараджае этнічны радыкалізм. На наш погляд, зыходнай ідэалагічнай пазіцыяй, якая прыводзіць у выніку да этнічнай нецярпімасці, выступае падзел людзей на дрэнныя і добрыя народы. Менавіта такі падзел этнасаў з'яўляецца сацыяльна-псіхалагічнай асновай этнічнай дыскрымінацыі аж да самых радыкальных яе праяў. “Добрым” народам заўсёды прызнаецца “карэнны” этнас, а чужынцы кляймуюцца негатыўнай адзнакай. Часцей за ўсё гэта прыводзіць да рэцыдываў этнафобіі. Паглядзім, выкарыстоўваючы сацыялагічны метад, наколькі шырокая сацыяльная база этнафобіі ў Беларусі. Крыніцай у дадзеным выпадку будуць вынікі сацыялагічнага апытання 684 дарослых жыхароў Магілёўскай вобласці, праведзенага пад кіраўніцтвам аўтара супрацоўнікамі кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання ў 2009 годзе. У якасці сацыялагічнага індыкатара этнафобіі мы выкарысталі меркаванне: “Некаторыя нацыі ў нас непажаданыя”, з якім удзельнікі апытання маглі пагадзіцца або не пагадзіцца. Згода з гэтым сцвярджэннем і будзе азначаць прыхільнасць рэспандэнта да ідэалогіі этнафобіі. На малюнку 7 яе сацыяльная база прадстаўлена ў графічным фармаце.




**Малюнак 7 – Стаўленне жыхароў Магілёўскай вобласці да сцвярджэння: *“Некаторыя нацыі ў нас непажаданыя”*, у працэнтах**

Сацыялагічнае апытанне выявіла кожнага трэцяга (34,2 %) дарослага грамадзяніна, схільнага да этнафобіі. Прычым сярод мужчын іх удзельная вага дасягае 41,1 %. Перавядзем першасныя сацыялагічныя даныя, прадстаўленыя на малюнку 1, у фармаце методыкі ІСН. Атрымаем значэнне Індэксу этнафобіі, роўнае 103,8 бала, што складае 51,9 % ад максімальна магчымага ўзроўню. Такая сацыяльная база этнафобіі на Магілёўшчыне.

Варта згадаць пра тое, што аб’ектамі этнафобіі могуць быць усё без выключэння этнасы і народы. Так, напрыклад, на пытанне сацыялагічнай анкеты пра тое, якія ж нацыі і народнасці, па меркаванні ўдзельнікаў апытання, непажаданыя на тэрыторыі Беларусі, былі атрыманыя адказы, якія датычацца чачэнцаў (16,1 %), армян (11,7 %), грузін (11,5 %), азербайджанцаў (11,3 %), цыган (10,5 %), кітайцаў (5,8 %), узбекаў (5,1 %), таджыкаў і туркмен (па 4,8 %), арабаў (4,7 %), мусульман (1,5 %), яўрэяў (4,4 %), неграў (3,5 %), а таксама японцаў (1,5 %), немцаў з амерыканцамі (па 0,9 %). Пералік непажаданых народаў дадзены ў рэдакцыі рэспандэнтаў, якія маглі ўпісаць іх назвы ў анкеце. І спіс гэты далёка не завершаны. У ім апынуліся і блізкія суседзі беларусаў, уключаючы рускіх, літоўцаў і палякаў. Адным словам, калі ўжо ідэя падзелу этнасаў на «сваіх» і «чужых» засела ў мазгах людзей, «дрэннымі» нацыямі могуць для іх стаць любыя народы.

Зразумела, далёка не ўсе нашы землякі, якія з падазронасцю адносяцца да іншых народаў, дойдуць да радыкальных праяў свайго этнічнага непрымання, але этнафобія з'яўляецца спрыяльнай глебай для развіцця бацыл этнічнага радыкалізму. У гэтым сумнявацца не прыходзіцца.

Нацыянальная самасвядомасць народа можа быць радыкалізавана з любой значнай для людзей нагоды і ў рознай ступені, пачынаючы з бяскрыўдных, на першы погляд, яго формаў і заканчваючы адкрытым генацыдам. Улічваючы гэта, мы і пачнем з той формы этнічнай дыскрымінацыі, якая нават і радыкалізмам не ўсімі грамадазнаўцамі прызнаецца. Размова пойдзе пра адзін з самых папулярных лозунгаў

ідэолагаў этнічнай нецярпімасці, згодна з якім пераважнае права на пражыванне на пэўнай тэрыторыі раз і назаўжды замацавана за так званай «карэннай» нацыяй. Наўрад ці варта даказваць, што праславутае «натуральнае» права з'яўляецца формай дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце і недапушчальна ў сучасным свеце. Тым не менш, страхі, звязаныя з «распродажам роднай зямлі чужынцам», апаноўваюць нямала людзей у самых розных краінах, у тым ліку і ў Беларусі.

Адной з формаў этнічнай дыскрымінацыі выступае яго «славянская» разнавіднасць, асноўная фікс-ідэя якога змешчана ў лозунгу: "Славянскія землі – толькі для славян». У нас не выклікае сумнення той факт, што любы падобны лозунг цалкам тоесны па сваім ідэалагічным значэнні дэвізу нямецкіх нацыстаў «Германія – толькі для немцаў». Таму абодва гэтыя лозунгі, роўна як і ўсе іншыя сцвярджэнні такога роду, у якой бы краіне яны ні абвяшчаліся, сведчаць аб наяўнасці на пабытавым узроўні прыкмет ідэалогіі этнічнай дыскрымінацыі. Наколькі папулярныя ідэі «натуральнага славянскага права» сярод грамадзян Беларусі? Гэта можна ўбачыць на дыяграме малюнка 8, на якой прадстаўлены вынікі нашага апытання жыхароў Магілёўшчыны ў 2009 годзе [453].




**Малюнак 8 – Стаўленне жыхароў Магілёўскай вобласці да сцвярджэння: *"Славянскія землі – толькі для славян"*, у працэнтах**

Па методыцы ІСН мы павінны ад долі станоўчых адказаў адняць працэнт рэспандэнтаў, якія адмаўляюць правільнасць прынцыпу славянскага шавінізму. У выніку, атрымаем значэнне Індэкса этнічнай славянскай нецярпімасці, роўнае 62,9 бала. Заўважым, што максімальна магчымае значэнне гэтага Індэкса складае 200 балаў. Такім чынам, у адносінах да максімуму этнічнай дыскрымінацыі наяўнае значэнне славянскай этнічнай нецярпімасці складала ў 2009 годзе 31,5 %.

Падкрэслім, што мы тут не аналізуем саму з'яву этнічнай нецярпімасці як такавую. Нам важна выпрацаваць інструментарый і

[453] Апытанне 684 дарослых (старэйшых за 16 гадоў) жыхароў Магілёўскай вобласці праведзена ў 2009 годзе супрацоўнікамі кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання.

методыку вымярэння этнічнага радыкалізму ў любым сацыякультурным асяроддзі. На дадзеным этапе можна канстатаваць працаздольнасць методыкі ІСН, прыменenaй для аналізу этнічнай нецярпімасці. Выкарыстанне дыхатамічнай шкалы («згодныя» – «нязгодныя») у сацыялагічнай анкеце падчас масавага апытання з наступным пераводам ў балы па методыцы ІСН дазваляе звесці любыя атрыманыя такім шляхам даныя ў супастаўляльны фармат. А на гэтай аснове адкрываецца магчымасць для шырокага параўнальнага аналізу этнічнай дыскрымінацыі на любым сацыяльным матэрыяле.

Праілюструем дзейснасць прапанаванай методыкі аналізу этнічнай нецярпімасці на прыкладзе яшчэ адной мадыфікацыі нацысцкага лозунгу, які ў мясцовай трактоўцы гучыць наступным чынам: “Беларусь – толькі для беларусаў”. У ходзе апытання ў 2009 годзе 684 дарослых жыхароў Магілёўскай вобласці мы атрымалі наступныя адказы на адпаведнае пытанне ананімнай сацыялагічнай анкеты (гл.: малюнак 9).




**Малюнак 9 – Стаўленне жыхароў Магілёўскай вобласці да сцвярджэння: *“Беларусь – толькі для беларусаў”*, у працэнтах**

Аказваецца, прыхільнікаў адкрыта дыскрымінацыйнага лозунгу сярод грамадзян Беларусі не так ужо і мала, а менавіта, цэлых 12,7 %. Ужо гэтыя даныя можна лічыць адэкватным сведчаннем наяўнасці бацыл бытавой ксенафобіі ў краіне. Аднак выкарыстанне методыкі ІСН дазволіць удакладніць індыкацыю ўзроўню этнічнай нецярпімасці, “ачысціўшы” зыходныя дадзеныя ад “перашкод” у асобе тых, хто ўхіліўся ад адказу на гэтае пытанне. Такім чынам, ад станоўчых адказаў (працэнт згодных з лозунгам “Беларусь – толькі для беларусаў”) аднімем ўдзельную вагу тых, хто не пагадзіўся з ім. Атрымаем ўзровень этнічнай беларускай нецярпімасці, роўны 53,1 бала (пры мінімальным значэнні 0 балаў і максімальным – 200 балаў). У больш звыклым працэнтным фармаце паказчык этнічнай нецярпімасці будзе роўны 26,5 % ад максімальна магчымага ўзроўню. Апрацаваныя з дапамогай методыкі ІСН даныя сацыялагічных апытанняў зараз можна смела параўноўваць з вынікамі

апытанняў, праведзеных у іншы час або на іншым сацыяльным масіве. Так, падобнае сацыялагічнае апытанне, праведзенае намі ў 2007 годзе, выявіла ўзровень “беларускай” нецярпімасці, роўны 46,9 балам або 23,5 % ад максімальна магчымага ўзроўню, што, як відаць, некалькі менш, чым двума гадамі пазней. На гэтай падставе можна зрабіць папярэднюю выснову пра тое, што, магчыма, выявілася тэндэнцыя павышэння ўзроўню этнічнай нецярпімасці ў Магілёўскім рэгіёне.

Узроставыя паказчыкі этнічнай нецярпімасці беларускай разнавіднасці, разлічаныя па методыцы ІСН, з паралельным працэнтным суправаджэннем паказаны на малюнку 10.




**Малюнак 10 – Стаўленне грамадзян рознага ўзросту да сцвярджэння: *“Беларусь – толькі для беларусаў”*, у працэнтах і ў балах**

На малюнку 4 мы сумясцілі два спосабы прадстаўлення ўзроўню этнічнай нецярпімасці сярод прадстаўнікоў розных пакаленняў нашых землякоў. Зыходныя сацыялагічныя даныя, якія характарызуюць удзельную вагу рэспандэнтаў розных узростаў, згодных і нязгодных з лозунгам “Беларусь – толькі для беларусаў”, прадстаўлены гістаграмамі. Лінейны графік зафіксаваў узровень этнічнай нецярпімасці ў балах па методыцы ІСН. На малюнку 4 добра відаць, што методыка ІСН, не скажаючы логікі першасных сацыялагічных даных, надае ім ўласцівасць адназначнасці і супастаўляльнасці з вынікамі іншых аналагічных даследаванняў. Адзначым відавочныя ўзроставыя адрозненні ў ступені прыхільнасці нашых суграмадзян да ідэалогіі этнічнай дыскрымінацыі, якія добра бачныя на малюнку 4. Індэкс этнічнай нецярпімасці сярод моладзі апынуўся ў паўтара разы меншым, чым у прадстаўнікоў старэйшага пакалення (адпаведна, 44,8 бала супраць 68 балаў). Верагодна, гэты факт можна растлумачыць уплывам на сучасную моладзь інтэрнацыянальнага, па сутнасці, працэсу глабалізацыі і, у прыватнасці, праз разнастайныя Інтэрнэт-тэхналогіі, якія забяспечваюць больш шырокае кола зносін маладых людзей у параўнанні з іх старэйшымі землякамі.

Іншым фактарам, які ўплывае на засваенне людзьмі нацыяналістычных прынцыпаў, апынуўся тып паселішчаў. У гэтым можна пераканацца, зірнуўшы на малюнак 11, на якім мы адлюстравалі пасяленчую залежнасць этнічнай нецярпімасці.




**Малюнак 11 – Стаўленне грамадзян, якія пражываюць у паселішчах рознага тыпу, да сцвярджэння: *"Беларусь – толькі для беларусаў"*, у працэнтах і ў балах**

На малюнку 5 зусім відавочна прасочваюцца павышаныя дыскрымінацыйныя арыентацыі сельскіх жыхароў у параўнанні з гараджанамі. Гэтым фактам адлюстроўваюцца культурныя адрозненні сельскага і гарадскога ладоў жыцця. Канкрэтна гэта можа выяўляцца ў розным узроўні адукацыі асноўнай масы насельніцтва ў вёсках і буйных гарадах. Ва ўсякім выпадку, паніжальны ўплыў адукацыі на схільнасць людзей да этнічнай нецярпімасці прасочваецца абсалютна выразна. Гэта можна ўбачыць на малюнку 12.




**Малюнак 12 – Стаўленне грамадзян з розным узроўнем адукацыі да сцвярджэння: *"Беларусь – толькі для беларусаў"*, у працэнтах і ў балах**

На прыкладзе даных, прадстаўленых на малюнку 6, можна бачыць эўрыстычныя вартасці новага метаду, якія выяўляюцца, у прыватнасці, у здольнасці фіксацыі асаблівасцей праявы ксенафобіі як па часовым

вектары, так і пад уплывам таго ці іншага фактара. У дадзеным выпадку добра бачны  адваротна прапарцыянальны ўплыў узроўню адукацыі на прыхільнасць людзей да спакусы дыскрымінацыі іншародцаў на карысць “карэннага” этнасу. Чым вышэйшы ў чалавека ўзровень адукацыі, тым вышэйшы ў яго імунітэт супраць бацыл этнічнай нецярпімасці. Гэты факт абнадзейвае, улічваючы як сусветную, так і нацыянальную тэндэнцыю да павышэння агульнай культуры насельніцтва і ўзроўню яго адукацыі. Можна спадзявацца на тое, што ў будучым грамадстве высокаадукаваных людзей ксенафобія стане такім жа анахранізмам, як і канібалізм у першабытную эпоху.

Аднак нават цяперашняя эпоха ўсеагульнай вышэйшай адукацыі пакуль не стала “залатым стагоддзем” этнічнай талерантнасці. Важна паспрабаваць адказаць на пытанне: “Чаму?”. Верагодна, ёсць важкія матэрыяльныя прычыны гістарычнай неўміручасці гэтага першабытнага рудымента. На наш погляд, таямніца ксенафобіі заключаецца ў тым, што яна адкрывае доступ да рознага роду пераваг так званых “карэнных” этнасаў.

Атрыманне прывілеяў і пераваг, заснаваных не на асабістых вартасцях (ведах і уменнях) грамадзян, а па прычыне іх самаідэнтыфікацыі з “карэннай” нацыяй, заўсёды было безадказна працуючым “пернікам” для сацыяльных груп з нізкімі канкурэнтнымі здольнасцямі. Гэтыя прывілеі тычацца, перш за ўсё, выключнай для прадстаўнікоў “карэннага” этнасу магчымасці набыцця зямлі і нерухомасці, а таксама іх пераважнага доступу да высокастатусных працоўных месцаў. Дыскрымінацыя іншародцаў па гэтых двух параметрах і складае каштоўнаснае “ядро” этнічнай нецярпімасці, незалежна ад эпохі або краіны. Паглядзім, наколькі прывабнымі гэтыя нацыяналістычныя “пернікі” з’яўляюцца для нашых суграмадзян – жыхароў Беларусі. На малюнку 13 дадзена візуальнае адлюстраванне грамадскай думкі Магілёўшчыны з нагоды таго, ці варта забараніць прадстаўнікам іншых этнасаў купляць на тэрыторыі Беларусі зямлю і нерухомасць.

Аказалася, што кожны пяты (19,2 %) наш зямляк цвёрда ўпэўнены ў неабходнасці такой забароны і яшчэ 28,4 % дарослых жыхароў Магілёўшчыны часткова схіляюцца да такога меркавання. Такім чынам, амаль палова нашых суграмадзян (47,6 %) цалкам або часткова падтрымалі б гэтую, адкрыта дыскрымінацыйную ў адносінах да некарэнных этнасаў, меру. Аднак грамадзянамі, радыкальна настроенымі супраць распродажу зямлі чужынцам, мы будзем лічыць толькі тыя 19,2 % рэспандэнтаў, якія цвёрда ўпэўненыя ў мэтазгоднасці такой забароны. У выніку, Індэкс “зямельнай” этнічнай нецярпімасці сярод нашых суайчыннікаў роўны 67,7 бала, ці 33,8 % у адносінах да максімальна магчымага ўзроўню.




**Малюнак 13 – Стаўленне жыхароў Магілёўскай вобласці да сцвярджэння: "*Неабходна забараніць прадстаўнікам іншых этнасаў купляць нерухомасць і зямлю*", у працэнтах**

Падобным жа чынам вымерым узровень "статуснай" этнічнай нецярпімасці, якая дыскрымінуе іншародцаў у іх магчымасці займаць важныя пасады ва ўладнай іерархіі. На малюнку 14 прыведзены агульныя суадносіны грамадзян Беларусі як згодных, так і нязгодных з гіпатэтычнай забаронай на высакастатусныя пасады для прадстаўнікоў непажаданых нацый.




**Малюнак 14 – Стаўленне жыхароў Магілёўскай вобласці да сцвярджэння: "*Неабходна забараніць прадстаўнікам іншых этнасаў займаць важныя пасады*", у працэнтах**

Прыхільнікаў забароны для чужынцаў займаць важныя пасады аказалася нават больш, чым абаронцаў роднай зямлі. Амаль трэць (30,0 %) удзельнікаў апытання пагадзіліся б з такой прапановай цалкам і яшчэ прыкладна столькі ж (28,4 %) – часткова. Але безумоўную прыхільнасць да падобнай дыскрымінацыі праявілі толькі першыя, таму для разліку Індэкса "статуснай" этнічнай нецярпімасці спатрэбяцца толькі яны. У выніку шукаемы Індэкс роўны 89,4 бала, што складае 44,7 % ад максімальна магчымага ўзроўню дыскрымінацыі. Прычым для мужчын Індэкс "статуснай" этнічнай нецярпімасці склаў 49 % ад максімальна магчымага ўзроўню, а для жанчын – 40,3 %.

У нас ёсць магчымасць параўнаць даныя сацыялагічнага апытання 2009 года з вынікамі аналагічнага даследавання, праведзенага намі ў

1997 г. [454] Праўда, тады мы апытвалі толькі моладзь да 30 гадоў, таму для карэктнага параўнання ў выніках апытання 2009 года мы будзем улічваць меркаванне адпаведнай групы рэспандэнтаў. На малюнку 15 можна візуальна ўпэўніцца ў зменах, якія адбыліся за 13 гадоў у светапоглядзе маладых жыхароў Беларусі з нагоды гіпатэтычнай забароны прадстаўнікам непажаданых этнасаў займаць важныя пасты.




**Малюнак 15 – Стаўленне моладзі ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў да сцвярджэння: *“Неабходна забараніць прадстаўнікам іншых этнасаў займаць важныя пасады”* ў 1997 і 2009 гг., у працэнтах**

Лёгка ўбачыць розніцу ў выніках апытанняў 1997 і 2009 гг. Удзельная вага маладых людзей, дыскрымінацыйна настроеных у дачыненні да непажаданых этнасаў за перыяд паміж даследаваннямі павялічылася з 55,5 % у 1997 годзе да 64,2 % у 2009 годзе, а доля талерантнай моладзі, насупраць, скарацілася з 39,2 % да 35,3 %. У фармаце тэхналогіі ІСН дынаміка змены этнічнай нецярпімасці будзе выглядаць наступным чынам: у 1997 годзе ўзровень падтрымкі “статуснай” дыскрымінацыі ў маладзёжным асяродку складаў 85,5 бала (42,7 % да максімуму), а ў 2009 годзе – ужо 97,9 бала, што склала 49 % у дачыненні да максімальна магчымага значэння. У выніку мы яшчэ раз упэўніліся ў працаздольнасці прапанаванай методыкі, якая дазваляе праводзіць параўнальны аналіз і па часовым вектары.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў адпаведнасці з заканадаўствам маглі перадаваць ва ўласнасць або бязвыплатнае карыстанне рэлігійным арганізацыям царкоўныя будынкі, культавую маёмасць. Рэлігійныя арганізацыі, у адпаведнасці з законам мелі пераважнае права на перадачу ім культавых будынкаў з прылеглай тэрыторыяй (артыкул 19).

Назіраўся даволі шырокі размах будавання храмаў. У якасці прыкладу варта прывесці з'яўленне мусульманскіх святынь. На той час, калі распачалося татарскае адраджэнне ў Беларусі, з 19-ці даваенных мячэцей заставалася толькі адна – у Іўі (у 2002 г. яна адзначыла сваё 120-годдзе). У 1994 г. адноўлена мячэць у Слоніме, у 1996 г. з'явілася мячэць у Смілавічах (Чэрвеньскі раён), у 1997 г. – у Навагрaдку, у 1999 г. – у Відзах (Браслаўскі раён), у 2000 г. – у Клецку, у 2002 г. – у Маладзечна і Лоўчыцкая мячэць (вёска Католышы Навагрaдскага раёна), у 2003 г. прыступілі да ўзвядзення мячэці па вул. Грыбаедава ў Мінску [467].

Рэлігійныя ўпраўленні і цэнтры, паводле закона 1992 г. у адпаведнасці са сваімі статутамі маглі засноўваць кляштары, місіі, братэрствы, і духоўныя вучэбныя ўстановы, сродкі масавай інфармацыі. Рэлігійныя арганізацыі атрымалі права ў адпаведнасці з заканадаўствам і са сваімі статутамі засноўваць выдавецкія, паліграфічныя, вытворчыя, рэстаўрацыйна-будаўнічыя, сельскагаспадарчыя і іншыя прадпрыемствы, якія падлягалі дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама дабрачынныя ўстановы (прытулкі, інтэрнаты, лякарні і інш.). Такім чынам яны атрымалі шырокія правы па ажыццяўленні сваёй дзейнасці [468].

Закон "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях" і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, якая была прынята 15.03.1994 г., заклалі падмуркі інстытута свабоды сумлення ў Беларусі, замацавалі прававы статус рэлігійных арганізацый у адпаведнасці з міжнароднымі прававымі стандартамі. У Канстытуцыі і законе ўсталёўвалася, што кожны мае права на свабоду сумлення, права самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выяўляць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя са стаўленнем да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў. Канстытуцыя і закон замацавалі права бацькоў выхоўваць дзяцей у адпаведнасці са сваім уласным стаўленнем да рэлігіі.

У вышэй названых дакументах замацоўваўся прынцып роўнасці ўсіх перад законам незалежна ад рэлігійных перакананняў. Закон забараняў

---

[467] Канапацкі І. Татары-мусульмане ў Беларусі. С. 46; Гембіцкая М. Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі. С. 39.

[468] Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях : Закон Рэспублікі Беларусь ад 17.12.1992 г. , № 2054 – XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1993. № 2. Арт. 18.

патрабаваць ад грамадзяніна указваць сваё стаўленне да рэлігіі ў афіцыйных дакументах, акрамя выпадкаў, калі гэтага жадае сам грамадзянін. Таксама сцвярджалася роўнасць перад законам усіх рэлігій і веравызнанняў.

Рэлігійныя арганізацыі прызнаваліся юрыдычнымі асобамі з моманту рэгістрацыі іх статутаў. Парадак іх рэгістрацыі істотна спрасціўся і была ўведзеная судовая абарона правоў дадзеных арганізацый у выпадку адмовы ў рэгістрацыі. Ва уласнасці рэлігійных арганізацый сталі знаходзіцца будынкі і культавая маёмасць. У выніку рэлігійныя арганізацыі займаліся дабрачыннай і культурна-асветніцкай дзейнасцю, выраблялі, экспартавалі, імпартавалі і распаўсюджвалі рэлігійную літаратуру, засноўвалі сродкі масавай інфармацыі, вытворчыя, сельскагаспадарчыя і іншыя прадпрыемствы [469].

Рэалізацыю права на свабоду сумлення таксама забяспечвалі Закон ад 19.12.1991 г. “Аб святочных днях у Рэспубліцы Беларусь” і Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.12.1992 г. № 30 “Аб парадку вызначэння непрацоўных дзён для веруючых нехрысціянскіх рэлігій у сувязі з іх святамі”. У снежні 1991 г. законам былі ўсталяваны ў якасці непрацоўных святочных дзён праваслаўныя і каталіцкія Каляды і па календарах праваслаўных і каталікоў другі дзень Пасхі (Вялікадня). Савет Міністраў Беларусі, каб пазбегнуць дыскрымінацыі прадстаўнікоў іншых канфесій, прыняў адмысловую пастанову, у якой гаварылася, што “рабочым і служачым – веруючым іўдзейскай і мусульманскай рэлігій могуць прадастаўляцца па ўзгадненні з адміністрацыяй прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама грамадзянамі–прадпрымальнікамі непрацоўныя дні (без аплаты) для святкавання наступных рэлігійных свят: па іўдзейскім календары: Пасха (Песах) – першы і апошні дні, Рош-Ашана – адзін дзень, Іом-Кіпур – адзін дзень; па мусульманскім календары: Рамазан, Ураза-байрам, Курбан-байрам і Мавлюд – па адным дні” [470]. Артыкул 14 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь замацаваў забарону на абмежаванні ў працоўных правах і на атрыманне якія-небудзь пераваг у залежнасці ад рэлігійных поглядаў. Было сцверджана, што дыскрымінацыйныя ўмовы калектыўных дамоў з’яўляюцца несапраўднымі, а асобы, якія лічаць, што яны падвергнуліся дыскрымінацыі, мелі права звярнуцца ў суд [471].

Асабліва прыкметныя змены ў параўнанні з раней дзеючым заканадаўствам, якое ўтрымлівала сур’ёзныя абмежаванні, што закраніулі

[469] Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях : Закон Рэспублікі Беларусь ад 17.12.1992 г. , № 2054 – XII.
[470] О порядке определения нерабочих дней для верующих нехристианских религий в связи с их праздниками: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 22 января 1992 г., № 30 // Собрание Постановлений Правительства Республики Беларусь. 1992. № 2. Ст. 28.
[471] Трудовой кодекс Республики Беларусь. С обзором изменений, внесеных Законом Республики Беларусь от 20 июля 2007г. № 272–3. Минск, 2007.

права на навучанне рэлігіі па-за сям'ёй і права ўдзельнічаць у рэлігійных абрадах, адбыліся ў адносінах да права непаўналетніх на свабоду сумлення. Паводле часткі 1 артыкула 8 Закона "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях", быў замацаваны свецкі характар дзяржаўнай сістэмы адукацыі, які "не ставіць мэтай фарміраванне тых або іншых адносін да рэлігіі", а частка 2 названага артыкула надзяліла рэлігійныя арганізацыі правам "ствараць для рэлігійнай адукацыі дзяцей ... навучальныя установы і групы, а таксама праводзіць навучанне ў іншых формах…". Адзінай умовай такой дзейнасці з'яўлялася рэгістрацыя статуту арганізацыі [472].

Права кожнага дзіцяці на свабоду веравызнання знайшло сваё развіццё ў Законе "Аб правах дзіцяці", які быў прыняты 19.11.1993 г. Паводле яго, усе дзеці маюць роўныя правы незалежна ад стаўлення да рэлігіі; кожнае дзіця можа самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, а дзяржава не павінна ўмешвацца ў выхаванне дзіцяці, заснаванае на вызначаным рэлігійным светапоглядзе бацькоў або асоб, якія іх замяняюць, за выключэннем выпадкаў, калі гэта пагражае жыццю і здароўю дзіцяці, парушае яго законныя правы [473]. Зыходзячы з канстытуцыйнага прынцыпу адказнасці бацькоў за выхаванне дзяцей (частка 3 артыкула 32 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), было сцверджана, што "ў адносінах да дзіцяці, якое не дасягнула ўзросту 15 гадоў, рэлігійныя абрады адпраўляюцца са згоды бацькоў або асоб, якія іх замяняюць".

Заканадаўства першай паловы 90-х гадоў XX стагоддзя забяспечыла "новые правовые основания государственно-конфессиональных отношений, создав благоприятный, либеральный правовой климат для религиозной деятельности" [474]. Мы павінны адзначыць, што ліберальная мадэль дзяржаўна-канфесійных адносін, замацаваная ў Законе "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях", якая склалася ў першай палове 1990-х не ўсімі ацэньваецца станоўча. Выказваецца меркаванне, што нормы закона 1992 г. "были вызывающе либеральными", што "привело не столько к возрождению традиционных конфессий, сколько к лавинообразному росту числа нетрадиционных религиозных организаций и групп, активизации деятельности зарубежных миссионеров, к росту прозелитизма" [475].

З прыняццем на рэферэндуме 24.11.1996 г. новай рэдакцыі

---

[472] Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях : Закон Рэспублікі Беларусь ад 17.12.1992 г. Арт. 18.

[473] Аб правах дзіцяці: Закон Рэсп. Беларусь, 19 лістапада 1993г., № 2570 – XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 1993г. № 34. Арт. 430.

[474] Старостенко В.В. Становление правового обеспечения свободы совести в Республике Беларусь // Романовские чтения: сб. трудов Международной науч. конференции. Могилев, 2005. С. 393.

[475] Безнюк Д.К. Особенности государственно- конфессиональных отношений в современной Беларуси: социологический аспект // Социология. 2005. № 2. С. 65.

Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, канстытуцыйныя нормы, якія прысвечаны адносінам дзяржавы і канфесій, зведалі істотныя змены. Артыкул 16 Канстытуцыі 1994 г., сцвярджаў: “Усе рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам. Наданне якіх-небудзь пераваг або абмежаванняў адной рэлігіі або веравызнанню ў адносінах да іншых не дапускаецца. Забараняецца дзейнасць канфесійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, якая накіравана супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды ці звязана з парушэннем правоў і свабод грамадзян. Адносіны дзяржавы і канфесій рэгулююцца законам” [476]. Пасля прыняцця змен на рэферэндуме 1996 г. артыкул 16 атрымаў наступнае гучанне: “Рэлігіі і веравызнанні роўныя перад законам. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Забараняецца дзейнасць рэлігійных арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, накіраваная супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды ці звязана з парушэннем правоў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджае выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або прычыняе шкоду іх здароўю і маральнасці” [477]. Інакш кажучы, у артыкуле 16 новай рэдакцыі Канстытуцыі была знята ранейшая забарона на сцвярджэнне якіх-небудзь пераваг або абмежаванняў адной рэлігіі або веравызнання ў адносінах да іншых рэлігій ці веравызнанняў. Такім чынам у самой Канстытуцыі знаходзіцца падстава для магчымай дыферэнцыяцыі рэлігійных арганізацый з боку дзяржавы і пабудовы з імі нятоесных адносін.

Артыкул 31, які замацоўваў права кожнага “самастойна вызначаць свае адносіны да рзлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў” быў дапоўнены словамі “не забароненых законам” [478]. Такім чынам, хоць астатнія канстытуцыйныя палажэнні, якія датычацца свабоды сумлення, і працягваюць дзейнічаць, несумненным з’яўляецца змена падыходу дзяржаўнай улады да рэгулявання рэлігійнай сферы грамадскіх адносін. З прыняццем новай рэдакцыі Кантытуцыі Рэспублікі Беларусь пачаўся новы этап дзяржаўна-канфесійных адносін, які характарызаваўся паступовым адыходам дзяржавы ад ліберальнай мадэлі дзяржаўна-канфесійных адносін.

Канстытуцыя валодае вяршэнствам не толькі па стаўленні да нормаў зноў уводзімых прававых актаў, але і раней прынятых, Закон аб свободзе

[476] Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, 15 сакавіка 1994г., № 2875 – XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1994. № 9. Арт. 144.
[477] Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г.
[478] Там жа.

веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях 1992 г. павінен быў прывесціся ў адпаведнасць з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. У 1995 г., пасля прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 15.03.1994 г., быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь ад 17.01.1995 г. "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях" [479]. У 1999 г. прымаецца Закон Рэспублікі Беларусь ад 29.11.1999 г. № 327–З "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя Законы Рэспублікі Беларусь", які таксама ўнёс нязначныя змены ў Закон "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях" [480].

Тагачасную міжканфесійную сітуацыю ў Беларусі дакладна ахарактарызаваў муфцій І.Александровіч у сваім інтэрв'ю газеце "Звязда": "Беларусь мы лічым сваёй другой радзімай… За ўсю гісторыю татар на гэтай зямлі не было ніводнага канфлікту паміж мусульманамі і карэнным насельніцтвам. І зараз няма ніякага процістаяння… Сёння ў нас вялізнае поле дзейнасці – асветніцтва" [481].

Прававое забеспячэнне свабоды сумлення ў Рэспубліцы Беларусь у першае дзесяцігоддзе XXI ст. нараўне з Канстытуцыяй засноўвалася на новай рэдакцыі Закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях" ад 31.10.2002 г. № 137–З [482].

Зыходнымі прынцыпамі праваадносін у вобласці рэлігійнага жыцця Закон 2002 г. абвяшчаў права грамадзян на "свабоду сумлення і свабоду веравызнання", на роўнасць незалежна ад стаўлення да рэлігіі; роўнасць рэлігій перад законам і інш. Адначасова ў ім было ўведзена палажэнне аб прызнанні "определяющей роли Православной церкви в историческом становлении и развитии духовных, культурных и государственных традиций белорусского народа", аб "духовной, культурной и исторической роли Католической церкви на территории Беларуси" і "неотделимости от общей истории народа Беларуси Евангелическо-лютеранской церкви, иудаизма и ислама". Можна сцвярджаць, што ў законе фактычна вызначана кола рэлігій і канфессій, якія прызнаюцца ў рэспубліцы традыцыйнымі веравызнаннямі. Прэамбула Закона не мае сілы прамога юрыдычнага дзеяння, аднак змяшчанае ў ёй ранжыраванне рэлігійных арганізацый, што аказвала ўплыў на распрацоўку шэрагу нарматыўных дакументаў розных ведамстваў.

Зафіксаваныя ў Законе 2002 г. прававыя нормы паказваюць, што Беларусь заставалася свецкай дзяржавай. Дзяржаўная сістэма адукацыі

---

[479] Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях": Закон Рэсп. Беларусь, 17 студзеня 1995г., № 3533 – XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995. № 13. Арт. 125.

[480] Аб унясенні змяненняў і дапайненняў у некаторыя Законы Рэспублікі Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 29 лістапада 1999г., № 327 – З. Арт. 518.

[481] Мядзведзева В. Нельга дапусціць процістаяння рэлігій. С. 2.

[482] Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях": Закон Рэсп. Беларусь, 31 кастрычніка 2002г., № 137–З // НРПА. 2002. № 123. 2/886.

павінна насіць свецкі характар і не ставіць мэты фарміравання таго або іншага стаўлення да рэлігіі (Арт. 9). На рэлігійныя арганізацыі не ўскладалася выкананне якіх-небудзь дзяржаўных функцый, дзяржава не павінна была ўмешвацца ў іх законную дзейнасць. Рэлігійныя арганізацыі мелі права ўдзельнічаць у грамадскім жыцці, але не ў дзейнасці палітычных партый (Арт. 8).

Законам рэгуляваліся ўзаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа (Арт. 8.1). Новая рэдакцыя закона не ўтрымлівала нормы аб забароне на фінансаванне рэлігійных арганізацый дзяржавай (Арт. 7 Закона 1992 г.), але абвяшчала, што дзяржава будуе свае ўзаемаадносіны з рэлігійнымі аб'яднаннямі шляхам заключэння пагадненняў (Арт. 8.7). На падставе дадзенай нормы 12.06.2003 г. была падпісана "Дамова аб супрацоўніцтве" паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой (БПЦ). Пагадненне вызначала прынцыпы і асноўныя кірункі супрацоўніцтва паміж дзяржавай і БПЦ, але фактычна ў яго сферы апынуліся ўсе бакі грамадскага жыцця, за выключэннем уласна палітычнай дзейнасці.

Напрыканцы 2006 г. у Доме міласэрнасці Усесвяцкага прыхода г. Мінска прайшло выязное паседжанне Калегіі Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. На ім абмяркоўвалася рэалізацыя Дамовы аб супрацоўніцтве Беларускай Праваслаўнай Царквы і Рэспублікі Беларусь.

Паседжанне ўзначальвалі старшыня Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Л. Гуляка і мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. У працы паседжання прыняў удзел сустаршыня сумеснага савету па супрацоўніцтву ў сферы выхавання архіепіскап Полацкі і Глыбоцкі Феадосій, супрацоўнікі сумесных Кардынацыйных саветаў, камісій, і працоўных груп дзяржаўных органаў і Беларускай Праваслаўнай Царквы, якія працавалі над рэалізацыяй падпісаных праграм.

Было адзначана, што ў перыяд да 2006 г. былі дасягнуты станоўчыя вынікі сумеснай дзейнасці БПЦ з Міністэрствамі адукацыі, аховы здароўя і сацыяльнай абароны, МУС Беларусі, Памежнымі войскамі, НАНБ, Міністэрствам культуры і іншымі міністэрствамі і ведамствамі.

Закон 2002 г. акрэсліваў прававы статус рэлігійных арганізацый. Рэлігійнымі арганізацыямі прызнаваліся аб'яднанні грамадзян (рэлігійныя аб'яднанні) або рэлігійныя абшчыны, а таксама кляштары, іншыя рэлігійные арганізацыі, рэлігійныя місіі, духоўныя вучэбныя ўстановы. Узначальваць рэлігійныя арганізацыі маглі толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь (Арт. 13).

Закон 2002 г., у параўнанні з заканадаўствам 1992 г., больш рэгламентаваў стварэнне рэлігійных арганізацый. Рэлігійныя абшчыны маглі ўтварацца па ініцыятыве не меней за дваццаць грамадзян Рэспублікі

Беларусь, якія стала пражывалі ў адным або некалькіх сумежных населеных пунктах, і іх дзейнасць абмяжоўвалася тэрыторыяй пражывання членаў рэлігійнай арганізацыі (Арт. 14). Прававой асновай для іх дзейнасці заставалася абавязковая рэгістрацыя. З таго моманту яны набывалі статус юрыдычнай асобы (Арт. 16.1). Гэтыя палажэнні юрыдычна выключалі магчымасць легітымнай дзейнасці малых (да 20 чалавек) рэлігійных груп. Рэгістрацыя абшчын, якія вызнавалі веравучэнні, раней невядомыя ў Рэспубліцы Беларусь адбывалася толькі пасля таго, як прадстаўленыя імі дакументы праходзілі дзяржаўную рэлігіязнаўчую экспертызу (Арт. 17). Таксама экспертыза праводзілася пры ўвозе ў рэспубліку рэлігійнай літаратуры і іншых прадметаў рэлігійнага прызначэння і распаўсюджванні гэтых матэрыялаў, а калі рэлігійная літаратура паступала ў бібліятэчныя фонды, то экспертыза гэтай літаратуры станавілася абавязковай.

У параўнанні з Законам 1992 г. у 2002 г. была ўведзеная сістэма кантролю за выкананнем заканадаўства аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях, якая ажыццяўлялася рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання па справах рэлігій (з 2006 г. – Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей) (Арт. 10, Арт. 36.1). Да кампетэнцыі дадзенай установы аднесены, у прыватнасці, праверка дзейнасці рэлігійных арганізацый у частцы выканання імі статутаў і існуючага заканадаўства, зварот у суд з заявай аб ліквідацыі рэлігійнай арганізацыі, прызначэнне дзяржаўнай экспертызы, стварэнне для яе правядзення экспертнай рады і іншае (Арт. 11).

12.04.2002 г. быў прыняты загад № 5 Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь “Аб зацвярджэнні Палажэння аб Экспертнай радзе”.

Экспертная рада была створана для падрыхтоўкі заключэнняў і рэкамендацый па недапушчэнні дзейнасці арганізацый, іх органаў і прадстаўнікоў, дзейнасць якіх супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Асноўныя задачы рады: правядзенне рэлігіязнаўчай экспертызы і падрыхтоўка па яе выніках экспертных заключэнняў; аналіз на прадмет адпаведнасці заканадаўству Рэспублікі Беларусь статутаў, веравучэнняў і адпавядаючых ім практык; аналіз дзейнасці і статутаў рэлігійных арганізацый пры прахаджэнні імі дзяржаўнай рэгістрацыі; вызначэнне характару веравучэнняў і адпавядаючых ім практык; вывучэнне дзейнасці арганізацый і груп, што займаліся рэлігійнай дзейнасцю, на прадмет яе адпаведнасці заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Аналізуючы адносіны ўладаў Рэспублікі Беларусь з рэлігійнымі арганізацыямі на сучасным этапе можна адзначыць розныя падыходы ў адзнаках іх сутнасці. Адны вызначаюць як “мадэль новага тыпу, якой найбольш падыходзіць назва мадэль постсавецкая” [483]. Іншыя

[483] Matwiejuk I. Normatywny model stosunków państwa z kościołami i związkami wyznaniowymi w Republice Białoruś // Polsko–Białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe. S. 628.

падкрэсліваюць, што ў апошія гады ў пытаннях веравызвання ў Рэспубліцы Беларусь створаны ўмовы для развіцця розных канфесій. Такая добрая, спакойная канфесіянальная сітуацыя ў першую чаргу звязана з ментальнасцю беларусаў і правільнай ідэалагічнай накіраванасцю сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Дзяржава на самым высокім ўзроўні клапоціцца аб захаванні таго асаблівага канфесіянальнага і міжнацыянальнага міру ў Рэспубліцы Беларусь, чаго імкнуцца дасягнуць многія еўрапейскія краіны, паколькі ў свеце моцнага міграцыйнага патоку яны не могуць забяспечыць мірнага суіснавання і ўзаемапавагі народаў да розных культур і рэлігій [484].

Беларускае заканадаўства аб свабодзе сумлення і свабодзе веравызнання было не пазбаўлена пэўных супярэчнасцей, але дазваляла дзяржаве ажыццяўляць эфектыўнае рэгуляванне канфесійных працэсаў. Існуе неабходнасць удасканалення прававога рэгулявання адносін, звязаных з рэалізацыяй волі сумлення (легітымізацыя дзейнасці малых рэлігійных груп і інш.).

Аналіз нарматыўна-прававых актаў, прынятых у Беларусі ў перыяд 1990–2005 гг. для рэгулявання дзяржаўна-канфесійных адносін, дазваляе казаць аб трох розных этапах.

На першым этапе (першая палова 1990-х гг.) ідзе працэс станаўлення заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях. У гэты час рэлігійная палітыка дзяржавы прытрымлівалася ліберальнай мадэлі.

Другі этап пачынаецца з 1996 г. і характарызуецца паступовым адыходам ад ліберальнай да кааперацыйнай мадэлі дзяржаўна-канфесійных адносін, калі дзяржава пачынае ўзаемадзейнічаць з пэўнымі рэлігійнымі арганізацыямі, вылучаючы іх на падставе ўплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый народа. Пры ўсталяванні мадэлі супрацоўніцтва (кааперацыйнай мадэлі), мы можам назіраць такія з’явы, калі прынцып свабоды сумлення суіснуе з прызнаннем за адной ці некалькімі рэлігійнымі арганізацыямі асобага палажэння. Дадзеная практыка з’яўляецца навацыяй для Беларусі, але традыцыйнай для шэрагу краін Еўропы, адпавядае адной з мадэлей дзяржаўна-канфесійных адносін.

Пасля 2002 г. дзяржаўна-канфесійныя дачыненні ў Рэспубліцы Беларусь развіваюцца па шляху пераходу да інтэграцыйнай мадэлі ўзаемаадносін царквы і дзяржавы.

[484] Бурая Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.). С. 48.

## 3.2 Дынаміка і накіраванасць рэлігійных працэсаў на сучасным этапе беларускай гісторыі

Рэлігійная сітуацыя ў сучасным беларускім грамадстве можа быць асэнсавана ў кантэксце радыкальных змен, якія адбыліся ў 90-х гадах XX стагоддзя. Складаная эвалюцыя эканамічных, сацыяльна-палітычных і ідэалагічных падстаў функцыянавання рэлігіі ў сучасным грамадстве, спецыфіка сацыяльнага ўзаемадзеяння рэлігійных інстытутаў з асноўнымі сацыяльнымі інстытутамі спарадзіла перапляценне сакральных і секулярных працэсаў, унесла істотныя папраўкі ў змест і формы рэлігійнай дзейнасці.

Сучасная рэлігійная сітуацыя ў грамадстве вызначаецца як "рэлігійнае адраджэнне". Лічыцца, што сярод веруючых адбываюцца змены як у якасці рэлігійных перакананняў, так і ў інтэнсіўнасці рэлігійнага жыцця, змяняюцца сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі вернікаў. Сярод веруючых павялічваецца ўдзельная вага моладзі і асоб з вышэйшай адукацыяй. Змяняюцца адносіны да рэлігіі і рэлігійных арганізацый з боку дзяржавы і грамадства. Фарміруецца вобраз рэлігіі як важнага сацыяльнага інстытута сучаснага грамадства. У грамадскай свядомасці змяняецца прадстаўленне аб рэлігіі, шматлікія члены сучаснага беларускага грамадства расцэньваюць рэлігію як аснову для адраджэння маральнасці і духоўнасці, як падмурак нацыянальнай культуры. На заканадаўчым узроўні прызнаецца гістарычны ўклад хрысціянства, асабліва ў яго праваслаўнай інтэрпрэтацыі, у фарміраванні беларускай дзяржаўнасці і культуры. Рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі характарызуецца дасягненнем адносна высокага ўзроўню рэлігійнай свабоды. Рэлігійным арганізацыям заканадаўча прадстаўлена права выконваць свае рэлігійныя і сацыяльныя функцыі як сярод веруючых, так і ў грамадстве ў цэлым.

Агульная канфесійная структура Беларусі мае перш за ўсё хрысціянскі характар. Да хрысціянства адносіцца 20 рэлігійных кірункаў з 25, і больш 97 % рэлігійных абшчын, якія маюць афіцыйную рэгістрацыю. Веруючыя, якія вызнаюць хрысціянства, прыналежаць да праваслаўя, каталіцызму, пратэстантызму і монафізіцтву, інакш кажучы да большасці асноўных кірункаў хрысціянства сучаснага свету [485].

У сучасных даследаваннях па геаграфіі рэлігій асаблівая ўвага звяртаецца на аналіз тэрытарыяльнай структуры рэлігійнай сферы Рэспублікі Беларусь. Прапаноўваецца, у прыватнасці, канфесійнае раяніраванне рэспублікі на падставе вылучэння 19 канфесійных раёнаў. Рэлігійныя раёны вылучаны як устойлівыя тэрытарыяльныя спалучэнні канфесійных тыпаў адміністрацыйных адзінак. У межах рэлігійных раёнаў гістарычна склалася своеасаблівая канфесійная структура абшчын,

[485] Старостенко В.В. Религия и свобода совести в Беларуси: очерки истории: монография. С. 50–52

функцыянальна-іерархічная сістэма цэнтраў кіравання і рэлігійнага паломніцтва [486]. У даследаваннях па геаграфіі рэлігій Беларусі вылучаюць наступныя канфесійныя раёны: Полацкае Падзвінне, Турава-Пінскае Палессе, Віцебскае Падзвінне, Аршанскае Падняпроўе, Мінскі раён, Браслаўскае Падзвінне, Мазырскае Палессе, Брэсцкае Палессе, Гомельскае Пасожжа, Магілёўскае Падняпроўе, Крычаўскае Пасожжа, Слуцка-Баранавіцкае Прадпалессе, Бабруйска-Бярэзінскае Прадпалессе, Бярэзінска-Барысаўскі раён, Верхняе Панямонне, Заходняе Панямонне, Слонімскае Панямонне, Лідскае Панямонне, Ашмянска-Нарачанскі раён [487]. Пры гэтым адзначаецца, што тэрытарыяльная структура зарэгістраваных абшчын, якая склалася ў раёнах не адпавядае рэлігійнай структуры насельніцтва.

Беларуская Праваслаўная Царква (БПЦ), да якой адносіць сябе пераважная большасць грамадзян Беларусі, на сённяшні момант з’яўляецца самай шматлікай рэлігійнай канфесіяй, дзеючай у Рэспубліцы Беларусь. Да 1989 г. на тэрыторыі БССР існавала толькі адна Мінска-Беларуская епархія, якая аб’ядноўвала 399 прыходаў і мела 395 храмаў. У кастрычніку 1989 г. па рашэнні Архірэйскага сабора Рускай праваслаўнай царквы (16 кастрычніка 1989 г.) Мінска-Беларуская епархія была ператворана ў экзархат Рускай Праваслаўнай Царквы, у якім быў створаны ўласны Святы Сінод. Узначальвае Беларускую Праваслаўную Царкву Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усея Беларусі.

У кастрычніку 1989 г. былі адроджаны Полацкая, Магілёўская і Пінская епархіі, у студзені 1990 г. адноўлена Гомельская і заснавана Брэсцкая кафедры, у кастрычніку 1991 г. заснаваны Навагрудская і Гродзенская, а ў маі 1992 г. – Тураўская і Віцебская кафедры [488]. У 2005 г. была ўтворана Бабруйская епархія. Такім чынам, лік епархій у цяперашні час разам з Мінскай складае 11.

У епархіях БПЦ, па даных на 01.01.2011 г., дзейнічаюць 1334 храмы і іншыя культавыя будынкі. Галоўным храмам Беларускага Экзархата з'яўляецца мінскі кафедральны сабор Святога-Духу. З 1994 г. пры мінскім праваслаўным прыходзе ў гонар вобраза Божай Маці “Всех скорбящих Радость” узводзіцца другі кафедральны сабор. Пасля 1991 г. дзяржава перадала царкве больш за 840 культавых і іншых будынкаў. На сродкі розных арганізацый і ахвяраванні грамадзян пабудавана больш за 180 храмаў, больш за 200 адрэстаўрыравана, 150 храмаў будуюцца, дзейнічаюць 32 кляштары.

Арганізацыйнаму будаўніцтву БПЦ уласціва ўстойлівая дадатная дынаміка развіцця. Калі ў 1986 г. налічвалася 369 прыходаў, у 1988 г. – 399, то ў 2000 г. – 1139, а на 1 студзеня 2011 г. – 1545. Найбольшая

---

[486] Озем Г.З. Территориальная структура религиозной сферы и конфессиональное районирование Беларуси : автореф. дис. ... канд. геогр. наук : 25.00.24 / Белорус. гос. ун-т. Минск, 2010. С. 17.
[487] Там же. С. 15, табл. 2
[488] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.). С. 322.

колькасць праваслаўных абшчын дзейнічае ў Брэсцкай (372) і Мінскай абласцях, уключаючы Мінск (381), меньш за ўсё абшчын (120) у Магілёўскай вобласці. У структурах царквы на пачатак 2011 г. было занята 1577 служыцелей культу.

Падрыхтоўку святароў ажыццяўляе пяць зарэгістраваных рэлігійных вучэбных устаноў. Для падрыхтоўкі кадраў духавенства з 1989 г. дзейнічае Мінская духоўная семінарыя, размешчаная ў Жыровіцкім Свята-Успенскім мужчынскім кляштары. Пры семінарыі дзейнічае таксама рэгенцкі клас. Шэраг прадметаў выкладаецца на беларускай мове, на якім навучэнцы таксама могуць пісаць курсавыя і дыпломныя працы. З 1995 г. пачала сваю работу Мінская духоўная акадэмія. У епархіях дзейнічаюць таксама Мінскае, Віцебскае і Слонімскае духоўныя вучылішчы. Курсы катэхізатараў створаны ў Мінскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай епархіях.

У Мінску працуюць іканапісныя школы і школа званароў, пры БДУ дзейнічае Інстытут тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірылы. Пры царкоўных прыходах і епархіяльных кіраваннях функцыянуюць больш за 300 нядзельных школ, 14 брацтваў і 10 сястрынстваў.

Брацтвы займаюцца рамонтам і будаўніцтвам храмаў, арганізацыяй кнігавыдавецкай дзейнасці, стварэннем нядзельных школ і прыхадскіх бібліятэк, сацыяльнай працай. У Мінску сродкамі дзяржаўнага фінансавання вядуцца працы па будаўніцтве Духоўна-адукацыйнага цэнтра БПЦ. Асноўныя вучэбныя ўстановы царквы субсідзіруюцца з дзяржаўнага бюджэту.

Другой па колькасці вернікаў канфесіяй у Беларусі з'яўляецца Рымска-каталіцкая царква, у якой на 01.01.1985 г. дзейнічалі 124 каталіцкія абшчыны. Вынікам актыўнай місіянерскай дзейнасці стала істотнае павелічэнне колькасці абшчын РКЦ. У 2000 г. – 405, на 01.01.2002 г. у рэспубліцы налічвалася 432 каталіцкія прыходы, на 01.01.2011 г. – 475 абшчын Рымска-каталіцкай царквы.

Найбольшае распаўсюджванне рыма-каталіцызм атрымаў у заходнім рэгіёне Беларусі. Найбольш значная, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі рэспублікі, колькасць абшчын (173, або каля 36 % ад іх агульнарэспубліканскай лічбы) дзейнічае на Гродзеншчыне, у месцах кампактнага пражывання палякаў.

У 1989 г. быў створаны адзіны для рэспублікі каталіцкі Мінская дыяцэзія, Апостальскім адміністратарам якой указам Іаана-Паўла II прызначаны біскуп Тадэвуш Кандрусевіч. У 1991 г. заснаваны Гродзенская і Пінская дыяцэзіі і Мінска-Магілёўская архідыяцэзія, якая мае статус мітраполіі, кіраўніком якой быў прызначаны біскуп (з 1994 г. – кардынал) Казімір Свентэк. У 1999 г. утворана чацвёртая дыяцэзія – Віцебская.

Пасля адстаўкі ў чэрвені 2006 г. кардынала К. Свентэка Апостальскім ад-міністратарам Мінска-Магілёўскім прызначаны Антоній Дзем'яненка. У верасні 2007 г. указам Бенедыкта XVI кіраўніком рыма-

каталікоў у Беларусі – Архібіскупам-Мітрапалітам Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі быў прызначаны Тадэвуш Кандрусевіч.

У 1999 г. была ўтворана Канферэнцыя каталіцкіх біскупаў у Беларусі. Яе старшынёй да 2006 г. з'яўляўся кардынал К. Свентэк, у цяперашні час – біскуп Гродзенскай дыяцэзіі Аляксандр Кашкевіч. РКЦ Беларусі знаходзіцца ў падначаленні Ватыкана, цесна ўзаемадзейнічае з польскім епіскапатам. У г. Мінску дзейнічае Апостальская Нунцыятура – дыпламатычнае прадстаўніцтва Ватыкана, заснаванае 11.11.1992 г. у дзень усталявання дыпламатычных адносін паміж Святым Прастолам і Рэспублікай Беларусь.

Рымска-каталіцкая царква (РКЦ) з'яўляецца другім рэлігійным аб'яднаннем у Рэспубліцы Беларусь па ўплыву і колькасці прыхільнікаў, і трэцім рэлігійным аб'яднаннем па ліку дзеючых абшчын (пасля БПЦ і Аб'яднанай царквы ХВЕ). Больш за 40 % каталікоў складаюць палякі, утвараючы тым самым найболей значную ў Беларусі этнаканфесіянальную групу. Па нацыянальнай прыкмеце сярод каталікоў пераважаюць беларусы (каля 56 %) [489].

У сучаснай Беларусі дзейнічаюць 9 жаночых манаскіх абшчын і 9 рымска-каталіцкіх місій, манаскія і місіянерскія ордэны. Адчынена каля 300 нядзельных школ. Богаслужэнні праводзяцца ў 464 касцёлах, каля паловы з якіх (226) знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці. Дзяржава перадала РКЦ каля 300 будынкаў пад рэлігійныя мэты. Вядзецца будаўніцтва 26 касцёлаў. Узровень забяспечанасці абшчын культавымі будынкамі з'яўляецца самым высокім сярод усіх канфесій у рэспубліцы.

Архікафедральным з'яўляецца касцёл імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў г. Мінску. Адзін з найболей уплывовых культурных цэнтраў беларускага каталіцызму – мінскі касцёл Святых Сымона і Алёны ("Чырвоны касцёл").

РКЦ з'яўляецца арганізатарам шэрагу вядомых у рэспубліцы культурных мерапрыемстваў, якія сталі традыцыйнымі: Міжнародны фестываль хрысціянскай музыкі "Магутны Божа" у г. Магілёве, Міжнародны каталіцкі фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм Magnificat у г. Глыбокае Віцебскай вобласці, і інш. Функцыянуюць выдавецтва "Pro Christo" Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі і выдавецтва Гродзенскай дыяцэзіі. Публікуюцца часопісы "Наша вера", "Дыялог", "Ave Maria", бюлетэні, газеты "Словы жыцця", "Каталіцкія навіны", "Odkupiciel", "Любите друг друга" і іншыя выданні. Арганізацыі РКЦ актыўна супрацоўнічаюць з установамі сацыяльнай абароны насельніцтва, дзейнічаюць дабрачынныя фонды "Маці Божай Фацімскай" і "Карытас".

Станаўленне арганізацыйных структур каталіцкай царквы ў сучаснай Беларусі праходзіла пры недахопе мясцовых святароў, што кампенсавалася

[489] Верещагина А.В. О некоторых тенденциях современной конфессиональной ситуации в Беларуси // Социология. 1998. № 2. С. 42.

запрашэннем святароў з-за мяжы – галоўным чынам з Польшчы. Яшчэ ў 1990 г. было прынята рашэнне аб запрашэнні ў БССР з Польскай Народнай Рэспублікі 50 ксяндзоў для часовага абслугоўвання мясцовых рымска-каталіцкіх абшчын. У 2001 г. замежнікамі з'яўляліся 160 ксяндзоў з 285[490] , у 2007 г. – 180 з 398, у 2010 г. – 164 з 414, на пачатак 2011 г. – 160 з 418 [491].

Гродзенская вышэйшая каталіцкая семінарыя з тэрмінам навучання 6 гадоў дзейнічае з 01.09.1990 г. (выкладанне вядзецца на польскай мове). У ліпені 2001 г. пачала сваю дзейнасць Пінская духоўная каталіцкая семінарыя[492]. У Гродна і Баранавічах дзейнічаюць курсы па падрыхтоўцы выкладчыкаў катэхізісу. Працэс фарміравання беларускага каталіцкага кліру звязваецца з выпускнікамі духоўных семінарый РКЦ, змешчаных на тэрыторыі Беларусі.

Дзяржава аказвае падтрымку рэлігійным вучэбным установам РКЦ, падаючы, як і ў выпадку з БПЦ, адтэрміноўку ад закліку на ваенную службу семінарыстам і выпускнікам семінарый.

З 1991 г. у Беларусі прадпрымаюцца спробы адраджэння Грэка-каталіцкай царквы. Гэты працэс звязаны з духоўнымі пошукамі часткі беларускай інтэлігенцыі і з ідэяй нацыянальнай царквы, у якой набажэнствы і культ былі бы злучанымі з нацыянальнымі сімволікай, мовай, традыцыяй. Але колькасць грэка-каталікоў вельмі малая, маецца тэндэнцыя да растварэння ўніятаў (каталікоў грэцкага абраду) сярод каталікоў рымскага абраду, альбо зварот у праваслаўе.

У 1992 г. дзейнічала 8 абшчын, у 1994 г. – 11, у 1999 г. – 13, на 1 студзеня 2011 г. налічвалася 15 грэка-каталіцкіх абшчын веруючых. У грэка-католікаў маецца 5 культавых будынкаў, 8 святароў. Абшчыны аб'яднаны ў дэканат, які знаходзіцца пад кіраваннем Кангрэгацыі ўсходніх цэркваў Ватыкана. Абшчыны сучасных уніятаў малакалькасныя – па 10–30 чалавек. Адметнай рысай уніятаў з'яўляецца тое, што сярэдні ўзрост вернікаў складае 25–30 гадоў, і яны маюць у асноўным вышэйшую адукацыю [493]. Абшчыны ўтвараліся галоўным чынам з прадстаўнікоў той часткі інтэлігенцыі, якая разглядала ўніяцтва як нацыянальнае веравызнанне беларускага народа.

Прафесійныя святары ёсць у абшчынах Мінска і Гродна. Полацкую абшчыну суправаджаў святар са Львова. Таму пытанням падрыхтоўкі кадраў святароў уніяты надаюць адмысловую ўвагу. Кандыдаты ў святары праходзілі навучанне ў духоўных установах Ватыкана, Англіі (Лондан), Чэхіі (Аламоўц), Польшчы (Люблін), Украіны (Львоў, Івана-Франкоўск).

На 1999 г. уніяцкая царква налічвала: 6 святароў, 1 дыякана, 3 манахі, 2 манашкі, 3000 парафіян, 12 прыходаў і 2 кляштары. Паколькі

---

[490] Землякоў Л., Марозаў Ю. Дзяржава. Рэлігія. Закон // Полымя. 2002. № 9–10. С. 217
[491] Старостенко В.В. Религия и свобода совести в Беларуси: очерки истории: монография. С. 24
[492] Посткоммунистическая Беларусь в процессе религиозных трансформаций. С. 28.
[493] Там жа. С.32.

Грэка-каталіцкая царква знаходзіцца пад патранатам Ватыкана, курыруе дзейнасць гэтых абшчын прадстаўнік Ватыкана архімандрыт Ян Гаек.

Важная роля ў адраджэнні ГКЦ належала моладзі, якая арганізоўвала ўніяцкія абшчыны, вяла прапагандысцкую працу сярод юнакоў і дзяўчын. 14–15 жніўня 1991 г. маладыя грэка-каталікі Беларусі прынялі ўдзел у XI міжнародным дні моладзі ў Чэнстахове (Польшча), на якім прысутнічаў папа Іаан-Павел II. У верасні таго ж года вернікі зноў сустрэліся з кіраўніцтвам РКЦ у Аглоне (Латвія). Сярод маладых грэка-каталікоў стала традыцыяй здзяйсняць шэсці па памятных месцах, звязаных з гісторыяй Грэка-каталіцкай царквы. З 1995 г. вернікі збіраюцца ў Полацку, каб ушанаваць памяць уніятаў, забітых 11.07.1705 г.

Пры вяртанні дзяржавай храмаў уніяты не атрымалі ні аднаго будынка. Толькі 15.08.1996 г. у Магілёве была асвячона невялікая капліца, вернутая грэка-каталікам. Набажэнствы праводзяцца ў непрыстасаваных памяшканнях (у Мінску, была збудавана капліца ў доме, дзе раней знаходзіўся “чырвоны” куток домакіраўніцтва; пакуль будаваўся ўніяцкі храм, прыход праводзіў набажэнствы ў скляпеннях Чырвонага касцёла).

Таксама грэка-каталікі займаліся выдавецкай дзейнасцю. У 1990 г. убачыў святло першы нумар часопіса “Унія”, выходзіў да 1995 гады. З 1995 г. стала выдавацца газета “Царква”, якая выходзіла раз у квартал. У Полацку выходзіў прыхадскі зборнік “Сафія”.

Адраджэнне ісламу ў Беларусі пачалось з першай паловы 1990-х гг. Этнічны падмурак ісламу складаюць беларускія татары, але расце актыўнасць мігрантаў з Азербайджана і іншых замежных краін традыцыйнай мусульманскай культуры. Татары ў Беларусі прытрымліваюцца галоўным чынам ісламу суніцкага накірунку. Шыіцкага напрамку ісламу прытрымліваецца адна з мусульманскіх абшчын г. Мінска.

Большасць мусульманскіх абшчын знаходзіцца ў Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай абласцях. У апошнія дваццаць год адбываецца павелічэнне колькасці абшчын мусульман. Калі ў 1988 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала адна абшчына мусульман, то ў 1993 г. – 8, у 1998 г. – 22, у 2003 г. – 27, на 1 студзеня 2011 г. – 25. З 2004 г. у г. Мінску на месцы, якое носіць гістарычнае найменне Татарскай слабады, узводзіцца саборная мячэць. Першапачаткова будаўніцтва мячэці фінансавалася арганізацыяй з Саудаўскай Аравіі, зараз мячэць будуецца за кошт сродкаў мусульман Беларусі.

Дзеючыя мячэці, размешчаныя ў Гарадзенскай (Іўе, пабудаваная ў 1998 г., Слонім, пабудаваная ў 1994 г., Навагрудак, пабудаваная ў 1997 г., у вёсцы Лоўчыцы, 2001 г.), Віцебскай (Відзы, пабудаваная ў 1999 г.) і Мінскай (Смілавічы, пабудаваная ў 1996 г.) абласцях. Малельныя дамы маюцца таксама ў Клецку, Маладзечна і Ашмянах [494].

---

[494] Посткоммунистическая Беларусь в процессе религиозных трансформаций. С. 45.

У 1989 г. адначасова ў Мінску і Гродна былі ўтвораны першыя татарскія культурна-асветніцкія супольнасці, якія ўлетку 1991 г. аб’ядналіся і стварылі Беларускае аб’яднанне татараў-мусульман “Аль-Кітаб”. Яго мэты – адраджэнне мовы, мусульманскай культуры і звычаяў, удзел у фестывалях нацыянальных культур, сумеснае правядзенне нацыянальных свят.

У снежні 1994 г. было створана Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь. Гэтае аб’яднанне было зарэгістравана ў Камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь 02.02.1994 г. У 2002 году створана Духоўнае кіраванне мусульман у Рэспубліцы Беларусь. Працуе каля 10 мусульманскіх школ выхаднога дня, выдаюцца газеты “Жыццё” і “Мусульманскі веснік”.

Арганізацыі беларускіх мусульман падтрымліваюць сувязі з міжнароднымі ісламскімі арганізацыямі, рэлігійнымі цэнтрамі Лівіі, Саудаўскай Аравіі і Турцыі, арганізацыямі з Расіі і іншых краін СНД. З 2004 г. дзейнічае Дамова аб супрацоўніцтве паміж “Мусульманскім рэлігійным аб’яднаннем у Рэспубліцы Беларусь” і Радай муфтыяў Расіі.

З пачатку 1990-х гг. у рэспубліцы назіраецца адраджэнне яўрэйскага нацыянальна-культурнага жыцця і іўдаізму. Дзейнічаюць больш 20 нядзельных школ, яўрэйскія класы ў сярэдніх школах, шэраг вучэбных устаноў – Вышэйшы завочны ешыбот і Вышэйшы іўдзейскі духоўны каледж. Працуе таксама адчынены ўніверсітэт Ізраілю, Яўрэйскі народны ўніверсітэт і іншыя ўстановы. Дзяржаўную рэгістрацыю як духоўная вучэбная ўстанова мае “Иешива Гдола Деминск”. Шматлікія адукацыйныя і іншыя праграмы фінансуюцца Сусветным яўрэйскім фондам “Джойнт”. Публікуецца газета “Берега” і шэраг іншых выданняў.

Расце колькасць культурна-асветніцкіх устаноў і абшчын іўдаізму. Калі ў 1991 *г.* дзейнічалі тры абшчыны, то на пачатак 1992 г. – 10, 1996 г. – 15, 2000 г. – 28, 2010 г. – 46, на 01.01.2011 г. – 52 абшчыны, з якіх 35 адносяцца да “артадаксальнага” і 17 – да “прагрэсіўнага” іўдаізму.

Артадаксальныя абшчыны маюць 7 культавых будынкаў, 4 будуюцца. За апошняе дзесяцігоддзе дзяржавай было перададзена іўдзейскім рэлігійным арганізацыям 10 будынкаў для культавых мэт.

У іўдзейскіх арганізацыях занята 24 святары, 5 з якіх – замежныя грамадзяне (Ізраіля і ЗША). Створаныя тры рэлігійныя аб’яднанні: “Иудейское религиозное объединение” (1993 г.), “Объединение иудейских религиозных общин” (2000 г.) і “Религиозное объединение общин прогрессивного иудаизма” (2001 г.).

Асаблівасці рэлігійнасці насельніцтва. Матэрыялы сацыялагічных апытанняў паказваюць на працэс дэсекулярызацыі соцыўму, паніжэнне колькасці няверуючых і рост рэлігійнасці насельніцтва. Па сацыялагічных даных, атрыманых даследчыкамі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі і БДУ, калі ў 1988 г. да веруючых сябе адносілі да 15 %, у 1990 г. – каля

30 % рэспандэнтаў, то ў канцы 1990-х – пачатку 2000-х гг. аб сваёй рэлігійнасці заяўляла каля 50 % рэспандэнтаў[495]. Па дадзеных на 1998 год колькасць веруючых ужо складала 47,5 % дарослага насельніцтва Рэспублікі Беларусь [496]. Мы бачым, што ў 1990-я годы на рэлігійным полі Рэспублікі Беларусь адбываўся значны рост колькасці веруючых.

У наступным мы назіраем стабілізацыю светапоглядных арыентацый насельніцтва. Ужо ў 2004 году веруючымі сябе лічылі 53,9 % дарослага насельніцтва [497]. Матэрыялы даследаванняў беларускіх сацыёлагаў 2006 г. паказваюць на 58,9 % носьбітаў рэлігійнай (вера ў Бога) самаідэнтыфікацыі [498] і 47,7 % па даных 2007 года [499] .

Адначасова з выяўленнем значнай групы веруючых у апошнім дзесяцігоддзі XX стагоддзя мы можам паказаць на прысутнасць у грамадстве так званай дэкларатыўнай рэлігійнай веры. Так, у 90-я годы XX ст. рэгулярна наведвалі богаслужэнні толькі 5 % веруючых, 55,3 % рабілі гэта зрэдку. У рэлігійных абрадах і таінствах рэгулярна ўдзельнічалі 5,5 %, часам – 37 % [500]. Рэгулярна ўдзельнічалі ў таінствах і абрадах сваёй канфесіі 20,9 %, зрэдку – 54 %, ніколі не ўдзельнічалі – 25,1 % веруючых [501]. Пры гэтым удзельнічала ў набажэнскай і абрадавай практыцы “па рэлігійных перакананнях” толькі 37,8 % праваслаўных, 50 % каталікоў, 46,5 % пратэстантаў, “па традыцыі” – 32,5 %, 22,2 % і 1,8 % адпаведна[502].

Колькі-небудзь істотна не змянілася становішча і ў першым дзесяцігоддзі XXI стагоддзя. Па выніках сацыялагічных даследаванняў Інстытута сацыялогіі НАНБ, толькі 19,9 % жыхароў Беларусі лічаць сябе веруючымі людзьмі і імкнуцца выконваць усе рытуалы сваёй рэлігіі. Царкву, касцёл, сінагогу і г.д. рэгулярна (адзін раз у тыдзень) наведвае толькі 6 % насельніцтвы краіны, 8,2 % – адзін-два разы ў месяц, 28 % – некалькі разоў у год, пераважна па вялікіх святах, 24,6 % – адзін-два разы ў год, пятая частка – не наведвае ніколі. Прычым колькасць вернікаў, якія стала наведваюць царкву або трымаюць пасты памяншаецца [503].

---

[495] Земляков Л.Е. Государство и церковь сквозь призму закона // Беларуская думка. 1999. № 5. С. 24 ; Новикова Л.Г. «Религиозный бум» в Беларуси: миф или реальность // Социология. 1999. № 2. С. 29–36 ; Яе ж. Религиозность в Беларуси на рубеже веков: тенденции и особенности проявления: социологический аспект. Минск, 2001. С. 23

[496] Новикова Л.Г., Белая Е.А. «О специфике религиозного поведения верующих основных христианских конфессий в современной Беларуси // Социология. 2007. № 42. С. 141

[497] Там жа.

[498] Беларусь после «религиозного бума»: что изменилось? // Социология. 2006. № 4. С. 48.

[499] Новикова Л.Г., Белая Е.А. «О специфике религиозного поведения верующих основных христианских конфессий в современной Беларуси. С. 141

[500] Верещагина А.В. О некоторых тенденциях современной конфессиональной ситуации в Беларуси. С. 42 ; Землякоў Л.Е. Рэлігія ва ўмовах сацыяльных перамен на Беларусі // Народная асвета. 1999. № 8. С. 92.

[501] Новикова Л.Г. «Религиозный бум» в Беларуси: миф или реальность. С. 32–33.

[502] Новикова Л.Г. Религиозность в Беларуси на рубеже веков: тенденции и особенности проявления: социологический аспект. Минск, 2001. С. 56.

[503] Котляров И.В. Какая дорога ведет к храму: социологические аспекты // Религия и общество – 6: сб. науч. статей. Могилев, 2011. С. 134.

Аб колькасці грамадзян рэспублікі, якія прымаюць удзел у богаслужэнні (прыналежных да праваслаўнай царквы, па афіцыйных даных каля 80 % насельніцтва рэспублікі вызначаюць сябе як праваслаўных), сведчаць даныя аб наведванні богаслужэнняў нават у найважныя святы канфесіі. Так, 6–7 студзеня 2007 г., т.е. на Каляды Хрыстовы, у храмах па ўсёй тэрыторыі Беларусі ў богаслужэннях прыняло ўдзел каля 198 тыс. чалавек, што складала каля 2 % насельніцтва рэспублікі. На Каляды Хрыстовы ў 2009 г. у праваслаўныя храмы прыйшло каля 140 тыс. чалавек, а ў 2010 г. – каля 110 тыс. У богаслужэннях у гонар Вадохрышча Гасподня ў праваслаўных храмах па ўсёй Беларусі ў 2009 г. прыняло ўдзел каля 84 тысяч чалавек, у 2010 г. – каля 66,5 тыс. праваслаўных веруючых. Пры гэтым, па дадзеных агульнарэспубліканскіх сацыялагічных даследаванняў, 80,9 % рэспандэнтаў пражывае на тэрыторыі, дзе ёсць дзеючыя культавыя будынкі [504].

Паніжэнне частаты наведвання богаслужэнняў праваслаўнымі фіксавалася ўжо ў даследаваннях сярэдзіны 2000-х гг. Адзначалася, што працэс паслаблення царкоўнай дысцыпліны закрануў як праваслаўных, так і каталікоў, і што рэгулярнасць наведвання богаслужэнняў у веруючых дадзеных канфесій падае тым хутчэй, чым больш сярод іх прадстаўнікоў мужчын і маладых людзей ва ўзросце да 30 гадоў [505].

Мы таксама павінны адзначыць, што ў свядомасці веруючух існуе меркаванне пра няроўнае становішча розных рэлігійных арганізацый. Няроўнае становішча цэркваў і веравызнанняў у Беларусі адзначаюць 15,5 % праваслаўных. Кожны трэці каталік (30,7 %) лічыць, што дзяржава не аднолькава ставіцца да канфесій, якія дзейнічаюць у Беларусі. Найбольш распаўсюджана меркаванне пра няроўнасць канфесій у Беларусі сярод прадстаўнікоў пратэстанцкіх веравызнанняў – 64 % рэспандэнтаў-пратэстантаў лічаць, што дзяржава не аднолькава ставіцца да канфесій. Як адзначаюць даследчыкі “канфесійныя меншасці асцерагаюцца, што праваслаўная царква прэтэндуе на статут дзяржаўнай”.

Можа здацца, што ідэі аб правах чалавека на ўласнае меркаванне ўмацаваліся ў нашым грамадстве, дайшлі да свядомасці кожнага чалавека. Прынамсі, за апошняе дзесяцігоддзе замацавалася меркаванне, што кожны чалавек мае права на свой уласны погляд на рэчы. Мала таго прызнаецца, што чужое меркаванне можа быць і дакладным. Акрамя гэтага, ахвотных уступаць у дыскусіі і такім чынам пераконваць “якія памыляюцца” змяніць свой пункт гледжання практычна не засталося. Гэтак жа ў меншасці апыняюцца аматары навязваць свае погляды сілай. У табліцы 11 мы прадставім дынаміку прынцыпу свабоды меркаванняў і перакананняў і тое, як гэты прынцып рэалізуецца ў свядомасці сучаснай моладзі.

[504] Старостенко В.В. Религия и свобода совести в Беларуси: очерки истории: монография. С. 44–45
[505] Динамика уровня и характера религиозности населения Республики Беларусь. Минск, 2005. С. 20, 27.

Такім чынам, тых што пакутуюць у рознай ступені нецярпімасцю да чужых поглядаў, сярод нашай моладзі не так ужо і шмат. Як бачна, колькасць “прапаведнікаў”, якія імкнуцца пераконваць, колькасць высакародна наўмысных фанатыкаў, гатовых прымусіць прыняць праўду і зацятых барацьбітоў з “ерассю” за апошнія дзесяць гадоў колькі-небудзь істотна не змянілася.

Табліца 11 – Размеркаванне адказаў на пытанне “Як Вы ставіцеся да тых, хто мае іншую, чым Вы, веру ці ідэалы?”, у працэнтах

| **Адносіны да думкі іншага** | **1999** | **2009** |
|---|---|---|
| Кожны мае права на сваё меркаванне, якое можа быць верным | 86,3 | 85,8 |
| Трэба вяртаць у ісцінную веру метадамі пераканання | 3,7 | 3,9 |
| Трэба вяртаць у ісцінную веру нават прымусам | 1,2 | 0,4 |
| Трэба вынішчыць | 0,5 | 1,3 |
| Не ведаю | 7,7 | 7,8 |

Калі казаць пра прызнанне права чалавека на свабоду сумлення, то за мірнае, без барацьбы, суіснаванне розных рэлігій і веравызнанняў выказваецца практычна шасцёра з дзесяці прадстаўнікоў моладзі (59,5 %). Дадзенага меркавання больш прытрымваюцца дзяўчыны (67,7 %), сярод маладых мужчын за мірнае суіснаванне рэлігій і веравызнанняў выказаліся – 50,8 % апытаных.

Кожны дзясяты прадстаўнік моладзі (11,6 %) лічыць прымальнай ідэйную барацьбу паміж рэлігіямі, але без ужывання гвалтоўных метадаў. Сярод маладых мужчын такога меркавання прытрымваецца 14 %, сярод дзяўчын прызнаюць толькі ідэйную барацьбу паміж рэлігійнымі светапоглядамі 9,3 %.

Праблема метадаў барацьбы паміж рэлігіямі не цікавіць 13,8 % маладых людзей. Сярод маладых мужчын індыферэнтна паставіліся да праблемы суіснавання розных рэлігійных перакананняў – 14,5 %. Сярод маладых жанчын такога ж погляду да праблематыкі міжрэлігійных адносін прытрымліваюцца 13,5 %.

Натуральна, што ў сучасным грамадстве барацьбіты з іншаверцамі застаюцца ў абсалютнай меншасці. Сярод моладзі толькі 2,6 % лічыць магчымым змагацца з іншай рэлігійнай верай усімі сродкамі, нават ужываючы гвалт.

Такім чынам, настаюць часы рэлігійнага міру і талерантнасці? Святары іўдаізму, каталіцызму і праваслаўя садзяцца за адзін стол і абмяркоўваюць набалелыя праблемы. Моладзь у большасці сваім не збіраецца адстойваць праўды сваёй веры і згодна на мірнае суіснаванне

розных рэлігій і веравызнанняў. Можа, настае час абыякавасці, якую мы прымаем за талерантнасць, і крывадушнасці?

У любым выпадку парадаксальнасць сітуацыі ў наяўнасці. Усе, ці амаль усе, так ці інакш прызнаюць за іншым чалавекам права на свабоду сумлення і меркаванняў. З іншага боку даследаванні выяўляюць наяўнасць у даволі значнай групы маладых грамадзян Беларусі адмоўнага стаўлення да прадстаўнікоў іншых рэлігій і веравызнанняў, прычым традыцыйных для Беларусі.

Апытанне моладзі, якое праводзілася ў верасні – кастрычніку 2001 г., дало вынікі, якія нас некалькі здзівілі. Мы чакалі, што адказваючы на адкрытае пытанне анкеты, моладзь найбольш негатыўна адрэагуе на антыхрысціянскія плыні, напрыклад, сатанізм. Натуральна, улічваючы падзеі ў Чачні, тэрарыстычныя акты ў Маскве, Нью-Ёрку, мы чакалі праявы ў моладзі негатыўнай рэакцыі і на іслам. Але як відаць з вынікаў апытання 2001 г., прыведзеных у табліцы 12, маладыя рэспандэнты выявілі найбольшую схільнасць да гвалтоўных дзеянняў за паслядоўнікамі ісламу. Вынікі апытання шмат у чым былі абумоўлены падзеямі восені 2001 г. і тым, як яны падаваліся ў СМІ.

Табліца 12 – Размеркаванне адказаў на адкрытае пытанне “Паслядоўнікі якіх рэлігій схільныя да гвалту?”, у працэнтах

| **Рэлігіі** | **2001 год** | **2009 год** |
|---|---|---|
| Хрысціяне | 3,9 | 2,2 |
| Іўдзеі | 3,6 | – |
| Мусульмане | 61,4 | 36,4 |
| Сатаністы | 9,2 | 8,1 |
| Секты | 3 | 6,4 |
| Не ведаю | 11,2 | 29,8 |
| Няма адказу | 17 | 14,3 |

За мінулыя некалькі гадоў моладзь крыху змяніла сваё стаўленне да ісламу. У параўнанні з 2001 г. колькасць маладых рэспандэнтаў якія лічаць, што паслядоўнікі ісламу найбольш схільныя да выкарыстоўвання гвалту, скарацілася амаль у два разы. У апошнія два-тры гады погляды сталі мяняцца зноў.

У той жа час амаль у тры разы вырасла колькасць маладых людзей, якія не здолелі адназначна адказаць на пастаўленае пытанне. Відаць, на сённяшні дзень усё больш моладзі не хвалюе праблема рэлігійнаматываванага гвалту, магчыма, моладзь наогул не ўгледжвае наяўнасць дадзенай праблемы.

Дзейнасць сатаністаў і іншых новых рэлігійных арганізацый (сект), мяркуючы па ўсім, з пункту гледжання моладзі і на сённяшні дзень не

ўяўляе адмысловай небяспекі. Маладыя прадстаўнікі хрысціянскай цывілізацыі выяўляюць свайго роду памяркоўнасць да сваіх асноўных апанентаў.

Такія адзнакі сатанізму для хрысціянскай Беларусі, сама меней, могуць здацца дзіўнымі. Моладзь, якая і праваслаўная, і веруючая, адным словам хрысціянская, лаяльна ставіцца да сатанізму. Можа мы пасяшаліся абвясціць пра працэс рэхрысціянізацыі, як адной з частак рэлігійнага адраджэння.

Сучасны малады чалавек, відаць, не зусім уяўляе сабе розніцу паміж рэлігіяй і веравызнаннем. Пры адказе на пытанне анкеты “З прадстаўнікамі якіх рэлігій Вы не жадаеце кантактаваць” нашы рэспандэнты замест рэлігій звалі веравызнанні. Дадзены факт вельмі цікавы ў перыяд “рэлігійнага адраджэння”, ён можа паслужыць адной з ілюстрацый якаснага боку працэсу. Што ж, блытаніна з рэлігіямі і веравызнаннямі характэрна і для працаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, з вуснаў якіх даводзіцца чуць словазлучэнні “праваслаўная рэлігія”, “каталіцкая рэлігія”. У табліцы 13 прадстаўлены вынікі апытанняў 2001 і 2009 гадоў, у якіх мы можам пабачыць найбольш непапулярныя сярод моладзі веравызнанні.

Мы бачым рост колькасці моладзі, у якой выяўляюцца негатыўныя ўстаноўкі ў стаўленні да баптыстаў, пяцідзясятнікаў і Сведак Іеговы. Скарацілася колькасць моладзі, у якой прысутнічае некаторая прадузятасць супраць ісламу і яго прадстаўнікоў. Вышэй мы казалі, што моладзь прызнае за паслядоўнікамі ісламу схільнасць да гвалтоўных дзеянняў. Аднак, нягледзячы на гэта, не ўсе, хто лічаць іслам рэлігіяй гвалту, адмаўляюцца кантактаваць з мусульманамі. Скарацілася колькасць моладзі, гатовай адмовіцца ад кантактаў з прадстаўнікамі найбольш адыёзных рэлігійных груп, тут мы маем на ўвазе плыні, названыя сатанізмам.

За апошнія гады, як можа здацца, мы сталі больш памяркоўнымі да іншых рэлігій, веравызнанняў. У 2001 г. сярод моладзі толькі трое са ста былі гатовыя мець зносіны з іншым чалавекам, не ўлічваючы яго рэлігійных поглядаў, ладу яго рэлігійнага жыцця, яго веры. У канцы першага дзесяцігоддзя XXI стагоддзя колькасць талерантных маладых людзей вырасла ў некалькі разоў. З іншага боку, назіраецца рост абыякавасці да чужых рэлігійных поглядаў, праўда на фоне зніжэння ўзроўня негатыўнага стаўлення да чужой веры. Але ўсё ж узнікае сумненне, ці памяркоўнасць гэта, можа быць мае месца простая абыякавасць і абыякавасць да чужых поглядаў, якія мы і прымаем за памяркоўнасць?

Табліца 13 – Размеркаванне адказаў на адкрытае пытанне “З прадстаўнікамі якіх рэлігій Вы не жадаеце кантактаваць?”, у працэнтах

| Веравызнанне | 2001 | 2009 |
|---|---|---|
| Праваслаўныя | 3,1 | 1,3 |
| Каталікі | 4,2 | 1,1 |
| Іўдзеі | 3,4 | 3,3 |
| Баптысты | 3,4 | 6,4 |
| Пяцідзясятнікі | 0,3 | 3,7 |
| Мусульмане | 38,4 | 18,6 |
| Сатаністы | 16,6 | 6,5 |
| Сведкі Іеговы | 1,1 | 4,3 |
| Гатовы кантактаваць з усімі | 3,3 | 19,1 |
| Няма адказу | 31,2 | 42,9 |

***Рэлігійнасць насельніцтва Магілёўскай вобласці***. У рэлігійнай прасторы Беларусі дамінаванне застаецца за праваслаўем, што абумоўлена гістарычным развіццём краіны. Акрамя таго, традыцыйнымі прызнаюцца каталіцызм і пратэстантызм у яго лютэранскім веравызнанні, а гэтак жа іслам і іўдаізм. Па стане на 01.01.2013 г. на тэрыторыі Магілёўскай вобласці зарэгістраваныя і дзейнічаюць 281 рэлігійная абшчына 19 веравызнаўчых канфесій і кірункаў. З іх: 129 рэлігійных абшчын Беларускага Экзархата Рускай праваслаўнай царквы; 23 абшчыны Рымска-каталіцкай царквы; 7 стараверскіх абшчын; 1 грэка-каталіцкая абшчына; 40 абшчын Евангельскіх хрысціян-баптыстаў; 41 абшчына хрысціян веры Евангельскай; 2 рэлігійныя абшчыны Новаапостальскай царквы; 3 абшчыны хрысціян Поўнага Евангелля; 1 абшчына Царквы Хрыстовай; 6 абшчын Адвентыстаў Сёмага Дня; 3 абшчыны Сведак Іеговы; 15 юдзейскіх абшчын; 4 евангелічна-лютэранскія абшчыны; 1 рэлігійная абшчына Армянскай Апостальскай царквы; 1 мусульманская абшчына, 1 прасвітарыянская; 1 абшчына бахаі; 1 абшчына Царквы Ісуса Хрыста Святых Апошніх Дзён (мармоны); 1 абшчына Міжнароднага грамадства прытомнасці Крышны. У вобласці таксама дзейнічаюць 2 праваслаўныя епархіі, рэспубліканскае рэлігійнае аб’яднанне “Самастойная евангельска-лютэранская царква ў Рэспубліцы Беларусь”; аб’яднанне цэркваў евангельскіх хрысціян-баптыстаў у г. Магілёве і Магілёўскай вобласці; абласное аб’яднанне цэркваў хрысціян веры евангельскай. Акрамя таго, дзейнічае 4 праваслаўныя манастыры (Свята-Успенскі мужчынскі манастыр у в. Пустынкі Мсціслаўскага раёна, Свята-Мікольскі жаночы манастыр у г. Магілёве, Свята-Узнясенскі жаночы манастыр у в.

Баркалабава Быхаўскага раёна, жаночы манастыр у гонар святых Жонак Міраносіц у г. Бабруйску) [506].

Сярод жыхароў Магілёўшчыны да праваслаўнага веравызнання сябе аднеслі 88,7 % апытаных у цэлым, сярод вернікаў – 93,2 %, што значна перавышае рэспубліканскія паказчыкі.

У Магілёўскай вобласці і Магілёве каталікі і прадстаўнікі пратэстанцкіх цэркваў не ўтвараюць колькі-небудзь значныя канфесійныя групы. У цэлым, да каталікоў сябе прылічаюць 1,6 % апытаных, да пратэстантаў 2,3 % (Евангельскія хрысціяне-баптысты, Хрысціяне веры Евангельскай і інш.).

У стаўленні да рэлігіі даныя сацыялагічных апытанняў дазваляюць вылучыць сярод жыхароў Магілёўскай вобласці чатыры групы. Першая – гэта веруючыя, якія выконваюць абрады – 16,4 %. Другая – веруючыя, якія не прытрымліваюцца абрадаў (63,4 %). Гэтыя дзве групы можам назваць рэлігійнымі. Наступная – няверуючыя, але якія адносяцца да рэлігіі дадатна (14,5 %), і, нарэшце, абыякавыя да рэлігіі (4,9 %).

Акрамя названых груп, сярод жыхароў Магілёўскай вобласці фіксуецца невялікая колькасць грамадзян, меней за 1 %, якія адносяць сябе да барацьбітоў з любой рэлігіяй.

Чалавек становіцца рэлігійным або абыякавым да рэлігіі пад уздзеяннем шматлікіх фактараў. Працэс рэлігійнага пошуку можа абвастрацца знешнімі акалічнасцямі, якія ўзнікаюць у жыцці сучаснага чалавека (цяжкая хвароба, смерць блізкага, няўпэўненасць у заўтрашнім дні). Адзначым, што такія складаныя моманты часта звязаныя з сям’ёй. Пад уздзеяннем сваякоў часта адбываецца рэлігійны выбар. На карысць гэтага сцвярджэння кажа і наступны факт: у 72 % апытаных жыхароў Магілёўшчыны рэлігійныя гледжанні адпавядаюць з рэлігійнымі арыентацыямі сваякоў. Такія фактары як зносіны з місіянерам, чытанне рэлігійнай літаратуры спрыяюць узмацненню рэлігійнага пошуку, гэтак жа як і цяжкая хвароба, але не аказваюць вызначальнага ўздзеяння на рэлігійны выбар.

Зрабіўшы свой рэлігійны выбар, большасць жыхароў Магілёўскай вобласці (89,8 %) прытрымліваецца яго на працягу жыцця і толькі 3,3 % апытаных заявілі, што ў іх узнікала жаданне памяняць свае рэлігійныя перакананні. Але чаму людзі працягваюць прытрымвацца сваёй рэлігійнай веры? І як паказваюць факты, адданасць рэлігійным перакананням мала звязаная з абяцаннем выратавання і вечнага жыцця, якое дае рэлігія. Над гэтымі пытаннямі альбо не задумваюцца, альбо шукаюць ад рэлігіі чыста тэрапеўтычнай дапамогі ў пераадоленні жыццёвых праблем і складанасцей.

---

[506] Юдин В.В. Состояние религиозности населения Могилевской области на современном этапе белорусской истории // История философия, политика, право: Научные труды преподавателей гуманитарных дисциплин. С. 173.

Даныя, прыведзеныя ў табліцы 14, наводзяць на думку аб тым, што ад рэлігіі сучасны чалавек мала чаго чакае. Звяртае на сябе ўвагу пазіцыя, у якой гаварыцца аб надзеі на ўваскрашэнне. Нават рэспандэнты, якія адносяць сябе да праваслаўнага веравызнання, сваю надзею на "жыццё вечнае" ў якасці прачыны захавання сваёй прыхільнасці дадзенаму веравучэнню паставілі на адно з апошніх месцаў. На пытанні аб сэнсе жыцця вера, якой прытрымваюцца нашы рэспандэнты, не то каб не дае адказы – хутчэй, пытанні так і не былі зададзеныя.

Нашых грамадзян у веры, рэлігіі ўтрымлівае не абяцанне ўваскрашэння і здабыццё сэнсу жыцця, а яе эстэтычны бок, "падабаюцца традыцыі і абрады". Гэта, як мы бачым, уласціва і праваслаўным, і ў цэлым жыхарам Магілёўскай вобласці па-за залежнасцю ад гендэрных адрозненняў.

Табліца 14 – Чаму прытрымваецеся веры? *

| **Прычыны** | **Ўсе** | **Праваслаўныя** | **Мужчыны** | **Жанчыны** |
|---|---|---|---|---|
| Дапамагае пераадольваць жыццёвыя праблемы, складанасці | 31,9 | 34,3 | 25,8 | 35,6 |
| Адпавядае перакананням | 21,9 | 22,6 | 21,6 | 21,9 |
| Падабаюцца традыцыі і абрады | 12,7 | 13,4 | 12,9 | 12,6 |
| Дае адказы на пытанні аб сэнсе жыцця | 8,9 | 8,6 | 7 | 10,1 |
| Дае надзею на ўваскрашенне | 4,1 | 3,3 | 5 | 2,5 |
| Не думалі аб гэтым | 34,9 | 37,7 | 33,8 | 35,8 |
| Сямейная традыцыя | 2 | 2,3 | 2 | 2 |

* Сума па слупках табліцы можа быць больш за 100 %, т.я. на пытанне анкеты можна было даць больш за 1 адказ.

Адным з найболей распаўсюджаных відаў культавай практыкі з'яўляецца малітва. У хрысціянскім асяроддзі лічыцца неабходным памаліцца перад сном, перад ежай. Асабліва важна апошняе, паколькі дадзеная практыка нагадвае аб апошняй сумеснай трапезе, больш вядомай як "тайная вечеря".

Табліца 15 – Як часта моляцца жыхары Магілёўшчыны

| **Частата** | **Усе** | **Праваслаўныя** | **Мужчыны** | **Жанчыны** |
|---|---|---|---|---|
| Некалькі разоў у дзень | 6,3 | 6,2 | 3,7 | 7,8 |
| Адзін раз у дзень | 10,7 | 11,1 | 7,5 | 12,6 |
| Адзін раз у тыдзень | 3,8 | 3,5 | 2 | 4,7 |
| Ад выпадку да выпадку | 41,8 | 45,9 | 34,5 | 46,2 |
| Не малюся, але малітвы ведаю | 10,2 | 11,1 | 12 | 9 |
| Не малюся, не ведаю малітвы | 20,9 | 21,9 | 29,5 | 15,6 |
| Няма адказу | 6,3 | – | 10,4 | 3,7 |

Малітвенная практыка трывала ўвайшла ў жыццё большасці жыхароў Магілёўскай вобласці. Не звяртаецца да азначанага віда культавай дзейнасці толькі 30 % жыхароў. Мы можам сказаць, што адназначна ніякіх малітваў не ведае кожны пяты жыхар вобласці. Сярод праваслаўных, як і ў цэлым па вобласці, не моліцца кожны трэці (33 %) і кожны пяты не ведае ні адной малітвы. Як і вынікала чакаць, да малітвы найчасцей звяртаюцца жанчыны, чым мужчыны. Жанчын, якія ведаюць малітвы, больш, чым мужчын, і частата малітвеннай практыкі ў жанчын вышэй.

Сярод моладзі штодзённая малітвенная практыка фіксуецца ў кожнага дзясятага (10 %), але і не звяртаецца да дадзенага віда культавай дзейнасці 35 % маладых жыхароў Магілёўскай вобласці.

Жыхары Магілёўшчыны не пакідаюць без сваёй увагі культавыя будынкі. Практычна восем з дзесяці заходзяць на богаслужэнні ў храмы. Не менш за раз у месяц у храм прыходзіць 16,8 % жыхароў рэгіёна. Адзін раз у паўгода прыходзяць у храм 30,9 % жыхароў і яшчэ 28,5 % ідуць у храм раз у год і ідуць па розных матывах.

Калі казаць аб матывах жыхароў Магілёўскай вобласці, якімі яны кіруюцца для ўдзелу ў абрадах і таінствах, то варта адзначыць, што рэлігійныя перакананні тут адыгрываюць не галоўную ролю. Па рэлігійных перакананнях на богаслужэнне ў храм прыходзіць 11 % жыхароў Магілёўскай вобласці. Ідуць у храм, таму што ў гэтым ёсць душэўнае запатрабаванне, 19 %, а 17,8 % жыхароў вобласці ідуць у храм за душэўным супакоем. Кожны пяты жыхар Магілёўшчыны прыходзіць у царкву з павагі да прынятых рэлігійных традыцый.

Можам сказаць, што ўдзел або не ўдзел у абрадавай практыцы мае гендэрныя асаблівасці. Так мужчыны паказваюць вялікую схільнасць да ігнаравання абрадаў і таінстваў больш, чым жанчыны. Практычна кожны чацвёрты прадстаўнік мужчынскай паловы (25 %) не ходзіць у царкву, не ўдзельнічаюць у здзяйсненні абрадаў і таінстваў чацвёра з дзесяці мужчын (39,1 %). Сярод жанчын Магілёўшчыны не ходзіць у царкву толькі 12,8 %, і 35,3 % жанчын не ўдзельнічаюць у абрадах і таінствах.

Варта адзначыць, што нашы праваслаўныя землякі не асабліва часта наведваюць храмы: толькі 17,3 % прыходзяць у царкву з рэкамендуемай

ёю частатой (не меней за 1 раз у месяц). Кожны трэці праваслаўны жыхар Магілёўскай вобласці заходзіць у храм раз у год, 34 % – раз у паўгода, а 18,4 % праваслаўных наогул у храм не прыходзяць. Практычна чацвёра з дзесяці (39,8 %) праваслаўных не ўдзельнічаюць у адпраўленні абрадаў і таінстваў.

Сучаснае беларускае грамадства ўжо не можа абыйсціся без рэлігііі. Вячэрняе і ранішняе гучанне званоў, што склікае вернікаў у храмы, успрымаецца як натуральная частка нашага жыцця. Самі жыхары Беларусі і Магілёўскага рэгіёна сцвярджаюць важнасць рэлігіі ў іх жыцці (вельмі важная – 21,2 %, хутчэй важная – 56,4 %) і для жыцця грамадства ў цэлым.

**Высновы.** Асаблівасцю канфесійнага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь было тое, што можна вылучыць тры этапы ў сацыяльна-палітычнай дзейнасці рэлігійных арганізацый і вернікаў. Першы этап характарызуецца адноснай рэлігійнай свабодай у дзейнасці вернікаў і рэлігійных арганізацый, на другім этапе (сярэдзіна 1990-х–2002 год) ажыццяўляецца пераход да рэгламентавання дзяржавай сацыяльна-палітычнай дзейнасці рэлігійных арганізацый і вернікаў, на трэцім этапе дзяржава ставіць пад свой кантроль сацыяльна-палітычную дзейнасць цэркваў, абмяжоўваючы яе сферамі адукацыі, культуры, сацыяльнымі праектамі.

Найбольшы рост колькасці рэлігійных арганізацый у асяродку нацыянальных супольнасцей адбываўся ў першай палове 1990-х гг. У сярэдзіне 1990-х гг. назіраецца стабілізацыя росту ліку рэлігійных абшчын, адначасова стабілізуецца колькасць грамадзян краіны, якія прылічвалі сябе да веруючых.

З канца 1990-х гадоў назіраецца паніжэнне дадатнай дынамікі росту колькасці рэлігійных арганізацый. У цяперашні час на рэлігійнай прасторы краіны адбылося насычэнне рэлігійнымі арганізацыямі і тэмпы штогадовага прыросту рэлігійных абшчын знізіліся амаль у 4 разы, у параўнанні з першай паловай 1990-х г.

У першыя гады постсавецкага існавання Беларусі адбыўся значны рост колькасці рэлігійных абшчын і колькасці “веруючых”, падставы якому былі закладзеныя яшчэ ў перыяд “перабудовы”. Затым, па меры ўмацавання Беларускай дзяржавы адбываецца стабілізацыя рэлігійнага поля. На сённяшні дзень агульнай для рэлігійнай прасторы сучаснай Беларусі з’яўляецца сітуацыя рэлігійнай стабільнасці, якая праяўляецца ў значным зніжэнні тэмпаў прыросту колькасці рэлігійных арганізацый і “веруючых”.

Варта адзначыць, што рост колькасці рэлігійных арганізацый не быў дапоўнены якасным станам рэлігійнасці насельніцтва, якаснай культавай практыкай, у прыватнасці “воцерковлением” насельніцтва (што тычыцца галоўным чынам дамінуючых хрысціянскіх канфесій і, у першую чаргу, праваслаўя). Гэта шмат у чым абумоўлена практычным знікненнем традыцыі ў выніку шматгадовай барацьбы з рэлігіяй.

## 4 Роля і значэнне нацыянальнай мовы ў фарміраванні этнічнай ідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва

Далучанасць да культуры свайго народа, павага да яго гісторыі і традыцый праяўляецца ў адносінах да сваёй нацыянальнай мовы – асноўнага сродку трансляцыі культурнай спадчыны і ментальных дасягненняў народа, адносінах, якія склаліся ў пэўных гістарычных, геаграфічных і сацыяльных умовах. Паводзінскім аспектам адносін да мовы з'яўляецца больш ці менш выражанае імкненне выкарыстоўваць яе ў штодзённым жыцці і лічыць яе роднай мовай. Узрастаючая каштоўнасць якаснага засваення і практычнага прымянення роднай мовы мае вельмі важны аспект: узмацненне ролі мовы ў нацыянальнай ідэнтыфікацыі асоб і сацыяльных груп. Гэта вельмі каштоўна з пункту гледжання перспектыў нацыянальнага адраджэння і развіцця.

### 4.1 Дзейнасць дзяржаўнай улады па захаванню нацыянальных моў і мовы тытульнай нацыі

У лістападзе 1996 г. у Беларусі прайшоў рэспубліканскі рэферэндум, на якім была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь са зменамі і дадаткамі. У адпаведнасці з артыкулам 17 Канстытуцыі "дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы" [507].

У рэалізацыі нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь улічваліся культурныя і адукацыйныя запатрабаванні нацыянальных супольнасцей і прыкладаліся намаганні па захаванню нацыянальных моў і арганізацыі навучання на родных мовах.

Аналіз каштоўнаснай арыентацыі моладзі ў духоўным жыцці імкліва зменлівага грамадства дазваляе адзначыць наступнае. У Беларусі напярэдані XXI стагоддзя 43,1 % моладзі лічылі сваёй роднай мовай – беларускую, а сярод іх ва ўзросце да 20 год – 51,1%. Для параўнання, у 1960–70-я гады 60–65 % этнічных беларусаў лічылі сваёй роднай мовай не беларускую, а рускую. Вынікі сацыялагічных даследванняў 90-х гадоў XX ст. пры зносінах з рэспандэнтамі (моладзю), якія гаварылі аб выкарыстоўванні дзвюх моў (рускай і беларускай), дазволілі зрабіць выснову, што размова вялася не аб двухмоўі, а аб нізкай моўнай культуры рэспандэнта, маючага маленькі слоўнікавы запас і рускай і беларускай моў [508]. У групе моладзі ва ўзросце да 20 год, два фактары – родная мова і пачуццё нацыянальнага адзінства – займалі два першыя рангавыя месцы (з 12) у іерархіі значнасці розных фактараў (эканамічных, палітычных,

[507] Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г.

[508] Динамика ценностных ориентаций молодёжи в трансформирующемся обществе. Минск, 2001. С. 97–98.

тэрытарыяльных, сацыякультурных і інш.) у нацыянальным развіцці і духоўным жыцці народа [509].

У фарміраванні подобных арыентацый на родную мову вялікую ролю адыгрывала адукацыя на нацыянальных мовах, у першую чаргу, на дзяржаўным узроўні.

З усіх нацыянальных супольнасцей Беларусі ў савецкі час толькі літоўцы мелі сваю школу ў Гродзенскай вобласці, калі не ўлічваць школы з рускай мовай навучання.

Пачатак навучання дзяцей польскай мове быў пакладзены ў Гродзенскай вобласці ў 1987–1988 навучальным годзе. На той момант яе вывучалі 11 вучняў Ласасноўскай СШ Гродзенскага раёна. З 1990–1991 навучальнага года – у Брэсцкай вобласці і ў паасобных школах у іншых абласцях Рэспублікі Беларусь.

Міністэрства адукацыі і навукі распрацавала вучэбныя планы, у якіх прадугледжвалася магчымасць вывучэння мовы нацыянальнай супольнасці або навучанне на гэтай мове. Навучальныя планы па польскай мове і літаратуры, па гісторыі польскага народа былі прааналізаваны, абмеркаваны і ўдасканалены ў мясцовых органах адукацыі. Планы абмяркоўваліся з прадстаўнікамі нацыянальных суполак, іх прапановы, заўвагі ўлічваліся пры канчатковай дапрацоўцы гэтых дакументаў. З мэтай больш грунтоўнай і якаснай арганізацыі навучальнага працэсу ў класах з вывучэннем такіх моў, міністэрства супрацоўнічала з краінамі паходжання нацыянальных супольнасцей Беларусі. З Польшчай было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў справе вывучэння польскай мовы ў нашай рэспубліцы. Былі створаны сумесныя кансультатыўныя камісіі па справах школы для беларускай супольнасці ў Польшчы і польскай супольнасці ў Беларусі.

У сакавіку 1998 г. Міністэрства адукацыі сумесна з Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей зацвердзілі інструктыўна-метадычны ліст “Аб арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь навучання дзяцей, якія належаць да нацыянальных супольнасцей”. Было вызначана тры тыпы школ (класаў) для нацыянальных супольнасцей: школа (клас) з вывучэннем усіх прадметаў на нацыянальнай мове акрамя беларускай і рускай моў і іх жа літаратур, гісторыі і геаграфіі Беларусі; школа (клас), дзе на нацыянальнай мове вывучаецца родная мова, літаратура, гісторыя, геаграфія, культура краіны, да якой этнічна належыць нацыянальная супольнасць; школа (клас), дзе выкладаецца дадатковы прадмет – родная мова нацыянальнай супольнасці [510].

Беларуская дзяржава праявіла клопат аб забеспячэнні школ, дзе выкладаліся нацыянальныя мовы, неабходнымі падручнікамі і

[509] Динамика ценностных ориентаций молодёжи в трансформирующемся обществе. С. 98.

[510] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 51.

дапаможнікамі. У 1992 г. выдавецтва “Народная асвета” выдала 5, а ў 1993 – 6 найменняў польскамоўных падручнікаў. На 1996 г. класы з вывучэннем польскай мовы былі забяспечаны ад 1-га да 9-га класаў падручнікамі па польскай мове і літаратуры. У той год рыхтаваўся да выдання падручнік-хрэстаматыя па гісторыі польскай літаратуры для 9-х класаў; былі зроблены пераклады падручнікаў матэматыкі для 1–4 класаў, біялогіі для 6–7 класаў, пераклад падручніка па матэматыцы для 5-х класаў. Праграма забеспячэння падручнікамі класаў з навучаннем на польскай мове была разлічана да 2002 г. Улічваючы складанасць падрыхтоўкі да выдання падручнікаў для класаў з польскай мовай навучання, была дамоўленасць з Міністэрствам адукацыі Літоўскай Рэспублікі аб супрацоўніцтве, згодна з якой можна было карыстацца перакладзенымі на польскую мову падручнікамі матэматыкі і іншых прадметаў. У 1997–1998 гг. за кошт дзяржаўных сродкаў былі выдадзены на польскай мове “Хрэстаматыя па польскай літаратуры” для 10 класа, падручнік “Матэматыка” для падрыхтоўчага класа, падручнік “Чалавек і свет” для падрыхтоўчага класа.

На пачатак 1989–1990 навучальнага года ў Гродзенскай вобласці дзейнічала наступная колькасць школ паводле мовы навучання: 184 на рускай мове (4575 класаў) з 120411 вучнямі; 564 на беларускай мове (4494 класа) з 40653 вучнямі; 26 на польскай мове (57 класаў) – 651 вучань; 3 на літоўскай мове (15 класаў) – 91 [511].

У 1990–1991 н.г. у Гродзенскай вобласці была 631 школа з адной мовай навучання (91256 вучняў). З іх з рускай мовай навучання – 80 школ (51337 вучняў), з беларускай − 551 (39919). Працавалі 105 школ з дзвюма мовамі навучання (72604 вучня). У іх 68396 вучняў вучыліся на рускай мове, 4208 на беларускай. Акрамя таго было 192 школы (120060 вучняў), у якіх родная мова вывучалася як прадмет: беларуская мова – 175 школ (119248 вучняў), польская мова – 14 (711), літоўская мова – 3 (101). У 157 школах (6653 вучня) родная мова вывучалася факультатыўна ці ў гуртках: беларуская мова – 41 школа (859 вучняў), польская мова – 116 (5795) [512].

У 1995–1996 навучальным годзе мовы нацыянальных супольнасцей вывучалі 16000 вучняў ў 330 школах: у 318 – польскую мову, 5 – літоўскую, 2 – яўрэйскую, 2 – украінскую.

21.09.1996 г. у г. Гродна была адкрыта першая ў рэспубліцы сярэдняя школа (разлічана на 560 асоб) з польскай мовай навучання, дзе навучалася 426 дзяцей. На будаўніцтва першай школы з польскай мовай навучання ў 1996 г. беларускай дзяржавай было выдзелена 62 тысячы долараў ЗША . У 1997/1998 навучальным годзе ў гэтай школе займалася 496 вучняў, у 2008–2009 вучэбным годзе ў ёй займаўся 301 вучань.

[511] Справаздача // ДАГр. Фонд 730 Воп. 2. Спр. 895. Арк. 3–4.
[512] Справаздача // Там жа. Арк. 1–1 адв.

15.12.1997 г. на пасяджэнні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта разглядалася пытанне “Аб ходзе рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян вобласці на навучанне дзяцей на роднай мове”.

На пасяджэнні было адзначала, што ў 1997–1998 н.г. у вобласці было 655 агульнаадукацыйных школ, з іх на беларускай мове – 464 (70,8 %), на рускай – 29 (4,3 %), на беларускай і рускай мовах – 160 (24,4 %), на польскай – 1, на літоўскай мове – 1. На беларускай мове навучаліся – 51,5 % ад агульнай колькасці школьнікаў, на рускай – 48,1 %. У той жа час, у тым навучальным годзе 44,1 % дзяцей паступілі ў 1 клас з беларускай мовай навучання, 55,4 % – з рускай мовай. Захоўваўся, у нейкай ступені, беларускамоўны рэжым у сістэме прафтэхадукацыі, у дашкольных установах, педвучылішчах. На польскай мове вучыліся 664 вучні. Як прадмет у гуртках і на факультатывах, у якасці роднай польскую мову вывучалі ў 21 раёне вобласці звыш 8000 дзяцей (стварыць польскую школу для такой колькасці дзяцей не палічылі патрэбным). Выкладалі польскую мову 318 настаўнікаў, 115 з іх (36,2 %) мелі спецыяльную адукацыю. У вобласці працавалі класы з вывучэннем літоўскай мовы як прадмета ў Астравецкім і Воранаўскім раёнах, была адкрыта школа з літоўскай мовай навучання ў в. Рымдзюны Астравецкага раёна, у в. Пеляса Воранаўскага раёна функцыянавала недзяржаўная школа з навучаннем па-літоўску. У перыяд 1995–1997 гг. у вобласці адбыўся працэс пераводу навучання дзяцей з беларускай на рускую мову. У выніку ў гг. Гродна і Слоніме навучанне цалкам стала рускамоўным. Актуальнай была праблема кадраў, якія забяспечвалі выкладанне польскай мовы. 63,8 % з іх былі сумяшчальнікамі. Неналежным чынам вырашалася праблема забеспячэння навучальнага працэсу на польскай мове падручнікамі па розных прадметах. Не былі абсталяваны ў неабходнай ступені кабінеты фізікі, хіміі, працоўнага навучання ў школах з польскай мовай – СШ № 36 г. Гродна, Рымдзюнскай СШ.

Паводле ліста Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за № 25–06/61 ад 09.02.98 г. па стану на 06.09.97 г. у нашай дзяржаве навучаліся на польскай мове: у г. Мінску – 48 вучняў (1 кл.–12; 2 кл.–8; 3 кл.–15; 4 кл.–13), у г. Брэсце – 43 вучня (1 кл. – 20; 2 кл. – 5; 3 кл. – 13; 4 кл. – 5), у Гродзенскай вобласці – 664 вучня (1 кл. – 93; 2 кл. – 121; 3 кл. – 75; 4 кл. – 119; 5 кл. – 97; 6 кл. – 118; 7 кл. – 51); на літоўскай мове ў Гродзенскай вобласці – 77 вучняў (1 кл. – 8; 2 кл. – 7; 3 кл. – 4; 4 кл. – 11; 5 кл. – 7; 6 кл. – 11; 7 кл. – 6; 8 кл. – 8; 9 кл. – 5; 10 кл. – 3; 11 кл. – 7) [513].

У 1999 г. у г. Ваўкавыску Гродзенскай вобласці была ўведзена школа з польскай мовай навучання на 198 месц, у якой у 2008–2009 вучэбным годзе вучылася 177 дзяцей.

[513] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 56–57.

З 1999 г. пачынаецца памяншэнне колькасці вучняў, якія рознымі формамі вывучалі польскую мову ў дзяржаўных установах. Адпаведна навучальным гадам (1999–2003 гг.): 10513, 9459, 9965, 9274 і 9219 дзяцей і падлеткаў.

На 01.09.2002 г. у Гродна, не ўлічваючы СШ № 36, вывучалі польскую мову – 2260 чалавек (2001/2002 нав. год – 2253 чалавекі). У СШ № 36 г. Гродна ў класах з польскай мовай у 2002/2003 нав. годзе вучылася – 489 вучняў. Адзначалася пэўная тэндэнцыя да змяншэння: 1.09.2000 – 548 вучняў, 1.09.2001 – 545 вучняў, 1.09.2002 – 489. У 2001 г. у польскай школе ў Баранавічах у 1–11 класах вучылася 610 вучняў, існавала група дарослых па вывучэнню польскай мовы, дзве настаўніцы выязжалі для правядзення заняткаў па польскай мове ў навакольныя школы вёсак Ішкалдзь і Паланечкі[514].

ГА "СПБ" у 2003 г. прапанавала пабудаваць у Гродна (за кошт сродкаў Польшчы) другую школу з польскай мовай навучання. Улады Беларусі катэгарычна адмовіліся ад прапановы. У той жа час, там дзе планавалі пабудаваць польскую школу, 341 вучань вывучаў польскую мову і літаратуру ў розных формах на базе існуючых агульнаадукацыйных школ.

Навучанне на польскай мове на пачатак 2004/2005 навучальнага года было ў трох школах Гродзенскай вобласці – у Ваўкавыску і Гродна. У 28 школах вобласці – 1374 вучня 11 падрыхтоўчых класаў вывучалі польскую мову як прадмет, 6019 – факультатыўна. У 39 дашкольных установах Гродзеншчыны быў створаны 61 гурток, у якіх 778 дзяцей засвойвалі асновы польскай мовы.

У 2008–2009 навучальным годзе годзе ў 12 школах Гродзенскай вобласці польская мова вывучалася як прадмет, амаль 3,5 тысячы школьнікаў вывучалі яе на занятках факультатываў, у гуртках. Акрамя таго, у шэрагу дзяржаўных пазашкольных устаноў польская мова вывучалася ў пазаўрочны час. У 21 дашкольнай установе вобласці дзецьмі таксама асвойваліся асновы польскай мовы. На базе польскіх нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў у 2008–2009 вучэбным годзе функцыянавалі 3 школы выхаднога дня, у якіх сваю родную мову вывучалі 584 чалавекі.

Пры Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур у г. Мінску дзейнічалі армянская, карэйская, літоўская, татарская, польская, яўрэйская, эстонская нядзельныя школы, дзе дзеці вывучалі родную мову, гісторыю, культуру і традыцыі свайго народа. У 1997 г. пры Цэнтры быў адкрыты Народны ўніверсітэт нацыянальных культур, слухачамі якога былі кіраўнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў і ўсе тыя, каго цікавілі пытанні гісторыі і сучаснага становішча нацыянальнага жыцця ў

[514] Kabzińska I. Odradzanie sią grupy polskej inteligencij w Respublice Białoruś // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. С. 35.

рэспубліцы. На базе дзяржаўных устаноў адукацыі і культуры функцыянавала значная колькасць нядзельных школ, галоўным чынам яўрэйскіх і польскіх [515].

Для задавальнення культурна-адукацыйных патрэб беларуская дзяржава выдаткоўвала фінансавыя сродкі. Так, згодна з афіцыйнымі данымі, толькі ў 2004 г. на ўтрыманне школ і класаў з польскай мовай навучання было выдаткавана 731,424 млн. рублёў (335515, 59 даляраў ЗША) [516].

Згодна з данымі афіцыйных улад: ”у 2004 годзе выдаткі бюджэтных фінансавых сродкаў вобласці на ўтрыманне школ і класаў, дзяржаўных адукацыйных устаноў з польскай мовай навучання і вывучэння польскай мовы склалі амаль міліярд рублёў” [517].

Гэта не такія вялікія сродкі, калі ўлічваць усе выдаткі на адукацыю і адпаведны працэнт (24,8 %) польскага насельніцтва ў вобласці.

У Гродна і Гродзенскім раёне ў школах, дзе вывучалася польская мова, праграма не прадугледжвала вывучэнне дадатковай мовы і здачу адпаведнага экзамену. Такім чынам, польская мова як прадмет выкладалася ў межах тагачаснай школьнай праграмы – гэта прыводзіла да скарачэння гадзін мовы і перагрузкі вучняў. Каб пазбегнуць перагрузкі, польскую мову вывучалі за кошт беларускай мовы! У матэрыялах Камітэта маецца інфармацыя аб тым, што настаўнікі прасілі аб вывучэнні польскай мовы як прадмета не за кошт гадзін, якія адводзіліся на вывучэнне беларускай мовы, а за кошт рускай, альбо іншых прадметаў [518].

У класах з польскай мовай навучання спачатку працавалі 15 настаўнікаў з Рэспублікі Польшча, запрошаныя Міністэрствам адукацыі і навукі пасля адпаведных зваротаў мясцовых органаў адукацыі і на падставе Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам нацыянальнай адукацыі Рэспублікі Польшча і Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь [519].

Беларускія настаўнікі, якія выкладалі польскую мову, паэтапна праходзілі падрыхтоўку па польскай мове ў Інстытутах павышэння кваліфікацыі і ў Рэспубліцы Польшча (Беласток, Варшава, Люблін). Акрамя таго, у супрацоўніцтве з настаўніцкім цэнтрам у Любліне, падчас школьных канікулаў для настаўнікаў арганізоўваліся курсы польскай мовы на базе Рэспубліканскага цэнтра павышэння кваліфікацыі і падрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі ў Мінску, а таксама

---

[515] Макрушич Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.). С. 52.

[516] К вопросу о белорусско-польских отношениях. С. 7.

[517] Тусевич Е. Живём без оглядки на национальность. С. 6.

[518] Пушкін І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. С. 58.

[519] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь. С. 165.

абласнога Інстытута павышэння кваліфікацыі настаўнікаў у Гродна.

Паступова настаўнікі з Польшчы замяняліся беларускімі грамадзянамі-выпускнікамі вышэйшых навучальных устаноў Беларусі і Польшчы.

Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў для польскамоўных школ ажыццяўлялася Гродзенскім універсітэтам (польска-беларускае і польска-рускае аддзяленні), Беларускім дзяржаўным універсітэтам (аддзяленне славянскай філалогіі), Лінгвістычным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка (факультэт беларускай філалогіі, сусветнай і айчыннай культуры), а таксама Ваўкавыскім педагагічным вучылішчам.

Універсітэты ў Брэсце, Гродна, Мінску рыхтавалі кадры выкладчыкаў літоўскай, польскай, украінскай моў. Выдаткі на дзеючы ў навучальных установах этнакампанент аплачваліся з бюджэту краіны па артыкуле “адукацыя” [520].

У вучэбных праграмах шэрагу ВНУ Беларусі, акрамя вывучэння моў асобных нацыянальных супольнасцей, меліся спецкурсы “Гісторыя нацыянальных супольнастей Беларусі”, “Нацыянальныя супольнасці Беларусі” (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна), “Народы і канфесіі Гродзеншчыны” (Гродзенскі дзяржуніверсітэт імя Я. Купалы) і іншыя [521].

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, пачынаючы з 1989 г., адбылося 12 выпускаў адпаведных спецыялістаў (382 настаўніка беларускай і польскай, рускай і польскай моў). З 1994 г. да 2008 г. адбылося 14 выпускаў, падрыхтаваны 451 спецыяліст. З 2003 г. ва ўніверсітэце была распачата падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі з дадатковай спецыяльнасцю – польская мова. Гродзенскі педагагічны каледж (вучылішча) з 1992 г. рыхтаваў выхавацеляў дашкольных устаноў з правам працы ў групах з польскай мовай навучання. На 01.09.2005 г. падрыхтаваны 353 спецыялісты, да 2009 г. – 408 чалавек па спецыяльнасці “выхавальнік дашкольнай установы з вывучэннем польскай мовы, кіраўнік гуртка польскай мовы”. Ваўкавыскі педагагічны каледж (вучылішча) падрыхтаваў 32 настаўнікі пачатковых класаў з правам выкладання польскай мовы [522].

Ва ўстановах адукацыі Гродзенскай вобласці ў 2004–2005 навучальным годзе працавалі 103 настаўнікі польскай мовы, якія мелі вышэйшую педагагічную адукацыю і валодалі польскай мовай, з іх 63 па сумяшчальніцтву.

---

[520] Рыбаков М.Л. О межнациональных отношениях и государственной политике в Республике Беларусь. С. 19–22.

[521] Иоффе Э.Г. Проблемы реализации прав национальных общностей и законодательство Республики Беларусь // Чалавек. Грамадства. Свет. 2005. № 1. С. 61.

[522] Тусевич Е. Живём без оглядки на национальность. С. 6.

У Гродзенскай вобласці сумесна з ГА "СПБ" і ГА "Polska Macierz szkolna" (пачала сваю дзейнасць у Беларусі з 1995 г.) [523] штогод праводзілася шмат раённых і абласных мерапрыемстваў для школьнікаў, міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі. З 2003 г. актывізавалася супрацоўніцтва з куратoрыяй адукацыі ў г. Беластоку ў межах падпісанага пагаднення аб супрацоўніцтве на 2003–2005 гг.. У 2004 г. быў праведзены сумесны конкурс паміж настаўнікамі беларускай мовы Гродзенскай вобласці і Падляскага ваяводства, у 2005г. праводзіўся сумесны конкурс "Настаўнік польскай мовы – 2005".

Табліца 16 – Даныя аб агульнаадукацыйных школах па мовах навучання ў абласцях Рэспублікі Беларусь, 2004–2005 н.г.[524]

| | **На беларускай** | | **На рускай** | | **На польскай** | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **чал.** | **%** | **чал.** | **%** | **чал.** | **%** |
| г. Мінск | 8558 | 4,2 | 193015 | 95,7 | 30 | 0,0 |
| Брэсцкая | 53964 | 26,4 | 150410 | 73,6 | 41 | 0,0 |
| Віцебская | 34711 | 21,5 | 126624 | 78,5 | 0 | 0,0 |
| Гомельская | 37345 | 18,6 | 163384 | 81,4 | 0 | 0,0 |
| Гродзенская | 53721 | 35,2 | 98435 | 64,4 | 585 | 0,4 |
| Мінская | 81960 | 42,6 | 110600 | 57,4 | 0 | 0,0 |
| Магілёўская | 30641 | 20,5 | 119095 | 79,5 | 0 | 0,0 |

Згодна з інфармацыяй Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2004/2005 н.г. у рэспубліцы функцыянiравалі 4104 агульнаадукацыйныя школы. З іх агульнай колькасці ў 2428 (59,2 %) агульнаадукацыйных школах навучальна-выхаваўчы працэс ажыццяўляўся на беларускай мове, у 1366 (33,3 %) – на рускай, у 307 (7,5 %) – на дзвюх мовах (беларускай і рускай). Ва ўсіх тыпах устаноў, якія забяспечвалі атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, навучалася 1264530 вучняў, у тым ліку, на беларускай мове – 301250 (23,8 %), на рускай – 962549 (76,15 %), на польскай – 656 (0,1%), на літоўскай 75 вучняў (гл. табліца 16).

У навучальных установах краіны вывучаліся ў розных формах іўрыт, польская, літоўская, новагрэчаская, украінская і іншыя мовы. Аб'яднаннямі арганізоўваліся школы выхаднога дня, у якіх родную мову, гісторыю і культуру вывучалі азербайджанцы, армяне, афганцы, грузіны, грэкі, яўрэі, карэйцы, літоўцы, латышы, малдаване, немцы, палякі, татары, украінцы.

Мова нацыянальнай супольнасці вывучалася як прадмет на факультатывах, гуртках і розных іншых формах навучання. Акрамя таго,

---

[523] Kabzińska I. Odradzanie sią grupy polskej inteligencij w Respublice Białoruś // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. С. 34.
[524] Наша слова. 2005. 23 сак. С. 1.

існавала даволі шырокая сетка нядзельных школ, школ пры касцёлах, сінагогах, мячэцях, дзе вывучаліся мовы нацыянальных супольнасцей, а таксама гісторыя, геаграфія краіны, да якой этнічна належала супольнасць, традыцыі і культура адпаведных народаў. Гэтай формай навучання было ахоплена амаль 5000 дзяцей [525]. На 28.01.2000 г. у Беларусі дзейнічала больш за 50 школ выхаднога дня (ШВД) нацыянальных супольнасцей, у якіх займаліся каля 4000 чалавек.

У 2014 г. у Беларусі функцыянавалі 4 установы адукацыі, у якіх навучанне ажыццяўлялася на мовах нацыянальных супольнасцей: 2 школы з польскай мовай навучання і выхавання (у Гродна і Ваўкавыску) і 2 школы з літоўскай мовай навучання і выхавання (у в. Рымдзюны Астравецкага раёна і в.Пеляса Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці). На мове нацыянальных супольнасцей у 2013/2014 навучальным годзе навучаліся 794 вучні (на польскай – 669, літоўскай – 125 вучняў). Акрамя таго, у 2013/2014 навучальным годзе ў 135 установах агульнай сярэдняй адукацыі 4 тыс. 997 вучняў вывучалі мовы нацыянальнай супольнасці на вучэбных занятках, факультатыўных занятках або ў аб'яднаннях па інтарэсах: польскую мову – 4 тыс. 702 вучні, літоўскую мову – 30 вучняў, яўрэйскую мову – 265 вучняў [526].

Такім чынам, у некаторых дзяржаўных вучэбных і выхаваўчых установах у адпаведнасці з пажаданнямі прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей было арганізавана вывучэнне шэрагу нацыянальных моў, навучанне і выхаванне на гэтых мовах. На базе агульнаадукацыйных школ, пазашкольных, клубных, бібліятэчных устаноў сістэм Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры па ініцыятыве нацыянальных супольнасцей былі ўтвораны школы, класы, факультатывы, гурткі па навучанню на роднай мове, даследаванню гісторыі і культуры нацыянальных супольнасцей. Адукацыйныя структуры з этнакультурным кампанентам забяспечваліся адпаведнымі падручнікамі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, па магчымасці, Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама краінамі гістарычнага паходжання. У вышэйшых навучальных установах была арганізавана падрыхтоўка кадраў для гэтых школ. У той жа час, у краіне не існавала ў неабходнай колькасці паўнавартасных дзяржаўных нацыянальных школ (яўрэйскіх, татарскіх, цыганскіх і г.д.).

Дзевяностыя гады XX стагоддзя адзначаюцца ў беларускай гісторыі, культуры і мовазнаўстве як час нацыянальнага ўздыму беларускай мовы, узросту яе папулярнасці. У гістарычных і мовазнаўчых крыніцах за дадзеным перыядам замацавалася назва “Другое беларускае адраджэнне”.

---

[525] Касовіч В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь. С. 165.

[526] Абавязковы экзамен па гісторыі Беларусі будуць здаваць з 2015 года выпускнікі 11-х класаў // Навіны Беларусі. БЕЛТА. 24 ліпеня 2014 года. http://blr.belta.by/all_news/society/Abavjazkovy-ekzamen-pa-gstory-Belarus-buduts-zdavats-z-2015-goda-vypusknk-11-x-klasa_i_69683.html. Дата доступа 24.07.2014 г.

Хваля нацыянальнага ўздыму не была стыхійнай, бо з ёй былі звязаны бурныя падзеі: крушэнне ідэй сацыялізму, а разам з імі – хуткі распад Савецкага Саюза, імкненне саюзных рэспублік атрымаць незалежнасць і замацаваць яе пры дапамозе мовы тытульнай нацыі.

У 1989–1990 гг. заканадаўчыя ўлады кожнай рэспублікі паспяшаліся зацвердзіць нацыянальныя мовы ў статусе дзяржаўных. Так 26.01.1990 г. быў прыняты Закон "Аб мовах у Беларускай ССР", які надаў беларускай мове статус дзяржаўнай і афіцыйна адчыніў дзверы беларусізацыі ўсіх сфер грамадскага жыцця. У Законе адзначаная мера рэгламентавалася як неабходнасць аховы беларускай мовы на этнічнай тэрыторыі. Руская мова кваліфікавалася ў законе як "мова міжнацыянальных зносін народаў Саюза ССР".

20.09.1990 г. Савет міністраў БССР прыняў "Дзяржаўную праграму развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў" [527]. Рэалізацыя праграмы была разлічана на працягу 10 год. За гэты тэрмін было неабходна:

а) на працягу 3 год увесці беларускую мову ў афіцыйныя дакументы, у сферу навукі, культуры, у сродкі масавай інфармацыі, у работу пошты і тэлеграфа, у маркіроўку тавараў, напісанне асабовых імён;

б) на працягу 3–5 год – у дзяржаўныя ўстановы, у мову службовых асоб, органы дзяржаўнай улады і кіравання, у мову з'ездаў і канферэнцый;

в) на працягу 5 год – у справаводства, у тэхнічную і праектную дакументацыю, у дакументы па выбарах дэпутатаў, у сферу абслугоўвання, у дзіцячыя дашкольныя ўстановы;

г) на працягу 10 год – у адміністратыўнае і натарыяльнае справаводства, судовую дакументацыю, у юрыдычныя ўстановы і міжнародныя дагаворы, у навучальны і выхаваўчы працэс агульнаадукацыйных школ, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, сярэднеспецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Разам з Дзяржаўнай праграмай, а таксама з Дэкларацыяй аб суверэнітэце Беларусі, прынятай 27.07.1990 г., узнікла новая магчымасць уплываць на моўнае становішча, павялічыць шансы на адраджэнне беларускай мовы і культуры, якая знаходзілася ў глыбокім крызісе пасля доўгіх стагоддзяў абмежаванага ўжывання, выкарыстоўвалася як другасная, "гутарковая", "сялянская", "саматужная" мова, у лепшым выпадку, як сродак культурных зносін у літаратуры, фальклоры, тэатральным мастацтве.

У краіне склалася надзвычай супярэчлівая, парадаксальная сітуацыя, якая выражаецца ў тым, што нацыянальная мова тытульнай нацыі не з'яўляецца функцыянальнай. Беларускі народ не размаўляе на той мове,

---

[527] Ліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у Савет Міністраў ад 4.01.1993 г. "Аб выкананні Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Рэспубліцы Беларусь" // НАРБ. Фонд 974. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 1–5.

якую сам адзначае роднай. У дзяржаве, дзе пераважную колькасць насельніцтва складаюць беларусы, большасць грамадзян выказваецца за дзяржаўнае двухмоўе і ўпарта размаўляе ў паўсядзённым жыцці на рускай мове.

Як сведчаць лічбы, працэнт беларускіх жыхароў, якія лічылі роднай мову сваёй нацыянальнасці, быў даволі высокім, калі БССР уваходзіла ў склад Савецкага Саюза. Напрыклад, па перапісу насельніцтва1979 г. беларускую мову назвалі роднай 83,5 % беларусаў, а рускую мову – 16,5 %. За дзесяцігоддзе лічбы змяніліся, але не вельмі значна. У 1989 г. колькасць беларускіх жыхароў, што лічылі роднай мовай нацыянальную, знізілася да 80,2 %, адпаведна да 19,7 % узрасла колькасць беларусаў, што назвалі роднай мовай рускую [528].

Як бачна, пазіцыі рускай мовы за 1980-я гг. некалькі ўзмацніліся. У якой ступені першаснасць рускай ці беларускай мовы звязана з нацыянальнасцю жыхароў Беларусі можна прасачыць па табліцы 17.

Табліца 17 – Нацыянальны састаў насельніцтва БССР па перапісу 1989 г. па лінгвістычных прыкметах

| **1989 г. Агульная колькасць насельніцтва БССР – 10 151 806. У тым ліку:** | **Родная мова** | | **Мова, якой свабодна валодаюць** | |
|---|---|---|---|---|
| | **Беларуская** | **Руская** | **Беларуская** | **Руская** |
| Беларусы – 7 904 623 | 6 341 410 (80,22 %) | 1 559 832 (19,73 %) | 749 367 (9,48 %) | 4 776 120 (60,42 %) |
| Рускія – 1 342 099 | 29 885 (2,22 %) | 1 311 043 (97,68 %) | 328 633 (24,48 %) | 23,870 (1,77) |
| Палякі – 417 720 | 266 790 (63,86 %) | 94 240 (22,56 %) | 74 391 (17,80 %) | 186 855 (44,73 %) |
| Украінцы – 291 008 | 17 016 (5,84 %) | 141 745 (48,70 %) | 30 348 (10,42 %) | 120 595 (41,44 %) |
| Яўрэі – 111 883 | 2 388 (2,13 %) | 100 739 (90,03 %) | 30 899 (27,61 %) | 9 647 (8,62 %) |

Згодна з перапісам насельніцтва 1989 г., лічбы ўказваюць на неверагодна нізкі працэнт (9,48 %) беларусаў, што ведаюць нацыянальную мову і свабодна ёй валодаюць, нягледзячы на тое, што 80,22 % называюць беларускую мову роднай. Нацыянальная мова і ў 1980-я гады з'яўлялася для беларусаў у першую чаргу не сродкам зносін, а неад'емным атрыбутам нацыі, як беларуская культура, гісторыя, як ідэнтыфікатар Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Савецкага Саюза разам з нацыянальнай сімволікай.

---

[528] Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Т.3. С. 317.

Наступнае дзесяцігоддзе (1990-я гг.) адзначаецца кантраснай і супярэчлівай дзяржаўнай палітыкай у галіне моваэнаўства. Моцная хваля беларусізацыі пачатку 1990-х гг., уступаючы ў канфлікт з жыццёвымі абставінамі, страчвае сілу і нарэшце спыняецца. Стрымліванне Закона аб мовах на Беларусі назіраецца ў розных сферах: беларуская мова не становіцца сродкам службовых зносін у большасці ўстаноў, кіраўніцтва арганізацый не спяшаецца вывучаць родную мову, не перакладаюцца справавыя паперы і навуковыя працы, не пераходзяць на родную мову суды, міліцыя, гандаль і іншыя ўстановы. Нацыянальная ідэя сутыкнулася з моўнай практыкай. Стагоддзямі адлажаны механізм камунікатыўных кантактаў патрабаваў значных змен, якія немагчыма было правесці за адно дзесяцігоддзе, як таго патрабавала "Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў". Можна адзначыць, што хуткімі тэмпамі беларусізацыя развівалася толькі ў галіне народнай адукацыі.

Напрыканцы 1980-х гадоў моўнае становішча ў агульнаадукацыйных школах і дашкольных установах было супярэчлівым.

Агульная колькасць дзіцячых садкоў у 1990 г. складала 5265 устаноў, з якіх на рускай мове працавала 2663 установы (больш за палову – 50,6 %). 1870 дзіцячых дашкольных устаноў працавала на беларускай і рускай мове адначасова і складала 35,5 % ад агульнай лічбы. Колькасць беларускамоўных садкоў – 732 установы, што складала 13,9 % [529]. Трэба адзначыць, што ў параўнанні з 1987–1989 гг., колькасць беларускамоўных і двухмоўных садкоў значна ўзрасла, бо ў грамадстве ўжо адчуваліся настроі на атрыманне суверэнітэту нашай краінай, узрастала актуальнасць моўнага пытання. Засваенне насельніцтвам роднай мовы пачалося з самых маленькіх грамадзян.

У 1990–1991 навучальным годзе колькасць дзённых агульнаадукацыйных школ складала 5197 устаноў. Сярод іх навучанне на рускай мове вялося ў 1287 школах, беларускамоўныя школы значна пераважалі па колькасці (3421 установа), змешаных школ было 489. Але трэба ўлічыць, што амаль усе беларускія школы знаходзіліся ў сельскай мясцовасці і былі малакамплектнымі. Такім чынам, на рускай мове навучаліся 79,2 % вучняў рускамоўных і змешаных школ і толькі 20,8 % навучэнцаў атрымоўвалі адукацыю на беларускай мове [530].

Сітуацыя пачала істотна змяняцца ў 1990 г., пасля прыняцця Закона "Аб мовах ў Беларускай ССР". Хуткімі тэмпамі ўзрастаў працэнт беларускамоўных школ і класаў. Рэзкая беларусізацыя пачатковай школы, паспешлівасць у прыняцці рашэння пры пераводзе школ на беларускую мову навучання мела адмоўныя вынікі. У большасці выпадкаў адкрыццё беларускіх школ і класаў рабілася дырэктыўнымі метадамі, без уліку

[529] Народное хозяйство Белорусской ССР в 1990 г.: Стат. ежегодник. Мінск, 1991. С. 117.
[530] Там жа. С. 108

жадання бацькоў першакласнікаў, пры адсутнасці дастатковай кадравай падрыхтоўкі, без наяўнасці адпаведнай матэрыяльнай базы (недахоп падручнікаў, дапаможнікаў, метадычнай літаратуры, наглядных навучальных сродкаў). Пры дапамозе дзесяціпрацэнтнай надбаўкі да заработнай платы была зроблена спроба заахвоціць настаўнікаў да выкладання дысцыплін на беларускай мове, што часцей за ўсё прыводзіла да зніжэння якасці адукацыі. Невысокі ўзровень ведання беларускай мовы настаўнікамі, асабліва тэхнічных дысцыплін, адсутнасць на першапачатковым этапе курсаў па перападрыхтоўцы выкладчыкаў не спрыяла папулярызацыі беларускай мовы. Усе цяжкасці паспешлівай беларусізацыі ляглі на плечы малодшых школьнікаў, якія з рускамоўных сем'яў прыйшлі ў класы з беларускай мовай навучання. Увогуле, такая нетактоўная, непрадуманая і незбалансаваная беларусізацыя пачатковай школы з'явілася адной з прычын вынясення моўнага пытання на рэферэндум.

Акрамя фактычных недахопаў у правядзенні палітыкі беларусізацыі, яе рэалізацыю спынялі некаторыя асаблівасці беларускага менталітэту: няспешлівасць, памяркоўнасць, грунтоўнасць, недавер да рэзкіх перамен і трансфармацый, крытычныя адносіны да дырэктыўных метадаў. Трэба адзначыць, што знешнепалітычныя фактары, адносіны з суседняй Расіяй адыгрывалі хаця і важную, але другасную ролю. Моўнае пытанне ў 1995 г. вырашалася менавіта беларускім народам і, на жаль, не на карысць нацыянальнай мовы.

Афіцыйным сігналам па згортванні беларусізацыі паслужылі вынікі агульнарэспубліканскага рэферэндуму, які праводзіўся 14.05.1995 г. На пытанне, вынесенае на абмеркаванне ў межах рэферэндуму "Ці згодны вы з наданнем рускай мове роўнага статуса з беларускай?" большасць жыхароў краіны адказалі станоўча. Звесткі з пратакола Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў:

1 Агульная колькасць грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме – 7 445 820 чалавек;

2 Колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання – 4 830 582 чалавекі;

3 Колькасць грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні – 4 823 482 чалавекі;

4 Вынікі галасавання па першым пытанні (аб статусе моў): "за" – 4 017 213 чалавек; "супраць" – 613 516 чалавек; прызнаны несапраўднымі – 192 693 бюлетэні [531].

---

[531] Протокол Центральной комиссии Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов "Об итогах голосования на республиканском референдуме, который проводился 14.05.1995 г. в соответствии с постановлением Верховного Совета Республики Беларусь от 13.04.1995 г. № 3728–XII // www.rec.gov.by

За наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай выказаліся 83,3 % асоб, якія мелі правы голасу і прынялі ўдзел у галасаванні.

Трэба адзначыць даволі нізкую актыўнасць грамадзян Беларусі, так як на пункты для галасавання з'явіліся далёка не ўсе выбаршчыкі (64,9 %). Але, верагодна, самыя заўзятыя абаронцы роднай мовы не засталіся абыякавымі і павінны былі прысутнічаць на рэферэндуме, каб паўплываць на лёс беларускай мовы ў такі складаны перыяд.

Такім чынам, большасць беларусаў, выступаючы за двухмоўе, фактычна выказаліся за падтрымку існуючых тэндэнцый у моўным становішчы, а значыць, згадзіліся з магчымасцю поўнага выцяснення беларускай мовы рускай.

Але беларусізацыя пачатку 1990-х гг., нават такая скарочаная і незавершаная, несумненна ўнесла свае карэктывы ў далейшае развіццё беларускай мовы і культуры, аб чым сведчаць табліцы 18, 19.

У параўнанні з 1989 г. больш, чым на 5 % узрасла колькасць беларусаў, якія лічаць нацыянальную мову роднай. Важна звярнуць увагу на тое, што беларусізацыя закранула і рускае насельніцтва. Амаль на 7 % узрасла колькасць рускіх, што палічылі роднай беларускую мову (з 2,2 % – у 1989 г., да 9,1 % – у 1999 г.). Многія прадстаўнікі іншых нацыянальных супольнасцей таксама падпалі пад беларусізацыю і вызначылі роднай мовай беларускую (сярод іх палякаў на 3,2 % больш, чым у 1989 г.; украінцаў – на 8,5 %; сярод яўрэяў розніца паміж вынікамі 1989 і 1999 гг. узрасла на 15 %) [532].

Табліца 18 – Размеркаванне насельніцтва Рэспублікі Беларусь па нацыянальнасці і мовах у 1999 г. [533]

| | Колькасць асоб дадзенай нацыянальнасці, тыс. чалавек | З агульнай колькасці асоб дадзенай нацыянальнасці | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лічаць роднай мову сваёй нацыянальнасці, % | Назвалі мову, на якой звычайна размаўляюць дома, % | | |
| | | | Бел. | Рус. | Інш. |
| Усё насельніцтва | 10045 | 81,9 | 36,7 | 62,8 | 0,5 |
| Беларусы | 8159 | 85,6 | 41,3 | 58,6 | 0,1 |
| Рускія | 1142 | 90,7 | 4,3 | 95,7 | – |
| Палякі | 396 | 16,5 | 57,6 | 37,7 | 4,7 |
| Украінцы | 237 | 42,9 | 10,2 | 83,6 | 6,2 |
| Яўрэі | 28 | 5,4 | 3,8 | 95,7 | 0,5 |

[532] Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Т.3. С. 317–318.
[533] Перепись населения 1999 года. Табличные данные. Национальный состав населения, гражданство. Выходные регламентные таблицы // www.belstat.gov.by

Цікава адзначыць, што ў 1999 г. працэнт палякаў, якія карысталіся ў паўсядзённых зносінах беларускай мовай (57,6 %), перавысіў адпаведны паказчык сярод прадстаўнікоў тытульнай нацыі (41,3 %). Нават 4,3 % грамадзян рускай нацыянальнасці паведамілі пра выкарыстанне беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці.

Дарэчы, для Беларусі лічба носьбітаў роднай мовы роўная 41,3 % ад колькасці ўсіх беларусаў здаецца неверагодна высокай. Напэўна, сюды ўвайшлі жыхары Беларусі, якія карысталіся дома дыялектнай мовай, або размаўлялі на сумесі дзвюх моў, так званай “трасянцы”. Калі ўлічыць, што перапіс насельніцтва Беларусі праводзіўся праз чатыры гады пасля агульнарэспубліканскага рэферэндуму, то можна зрабіць вынік, што ў 1994–1995 гг., верагодна, лічбы былі яшчэ вышэйшымі. Можна прасачыць заканамерныя тэндэнцыі ў адносінах да беларускай мовы прадстаўнікоў розных нацыянальных супольнасцей, адзначыць сувязь паміж дзяржаўнымі мерапрыемствамі, накіраванымі на падтрымку беларускай мовы і выніковымі лічбамі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь. Безумоўна, беларусізацыя 1990-х гг. унесла значны ўклад у развіццё беларускай мовы, станоўча паўплывала на адносіны грамадства да моўнага пытання. Але, як усё, што прывівалася ненатуральнымі, дырэктыўнымі метадамі, усё, што навязвалася сілай і пад прымусам, не знайшло падтрымкі сярод беларускага насельніцтва, і ўжо праз 10 год яскрава акрэсліваецца вяртанне да рускамоўных традыцый.

Найбольш выразнымі і кантраснымі выступаюць вынікі перапісу беларускага насельніцтва 2009 г. у параўнанні з 1999 г.

Табліца 19 – Размеркаванне насельніцтва Рэспублікі Беларусь па нацыянальнасці і мовах у 2009 г. [534]

| | **Колькасць асоб дадзенай нацыянальнасці, тыс. чалавек** | **З агульнай колькасці асоб дадзенай нацыянальнасці** | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **Лічаць роднай мову сваёй нацыянальнасці, %** | **Назвалі мову, на якой звычайна размаўляюць дома, %** | | |
| | | | **Бел.** | **Рус.** | **Інш.** |
| Усё насельніцтва | 9504 | 59,9 | 31,6 | 62,2 | 6,2 |
| Беларусы | 7957 | 60,8 | 26,1 | 69,8 | 4,1 |
| Рускія | 785 | 96,3 | 2,1 | 96,5 | 1,4 |
| Палякі | 294 | 5,4 | 40,9 | 50,9 | 8,2 |
| Украінцы | 159 | 29,2 | 6,1 | 88,4 | 5,5 |
| Яўрэі | 13 | 1,9 | 2 | 95,9 | 2,1 |

За апошняе 10-годдзе назіраецца значнае паніжэнне пазіцый мовы тытульнай нацыі на тэрыторыі Беларусі. З 41,3 % да 26,1 % (больш чым у

[534] Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Т.3. С. 318, 355.

1,5 разы!) знізіўся працэнт беларусаў, якія размаўляюць на роднай мове ў паўсядзённым жыцці, адпаведна ўзраслі лічбы па выкарыстанні беларусамі рускай мовы з 58,6 % у 1999 г. да 69,8 % у 2009 г. Але трэба адзначыць, што іншыя нацыянальныя супольнасці таксама больш ахвотна выбіраюць рускую мову як сродак паўсядзённых зносін. Палякі, украінцы, яўрэі аддаюць перавагу рускай мове. Не толькі беларуская мова становіцца неканкурэнтназдольнай у параўнанні з рускай, але і родныя мовы нацыянальных супольнасцей адыходзяць на другі план. Такі вынік можна зрабіць, аналізуючы даныя па ўсведамленню беларускім грамадствам і нацыянальнымі супольнасцямі краіны паняцця "родная мова". У 2009 г. толькі 5,4 % палякаў, 29,2 %  украінцаў, 1,9 % яўрэяў лічаць роднай мову сваёй нацыянальнасці (адпаведныя лічбы 1999 года: 16,5 % палякаў, 29,2 % украінцаў, 5,4 % яўрэяў). Амаль на 25 % знізілася колькасць беларусаў, якія прызналі нацыянальную мову роднай у 2009 г. (60, 8 % у параўнанні з 85,6 % па перапісу насельніцтва 1999 г.).

Агульнарэспубліканскую статыстыку дапаўняюць сацыялагічныя даныя рэгіянальнага характару, атрыманыя ў выніку сацыялагічнага даследавання, якое праводзілася кафедрай гуманітарных дысцыплін ў 2009 г. у межах навуковага праекта "Сацыякультурныя фактары станаўлення грамадзянскай супольнасці ў Беларусі". Даследаванні вяліся на тэрыторыі Магілёва і Магілёўскай вобласці. Агульная выбарачная сукупнасць склала 686 рэспандэнтаў, з якіх раўнамерна прадстаўлены жыхары буйных гарадоў, раённых цэнтраў і прадстаўнікі сельскага насельніцтва. У выбарцы адэкватна прадстаўлены ўсе полаўзроставыя групы насельніцтва, што забяспечвае рэпрэзентатыўнасць сацыялагічнага даследавання.

Для праблемы, звязанай з моўнай сітуацыяй у краіне, вялікае значэнне мае нацыянальны склад удзельнікаў сацыялагічнага апытвання. На пытанне аб прыналежнасці да пэўнай нацыяльнасці пераважная большасць рэспандэнтаў (80,4 %) адзначылі сябе беларусамі, 9,6 % грамадзян з'явіліся прадстаўнікамі рускай нацыянальнасці, астатнія ўдзельнікі апытвання (каля 10 %) або не адказалі на пытанне, або аднеслі сябе да іншай нацыянальнасці (украінцы, палякі, яўрэі і інш.). Адзначым, што атрыманыя лічбы ў поўнай меры адпавядаюць даным перапісу насельніцтва 1999 года, па якіх доля беларусаў у агульнай колькасці грамадзян склала 81,2 %, рускіх – 11,4 %, іншых нацыянальнасцей – 7,4 %.

Парадаксальна, але сярод 80,4 % беларусаў, якія прынялі ўдзел у апытванні, толькі трэцяя частка (29,4 %) грамадзян назвала роднай мовай беларускую! Лічба ўдвая меншая за адпаведную на тэрыторыі ўсёй краіны ў параўнанні з перапісам насельніцтва ў 2009 г. Магчыма, трэба ўлічыць наступны факт: Магілёўская вобласць больш падпала пад русіфікацыю ў гады Расійскай Імперыі, што тлумачыцца геаграфічным становішчам Магілёўскай вобласці, блізкасцю яе межаў да Расіі. Можна дадаць у групу беларускамоўных жыхароў і тых, хто адначасова размаўляе на дзвюх

мовах – білінгваў (12,7 %), бо такой групы насельніцтва не выдзяляе Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь.

Па якіх прыкметах нашы суайчыннікі вызначаюць мову роднай? На гэтае пытанне кожны рэспандэнт адказваў, карыстаючыся ўласнымі меркаваннямі. Лагічным прадстаўляецца наступны тэзіс: роднай мовай сапраўднага беларуса з’яўляецца менавіта беларуская мова. Такой думкі прытрымліваюцца 29,4 % рэспандэнтаў. Але, напэўна, для многіх пытанне аб роднай мове мела свае крытэрыі для адказу. Кожны другі рэспандэнт (51,8 %) лічыць роднай рускую мову, бо пры яе дапамозе афармляе ўласныя думкі і размаўляе з іншымі людзьмі. Яшчэ 12,7 % апытаных не аддаюць перавагу адной мове і лічаць, што для краіны ў становішчы двухмоўя выбар адзінай роднай мовы не мае сэнсу.

Нягледзячы на тое, што значна большую частку рэспандэнтаў складалі беларусы і сярод іх кожны трэці лічыць роднай мовай беларускую, фактычна нацыянальнай мовай у паўсядзённым жыцці карыстаюцца толькі 2,2 % апытаных.

Прыкладна дзве трэці ўдзельнікаў апытвання аддаюць перавагу рускай мове. Яшчэ 37,3 % грамадзян прызналіся, што карыстаюцца рускай і беларускай лексікай адначасова. Калі разглядаць дадзеную праблему сярод розных узроставых груп, то назіраецца выразная тэндэнцыя памяншэння папулярнасці беларускай мовы сярод моладзі. У групе рэспандэнтаў старэйшага ўзросту (больш за 50 год) на рускай мове размаўляюць 48,1 % і прыкладна столькі ж (48,9 %) карыстаюцца змешаным варыянтам, у народзе названым “трасянкай”. Сярод прадстаўнікоў старэйшага ўзросту самы высокі працэнт (3,1 %) носьбітаў беларускай мовы. Ужо ва ўзроставай групе ад 30 да 50 год нацыянальнай мовай карыстаюцца 2,5 % удзельнікаў апытвання, а сярод моладзі да 30 год толькі 1,3 % ужываюць беларускую мову штодзённа. Адпаведна павялічваецца колькасць носьбітаў рускай мовы: толькі на рускай мове размаўляюць 58,6 % сталых (30–50 год) грамадзян і 70,3 % моладзі; ужыванне абедзвюх моў практыкуюць 38,0 % прадстаўнікоў узроставай групы ад 30 да 50 год і толькі 28,4 % моладзі.

Значныя адрозненні ў лічбах назіраюцца пры аналізе моўнай сітуацыі ў гарадской і сельскай мясцовасці. Амаль 3/4 часткі (73,8 %) жыхароў буйных гарадоў размаўляюць па-руску, у раённых цэнтрах каля паловы насельніцтва (49,2 %) карыстаецца рускай мовай, у сельскай мясцовасці працэнт носьбітаў рускай мовы яшчэ паніжаецца: 44,1 % вяскоўцаў выбіраюць як сродак зносін мову суседняй краіны. Такім чынам, чым далей ад абласнога цэнтра, тым ніжэй працэнт рускамоўных жыхароў. Але, на жаль, колькасць беларускамоўных грамадзян пры гэтым не павялічваецца: большасць сяльчан (53,9 %) карыстаюцца адначасова рускай і беларускай мовай; на “трасянцы” размаўляюць 47,6 % жыхароў раённых цэнтраў і 24,7 % гараджан.

Той факт, што руская мова больш папулярная ў гарадах, не выклікае непаразумення, бо з'яўляецца гістарычна абумоўленым. Спрадвеку насельніцтва гарадоў было поліэтнічным. Акрамя беларусаў у гарадах жылі прадстаўнікі яўрэйскай, польскай, рускай, татарскай нацыянальнасці. Карэннае насельніцтва пражывала пераважна ў вёсцы, дзе працэсы русіфікацыі ішлі не такімі хуткімі тэмпамі, як у горадзе [535].

Адзначаная прычына тлумачыць таксама і факты значнай перавагі беларускамоўных школ у сельскай мясцовасці на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і распаўсюджвання ў горадзе ўстаноў з рускай мовай навучання.

Пасля агульнарэспубліканскага рэферэндума 1995 г. у галіне народнай адукацыі назіраюцца тэндэнцыі да зніжэння выкарыстання беларускай мовы. Для аналізу прывядзем адпаведныя даныя, атрыманыя са статыстычных даведнікаў Рэспублікі Беларусь з 1995 г. па 2008 г. і зведзеныя ў агульную табліцу для параўнання (гл. табл. 20).

Табліца 20 – Размеркаванне дзённых сярэднеадукацыйных устаноў Рэспублікі Беларусь і колькасці вучняў у школах па мове навучання [536]

| | **1995–1996** | **1997–1998** | **1998–1999** | **2000–2001** | **2002–2003** | **2003–2004** | **2006–2007** | **2007–2008** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Агульная колькасць школ, шт., % | 4807<br>100 % | 4709<br>100 % | 4669<br>100 % | 4559<br>100 % | 4335<br>100 % | 4209<br>100 % | 3893<br>100 % | 3767<br>100 % |
| Агульная колькасць вучняў, тыс., % | 1538,0<br>100 % | 1555,1<br>100 % | 1575,3<br>100 % | 1498,4<br>100 % | 1385,2<br>100 % | 1327,5<br>100 % | 1145,1<br>100 % | 1105,4<br>100 % |
| Колькасць школ з навучаннем на беларускай мове, % | 3029<br>63,0 % | 2898<br>61,5 % | 2874<br>61,5 % | 2822<br>61,9 % | 2621<br>60,5 % | 2503<br>59,5 % | 2196<br>56,4 % | 2071<br>55,0 % |
| Колькасць вучняў у беларускамоўных школах, тыс., % | 293,0<br>19,0 % | 297,7<br>19,1 % | 298,1<br>18,9 % | 304,7<br>20,3 % | 285,8<br>20,6 % | 270,8<br>20,3 % | 221,5<br>19,3 % | 211,6<br>19,1 % |
| Колькасць школ з навучаннем на рускай мове, шт., % | 594<br>12,3 % | 959<br>20,3 % | 1076<br>23,0 % | 1201<br>26,3 % | 1294<br>29,9 % | 1337<br>31,8 % | 1489<br>38,2 % | 1509<br>40,0 % |
| Колькасць вучняў у рускамоўных школах, тыс., % | 373,2<br>24,3 % | 615,5<br>39,5 % | 692,2<br>43,9 % | 759,6<br>50,7 % | 796,6<br>57,5 % | 806,4<br>60,8 % | 807,5<br>70,5 % | 799,1<br>72,3 % |
| Колькасць школ з навучаннем на дзвюх мовах, шт., % | 1184<br>24,6 % | 850<br>18,1 % | 717<br>15,4 % | 533<br>11,7 % | 417<br>9,62 % | 366<br>8,7 % | 205<br>5,3 % | 184<br>4,9 % |
| Колькасць вучняў у двухмоўных школах, тыс., % | 871,8<br>56,7 % | 641,4<br>41,4 % | 584,5<br>37,1 % | 433,2<br>28,9 % | 302,0<br>21,8 % | 249,6<br>18,8 % | 115,6<br>10,0 % | 94,1<br>8,5 % |

[535] Бунас А.У. Беларуская мова ў жыцці сучаснага беларуса. С. 258–260.
[536] Статистический ежегодник Республики Беларусь, 1999: статистический материал. Минск, 1999. С. 157; Там жа, 2000. С. 196; Там жа, 2004. С. 192; Там жа, 2007. С. 203; Там жа, 2008. С. 194.

Як бачна з табліцы, у галіне адукацыі назіраецца паступовае паніжэнне колькасці беларускіх школ з 63 % у 1995–1996 навучальным годзе да 55 % у 2007–2008 навучальным годзе. Але, як ні парадаксальна, колькасць беларускіх вучняў пры гэтым істотна не змянілася. На працягу трынаццаці год лічбы вагаюцца ў дыяпазоне ад 18,9 % да 20,6 %. Разбежка ў дзясятыя долі працэнта істотна не ўплывае на канчатковыя паказчыкі: прыкладна пятая частка ўсіх вучняў у другой палове 1990-х – першай палове 2000-х атрымліваюць адукацыю на беларускай мове. Але колькасць рускамоўных школ за гэты тэрмін павялічылася больш чым у 3 разы (з 12,3 % у 1995–1996 н.г. да 40 % у 2007–2008 н.г.). Аналагічна, у той жа прапорцыі (амаль у 3 разы), павялічылася колькасць вучняў з навучаннем на рускай мове (з 24,6 % у 1995–1996 н.г. да 72,3 % у 2007–2008 н.г.).

Узрост колькасці рускамоўных школ адбыўся за кошт паніжэння колькасці двухмоўных школ. Агульнаадукацыйных устаноў, якія змяшчалі класы і з рускай, і з беларускай мовай навучання, па рэспубліцы стала на 1000 менш (1184 – у 1995–1996 н.г., і толькі 184 – у 2007/08 н.г.). А колькасць вучняў у двухмоўных школах знізілася з 56,6 % да 8,5 %. Адзначаныя лічбы не выклікаюць здзіўлення, бо ў пачатку 1990-х класы з беларускай мовай навучання адкрываліся на базе рускамоўных школ. А пасля згортвання палітыкі беларусізацыі ўсё вярнулася на свае месцы.

Акрамя іншых прычын, русіфікацыя беларускіх школ мае і практычныя падставы. Так як у краіне амаль адсутнічаюць беларускамоўныя (або змешанага тыпу) сярэднеспецыяльныя і вышэйшыя ўстановы, то і рыхтавацца да паступлення лепш за ўсё ў рускамоўных школах. Адсюль вядуцца вытокі такой рэзкай, нават агрэсіўнай, пазіцыі бацькоў да пераводу школ на беларускую мову навучання. Дарэчы, адной з прычын далучэння да рускамоўнай культуры стаў якраз такі факт, што вышэйшая адукацыя для беларусаў  у час уваходу ў Расійскую імперыю была магчыма толькі на іншаземнай мове і за межамі сваёй краіны, што пазбаўляла наш народ беларускамоўнай інтэлігенцыі.

Такім чынам, хаця беларусізацыя закранула сферу народнай адукацыі ў большай ступені, чым іншыя сферы дзейнасці чалавека, але за першую палову 2000-х гадоў навучальны працэс паступова вярнуўся да рускамоўнага варыянта.

Як адзначалася раней, традыцыйна ў Савецкім Саюзе, а таксама па перапісу насельніцтва Беларусі ў 1999 г. пераважная частка прадстаўнікоў тытульнай нацыі (у 1999 годзе – 85,6 %) лічылі роднай мовай беларускую. Традыцыйна родная мова ўсведамлялася як сімвал, дыферэнцыйная прыкмета нацыі, такая як дзяржаўны сцяг, герб, нацыянальны касцюм. Этнічная функцыя мовы, яе здольнасць кансалідаваць народ і адрозніваць яго ад іншых этнасаў спрадвеку ставілася на першае месца, нягледзячы на тое, што асноўная функцыя мовы – камунікатыўная – адыгрывала

другасную ролю [537]. На цяперашні момант выразна акрэслілася тэндэнцыя да зніжэння прэстыжу роднай мовы, нават у якасці этнічнага сімвала.

Мова – адзін з фундаментальных фактараў станаўлення этнасу. Гэта непарушнае сцвярджэнне ўпэўнена паўтараецца ў падручніках па гісторыі, ідэалогіі. Але на сучасны момант нават гэта аксіёма крытыкуецца і ставіцца пад сумненне. Ці застаецца мова асноватворнай этнічнай характарыстыкай у наступным развіцці народа? Усё часцей выказваюцца тэзісы аб несупадзенні межаў распаўсюджвання мовы і этнічнай супольнасці. Напрыклад, яўрэі, шатландцы, фіны размаўляюць на розных мовах. Існуе і адваротная з’ява: за апошнія 20 гадоў колькасць людзей, якія лічаць роднай англійскую мову павялічылася на 70 мільёнаў чалавек, і, несумненна, носьбіты англійскай мовы пражываюць не толькі на тэрыторыі Англіі [538].

Дарэчы, моўнае пытанне для сярэднестатыстычнага беларуса ніколі не ставілася па-сапраўднаму востра, нягледзячы на палеміку ў сродках масавай інфармацыі, у навуковай і мастацкай літаратуры. Беларусы спрадвеку адрозніваліся індыферэнтнасцю да тых пытанняў, якія не ўплывалі на непарушны, традыцыйны лад жыцця. Звычка да адаптацыі ў поліэтнічным асяроддзі пад уплывам суседніх культур (літоўскай, польскай, рускай) замацавалася яшчэ ў старажытнасці. Білінгвізм не перашкаджаў мець зносіны ў бытавой, паўсядзённай сферы: большасць насельніцтва разумеюць і рускую, і беларускую мову. Двухмоўныя зносіны ў межах адной камунікатыўнай сітуацыі на працягу стагоддзяў былі звычайнай справай і не ўспрымаліся як перашкода да разумення паміж носьбітамі моў. Як ужо праверана гісторыяй, змена стагадовых традыцый не адбываецца на працягу 10 год, аб чым сведчыць няўдалая спроба беларусізацыі пачатку 1990-х.

Моўную праблему можна аналізаваць з улікам уплыву мноства фактараў, такіх, як гістарычныя карані і перспектывы глабалізацыі, асаблівасці нацыянальнага менталітэту, эканамічнай інтэграцыі, школьнай рэформы і сеткавых інфармацыйных тэхналогій. Але ўсякі кантэкст яё разгляду павінен абапірацца на дакладныя факты сацыялагічнага паходжання. Толькі на гэтай аснове можна атрымаць верагодныя звесткі аб працэсах і тэндэнцыях, якія адбываюцца ў сацыяльных глыбінях і датычацца, у тым ліку, такога важнейшага грамадскага інтэгратара, як мова.

Зноў звернемся да статыстычных даных, атрыманых у выніку ўзгаданага сацыялагічнага даследавання 2009 г. На агульным сумным фоне аптымістычнымі здаюцца лічбы, якія вызначаюць адносіны грамадства да беларускамоўных носьбітаў. Амаль дзве трэці рэспандэнтаў (63,6 %) станоўча адносяцца да людзей, якія размаўляюць па-беларуску, яшчэ трэць

[537] Мячкоўская Н.Б. Мовы і культура Беларусі: Нарысы. Мінск, 2008. С. 83.
[538] Чернявская Ю. В. Белорусы от “тутэйшых” – к нацыі. Мінск, 2010. С. 469–470.

(33,5 %) вызначаюць свае адносіны да беларускамоўных грамадзян як індыферэнтныя. Толькі 2,6 % рэспандэнтаў адмоўна ставяцца да носьбітаў беларускай мовы [539]. Напэўна выйсце з гэтага становішча трэба шукаць у славутай беларускай талерантнасці.

Вызначэнне прычын заняпаду беларускай мовы і пошукі шляхоў па ўмацаванню яе прэстыжу – гэта тэма для канструктыўнага, грунтоўнага даследавання. Пакуль канстатуем наступныя вынікі:

Своеасаблівасць і парадаксальнасць моўнай сітуацыі ў тым, што асноўным сродкам зносін большасці беларусаў з’яўляецца руская мова, хаця пераважная колькасць насельніцтва называе нацыянальную мову роднай. Пры даволі высокай ступені самаідэнтыфікацыі беларусаў як асобнай нацыі, адна з самых галоўных прыкмет нацыі – родная мова народа – застаецца незапатрабаванай.

Статыстычныя даныя пацвярджаюць залежнасць паміж дзяржаўнай палітыкай ў моўнай сферы і функцыямі нацыянальнай мовы ў жыцці беларускага народа. На ўздыме беларусізацыі назіраецца павелічэнне ў працэнтных суадносінах колькасці грамадзян, якія лічаць роднай мовай беларускую, а таксама карыстаюцца ей ў паўсядзённым маўленні. І наадварот: за апошняе дзесяцігоддзе канстатуецца рэзкае звужэнне функцыянавання беларускай мовы і як сродку камунікацый у розных сферах, і як сімвала нацыі, дыферэнцыйнай прыкметы этнасу.

Асаблівасці дзяржаўнай моўнай палітыкі выразна адлюстроўваюцца ў статыстычных табліцах па размеркаванню сярэднеадукацыйных устаноў па мове навучання. На піке беларусізацыі значна ўзрасла колькасць беларускамоўных школ, а таксама і колькасць школ з дзвюма мовамі навучання, а пасля агульнарэспубліканскага рэферэндуму 1995 г. пачала зніжацца. Адзначаная тэндэнцыя захоўваецца і на сучасным этапе.

Сацыялагічныя даныя рэгіянальнага характару (па Магілёўскай вобласці) у цэлым пацвярджаюць агульнарэспубліканскія звесткі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, але таксама выяўляюць характэрныя асаблівасці, звязаныя з гістарычным мінулым рэгіёна і блізкасцю мяжы з Расіяй

Высокі ўзровень талерантнасці беларусаў фарміруе добразычлівыя адносіны да носьбітаў беларускай мовы, што дае некаторую надзею на пазітыўнае вырашэнне моўнага пытання на Беларусі ў будучым.

[539] Бунас А.У. Беларуская мова ў жыцці сучаснага беларуса // Социальное знание и белорусское общество. С. 258–260.

## 4.2 Асаблівасці беларускай самасвядомасці і роля нацыянальнай мовы ў фарміраванні этнічнай самаідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва

На сучасны момант мы маем магчымасць назіраць, на першы погляд, узаемавыключальныя тэндэнцыі развіцця чалавецтва, цывілізацыйных тыпаў, якія яго складаюць, а таксама асобных грамадстваў. З аднаго боку, ідуць бясконцыя размовы аб глабалізацыі, якая робіць аднастайнымі метады гаспадарання на ўсёй планеце і ў вядомай ступені сцірае адрозненні паміж культурамі. З другога боку, застаецца папулярным тэзіс множнасці культур і развіваецца тэорыя і практыка захавання культурнай своеасаблівасці пэўных грамадстваў.

Супярэчлівасць дадзеных тэндэнцый прымушае з розных пазіцый разглядаць шматлікія пытанні дысцыплін гуманітарнага цыклу, служыць асновай для існавання супрацьлеглых пунктаў гледжання, навуковых дэбатаў і спрэчных думак.

На перакрыжаванні ідэй і меркаванняў паўсталі пытанні этнічнай сацыялізацыі і нацыянальнай идэнтыфікацыі. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў сацыёлагі і этнолагі значную ўвагу надаюць вывучэнню этнічнай самаідэнтыфікацыі і ідэнтычнасці беларускага насельніцтва.

Для вызначэння характэрных асаблівасцей самаідэнтыфікацыі беларусаў трэба абапірацца на базавыя паняцці, якія змяшчаюцца ў фундаментальных крыніцах ведаў – энцыклапедыях.

Сацыялізацыя – працэс засваення індывідам пэўнай сістэмы ведаў, норм, каштоўнасцей, якія дазваляюць яму функцыянаваць у якасці паўнапраўнага члена грамадства; уключае як мэтанакіраванае ўздзеянне на асобу (выхавнне), так і стыхійныя працэсы, што ўплываюць на яе фарміраванне [540].

Ідэнтыфікацыя – у псіхалогіі і сацыялогіі працэс атаясамлівання, суаднясення самога сябе з іншымі індывідамі ці супольнасцямі, цэнаснымі арыентацыямі і ўзорамі паводзін. Фарміруецца, замацоўваецца або трансфармуецца ў выніку сацыяльнага ўзаемадзеяння і дапамагае індывіду аваладваць разнастайнымі відамі сацыяльнай дзейнасці, засвойваць пэўныя сацыяльныя нормы і ролі. У працэсе ідэнтыфікацыі ўзнікае пэўная ідэнтычнасць, або суаднесенасць індывіда з тымі супольнасцямі, якія ён успрымае і ацэньвае ў якасці “сваіх” у адрозненне ад іншых, чужых або незнаёмых яму. Этнанацыянальная ідэнтыфікацыя праяўляецца ў суаднясенні індывідам сябе з пэўным этнасам або нацыяй, з уласцівымі ім мовай, культурай, узорамі паводзін, якія адрозніваюць іх ад іншых этнічных груп ці нацый [541].

---

[540] Советский энциклопедический словарь. М., 1989. С. 1261.
[541] Республика Беларусь: Энциклопедия: В 6 т. Т. 3. Минск, 2006. С. 713.

Такім чынам, працэсы ідэнтыфікацыі і сацыялізацыі непарыўна звязаны паміж сабой. Для таго, каб індывіду паспяхова ўключыцца ў працэс сацыялізацыі, неабходна, каб завяршыўся працэс ідэнтыфікацыі чалавека з пэўнай супольнасцю людзей, у тым ліку з пэўнай этнічнай групай.

Індывід з’яўляецца адносна вольным у выбары этнічнай самаідэнтыфікацыі, і гэты выбар залежыць ад канкрэтнага становішча. Разам з тым гэты выбар абмежаваны пэўным наборам стэрэатыпаў, якія могуць або прыцягваць чалавека, або адштурхоўваць ад той ці іншай самаідэнтыфікацыі. Змена этнічнай самаідэнтыфікацыі вядзе да пераходу чалавека ў іншую этнічную групу.

Як правіла, чалавек дазнаецца пра сваю этнічную прыналежнасць ад іншых, часцей за ўсё блізкіх яму людзей і толькі пазней знаходзіць рысы, якія падкрэсліваюць ці аправяргаюць гэтыя факты. У большасці выпадкаў некаторыя з іх, як, напрыклад, мова, рэлігія, звычаі і іншыя аб’ектыўныя прыкметы супадаюць з нацыянальнай ідэнтыфікацыяй чалавека, што падмацоўвае яго этнічнае самавызначэнне. Пры гэтым аб’ектыўныя элементы культуры і суб’ектыўная этнічная самасвядомасць выступаюць раўнапраўнымі індыкатарамі прыналежнасці людзей да этнічнай групы, а першаснасць кожнага з іх для вызначэння этнічнай прыналежнасці залежыць ад канкрэтных умоў.

На сучасны момант не існуе адзінай стандартнай для любых умоў формулы вызначэння этнічнай прыналежнасці. Цяжкасці з выбарам самаідэнтыфікацыі могуць узнікаць, перш за ўсё, у людзей, чые бацькі належаць да розных этнасаў. Калі адзін з бацькоў належыць да этнічнай большасці насельніцтва, а другі – да меншасці, іх нашчадкі звычайна ідэнтыфікуюць сябе з этнічнай большасцю. Тут мае месца асэнсаваны выбар, калі ўсведамляюцца і веданне моў, і элементы культуры, і статус групы ў сістэме этнічнай іерархіі, і палітычнае становішча.

На асэнсаванне людзьмі сваёй этнічнай прыналежнасці значна ўплывае факт пражывання ва ўмовах поліэтнічнага ці монаэтнічнага асяроддзя. У поліэтнічным грамадстве, як правіла, прытрымліваюцца станоўчай групавой ідэнтычнасці без негатыўных праяў у адносінах да іншых этнічных груп і ажыццяўляецца цеснае ўзаемадзеянне з імі, так як найбольш важным для чалавека з’яўляецца імкненне захаваць адчуванне псіхалагічнай бяспекі і стабільнасці.

Гістарычнае станаўленне беларусаў адбывалася выключна ў поліэтнічным соцыуме. Пачынаючы з уваходжання спрадвечных беларускіх земляў у Кіеўскую Русь, продкі сучасных беларусаў ніколі не жылі абмежавана, а толькі разам з іншымі народамі, на перакрыжаванні і пад уплывам розных нацыянальных культур.

Беларуская нацыянальная культура заснавалася на культуры беларускага этнасу пад уздзеяннем іншых этнічных груп – украінцаў,

рускіх, літоўцаў, палякаў… Своеасаблівасць беларускай культуры вызначылі яе цесныя ўзаемасувязі з іншымі народамі, якія былі абумоўлены геаграфічным становішчам Беларусі паміж Усходам і Захадам, уплывам дзвюх сістэм – праваслаўна-візантыйскай і каталіцка-рымскай. Асаблівасці самаідэнтыфікацыі беларусаў як суаднесенасці чалавека з пэўнай культурай, яго прыналежнасці да гэтай культуры і ўсведамленне гэтага факта вызначае пагранічны характар нашай культуры. Пастаянны цесны кантакт з іншымі нацыямі, асаблівае становішча беларускіх зямель, якія знаходзіліся на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў, водараздзелаў Чорнага і Балтыйскага марэй, у геаграфічным цэнтры Еўропы, суседства моцных ваенных дзяржаў з ўсіх беларускіх межаў адзначылі супярэчлівасць развіцця культурнага пласта. З аднаго боку, беларуская культура ўспрыняла лепшыя дасягненні ўсходняй і заходняй культур, а з другога боку, менавіта пастаяннае знаходжанне ў сферы розных культурна-цывілізацыйных уплываў не далі беларусам да канца самавызначыцца, выбраць свой шлях, ідэнтыфікавацца, у адрозненні ад суседзяў, толькі з адной пэўнай культурнай традыцыяй. Праблема пошуку свайго развіцця была характэрна для беларускай культуры на працягу ўсёй яе гісторыі.

У апошнія дзесяцігоддзі пытанні культурнай самаідэнтыфікацыі беларусаў набылі найбольшую актуальнасць. Гэта звязана з тымі значнымі зменамі, якія зараз адбываюцца ў свеце: пашырэннем сродкаў масавай камунікацыі і інфармацыі, сучаснымі глабалізацыйнымі працэсамі, асаблівасцямі культурнай сітуацыі, зменамі геапалітычнай прасторы, парушэннем звыклых культурных сувязей, праблемай інтэграцыі і захавання ўласнай культурнай самабытнасці.

Гістарычна так склалася, што тэрыторыя Беларусі часта трапляла пад зямельны перадзел, бо знаходзілася на стыку дзвюх сфер уплыву – заходняй каталіцка-рымскай і ўсходняй праваслаўна-візантыйскай. Магчыма, гэтым тлумачыцца тое, што самаідэнтыфікацыя беларусаў насіла ў асноўным лакальны характар і засноўвалася больш на прыналежнасці да пэўнай тэрыторыі, мясцовасці, рэгіёну (“тутэйшыя”), сацыяльна-рэлігійнай групы (праваслаўныя, каталікі і інш.), клану, роду, сям’і, узвышаючыся іншым часам да ўзроўню нацыі і дзяржавы. Адсутнасць непарыўнай традыцыі, уздзеянне разнастайных культур і цывілізацый запавольвалі працэсы ідэнтыфікацыі беларусаў, не давалі акрэсленых крытэрыяў вызначэння культурнай прыналежнасці.

Так як гістарычнае станаўленне беларусаў адбывалася выключна ў мультыкультурным, шматмоўным, рознаканфесійным грамадстве, то асэнсаванне дадзенага факта вызначае пагранічны характар нашай культуры, супярэчлівасць рэлігійных пунктаў гледжання і нізкую зацікаўленасць, нават індыферэнтнасць, у моўных пытаннях.

Агульная нацыянальная мова на працягу стагоддзяў застаецца адным з галоўных фактараў пры аб'яднанні людзей у гістарычныя супольнасці. Разам з такімі паказчыкамі, як адзіная этнічная тэрыторыя, культура, устойлівыя эканамічныя сувязі, агульныя традыцыі, звычаі, рысы характару, этнічная самасвядомасць і саманазва, важнай умовай фарміравання нацыі з'яўляецца таксама мова. Моўная праблема беларускага народа не спрыяе вызначэнню грамадзянскай самаідэнтыфікацыі, перашкаджае ўсведамленню нацыянальнай годнасці, выклікае сумненні ва ўласнай самабытнасці.

Перш чым праводзіць аналіз моўнага становішча на Беларусі, трэба яго дэталёва апісаць. У лінгвістычнай сітуацыі ўдзельнічаюць дзве мовы: руская і беларуская са сваімі дыялектамі, а таксама змешанае маўленне, або трасянка.

Беларуская нацыянальная мова прадстаўлена дзвюма формамі: літаратурнай і народнадыялектнай.

Літаратурная беларуская мова пачала складацца яшчэ ў XIX стагоддзі. Але росквіт яе прыпадае на гады беларусізацыі (1920–1930 гг.). Ужо ў 1918 годзе з' явіўся зборнік Браніслава Тарашкевіча "Беларуская граматыка для школ", які ўпершыню замацаваў нормы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Але пасля моўных рэформ савецкага часу 33-га і 57-га года беларуская арфаграфія падпала пад значны ўплыў рускай мовы, у выніку чаго дзве блізкароднасныя мовы яшчэ наблізіліся і набылі большае падабенства.

У апошні час з-за адсутнасці дастатковага кантынгенту пастаянных носьбітаў мовы, а таксама пад уплывам рускамоўных традыцый адбываецца разладжванне літаратурнай нормы як у вусным маўленні, так і ў пісьмовым.

У цэлым трэба адзначыць большую варыянтнасць беларускай мовы ў параўнанні з рускай, звязаную з нядоўгай гісторыяй арфаграфіі і з вялікай апорай на дыялекты. Уменне гаварыць на літаратурнай беларускай мове ў большасці носьбітаў выпрацоўваецца не з дзяцінства, не пры натуральным маўленні ў сям'і і на вуліцы, а шляхам спецыяльнага навучання ў школе, ВНУ, на курсах павышэння адукацыі.

Народнадыялектная форма складаецца з двух асноўных дыялектаў (паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні), акрамя іх выдзяляюць сярэдне-беларускія і заходнепалескія гаворкі. Большая частка беларускамоўнага насельніцтва з'яўляецца носьбітамі менавіта дыялектнай мовы. Хаця ў значнай частцы даследаванняў і указваецца на тое, што маецца на ўвазе як літаратурная мова, так і народны дыялект, але нідзе не вызначаюцца адрозненні паміж імі.

Руская мова ў Беларусі больш аднародная, але вар'іруецца ад высокай літаратурнай мовы да моцна змешанага маўлення, якое хутчэй можна аднесці да трасянкі.

Пэўнай мяжы паміж трасянкай, а таксама рускай і беларускай мовамі не існуе. Іншае пытанне, што самі носьбіты мовы па-рознаму характарызуюць сваё маўленне, абапіраючыся на ўласныя меркаванні, таму вызначыць колькасць людзей, якія размаўляюць на трасянцы, шляхам апытвання надзвычай складана.

Верагодна, можна паставіць пад сумненне вынікі любога сацыялагічнага апытвання на моўную тэматыку, уключаючы нават дзяржаўныя перапісы насельніцтва, калі ўлічваць наступныя фактары:

1 розная ступень валодання беларускай мовай насельніцтва;

2 суб'ектыўная адзнака кожнага носьбіта мовы ў высокай якасці ўласнага маўлення;

3 размытыя крытэрыі паняцця "трасянка";

4 ужыванне на тэрыторыі краіны як літаратурнай формы мовы, так і дыялектнай.

Аднак толькі карыстаючыся статыстычнымі данымі, можна прасачыць, як уплываў лінгвістычны фактар на самаідэнтыфікацыю беларускага насельніцтва. Усведамляючы хібнасць даследаванняў у сувязі з вышэйадзначанымі прычынамі, звернемся да лічбаў.

Працэнт беларускіх жыхароў, якія лічылі роднай мову сваёй нацыянальнасці, быў даволі высокім, калі БССР уваходзіла ў склад Савецкага Саюза. Напрыклад, па перапісу насельніцтва 1979 года беларускую мову назвалі роднай 83,5 % беларусаў, а рускую мову – 16,5 %.

За дзесяцігоддзе лічбы змяніліся, але не вельмі значна. У пачатку 1989 года адбыўся апошні ўсесаюзны перапіс насельніцтва. Згодна з ім 80,22 % прадстаўнікоў тытульнай нацыі назвалі беларускую мову роднай, але толькі 9,48 % сцвярджалі, што свабодна ёй валодаюць, адпаведна да 19,7%, у параўнанні з 1979 годам, узрасла колькасць беларусаў, што назвалі роднай мовай рускую. Больш за шэсць мільёнаў беларусаў (6 341 410 чал.) вызначылі нацыянальную мову роднай, і толькі 749 367 чалавек (менш за 10 %) маглі свабодна ёю карыстацца [542]. Застаецца толькі задумацца, колькі людзей рэальна выкарыстоўвалі беларускую мову як сродак паўсядзённых зносін, а колькі з іх ужывалі сапраўдную літаратурную мову, не трасянку і не дыялект.

Як мы бачым, недастатковае веданне нацыянальнай мовы ніяк не перашкаджала савецкім беларусам усведамляць яе у якасці "роднай" , тым больш не ўплывала на самавызначэнне беларускага насельніцтва. Трэба падкрэсліць неверагодна высокую ступень самаідэнтыфікацыі беларусаў савецкай краіны пры даволі нізкім працэнце сапраўдных знаўцаў роднай мовы.

Вынікі перапісу насельніцтва 1989 года сталі адным з галоўных аргументаў пры правядзенні ў Беларусі моўнай палітыкі пачатку 90-х

[542] Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Т. 3. С. 317.

гадоў. Аднак паняцце “родная мова”, якое ўжывалася ў савецкіх перапісах было неадназначным. Дадзенае паняцце хутчэй трактавалася як частка этнічнай самасвядомасці і рэгістравалася па прынцыпу самавызначэння. У выніку даныя савецкіх перапісаў адлюстроўваюць не моўна-функцыянальнае, а этнапсіхалагічнае становішча. Калі ж памылкова лічыць, што роднай мовай не толькі свабодна валодаюць, але і актыўна ёй карыстаюцца, то атрымаецца, што 4/5 часткі насельніцтва з’яўляюцца актыўнымі носьбітамі беларускай мовы. Пры такім падыходзе становіцца мэтазгодным і наданне беларускай мове статусу дзяржаўнай, і актыўная беларусізацыя. Але рэферэндум 1995 года, які можна лічыць фактычным апытваннем людзей аб пажаданым моўным становішчы і лінгвістычнай палітыцы, вызначыў, што пераважная колькасць беларусаў выказалася за раўнапраўнае двухмоўе.

Наступнае дзесяцігоддзе (90-я гады XX стагоддзя) адзначаецца кантраснай і супярэчлівай дзяржаўнай палітыкай у галіне мовазнаўства. Моцная хваля беларусізацыі пачатку 90-х, уступаючы ў канфлікт з жыццёвымі абставінамі, страчвае сілу і нарэшце спыняецца. Нацыянальная ідэя сутыкнулася з моўнай практыкай. Стагоддзямі адлажаны механізм камунікатыўных кантактаў патрабаваў значных змен, якія немагчыма было правесці за адно дзесяцігоддзе, як таго патрабавала “Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы  і іншых нацыянальных моў”. Але беларусізацыя пачатку 90-х, нават такая скарочаная і незавершаная, несумненна ўнесла свае карэктывы ў далейшае развіццё беларускай мовы і культуры, аб чым сведчаць наступныя лічбы.

Больш за восем мільёнаў чалавек, або 81,22 % жыхароў рэспублікі ў 1999 годзе вызначылі сябе беларусамі. З іх пераважная колькасць, а дакладней 85,6 %, лічаць роднай мову сваёй нацыянальнасці, што больш, чым на 5 % перавышае паказчыкі 1989 года. 41,3 % ад усіх беларусаў паведамілі, што карыстаюцца беларускай мовай і ў паўсядзённым маўленні [543]. Дарэчы,  для Беларусі лічба носьбітаў роднай мовы роўная 41,3 % ад колькасці ўсіх беларусаў здаецца неверагодна высокай. Напэўна, сюды ўвайшлі жыхары Беларусі, якія карысталіся дома дыялектнай мовай, або размаўлялі на сумесі дзвюх моў, так званай “трасянцы”. Калі ўлічыць, што перапіс насельніцтва Беларусі праводзіўся праз чатыры гады пасля агульнарэспубліканскага рэферэндуму, то можна зрабіць вынік, што ў 94 – 95 годзе, верагодна, лічбы былі яшчэ вышэйшымі.

Безумоўна, беларусізацыя 90-х унесла значны ўклад у развіццё беларускай мовы, станоўча паўплывала на адносіны грамадства да моўнага пытання. Але, як усё, што прывівалася ненатуральнымі, дырэктыўнымі метадамі, усё, што навязвалася сілай і пад прымусам, не знайшло

[543] Перепись населения 1999 года. Табличные данные. Национальный состав населения, гражданство. Выходные регламентные таблицы // http://belstat.gov.by/homep/ru/perepic/p6.php. Дата доступа 10.11.2012 г.

падтрымкі сярод беларускага насельніцтва, і ўжо праз 10 год яскрава акрэсліваецца вяртанне да рускамоўных традыцый.

Найбольш выразнымі і кантраснымі выступаюць вынікі перапісу беларускага насельніцтва 2009 года ў параўнанні з 1999 годам.

Амаль восем мільёнаў беларусаў па нацыянальнасці (7957 тыс. чалавек) пражывае ў Рэспубліцы Беларусь на 2009 год. З іх 60,8 % лічаць роднай мову свайго народа, але толькі 26,1 % беларускай назвалі мову, на якой звычайна размаўляюць дома.

За першыя 10 гадоў XXI стагоддзя назіраецца значнае паніжэнне пазіцый мовы тытульнай нацыі на тэрыторыі Беларусі. З 41,3 % да 26,1 % (больш чым у 1,5 разы!) знізіўся працэнт беларусаў, якія размаўляюць на роднай мове ў паўсядзённым жыцці, адпаведна ўзраслі лічбы па выкарыстанні беларусамі рускай мовы з 58,6 % у 1999 г. да 69,8 % у 2009 годзе. Амаль на 25 % знізілася колькасць беларусаў, якія прызналі нацыянальную мову роднай у 2009 годзе (60, 8 % у параўнанні з 85,6 % па перапісу насельніцтва 1999 г.) [544].

Канец XX і пачатак XXI стагоддзяў вызначаецца супярэчлівасцю моўнай палітыкі і незбалансанасцю лінгвістычнай сітуацыі ў краіне. Поўны заняпад беларускай мовы ў перыяд агоніі Савецкага Саюза, станаўленне незалежнасці і моцная хваля беларусізацыі пачатку 1990-х, агульнарэспубліканскі рэферэндум і звязанае з ім становішча білінгвізму, паступовае вяртанне да рускамоўных традыцый – усе адзначаныя падзеі, адмоўныя і станоўчыя, падкрэсліваюць цяжкасці развіцця сучаснай беларускай мовы.

Але можна зрабіць вынік, што такі важны маркер этнічнай самабытнасці, як агульная нацыянальная мова, абсалютна не ўплывае на самаідэнтыфікацыю беларускага насельніцтва. Звернемся да лічбаў: у 1989 г. 77, 86 % жыхароў нашай краіны пацвердзілі нацыянальную прыналежнасць да беларусаў [545], у 1999 годзе лічбы выраслі да 81,22 %,[546] у 2009 г., нягледзячы на агульнае змяншэнне насельніцтва і міграцыйныя праблемы, колькасць беларусаў павялічылася да 83,69 % [547].

Парадаксальна, але для Рэспублікі Беларусь агульная мова ніколі не з'яўлялася першаснай прыкметай этнасу. Беларусы, якія ў паўсядзённых зносінах аддаюць перавагу рускай мове, на самой справе валодаюць устойлівай беларускай самаідэнтыфікацыяй, якая з гадамі толькі замацоўваецца. Можна дапусціць меркаванне аб існаванні этна-лінгвістычнага феномена! У адпаведных умовах дзіўна нават не тое, што беларусы не выказваюць цікавасці да пытанняў нацыянальнай мовы і

---

[544] Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Т. 3. С. 318, 355.

[545] Там жа. С. 317.

[546] Перепись населения 1999 года. Табличные данные. Национальный состав населения, гражданство. Выходные регламентные таблицы //http://www.belstat.gov.by/homep/ru/perepic/p5.php. Дата доступа 10.11.2012 г.

[547] Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Т. 3. С. 318, 355.

культуры, здзіўляе адваротнае: больш за 80 % насельніцтва краіны прызнае сябе этнічнымі беларусамі, а больш за 60 % (за выключэннем невялікай часткі) лічаць роднай мову, на якой не размаўляюць.

Нацыянальная функцыя мовы, яе здольнасць кансалідаваць народ і адрозніваць яго ад іншых этнасаў спрадвеку ставілася на першае месца, нягледзячы на тое, што асноўная функцыя мовы – камунікатыўная, адыгрывала другасную ролю. У выніку беларуская мова з'яўляецца самастойнай сутнасцю, не звязанай непасрэдна з моўнымі паводзінамі чалавека. Яна выконвае важную сімвалічную функцыю, калі чалавек ведае, што ён беларус, яго продкі жылі на Беларусі, ён сам у пэўнай ступені валодае беларускай мовай, разумее беларускую гаворку, але ў рэальным жыцці можа ёй практычна не карыстацца. Можна было б атаясаміць гэтую функцыю з нацыянальнай прыналежнасцю, але некаторая частка беларусаў (і ў апошняе 10-годдзе гэты працэнт значна ўзрос) называе сваёй роднай мовай рускую. Напэўна, яны пад гэтым паняццем маюць на ўвазе непасрэдны сродак зносін.

Нацыянальная мова і ў 1980-я гады з'яўлялася для беларусаў у першую чаргу не сродкам зносін, а неад'емным атрыбутам нацыі, як беларуская культура, гісторыя, як ідэнтыфікатар Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Савецкага Саюза разам з нацыянальнай сімволікай: беларускім гербам, сцягам, гімнам і іншымі атрыбутамі "беларускасці": народнымі касцюмамі, зубрамі і буслам. Тым больш павялічылася значэнне данай функцыі з моманту атрымання краінай статусу незалежнай дзяржавы. Гэты факт упэўнена пацвярджаюць лічбы, так як за апошнія 20 гадоў колькасць грамадзян, што называюць сябе беларусамі па нацыянальнасці, у краіне вырасла амаль на 6 %.

Беларускае насельніцтва ўпэўнена адрознівае сябе ад іншых народаў: рускіх, палякаў, літоўцаў, украінцаў, – не зважаючы на недастатковае веданне роднай мовы і невысокае імкненне яе вывучаць, на прыналежнасць да розных канфесій, на зменлівую на працягу стагоддзяў дзяржаўнасць, насуперак кніжным аксіёмам і фундаментальным паняццям. Якія ж параметры дазваляюць захаваць стабільную этнічную самаідэнтыфікацыю? Не трэба выключаць мноства іншых фактараў, якія ў пэўных гістарычных абставінах паўплывалі значна глыбей, чым лінгвістычны і рэлігійны паказчык.

Агульная тэтыторыя спрадвечна з'яўлялася адным з вядучых параметраў самавызначэння беларусаў. Не маючы магчымасці самаідэнтыфікацыі ў адносінах да пастаянна зменлівага дзяржаўнага адзінства, беларускі селянін атаясамліваў сябе з адзіным заўжды непарушным – роднай зямлёй. Менавіта з гэтай прычыны з'яўляецца ў беларускім менталітэце такая рыса, як "тутэйшасць".

Нельга не ўлічваць і палітычны кампанент. Вядома, што ў XX стагоддзі ўзмацнілася самавызначэнне беларускага народа. Не ў апошнюю

чаргу таму спрыяла стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Савецкага Саюза, а ў 1991 годзе абвяшчэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь. Частотнасць выкарыстання лінгвістычных адзінак з корнем “беларус” значна ўзвысілі ўсведамленне прыналежнасці насельніцтва краіны да пэўнай нацыянальнасці.

Сацыяльна-культурным ядром самавызначэння беларускага этнасу з’яўляецца менталітэт, які дазваляе карэннаму насельніцтву аднолькава ўспрымаць рэчаіснасць, ацэньваць яе і дзейнічаць у згоднасці з устойлівымі нормамі, каштоўнасцямі і мадэлямі паводзін. Такія рысы нацыянальнага характару, як добразычлівасць, гасціннасць, памяркоўнасць, засцярожлівасць, талерантнасць, даюць магчымасць беларусам упэўненна адрозніваць сваю этнічную супольнасць ад суседніх.

На гэтым устойлівым падмурку пастунова, але ўпэўнена будуецца беларуская нацыянальная самасвядомасць, менавіта будуецца, знаходзіцца ў стадыі развіцця. Самасвядомасць – гэта рыса, якая адрознівае чалавека ад іншых істот, а чалавечую арганізаваную супольнасць ад натоўпу або статку. І невыпадкова ўсе сучасныя азначэнні этнасу абавязкова ўключаюць такую катэгорыю, як нацыянальная самасвядомасць.

Нацыянальная самасвядомасць – гэта сукупнасць поглядаў, адзнак, меркаванняў, якія выражаюць змест, узровень і асаблівасці ўяўленняў членаў нацыянальна-этнічнай супольнасці (нацыі, народнасці) аб сваёй гісторыі, сучасным становішчы і перспектывах развіцця, а таксама аб месцы сярод аналагічных супольнасцей і характары ўзаемаадносін з імі. Асновай нацыянальнай самасвядомасці з’яўляецца асэнсаванне ўласнай этнічнай прыналежнасці, г.зн. этнічная самаідэнтыфікацыя праз выяўленне агульнасці мовы, культуры, псіхічнага складу, традыцый, звычаяў і г.д.[548]

Працэс фарміравання этнічнай самасвядомасці і яе праяўленне ў сацыяльнай рэчаіснасці з’яўляецца надзённай праблемай любога, і перш за ўсё, полікультурнага, поліэтнічнага грамадства. Нацыянальная свядомасць беларускага народа фарміравалася ў складаных абставінах, што абумоўлена шэрагам падзей і з’яў палітычнага, ідэалагічнага, рэлігійнага, сацыяльна-культурнага і іншага характару.

Спрадвеку так адбывалася, што ніколі беларускі народ не існаваў аднаасобна. З часоў Полацкага княства яму прыходзілася абараняць сваю незалежнасць і самабытнасць, змагацца з паланізацыяй у Рэчы Паспалітай, прыцерпяваць моцную русіфікацыю і нават даказваць сваё існаванне як асобнага народа ў складзе Расійскай Імперыі. Азначаныя падзеі моцна запавольвалі развіцце беларускай самасвядомасці.

Працэсы станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларусаў працягваліся і ў XX стагоддзі. На іх паўплывалі шматлікія фактары: неаднаразовыя змены межаў рэспублікі, абвешчаны ў Савецкім Саюзе курс

[548] Республика Беларусь: Энциклопедия: В 6 т. Т. 5. Минск, 2007. С. 369.

на сціранне нацыянальных асаблівасцей, змяненне нацыянальнага складу краіны ў сувязі з войнамі і міграцыямі, урбанізацыя, змяненне ролі сям'і ў перадачы этнічнага вопыту і роднай мовы, ідэалагічная работа па выхаванню беларусаў праз навучальныя ўстановы, творчую дзейнасць мастацкіх калектываў, музеі, сродкі масавай інфармацыі, праз узнаўленне і захаванне культурнай і гістарычнай спадчыны.

Даследаванне розных аспектаў дадзенай праблематыкі дае магчымасць устанавіць той факт, што нацыянальная самасвядомасць у вузкім сэнсе слова – гэта ўсведамленне аб сваіх спецыфічных адрозненнях ад іншых – цвёрда і трывала асэнсоўваецца сучаснымі беларусамі. Аднак у стадыі развіцця знаходзіцца этнічная самасвядомасць у шырокім сэнсе слова. Маецца на ўвазе ўвасабленне народам яго ўласнай сутнасці, уяўленне свайго становішча ў сістэме ўзаемадзеянняў з іншымі народамі, усведамленне сваёй ролі ў гісторыі чалавецтва, свайго права на свабоднае незалежнае існаванне і на самабытную этнічную культуру.

У 1991 годзе ўпершыню за шматвяковую гісторыю Беларусь склалася як незалежная і самастойная дзяржава і ўступіла ў новы гістарычны этап свайго нацыянальнага развіцця. Такім чынам, нягледзячы на складаны гістарычны вопыт, на сучасны момант вызначыліся спрыяльныя ўмовы для далейшага ўпэўненага станаўлення беларускай самасвядомасці.

У XXI стагоддзі ў святле глабальных праблем чалавечай цывілізацыі, асноўнымі задачамі Беларусі з'яўляюцца: захаванне сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці, мірнае суседства і супрацоўніцтва з іншымі народамі, вызначэнне сваіх стратэгічных прыярытэтаў з улікам існавання іншых цывілізацый і культур, уваходжанне ў якасці паўнапраўнага члена ў еўрапейскую і сусветную супольнасць.

Адзначым станоўчыя фактары і спрыяльныя ўмовы сучаснай рэчаіснасці і падвядзем наступныя вынікі.

Абапіраючыся на базавыя паняцці “сацыялізацыя” і “самаідэнтыфікацыя”, шырока вядомыя ў гуманітарных навуках, у выніку праведзенага даследавання мы выявілі характэрныя асаблівасці самаідэнтыфікацыі беларусаў.

Так як гістарычнае станаўленне беларусаў адбывалася выключна ў мультыкультурным, шматмоўным, рознаканфесійным грамадстве, то асэнсаванне дадзенага факта вызначае пагранічны характар нашай культуры, супярэчлівасць рэлігійных пунктаў гледжання і нізкую зацікаўленасць, нават індыферэнтнасць, у моўных пытаннях.

Аналіз моўнага становішча ў краіне сведчыць пра выкарыстанне дзвюх моў са сваімі дыялектамі, а таксама наяўнасць змешанага маўлення, або трасянкі.

Карыстаючыся статыстычнымі данымі, можна прасачыць, як уплываў лінгвістычны фактар на самаідэнтыфікацыю беларускага

насельніцтва, але трэба ўлічыць неадназначнасць сацыялагічных даных у сувязі з наступнымі фактарамі: розная ступень валодання беларускай мовай насельніцтва, суб'ектыўная адзнака кожнага носьбіта мовы ў высокай якасці ўласнага маўлення, размытыя крытэрыі паняцця «трасянка», ужыванне на тэрыторыі краіны як літаратурнай формы мовы, так і дыялектнай.

Аналіз даных апошніх перапісаў насельніцтва 1999 і 2009 гг. дазваляе выявіць заканамернасць: асноўным сродкам зносін большасці беларусаў з'яўляецца руская мова, хаця пераважная колькасць насельніцтва называе нацыянальную мову роднай.

Такім чынам, можна зрабіць вынік пра існаванне этналінгвістычнага феномена: беларусы, якія ў паўсядзённых зносінах аддаюць перавагу рускай мове, на самой справе валодаюць устойлівай беларускай самаідэнтыфікацыяй, якая з гадамі толькі замацоўваецца.

Важна зацвердзіць наступнае: хаця беларуская мова не выконвае сваёй асноўнай ролі сродку этнічнай камунікацыі, але захоўвае іншае значэнне – сімвалічнага фактару этнічнай культуры і традыцыі.

Праводзячы паралелі паміж паняццямі "нацыянальная самаідэнтыфікацыя" і "нацыянальная самасвядомасць", можна ўстанавіць заканамернасць: беларусы валодаюць развітой, трывалай самаідэнтыфікацыяй, аднак у стадыі развіцця знаходзіцца этнічная самасвядомасць у шырокім сэнсе слова. Маецца на ўвазе ўвасабленне народам яго ўласнай сутнасці, уяўленне свайго становішча ў сістэме ўзаемадзеянняў з іншымі народамі, усведамленне сваёй ролі ў гісторыі чалавецтва, свайго права на свабоднае незалежнае існаванне і на самабытную этнічную культуру.

Але нягледзячы на складаны гістарычны вопыт, на сучасны момант вызначыліся спрыяльныя ўмовы для далейшага ўпэўненага станаўлення беларускай самасвядомасці.

### 4.3 Некаторыя рысы да сацыялінгвістычнага партрэта сучаснага беларускага насельніцтва

У розных дзяржавах нацыянальна-моўныя пытанні вырашаюцца ў залежнасці ад лінгвістычнай сітуацыі, характэрнай для той ці іншай краіны. Зыходзячы са зместу і мэты моўнай палітыкі, кожная дзяржава выпрацоўвае ўласную мадэль лінгвістычнага развіцця. Моўнае становішча сучаснай Беларусі мае свае ўнікальныя рысы: поліэтнічны склад насельніцтва (на тэрыторыі краіны пражываюць прадстаўнікі 146 нацый і народнасцей); афіцыйны білінгвізм пры моцным дамінаванні рускай мовы як функцыянальнай; сімвалічная функцыя роднай мовы ў сферы культуры і мастацтва і інш. Рэаліі Беларусі сёння патрабуюць моўнай палітыкі, якая задавальняе патрэбы поліэтнічнага насельніцтва краіны, улічвае асаблівасці моўнай, дэмаграфічнай і палітычнай сітуацыі і з'яўляецца магутным фактарам стабільнасці ў беларускім грамадстве. Запаўненне

інфармацыйнай прасторы рэальным двухмоўем дазволіць беларусам дасканала авалодаць нацыянальнай мовай і не страціць навыкаў рускай мовы. Пабудова моўнай палітыкі павінна грунтавацца на ўяўленні спецыфічных рыс і дэталей, якія характарызуюць прадстаўнікоў беларускага соцыуму з пункту гледжання геалінгвістычных і сацыякультурных аспектаў карыстання той ці іншай мовай.

Насельніцтва Рэспублікі Беларусь па характары моўных паводзін адрозніваецца ад іншых краін двухмоўем асаблівага тыпу з моцнай перавагай рускай мовы, якая не з'яўляецца роднай для большай часткі карэнных жыхароў. Акрамя наяўнасці білінгвізму, пры апісанні моўнай сітуацыі трэба ўлічыць, што тэрыторыя Беларусі падзяляецца на два асноўныя дыялекты: паўночна-ўсходні (Віцебская вобласць, большая частка Магілёўскай вобласці, поўнач Мінскай вобласці) і паўднёва-заходні (Брэсцкая вобласць, Гомельская, поўдзень Мінскай, большая частка Гродзенскай вобласці). Гэтыя дыялекты раздзяляюцца паласой пераходных, або сярэднебеларускіх, гаворак, што знаходзяцца абапал лініі Ашмяны – Мінск – Бабруйск – Гомель (Ашмянскі, Валожынскі, Маладзечанскі, Дзяржынскі, Мінскі, Лагойскі, Барысаўскі, Рагачоўскі, Бярэзінскі, Чэрвеньскі раёны). Акрамя гэтага, у склад сучаснай беларускай дыялектнай мовы ўваходзіць адасобленая група заходнепалескіх, ці брэсцка-пінскіх, гаворак. Яны значна адрозніваюцца ад усіх іншых гаворак асноўнага беларускага дыялектнага масіву.

Наяўнасць дыялектаў не парушае адзінства беларускай нацыянальнай мовы. Яны больш старажытныя, чым сама беларуская мова. Працэс групавання гаворак у дыялекты адбываўся у эпоху кансалідацыі беларускіх земляў у межах Тураўскага і Полацкага княстваў. У наш час новыя дыялекты не толькі не ўтвараюцца, але і паступова сціраюцца адрозненні паміж існуючымі, разбураюцца дыялектныя межы.

Тым не менш, і на сучасны момант назіраюцца значныя адрозненні ў маўленні жыхара беларускага Палесся і ўраджэнца Віцебшчыны, сталічнага жыхара і прадстаўніка заходнебеларускай вёскі. Таму асноўнай кампанентай для апісання і даследавання моўнай сітуацыі ў Беларусі можна лічыць тэрытарыяльны падыход.

Моўнае планаванне абавязкова павінна грунтавацца на выніках сацыялагічных даследаванняў, матэрыялах перапісу насельніцтва, статыстычных даных. Адной з найбольш важных і дакладных крыніц аналізу лінгвістычнай сітуацыі з'яўляюцца перапісы насельніцтва, якія ператварыліся ў магутны кірунак дэмаграфіі, статыстыкі і інфарматыкі. У сусветным маштабе маніторынгам, абагульненнем доследу і супастаўленнем сукупнасці статыстычных даных розных краін займаецца шэраг міжнародных арганізацый. Па ступені дакладнасці дэмаграфічных даных краіны свету падзяляюцца на 4 катэгорыі (A, B, C, D). Група A прадстаўлена развітымі краінамі, у якіх статыстычныя даныя перапісу

насельніцтва лічацца найбольш надзейнымі. Усходнеславянскія краіны (Расія, Украіна, Беларусь) уваходзяць у катэгорыю В.

Агульны перапіс насельніцтва не толькі з'яўляецца асноўнай крыніцай атрымання сацыялагічных даных пра колькасць і структуру насельніцтва, але і дазваляе высветліць дзеючае моўнае становішча пэўнай дзяржавы. Асабліва гэта важна для шматнацыянальных краін, таму што на аснове даных, атрыманых пры перапісе, распрацоўваецца інфармацыйна-адукацыйная палітыка, а таксама меры па падтрымцы тых ці іншых моў, калі ў гэтым ёсць неабходнасць.

У 2009 годзе ў гісторыі незалежнай Беларусі адбыўся другі перапіс насельніцтва, які ўключаў наступныя пытанні аб мове: "Ваша родная мова", "На якой мове вы звычайна размаўляеце дома?", "Іншыя мовы, якімі вы свабодна валодаеце".

Для вызначэння роднай мовы сучаснага беларускага грамадзяніна вялікае значэнне мае нацыянальны склад насельніцтва. У 2009 годзе на пытанне "Да якой нацыянальнасці вы сябе далучаеце?" (па самавызначэнні і жаданні рэспандэнта) была атрымана вялікая колькасць адказаў, з дапамогай якіх было ўсталявана, што на тэрыторыі краіны пражывае 146 этнасаў. Характарыстыка насельніцтва Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай прыкмеце выглядае наступным чынам: беларусы – 83,7 %, рускія – 8,3 %, палякі – 3,1 %, украінцы – 1,7 %, яўрэі – 0,1 %, армяне – 0,1 %, татары – 0,1 %, цыганы – 0,1 %, азербайджанцы – 0,1 %, літоўцы – 0,1 % і інш. [549] Астатнія нацыянальнасці, згодна з данымі апошняга перапісу насельніцтва, прадстаўлены на беларускай тэрыторыі колькасцю меншай за 0,1 %. Такім чынам, пераважная колькасць насельніцтва далучае сябе да карэннай тытульнай нацыі. Калі разгледзець статыстычныя даныя па абласцях, то можна вызначыць, што колькасць беларусаў у Брэсцкай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай вобласці нават перавышае 88 %, у Віцебскай вобласці – блізкая да агульных паказчыкаў (85,1 %), нязначна зніжана па г. Мінску (79,2 %). Але паказчыкі Гродзенскай вобласці значна адрозніваюцца ад сярэднестатыстычных па краіне, так як у гэтым рэгіёне пражывае вялікая колькасць палякаў – 21,5 %, а беларускае насельніцтва складае ўсяго 66,7 % [550].

Выбар мовы паўсядзённага выкарыстання для сучаснага беларуса шмат у чым залежыць ад месца пражывання, аднесенасці населенага пункта да горада ці вёскі. Гістарычна так склалася, што большая частка мясцовага насельніцтва пражывала менавіта ў сельскай частцы краіны. Буйныя гарады былі шматнацыянальнымі, з'яўляліся цэнтрамі гандлю і рамёстваў, і таму насяляліся не толькі беларусамі, але і прадстаўнікамі

---

[549] Перепись населения – 2009. Статистические бюллетени «Общая численность населения, его состав по возрасту, полу, состоянию в браке, уровню образования, национальностям, языку и источникам средств к существованию». Республика Беларусь. С. 23. // http://belstat.gov.by/homep/ru/perepic/2009/itogi1.php. Дата доступа 10.11.2013г.

[550] Там жа. С. 24.

іншых нацыянальнасцей: рускіх, яўрэяў, палякаў, украінцаў, літоўцаў і інш. Гарадское насельніцтва было больш залежным ад палітычных абставін: значна падпадала пад уплыў спачатку паланізацыі, потым русіфікацыі. На выбар мовы ўздзейнічалі органы ўлады, адміністрацыйныя падраздзяленні, адукацыйныя ўстановы, пазней сродкі масавай інфармацыі. Сельскае насельніцтва да савецкага перыяду было малаадукаваным, перадавала з пакалення ў пакаленне асаблівасці вуснай дыялектнай гаворкі, якая з'явілася асновай, падмуркам сучаснай беларускай мовы. Таму і на сёняшні момант, па даных перапісу насельніцтва 2009 года, захоўваецца значная розніца паміж горадам і вёскай у прыняцці беларускай мовы ў якасці роднай, а таксама ў яе паўсядзённым выкарыстанні.

Даныя адзначанай ніжэй табліцы 21 пацвярджаюць той факт, што сельскае насельніцтва значна больш за гарадское выкарыстоўвае беларускую мову. Амаль 80 % сяльчан нашай краіны лічаць беларускую мову роднай, большая частка (58,7 %) размаўляюць на роднай мове кожны дзень. Адпаведна толькі 44,1 % гараджан прызнаюць мову тытульнай нацыі роднай, і ўсяго 11,3 % карыстаюцца ёй у быту.

Пераважнай дэмаграфічнай магутнасцю на Беларусі валодае руская мова. Нават такую лічбу, як 11,3 % носьбітаў беларускай мовы па ўсёй краіне, большасць грамадзян паставяць пад сумненне, бо рэальна назіраюць іншую карціну.

Ацэнка моўнага становішча Беларусі праблематычна па той прычыне, што перапісы насельніцтва не ўлічваюць такі факт, як існаванне змешанай мовы, так званай "трасянкі". Трасянка – гэта маўленне, якое ўзнікла на аснове лексікі рускай мовы з накладаннем на яе беларускай граматыкі і фанетыкі.

Табліца 21 – Размеркаванне насельніцтва Рэспублікі Беларусь па валоданні беларускай і рускай мовамі [551]

| | **Усё насельніцтва** | **З агульнай колькасці насельніцтва назвалі ў якасці** | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **роднай мовы** | | **мовы, на якой звычайна размаўляюць дома** | |
| | | **беларускую** | **рускую** | **беларускую** | **рускую** |
| Рэспубліка Беларусь | 9 503 807<br>100 % | 5 058 402<br>53,2 % | 3 948 074<br>41,5 % | 2 227 175<br>23,4 % | 6 672 964<br>70,2 % |
| Гарадское насельніцтва | 7 064 529<br>100 % | 3 113 235<br>44,1 % | 3 517 330<br>49,8 % | 796 213<br>11,3 % | 5 789 010<br>81,9 % |
| Сельскае насельніцтва | 2 439 278<br>100 % | 1 945 167<br>79,7 % | 430 744<br>17,7 % | 1 430 962<br>58,7 % | 883 954<br>36,2 % |

[551]Перепись населения – 2009. С. 25.

У анкеце перапісу для вызначэння мовы паўсядзённага карыстання існавала тры варыянты адказаў: беларуская, руская і іншая мова. Варыянт “трасянка” або “змешаная мова” не прадугледжваўся і нідзе ў афіцыйных даных не выкарыстоўваўся. Відавочна, што сярод рэспандэнтаў перапісу, былі такія, што вызначалі сваё маўленне як змешанае, аднак не змаглі адлюстраваць у анкеце наступны факт. Бясспрэчна і тое, што многія рэспандэнты не змаглі дакладна класіфікаваць сваё паўсядзённае маўленне. Асабліва трэба ўлічыць той момант, што размова ідзе пра генетычна роднасныя і падобныя па будове і граматыцы мовы. Многія з носьбітаў трасянкі лічаць, што размаўляюць па-руску, хаця на самой справе выкарыстоўваюць змешаную мову. У пераважнай ступені гэта датычыцца мігрантаў з сельскай мясцовасці ў горад. У дамашніх умовах яны прайшлі сацыялізацыю пераважна ў беларускім дыялектным асяроддзі, але ва ўмовах горада вымушаны былі адаптавацца і звярнуцца да рускай мовы як да асноўнага сродку камунікацыі. Звычайна ўласныя адхіленні ад норм мовы, засвоенай у другую чаргу, застаюцца неасэнсаванымі і не заўважаюцца ў вусным і пісьмовым маўленні.

Узаемадзеянне разнастайных этнакультур на тэрыторыі краіны спрыяла фарміраванню полікультурнага і полілінгвістычнага асяроддзя і, як вынік, станаўленню білінгвальнай асобы. Большасць насельніцтва без асаблівых цяжкасцей разумее абедзве мовы, выдзяляе патрэбную інфармацыю на слых і пры чытанні тэкстаў. Але, з’яўляючыся пасіўнымі носьбітамі беларускай мовы, многія з цяжкасцю прымяняюць яе ў актыўным выкарыстанні, таму трасянка распаўсюджана на ўсёй плошчы Рэспублікі Беларусь.

Але, абапіраючыся на афіцыйную статыстыку апошняга перапісу насельніцтва, немагчыма апісаць моўнае становішча з улікам міжмоўнай інтэрферэнцыі, таму далейшыя назіранні датычацца дзвюх афіцыйных дзяржаўных моў, зацверджаных заканадаўча ў краіне.

Разгледзім больш пільна тыя рэгіянальныя даныя, якія істотна адрозніваюцца ад сярэднестатыстычных па краіне, і паспрабуем вызначыць прычыны такога разыходжання. Так як статыстыка даных у Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцях падобна (з улікам нязначных адхіленняў) да агульных звестак у рэспубліцы, то звернем большую ўвагу на іншыя рэгіёны.

Моўнае становішча сталіцы Беларусі патрабуе асобнага апісання. Перш за ўсё трэба звярнуць увагу на тое, што ў Мінску пражывае 1 836 808 чалавек. Гэта значна больш, чым колькасць жыхароў у любой вобласці Беларусі. Жыццё ў буйным горадзе накладае адбітак на ўсе сферы чалавечай дзейнасці, у тым ліку камунікацыйныя зносіны паміж людзьмі. Па табліцы 22 размеркавання бачна, што паказчыкі па сталіцы значна адрозніваюцца ад сярэднестатыстычных лічбаў па краіне.

Табліца 22 – Размеркаванне насельніцтва г. Мінска і Мінскай вобласці па валоданні беларускай і рускай мовамі [552]

| | Усё насельніцтва | З агульнай колькасці насельніцтва назвалі ў якасці | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | роднай мовы | | мовы, на якой звычайна размаўляюць дома | |
| | | беларускую | рускую | беларускую | рускую |
| г. Мінск | 1 836 808<br>100 % | 645 875<br>35,2 % | 966 028<br>52,6 % | 106059<br>5,8 % | 1 508 669<br>82,1 % |
| Мінская вобласць | 1 422 528<br>100 % | 987 152<br>69,4 % | 390 474<br>27,4 % | 522 961<br>38,9 % | 796 612<br>56,0 % |
| Гарадское насельніцтва | 788 040<br>100 % | 473 030<br>60,0 % | 288 348<br>36,6 % | 172 684<br>21,9 % | 574 035<br>72,8 % |
| Сельскае насельніцтва | 634 488<br>100 % | 514 122<br>81,0 % | 102 126<br>16,1 % | 380 277<br>59,9 % | 222 577<br>35,1 % |

Больш за палову мінчан (52,6 %) у якасці роднай мовы ўпэўнена назвалі рускую. Гэты паказчык на 11 % перавышае сярэднестатыстычны па ўсёй Беларусі і некалькі вышэй (на 2,8 %) за лічбы, якія паказваюць адносіны да роднай мовы ў гарадскога насельніцтва рэспублікі. Не вельмі адрозніваюцца і паказчыкі па выкарыстанні рускай мовы ў паўсядзённым жыцці сярод гарадскога насельніцтва краіны і сталічных жыхароў (адпаведна 81,9 % і 82,1 %). Але мова тытульнай нацыі ў мінчан не карыстаецца вялікім попытам. Усяго 35,2 % мінчан назвалі беларускую мову роднай (у параўнанні: 53,2 % – сярэднестатыстычны паказчык па ўсёй краіне, 44,1 % – у гарадскога насельніцтва Беларусі). І толькі 5,8 % карыстаюцца беларускай мовай дома ў сямейным асяроддзі. Гэта ўдвая менш у параўнанні з гарадскім насельніцтвам краіны (11,3 %) і значна саступае сярэднерэспубліканскім паказчыкам (23,4 %).

Што датычыцца моўнай сітуацыі ў Мінскай вобласці, то ў гэтай сувязі можна выдзеліць наступныя цікавыя моманты.

Паказчыкі па сельскай мясцовасці амаль не адрозніваюцца ад адпаведных лічбаў па Беларусі (з улікам невялікіх адхіленняў у той ці іншы бок). Затое значна розняцца паказчыкі Мінскай вобласці ад рэспубліканскіх па выкарыстанні моў гарадскім насельніцтвам.

Напрыклад, роднай мовай лічаць беларускую 60 % гараджан Мінскай вобласці, у той час, як агульнарэспубліканскія паказчыкі складаюць 44,1 %. Розніца паміж лічбамі даволі заўважная – больш за 15 %. І наадварот, рускую мову прызнаюць роднай каля 36,6 % гарадскіх жыхароў Міншчыны, што значна ніжэй, чым у цэлым па краіне (49,8 %).

[552] Перепись населения – 2009. С. 25.

Таксама заўважны кантраст назіраецца ў лічбах, якія паведамляюць аб выкарыстанні мовы ў паўсядзённым жыцці. Рэспандэнты гарадоў Мінскай вобласці (акрамя г. Мінска) у два разы часцей ужываюць беларускую мову ў параўнанні з сярэднестатыстычнымі данымі па гарадах краіны ў цэлым (21,9 % – гараджане Міншчыны, 11,3 % – гараджане рэспублікі). Адпаведна, носьбіты рускай мовы сярод гарадскіх жыхароў Мінскай вобласці складаюць 72,8 %, супраць 81,9 % рускамоўных рэспандэнтаў у цэлым па краіне.

Сярэднестатыстычныя лічбы па сельскай мясцовасці і нечакана высокі працэнт беларускамоўных гараджан у цэнтральным рэгіёне рэспублікі тлумачацца тым, што рэспандэнтамі з’яўляюцца жыхары раённых цэнтраў і невялікіх пасёлкаў гарадскога тыпу, дзе вялікая колькасць мігрантаў з сельскай мясцовасці.

Такім чынам, поўнасцю пацвярджаецца тэзіс аб тым, што мовай паўсядзённага карыстання для вялікага горада, як ні сумна, з’яўляецца руская мова. Чым буйнейшы населены пункт, тым радзей у ім чутна беларускае маўленне.

Такі несуцяшальны вынік можна растлумачыць наступнымі прычынамі. Вялікі горад – крыніца лепшых магчымасцей для працы і заробку, свабодных рабочых месцаў, што прыцягвае вялікую колькасць перасяленцаў розных нацыянальнасцей, а сродкам камунікацыі для іх з’яўляецца менавіта руская мова. Высокая сканцантраванасць вышэйшых навучальных устаноў таксама павышае прэстыж рускай мовы. Нягледзячы на афіцыйны білінгвізм, вядома, што вышэйшую адукацыю ў нашай краіне можна атрымаць толькі на рускай мове. Нават абітурыенты з беларускамоўных школ, паступіўшы ў сталічныя ВНУ, вымушаны падпарадкоўвацца агульнапрынятым правілам і вучыцца па-руску. У выніку, праз чатыры-пяць гадоў адукацыі і паўсядзённых зносін на рускай мове яны трывала забываюць родную мову і пераходзяць у разрад рускамоўных носьбітаў або карыстаюцца трасянкай.

Што датычыцца невялікай колькасці (усяго 5,8 %) мінскіх аматараў роднай мовы, то, на наш погляд, яны больш свядома выбіраюць нацыянальную мову ў якасці функцыянальнай.

Вызначаючы лінгвістычныя рысы беларускамоўнага сталічнага жыхара, нельга не закрануць наступную праблему. Бясспрэчны той факт, што сярод высокаадукаваных прыхільнікаў беларускай мовы ёсць катэгорыя, якая не згодна з сучаснай афіцыйнай арфаграфіяй. Як вядома, беларускі правапіс упершыню быў кадэфікаваны і ўнармаваны Браніславам Тарашкевічам у 1918 годзе. А ў 1933 годзе адбылася моўная рэформа, якая ставіла сваёй мэтай уніфікаваць беларускую арфаграфію, наблізіць яе да рускамоўнай. У БССР сталі карыстацца афіцыйным варыянтам, за межамі Савецкага Саюза – гістарычным правапісам, так званай “тарашкевіцай”. Пазней адбылося яшчэ дзве рэформы беларускага

правапісу, апошняя была зацверджана ў 2008 годзе і практычна выкарыстоўваецца з 2010 года. Можна прыводзіць сотні довадаў "За" або "Супраць" той ці іншай рэформы: абвінавачваць Б. Тарашкевіча ў насаджэнні традыцый польскай арфаграфіі, вялікай колькасці паланізмаў, крытыкаваць укладальнікаў рэформы 1933 года за моцную русіфікацыю. Але ці вырашыць такое супрацьстаянне праблемы сучаснай беларускай мовы, ці павялічыць колькасць беларускамоўных носьбітаў? Які варыянт правільны і "больш беларускі" – тэма для бясконцых дыскусій і "арфаграфічных войнаў" на старонках беларускага друку і ў інтэрнэце. На жаль, існаванне двух варыянтаў арфаграфіі не спрыяе наладжванню моўнага становішча, якое і без таго даволі складанае на Беларусі.

І зноў звернемся да разгляду агульнарэспубліканскай статыстыкі з пункту гледжання размяшчэння рэгіёна.

Гродзенская вобласць па выкарыстанні беларускай мовы стаіць на першым месцы сярод рэгіёнаў Беларусі. Статыстыка паказвае, што больш за трэць (35,1 %) жыхароў вобласці звычайна размаўляюць дома па-беларуску. Гэты паказчык значна перавышае агульнастатыстычны па краіне (23,4 %). Адпаведна, рускай мовай у Гродзенскай вобласці карыстаюцца 56,5 % рэспандэнтаў, у параўнанні з 70 %, адзначанымі па краіне ў цэлым.

Пераважную частку беларускамоўнага насельніцтва складаюць сельскія жыхары (71,4 %), і толькі 17,7 % сяльчан размаўляюць ў сям'і на рускай мове. Адваротная карціна назіраецца ў горадзе: 73,9 % гродзенцаў аддаюць перавагу рускай мове, і толькі 18,7 % паўсядзённа выкарыстоўваюць беларускую мову. У параўнанні з астатнімі рэгіёнамі краіны назіраецца найбольш заўважная розніца ў працэнтах.

Яшчэ большая частка сяльчан (84,2 %) называюць беларускую мову роднай, што на 31% вышэй, чым увогуле па краіне, і на 4,5 % больш за агульныя паказчыкі сярод сельскага насельніцтва. Рускую мову вызначаюць роднай толькі 11,6 % сяльчан і 51,9 % гараджан Гродзеншчыны.

Табліца 23 – Размеркаванне насельніцтва Гродзенскай вобласці па валоданні беларускай і рускай мовамі [553]

| | Усё насельніцтва | З агульнай колькасці насельніцтва назвалі ў якасці | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | роднай мовы | | мовы, на якой звычайна размаўляюць дома | |
| | | беларускую | рускую | беларускую | рускую |
| Гродзенская вобласць | 1 072 381<br>100 % | 634 736<br>59,2 % | 386 941<br>36,1 % | 375 920<br>35,1% | 606 065<br>56,5% |
| Гарадское насельніцтва | 740 088<br>100 % | 354 804<br>47,9 % | 348 320<br>51,9 % | 138 720<br>18,7 % | 547 144<br>73,9 % |
| Сельскае насельніцтва | 332 293<br>100 % | 279 932<br>84,2 % | 38 621<br>11,6 % | 237 200<br>71,4 % | 58 921<br>17,7 % |

[553] Перепись населения – 2009. С. 25.

Як ужо адзначалася раней, Гродзенская вобласць адзначаецца своеасаблівым нацыянальным складам. Больш за пятую частку насельніцтва (21,5 %) жыхароў Гродзеншчыны складаюць палякі [554]. Як сведчаць даныя перапісу насельніцтва, у цэлым па краіне налічваецца 294 549 чалавек польскай нацыянальнасці [555], і пераважная частка (230 810 чалавек або 78,3 %) пражывае на тэрыторыі Гродзеншчыны. Сярод іх 140 367 гараджан, што складае 18 % ад агульнай колькасці гарадскога насельніцтва Гродзенскай вобласці, і 90 443 вяскоўцы – гэта 27,2 % ад агульнай колькасці сельскіх жыхароў рэгіёна [556].

Парадаксальным з'яўляецца той факт, што большая частка палякаў (58 %) роднай мовай назвала беларускую, што не так значна адрозніваецца ад колькасці рэспандэнтаў-беларусаў, якія аддаюць перавагу беларускай мове (60,8 % – у краіне, 68,8 % – на Гродзеншчыне). Цікава, што рускую мову ў якасці роднай вызначаюць 34% палякаў, а прыхільнікі польскай мовы складаюць усяго 5,3 % [557]. Напэўна, такая высокая ўвага да беларускай мовы сярод рэспандэнтаў польскай нацыянальнасці тлумачыцца падабенствам лексічнага складу, граматычных асаблівасцей дзвюх моў, высокай пранікальнасцю кампанентаў мовы з адной у адну. Хаця беларуская і польская мовы адносяцца да розных лінгвістычных падгруп славянскай групы індаеўрапейскай сям'і, але, вядома, што заходнеславянская польская мова бліжэй да беларускай, чым да рускай мовы. Агульнае гістарычнае мінулае нашых народаў таксама спрыяе пільнай ўвазе палякаў да мовы-суседкі.

Зусім іншае лінгвістычнае становішча назіраецца на Магілёўшчыне. Насельніцтва Магілёва і Магілёўскай вобласці характарызуецца больш частотным ужываннем рускай мовы, чым у іншых рэгіёнах краіны.

Табліца 24 – Размеркаванне насельніцтва Магілёўскай вобласці па валоданні беларускай і рускай мовамі[558]

| | **Усё насельніцтва** | **З агульнай колькасці насельніцтва назвалі ў якасці** | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **роднай мовы** | | **мовы, на якой звычайна размаўляюць дома** | |
| | | **беларускую** | **рускую** | **беларускую** | **рускую** |
| Магілёўская вобласць | 1 099 374<br>100 % | 605 512<br>56,1 % | 460 758<br>41,9 % | 215 543<br>19,6 % | 840 815<br>76,5 % |
| Гарадское насельніцтва | 833 248<br>100 % | 390 294<br>46,8 % | 413 054<br>49,6 % | 82 949<br>10,0 % | 716 753<br>86,0 % |
| Сельскае насельніцтва | 266 126<br>100 % | 215 218<br>80,9 % | 47 704<br>17,9 % | 132 594<br>449,8 % | 124 062<br>46,7 % |

[554] Перепись населения – 2009. С. 24.
[555] Там жа. С. 23.
[556] Там жа. С. 30.
[557] Там жа. С. 32.
[558] Там жа. С. 25.

19,6 % жыхароў Магілёўшчыны паводле даных агульнарэспубліканскага перапісу насельніцтва 2009 года размаўляюць на беларускай мове ў паўсядзённым жыцці, што ніжэй за агульнарэспубліканскія паказчыкі (23,4 %); у тым ліку, істотна адрозніваецца дадзены паказчык сярод сельскіх жыхароў (49, 8 % – па Магілёўшчыне, 58,7 % – у рэспубліцы). Адпаведна, рускай мовай карыстаюцца больш за тры чвэрці насельніцтва Магілёўскай вобласці (76,5 %), у той час як агульнарэспубліканскі паказчык складае 70,2 %. Колькасць рускамоўных жыхароў на Магілёўшчыне вышэй за сярэднестатыстычныя даныя і сярод гараджан, і сярод вяскоўцаў, але розніца ў працэнтах найбольш заўважная пры аналізе паказчыкаў сельскага насельніцтва (46,7 % – па Магілёўшчыне, 36,2 % – у краіне), але і гараджане часцей выкарыстоўваюць рускую мову (86,0 % – па вобласці, 81,9 % – па рэспубліцы).

Перавага рускай мовы і высокая частотнасць ужывання невыпадковая. Блізкасць мяжы з Расіяй, мацнейшая за іншыя рэгіёны і больш доўгая русіфікацыя, асіміляцыя карэннага насельніцтва з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей значна ўплываюць на выбар мовы ва ўсходнім рэгіёне. Хаця, калі разгледзець лічбы, звязаныя з усведамленнем роднай мовы, то можна заўважыць больш высокую, чым у краіне частотнасць выбару менавіта беларускай мовы. Жыхары Магілёўшчыны валодаюць устойлівай беларускай самаідэнтыфікацыяй, надаюць важнае сімвалічнае значэнне мове сваёй нацыянальнасці, хаця ў паўсядзённых зносінах аддаюць перавагу рускай мове.

Фактарам, які можа непасрэдна паўплываць на выбар мовы, з'яўляецца ўзрост прадстаўнікоў беларускага насельніцтва. У апошні час праяўляюцца тэндэнцыі да скарачэння ўжывання як змешанай, так і беларускай мовы ці нават поўнай адмовы ад іх сярод юнацкай узроставай групы.

Такі вынік можна пацвердзіць данымі сацыялагічнага апытвання, праведзенага ў 2009 годзе супрацоўнікамі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання на тэрыторыі Магілёўскай вобласці.

Калі разглядаць дадзеную праблему сярод розных узроставых груп, то назіраецца выразная тэндэнцыя памяншэння папулярнасці беларускай мовы сярод моладзі. Па даных сацыялагічнага апытвання на Магілёўшчыне, у групе рэспандэнтаў старэйшага ўзросту (больш за 50 год) на рускай мове размаўляюць 48,1 % і прыкладна столькі ж (48,9 %) карыстаюцца змешаным варыянтам, у народзе названым "трасянкай". Сярод прадстаўнікоў старэйшага ўзросту самы высокі працэнт (3,1 %) носьбітаў беларускай мовы. Ужо ва ўзроставай групе ад 30 да 50 год нацыянальнай мовай карыстаюцца 2,5 % удзельнікаў апытвання, а сярод моладзі да 30 год толькі 1,3 % ужываюць беларускую мову штодзённа. Адпаведна павялічваецца колькасць носьбітаў рускай мовы: толькі на рускай мове размаўляюць 58,6 % сталых (30–50 год) грамадзян і 70,3 %

моладзі; ужыванне абедзвюх моў практыкуюць 38,0 % прадстаўнікоў узроставай групы ад 30 да 50 год і толькі 28,4 % моладзі [559].

Вынікі рэгіянальнага даследавання можна лічыць характэрнымі і для ўсёй тэрыторыі краіны.

Ускоснымі паказчыкамі адносін моладзі да выкарыстання на практыцы нацыянальнай мовы з’яўляецца статыстыка ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Апошнія гады захоўваецца сумная дынаміка: зніжаецца колькасць абітурыентаў, якія выбралі для тэсціравання беларускую мову, адпаведна назіраецца рост колькасці ўдзельнікаў, зарэгістраваных на рускую мову. Калі ў 2011 годзе беларускую мову здавала 53167 чалавек (больш за 35 %), а ў 2012 годзе – 45199 чалавек (каля 33 %), то ў 2013 годзе вырашылі праверыць свае веды па роднай мове ўсяго 33564 абітурыенты, што складае 30 % ад агульнай колькасці ўдзельнікаў [560].

Ёсць меркаванне, што прычынай такой нізкай папулярнасці тэсціравання па беларускай мове сталі новыя правілы беларускай арфаграфіі, уведзеныя ў 2010 годзе.

Але добра вядома, што бліжэйшыя гады дзейнічае мараторый на выкарыстанне ў тэстах слоў, якія змянілі напісанне адпаведна новаму правапісу, таму верагоднасць рызыкі мінімальная. Тым не менш, лічбы гавораць самі за сябе…

Так як у нашай краіне афіцыйна ўстаноўлена дзве дзяржаўныя мовы, то любы абітурыент мае магчымасць здаваць іншыя дысцыпліны на беларускай мове. Але з кожным годам такую магчымасць скарыстоўваюць усё менш удзельнікаў ЦТ. Нават тэст па гісторыі Беларусі ў 2013 годзе больш за 80 % абітурыентаў, зарэгістраваных на гэты прадмет, пісалі на рускай мове. Для параўнання трэба адзначыць, што яшчэ не так даўно (у 2010 годзе), лічба была ўдвая меншая: 40% рускамоўных тэстаў па гісторыі Беларусі. Па іншых дысцыплінах запатрабаванасць беларускай мовы яшчэ ніжэйшая. У 2013 годзе матэматыку, фізіку, хімію на роднай мове здавала па 6 % удзельнікаў ЦТ, біялогію – менш за 7 % абітурыентаў, тэст па грамадазнаўству на роднай мове вырашыла здаваць ледзь больш за 2 % будучых студэнтаў.

Прычыны невысокай папулярнасці беларускай мовы сярод прадстаўнікоў моладзі трэба шукаць у тым, што веданне роднай мовы не з’яуляецца вострай неабходнасцю ў краіне з афіцыйным двухмоўем. Валоданне роднай мовай на высокім узроўні ніяк не паўплывае на будучыню маладых юнакоў і дзяўчат: не дапаможа атрымаць вышэйшую адукацыю, не пашырыць магчымасці выбару прэстыжнай і высокааплатнай працы (як, напрыклад, веданне замежнай мовы), не пасадзейнічае

[559] Бунас А.У. Беларуская мова ў жыцці сучаснага беларуса // Социальное знание и белорусское общество. С. 258–260.

[560] Статистика ЦТ 2013: динамика по предметам // http://test.bseu.net/news/

ўладкаванню асабістага жыцця. Разуменне таго, што можна быць беларусам, не размаўляючы на роднай мове, поўнасцю адпавядае моўнай рэчаіснасці ў краіне, і гэтае ўсведамленне распаўсюджана сярод моладзі.

**Высновы.**

Статыстычныя даныя пацвярджаюць залежнасць паміж дзяржаўнай палітыкай ў моўнай сферы і функцыямі нацыянальнай мовы ў жыцці беларускага народа. На ўздыме беларусізацыі назіраецца павелічэнне ў працэнтных суадносінах колькасці грамадзян, якія лічаць роднай мовай беларускую, а таксама карыстаюцца ей ў паўсядзённым маўленні. І наадварот: за апошняе дзесяцігоддзе канстатуецца рэзкае звужэнне функцыянавання беларускай мовы і як сродку камунікацый у розных сферах, і як сімвала нацыі, дыферэнцыйнай прыкметы этнасу.

У рэалізацыі нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь улічваліся культурныя і адукацыйныя запатрабаванні нацыянальных супольнасцей і прыкладаліся намаганні па захаванню нацыянальных моў і арганізацыі навучання на родных мовах. У некаторых дзяржаўных вучэбных і выхаваўчых установах у адпаведнасці з пажаданнямі прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей было арганізавана вывучэнне шэрагу нацыянальных моў, навучанне і выхаванне на гэтых мовах. На базе агульнаадукацыйных школ, пазашкольных, клубных, бібліятэчных устаноў сістэм Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры па ініцыятыве нацыянальных супольнасцей былі ўтвораны школы, класы, факультатывы, гурткі па навучанню на роднай мове, даследаванню гісторыі і культуры нацыянальных супольнасцей. Адукацыйныя структуры з этнакультурным кампанентам забяспечваліся адпаведнымі падручнікамі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, па магчымасці, Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама краінамі гістарычнага паходжання. У вышэйшых навучальных установах была арганізавана падрыхтоўка кадраў для гэтых школ.

На аснове прыведзеных у працы даных паспрабуем акрэсліць асноўныя сацыялінгвістычныя рысы сучаснага грамадзяніна нашай краіны.

Насельніцтва Рэспублікі Беларусь па характары моўных паводзін адрозніваецца ад іншых краін двухмоўем асаблівага тыпу з моцнай перавагай рускай мовы, якая не з'яўляецца роднай для большай часткі карэнных жыхароў. Пераважная частка насельніцтва рэспублікі – пасіўныя білінгвы: разумеюць абедзве мовы, выдзяляюць патрэбную інфармацыю на слых і пры чытанні тэкстаў, але з цяжкасцю прымяняюць яе ў актыўным выкарыстанні. Таму ў маўленні многіх беларусаў можна заўважыць праявы руска-беларускай інтэрферэнцыі. Акрамя наяўнасці змешанай мовы, так званай “трасянкі”, пры апісанні моўнай сітуацыі трэба ўлічыць уздзеянне на маўленне двух асноўных дыялектаў: паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга.

На аснове праведзенага аналізу даных апошняга перапісу насельніцтва ўстаноўлена залежнасць выкарыстання беларускай мовы ад месца пражывання, аднесенасці населенага пункта да горада ці вёскі. Сельскае насельніцтва значна больш за гарадское выкарыстоўвае беларускую мову. Чым буйнейшы населены пункт, тым радзей у ім прысутнічае беларускае маўленне. Самыя нізкія паказчыкі выяўлены ў сталіцы краіны. Гэта даныя статыстыкі. У той жа час найбольш беларуская мова выкарыстоўваецца і яе можна часцей пачуць на вуліцах менавіта ў Мінску і абласных гарадах, носьбітамі родных моў становяцца асобы з больш высокім сацыяльным статусам. Для некаторых высокаадукаваных прыхільнікаў беларускай мовы, не згодных з сучаснай афіцыйнай арфаграфіяй, характэрна ўжыванне ў пісьмовым маўленні гістарычнага беларускага правапісу, так званай "тарашкевіцы".

Адлюстравана парадаксальная асаблівасць моўнага становішча Гродзенскай вобласці: па выкарыстанні беларускай мовы яна стаіць на першым месцы сярод рэгіёнаў Беларусі. Неверагодна, але высокая канцэнтрацыя польскага насельніцтва спрыяе павелічэнню частотнасці ўжывання беларускай мовы ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі. Большая частка палякаў (58 %) роднай мовай назвала беларускую. Па меры набліжэння да мяжы з Расіяй назіраецца зніжэнне частотнасці выкарыстання беларускай мовы, што пацверджана статыстычнымі данымі па Магілёўскай вобласці.

На аснове аналізу статыстыкі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання апошніх гадоў і рэгіянальных даных па Магілёўшчыне ўстаноўлена тэндэнцыя зніжэння папулярнасці беларускай мовы сярод моладзі. Прычыны трэба шукаць у тым, што веданне роднай мовы не з'уляецца вострай неабходнасцю ў краіне з афіцыйным двухмоўем.

Ва ўмовах доўгачасовага пражывання на адной тэрыторыі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, існавання побач некалькіх моўных сістэм адбываецца ўзаемаўплыў і ўзаемапранікненне іх культур, што спрыяе фарміраванню агульных каштоўнасцей і самасвядомасці, уздзейнічае на моўнае ўсведамленне, а таксама прыводзіць да ўзнікнення добрасуседскіх адносін, да міжнацыянальнай згоды ў краіне і ідэнтыфікацыі насельніцтва як часткі адзінага цэлага – народа Рэспублікі Беларусь. Аднак у гэтай з'явы ёсць і адваротны бок: славутая беларуская талерантнасць можа прывесці да зніжэння зацікаўленасці, нават індыферэнтнасці, у моўных пытаннях. На сучасны момант асэнсаванне беларускай самасвядомасці па лінгвістычнай прыкмеце не з'яўляецца дамінуючым ва ўсведамленні беларусаў.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У выніку комплекснага аналізу ўдзелу нацыянальных супольнасцей у грамадска-палітычным і культурным жыцці краіны намі вызначана іх роля ў забеспячэнні ўстойлівага пастпальнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі Рэспублікі Беларусь і зроблены наступныя абагульненні і высновы.

1 У Рэспубліцы Беларусь адсутнічалі сутыкненні і вострыя канфлікты на этнічнай, расавай, лінгвістычнай і канфесійнай аснове. Такое становішча тлумачыцца менталітэтам беларускага народа, гістарычнымі традыцыямі мірнага міжэтнічнага супрацоўніцтва, даўнімі і трывалымі сувязямі між этнічнымі групамі, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі, дзеючым заканадаўствам у сферы міжнацыянальных адносін і нацыянальна-дзяржаўнай палітыкай, а таксама адносна невялікай колькасцю прадстаўнікоў не славянскага насельніцтва.

У навейшай гісторыі Беларусі ва ўмовах пастпальнага развіцця беларускага грамадства Канстытуцыя і заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы міжнацыянальных адносін дазвалялі праводзіць у жыццё прынцыпы нацыянальнай палітыкі, накіраванай на адносна свабоднае развіццё культур, моў, традыцый усіх нацыянальных супольнасцей на аснове роўнасці, павагі і ўліку іх правоў і інтарэсаў, а таксама пэўнай падтрымкі з боку дзяржавы ў здзяйсненні дадзеных правоў. Гэта забяспечвалася разгалінаванай сістэмай дзеянняў дзяржаўных органаў улады ў галіне пратэкцыі правоў нацыянальных супольнасцей.

Рэспубліка Беларусь далучылася да асноўных міжнародных канвенцый, пактаў, пратаколаў, якія звязаны з правамі чалавека і чалавечым вымярэннем. Краіна развівала супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі ў сферы забеспячэння правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей. Знешнепалітычныя фактары аказвалі пэўны ўплыў на нацыянальна-дзяржаўную палітыку, якая праводзілася ў Рэспубліцы Беларусь.

У Рэспубліцы Беларусь была прынята нарматыўна-прававая база, якая стварала досыць камфортныя ўмовы для развіцця культур нацыянальных супольнасцей і задавальнення іх этнакультурных запатрабаванняў. Гэта ў першую чаргу Законы: “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь”, “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь”, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. У 1996 г. была распрацавана “Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі”, якая была пакладзена ў аснову правадзімай дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі.

2 Дзяржаўная падтрымка культурнай дзейнасці нацыянальных супольнасцей і кантроль за іх грамадскімі арганізацыямі актывізаваліся з

другой паловы 1990-х гг. пасля стварэння органаў, адказных за правядзенне нацыянальна-канфесійнай палітыкі: Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, які ўваходзіў у склад Міністэрства культуры, Кардынацыйнай рады па справах нацыянальных супольнасцей (1995–1997 гг.), Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей (1997–2001 гг.), у 2002–2006 гг. – Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, з 2006 г. – Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей. За апошнія 10 год статус дзяржаўнага органа вышэйшай выканаўчай улады, які каардынаваў узаемаадносіны дзяржавы з нацыянальнымі супольнасцямі, зніжаўся.

У практычнай дзейнасці органаў улады Рэспублікі Беларусь выразна бачна пераемнасць этнакультурнай палітыкі Беларусі ў адносінах да “нацыянальнай палітыкі” СССР. Тэрміналогія, канцэптуальная арганізацыя кіравання разнастайнасцю і аперацыянальныя падыходы да яе, якія сфарміраваліся ў савецкі перыяд і выразна сфармуляваныя ў канцы 1980-х гадоў, засталіся ў цэлым без змен, што дазваляе зрабіць выснову пра вызначальную ролю савецкай ідэалагічнай і інстытуцыянальнай спадчыны ў кіраванні этнакультурнай разнастайнасцю ў перыяд навейшай гісторыі Беларусі.

Актывізацыя сувязей з грамадскімі аб’яднаннямі нацыянальных супольнасцей Беларусі і дыяспарамі беларусаў у замежжы, падтрымка іх дзейнасці была выклікана спробамі ўладаў Рэспублікі Беларусь пераадолець крызіс у знешнепалітычных стасунках з шэрагам краін, а таксама для наладжвання і паляпшэння эканамічных, палітычных адносін з краінамі паходжання нацыянальных супольнасцей Беларусі і знаходжання дыяспар беларусаў.

У аблвыканкамах і Мінскім гарвыканкаме дзейнічалі саветы (аддзелы) па справах рэлігій і нацыянальнасцей, якія займаліся пытаннямі рэалізацыі этнаканфесійнай палітыкі дзяржавы ў рэгіёнах і сачылі за выкананнем заканадаўства ў дадзенай сферы на месцах. У структурах Міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі працавалі спецыялісты, якім было даручана аказваць дапамогу грамадскім нацыянальна-культурным аб’яднанням. З 1994 г. працаваў Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур.

Дзяржава ў пэўнай ступені стымулявала культурна-асветніцкія ініцыятывы нацыянальных супольнасцей і арганізоўвала мерапрыемствы сумесна з дзяржаўнымі органамі і ўстановамі. Прыярытэт у дзейнасці адпаведных дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь атрымоўвалі праекты, праграмы і мерапрыемствы, якія мелі інтэрнацыянальны і міжкультурны характар, былі накіраваны на здзяйсненне і развіццё міжнацыянальнага дыялогу.

На базе некаторых агульнаадукацыйных школ, пазашкольных, клубных, бібліятэчных устаноў сістэм Міністэрства адукацыі і

Міністэрства культуры па ініцыятыве прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей былі ўтвораны школы, класы, факультатывы, гурткі па навучанню і выхаванню на роднай мове, даследаванню гісторыі і культуры дадзенай супольнасці.

3 На правядзенне нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі Беларусі аказвалі ўплыў як дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей, так і стан грамадства ў Беларусі. Нягледзячы на адсутнасць антаганістычных сутычак і канфліктаў на этнічнай, расавай, лінгвістычнай і канфесіянальнай аснове, у Беларусі былі пэўныя праблемы ў міжнацыянальных адносінах. Пры станоўчым разуменні агульначалавечых каштоўнасцей у часткі грамадзян нашай краіны заўважаліся пэўныя праявы нацыянальнага экстрэмізму, у тым ліку і з боку лідараў асобных нацыянальных аб’яднанняў. Заўважаліся праявы антысемітызму. Былі складанасці ў адносінах з польскай супольнасцю. Існавалі пэўныя непаразуменні і канфлікты паміж органамі ўлады і аб’яднаннямі нацыянальных супольнасцей, пераважна на мясцовым узроўні. Усе выпадкі праяўлення ксенафобіі, экстрэмізму і нецярпімасці не заставаліся без належнага рэагавання адпаведных дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь. Некаторыя праблемы былі выкліканы і статусам грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі.

Можна вылучыць некалькі этапаў у фарміраванні і развіцці нацыянальнай палітыкі Рэспублікі Беларусь:

1) першая палова 1990-х гг. – гэта перыяд ідэнтыфікацыі і актывізацыі, найвышэйшага ўзроўню грамадскай дзейнасці нацыянальных супольнасцей. У гэты час нацыянальная і рэлігійная палітыкі дзяржавы прытрымліваліся ліберальнай мадэлі нацыянальна-канфесійных адносін. Праводзілася палітыка неўмяшальніцтва ў дзейнасць грамадскіх нацыянальна-культурных арганізацый. Была створана прававая база, якая забяспечыла спрыяльныя ўмовы для свабоднага развіцця ўсіх культур нацыянальных супольнасцей Беларусі. Асноўная ўвага дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь была накіравана на развіццё адукацыі нацыянальных супольнасцей на іх родных мовах. На піке беларусізацыі значна ўзрасла колькасць беларускамоўных школ і школ, дзе вывучалася мова нацыянальных супольнасцей. Паступова фарміраваліся элементы грамадзянскай супольнасці і актывісцкага тыпу палітычнай культуры насельніцтва, арыентаванай на рынак і канкурэнтную барацьбу.

2) з 1996 г. – нацыянальная палітыка Рэспублікі Беларусь была накіравана на вырашэнне праблем забеспячэння правоў нацыянальных супольнасцей, задавальнення этнакультурных запытаў насельніцтва. Гэты этап характарызуецца паступовым адыходам ад ліберальнай да мадэлі супрацоўніцтва (каапераціцыйнай мадэлі) дзяржаўна-нацыянальных адносін, калі дзяржава пачынае ўзаемадзейнічаць з пэўнымі нацыянальнымі арганізацыямі, вылучаючы іх на падставе ўплыву на фарміраванне

духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Адпаведна прасочваецца памяншэнне актыўнасці з боку як асобных прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, так і НГА.

3) з пачатку 2000-х гг. у нацыянальнай палітыцы Рэспублікі Беларусь заўважаецца імкненне да кантролю, унармавання і рэгулявання грамадскай дзейнасці, пераважае падтрымка інтэрнацыянальнага і выкарыстоўванне праграмных метадаў працы. Нацыянальна-дзяржаўныя дачыненні ў краіне развіваюцца па шляху пераходу да інтэграцыйнай мадэлі ўзаемаадносін у кірунку пратэкцыі правоў нацыянальных супольнасцей. Заўважаецца рэзкае звужэнне функцыянавання беларускай мовы і моў нацыянальных супольнасцей на карысць рускай. Выразна акрэслілася тэндэнцыя да зніжэння прэстыжу роднай мовы, нават у якасці этнічнага сімвала.

Аналіз крыніц дазваляе сцвярджаць, што структуры прадстаўнічай і выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь прымалі рашэнні ўзважана, з улікам дзяржаўных інтарэсаў, а таксама грамадска-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы. Нацыянальная палітыка дзяржаўнай улады насіла характар пратэкцыянізму і здзяйснялася ў цэлым выверанымі, прадуманымі крокамі, пры наяўнасці пэўных недахопаў, якія можна выправіць. У дзеяннях уладаў прасочвалася схіленне да комплекснага вырашэння існуючых праблем нацыянальных супольнасцей. У выніку правядзення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі, якая забяспечвала задавальненне культурна-асветных і грамадскіх запатрабаванняў нацыянальных супольнасцей з улікам агульнанацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, у грамадстве склаліся стабільныя міжнацыянальныя адносіны.

4 У Рэспубліцы Беларусь сфарміравалася такая мадэль дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных супольнасцей, пры якой вядучая роля адводзілася дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, якія былі створаны іх прадстаўнікамі, пры фінансавай, прававой, арганізацыйнай падтрымцы і кантролю з боку дзяржаўных структур.

У Беларусі ствараліся і дзейнічалі грамадскія аб'яднанні нацыянальных супольнасцей, як міжнародныя, так і рэспубліканскія, рэгіянальныя. Статуты і планы працы значнай часткі грамадскіх аб'яднанняў былі падобныя з пункту гледжання мэт і задач. Яны ажыццяўлялі культурна-асветніцкія, дабрачынныя і адукацыйныя праграмы пры падтрымцы рэспубліканскіх і муніцыпальных улад. Дзейнасць НГА была накіравана на вывучэнне гісторыі, культуры, мастацтва сваіх народаў, правядзенне сустрэч, семінараў, свят, фестываляў, выстаў, канферэнцый, наладжванне сувязей з краінамі іх паходжання. Усё гэта спрыяла адраджэнню і фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Гэтаму таксама садзейнічала дабрачыннасць, абарона сацыяльных і эканамічных правоў. Найбольш актыўнымі з'яўляліся яўрэйскія і польскія грамадскія фарміраванні.

Выяўлена заканамернасць, што пры паступальным развіцці беларускага грамадства сваё імкненне да творчай самарэалізацыі, задавальнення нацыянальных запатрабаванняў прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей Беларусі рэалізоўвалі, выкарыстоўваючы ў поўным аб'ёме магчымасці ў культурна-асветніцкай сферы. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць творчых і мастацкіх самадзейных калектываў, якія былі створаны і дзейнічалі пры нацыянальных аб'яднаннях і дзяржаўных установах культуры. Таму такімі масавымі, яскравымі і разнастайнымі былі фестывалі нацыянальных культур. Неабходна адзначыць, што ў пэўных рэгіёнах жаданне паказаць культуру нацыянальных супольнасцей, якія пражывалі на іх тэрыторыі, прыводзіла да таго, што зусім не было бачна беларускай. Сітуацыя стала выпраўляцца ў апошнія два-тры гады.

Узнікненне і дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў – гэта ініцыятыва прадстаўнікоў этнічных супольнасцей з больш высокім сацыяльным статусам. Дзейнасць нацыянальных грамадскіх арганізацый была сканцэнтравана пераважна ў гарадах і ўзровень іх актыўнасці ва ўсходнім рэгіёне Рэспублікі Беларусь быў значна ніжэй, чым у заходнім. Некампактнасць пражывання нацыянальных супольнасцей ва ўсходняй частцы Беларусі абумоўлівала нязначны ўплыў на насельніцтва гэтага рэгіёна НГА і памяншала верагоднасць узнікнення праблем у нацыянальных адносінах. Наогул насельніцтва краіны ў пераважнай большасці не было знаёма з дзейнасцю грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі і ўважала за сферу іх інтарэсаў і дзейнасці толькі культурна-асветніцкую працу. У той жа час дзейнасць некаторых грамадскіх арганізацый палякаў, рускіх і ўкраінцаў у пэўныя перыяды навейшай гісторыі Рэспублікі Беларусь насіла неканструктыўны характар.

Існуючы фактычны матэрыял, які даступны даследчыку, дазваляе казаць аб тым, што НГА не заўжды мелі магчымасць аказваць дастатковы ўціск на дзяржаўную ўладу для прыняцця рашэнняў па эфектыўнай рэалізацыі сваіх праў. Актыўная грамадская дзейнасць НГА, за выключэннем культурнай сферы, рашуча перарывалася органамі дзяржаўнага кіравання.

Варта падкрэсліць залежнасць кірункаў дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў ад палітыцы дзяржавы і тыпу палітычнага рэжыму ў Рэсубліцы Беларусь. У краіне паступова адбывалася ўзнаўленне сістэмы кантролю, нагляду і рэгламентацыі ўсіх сфер дзейнасці нацыянальных супольнасцей. Яна была накіравана на падпарадкаванне дзейнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый дзяржаве. Адначасова дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей садзейнічала працэсу фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.

5 У Беларусі не існуе досыць сур'ёзных аб'ектыўных падстаў для міжнацыянальных канфліктаў. У эканоміцы, банкаўскай справе няма

нацыянальных кланаў, якія б дыктавалі свае правілы ўсяму грамадству, у рэлігійнай сферы усталявалася пэўная этнаканфесійная згода, дэтэрмінаваная як дзяржавай, так і светапоглядная культурай грамадзян. У Рэспубліцы Беларусь у наш час назіраецца стабільнасць трансфармацыйных працэсаў у этнаканфесійным асяроддзі. Гэта з'яўляецца несумненным дасягненнем знешняй і ўнутранай дзяржаўнай палітыкі і ідэалагічнай працы. Аднак у беларускім грамадстве існуе "прыхаваная нацыянальная нецярпімасць" да цыган, асоб "каўказскай і азіяцкай" нацыянальнасцей, яўрэяў. І ёсць небяспека таго, што пры складанай палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў Беларусі, у агульнай масе насельніцтва з'явіцца значная колькасць актыўных асоб, якія паспрабуюць вырашыць свае праблемы шляхам нацыянальных абвінавачванняў, пошукам ворагаў па нацыянальных прыкметах.

Этнічны радыкалізм сярод некаторай часткі насельніцтва Беларусі прысутнічае і не паменшыўся, ва ўсякім выпадку, за перыяд нашых назіранняў з 1997 г. У якасці сацыялагічных індыкатараў этнічнага радыкалізму былі ўжыты варыянты адказаў у ананімнай анкеце пра розныя забаронныя меры ў адносінах да прадстаўнікоў нетытульных нацый, а таксама згода рэспандэнтаў з прапановай высяліць іх з Беларусі сілай ці нават вынішчыць фізічна. У прыватнасці, было высветлена, што забарону на заняцце важных адміністрацыйных пасад выхадцамі некарэнных народаў цалкам ці збольшага падтрымае больш 50 % нашых суграмадзян, забарону на куплю зямлі і нерухомасці для чужынцаў ухваляць каля паловы суайчыннікаў. Абмежаванне прадстаўнікоў нацсупольнасцей па месцах пражывання станоўча ўспрымуць больш траціны жыхароў Беларусі. Супраць змешаных шлюбаў выступіў кожны чацвёрты ўдзельнік апытвання. За гвалтоўнае высяленне за межы Беларусі прадстаўнікоў шэрагу нацый выказаўся кожны пяты наш зямляк. А ксенафобія ў рэцыдыўнай форме зафіксавана ў 6,2 % рэспандэнтаў, якія лічаць магчымым фізічнае знішчэнне прадстаўнікоў некаторых этнасаў. Усё гэта сведчыць аб наяўнасці ў глыбінях грамадскай падсвядомасці сучасных жыхароў Беларусі першабытных этнічных забабонаў, у тым ліку і бацыл этнічнага радыкалізму. Закрываць вочы на гэтыя навукова абгрунтаваныя факты надзвычай небяспечна. Яскравым доказам таму служаць шматлікія гістарычныя і сучасныя падзеі, уключаючы і тыя, што адбываюцца ў непасрэднай блізкасці ад межаў нашай краіны. Мы паспрабавалі зразумець прычыны, якія ляжаць у падставе этнічнай нецярпімасці.

Устаноўлена заканамернасць актуалізацыі праблематыкі этнічнай нецярпімасці ў залежнасці ад дэмаграфічных, эканамічных, палітычных і тэхніка-тэхналагічных фактараў. Менавіта ў навейшай гісторыі праблематыка этнічнай дыскрымінацыі выступае ў першы шэраг найбольш грамадска значных праблем. Узровень нецярпімасці людзей да прадстаўнікоў іншых этнасаў быў тым вышэй, чым далей у глыбіню

гісторыі мы апускаем свой позірк. Сучаснасць дае нам яркія прыклады міжэтнічнай талерантнасці. Аднак менавіта ў цяперашнія часы праблематыка этнічнай дыскрымінацыі выступае ў першы шэраг найбольш значных грамадскіх праблем. Зразумець гэты парадокс можна толькі ў кантэксце асаблівасцей дэмаграфічных, эканамічных, тэхніка-тэхналагічных і палітыка-прававых працэсаў, якія адбываюцца з сярэдзіны XX стагоддзя. Фактарны аналіз прычын актуалізацыі праблематыкі этнічнай нецярпімасці дазволіў вызначыць асноўныя напрамкі процідзеяння дыскрымінацыі на нацыянальнай глебе.

Галоўнай перадумовай устанаўлення міжнацыянальнай гармоніі выступае прававая дзяржава. Вяршэнства закона, а не жыццё "па паняццях", выкараненне карупцыйных каналаў "вырашэння пытанняў" чыноўнікамі выступаюць той мінімальнай умовай паспяховага процідзеяння этнічнай нецярпімасці, без якой усе размовы аб дасягненні міжнацыянальнай гармоніі пазбаўлены сэнсу.

Прававая дзяржава – гэта ўсяго толькі агульны фон, які забяспечвае захаванне правоў грамадзян усіх нацыянальнасцей. Але дзяржава абавязана і непасрэдным чынам удзельнічаць у ліквідацыі рэшткаў этнічнай дыскрымінацыі. Мы лічым мэтазгодным сфарміраваць дарадчыя органы пры першых кіраўніках дзяржавы і рэгіёнаў, у складзе якіх працавалі б спецыяльныя камісіі па прадухіленні міжэтнічнай напружанасці. Такія саветы маглі б ажыццяўляць антыдыскрымінацыйную экспертызу кіраўніцкіх рашэнняў, якія прымаюцца на ўсіх узроўнях, ініцыіраваць абмеркаванне метадаў вырашэння міжнацыянальных праблем, якія ўзнікаюць час ад часу, прапаноўваць канкрэтныя рэкамендацыі па іх ліквідацыі.

Роля дзяржавы ў забеспячэнні міжнацыянальнай гармоніі надзвычай важная. Аднак не менш істотны ўдзел у гэтай працы грамадзянскай супольнасці. На фоне высокай антыдыскрымінацыйнай актыўнасці грамадскасці Еўропы і нават Расіі грамадзянская супольнасць Беларусі выглядае бледна. Лічым мэтазгодным на базе рэспубліканскага і абласных саветаў грамадскіх аб'яднанняў стварыць камітэт з прадстаўнікоў нацыянальных рухаў з мэтай каардынацыі і арганізацыйнага забеспячэння праваабарончай дзейнасці ў сферы процідзеяння дыскрымінацыі на этнічнай глебе. Правядзенне такой працы з удзелам дзяржавы і арганізаванай грамадскасці дазволіць прадухіліць стыхійныя міжнацыянальныя канфлікты.

Аналіз прычын міжнацыянальных канфліктаў, якія адбыліся ў Расіі, прывёў да нашай наступнай рэкамендацыі. Лічым неабходным публічна абмеркаваць мэтазгоднасць увядзення паняцця "этнічна абумоўленая манаполія" (або любога іншага блізкага па значэнні тэрміна) для абазначэння сітуацыі, калі нейкі этнас займае непрапарцыянальна сваёй колькасці ў структуры насельніцтва месца на рынку працы, тавараў, паслуг

і капіталаў, што перашкаджае сумленнай канкурэнцыі ў сферы эканомікі і правакуе міжэтнічную напружанасць. У тэксце справаздачы абгрунтаваны неабходнасць і абмежаванні прымянення на практыцы гэтай прапановы.

У незалежнасці ад таго, у якой меры будуць прынятыя нашы рэкамендацыі, лічым сам факт абмеркавання праблематыкі этнічнай нецярпімасці і шляхоў процідзеяння яму надзвычай важным і прадуктыўным.

6 Найбольшы рост колькасці рэлігійных арганізацый у асяродку нацыянальных супольнасцей адбываўся ў першай палове 1990-х гг. У сярэдзіне 1990-х гг. назіраецца стабілізацыі росту ліку рэлігійных абшчын, адначасова стабілізуецца колькасць грамадзян краіны, якія прылічвалі сябе да веруючых. З канца 1990-х гадоў назіраецца – паніжэнне дадатнай дынамікі росту колькасці рэлігійных арганізацый. У цяперашні час на рэлігійнай прасторы краіны адбылося насычэнне рэлігійнымі арганізацыямі, і тэмпы штогадовага прыросту рэлігійных абшчын знізіліся амаль у 4 разы ў параўнанні з першай паловай 1990-х г.

У Рэспубліцы Беларусь адзначалася ўзнаўленне сістэмы кантролю і рэгламентацыі ўсіх сфер дзейнасці рэлігійных аб'яднанняў, якая была накіравана на падначаленне дзейнасці рэлігійных арганізацый дзяржаве, з мэтай выкарыстання іх уплыву ў грамадстве для падтрымання стабільнасці і парадку, выхавання падрастаючых пакаленняў на традыцыях беларускага народа.

У выніку па меры ўмацавання Беларускай дзяржавы адбылася стабілізацыя рэлігійнага поля. Агульнай для рэлігійнай прасторы сучаснай Беларусі з'яўляецца сітуацыя рэлігійнай стабільнасці, якая праяўляецца ў значным зніжэнні тэмпаў прыросту колькасці рэлігійных арганізацый і "веруючых". Варта адзначыць, што рост колькасці рэлігійных арганізацый не быў дапоўнены якасным станам рэлігійнасці насельніцтва, якаснай культавай практыкай, у прыватнасці "воцерковлением" насельніцтва (што датычыцца галоўным чынам дамінуючых хрысціянскіх канфесій і ў першую чаргу праваслаўя), гэта шмат у чым абумоўлена практычным знікненнем традыцыі ў выніку шматгадовай барацьбы з рэлігіяй.

7 Своеасаблівасць моўнай сітуацыі ў тым, што асноўным сродкам зносін большасці беларусаў з'яўлялася руская мова, хаця пераважная колькасць насельніцтва Рэспублікі Беларусь называла нацыянальную мову роднай.

Статыстычныя даныя пацвярджаюць залежнасць паміж дзяржаўнай палітыкай у моўнай сферы і функцыямі нацыянальнай мовы ў жыцці беларускага народа. На ўздыме беларусізацыі назіралася павелічэнне ў працэнтных суадносінах колькасці грамадзян, якія лічылі роднай мовай беларускую, а таксама карысталіся ёй ў паўсядзённым маўленні. І наадварот: за апошняе дзесяцігоддзе канстатуецца рэзкае звужэнне функцыянавання беларускай мовы і як сродку камунікацый у розных

сферах, і як сімвала нацыі, дыферэнцыйнай прыкметы этнасу. На піке беларусізацыі значна ўзрасла колькасць беларускамоўных школ, а таксама і колькасць школ з дзвюма мовамі навучання, а пасля агульнарэспубліканскага рэферэндуму 1995 г. пачала зніжацца. Адзначаная тэндэнцыя захоўваецца і на сучасным этапе.

У рэалізацыі нацыянальнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь улічваліся культурныя і адукацыйныя запатрабаванні нацыянальных супольнасцей і прыкладаліся намаганні па захаванню нацыянальных моў і арганізацыі навучання на родных мовах. У некаторых дзяржаўных вучэбных і выхаваўчых установах у адпаведнасці з пажаданнямі прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей было арганізавана вывучэнне шэрагу нацыянальных моў, навучанне і выхаванне на гэтых мовах. На базе агульнаадукацыйных школ, пазашкольных, клубных, бібліятэчных устаноў сістэм Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры па ініцыятыве нацыянальных супольнасцей былі ўтвораны школы, класы, факультатывы, гурткі па навучанню на роднай мове, даследаванню гісторыі і культуры нацыянальных супольнасцей. Адукацыйныя структуры з этнакультурным кампанентам забяспечваліся адпаведнымі падручнікамі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, па магчымасці, Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама краінамі гістарычнага паходжання. У ВНУ была арганізавана падрыхтоўка кадраў для гэтых школ. У той жа час, у краіне не існавала ў неабходнай колькасці паўнавартасных дзяржаўных нацыянальных школ (яўрэйскіх, татарскіх, цыганскіх і г. д.).

Насельніцтва Рэспублікі Беларусь па характары моўных паводзін адрозніваецца ад іншых краін двухмоўем асаблівага тыпу з моцнай перавагай рускай мовы, якая не з'яўляецца роднай для большай часткі карэнных жыхароў. Пераважная частка насельніцтва рэспублікі – пасіўныя білінгвы: разумеюць абедзве мовы, выдзяляюць патрэбную інфармацыю на слых і пры чытанні тэкстаў, але з цяжкасцю прымяняюць яе ў актыўным выкарыстанні. Таму ў маўленні многіх беларусаў можна заўважыць праявы руска-беларускай інтэрферэнцыі. Акрамя наяўнасці змешанай мовы, так званай "трасянкі", пры апісанні моўнай сітуацыі трэба ўлічыць уздзеянне на маўленне двух асноўных дыялектаў: паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга.

На аснове праведзенага аналізу даных апошняга перапісу насельніцтва ўстаноўлена залежнасць выкарыстання беларускай мовы ад месца пражывання, аднесенасці населенага пункта да горада ці вёскі. Сельскае насельніцтва значна больш за гарадское выкарыстоўвае беларускую мову. Чым буйнейшы населены пункт, тым радзей у ім прысутнічае беларускае маўленне. Самыя нізкія паказчыкі выяўлены ў сталіцы краіны. Гэта даныя статыстыкі. У той жа час найбольш беларуская мова выкарыстоўваецца і яе можна часцей пачуць на вуліцах менавіта ў Мінску і абласных гарадах, носьбітамі родных моў становяцца асобы з

больш высокім сацыяльным статусам. Для некаторых высокаадукаваных прыхільнікаў беларускай мовы, не згодных з сучаснай афіцыйнай арфаграфіяй, характэрна ўжыванне ў пісьмовым маўленні гістарычнага беларускага правапісу, так званай “тарашкевіцы”.

Адлюстравана парадаксальная асаблівасць моўнага становішча Гродзенскай вобласці: па выкарыстанні беларускай мовы яна стаіць на першым месцы сярод рэгіёнаў Беларусі. Высокая канцэнтрацыя польскага насельніцтва спрыяе павелічэнню частотнасці ўжывання беларускай мовы ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі. Устаноўлена заканамернаць: па меры набліжэння да мяжы з Расійскай Федэрацыяй назіраецца зніжэнне частотнасці выкарыстання беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці, а ў заходніх рэгіёнах Беларусі колькасць беларускамоўных носьбітаў павялічваецца.

На аснове аналізу статыстыкі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання апошніх гадоў і рэгіянальных даных па Магілёўшчыне ўстаноўлена тэндэнцыя зніжэння папулярнасці беларускай мовы сярод моладзі. Прычыны трэба шукаць у тым, што веданне роднай мовы не з’яуляецца вострай неабходнасцю ў краіне з афіцыйным двухмоўем.

Ва ўмовах доўгачасовага пражывання на адной тэрыторыі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, існавання побач некалькіх моўных сістэм адбываецца ўзаемаўплыў і ўзаемапранікненне іх культур, што спрыяе фарміраванню агульных каштоўнасцей і самасвядомасці, уздзейнічае на моўнае ўсведамленне, а таксама прыводзіць да ўзнікнення добрасуседскіх адносін, да міжнацыянальнай згоды ў краіне і ідэнтыфікацыі насельніцтва як часткі адзінага цэлага – народа Рэспублікі Беларусь. Аднак у гэтай з’явы ёсць і адваротны бок: славутая беларуская талерантнасць можа прывесці да зніжэння зацікаўленасці, нават індыферэнтнасці, у моўных пытаннях. На сучасны момант асэнсаванне беларускай самасвядомасці па лінгвістычнай прыкмеце не з’яўляецца дамінуючым ва ўсведамленні беларусаў.

Пры даволі высокай ступені самаідэнтыфікацыі беларусаў як асобнай нацыі, адна з самых галоўных прыкмет нацыі – родная мова народа – застаецца незапатрабаванай. Беларуская мова не выконвае сваёй ролі найважнейшага сродку этнічнай камунікацыі, але захоўвае іншае значэнне – сімвалічнай складовай этнічнай культуры і традыцыі.

Такім чынам, з моманту атрымання Рэспублікай Беларусь дзяржаўнай незалежнасці побач з адраджэннем культуры і нацыянальнага жыцця беларускага этнаса пачаўся і аналагічны працэс у большасці нацыянальных супольнасцей, якія жылі на тэрыторыі нашай дзяржавы. Дзяржава ў пэўнай ступені спрыяла развіццю культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія жылі ў краіне.

# БІБЛІЯГРАФІЯ


## Архіўныя крыніцы

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці

1 Фонд 254 Статыстычнае упраўленне Брэсцкай вобласці цэнтральнага статыстычнага упраўлення (ЦСУ) пры Савеце міністраў БССР

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці

2 Фонд 1966 Віцебскі абласны выканаўчы камітэт (савет народных дэпутатаў)

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці

3 Фонд 730 Аддзел народнай адукацыі Гродзенскага аблвыканкама

4 Фонд 1171 Гродзенскі абласны савет дэпутатаў працоўных і яго выканкам

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці

5 Фонд 9 Магілёўскі абкам кампартыі Беларусі

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці

6 Фонд 7. Магілёўскі абласны савет народных дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь

7 Фонд 4 п Цэнтральны камітэт КП(б)Б

8 Фонд 968 Вярхоўны савет Рэспублікі Беларусь

9 Фонд 974 Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Lietuvos valstybės naujasis archyvas (Літоўскі дзяржаўны новы архіў)

10 Фонд 78 Дэпартамент па нацыянальных меншасцях і літоўцам замежжа пры Ўрадзе Літоўскай Рэспублікі

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі

11 Фонд Р-9654 З’езд народных дэпутатаў СССР, Вярхоўны Савет СССР і іх органы

## Літаратура

12 Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь, 9.01.2006 г., № 98–3 // НРПА Респ. Беларусь. – 2006. – № 9. – 2/1195.

13 Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны: Указ Президента Республики Беларусь, 18 окт. 2007 г., № 527 // НРПА Респ. Беларусь. – 2007. – № 252. – 1/9038.

14 Аб правах дзіцяці: Закон Рэсп. Беларусь, 19 лістапада 1993 г., № 2570 – ХІІ // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 1993 г. – № 34. – Арт. 430.

15 Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях : Закон Рэспублікі Беларусь ад 17.12.1992 г., № 2054–XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1993. – № 2. – Арт. 18.
16 Аб унясенні змяненняў і дапайненняў у некаторыя Законы Рэспублікі Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 29 лістапада 1999 г., № 327–З // Ведамасці Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь 1999 г. – № 34–35. – Арт. 518.
17 Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях": Закон Рэсп. Беларусь, 31 кастрычніка 2002 г., № 137–З // НРПА. – 2002. – № 123. – 2/886.
18 Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях": Закон Рэсп. Беларусь, 17 студзеня 1995 г., № 3533 – XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995. – № 13. – Арт. 125.
19 Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік / Складальнік Н.В. Ходар. – Мінск: "Энцыклапедыкс", 2004. – 272 с.
20 Абраменко, Е.Г. Деятельность Национального собрания Республики Беларусь по регулированию межконфессиональных отношений в Республике Беларусь / Е.Г. Абраменко // Религия и общество – 6: актуальные проблемы свободы совести: сб. науч. статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилёв: УО "МГУ им. А.А.Кулешова", 2011. – С. 3–5.
21 Агеев, А.Г. и др. Перекрестки могилевской истории / А.Г. Агеев, Я.И. Климуть, И.А. Пушкин.– Минск: ООО «Туринфо», 2004. – 216 с.
22 Агеев, А.Г. История профсоюзного движения Могилёвщины / А.Г. Агеев, И.А. Пушкин. – Могилёв: УПКП «Могилёвская областная ўкрупнённая типография имени Спиридона Собаля», 2005. – 216 с.
23 Агееў, А.Р. Магілёў на скрыжаванні. – 2-е выд., перапрац. і дапоўн. / А.Р. Агееў, І.А. Пушкін. – Магілёў: Абласная друкарня, 2000. – 96 с.
24 Адукацыя і нацыянальна-культурнае адраджэнне: Тэз. навук. дакл. на Міжнар. канф. (25–26 кастр.1994 г., г. Мінск): У 2 ч. / Нац. ін-т адукацыі Рэсп.Беларусь, Нац. ін-т гуманітар.навук Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 1994. – Ч.1. – 120 с.; Ч.2. – 280 с.
25 Акинчиц, И.И. Конфессиональная политика в современной Беларуси / И.И. Акинчиц // Белорусская политология: многообразие в единстве: Материалы международ.науч.-практ.конф. – Гродно: Гр.ГУ, 2004. – С. 8–10.
26 Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 19–20 апреля 2007 г. / Вит. гос. ун-т.; редкол.: В.А. Космач (гл. ред.). – Витебск: Издательство УО "ВГУ им. П.М. Машерова", 2007. – Ч. I. – 480 с.
27 Алампиев, О.А. Восприятие выходцами из исламских стран сложностей интеграции в белорусском обществе / О.А. Алампиев // Религия и общество – 7: сб. науч. статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: УО "МГУ им. А.А. Кулешова", 2012. – С. 6–8.

28 Алейникова, С.М. Особенности регулирования конфессиональных отношений в Республике Беларусь: социально-правовой аспект / С.М.Алейникова // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : материалы Международной научной конференции, 8–9 декабря 2005 г., Гродно. – Гродно, 2006. – С.161–163.
29 Александров, К. Кто прав – Иосиф Сталин или Теодор Герцль / К. Александров // Истоки. – 2004 февраль. – С. 8.
30 Андреева, Е. Асвета і мова / Е. Андреева, Л. Лыч // Настаўніцкая газета. – 1990. – 11 ліпеня. – С. 3.
31 Антес, Петер. Религии современности. История и вера / П. Антес. – Москва: Прогресс–Традиция, 2001. – 304 с.
32 Бабосов, Е.М. Белорусская модель этнокультурного развития / Е.М. Бабосов // Философские проблемы бытия, познания, веры и культуры. – Минск, 2010. – С. 164–175.
33 Багданаў, І. Татары і башкіры: “Чышма” запрашае да супрацоўніцтва / І. Багданаў // Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы ІІІ Міжнар.кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цівілізацый” (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000г.) / Рэдкал.: Э.Дубянецкі (гал.рэд.) і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2001. – С. 201–203.
34 Бажэнаў, Ю.В. Асвятленне нацыянальных меншасцей Беларусі ў беларускіх энцыклапедычных выданнях / Ю.В. Бажэнаў // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У.І. Навіцкі, М.С. Сташкевіч. – Мінск: “Дэполіс”, 2001. – С. 369–372.
35 Базыленок, А.В. Общественные организации и объединения как фактор становления гражданского общества в Республике Беларусь / А.В. Базыленок // Белорусская политология: многообразие в единстве: Материалы международ. науч.-практ.конф. – Гродно: Гр.ГУ, 2004. – С. 16–18.
36 Балаўнёва, Л. Фарміраванне і дзейнасць нацыянальна-культурных арганізацый беларускай дыяспары ў Латвіі / Л. Балаўнёва // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 5. – С. 74–77.
37 Бандарчык, В. Атлас “Народы Беларусі” як адна з крыніц вывучэння нацыянальных меншасцей Рэспублікі / В.Бандарчык // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб.навук.прац. Кн.1 / Нав.рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. – С. 67–71.
38 Барановский, Е.И. Динамичный характер национальных отношений в СССР / Е.И. Барановский // Коммунист Белоруссии. – 1986. – № 12. – С. 14–22.
39 Бараноўскі, Я. Нацыянальная палітыка / Я. Бараноўскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн., 1999. – Т. 5. – С. 307.
40 Бартош, О.Э. Проблемы этничной идентификации цыган Беларуси / О.Э. Бартош // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я. Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2010. – С. 152–154.
41 Барыс, С. Адраджэнне рэлігійнага жыцця ў Беларусі ў 1988–2003 гг. / С. Барыс // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 5. – С. 16–27.

42 Батяев, В.Ф. Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей) / В.Ф.Батяев // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. / БДПУ пад рэд. А. Кавалені. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 57–76.
43 Безнюк, Д.К. Государственно-конфессиональные отношения в Республике Беларусь / Д.К. Безнюк. – Минск: РИВШ, 2006. – 242 с.
44 Безнюк, Д.К. Этапы формирования национальной политики Республики Беларусь в делах религии / Д.К.Безнюк // Гуманітарна-эканамічны веснік. – 2004. – № 3. – С. 104–111.
45 Беларусіка = ALBARUTHENICA. [Кн.] 4: Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі / Міжнар. Асац. Беларусістаў, Нац. Навук. – асвет. Цэнтр імя Ф.Скарыны; Рэд.: В. Рагойша і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 381 с.
46 Беларусіка = ALBARUTHENICA. Кн. 3: Нацыянальная і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / Міжнар. Асац. Беларусістаў, Нац. Навук.– асветны цэнтр імя Ф. Скарыны; Рэд. А. Мальдзіс і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 431 с.
47 Беларуска-польскія культурныя сувязі ў 1945–1991 гадах / Ю. Вашкевіч. – Мінск: ООО “ТЕСЕЙ”, 2004. – 184 с.
48 Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё / В.К. Бандарчык, В.М. Белявіна, Г.І. Каспяровіч і інш.; Рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 433 с.
49 Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А.У. Гурко і інш.; Рэдкал.: В.М. Бялявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 606 с.
50 Беларусы: Этнагеаграфія, дэмаграфія, дыяспара, канфесіі. Атлас / Нав.рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск: Камітэт дзяржаўных знакаў пры Міністэрстве фінансаў Рэспублікі Беларусь, 1996. – 32 с.
51 Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал.: У.І. Навіцкі (гал.рэд.), М.П. Касцюк (нам.гал.рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – 434 с.
52 Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск: “БелЭн”, 2000. – 432 с.
53 Беларусь наш общий дом // Вечерний Могилёв. – 2004. – 22 сент. – С. 3.
54 Беларусь у міжваенны час: Метадычныя парады студэнтам / Складальнік І.А. Пушкін. – Магілёў: УА “МДУХ”, 2003. – 12 с.
55 Беларусь у XX стагоддзі. Вып.1. – Мінск: ”Водолей”, 2002. – 192 с.
56 Беспамятных, Н.Н. Белорусско-польско-литовское пограничье: вклад сторон в исследование проблемы / Н.Н. Беспамятных // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно / отв. ред. проф. М.А.Можейко. – Гродно: ГрГУ, 2006. – С. 19–28.
57 Беспамятных, Н.Н. Идентификационные процессы у русских как «нового меньшинства» белоруско-польско-литовского пограничья / Н.Н. Беспамятных, О.С. Плескач // Этносоциальные и конфессиональные

процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я.Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2010. – С. 171–174.
58 Беспамятных, Н.Н. Интерлокутивная методология как инструмент исследования пограничной идентичности / Н.Н. Беспамятных // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я. Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2012. – С. 261–266.
59 Беспамятных, Н. Политика управления этнокультурным разнообразием в Беларуси, Молдове и Украине: между советским наследием и европейскими стандартами / Н. Беспамятных, А. Василевич, А. Осипов, Ф. Прина, И. Пушкин. – Вильнюс: ЕГУ, 2014. – 300 с.
60 Беспамятных, Н.Н. Этнокультурное Пограничье и белорусская идентичность в условиях глобализации (проблемы методологии кросскультурных взаимодействий) / Н.Н. Беспамятных. – Гродно, 2009. – 320 с.
61 Билык, А.Н. Законодательное обеспечение прав лиц, принадлежащих к национальным меньшинствам, и его реализация в Республике Беларусь / А.Н. Билык, Ю.М. Уральский // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У.І. Навіцкі, М.С. Сташкевіч. – Мінск: “Дэполіс”, 2001. – С. 310–318.
62 Білык, А. Забяспячэнне праў нацыянальных меншасцей Беларусі ў святле заканадаўчых актаў / А. Білык // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн.1 / Нав.рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. – С. 34–37.
63 Бобрык, А. Поляки в Могилёвщине. Очерк проблематики / А. Бобрык // Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. – Магілёў: Могилёв.обл.укруп.тип., 2005. – С. 222–226.
64 Богуш, Т.А. Белорусское студенчество: политические предпочтения и ориентации / Т.А. Богуш, Н.Л. Мысливец // Белорусская политология: многообразие в единстве: Материалы международ. науч.-практ.конф. – Гродно: Гр.ГУ, 2004. – С. 20–26.
65 Болотова, Ю.Г. Субкультура белорусских цыган / Ю.Г. Болотова // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я. Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2010. – С. 324–329.
66 Боярчук, Т.Н. Культура мижэтнических отношений современного белорусского общества: теоретико-методологические аспекты исследования / Т.Н. Боярчук // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я. Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2012. – С. 391–395.
67 Боярчук, Т.Н. Этнонациональная и поликонфессиональная ситуация современной Гродненщины / Т.Н. Боярчук // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я. Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2010. – С. 148–152.
68 Броўкін, Я. Да пытання аб традыцыях аўтаноміі нацыянальных меншасцей на Беларусі / Я. Броўкін // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб.

навук. прац. Кн. 1 / Нав. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск – Віцебск, 1996. – С. 39–40.
69 Бубнаў, Ю.М. Паліталогія: Курс лекцый / Ю.М. Бубнаў, І.А. Пушкін. – Магілёў: УА “МДУХ”, 2006. – 176 с.
70 Бубнов, Ю. М. Социологический очерк потенциальной этнической нетерпимости в белорусском обществе / Ю.М. Бубнов // Вестник Брестского университета. Серия 1. Философия. Политология. Социология. – 2012. – № 1. – С. 129–138.
71 Бубнов, Ю.М. Легитимность государственной власти в Беларуси / Ю.М. Бубнов // Экономико-правовые, социально-политические и культурно-исторические аспекты развития регионов. Материалы Международной научно-практической конференции. Березники: Филиал УГЭГУ, 2011. – С. 214–219.
72 Бубнов, Ю.М. При каком политическом режиме хотят жить белорусы? / Ю.М. Бубнов // Освоение минеральных ресурсов Севера: проблемы и решения: Труды 10-й научно-практической конференции 11–13 апреля 2012 года / Воркутинский горный институт (филиал) ФГБ ОУ ВПО «Национальный минерально-сырьевой университет «Горный». – Воркута, 2012. – С. 592–597.
73 Бубнов, Ю.М. Социальная оценка общественной безопасности в Беларуси / Ю.М. Бубнов // Освоение минеральных ресурсов Севера: проблемы и решения: Труды 11-й Международной научно-практической конференции 11–12 апреля 2013 г. / Воркутинский горный институт (филиал) ФГБ ОУ ВПО «Национальный минерально-сырьевой университет «Горный». – Воркута, 2013. – С. 675–680.
74 Бубнов, Ю.М. Социальная потребность в гражданском обществе / Ю.М. Бубнов. // Гражданское общество как среда для реализации прав человека: Сборник материалов Международного научно-методологического семинара, Брест, 28–29 марта 2012 г. / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина, науч. ред. И.И. Котляр. – Брест: БрГУ, 2012. – С. 30–33.
75 Бубнов, Ю.М. Социологическая индикация этнического радикализма / Ю.М. Бубнов // Нижегородский музей. Специальный выпуск. – Нижний Новгород, 2013. – С. 46–53.
76 Бубнов, Ю.М. Социологический метод индикации этнического радикализма / Ю.М. Бубнов // Социология. Научно-теоретический журнал. – 2013. – № 1. – С. 81–93.
77 Бубнов, Ю.М. Формы этнической дискриминации / Ю.М. Бубнов // Молодёжная галактика: Ежегодный Альманах НИИКСИ Санкт-Петербургского государственного университета. – СПб. – 2013. – № 9 – С. 88–92.
78 Буко, С. Республика Беларусь – страна межнацинального мира и согласия / С.Буко // Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік / Складальнік Н.В. Ходар. – Мінск: “Энцыклапедыкс”, 2004. – С. 3–5.
79 Бунас А.У. Моўная палітыка ў галіне народнай адукацыі (1990–2010 гг.) // История, философия, политика, право: Научные труды преподавателей гуманитарных дисциплин / Могилёвский государственный университет

продовольствия; БИП – Институт правоведения; под общ. ред. В.Д. Выборного, А.А. Скикевича, В.В. Юдина. – Вып. 2. – Могилев, 2012. – С. 16–20.
80 Бунас, А.У. Асаблівасці беларускай самасвядомасці і роля нацыянальнай мовы ў фарміраванні этнічнай самаідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва / А.У. Бунас // Гуманитарный альманах: сборник статей. – Могилёв: МГУП. – 2013. – С. 88–100.
81 Бунас, А.У. Асаблівасці самаідэнтыфікацыі беларускага грамадства / А.У. Бунас // История, философия, политика, право: Научные труды преподавателей гуманитарных дисциплин / Могилёвский государственный университет продовольствия; БИП – Институт правоведения; под общ. ред. В.Д. Выборного, А.А. Скикевича. – Вып. 3. – Могилев, 2013. – С. 22–26.
82 Бунас, А.У. Беларуская мова ў жыцці сучаснага беларуса / А.У. Бунас // Социальное знание и белорусское общество: материалы международной научно-практической конференции, г. Минск, 3–4 декабря 2009 г. – Минск: Право и экономика, 2009. – С. 258–260.
83 Бурая, Н.В. Напрамкі дзейнасці яўрэйскіх арганізацый на Беларусі на сучасным этапе развіцця / Н.В. Бурая // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно / отв. ред. проф. М.А. Можейко. – Гродно: ГрГУ, 2006. – С.191–193.
84 Бурая, Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) / Н.В.Бурая // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2007. – № 1. – С. 46–49.
85 Бушчык, Г.П. Стан гандлёва-эканамічных сувязяў Рэспублікі Беларусь з Украінай у 1992–2002 гг. / Г.П. Бушчык // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У.І. Навіцкі (гал.рэд.), М.П. Касцюк (нам.гал.рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 398–401.
86 Быков, К. Белорусы и чуваши / К.Быков // Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цівілізацый” (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / Рэдкал.: Э. Дубянецкі (гал.рэд.) і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2001. – С. 213–218.
87 Бяспамятных, М.Н. Літоўцы Гродзенскай вобласці: праблемы этнакультурнай ідэнтыфікацыі / М.Н. Беспамятных // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У.І. Навіцкі, М.С. Сташкевіч. – Мінск: “Дэполіс”, 2001. – С. 336–339.
88 Валахановіч, А. Нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі / А.Валахановіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн., 1999. – Т. 5. – С. 310–311.
89 Взаимодействие с общественными объединениями // Материалы по итогам управления идеологической работы Могилевского облисполкома в 2008 году. – Могилев: УПКП «Могилевская областная укрупненная типография им. Спиридона Соболя», 2009. – 134 с.
90 Вишневский, А.Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917–1995) / А.Ф. Вишневский. – Минск: ТПА “Форум” , 1995. – 266 с.

91 Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава. Падзеі. Людзі. Лёсы / Пад рэд. А.У. Русецкага, А.М. Дарафеева. – Віцебск: ВДУ, 1998. – 224 с.
92 Войницкий, П.В. Некоторые аспекты взаимовлияния ўкраинской и белорусской школ скульптуры на современном этапе / П.В. Войницкий // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У.І. Навіцкі (гал.рэд.), М.П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 382–385.
93 Володько, Л. «Русское общество» в Могилеве / Л. Володько // Веснік Магілёва. – 2010. – 2 крас. – С. 2.
94 Вопросы меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире / Европейский центр по вопросам меньшинств; сост., авт. предисл. А. Оипов, А. Василевич. – Минск: Медисонт, 2012. – 200 с.
95 Вопросы свободы совести и религиозных организаций в Республике Беларусь: Сборник документов и материалов / Авт.-сост. М.В. Цвилик; Под ред. В.И. Новицкого. – Минск: Издательство «Четыре четверти», 2005. – 336 с.
96 Выборный, В.Д. Беларусь–Украина: возможности и перспективы сотрудничества и интеграции / В.Д. Выборный, С.С. Толкачёва // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У.І. Навіцкі (гал.рэд.), М.П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 363–365.
97 Выборный, В.Д. Деятельность общественных объединений Могилевской области по формированию гражданского общества / В.Д. Выборный, Т.Б. Шайтуро // Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20–21 мая 2010 г., Могилев / УО «МГУП»; редкол.: Ю.М. Бубнов (отв.ред.), Т.Г. Бобкова, И.А. Пушкин, В.Л. Рожковский, В.В. Юдин. В 2 ч. Ч. 2. – Могилев: УО «МГУП», 2010. – С. 32–36.
98 Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы: Бібліяграфічны даведнік / Пад рэд. В.М. Чарапіцы. – Гродна: ГрДУ, 1999. – 595 с.
99 Вялікі, А.Ф. Палякі ў савецкай Беларусі: ”дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.) / А.Ф. Вялікі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У.І. Навіцкі, М.С. Сташкевіч. – Мінск: “Дэполіс”, 2001. – С. 292–297.
100 Галіновая праграма “Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.” / Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь. – Мінск: БелДІПК, 2002. – 168 с.
101 Ганбаров, Б.А. Азербайджанская диаспора в Республике Беларусь: организационная структура, социально-экономическое положение и основные направления деятельности (1989–2013 г.) / Б. А. Ганбаров. – Минск : Донарит, 2014. – 231 с.
102 Гембіцкая, М. Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі / М. Гембіцкая // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 11. – С. 34–39.

103 Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т.6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л.Лыч і інш.; рэд. калегія: М.Касцюк (гал. рэд.). – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.
104 Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / М.У. Смяховіч і інш.; рэдкал.: А.А.Каваленя і інш; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 654 с.
105 Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай навуковой канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" у 2 ч. / Уклад І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. – Магілеў, 2003. – Ч. II. – 280 с.
106 Горбач, Т. К вопросу о судьбах немцев Беларуси: Возрождение немецкой культуры (90-е годы XX в.) / Т.Горбач // Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цівілізацый" (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / Рэдкал.: Э.Дубянецкі (гал.рэд.) і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2001. – С. 159–163.
107 Государственная идеология Республики Беларусь: концептуальные основы. – 3-е изд., испр. и доп. / В.А.Мельник. – Минск: ООО"ТЕСЕЙ", 2004. – 256 с.
108 Государство для народа : Доклад Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко // Государство для народа: документы и материалы Третьего Всебелорусского собрания, 2–3 марта 2006 года, Минск / редкол.: А.Н. Рубинов и др. – Минск: Беларусь, 2006. – С. 9–74.
109 Гражданское общество и государство (очерки теории и практики взаимодействия) / Е.М. Бабосов и др.; под общ. ред. Ю.М. Бубнова. – Могилев: МГУП, 2014. – 294 с.
110 Грамадзянская супольнасць і праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ў Беларусі. Матэрыялы навукова-практычнага семінара (Мінск, 30–31 мая 1996 года). – Брэст: Рэдакцыя газеты "Шлях", 1996. – 72 с.
111 Грэкі ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2001. – № 1. – С. 48–52.
112 Гурко, А.В. Конфессиональная ситуация в Республике Беларусь: этнический и исторический аспекты / А.В. Гурко. – Минск, 2001. – 102 с.
113 Гурко, А.У. Беларуская этналогія ў XXI стагоддзі: праблемы і перспектывы / А.У. Гурко // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2009. – № 1. – С. 80–85.
114 Давыденко-Кучинская, С.С. Государственная политика в отношении религиозных организаций в Беларуси / С.С. Давыденко-Кучинская // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я.Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2012. – С. 160–164.
115 Дарашэвіч, Э. Этнаканфесіянальныя ўзаемаадносіны ў кантэксце нацыянальнай і культурнай палітыкі / Э. Дарашэвіч // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб.навук.прац. Кн.1 / Нав. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. – С. 62–64.
116 Дашкевич, В. Гражданское согласие и национальная безопасность Беларуси: этнокультурный аспект / В. Дашкевич // Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. Материалы междунар. науч. конф. Минск, 9–10

февраля 1995 г. / Серия “Общественно-политические науки”. – М.: Издательство “Право и экономика”, 1995. – С. 245–248.

117 Дашкевіч, А.Л. Грамадскія аб’яднанні як суб’екты канстытуцыйна-прававых адносін у Рэспубліцы Беларусь / А.Л. Дашкевіч // Право и демократия: сб. науч. тр. Вып. 21 / редкол. В.Н. Бибило (гл. ред.). – Минск: БГУ, 2010. – С. 33–42.

118 Денисюк, Н. Национальные отношения и государственность / Н. Денисюк // Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. Материалы междунар. науч. конф. Минск, 9–10 февраля 1995 г. / Серия “Общественно-политические науки”. – М.: Издательство “Право и экономика”, 1995. – С. 283–287.

119 Дзяржаўная праграма “Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.” / Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь; нав. рэд. У.П. Скараходаў. – Мінск: БелДІПК, 2002. – 70 с.

120 Динамика ценностных ориентаций молодёжи в трансформирующемся обществе / Е.М. Бабосов, С.Е. Бабосов, Ю.М. Бубнов, В.А. Клименко, Т.И. Яковук и др. Под ред. академика Е.М. Бабосова. – Минск: ИООО “Современное слово”, 2001. – 160 с.

121 Доклады Беларуси / CERD/C/BLR/18-19 от 18.11.2012 восемнадцатый и девятнадцатый периодические доклады по выполнению положений Международной конвенции о ликвидации всех форм расовой дискриминации, подлежавшие представлению 8 мая 2008 года. Доступно на сайте: <http://www2.ohchr.org/english/bodies/cerd/cerds83.htm> [Дата доступа 16 августа 2013]

122 Дом Польский приглашает на XIV фестиваль польского кино // Вечерний Могилёв. – 2011. – 10 марта. – С. 2.

123 Донских, С. Поляки и “польскость” в истории Беларуси: опыт социокультурной типологии / С. Донских // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф., Гродно, 7–9 нояб. 2003 г. / общественное об-ие “Союз поляков на Беларуси”. – Барановичи: «Баранов.укруп.тип.», 2004. – С. 73–90.

124 Донских, С.В. В тени большого города. Народ и город в Беларуси / С.В. Донских // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно / отв. ред. проф. М.А. Можейко. – Гродно: ГрГУ, 2006. – С. 28–35.

125 Драко, І.С. Дзяржаўна-палітычны аспект беларускай ідэнтычнасці / І.С. Драко // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2006. – № 4. – С. 5–11.

126 Думін, С.У. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць / С.У. Думін, І.Б. Канапацкі. – Мінск: Полымя, 1993. – 206 с.

127 Дучыц, Л. З гісторыі цыганоў Беларусі / Л. Дучыц // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 3. – С. 45–49.

128 Дэбаш, Ш., Пант’е, Ж.-М. Уводзіны ў палітыку / Пад рэд. І. Бабкова, В.Булгакова, В.Вячоркі, В.Кавалёвай. – Мінск: ЭўраФорум, Беларускі Фонд Сораса, 1996. – 624 с.

129 Евдокименко, О.Н. Особенности национальноо менталитета и формирование социального государства в Республике Беларусь / О.Н. Евдокименко //

Беларуская дзяржаўнасць: вопыт ХХ стагоддзя: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18–19 крас. 2003 г. – Мінск: БДПУ, 2004. – С. 210–211.
130 Ергемлідзе, М. Самоідентифікацыя національних меншин в умовах глобалізації / М. Ергемлідзе // Українознавчий альманах. Випуск 2. – Київ: Київский національний університет імені Т.Шевченко, 2010. – С. 18–20.
131 Жук, О.Э. Социальная организация цыган Беларуси / О.Э. Жук // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно / отв. ред. проф. М.А. Можейко. – Гродно: ГрГУ, 2006. – С. 78–81.
132 Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навук. артыкулаў / Гродз. дзярж. ун-т., рэдкалегія: І.П. Крэнь, У.І. Навіцкі, В.А. Белазаровіч (адк. рэдактары). – Гродна: ГрДУ, 2006. – 422 с.
133 Земляков, Л.Е. Религиозные процессы в Беларуси. Проблемы государственно-правового регулирования / Л.Е. Земляков. – Минск: РИВШ БГУ, 2001. – 208 с.
134 Зенченко, В.А. Проблемы модернизации политической системы Республики Беларусь в условиях переходного общества / В.А. Зенченко // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт ХХ стагоддзя: Матэрыялы Міжнар.навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18–19 крас.2003 г. – Мінск: БДПУ, 2004. – С. 215–218.
135 Зенькович, Ю.В. Вклад уроженцев Украины в развитие математической науки Беларуси в ХХ веке / Ю.В. Зенькович // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У.І. Навіцкі (гал.рэд.), М.П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 326–328.
136 Зубарев, А.В. Образ цыган в белорусской республиканской прессе / А.В. Зубарев // Романовские чтения–3 : сб. трудов Международной науч. конференции / Под ред. И.А. Марзалюка. – Могилёв: МГУ им. А.А.Кулешова, 2007. – С. 124–126.
137 Игнатенко, И.М. Национальный вопрос и современность / И.М. Игнатенко // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У.І. Навіцкі, М.С. Сташкевіч. – Мінск: “Дэполіс”, 2001. – С. 31–38.
138 Игнатович, П.Г. Особенности динамики национальных и конфессиональных отношений в современном белорусском обществе / П.Г. Игнатович // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я.Купалы; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2012. – С. 19–25.
139 Идеология и жизнь: материалы семинара преподавателей вузов Могилевской области / Науч. изд. сост. и науч. ред. Ю.М. Бубнов. – Могилев: УПКП “Могилевская областная ўкрупненная типография имени Спиридона Соболя”, 2001.– 336 с.
